ARCHE Зьмест № 4’03 ЧЭСКІ АЛЬБОМ

1. Зьмест / Уводзіны
2. Маім беларускім сябрам. Томаш Ірса ў ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
3. Варты самога сябе. Славамір Адамовіч у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
4. Чаму Васілю Быкаву не далі Нобелеўскай прэміі? Валянцін Акудовіч у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
5. Не народны пісьменьнік. Алесь Анціпенка ў ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
6. Вялікі паэт. Юры Пацюпа ў ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
7. У вянок Пісьменьніку. Вера Рыч у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
8. Нас зь беларусамі дзяліў досьвед 60-х. Яўген Сьвярсьцюк у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
9. Усенародны, беларуска-савецкі. Максім Шчур у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
10. Тры целы беларускага караля. Сяргей Шыдлоўскі ў ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
11. Тры метады палітычнае тэрапіі. Андрэй Казвіч у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
12. Апытаньне ў ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
13. Круглы стол у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
14. Пяць заўваг пра будучыню NATO. Вацлаў Гавал у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
15. Чэскі нататнік. Ян Максімюк у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
16. Праскія кавярні. Ёзаф Кроўтвар у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
17. Палітычная арэна Чэхіі: працэсуальная нестабільнасць. Наталля Прыступа ў ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
18. Незнаёмае пісьменства. Сяргей Сматрычэнка ў ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"

19. Эканоміка Чэхіі ў ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
20. Новая рэлігійная сытуацыя: індывідуалізацыя веры. Іван Адзіла Штампах у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
21. Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі. Міхал Вівэг у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
22. Беларуска. Аповед пра каханне. Мілаш Урбан у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
23. Наведнікі. Іржы Кратахвіл у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
24. Лірыка. Яхім Топал у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
25. Дыянка. Ружэна Свобада ў ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
26. Успаміны аб прэзыдэнту Масарыку. Антон Луцкевіч у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
27. Дзьве дзесяцімільённыя краіны ў цені Тэмэліну. Бржэціслаў Данчак, Віт Глоўшак у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
28. Адкладзеная свабода. Віталь Сіліцкі ў ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
29. Чэхі ў Беларусі. Ігар Карашчанка ў ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
30. Дзённік 1998. Вячаслаў Адамчык у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"
31. Праўда Адамчыкаў. Павал Абрамовіч у ARCHE 4(27)-2003. ЧЭСКІ АЛЬБОМ. "…"

[redacted]ізм

[image]

A R C H E **П а ч а т а к** **№ 4 (27) – 2003**

[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум

Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]

ЧЭСКІ АЛЬБОМ

[image] [image] 2003

аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

[image] [image] [image]

[image]

З ь м е с т

Маім беларускім сябрам.

Прадмова Томаша Ірсы, мэра Глубокай-над-Вэлтавай.

Разьвітаньне з Быкавым.

Славамір Адамовіч. **Варты самога сябе**

Валянцін Акудовіч. **Чаму Васілю Быкаву не далі Нобэлеўскай прэміі?**

Алесь Анціпенка. **Не народны пісьменьнік.**

Юры Пацюпа. **Вялікі паэт.**

Вера Рыч. **У вянок Пісьменьніку.**

Яўген Сьвярсьцюк. **Нас зь беларусамі дзяліў досьвед 60-х.**

Максім Шчур. **Усенародны, беларуска-савецкі.**

Сяргей Шыдлоўскі. **Тры целы беларускага караля.**

Беларусь сёньня

Андрэй Казьвіч. **Тры мэтады палітычнае тэрапіі.**

Апытаньне «ARCHE»: Якія плюсы й мінусы для краіны будзе мець трэці тэрмін прэзыдэнцтва Аляксандра Лукашэнкі?

Тарашкевіца — наркамаўка: складанае збліжэньне. Круглы стол.

Чэскі альбом

Вацлаў Гавал. **Пяць заўваг пра будучыню NATO.**

Ян Максімюк. **Чэскі нататнік.**

Ёзаф Кроўтвар. **Праскія кавярні.**

Наталя Прыступа. **Палітычная арэна Чэхіі: працэсуальная**

нестабільнасьць.
Сяргей Сматрычэнка. **Незнаёмае пісьменства. Эканоміка Чэхіі**
Іван Адзіла Штампах. **Новая рэлігійная сытуацыя: індывідуалізацыя веры.**
кніга
Міхал Вівэг. **Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі.**
гісторыі
Мілаш Урбан. **Аповеды.**
Іржы Кратахвіл. **Наведнікі.**
лірыка
Яхім Топал. **У горад, Агнявая вада, Дзе-кольвек, У дарозе, “Зараз хадзеце зь мірам”...**
архіў
Ружэна Свобада. **Дыянка.**
Антон Луцкевіч. **Успаміны аб прэзыдэнту Масарыку.**
палітыка
Бржэціслаў Данчак, Віт Глоўшак. **Дзьве дзесяцімільённыя краіны ў цені Тэмэліну.**
Віталь Сіліцкі. **Адкладзеная свабода: Посткамуністычны аўтарытарызм у Сэрбіі і Беларусі**
беларускі сьвет
Ігар Карашчанка. **Чэхі ў Беларусі.**
запісы
Вячаслаў Адамчык. **Дзёньнік 1998.**
водгук
Павал Абрамовіч. **Праўда Адамчыкаў.**

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk**
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/10/05**
[image]

Маім беларускім сябрам

Нядаўна мы з прыяцелямі сядзелі за сталом і гаманілі пра жыццё. Нехта ўзьняў пытаньне, ці было да 1989 году (то бок за камунізмам) нешта лепш, чым цяпер. Хоць нешта. Хоць у нейкай галіне нашага жыцьця. Мы раздумвалі — і ні да чога не дадумаліся.

1989 год, то бок вяртаньне да дэмакратыі, зьмяніў усё нашае існаваньне. Не да лепшага — да чагось зусім іншага, і слова “лепшае” — слабы выраз той дзівоснай розьніцы ў нашых жыцьцях. Найбольш зьмена відаць на нашых дзецях, якія з задавальненьнем атрымліваюць навуку ў той галіне, у якой хочуць (тым часам як іхныя бацькі заканчвалі інстытуты, у якія здолелі трапіць і якія іх ня дужа займалі), падарожнічаюць па ўсім сьвеце (тым часам як у нас не было пашпартоў), цалкам свабодна валодаюць некалькімі сусьветнымі мовамі (у адрозьненьне ад маёй кепскай расейскай) і без праблемаў даюць сабе рады з Інтэрнэтам (які мяне нязьменна ставіць у тупік, бо я зь ім працаваць ня ўмею). Мы, старэйшае пакаленьне, цяжкую спадчыну камунізму часткова яшчэ нясём з сабою. Аднак прычына, відаць, ня гэтак у няведаньні моваў або невалоданьні кампутарнымі праграмамі.

Галоўная праблема палягае на досьведзе жыцьця ў камунізьме, то бок на тым, што навыкі такога жыцьця мы перанесьлі ў цяперашні час. На тым, што мы ўмелі пралайдачыць працоўны

дзень, на тым, што мы нястомна гралі камэдыю, што мы не рабілі сваёй працы зь любасьцю й поўнай самааддачай. Што мы без згрызотаў сумленьня маглі скрасьці з працы нейкую драбязу. Таксама на тым, што мы прывыклі да адсутнасьці беспрацоўя, і для нас праблематычна зь ім зьмірыцца. А між тым асабістае дачыненьне да беспрацоўя вырашаецца менавіта праз уласную дзейнасьць, дзеля якой нашыя дзеці выхоўваюцца, праз адукацыю й самаадукацыю, гатовасьць да самастойнага вырашэньня праблемаў, праз асабістую самааддачу. Паўсюль у сьвеце дзейнічае правіла, што хто сапраўды хоча працаваць, працу заўсёды знойдзе.

Сёньня мы напоўніцу робім сваю працу і напоўніцу цешымся з адпачынку пасьля яе. Няма праблемы выжыць, мэтай ёсьць добра жыць. Быць пасьпяховым у працы і ў асабістым жыцьці. Быць задаволеным і прыносіць карысьць. І дэмакратыя нам да гэтага шырока расчыняе дзьверы.

Прыватызацыя і прыватнае прадпрымальніцтва спрасьцілі нашае жыцьцё, бо ўсе паслугі й тавары зрабіліся ня толькі даступныя, але дзякуючы канкурэнцыі таньнейшыя і разнастайнейшыя. Што казаць, нашай эканамічнаю мэтай ёсьць узровень краінаў Эўразьвязу, нашай абарончаю мэтай ёсьць бясьпека ўва ўмовах NATO. І да абедзьвюх мэтаў мы ўпэўнена крочым.

Я досыць часта ежджу ў Беларусь. За апошнія тры гады я тут быў мо разоў восем-дзесяць. Досыць часта мае беларускія сябры і знаёмыя наведваюць Чэхію. Беларуская й чэская мовы вельмі падобныя, паміж нашымі нацыямі існуе доўгая гістарычна-культурная ўзаемнасьць, дый нашыя лёсы ў XX стагодзьдзі былі трохі падобныя. Зрэшты, лёс Беларусі быў значна трагічнейшы.

Мо й таму, калі я цяпер прыяжджаю ў Менск, Віцебск, Гомель ці іншае месца, у мяне адчуваньне, што ўвесь час я бачу пэўную розьніцу. Я зьвяртаю на яе ўвагу сваіх беларускіх сяброў, што прыяжджаюць да мяне ў Чэхію.

Цяжкасьці прамінуць. Я зычу сваім беларускім сябрам дасягнуць такога жыцьцёвага, эканамічнага і абарончага ўзроўню, які дасьць ім магчымасьць жыць паўнакроўным і заможным жыцьцём. Дэмакратыя ў тым, каб гэтыя мэты сталіся справай кожнага грамадзяніна.

Томаш Ірса, *мэр Глубокай-над-Вэлтавай*

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/28
[image]

Славамір Адамовіч

Варты самога сябе

“Столькі намаганьняў пакладзена і дарагога апазыцыйнага часу страчана дзеля стварэньня вобразу Быкава-рэзыстанта, а ён узяў ды памёр”, — падумаў я, атрымаўшы сумную навіну ад знаёмага беларускага палітуцекача, які знайшоў часовы прытулак у Фінляндыі.

На другі дзень, чытаючы ў Інтэрнэце камэнтары на сьмерць пісьменьніка, я раптам пачуў, як нехта ўва мне злосна прашыпеў: “Пасьля цяжкой і працяглай хваробы... апазыцыя панесла непапраўную страту”. “Да-да”, — кіўнуў мне сярэдняга веку аўганец, які разы тры спрабаваў пераходзіць беларускую дзяржаўную мяжу ў раёне Смаргонскага пагранатраду і крыху разумеў па-славянску.

На трэці дзень чорны гумар ува мне пачаў ператварацца ў зялёныя пэстыцыды сарказму, і я ня мог не падумаць: “Вось яшчэ адзін літаратурны “зубр” пакінуў нас, а правільныя гарадзкія хлапцы пакуль так і не перамаглі калхозных рыштантаў-лімітчыкаў...”

На чацьвёрты дзень я пасьпяшаўся вярнуцца да праблемаў уласнага існаваньня: паходаў у горы, вывучэньня бежанскага інтэрнацыяналу, пошукаў жанчыны, пісаньня дзёньнікаў, вершаў і пісьмаў у каралеўскую рэзыдэнцыю... Аднак сёньня,

атрымаўшы прывітаньне з “Arche”, я зноў мусіў вярнуцца да пытаньня пра сьмерць вялікіх.
Васіль Быкаў, як ніхто іншы зь пісьменьнікаў яго веку, мужна абараняў сваю Матку-нацыю ад залётнага кабяля-парнографа. Гэта факт. Але факт і тое, што ягонае публічнае стаяньне за Беларусь суправаджалася нязьменным пэсымістычным одумам. Ці не савецкае мінулае ўтрымлівала яго ад патрыятычнай гарачкі апошніх гадоў?

У дыскусіі пра вялікага Быкава трэба ясна бачыць абодва бакі мэдаля. На адным Васіль Уладзіміравіч засядае ў прэзыдыюме зьезду БНФ, крочыць у першых шэрагах дэманстрантаў і дае інтэрвію лібэральным СМІ. На другім ён — звычайны савецкі пісьменьнік, які крыху больш за іншых сказаў пра акопную праўду *савецкай* вайны.
Калі Быкаў сапраўды назваў салжаніцынскі “Адзін дзень Івана Дзянісавіча” “каляднай казачкай”, то мне такі ягоны пасаж нагадвае заяву Зянона Пазьняка ўзору 96-га наконт таго, ці варта палітыку ісьці на турэмную адседку. Больш за тое, у апошні час Быкаў сам пачаў пісаць казачкі-прыпавесьці. Але — позна: пісаць іх трэба было крыху раней, хоць бы ў 80-я...
Васіль Быкаў — ня *мой* пісьменьнік (мае — Гарэцкі, Чорны, Колас, Яновіч), тым ня менш, дзякуй яму за тое, што ён не баяўся запэцкацца і мяшаўся ў палітыку.
Быкаў пайшоў. На перадавой зацішша. Вэрбальную зброю павінны ўзяць пакаленьне саракагадовых і маладзейшыя. Вось толькі цікава, як адрэагуе дэмакратычная грамадзкасьць, калі заўтра стане вядома, што атаку на варожае пасольства арганізаваў... беларускі літаратар?

1 жніўня 2003 году,
Паўночная Нарвэгія

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/28
[image]

Валянцін Акудовіч

Чаму Васілю Быкаву не далі Нобелеўскай прэміі?

Дзіўная рэч, у калізіі “Быкаў—Нобель”, якая разгортвалася цягам колькіх там гадоў, я ні разу не чуў пытання: “А з чаго гэта Васілю Быкаву мусяць даць Нобелеўскую прэмію?” Здаецца, не толькі ў адэптаў пісьменніка, але і ў ягоных антаганістаў ніколі не было асаблівага сумневу, што ён варты такога *статусу* (менавіта так, бо Нобелеўская прэмія ўжо даўно не ўзнагарода, а вяршыннае месца ў іерархіі сучасных элітаў). Таму кожны год, пасля чарговага ўручэння “Нобеля” ня-Быкаву, усчыналіся дыскусіі: маўляў, з якіх такіх інтрыгаў нашага чалавека зноў “пракінулі”? Бо нават калі не звяртаць увагі на a priori зададзеную сакральнасць “феномену Быкава”, то для ўганаравання хапала і проста фармальных падставаў: агульны наклад кніжак перасягнуў тры мільёны (а яшчэ да выхаду кніжак усе апавяданні і аповесці не ў адзін мільён былі паасобку надрукаваныя ў газетах ды часопісах), ягоная проза перакладалася на паўсотню моваў свету, а ў колькіх краінах друкавалася — дык і ўвогуле як падлічыць? Не забудземся і на тое, што гэта не займальная белетрыстыка, а, так бы мовіць, “высокая літаратура”, да таго ж псіхалагічна “цяжкая” ў чытве,

і таму кожны экземпляр тут мусіць быць падвышаны на парадак адносна камерцыйных чытанак.
Версіяў тых прычынаў, з якіх Нобелеўскі камітэт (з яго шматлікімі экспертамі) упарта не зважаў на Быкава, было болей чым даволі. Тут і “камуністычнае” мінулае пісьменніка, і ягоны “нацыяналізм”, і слабое “лобі”, і малая знанасць у свеце беларускай літаратуры, як і самой Беларусі... Але ўсе пералічаныя (і ў мностве не пералічаныя) версіі — гэта ўсяго толькі вольная гульня інтэрпрэтацыяў на полі праблемы, параметраў якой ніхто не ведае (натуральна, акрамя тых, хто ведае). Вось чаму апошнім часам кожны новы “лаўрэат” для літаратурнай грамадскасці гэтаксама нечаканы (і непрадказальны), як адкрыццё Амерыкі (выключэннем — у сэнсе “чаканасці” — быў хіба толькі Гюнтэр Грас).
У праблеме Нобелеўскай прэміі старонняму чалавеку зразумела пакуль адно, а менавіта — што цяпер узнагарода залежыць не столькі ад творчасці як эстэтычнай дзейнасці таго ці іншага літаратара, колькі ад шматлікіх ускосных прычынаў, часам зусім і не звязаных з творцам і ягоным творывам. І гэта цалкам слушна. За стагоддзе свайго існавання прэмія Нобеля набрыняла такім значэннем і ўвабралася ў такі статус, што было б бязглуздым марнатраўствам аддаваць увесь назапашаны капітал аднаму асобнаму чалавеку (з чалавека хопіць і грашовых адсоткаў гэтага капіталу). Адсюль толькі фармальна “Нобелем” узнагароджваюць некага персанальна, а насамрэч гэта прэмія кантыненту, рэгіёну, краіне, чорным, жоўтым, мусульманам, гэбраям, дысідэнтам, сексуальным мяншыням... (Як на мой прагноз, дык яе вось-вось мусяць атрымаць феміністкі — і, можа, іх заперсаналізуе наша Святлана Алексіевіч?!)
З гэтага вынікае, што праблему “Быкаў—Нобель” будзе лагічна перафармуляваць на праблему “Беларусь—Нобель” і, адпаведна, задацца пытаннем, чаму Беларусі не далі Нобелеўскай прэміі? А як толькі мы гэтак запытаемся, то атрымаем два варыянты адказу.
Першы: не далі таму, што і не мелі намеру даваць. Вунь колькі ў чарзе стаіць, дзе ж на ўсіх “нобеляў” набярэшся?
Другі: не далі таму, што *некаму* гэтага вельмі моцна не хацелася.

Абвінавачвайце мяне як і ў чым заўгодна: у непавазе да “прэзумпцыі невінаватасці”, логіка-спекулятыўным валюнтарызме, дэманізацыі антыбеларускіх сілаў (і г.д. і да т.п.), але я схіляюся да другога варыянту.
Бачыце, даць Нобелеўскую прэмію Васілю Быкаву — азначала легалізаваць Беларусь у якасці эстэтычнага, інтэлектуальнага і (то ж Быкаў) этычнага суб’екта сусветнай супольнасці. Гэта па-першае. А па-другое — істотна ўтрываліць Беларусь у яе геапалітычнай рэальнасці. Скасаваць краіну, якая мае свайго Нобелеўскага лаўрэата, значна складаней, чым скасаваць краіну, якая яго не мае.
Так знадворку, але не меней і ўнутры. Найперш, ідэя нацыянальнай, незалежнай і еўрапейскай Беларусі атрымлівала б на сваю карысць магутны аргумент. Затым, беларуская мова ўпляталася б у залаты суплёт вялікіх літаратурных моваў свету і з гэтым давялося б лічыцца і людзям паспалітым, і прэзідэнтам. Далей, этычны імператыў, як формула адбывання быцця, перастаў бы быць ідэальнай фігурай і шмат для каго паклаўся б у под яго рэальнага шляху...
Я не ведаю, хто непасрэдна скраў “Нобеля” ў Васіля Быкава (Беларусі), але гэтую страту я цалкам усур’ёз гатовы параўнаць са стратай Вітаўтам (ВКЛ) каралеўскай кароны. “Быў прызначаны нават дзень каранацыі, але палякі спрытна перахапілі карону па дарозе” (Янка Запруднік).
Якім быў бы наш гістарычны лёс, каб Вітаўт стаўся каралём, а ВКЛ — каралеўствам, не скажа ніхто, хаця зразумела — ён быў бы іншым. Прыкладна тое ж і з не-каранаваннем Васіля Быкава. Усё будзе трохі інакш (а можа, зусім і не трохі) ад таго, як магло б быць.
Таму цяпер, калі нядобрае здарылася, няма сэнсу гадаць, хто на гэты раз “перахапіў карону па дарозе”. Больш за тое, асабіста мне не хацелася б, каб нам яе *неўзабаве* “вярнулі”. Без Васіля Быкава “нобелеўская карона” на Беларусі будзе вялікай няпраўдай. Прынамсі, яшчэ ладны кавалак часу... Той, хто плячо ў плячо з тысячамі суайчыннікаў праводзіў Яго ў апошні шлях, верагодна, пагодзіцца са мной.

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/28
[image]

Алесь Анціпенка

Не народны пісьменнік

Васіль Быкаў быў першым сучасным беларускім пісьменнікам агульнанацыянальнага маштабу. Яму зусім не пасавалі самыя розныя савецкія пісьменніцкія атрыбуты, у тым ліку і званьне “народны пісьменнік Беларусі”. Выглядала б парадоксам, калі б хтосьці назваў Камю, Бёля ці Кундэру “народнымі пісьменнікамі”. “Народнасьць” — савецкі анахранізм і толькі адна з эстэтычна-ідэалягічных плыняў літаратуры XIX стагодзьдзя, якая так і ня сталася эўрапейскай. Творчасьць Быкава разгортвалася ў агульнаэўрапейскім літаратурным кантэксьце, а яе грунтам быў экзыстэнцыйны досьвед аўтара. А таму творчасьць Быкава іншая ад той, якою яе традыцыйна вызначаюць. Ягоную прозу нельга назваць ні “лейтэнанцкай”, ні “прозай пра вайну”. І ўжо зусім ня ёсьць яна прозай “пра гераізм савецкага воіна-пераможцы”.

Быкаў экзыстэнцыйны ад пачатку і да канца. Вайна, насамрэч, — гэта “памежная сытуацыя”, у якой знаходзіць сябе аўтар і героі ягонай прозы. І ў сваім экзыстэнцыйным, быкаўскім вымярэньні яна — страшны выбар паміж прагным, амаль жывёльным жаданьнем “застацца ў жывых” (Рыбак) і “чалавекам унутры чалавека” (Сотнікаў). Гэта страшны выбар, кошт якому — сьмерць.

БОГ, абставіны (?), лёс (?) падаравалі Быкаву жыцьцё. Можа быць, і дзеля таго, каб ён, першым зь беларусаў, стаўся эўрапейскім беларуска-нацыянальным пісьменьнікам.

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/28
[image]

Юры Пацюпа

Вялікі паэт

У Беларусі яшчэ захавалася тая архаічная і адначасна рамантычная павага да пісьменьніка. Нездарма так часта ў нас зьяўляюцца наіўныя дзяўчаткі і хлопчыкі, якія пішуць вершы. Ім здаецца, што пісьменьнік — крыху прарок.

І цяпер — памёр наш Вялікі Паэт. Анэкдот пра “вершы Быкава” не такі ўжо абсурдны, калі слова *паэт* разумець у вышэйшым сэнсе, ведучы адлік ад Гамэра. Такая іронія праўды! Амаль сто гадоў таму сьмерць Талстоя для нашых суседзяў мела блізкую вагу. Надоўга гэтая сьмерць стане вяхою, якой мы чакалі і баяліся. Бо ня скора будзем мець, і ці будзем, такога заступніка перад сьветам. Фэномэн Быкава народжаны савецкаю эпохай, але насуперак саветам. Махіну каляніяльнае культуры пісьменьнік volens nolens скарыстаў для “раскручваньня” свайго таленту, для таго, каб сказаць сьвету, што “Жыве Беларусь!”.

Ён, як ніхто іншы, нідзе не пахібіў, не адхіліўся ад няпісанага кодэксу Вялікага Паэта. Сёньня можна колькі заўгодна капацца ў прыватным жыцьці пісьменьніка, шукаць дробныя, “пабытовыя” абмылкі, але не знайсьці ў ім абмылаў быцьцёвых. Як ні спакушалі вакол, як ні даводзілі то расейскасьць, то савецкасьць Быкава — памёр ён беларускім нацыяналістам.

І памёр, як шчыры беларус, сэнсоўна, можна сказаць, “рупліва”. Патрапіў вярнуцца на родную зямельку.
Пры нагодзе хочацца ўспомніць адну дэталь, якая ў свой час моцна мяне ўразіла. У сярэдзіне васьмідзясятых гадоў я недзе пачуў ці прачытаў, што Быкаў дзеля творчае свабоды адмовіўся ад нейкае высокае пасады. Так гэта было ці не зусім, але я доўга разважаў гэты факт. Ён ператварыўся для мяне ў прыпавесьць. Тады я не сумняваўся ў рацыі Ніцшэ, што ўсё жывое імкнецца да ўлады. Але якой? Во пытаньне! І што значыць улада Бісмарка супраць улады Гегеля! Улада Аляксандра Македонскага — супраць улады Плятона, Дыягена! Ад першых у найлепшым разе засталося імя, а другія і да гэтае пары валодаюць нашымі думкамі.

Улада ж звычайнага чыноўніка ў гэтым сэнсе нішто. Тое самае, што ўлада вахцёра на прахадной. Можна мець чын — чаму не! — але ганарыцца ім — гэта прыніжаць самога сябе. Асабліва ганебны такі гонар для пісьменьніка, гэтаксама як і захапленьне ўзнагародамі, славаю. У апошнія гады жыцьця, кажуць, Быкаву прапаноўвалі стаць кандыдатам у прэзыдэнты. Чаму ж ён адмовіўся, калі гэта было так патрэбна не самому Быкаву, а нам, беларусам? Гавал жа не пагрэбаваў зямною ўладаю. Асьцярожнасьць Быкава, як індыкатар, паказвае, што мы маем шулерскі і бутафорскі палітычны бамонд. І ў гэтым таксама яго папярэджаньне сучасным палітыкам.
Імя Быкава даўно стала жывым аргумэнтам. Адзін гарадзенскі змагар з адраджэньнем яшчэ гадоў пятнаццаць таму назваў яго “буйной артылерыяй беларускага нацыяналізму”. І зь якой палёгкаю ўспрынялі гэтую сьмерць ворагі! Цікава было назіраць розьніцу: як пахаваньне апісвалі сьведкі і як яго падавала тутэйшая тэлевізія. Апошняя надта моцна ціснула на савецкія заслугі Быкава, на тое, што ён герой сацыялістычнай працы. Нібы хацела ўпхнуць Паэта ў рамкі чыноўніцкае велічы і наагул нэўтралізаваць — нарэшце! — яго беларускасьць. Як тут ня ўспомніць “Легенды пра Вялікага Інквізытара” Дастаеўскага. Мёртвы паэт зручнейшы за паэта жывога!

P. S.
У нядзелю 27 ліпеня ў Фарным касьцёле Горадні адбылася задушная адправа па Быкаву. Дзеля гэтага я адумысна прыехаў

зь вёскі. Але адразу ледзь стрымаўся, каб ня выйсьці з храму. Нейкі ксяндзок пачаў з таго, што працытаваў, нібы айца Царквы, начальніка рэспублікі, пэўна ж, не бяз згоды свайго начальства. Нават у савецкія часы ні Брэжнева, ні Леніна не цытавалі. І гэта ў касьцёле! А скончылася ўсё тым, што Божы служка, не дабыўшы да канца, хутчэй пабег сьвянціць аўтамабілі...

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/28

Вера Рыч

У вянок Пісьменьніку

Нехта некалі вызначыў генія як чалавека, што надае форму й значэньне свайму веку. Для мяне жыцьцё — і сьмерць — Васіля Быкава заключае ў сабе многія парадоксы беларускай гісторыі апошніх 60 гадоў. Ён быў пісьменьнікам, творы якога савецкая ўлада апантана адзначала прэміямі, але які пры гэтым адчуваў няспынны ціск цэнзуры. Ён быў адзіным сусьветна вядомым беларускім пісьменьнікам свайго часу (хоць і ў перакладах людзей, якіх, можна меркаваць, адбіралі паводле палітычнай добранадзейнасьці, а не паводле літаратурнага таленту), і пры гэтым замежныя чытачы — у тым ліку й некаторыя замежныя крытыкі й дасьледчыкі — лічылі яго расейскім літаратарам. Быкаўскія творы савецкага часу былі напісаныя на тэму ня толькі прымальную, але і вітаную літаратурным канонам таго часу — “вялікай айчыннай вайны”. Ня ён адзін пісаў на гэтую тэму; у 1940—50-х гадох аўтары ўва ўсім Савецкім Саюзе бачылі ў вайне тэму, якая дазваляла ня толькі знайсьці чытача, але й была палітычна “правільнаю”. На жаль, палітычная “правільнасьць” зачаста абарочвалася пэўнай просталінейнасьцю сюжэту: адважныя савецкія салдаты й партызаны, крыважэрныя гітлерцы, здраднікі-паліцаі выконвалі свае ролі з праўдзівасьцю марыянэтак. Быкаў унёс у тэму новыя

падыходы — ягоныя героі былі асобамі ў поўным сэнсе гэтага слова, ён не баяўся пісаць пра іхныя ўнутраныя страхі, перажываньні, пра зьдзічэньне звычайнага салдата, пра памылкі й жахі сыстэмы, за якую прыходзілася рызыкаваць, а часта і ахвяраваць жыцьцём. Пры гэтым яму ўдалося надаць новую шырыню й глыбіню жанру ваеннага раману.
Пасьля, у другой палове 1980-х, калі розныя “нефармальныя” групы й рухі паўсталі на абарону беларускае культуры, ідэнтычнасьці й традыцый, Быкаў пачаў адыгрываць новую грамадзкую ролю. У апошнія гады свайго жыцьця ён быў вымушаны шукаць часовага прытулішча за мяжой, аднак паміраць вярнуўся ў Беларусь — і гэта красамоўна гаварыла пра цяперашні стан краіны. Як і рытуалы, якімі суправаджалася ягонае пахаваньне — калі за вонкавымі пахваламі ўладаў хавалася імкненьне абмежаваць маштаб падзеі, і настойлівасьць, зь якой ягоная сям’я дабівалася, каб пісьменьніка пахавалі пад бел-чырвона-белым сьцягам, а не пад флягам рэжыму.
Але навошта я ўсё гэта пішу? Вы, мае беларускія сябры, ведаеце гэта лепш, чым я. Проста дадаю гэтыя думкі, запісаныя далёка ад Беларусі, у вянок вялікаму пісьменьніку, зь якім я мела шчасьце сустракацца ў апошнія гады ягонага жыцьця.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/09/28**
[image]

Яўген Сьвярсьцюк

Нас зь беларусамі дзялілу досьвед 60-х

ЯЎГЕН СЬВЯРСЬЦЮК — Украінскі літаратуразнаўца, былы дысыдэнт, палітвязень, прэзыдэнт Украінскага ПЭН-цэнтру. Артыкул перакладзены з украінскай зь невялікімі скаротамі паводле аўтарскага арыгіналу, які быў надрукаваны таксама ў газэце "Рядовий кур'єр". Назва ў арыгінале — "Апошняя сустрэча з Васілём Быкавым".

Ён стаіць у мяне ўваччу, высокі і сівы, і ў ягонай уважнай рысе я адчуваю адно з тых разьвітаньняў, зь якіх сатканае падзеснае жыцьцё. У разьвітаньні ёсьць суворая праўда і ўдзячнасьць. Васіль Быкаў не адразу стаў прэзыдэнтам Беларускага ПЭН-цэнтру, які запрацаваў на пачатку 90-х высілкамі няўрымсьлівага Карласа Шэрмана — гэты рэпатрыянт з Уругваю ведаў некалькі моваў, а галоўнае, меў дзелавую хватку і арганізатарскія здольнасьці. Займаць пры яго прэзыдэнту Шэрману пасаду прэзыдэнта было, мабыць, лёгка і спакойна.

Яшчэ ад 60-х гадоў Быкаў быў для мяне клясыкам адным зь нямногіх, каго шанавалі й чыталі. На пачатку 90-х у агульным грукаце ад падзеньня куміраў неяк раптам зблякнулі вядомыя імёны. "Сьмелыя аповесьці" Чынгіза Айтматава пасьля падзеньня цэнзуры страцілі тую загадкавасьць "высокіх узгадненьняў" і грамадзкую напругу, якая стварала вакол іх трывожны арэол. А пра аўтара беларускіх партызанскіх аповесьцяў раптам забыліся. Кніжны рынак запоўнілі

сэнсацыйныя выкрыцьці. На паверхню выплылі раней забароненыя лягерныя тэмы, папулярнаю стала газэта “Совершенно секретно”. У бэстсэлеры выйшла аповесьць Рыбакова “Дзеці Арбату”.
З даўнейшага чытаньня пра беларускую літаратуру ў маёй памяці чамусьці адбілася фраза зь нейкага газэтнага разносу “ідэйна нясьпелых”: “Тры разы ўрадам адзначаны, а сам сапсаваўся дазваньня”. Ужо не згадаю аўтара, але выраз ёмісты, варты цэлага апавяданьня.

Нас зь беларусамі дзяліў досьвед 60-х гадоў. Украінцы запаўнялі палітычныя вязьніцы й лягеры, а беларусаў тамака было вобмаль. Хоць я знаў, у Беларусі ёсьць такія ж настроі, як і ўва Ўкраіне. Але калі Адамовіч і Быкаў маюць свой спосаб нацыянальнае самаабароны, дык дзякуй Богу.
Часам да Кіева ад беларусаў у 60-я гады даходзілі вальнадумныя лісты. Мне здавалася, што ў Беларусі няма асяродку для падтрымкі самвыдаву і беларусы шукаюць аддушыны збоку. Але ж кожны “самвыдаў” мусіць мець уласнае нацыянальнае жыватворнае асяродзьдзе і свайго ўдзячнага чытача. Бяз гэтага “самвыдаў” не народзіцца. У 1970 годзе я прачытаў яшчэ “сьвежае” эсэ Валянціна Мароза “Майсей і Датан” — і адразу запратэставаў. Натуральна, там была праўда аб правінцыйных рабах, якія хочуць у сябе і ў школе, і ў музэях, і дома арганізаваць “куточак Масквы”. Але хіба ўва Ўкраіне бракавала такіх рабоў? Мяне ўдарыла непрыемнаю фразаю пра беларусаў як нацыю рабоў. Зразумела, што беларусам бракавала ў гісторыі Хмяльніцкага, у літаратуры — Шаўчэнкі, у ХХ стагодзьдзі — Пятлюры й Бандэры. Але бальшавіцкая чума, а пасьля бесьперапынная вайна іх гэтак выкасіла, што ня дай Божа! А рух супраціву вымагае прынамсі пяці адважных і маральна загартаваных грамадзянаў, што знаходзяць і падхопліваюць эстафэту.
Ведама, шкада, што ў лягеры няма беларусаў: кожная нацыя мусіць пасылаць у ахвяру сваіх Дон Кіхотаў… Стануць жа перад Нябёсным Пасадам тыя, у белых шатах, каго замардавалі за слова веры…
Я тлумачыў сабе сытуацыю тым, што беларускія цэка не такія шчарбіцкія, як нашы. А галоўнае, тым, што крытычная сіла супраціву ў Беларусі не такая вялікая, як ува Ўкраіне, і тамака

душаць абуджаных неўпрыкмет. Гэтак, як у нас у райцэнтрах.

Натуральна, былі ў лягерах сымпатычныя беларусы даўнейшага набору. Адзін — Рыгор Вабішчэвіч — за ўдзел ува УПА, за нейкую справу Кастусь Грэбень, Алейнік… Адзін сымпатычны беларус сядзеў за тое, што схапіў сваю прыхаваную вінтоўку й пабег адбіваць у чырвоных сваю рагулю. “Вызваліцелі” гэта прыгадалі.
Словам, беларусы выклікалі ў мяне спагаду й пашану, не зважаючы нават на тую мазырскую савецкую бабулю, якая, падслухаўшы маю размову з прыяцелямі, пабегла за мною з пагрозамі даказаць. Адзін толькі беларус Уладзімер Караткевіч важыць больш за тысячу такіх “прадуктаў эпохі”. Дарэчы, сярод кіеўскіх студэнтаў і моладзі ён быў пашыральнікам нацыяналістычнага фэрмэнту...
Але гэта наша супольная доля, што на працягу некалькіх пакаленьняў секлі галовы. Зазвычай гэта прыводзіла да зьяўленьня масавае ляяльнасьці і яе вестуноў у літаратуры, дзе, кажучы словамі Васіля Быкава, “у некаторых нашых майстроў слова бачым па шэсьць-восем ордэнаў — не за вайну, за літаратуру”. І далей: “За часамі таталітарызму нацыя адвярнулася ня толькі ад рэлігіі, а і ў вялікай ступені ад нацыянальнае ідэі”.

Калі я наведаў Беларусь, мяне ўразіла савецкая нязьменнасьць сталіцы. Але й прыемная чысьціня вуліцаў. Нават уявілася, што сам Лукашэнка ўранку ў белым хвартуху праходзіць з драпачом, каб паказаць, як трэба ўтрымліваць фасад.
Усе беларускія пісьменьнікі ў сваіх выступах былі выразна апазыцыйнымі і аднадушнымі ў падтрымцы вострых выступаў з трыбуны. Там прабліскавалі яркія публіцыстычныя таленты, якіх бракуе і ўкраінскай, і расейскай літаратурам. Мне здалося, што ў Беларусі расейскамоўны пісьменьнік застаецца беларускім, тады як у нас — гэта ўжо па-за ўкраінскаю літаратураю.
У кожным разе, расейскамоўная Сьвятлана Алексіевіч — гэта беларуская пэрліна, дар рэдкаснае праўдзівасьці.
У апошні мой прыезд улетку 1998 году ўранку прыйшоў у гатэль прывітаць гасьцёў Васіль Быкаў. Між намі была рака жыцьця: колішні прызнаны клясык беларускае літаратуры і колішні вязень, гнаны за пазыцыю ў літаратуры. Але мы былі

на адным беразе й шанавалі адзін аднаго за аднолькавасьць сьвятыняў. І ўсё ж за горыч лёсаў…
Я ня памятаю больш удзячнае аўдыторыі, чым беларуская. Ды мне стаіць уваччу разьвітаньне. Тым летам 1998 году міжнародная канфэрэнцыя ПЭН-клюбу ў Менску супала ў часе зь міжнародным Біблійным сымпозіюмам у Любляне. Дык жа пасьля свайго дакладу ў перапынку я перапрасіў, што мушу адбыць раней, і разьвітаўся з усімі.
Але пасьля вырашэньня фармальнасьцяў я праходзіў перад расчыненымі дзьвярыма актавае залі проці прэзыдыюму і, сустрэўшыся поглядам з Васілём Быкавым, памахаў яму рукою. Ён устаў, памахаў рукою ў адказ. І ўвесь прэзыдыюм устаў. Гэта было так значна, так велічна, што нават трохі выходзіла за межы рэчаіснасьці — як бывае ў сьне.
Ён стаіць у мяне ўваччу, высокі й сівы. І ў ягонай узьнятай руцэ я адчуваю сапраўднасьць, па-над абставінамі месца й часу.
А мо гэта накладаецца вобраз “высакаслы сівы беларус” з твору Някрасава. Але глыбокі погляд Васіля Быкава стаіць і ня тоне.

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/09/21**
[image]

[illegible]ізм

[image]
ARCHE Пачатак № 4 (27) – 2003
[image]

[image]

Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае

[image]
[illegible] [illegible]
[illegible] [illegible]
[illegible] [illegible

штосьці накшталт сутычкі дзьвюх груповак футбольных хуліганаў, якім не спадабаўся нічыйны вынік матчу. Сьмерць нібыта павінна змушаць забывацца аб палітычных сварках — у нас жа, наадварот, яны толькі ўзмацніліся, што можа сьведчыць адно аб адсутнасьці нацыянальнай культуры пахаваньня.
А можа, не дарасьлі мы да Быкава? Дзяржава не дарасла да разуменьня ані ягонай палітычнай пазыцыі, ані таго, што раскоша мець ворага ў асобе такога вялікага чалавека можа дорага каштаваць. Апазыцыя не дарасла да разуменьня таго, што на Быкава маюць права ўсе, а ня толькі тыя, хто стаіць пад бел-чырвона-белым ці пад чырвоным (пад якім ён, як ні круці, ваяваў) сьцягамі. Безумоўна, былі часы, калі пахаваньні пэўных “неўпадабаных” асобаў ператвараліся ў стыхійныя (!) палітычныя маніфэстацыі, але ў такіх выпадках прадстаўнікі дзяржавы не дасылалі нябожчыку вянкоў ды не хавалі яго за дзяржаўныя грошы. У выпадку з пахаваньнем Быкава стыхійнай палітычнай маніфэстацыі, нягледзячы на ўсю шырыню падрыхтоўкі да яе, дзякуй богу, ня выйшла. Было стыхійнае, палітычна неакрэсьленае й насамрэч жалобнае шэсьце, якое адвеку было сымбалем нацыі: “А хто там ідзе...” Шкада, што ў нейкі сымбаль паспрабавалі ператварыць і самога нябожчыка, што было цалкам празьмерным: сымбалем ён стаўся ўжо пры жыцьці. Пасьля сьмерці ён таксама застаецца сымбалем, знакам калі не бяды, дык паняверкі: што далей? Адчуваньне, як пасьля такога самага хаўтурнага шэсьця ў апошняй сцэне “Гамлета”: п’еса скончаная, дадаць няма чаго. Варта аддаць належнае акторам, пайсьці дамоў, яшчэ раз перачытаць тэкст, задумацца над ім і паспрабаваць яго зразумець.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/28

[image]

Сяргей Шыдлоўскі

Тры целы беларускага караля

На харугве крывічоў папараць і васілёк. Купала і Колас, Караткевіч і Быкаў выйшлі з чатырох томікаў Яна Баршчэўскага, каб туды і вярнуцца. Пераемнікі традыцыі? Хутчэй яе пэрсаніфікаваныя архетыпы. Мы пільнуем, каб яны былі разам на фатаздымках. І справа не ў рэальным сяброўстве, не ў іх інтэлектуальным дыялёгу, а ў нашых чаканьнях, камфорце міталягічнай адпаведнасьці, казках, знаёмых зь дзяцінства. Мы ставім іх побач на імгненным фатаздымку эпохі, яны побач, Пан ды Апалён, — значыць, эпоха адбылася. Купала і Караткевіч сышлі хутка, як мінае сьвята. Але цыкл скончыўся не на іх. Першае і другое стагодзьдзі беларускага Адраджэньня, дзе год за два, вяршылі Колас ды Быкаў.
Зь сьмерцю Быкава для нас скончыліся даўгія 70-я, а разам і век. Пэўныя культуры ў сваім летазьлічэньні датрымліваюцца цыклу месяцу, а ня сонца. Беларускія ўздымы-заняпады таксама не дастасуюцца да грыгарыянскага календара. Што за стагодзьдзе за нашым акном?
Было прынамсі тры Быкавы. Першы — клясык савецкай літаратуры. Вялікі стыль, Рэалістычны канон, Духовасьць, Праўда, Народ — усё зь вялікай літары. Быкаў — адзін зь нямногіх, хто вытрымліваў без выдаткаў для творчасьці патас

азначэньня “беларускі савецкі пісьменьнік”. “Літаратары” ж за іроніяй маскавалі разгубленасьць перад засьнежанымі вяршынямі школьных хрэстаматый ды лысагорскай легенды, крыўдавалі на гэтага Быкава за касмапалітызм, за русізмы і, што хаваць, нават за слова “хлопцы”, а ня “мальцы”, як прынята ў нас на Полаччыне — Вушаччыне. У пакаленьня “Фанты” былі свае рахубы да клясыка — нуда школьных урокаў, корпаньне ў “нацыянальным характары” Петрака і Сьцепаніды, а насамрэч — у комплексе самасьцьвярджэньня правінцыйнага літаратуразнаўства Беларусі.
Моцна раскручаны паводле канонаў савецкай літаратурнай іканаграфічнай традыцыі, Быкаў-савецкі-клясык меў і ідэалягічны рэвэрс — рэпутацыю гнанага, рэжучага акопную праўду-матку салдата, які калі й піў, дык “з ідэяй”. Бальшавікі ўмелі рабіць біяграфію паэту. Што магла заходняя сыстэма вырабляць з творцаў, дык гэта штампаваць Эдзічкаў Лімонавых. Бродзкіх жа і Салжаніцыных яна экспартавала ўжо ў сфармаваным як брэнд выглядзе. Сакрэт вырабу паэтаў-прарокаў незваротна згублены.
Другая, перабудовачная, іпастась Быкава — апостал...

Час стагодзьдзі, як касой, сьцінае,
Веры, царствы, догмы йдуць да ценяў...
Ўсё мінае — Гонар не мінае,
Бо народжаны адным сумленьнем.
Калі сонца выб’ецца з туману,
Толькі іх і ўспомніць хор народаў,
Воінаў сваіх, сьвятых і зраненых,
Рыцараў сумленьня і свабоды, —

праграмаваў далейшае разгортваньне беларускай гісторыі ў адным з сваіх апошніх вершаў, прысьвечаным, дарэчы, Быкаву, Уладзімер Караткевіч. І незабавам зьяўляецца Зянон Пазьняк. Але мэсіі патрэбны прадцеча, Іван Ксьціцель, які б злучыў сваім аўтарытэтам філялягічнае пакаленьне беларускай інтэлігенцыі з Добрай весткай геапалітычнай каньюнктуры. Новае пакліканьне трансфармуе творчасьць Быкава. Няма больш хадульных “нацыянальных характараў”, ёсьць Голас, пазнавальная мабілізуючая інтанацыя тугі, якую мы ведаем з

твораў Багдановіча і Гарэцкага. Гэты час быў плённы для пісьменьніка на публіцыстыку ды калектыўныя звароты. Пасьля адкату Зянона Пазьняка за “франт’еру” мэнэджэрам ідэалягічнага капіталу Быкава робіцца Дубавец. Прынамсі, так выглядала збоку актыўнасьць з нобэлеўкай. З гэтага часу паўстае новы Быкаў, нашанівец ды экзыстэнцыяліст, выгнаньнік, канвэртабэльны аўтар эўрапейскага фармату. Сапраўды, аповесьці Быкава глядзеліся “акуратнымі эўрапейскімі раманамі” ў кантэксьце заходняга літпрацэсу, дзе слова “раман” даўно ўжо зь літаратуразнаўчага зрабілася паліграфічным тэрмінам. Позьні Быкаў — ляканізм і мэтафорыка прыпавесьці. З гэтым Быкавам сучасныя літаратары любілі мерацца ў актуальнасьці, цешачыся, як дзеці, што і ў іх так палучаецца. Сапраўды, сярэдняму беларускаму літаратару мэтафарычнасьці не пазычаць.
Сьмерць пісьменьніка скаланула грамадзтва. Пахавальная працэсія ператварылася ў стыхійную дэманстрацыю. Нават форумы Байнэту, досыць індыфэрэнтныя звычайна да літаратурнай тэматыкі, адлюстравалі гэтую неабыякавасьць. Скончылася эпоха. Мы ўглядаемся ў новыя групавыя здымкі беларускай эліты, але сучаснікі пасьпелі неяк скурчыцца ў засені вялікіх імёнаў. Ці, можа, мы страцілі здатнасьць пазнаваць караля. Кароль памёр?

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/09/28**
[image]

Андрэй Казвіч

Тры метады палітычнае тэрапіі

Кнігі, якія абмяркоўваюцца ў артыкуле:
Владимир Матикевич. *Нашествие.* Москва: Яуза, 2003.
Евгений Огурцов. *Тот самый Климов.* Санкт Петербург: Невский простор, 2003.
Василий Леонов. *Работа над ошибками.* Смоленск: Скиф, 2003.

Тры гэтыя розныя і нават цяжка параўнальныя кнігі, тым не менш, маюць нешта супольнае — яны пра палітыку. Палітычная сутнасць кожнага выдання можа быць апісана ў тэрмінах псіхатэрапіі: “Нашествие” — гэта сукупнасць працэдураў нейралінгвістычнага праграмавання (НЛП) з дакладна вызначанымі палітычнымі інтэнцыямі. Кніга пра Клімава — тыповы прыклад псіхааналітычнага расповеду, які, натуральна, не мае ніякае пэўнае інтэнцыі, акрамя эмацыйнае разгрузкі. Кніга Лявонава ў гэтым сэнсе — прадукт больш складаны. Яе псіхатэрапеўтычны аналаг — вольны расповед, які, апроч іншага, дазваляе выявіць лагічнасць выказванняў, здольнасць да аналізу і самааналізу. Такім чынам, паклаўшы

палітычныя аб’екты на дошку псіхалогіі, мы можам пачаць аналіз, прыгадаўшы першапачатковы сэнс гэтага лацінскага слова — разразанне.

Кніга пра “Нашествие”
Найбольш паранаідальная фантазія амерыканца, які жыве ў ідылічным мястэчку Каліфорніі — раі для спажыўца, ёсць у тым, што ён раптоўна пачынае падазраваць, нібыта свет, у якім ён жыве, з’яўляецца спектаклем, што разыгрываецца перад ім з тым, каб упэўніць яго ў рэальнасці гэтага свету, а людзі, якія яго атачаюць, на самай справе акторы, занятыя ў велізарным шоў.
Гэтая цытата з вядомага тэксту (*Сардэчна запрашаем у пустыню рэальнага*) славенскага філосафа Славоя Жыжка прыводзіцца тут, каб патлумачыць, якія адчуванні, па інтэнцыі стваральнікаў, павінна выклікаць кніга “Нашествие” ў паспалітага чытача. Пасля гэтае кнігі палітычны свет павінен стаць іншым, а рэальнасць — брутальнаю. Сутнасць улады аказваецца простаю да фізіялагічнасці. Змест ідэяў (не мае значэнне, як да іх ставіцца) — пылам. Дзяржаўныя інстытуты пазбаўляюцца сваёй сімвалічнае абалонкі і нават легітымнасці. Усё, што раней лічылася дзяржаваю, уладаю, аўтарытэтам, аказваецца толькі кволаю надбудоваю над прыхаваным базісам. Гэты базіс нават не ў жывёльнай волі-да-ўлады аднаго чалавека, што прынамсі яшчэ можа мець арэол містычнасці. Базіс — звычайнае банальнае жаданне грошай і асалодаў. Самы нанкамфармісцкі рэжым Еўропы аказваецца самым канс’юмерысцкім.
Відавочная мэта кнігі — зруйнаваць звыклыя сімвалічныя коды, якія выкарыстоўвае ўлада ў паўсядзённых практыках. Робіцца гэта праз забаўляльны стыль, брутальныя сцэны ды сімуляваную дакументальнасць і праўдзівасць. Нават калі, прачытаўшы гэтую кнігу, вы не паверыце ніводнаму слову, непрыемны асадак у стаўленні да ўлады ўсё адно застанецца.

Калі казаць шчыра, то гэта не столькі кніга, колькі палітычная тэхналогія. Тэхналогія не мае ніякае цікавасці да таго, *што* яна апісвае. Галоўнае, *як* гэта будзе ўздзейнічаць і з якой эфектыўнасцю. Менавіта зыходзячы з гэтага трэба аналізаваць тую мадэль палітычнае рэальнасці, якую фармулюе тэкставая

прастора “Нашествия”, яе мову, фабулу, кампазіцыю падзеяў і г.д. Пытанне аб “праўдзівасці” гэтага тэксту ў вызначаных каардынатах проста некарэктнае і не мае ніякага сэнсу.
Нешта такое даўно чакалі. “Патаемныя спрыжыны беларускае палітыкі” зрабілі рух назад. Самае цікавае, што кніга сапраўды мае пэўны поспех, яе чытаюць значна больш шырокія колы, чым падавалася напачатку. Жаданне ведаць што-небудзь “паніжанае” пра ўладу вельмі доўга не спаталялася, і гэты вакуум пачынае паступова запаўняцца. Цяпер падаецца нават дзіўным, чаму такія кнігі не з’яўляліся раней, а ўся аргументацыя супраць рэжыму базавалася на рацыянальных разважаннях.
Асобна трэба зазначыць тое, што “Нашествие” як палітычная тэхналогія стала магчымая ў Беларусі шмат у чым дзякуючы Інтэрнету, які з’яўляецца галоўным сродкам распаўсюджвання гэтага выдання.
Жанр. Кніга ідэнтыфікуе сябе як дакументальна-мастацкая. Яе мова простая, кампазіцыя нагадвае танны дэтэктыў. Падзеі ў кнізе разгортваюцца не храналагічна, адбываюцца пераскокі ад сучаснага да мінулага, ад падзеяў 1996 году да кампаніі 1994-га і г.д. Большасць фактаў, натуральна, раней ужо праходзілі праз беларускія СМІ. Кніга не мае нават намёку на аналіз. Яе рэальнасць павінна быць брутальнаю, і яна сапраўды брутальная. Калі нехта будзе шукаць тут інфармацыю пра беларускі рэжым (у палітычным сэнсе), то знойдзе няшмат. У лепшым выпадку ён будзе змушаны задаволіцца чарговай “крымінальнай хронікай”.
Асноваю, фундаментам палітычнае стратэгіі кнігі з’яўляецца адлюстраванне палітычнай фізіялагічнасці рэжыму. Улада цалкам пазбаўляецца палітычных поглядаў, матываў, жаданняў і памкненняў. Яна ёсць фізіялагічна чыстаю, цалкам нізкапрагматычнаю і, як ні парадаксальна гэта гучыць, зусім абыякаваю да *палітыкі*. Усе памкненні персанажаў кнігі зводзяцца да атрымання “бабла”, піцця гарэлкі і гетэрасэксуальных (дзякуй богу, што без вычварэнняў)[1] палавых адносінаў. Вобраз улады вельмі просты ад самага пачатку: “жратва”, “бухло”, “расслабон” і “неконкретный базар”. Ніякага жадання працаваць, ніякіх “высокіх” ідэяў, ёсць толькі адно жаданне — жаданне грошай, што больш не хаваецца за палітычнай рыторыкай. Эмоцыі персанажаў

прымітыўныя і кожнаму зразумелыя. Улада ў гэтай краіне ёсць бізнесам, і гэта, паводле задумкі аўтараў, павінна дэмістыфікаваць яе пабудаваную на падмане легітымнасць.

Перад тым як пачаць разгортваць тую мадэль палітычнае рэальнасці, якую паказвае “Нашествие”, неабходна зрабіць яшчэ невялікую заўвагу. Змест кнігі ў цэлым прыхільны і нават падкрэслена паважлівы да КДБ. Вокладка нават мае легітымуючы надпіс: “Некалькі гадоў следчыя КДБ патаемна збіралі матэрыялы пра жыццё і дзейнасць першага прэзідэнта”. Уладзімір Мацкевіч, які доўгі час узначальваў КДБ, малюецца як выключна станоўчы персанаж (сярод іншых станоўчых — Бажэлка, Віннікава, Карпенка, Ганчар…). Мацкевіч “честного чекиста из себя корчил”, улада яму не давярала. Фраза старшыні КДБ пра тое, што “камітэт будзе кіравацца толькі літарай закону”, нібыта вельмі не спадабалася Лукашэнку, што, улічваючы этас кнігі, павінна надаваць Мацкевічу “станоўчыя” чалавечыя адценні.
А цяпер пра змест гэтае кнігі.
Прэзідэнт. Значнае месца ў кнізе займае стварэнне адмысловага іміджу Лукашэнкі. Гэты негатыўны імідж тыповы і нават банальны ды цалкам адпавядае звычайнай стратэгіі выяўлення ненармальнасці (з стандартным наборам сімптомаў і комплексаў) у кнігах такога жанру. Тут можна вылучыць два блокі негатыўнасці. Па-першае, псіхічныя адхіленні. Па-другое, нізкія маральныя якасці. Ёсць такое меркаванне, што, калі ўважліва шукаць, дык у кожнага сучаснага чалавека можна знайсці лёгкую ступень шызафрэніі ці, прынамсі, маніякальна-дэпрэсіўны сіндром. Калі прыцягнуць да гэтае мэты псіхааналіз, заўсёды можна знайсці якое-небудзь вычварэнне, комплекс непаўнавартасці і г. д. Таму сродкаў абгрунтавана даказваць, што прэзідэнт “псіх”, больш чым дастаткова.
У кнізе галоўнае месца займае медыцынская легітымацыя такіх сцверджанняў. У выніку абследавання лекары вызначылі дыягназ персанажа Лукашэнкі: мазаічная псіхапатыя, прыступы эпілепсіі, садысцкія схільнасці, “ва ўсіх бачыць ворагаў”. “Мы, лекары, лічым, што такія людзі складаюць групу рызыкі, з іх вырастаюць маньякі”, не дай божа каб ён узначаліў краіну. Паводле легенды, якую прапаноўвае кніга, гісторыя хваробы персанажа А. Лукашэнкі была знішчана неўзабаве пасля

выбараў 1994 году. Медыцынскі дыягназ пацвярджаецца вялікаю колькасцю сімптомаў, якія шчыльна раскіданы па ўсёй кнізе. Пастаянныя прыступы бяссоння, неспакойны сон і прыступы страху, які здымае каханка з дапамогаю “калёсаў” і “іглы”[2]. Спробы самагубства ў нецвярозым стане: п’е — і “крышу зносіць”. Кніга навязліва падводзіць да думкі, што прэзідэнт — маньяк ці, прынамсі, не зусім здаровы чалавек. Асобнае месца займае апісанне паталагічнае нянавісці і злосці. “Самая мая галоўная мара, — кажа персанаж кнігі Лукашэнка персанажу Сівакову, — знішчыць усіх ворагаў, чуць лямант іхных баб... назіраць за іх пакутамі”. Яшчэ працуючы дырэктарам саўгасу, гэты персанаж моцна збіў трактарыста. (Па гэтым факце, дарэчы, сапраўды была ўзбуджана крымінальная справа.) Калі вучыўся ў школе, шпурнуў у настаўніка бульбінаю, за гэта яго нават школьнікі пабілі. Аднавясковец узгадвае, што персанаж Лукашэнка “злым рос, невядома ад чаго, многа шкоды рабіў... катоў душыў”. За збіццём дэпутатаў парламенту ў 1995 годзе персанаж Лукашэнка назірае асабіста (папярэдне параіўшыся з Грыбам і атрымаўшы падтрымку ад Прымакова), яму падабаецца гэта бачыць...

Усе гэта арганічна дапаўняецца тым, што звычайна называюць “нізкімі” (з пункту гледжання паспалітага чалавека) “маральнымі якасцямі”.
Лянота і даносы: “Раней нідзе доўга не працаваў, хутка звальнялі …пісаў паперы на сваіх былых калегаў”. У школе даносіў на сваіх аднакласнікаў, за што яго шматкроць білі. Пазней, калі пачаў працаваць, паталагічна “стучал” куды толькі мог, не маючы на гэта ніякіх прычынаў.
Паталагічная карыслівасць: “Ты глядзі, я думаў, такі паважны, ціхі, сумленны, а ў зэкаў красці праз два дні стаў... Зразумела, мы таксама частуемся, але без крыўды, па-брацку. А гэты...” (Так яго нібыта характарызуюць калегі па працы на “зоне”.) Тут, дарэчы, упершыню ўзнікаюць матывы “беспредела”, які, як сімвалічны кантэкст улады, мы абмяркуем пазней. Падчас публічных выступаў будучы прэзідэнт заяўляе, што не мае маёмасці, але валодае зямельным надзелам. Да таго ж, Кебіч дапамагае яму прыватызаваць дзяржаўны аўтамабіль (напэўна, не зусім законна).

Усё гэта завяршаецца апісаннем неспрыяльнага сацыяльнага кантэксту. Рос Лукашэнка без бацькі, адносіны з жыхарамі вёскі былі дрэнныя — “уся вёска яго ненавідзела”.
Сям’я і сексуальнае жыццё. У прынцыпе, кожную сексуальную гісторыю можна падаць як вычварэнне, а калі сексуальнае гісторыі няма, дык можна распавесці пра імпатэнцыю. Можна яшчэ і пагуляцца з псіхааналізам… Гэты бок вобразу прэзідэнта, трэба адзначыць, больш-менш прыстойны (улічваючы законы жанру, усё магло быць значна горш).
У цэлым гэты блок арыентаваны на эмацыйную рэакцыю чытача-жанчыны. Цэнтральнае месца тут займае сямейная нявернасць, дарэчы, апісаная дастаткова фізіялагічна. Нявернасць нахабная, цынічная і шматразовая. Жонка за гэта нават лічыць будучага прэзідэнта “дурнем”, што павінна чарговы раз адсылаць да псіхічнае паталогіі. Маецца тут і эпізод падману жанчыны паводле стандартнай схемы “абяцаў і кінуў”. Сексуальныя адносіны ў кнізе ўвогуле пазбаўленыя “рамантызму”, нават апошнюю каханку (лекарку) персанажу “падкінуў” Шэйман. Персанаж застаўся задаволены.
На гэтым варта спыніць апісанне персанажа прэзідэнта, але перад тым, як перайсці да апісання палітычнага ландшафту, трэба зрабіць некалькі заўваг. Калі пачынаеш аналізаваць вобраз прэзідэнта ў “Нашествии”, то міжволі ўзгадваеш “альтэрнатыўны” вобраз Леніна ў канцы 80-х — пачатку 90-х. Яшчэ трошкі, і Лукашэнку можна будзе аб’явіць грыбам іншапланетнага паходжання ці генетычным гібрыдам чалавека і дыназаўра.
Пачатак. Пачатак вялікае палітычнае кар’еры Лукашэнкі кніга звязвае з расійскаю інтрыгаю і падманам Кебіча. Прэм’ер у супрацьвагу парламенту хацеў стварыць камісію па барацьбе з карупцыяй і прызначыць яе старшынём лаяльную асобу кшталту Марыніча, але прэм’ер-міністра перайгралі. Старшынём стаў Лукашэнка, і гэта быў ягоны ўдалы пачатак.

Сістэма залежнасці. Кніга шмат увагі надае расійскаму ўплыву на беларускі рэжым. Усё, ад палітыкі да эканомікі новае ўлады, створана для Масквы і праз Маскву. Імперскі цэнтр кантралюе і маніпулюе беларускім палітычным полем. Перад выбарамі 1994 году ў сістэму маніпулявання ўваходзіць фракцыя “Беларусь”, агенты ажыццяўляюць ціск на Шушкевіча і

працуюць з Кебічам, вялікая колькасць былых супрацоўнікаў КДБ “застаюцца нашымі (*у сэнсе лаяльнымі Маскве.* **— Аўт.**) людзьмі”. У 1994 годзе сітуацыя, аднак, выглядае не вельмі стабільнаю. Кебіч не мае папулярнасці (ён — “чалавек учарашняга дня”), Масква вырашае распрацоўваць новую персону для стварэння лаяльнага і падкантрольнага рэжыму — гэта аперацыя атрымала назву “Парасон”. Кебіча “кінулі”. Нягледзячы на абяцанні і дэманстрацыю прыхільнасці, яго лёс ужо вырашаны. На яго месца прызначаны Лукашэнка.
Пазіцыя Лукашэнкі пасля абрання падаецца як сітуацыя яшчэ большае залежнасці. Ад маскоўскага агента ФСБ ён атрымоўвае грошы, парады і адкрытыя загады-рэкамендацыі. Прэзідэнт вымушаны праводзіць узгодненую з Крамлём кадравую палітыку, супрацоўнічаць у гандлі зброяй, кантрабандзе, фінансавых махінацыях. Апісваецца нават не палітычная залежнасць, але фізічная. Новы прэзідэнт атрымоўвае “парады” не ад афіцыйных асобаў Расіі, але ад шараговых агентаў ФСБ. Гэтая акалічнасць павінна сімвалічна пацвердзіць прыніжаны і плебейскі стан новае ўлады. Марыянетачны стан ўлады эмацыйна падкрэсліваецца “крамлёўскімі байкамі” пра тое, як Ельцын, Каржакоў, Саскавец ды Чарнамырдзін усё арганізавалі, навошта ім патрэбная Беларусь і як яе зручней кантраляваць, што можна падсумаваць фразаю Барыса Мікалаевіча: “А вас, Яўгене Максімавічу (*Прымакоў.* **— Аўт.**), я віншую асобна. Будзем лічыць, што Лукашэнка — ваш хроснік”.
Асаблівае месца ў іерархіі залежнасці займае У. Латыпаў, які на працягу ўсяе кнігі выконвае ролю шэрага кардынала рэжыму. Яму прысвечана, акрамя таго, некалькі сентыментальных абзацаў (чаго толькі вартыя яго чуллівыя маскоўскія спатканні з жонкаю). Персанаж Латыпаў — агент уплыву, адказны за сувязі ФСБ з беларускімі ўладамі, адначасова ён цалкам лаяльны да прэзідэнта і выконвае ягоныя “далікатныя” даручэнні. Постаць Латыпава, аднак, некалькі падазроная: дзеці вучацца ў ЗША, жонка стала жыве ў Маскве. Падкрэсліваецца ісламская ідэнтычнасць “другой асобы ў краіне”: “Ён мусульманін і не хавае гэтага”. Ягоны кабінет у Адміністрацыі прэзідэнта сімвалічна мае зялёны колер яго веры. Гэта спалучаецца з пэўнымі рэмінісцэнцыямі побытавага антысемітызму. “Латыпаў чмокнуў Якубовіча… Падышоўшы да машыны, незаўважна сплюнуў. Ён недзе чытаў, што

мусульманін не можа з пархатым сябраваць”.

Латыпаў — уплывовы, ён адзіны, хто пасля 2001 году мае самы блізкі подступ да “бацькі” (усіх астатніх распусцілі), ён кантралюе “вертыкаль”, мае манаполію на перамовы з Масквою, здольны ўсім “залезці ў душу”…
Цяжка сказаць, наколькі вобраз з кнігі адпавядае арыгіналу, але ён зусім не такі, які ў выданнях кшталту “Белорусской газеты”, хоць шэраг станоўчых рысаў прысутнічае нават у гэтай кнізе.
2001… Некалькі старонак кнігі прысвечана выбарам 2001 году. Персанаж Лукашэнка святкуе, добра ведаючы, што не перамог. “Ён перамог з вялікім адрывам, няважна, што нейкія сорак адсоткаў па вёсках падтасавалі, але ён усё роўна перамог тут…” Сцверджанне, трэба сказаць, дастаткова спрэчнае (пасля выбараў узровень фальсіфікацыяў звычайна ацэньвалі ў памеры, не большым за 20—30 %), але агульны “мастацка-дакументальны” вобраз прэзідэнта-вар’ята і злачынцы дапаўняецца вобразам узурпатара, пазбаўленага палітычнае легітымнасці.
Вынікі выбараў змушаюць да пэўных зменаў. Мясніковіча і Ярмошына звальняюць за перамовы з апазіцыяй падчас выбараў. Замяталіна прыбіраюць як “адмарозка”. Да поўнае ўлады прыходзіць Латыпаў, які ўзначальвае Адміністрацыю прэзідэнта. Пасля выбараў Латыпаў паўстае як чалавек, які трошкі стаміўся ад адміністрацыйнае працы і жадае з’ехаць куды-небудзь амбасадарам. Ён згаджаецца працягваць працу толькі пасля пашырэння сваіх паўнамоцтваў. Гэты факт аўтарамі кнігі чамусьці падмацоўваецца спасылкамі на Ўказ прэзідэнта ад 5 ліпеня 2002 году № 361. Гэты Ўказ устанаўляе, што кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта заключае працоўныя кантракты з старшынямі абласных і менскага гарадскога выканкамаў, намеснікамі старшыні Адміністрацыі прэзідэнта, памочнікамі прэзідэнта, галоўным рэдактарам газеты “Советская Белоруссия“, старшынём тэлерадыёкампаніі ды інш. Здаецца, што гэта само па сабе ніяк не можа сведчыць пра ўсясільнасць Латыпава.
З выкладаннем зместу гэтага указу (які з’яўляецца адкрытым дакументам і прысутнічае ў прававых базах звестак) аўтар(ы) кнігі чамусьці маюць праблемы. У кнізе ўказ цытуецца такім

чынам: старшыня КДБ заключае працоўныя кантракты з “намеснікамі старшыні Камітэту дзяржаўнае бяспекі, а таксама намеснікам старшыні Камітэту дзяржаўнага кантролю — дырэктарам дэпартаменту фінансавых расследаванняў”. Гэта не адпавядае праўдзе. Пра КДБ ва ўказе няма ні слова. Акрамя таго, з дырэктарам Дэпартаменту фінансавых расследаванняў кантракт заключае, натуральна, старшыня Камітэту дзяржаўнага кантролю. Трэба сказаць, што прынцыповая розніца паміж КДК і КДБ усё ж такі ёсць.
Але вернемся да персанажа Латыпава. Думка пра яго ключавую ролю ў існым рэжыме падмацоўваецца сцверджаннямі пра створаную ім “разумную” сістэму кантролю за ўсім. Сетка інфарматараў у кожным шапіку, даніна з прастытутак (у тым ліку, напэўна, і інфармацыйная), кантроль над крымінальным “абшчаком”, бізнес-праекты ў маштабах краіны, стварэнне (з словаў персанажа Якубовіча) бізнес-дыяспары з каўказцаў. Шырокае кола сродкаў масавае інфармацыі дапамагае стварыць яму імідж “партыі міру” рэжыму. Ён мае сваіх людзей усюды: КДБ, КДК, МУС, Рада Бяспекі, банкі, апазіцыя (у кніге прыведзена некалькі прозвішчаў).

Гандаль зброяй. Гандаль зброяй, як легальны, так і нелегальны, з’яўляецца даўняй тэмаю нападак на беларускі рэжым. Такая кніга, як “Нашествие”, не магла прайсці міма яе. Дыспазіцыя нелегальнага гандлю простая. У ім зацікаўлены: беларуская адміністрацыя (гэта дае вялікія прыбыткі, значная колькасць якіх ідзе не ў бюджэт), Масква, якая не можа прадаваць зброю адкрыта, і міжнародныя крымінальныя групы. Беларусь — выдатная для такога гандлю магчымасць: яна, як сцвярджаецца ў кнізе, кантралюецца карумпаваным, напаўкрымінальным кланам. Тут “все схвачено”: і прэм’ер-міністр, і кіраўнік адміністрацыі, і мытня, і, галоўнае, сам прэзідэнт.
Беларускі рэжым абвінавачваецца ў кнізе ва ўсіх магчымых парушэннях як нормаў права, так і маралі. Беларусь прадае сваю і расійскую зброю талібам, “Аль-Каідзе” (гэта павінна дадаць негатыўнасці[3]) і іншым тэрарыстычным арганізацыям, паўстанцам у Анголе, Судане, Эфіопіі, Іраку. Лёгкае ўзбраенне паступае сербам і нават албанцам у Македоніі (і гэта пры такіх цёплых адносінах з братамі-славянамі…). Схемы продажу: Славаччына—Францыя—Афрыка, Беларусь—Конга—Судан—

Кенія—Філіпіны—талібы і г. д. Беларусь тут — афшор, накапіцель і пасрэднік[4]. Зброя прадаецца за нафту і алмазы (для перапрацоўкі алмазаў, як пішацца ў кнізе, была створана адмысловая вытворчая база ў Гомелі). Існуе разгалінаваная сістэма легалізацыі атрыманага прыбытку праз сетку фінансавых кампаніяў і афшоры (падаюцца назвы некаторых фірмаў). Зброя прадаецца замест прадукцыі беларускіх прадпрыемстваў, каб абысці санкцыі ААН. Для большае праўдзівасці ў кнізе нават змешчаны бланк Упраўлення вайсковае контрвыведкі КДБ Беларусі, пад якім даецца інфармацыя пра незаконны гандаль.

Улада злачынцаў. У спецыяльных палітычных даследаваннях для апісання пэўных дзяржаўных супольнасцяў выкарыстоўваецца панятак (мне асабіста вядомы з “African Studies”) “лутакратыя” — улада злачынцаў, крыміналітэту (ад анг. loot — рабаваць). Змест, стыль і мова кнігі спрабуюць пераканаць, што ў Беларусі існуе менавіта такая форма ўлады, прычым у яе татальным варыянце.

Сутнасць рэжыму — рабаванне. Гэта сцвярджаецца сістэматычным паўтарэннем персанажам прэзідэнтам і яго атачэннем маналогаў кшталту: “Зразумей ты: у нашых з табою руках не Беларусь, а грамадства з неабмежаванымі магчымасцямі. Заробім і кіраваць будзем. Высмакчам усё адсюль…Толькі думай, думай. Тады свет здрыганецца. Мы зробім дзяржаву. Для саміх сябе…” Такім чынам, асноўная інтэнцыя новае ўлады — уласнае ўзбагачэнне за кошт краіны, цынічнае і татальнае. Такі вобраз улады падмацоўваецца меркаваннямі расійскіх алігархаў пра Беларусь і прыроду яе рэжыму: “Трэба даць ім (*беларускім уладам.* **—** Аўт.) пакарміцца”, “цэлая краіна ў кішэні”, “кантралююць эканоміку, мытні, транзіт”. Гэта дапаўняецца ацэнкамі асобных прадстаўнікоў беларускіх уладаў кшталту: “Крадуць без сумлення”. Яшчэ больш красамоўна выглядае тэза крымінальнага аўтарытэта Гайдамака: “Там (*у Беларусі.* — **Аўт.**) на самым версе клоўн прыйшоў да ўлады як барацьбіт з карупцыяй, а цяпер “бярэ ўсё спрэс”. Інтарэсы крымінальнага бізнесу — галоўны прыярытэт, нават калі яны сур’ёзна пагражаюць эканамічнай стабільнасці. Не маюць значэння этычныя і тым больш юрыдычныя нормы. Беларускія ўлады нібыта займаюцца гандлем і вырабам наркотыкаў, ствараюць

рэкрэацыйныя зоны для чачэнскіх бандытаў, хаваюць міжнародных злачынцаў.

Для большага эмацыйнага эфекту Лукашэнка і Сініцын пасля выбараў 1994 году называюцца “бізнесменамі-пачаткоўцамі”. Улада займаецца практычна толькі “бізнесам”. Дзяржаўная палітыка — толькі прыкрыццё крымінальнае дзейнасці. Напрыклад, персанаж Замяталін доўгі час займае дзяржаўную пасаду, але фактычна толькі вядзе гандаль з Іракам. Прынцыпы лутакратыі распаўсюджваюцца і на кадравую палітыку. Поспех у незаконнай дзейнасці цягне за сабою прызначэнні на вышэйшыя дзяржаўныя пасады. На той падставе, што, “маўляў, пацан добры, праверaны”. Такія формулы праходзяць праз усю кнігу. Да прыкладу, калі персанаж Лукашэнка даведваецца, што персанаж Навумаў займаеца крыміналам, ён вырашае: “Гэты падыходзіць”. Кадравую палітыку, такім чынам, ён праводзіць як звычайны “блатны”. Стыль размоваў і развагаў, якія кніга ўкладае ў вусны і галовы дзяржаўных чыноўнікаў і самога прэзідэнта, нагадвае “базар браткоў” і ў лексіцы, і ў змесце. Улада ў кнізе з’яўляецца крымінальнай не толькі паводле характару сваёй дзейнасці, але і на ментальным узроўні, субкультурна. Кіраўніцтва крымінальным бізнесам персанаж прэзідэнта ажыццяўляе асабіста, да таго ж вельмі своекарысліва. Ён асабіста атрымоўвае грошы ад аперацыяў, уважліва сочыць за тым, каб яго не “кінулі”, і настойліва патрабуе сваёй долі. Прэзідэнт асабіста кантралюе свой “бізнес”, сам удзельнічае ў “разборках” — і гэта галоўная мэта ягонае палітычнае дзейнасці. “Не лезь, я сам разбяруся”. Персанаж Лукашэнка асабіста загадвае заткнуць рот супрацоўніку міністэрства культуры Грачову ў эпізодзе пра крымінальную дзейнасць персанажа Таццяны Бандарчук. Ніякае ідэйнае ці нават ідэалагічнае матывацыі не прасочваецца.
Сутнасны і субкультурны характар беларускае паўкрымінальнае ўлады дапаўняецца яшчэ і юрыдычным аспектам. У тэксце кнігі ўзгадваецца нейкая “незалежная група экспертаў-крыміналістаў”, паводле матэрыялаў якой “будзе ўзбуджана крымінальная справа”. Тут вышэйшыя асобы дзяржавы адкрыта называюцца “арганізаванаю злачыннаю групаю”, структуру якой складаюць крымінальныя ценявыя

структуры, Рада Бяспекі, Адміністрацыя прэзідэнта і г. д. Крымінальная сутнасць улады паслядоўна пераходзіць у кнізе на інстытуцыйны ўзровень стварэння паўкрымінальных і крымінальных структураў пад прыкрыццём дзяржаўнага апарату. Такой структурай на пачатку кіравання персанажа Лукашэнкі робіцца Рада Бяспекі, якая непасрэдна плануе і аналізуе эфектыўнасць злачыннае дзейнасці, утвараючы нешта кшталту “апаратыўнага штабу” арганізаванае злачыннае групы. Вялікае значэнне мае падкантрольная мытня як ключавая структура ў схемах кантрабанды. Прыкрыццё крымінальнае дзейнасці ажыццяўляе “Альфа”. Вядзецца падбор кадраў для спецыялізаванае злачыннае дзейнасці (стварэнне “эскадрону смерці”).
Але гэтым дыскурс кнігі не абмяжоўваецца. Улада не проста крымінальная, але паталагічная. Гэта сітуацыя крымінальнай аноміі — “беспредела”, парушэння нават незаконных нормаў. Дакладней, поўная адсутнасць любых нормаў. “Беспредел” — гэта самая чыстая форма сацыяльнага хаосу, нестабільнасць ужо без таго нестабільнай сітуацыі. Улада цалкам незалежная ад юрыдычных, маральных і якіх заўгодна іншых нормаў. Адначасова яна вольная ствараць гэтыя нормы. Карупцыя і парушэнне закону з’яўляюцца атрыбутам і ўласцівасцю ўлады, яе матэрыяльным працягам; руйнаванне ўсіх існых нормаў — неабходнай умоваю існавання.

Кантрабанда і фінансавыя аперацыі. Галоўная крыніца даходаў рэжыму, абмаляванага ў “Нашествии”, у сярэдзіне 90-х — кантрабанда, незаконны гандаль і фінансавыя махінацыі. Паступова назіраецца тэндэнцыя пераходу на больш “цяжкі” тавар — наркотыкі і зброю. Адбудоўваецца сістэма дзяржаўнага кантролю над такой дзейнасцю (на першапачатковым этапе існуюць праблемы ў дачыненнях з МУС, мытняй ды іншымі органамі; але паступова сістэма дапрацоўваецца і ставіцца пад кантроль, працуе без збояў): ахова, канваяванне, вокны на мытні, авіярэйсы, падробка дакументаў. Менавіта жаданне больш эфектыўна займацца “бізнесам” з’явілася галоўнаю прычынаю змены дзяржаўнага ладу і Канстытуцыі. “Крышай” кантрабанднае дзейнасці становіцца Рада Бяспекі.
Спачатку прадмет кантрабанды — цыгарэты, гарэлка,

патрыманыя аўтамабілі; з гэтым звязаны вядомы скандал першых гадоў прэзідэнцтва Лукашэнкі наконт дзейнасці Фонду імя Эсамбаева. Затым асноўны цяжар прыпадае на фірму “Гандальэкспа” і Кіраўніцтва справаў прэзідэнта, пачынаецца актыўнае супрацоўніцтва з Барадзіным. Пазней, у адпаведнасці з матэрыяламі кнігі, наладжваюцца кантакты з Беразоўскім, маскоўскай мэрыяй і Лужковым, Мілошавічам, Марчуком (тагачасным сакратаром Рады Бяспекі Ўкраіны).
Надыходзіць час буйных фінансавых афераў. Спачатку дастаткова падрабязна апісваецца схема махінацыі з юбілейнымі манетамі, якая нанесла краіне шкоду ў памеры 50 млн даляраў. Потым — аперацыя з расійскім алігархам Беразоўскім (шкода ў 2 млрд даляраў). Чамусьці пры апісанні апошняе схемы ў тэксце пастаянна ідзе гаворка пра наяўныя грошы: “Станок працуе на ўсю моц” і г. д. Натуральна, у рэальнасці такая фінансавая аперацыя проста тэхнічна не магла быць рэалізавана праз наяўны разлік. Але, магчыма, гэта толькі мастацкая метафара. Прысутнічае згадка (у развагах Віннікавай) пра тое, што такія фінансавыя аперацыі з’яўляюцца традыцыйнымі схемамі зарабляння грошай для наркабізнесоўцаў. Незразумела, пры чым тут наркабізнес. Ці, можа, гэта зноў нейкая цьмяная метафара?
Найбольш аўтараў кнігі вабіць гандаль наркотыкамі. Калі ім верыць, Беларусь дае шырокі спектр паслугаў для наркабізнесу: мытныя калідоры, транспартаванне, забеспячэнне сувязі. Югаслаўскія кур’еры, чачэнскія групоўкі, буйныя памеры… Трафік ідзе “рэальна”. Больш за тое, у Беларусі паступова прыходзяць да вытворчасці наркатычных рэчаў на продаж.
Эскадрон смерці. Тэма мела шырокі прамоўшн падчас выбарчае кампаніі 2001 году ад шматтыражных спецыяльных і звычайных выпускаў газетаў да тупаватае кампаніі спісвання сценаў надпісамі “Где Завадский, где Гончар?”. (Рудыменты гэтае хвалі можна назіраць у перыядычных акцыях АГП “Ланцуг неабыякавых людзей”.) Здаецца, цяпер дачыненне пэўных афіцыйных асобаў да забойства палітыкаў, прадпрымальнікаў і крымінальных аўтарытэтаў практычна ні ў кога не выклікае сумневу (для аўтараў усіх трох кнігаў, якія аналізуюцца тут, гэта, прынамсі, бясспрэчны факт). “Нашествие”, натуральна, прысвячае гэтай тэме ладную колькасць старонак, хаця яго версія нямоцна адрозніваецца ад газетных.

У галоўнай спрэчцы пра тое, “ведаў прэзідэнт пра дзейнасць групы ці не”, кніга без ваганняў выбірае першую версію. Група, чалавек з дзесяць, якую потым назавуць “Эскадронам смерці”, паводле кнігі, была створана на загад Лукашэнкі з “здольных” (прафесіяналаў) і “надзейных” (адмарозкаў), здатных да рознае далікатнае працы. Прэзідэнт асабіста дае каманду: “Рабіце”. Калі перад групай паўстаюць праблемы (арышт кіраўніка групы Паўлічэнкі), персанаж Лукашэнка асабіста вызваляе яго. “Эскадрон” у “Нашествии” за сваю дзейнасць знішчыў некалькі дзесяткаў чалавек. У тым ліку крэдытора сына Замяталіна, крымінальных аўтарытэтаў Шчаўліка і Зільбермана. Факты забойстваў падмацаваны нават вынікамі нейкага “незалежнага расследавання, якое было праведзена супрацоўнікамі МУС”. Нягледзячы на абсурдную фармулёўку, для паспалітага чытача ўсё гэта павінна выглядаць нечым падобным да праўды. Пазней настаў час палітыкаў. Карпенка быў атручаны “журналісткай”. Ганчар, Красоўскі, Захаранка, Завадскі забітыя. Тут у кнізе, дарэчы, ёсць адзін эпізод, варты асобнае дэканструкцыі. Персанаж Сівакоў сядзіць у машыне і слухае класічную музыку (Бетховена). Ён адчувае асалоду, думаючы пра тое, як забівалі людзей у ягонай прысутнасці. Гэта проста класічны шаблон амерыканскага кіно: “маньяк слухае класічную музыку”. У трылерах такі факт звычайна падкрэслівае асаблівасць і вытанчанасць маньяка. А заснуў персанаж Сівакоў пасля гэтага з усмешкаю.
Нядрэнныя людзі. У гэтай кампаніі зладзеяў ёсць пара адносна станоўчых персанажаў — генпракурор Бажэлка і старшыня КДБ Мацкевіч. Яны рабілі ўсё магчымае, каб арыштаваць Паўлічэнку, і нават ставілі пытанне пра арышт Шэймана й Сівакова, але іх намаганні былі марнымі, бо “крыша” ўсіх трох — сам персанаж прэзідэнт.
На гэтым расповед пра “Нашествие” варта скончыць (хаця размову пра палітыку ў стылі фэнтэзі можна весці бясконца): “Мрак обступил его со всех сторон. Успокойся, успокойся. У тебя всё в полном порядке”. Самы час перайсці ад НЛП да псіхааналізу.

Кніга пра Клімава
Першае пытанне, якое паўстае пры чытанні кнігі пра Клімава, — чаму б яму самому не напісаць нармальную кнігу пра

ўласны палітычны досвед? Можна прыгадаць, напэўна, з паўдзесятка кніг пра палітыкаў, у якіх практычна нічога няма сутнасна палітычнага. Яшчэ больш дзівіць імкненне такіх асобаў да канцэптуальнасці ці маралізацыі. Няўжо цяжка зразумець: “інтэлектуальныя” кнігі пішуцца зусім іншай моваю і для іншай аўдыторыі. (Нібыта яны не адчуваюць, што палітычны досвед — гэта іх самы вялікі інфармацыйны капітал, якога так не хапае ў вольным звароце?)
Кніга-інтэрв’ю пра Клімава — тыповы прыклад такога кшталту. Фрагменты палітычнага досведу тут моцна разбаўлены пераважна абстрактнымі і нават метафізічнымі разважаннямі. Гэта такі сабе пратакол псіхааналітычнага сеансу, дзе сэнсы, пазіцыі і тэмы моцна зблытаны і фрагментаваны. У якасці аналітыка тут выступае журналіст Яўген Агурцоў, з адказаў на пытанні якога і складаецца кніга[5]. Тут значна больш матэрыялу для даследавання свядомасці, чым палітыкі, але нас цікавіць і апошняе, тым больш што тэкст, здаецца, шчыры і практычна непрычасаны.
Аналізуючы тэкст кнігі, я дазволю сабе выкарыстанне трошкі некарэктнага метаду. Я пакіну па-за дужкамі пытанні і буду аналізаваць толькі адказы, бо пераважна яны ўтрымліваюць інфармацыю, цікавую для нас.
Метад. Зазначым пэўныя тэндэнцыі ў выкладанні думак Клімавым.
Па-першае, варта адзначыць вялікую ролю абстрактных меркаванняў і метафізічных разважанняў пра інтэлект, розум, уладу і г. д. Да таго ж, гэта спалучаецца з высокаю ступенню несістэмнасці ў выкладанні думак. Такія разважанні не маюць канцэптуальнага грунту і пабудаваны пераважна на “здаровым сэнсе”, але з нейкаю прэтэнзіяй на інтэлектуальнасць.
Па-другое, адказы Клімава ўтрымліваюць вялікую колькасць паўтораў, супярэчлівых выказванняў і ацэнак. Часам адсутнічае логіка выкладання, незразумелыя пэўныя пераскокі з тэмы на тэму, што, магчыма, нармальная з’ява для інтэрв’ю.
Па-трэцяе, здаецца, практычна ўсе ацэнкі падзеяў ці асобаў пабудаваны альбо на стэрэатыпах (іх, трэба адзначыць, нямнога), альбо на выключна суб’ектыўных, інтуітыўных адчуваннях, практычна пазбаўленых аналітычнасці.
Усё адзначанае робіць тэкст малаінфарматыўным для даследчыка палітычнага поля, але цалкам прыдатным для

рэканструкцыі палітычнага мыслення пэўных прадстаўнікоў беларускае палітыкі. Такое мысленне пабудаванае на дыхатаміі дзвюх стратэгіяў ацэнкі. Першае — ацэнка *іншых* (палітыкаў, партыяў, груповак) як абстрактных сімвалаў, замацаваных у масавай свядомасці. Другое — фармуляванне свайго стаўлення да астатніх толькі праз уласны досвед адносінаў з імі, угрунтаваны больш на эмацыйным, чым рацыянальным узаемадзеянні.

Асоба. Асоба Клімава (яе “афекты” ў тым сэнсе, як яны разумеліся ў філасофіі Новага часу) з’яўляецца галоўнай тэмаю інтэрв’ю-кнігі. Часам тут нават праскокваюць прыкметы маніі велічы: Клімаву падабаецца ўласнае параўнанне з Напалеонам, Лукашэнкам, пошук паралеляў у біяграфіі, рысах характару і светапоглядзе.
Матыў прыходу Клімава ў палітыку — не грошы, не слава, не ўлада, а звычайная нуда. Стаўленне да страты маёмасці, сацыяльнага становішча пасля арышту і “адседкі” падкрэслена спакойнае, бо метафізічныя каштоўнасці — розум, інтэлект, свабода — даражэйшыя.
Лукашэнка. Лукашэнка ў палітычнай рэфлексіі Клімава займае асаблівае месца, якое таксама выразна супярэчыць “дэманічнаму” вобразу, намаляванаму ў “Нашествии”. Размова пра Лукашэнку вядзецца без нянавісці ці крыўды, агіды альбо непрымання. Лукашэнка ўвогуле “нядрэнны” і, натуральна, не такі страшны, якім яго малююць. Для Клімава Лукашэнка выступае як слабы палітык, не здольны цалкам кантраляваць сітуацыю ды ўласных падначаленых. “Беларускі прэзідэнт не тыран”, але “проста слабак”. Лукашэнка ёсць габітус, дэтэрмінаваны сацыяльна і псіхалагічна, ён слабы ў тым, што канфармуе пад існую сістэму і ўсімі намаганнямі збіраецца яе захаваць з дзвюх прычынаў: кампенсацыі ўласнае прагі да ўлады і страху пераменаў. Тую сістэму, што ён стварыў, можна лічыць заганнаю, але не кіраванаю з аднаго персаніфікаванага цэнтру. У тэксце хапае заўваг пра рабоў, крывадушнікаў, мутантаў і іншых персанажаў, якія канструююць этас існага рэжыму. Але гэты “этас” — прынамсі, у мяне складваецца такое ўражанне — для Клімава безасабовы, абстрактны і аморфны, што і забяспечвае, па сутнасці, умовы для яго існавання.
У адпаведнасці з гэтым, прэзідэнт не мае дачынення да

палітычных забойстваў, хоць далучанасць да гэтага найбліжэйшага атачэння (Шэймана і іншых) не ставіцца Клімавым пад сумнеў і падаецца як агульнавядомы і бясспрэчны факт.
Яшчэ больш шчырым выглядае параўнанне біяграфіі, псіхічнага складу Клімава і Лукашэнкі. Яны “ідуць паралельнымі дарогамі і вельмі падобныя адзін да другога”. Яны ніколі не даруюць крыўды, змаглі дабіцца поспеху, гадаваліся без бацькі, добра вучыліся… Клімава выяўленне такое сіметрыі не абражае (здаецца, нават спакушае). “Так, мы падобныя”, — кажа ён і не можа бачыць у гэтым нешта дрэннае. Але Лукашэнка з’яўляецца для Клімава абстрактнаю асобай — чалавекам-сімвалам, які сфармаваны грамадскаю думкаю, уласным палітычным досведам і сродкамі масавае інфармацыі.
Інтэлект. Інтэлект, як абстрактная катэгорыя, з’яўляецца цэнтральным паняткам у рэфлексіўнай сістэме Клімава. Дакладны змест гэтай катэгорыі зразумець цяжка, дакладней, іх шмат. Тут варта было б пагуляцца з рознымі шызафрэнічнымі практыкамі прачытання ці проста напісаць некалькі старонак крытыкі навачаснае рацыянальнасці, але рабіць гэта марна: рэдактары часопісу напэўна гэтыя пасажы выражуць. Лепей пакінуць “інтэлект” нераскрытай містычнай метафарай кнігі.
Цэнтр — перыферыя. Асобную ўвагу варта надаць нязвыкла прапісанай у кнізе апазіцыі “цэнтр — перыферыя”, “Менск — правінцыя”. Менск паказваецца пэўным самадастатковым топасам, мозгам краіны, які паступова губляе свае найбольш карысныя ўласцівасці праз актыўнае прыняцце ў сябе элементаў перыферыі. У 1994 годзе ў Менск прыйшоў райцэнтр, уласна кажучы, “барбары ўвайшлі ў Рым”. Менавіта калхоз акупаваў горад і знішчае яго шляхетную сутнасць. Тут Клімаў, трэба сказаць, крыху адрознівае паняткі “вёска” і “калхоз”. Сталіцу ўвогуле лепей перанесці ў Шклоў, ад гэтага выйграюць абодва гарады, эканамічна і культурна.
Нават Лукашэнка, паводле Клімава, і той — стварэнне стомленага нудою і млявасцю Менску. Менск — месца канцэнтрацыі нейкае містычнае сілы; “менавіта гэты горад даў Сашу *(Лукашэнку.* **— Аўт.***)* сваю сілу, толькі ў Менску ён стаў палітыкам… без яго ён — ніхто”.
Ацэнка крымінагеннасці ўлады ў Клімава значна больш

памяркоўная за тую, якую мы знаходзім у “Нашествии”, але ўзровень карупцыі вызначаецца як высокі. Дзяржаўнае “крышевание” мае месца і з’яўляецца часткаю эканамічнае рэальнасці, але такі стан звязаны не з воляю прэзідэнта. Прэзідэнт слабы, ён нічога не можа змяніць — рэальную ўладу маюць толькі мясцовыя “князькі”.
Асобы. Інтэрв’ю ўтрымлівае асабістыя ацэнкі Клімавым шэрагу публічных асобаў. Ацэнкі гэтыя лаканічныя, шчырыя і, адпаведна, цалкам суб’ектыўныя.
Ціхіня (былы старшыня Канстытуцыйнага суду): баязлівы і слабы чалавек, але не “сволочь”.
Шарэцкі: памылка выбаршчыкаў і дэпутатаў, які не вытрымаў адказнасці і зламаўся.
Шушкевіч — гэта “частка гісторыі”. Клімаў выказвае да яго павагу, але кажа пра гэтага палітыка толькі ў прошлым часе (нават Пазняк падаецца яму не настолькі “прошлым”).

Клімаў выяўляе дастаткова паважлівае стаўленне да “рэальнага” Пазняка першае паловы 90-х, які ўяўляецца яму персаніфікацыяй нацыянальнай ідэі. Ідучы ў рэчышчы агульнай гіпертрафаванай персаналізацыі, Клімаў вызначае Пазняка як асобу, што зрабіла вялікую справу, аб’яднаўшы частку грамадства пад сімваламі нацыянальнай ідэі. Толькі дзякуючы гэтаму Беларусь здолела не ператварыцца ў Туркменістан. Для Клімава Пазняк — манапольны ўладар зброі пад назваю “беларускі нацыяналізм”. Толькі ён адзін ведае (ведаў) генетычны код гэтае зброі, якога так і не расшыфравала ўлада. Як палітык Пазняк мёртвы (“ён мог стаць беларускім Гавалам, але выбраў эміграцыю”), але структуры ды палітычная прастора, якую ён здолеў стварыць, працягваюць захоўваць сваю актыўнасць. Пазняк “выратаваў нас ад асіміляцыі, замарудзіў працэс знікнення Беларусі як дзяржавы, а беларусаў як этнасу”. Персона Пазняка для Клімава выключна “метафізічная” і сімвалічная (прычым дастаткова моцна ўгрунтаваная ў мінулае), тут мы не знойдзем згадак пра чалавечыя дачыненні ды суб’ектыўных ацэнак. Ніякая іншая асоба (акрамя Лукашэнкі) такога вялікага каментару не мае. Далей даецца лаканічная ацэнка ледзьве не паловы складу Палітычнае рады АГП (сябрам якое з’яўляецца і сам Клімаў). Лябедзька — добры партыйны функцыянер. Бацька Лукашэнкі,

яго стваральнік. Адзіны чалавек, якога Лукашэнка не перабіваў пры выступах у Вярхоўным Савеце падчас імпічменту, адзіны чалавек, які можа аказваць псіхалагічнае ўздзеянне на свайго “сябра” Лукашэнку. Чым мацнейшы Лукашэнка, тым ярчэйшая зорка Лябедзькі, але ягонае палітычнае жыццё скончыцца разам з палітычнай кар’ерай Лукашэнкі. Для “мірнага часу” Лябедзька — некарысны матэрыял.

Чыгір — “кореш” па адседцы і моцная асоба, прыклад для астатніх. У трактоўцы Клімава ён адзіны, хто адкрыта выявіў сваю нязгоду з прэзідэнтам падчас канстытуцыйнага крызісу 1996 году.

Багданкевіч — сябар, хоць раней (калі быў старшынём Нацыянальнага банку Беларусі) усяляк спрабаваў зачыніць банк Клімава.

Шлындзікаў — эканамічны настаўнік Клімава. Найлепшы з магчымых прэм’ераў.

Блок “іншых” палітыкаў адкрывае М. Статкевіч — не больш чым “добры партыйны функцыянер”, роля якога — паказваць (ці прадаваць) палітычны тавар сацыял-дэмакратыі, вывезены з Нямеччыны.

В. Лявонаў (былы міністр сельскае гаспадаркі) — “кореш” па адседцы, больш нічога пэўнага Клімаў пра яго не ведае.

А вось вобраз былой старшыні Нацыянальнага банку Віннікавай у Клімава выразна кантрастуе з вобразам, канструяваным “Нашествием”. Адказная, крохкая жанчына, якая прымае “гэтак блізка да сэрца” эканамічны стан краіны, нават калі ёй самой пагражае небяспека, паўстае ў Клімава “прыгожай, разумнай, але сцервай”. Праблема Віннікавай у тым, што яна хацела выкарыстоўваць Лукашэнку ў сваіх мэтах, але “трохі-трохі не дацягнула ды сарвалася”. Персона Віннікавай для Клімава, здаецца, нічым не адрозніваецца ў сваім эмацыйным і палітычным змесце ад Ціцянкова ды Шэймана. У “Нашествии” ж гэтая асоба чамусьці выступае як станоўчы персанаж.

З асабліваю павагаю Клімаў гаворыць пра Ганчара й Карпенку. Ганчар — асабісты сябар і галоўны палітычны настаўнік, ён разам з Карпенкам — тыя людзі, якія маглі зрабіць Беларусь моцнай еўрапейскай дзяржаваю, забяспечыць гарантаванае квітненне краіны.

З апісаннем асобаў аналіз зместу кнігі можна лічыць

вычарпаным. Скончыць яго мне хочацца невялікай цытатаю з найбольш вядомага постфрэйдыста Ж. Лякана:
“Аналітыка (*псіхааналітыка.* **— Аўт.**) параўноўваюць з памыйнаю ямаю — і небеспадстаўна. На самай справе, ён дзень пры дні павінен выслухоўваць прамовы вельмі сумнеўнае вартасці, прычым сумнеўныя не толькі для яго самога, але і для суб’екта, які іх прамаўляе”. Прыкладна на 50 % гэта адпавядае кнізе “пра таго самага Клімава”.
Ад псіхааналізу мы падыходзім да працэдуры вольнага расповеду. Мэта расповеду — акрэсліць (заняць) пазіцыю. Гэты метад выразна адрозніваецца ад НЛП “Нашествия”, мэта якога — змяніць ці прынамсі зблытаць пазіцыі, як і ад псіхааналітычнага сеансу Клімава, дзе пазіцыя павольна выяўляецца з прыцемак.

Кніга пра Лявонава
Беларускі рэжым, які склаўся пасля 1996 году, з’яўляецца складанаю з’яваю і выяўляе сябе ў розных сімвалічных формах. У “Нашествии” існая ўлада — гэта мяжа. Мяжа паміж нармальным і ненармальным, этычным і амаральным ды, нарэшце, паміж дабром і злом. (“Анклаў цемры” павінен быць пабудаваны на абсалютным палітычным ліху.) У кнізе пра Клімава Лукашэнка і ягонае атачэнне — гэта нешта абстрактнае, hexis (габітус), манера трымаць сябе, схільнасць паводзіць сябе ў пэўных абставінах пэўным чынам. Успрыманне рэжыму Лявонавым трошкі іншае, гэта погляд пераважна знутры. Погляд на палітычных актораў як звычайных людзей без дэманізацыі (сакралізацыі) і спробаў сканструяваць з іх пэўныя палітычныя сімвалы.
Кніга Лявонава, у параўнанні з папярэднімі дзвюма, эмацыйна збалансаваная і палітычна карэктная ў сваіх ацэнках. Здаецца, менавіта так выглядаюць кнігі людзей, якія захоўваюць палітычныя амбіцыі, але жадаюць быць стаерамі, а не спрынтэрамі. Тут практычна няма шчырых і нечаканых (тым больш рэзкіх) заўваг і каментароў, якія мы сустракаем у Клімава.
Значным недахопам кнігі з’яўляецца яе неструктураванасць, яна мае толькі дзве часткі, але лагічна кнігу можна падзяліць на пяць-шэсць: падзеі да заняцця пасады міністра, выкананне функцыяў міністра, суд і турма, прэзідэнцкая кампанія 2001

году, уласны палітычны праект.
Кніга ўтрымлівае дастаткова шмат інфармацыі пра генезіс беларускае палітычнае сістэмы з канца 80-х, таму ўяўляе цікавасць проста як эмпірычная крыніца.
Адлік падзеяў кнігі пачынаецца з 1979 году, калі Лявонаў першы раз сустрэўся з Лукашэнкам. Будучы прэзідэнт быў добрым папулістам, але дрэнным кіраўніком. Лявонаў таксама шмат увагі надае апісанню партыйнага жыцця канца 80-х, палітычнай сітуацыі ў СССР у той час. Апісанне выбараў 1989 і 1990 гадоў на Магілёўшчыне фрагментарнае і не дае магчымасці скласці сістэмнае ўяўленне пра падзею. Гэтыя выбары ўвогуле дрэнна апісаны як у навуковай літаратуры, так і ў публіцыстыцы.
Пачатак 90-х. Лявонаў апісвае структуру галоўнага палітычнага падзелу канца 1980-х — пачатку 1990-х як "дэмакраты — партакраты", менавіта гэтую бінарную апазіцыю адлюстроўвае звязка Шушкевіч — Дземянцей у Вярхоўным Савеце XII склікання. Прычына палітычнае паразы Шушкевіча Лявонаву бачыцца ў тым, што той не здолеў абаперціся на наменклатуру, адзіную рэальную сілу таго часу. З апазіцыяй у яго таксама не было трывалых адносінаў. Шушкевіч заўсёды вагаўся і не мог прыняць чыйсьці бок ("гайдаўся ў паветры"), а такія паводзіны ў палітыцы не даруюцца.

Прычыны няўдачы БНФ — заўзяты антыкамунізм і радыкалізм лідэра Зянона Пазняка, ягонае паталагічнае непрыманне наменклатуры і неабальшавісцкая палітычная стратэгія. Лявонаў дэманструе сваё прыхільнае (ці, прынамсі, неблагое) стаўленне да Фронту. Ён нібыта некалькі разоў раіў яго функцыянерам змяніць лідэра, пазбавіцца ад экстрэмізму і радыкалізму, каб займець поспех. Расповед Лявонава цікавы яшчэ тым, што галоўнай прычынай паразы БНФ вызначаецца не "нацыяналізм" і патрабаванне радыкальнае нацыянальнае палітыкі, пра што звычайна кажа большасць розных аналітыкаў, але жорсткае супрацьпастаўленне Фронту адміністрацыйным структурам, хоць апошнія і былі гатовыя да кампрамісу.
Галоўнай палітычнай праблемай пачатку 90-х (у чым немалая віна кладзецца на БНФ) Лявонаву ўяўляецца тое, што раскол у Беларусі прайшоў не па лініі "за — супраць" Беларусі, але па

“замшэлай класава-артадаксальнай догме” “дэмакрат — партакрат”. Менавіта таму краіна не змагла вызначыць свой шлях, правесці рэформы, таму і прыйшоў да ўлады Лукашэнка.
Выбары-94. Лявонаў у цэлым пацвярджае версію пра тое, што Кебіча “кінулі”. “Ён шчыра не мог зразумець, што не пераможа”. Кантакты паміж пэўнымі функцыянерамі штабоў Кебіча і Лукашэнкі былі вельмі шчыльнымі. Менавіта таму Кебіча ўпэўнілі ісці на другі тур, каб не сарваць выбараў і забяспечыць легітымную перамогу Лукашэнкі.
Крызіс-96. Прэзідэнт правакаваў Вярхоўны Савет і здолеў (пры дапамозе “дырыжора” Сініцына і тэлешоў на БТ) стварыць у насельніцтва вобраз непатрэбнага і скандальнага парламенту. Замест рашучых дзеянняў кіраўніцтва Вярхоўнага Савету заставалася пасіўным, спадзеючыся на тое, што пагроза дзяржаўнага перавароту знікне сама сабою. Крэмль падыграў Лукашэнку, і лёс Беларусі быў вырашаны.
Паводле Лявонава, большая частка адміністрацыйнае эліты была выразна супраць рэферэндуму. Ніхто не выступіў адкрыта толькі праз неспрыяльны кантэкст і абставіны. Лявонаў узгадвае, што на першым Усебеларускім народным сходзе міністры сядзелі “как в дерьме”, рэферэндуму сапраўды не жадалі, настрой быў прыгнечаны. Сцвярджаецца нават, што сыход Чыгіра з пасады прэм’ера мог бы быць палітычна больш значным. Калі б ён паразмаўляў з міністрамі, то разам з ім сышло б яшчэ чалавек пяць—сем.
Рэформы і Крэмль. Напачатку Лукашэнка шчыра жадаў рэформаў. Ён быў гатовы, але быў не гатовы ўрад. У 1994—95-м працаваць ва ўрадзе было можна, Лукашэнка не перашкаджаў. Дазваляліся спрэчкі паміж міністрамі і нават з прэзідэнтам. Прынцыповаю вяхою тут з’яўляецца рэферэндум 1995 году (які сам Лявонаў лічыць бессэнсоўным). Пасля яго рэформы сталі непатрэбнымі. Затое ўладзе стаў патрэбны Крэмль. Узгадваюцца словы тады яшчэ кіраўніка Адміністрацыі прэзідэнта Сініцына: “Нам рэформы не патрэбныя, нам трэба захаваць тое, што ёсць, а потым мы заваюем Крэмль”. Праграма рэформаў, у тым ліку і ў сельскай гаспадарцы, была згорнута, сістэма пачала працаваць на “захаванне”.
Карупцыя і “эскадрон смерці”. Ацэнка ўзроўню крыміналізаванасці беларускага рэжыму Лявонавым у значнай ступені супадае з той, што даецца ў “Нашествии”, —

натуральна, па духу, а не літаральна. Карумпаванасць беларускіх уладаў не выклікае сумневаў, больш за тое, “Лукашэнка вельмі добра ведае, хто, дзе і як цяпер крадзе”. Узгадвае былы міністр і пра ўдзел найбліжэйшага атачэння прэзідэнта ў кантрабандзе.
Лявонаў непасрэдна займаўся зборам інфармацыі пра знікненне вядомых палітыкаў, забойствы бізнесоўцаў і іншых асобаў групаю, якая ў прэсе атрымала назву “эскадрон смерці”. Ягоная версія ў цэлым адпавядае той, што выкладалася ў газэтах на працягу лета 2001 году: маўляў, забойствы мелі месца і Лукашэнка не мог не ведаць пра гэта.
Прэзідэнцкія выбары-2001. Першы палітычны праект, з якім Лявонаў пачаў працаваць, быў Ярашук, — менавіта яго аўтар кнігі бачыў найбольш перспектыўным і прымальным для большасці палітычных суб’ектаў, уключаючы і Маскву. Трошкі пазней Лявонаў адзначае пасіўнасць Ярашука, няздольнасць да рашучых дзеянняў. Ярашук марудзіў з сваёй “раскруткай” і страціў час. Другой прымальнай кандыдатурай быў Чыгір. Менавіта пра Ярашука й Чыгіра вяліся перамовы з Масквою. Грошы з Захаду Лявонаў не хацеў браць з прынцыпу.
Былы міністр апісвае сябе як аднаго з аўтараў канцэпцыі “некалькіх кандыдатаў” (тры—пяць), якія потым самастойна вырашаюць, хто з іх будзе “адзіным”. Ён жа становіцца архітэктарам “цэнтрысцкай тройкі” Казлоўскі, Чыгір, Ганчарык, а пасля “пяцёркі”. Пашырэнне тройкі за кошт С. Домаша, паводле Лявонава, было вялікай складанасцю. Домаш ад старту сваёй кампаніі пачаў асацыявацца з правым флангам палітычнага поля, перш за ўсё з БНФ, яго далучэнне да “тройкі” здольнае было моцна зрушыць яе ўправа. Гэтага Лявонаў (як прадстаўнік “левага блоку”) не жадаў. Было вырашана далучыць да новага альянсу лідэра апазіцыйных камуністаў Калякіна, што дазволіла трохі выправіць “правы ўхіл”. Трэба адзначыць, што з самага пачатку Калякін не меў асаблівых прэзідэнцкіх амбіцыяў і не ўяўляў сабою завершанага палітычнага суб’екта, што давала дастатковую прастору для палітычнае гульні “левага блоку”.

Працуючы з “пяцёркай”, Лявонаў прыклаў шмат намаганняў для абмежавання ўплыву партыяў на патэнцыйных кандыдатаў[6], што ўдалося ажыццявіць толькі часткова. Гэта

цалкам зразумела: уплыў былога міністра на палітычныя партыі (перш за ўсё АГП і БНФ) быў вельмі абмежаваны, а інтарэсы часам процілеглыя.
Рэальны патэнцыял для прэзідэнцкае кампаніі мелі толькі Ганчарык і Домаш. Сімпатыі Лявонава, натуральна, былі на баку Ганчарыка. Да таго ж, ён разлічваў на значны людскі і арганізацыйны патэнцыял прафсаюзаў. Толькі падчас кампаніі раптам высветлілася, што гэта пераважна мёртвыя структуры. Недзе з чэрвеня стала зразумела, што новага прэзідэнта не будзе. У ліпені бок Лукашэнкі адназначна прыняла Масква. Расійскія каналы (акрамя НТВ), спасылаючыся на загад з Крамля, адмаўляліся даваць праўдзівую інфармацыю пра Беларусь, нават пра “эскадрон смерці”.
Зацягванне працэсу выбару адзінага кандыдата, інтрыгі ў штабе рабілі выбарчую кампанію проста безнадзейнай. Сваю ролю, на думку Лявонава, сыграла шчыльная прысутнасць спецслужбаў у штабах апазіцыйных кандыдатаў. Дастаткова падрабязна апісваецца атмасфера ў апазіцыйных штабах летам 2001-га, стварэнне падвойных структураў менеджменту. Пагадненне паміж Домашам і Ганчарыкам перад выбарамі Лявонаў называе “пактам Ганчарык—Домаш”, які паставіў крыж на “пяцёрцы”. Гэтае пагадненне было “праціснута” Лябедзькам і Вячоркам праз Палевікову. Адчуваецца, што з усімі гэтымі людзьмі ў былога міністра не склаліся добрыя адносіны.
Пасля “пакту” Лявонаў хацеў сысці, але застаўся, каб адпрацаваць пачатае да канца. “Хацеў пабачыць людзей за справаю, зразумець сутнасць працэсу, яго тэхналогію, усё гэта потым спатрэбіцца … У гэтым я выйграў”.
Сярод абласных каардынатараў кампаніі Ганчарыка Лявонаў называе толькі двух, якія адпрацавалі сумленна: Ярашука й Чыгіра. Да астатніх застаюцца вялікія пытанні, у тым ліку і фінансавага плану.
Вынікі галасавання былі сфальсіфікаваныя. У якасці пацьверджання Лявонаў распавядае пра ўласны досвед размоваў з рэгіянальнымі кіраўнікамі Магілёўшчыны. Са слоў былога міністра, ім загадалі пісаць 78 % за Лукашэнку. За Ганчарыка на асобных участках галасавалі і 40 %, і 50 %.
Свядомасць сінтэзу. Каб сапраўды зразумець культурную ідэнтычнасць беларускае адміністрацыйнае (і не толькі) эліты,

трэба ўз'яднаць у адной мадэлі інтэлектуальныя і палітычныя традыцыі, якія звычайна (і зусім памылкова) успрымаюцца як несумяшчальныя. Свядомасць, ці "ідэалогію", якую прадстаўляе Лявонаў, можна назваць савецка-нацыянальным сінтэзам. Пашыранасць і сацыяльнае значэнне такое свядомасці вызначыць даволі цяжка, але яна натуральна характэрная для значнае часткі адміністрацыйнае эліты і паспалітага насельніцтва. Сутнасць гэтае свядомасці ў паступовым спалучэнні беларускага савецкага ідэалагічнага комплексу: лёгкая\моцная настальгія па СССР, падкрэсленая павага да гераічнага эпасу вялікае айчыннае вайны, прызнанне эканамічных "заваёваў" савецкага ладу, палітычнае міфалогіі — Машэраў, Мазураў і г. д. — з нацыянальным, "адраджэнскім" дыскурсам. Павага да суверэнітэту і незалежнасці, прызнанне гістарычнае нацыянальнае сімволікі, прыязнае стаўленне да беларускае мовы, даўняя традыцыя беларускае дзяржаўнасці з асаблівай увагаю да перыяду Вялікага Княства Літоўскага. Лявонаў спрабуе не "мазаць чорным", але і не "ўсхваляць мінулага" (маецца на ўвазе савецкае мінулае). Ён памяркоўна апелюе да палітычнага прыкладу Машэрава й Мазурава, ацэньваючы іх як сімвалаў палітычнае разважлівасці, свайго роду этычны прыклад. (Іх вобраз "стваральнікаў" супрацьпастаўляецца вобразу "дыктатара-самадура" Лукашэнкі.) Апісанне беларускае савецкае цывілізацыі ўтрымліваецца ў наступных тэзах: людзі сапраўды нядрэнна жылі, былі поспехі ў эканоміцы, народ прыхільна ставіўся да ўлады і мог дабіцца праўды. У тэксце час ад часу сустракаецца палітычна карэктная журба па СССР. Адначасова Лявонаў досыць часта спасылаецца на палітычную традыцыю Вялікага Княства Літоўскага, прызнае каштоўнасць беларускіх нацыянальных сімвалаў, беларускае мовы. У турме Лявонаў чытае і вучыць на памяць беларускую літаратурную класіку, хоць і паралельна з расійскай.

Такі сінтэз — складаная сацыяльная з'ява, апісанне якой выведзе нас далёка па-за прастору рэцэнзаванае кнігі. Зазначым толькі, што свядомасць той адміністрацыйнай субкультуры, якую прэзентуе Лявонаў, — з'ява сінтэтычная, якая ёсць адной з праяваў сучаснае беларускае ідэнтычнасці.

Палітычны праект. Апошнія сорак старонак кнігі цалкам прысвечаны выкладанню Лявонавым свайго разумення

далейшага палітычнага і эканамічнага развіцця краіны. Першае, што варта адзначыць у палітычным праекце Лявонава, — устойлівае апеляванне да патрыятызму (“патрыёты зямлі беларускай”, “патрыятычна арыентаваны ўрад” і г. д.). Такім чынам, неабходнаю ўмоваю паспяховага пераадолення сучаснага палітычнага і эканамічнага крызісу з’яўляецца асабістая блізкасць да гэтае зямлі і адчуванне еднасці з яе народам. Гэта, на думку Лявонава, павінна скласці этас дэканструкцыі існага рэжыму і палітыкі далейшага рэфармавання.

Калі звярнуцца да зместу праграмы, дык гэта тое, што можна назваць беларускім варыянтам памяркоўнага левага кансерватызму[7]. Сутнасць гэтага кансерватызму — *паступовы* (тут гэта ключавое слова) пераход да рынкавае эканомікі і дэмакратыі. Гэтую праграму можна, мяркую, лічыць пэўным агульным уяўленнем пра рэформы даволі вялікага пласту адміністрацыйнае эліты.
Прамысловасць. Стоадсоткавае акцыянаванне. Адкрытыя конкурсы на кіраванне прадпрыемствамі. Менеджмент павінен на працягу пяці гадоў ажыццявіць прыватызацыю. Колькасць ліцэнзаваных відаў дзейнасці павінна быць скарочана. Неабходна стварыць сістэму падтрымкі прадпрымальніцтва.
Сельская гаспадарка. Калгасны лад павінен быць ліквідаваны: “Калгас сёння — гэта нонсэнс. Сёння гэта выбуховая сумесь працоўнае арміі Троцкага і прыгоннага права”. Лявонаў выступае за прыватную ўласнасць на зямлю, але свабодны продаж павінен уводзіцца паступова на працягу дзесяці гадоў. Лявонаў выступае за далейшае скарачэнне войска, рэформу органаў МУС і змену існага крымінальнага заканадаўства (што менавіта, не канкрэтызуецца). Патрабаванні павелічэння выдаткаў на адукацыю, медыцыну і навуку, якія фармулюе былы міністр, патыхаюць папулізмам. Рэформы (прынамсі напачатку) прымусяць скараціць такія выдаткі.
Палітычны лад. Праект палітычнага ладу ўтрымлівае яшчэ больш выразныя элементы левакансерватыўнае візіі дэмакратыі і яе перспектываў у Беларусі.
Цэнтральнае месца ў палітычных зменах адыгрывае рэформа Канстытуцыі. Прэзідэнт павінен быць толькі кіраўніком выканаўчае ўлады[8], узначальваць урад і несці адказнасць за яго

дзейнасць. Натуральна, паўнамоцтваў на выданне дэкрэтаў прэзідэнт мець не павінен.
Выбары ў парламент павінны, напачатку, праходзіць паводле мажарытарнай сістэмы. Беларускія партыі занадта слабыя, каб арганізаваць паўнавартаснае прадстаўніцтва інтарэсаў грамадства. Змяшаную сістэму можна ўвесці на мясцовых выбарах, а калі эксперымент будзе паспяховым, пачаць праводзіць паводле гэтай схемы выбары ў парламент.
Прэзідэнт павінен абірацца народам, але папярэдне кожны кандыдат павінен праходзіць медыцынскі агляд. Павінна быць створаная таксама сістэма абароны “ад дурняў ва ўладзе”, праўда, яе структуры Лявонаў не акрэслівае.
Асаблівае стаўленне Лявонаў мае да “вертыкалі”. Напачатку яе трэба захаваць, не ўводзячы выбараў мясцовых кіраўнікоў насельніцтвам. Адзінае, што трэба даць магчымасць мясцовым саветам здымаць кіраўнікоў выканкамаў у асаблівых выпадках. Трэба забыцца на магчымасць апаратных чыстак і люстрацыю, гэта бесперспектыўна. Да таго ж, замена больш за 20 % штатных адзінак апарату прывядзе да анархіі ў сферы кіравання. Рэформы павінны ў нечым нагадваць кітайскі шлях. Дэмакратычныя сілы можна прыцягваць да выканання пэўных адміністрацыйных функцыяў, але скласці з іх дзяржаўны апарат немагчыма тэхнічна.
Павінны быць зменены структура і функцыі Рады Бяспекі (створанай спецыяльна пад Шэймана). Яна павінна ператварыцца ў невялікі аналітычны апарат, перадаўшы астатнія функцыі КДБ.
Прэса павінна застацца толькі недзяржаўная, дзяржаўныя органы могуць валодаць толькі спецыялізаванымі (напрыклад, нарматыўнымі) выданнямі.
У праграме апісваецца таксама схема рэфармавання сістэмы самакіравання і бюджэтных адносінаў.
Міжнародная інтэграцыя. Лявонаў скептычна ставіцца да магчымасцяў Беларусі інтэгравацца ў еўрапейскую супольнасць. Магчыма, мы будзем там, але няхутка. Не лічыць мэтазгодным Лявонаў адкідаць ідэю інтэграцыі з Расіяй, але займае ў гэтым пытанні памяркоўную пазіцыю: “Мы — два народы”, “Я не хачу мяняць пашпарт”. Інтэграцыя магчымая толькі як саюз дзвюх суверэнных дзяржаў. Формула добра вядомая і мала чым розніцца ад афіцыйнай, толькі яе

канкрэтны змест незразумелы.
Што тычыцца правядзення рэформаў, дык яны павінны праводзіцца рашуча і жорстка, але на аснове грамадскае згоды. Такая згода павінна грунтавацца на часовым самаабмежаванні правоў (у прыватнасці, неабходны мараторый на буйныя страйкі і вулічныя акцыі). Сама ідэя нядрэнная, але незразумела, ці можа такая згода быць дасягнута ва ўмовах максімальна фрагментаванага беларускага грамадства. Збалансаваная рыторыка палітычнага праекту Лявонава ў канцы падводзіць да пытанняў: ці будзе існаваць дзяржава пад назваю Рэспубліка Беларусь, ці будуць нашы дзеці звацца беларусамі? Пэўнага адказу няма, ёсць адказ-лозунг: “Мы можам стацца, можам выжыць”. Яшчэ старажытныя грэкі называлі палітыку мастацтвам магчымага, з тых часоў не так шмат і змянілася.
З трох кнігаў найбольш цікавая апошняя. У творы Лявонава багата інфармацыі, нестандартных інтэрпрэтацыяў ды схемаў. Мне падаецца, што гэта найлепшая беларуская кніга палітычна-біяграфічнага зместу апошніх часоў. Кніга пра Клімава, сканцэнтраваная на адной асобе і яе пераважна абстрактных разважаннях, выглядае занадта суб’ектыўнай. Яна будзе цікавая тым, каму цікавы Клімаў. Што тычыцца “Нашествия”, то гэта выданне найменш прывабнае зместам, але найбольш цікавае кантэкстам. Назіраць за тым, як яе чытаюць іншыя, значна больш цікава, чым чытаць самому.
Тры працэдуры палітычнае тэрапіі скончаны. Але не трэба чакаць паляпшэння стану: палітычныя хваробы не лечацца, звычайна яны праходзяць самі.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/28

[image]

Якія плюсы й мінусы для краіны будзе мець трэці тэрмін прэзыдэнцтва Аляксандра Лукашэнкі?

Уладзімер Арлоў, пісьменьнік

За прамінулыя гады мы назапасілі багаты досьвед пошуку й шчасьлівага адшуканьня розных плюсоў і плюсікаў рэжыму. Але асабіста я шукаць іх, прызнаюся, сьмяротна стаміўся. Можа, вінаваты гэтак званы “чалавечы фактар”? Некалі Аляксандар Купрын, седзячы ў славутай рэстарацыі “Славянскі базар”, паслаў цару тэлеграму: “Долой самодержавие. А.Куприн”. Неўзабаве ўсьлед за чарговай порцыяй бліноў з ікрой і запацелай бутэлечкай афіцыянт прынёс пісьменьніку тэлеграфны адказ: “Выпил — закуси. Николай II”. Аднойчы, калі ў парлямэнце зьбілі дэпутатаў ад апазыцыі, я таксама накіраваў прэзыдэнту тэлеграму. Тэлеграма была з аплатаю паведамленьня пра ўручэньне. Я не атрымаў нават гэтага паведамленьня.

А магчыма, прычына маёй сьмяротнай стомы ў тым, што днямі

выпала быць сьведкам таго, як амонаўцы бралі пад свой пэдагагічны кантроль будынак адзінага ў краіне і ў сьвеце Беларускага гуманітарнага ліцэю, ачышчаючы тэрыторыю ад выкладчыкаў, ліцэістаў ды іхных бацькоў, што роспачна спрабуюць бараніць сваю навучальную ўстанову, ліквідаваную пастановай ажно Савету Міністраў (хапіла б, мабыць, і Міністэрства ўнутраных справаў).
Калі разглядаць згаданую падзею ў кантэксьце закрыцьця газэтаў, выкіданьня беларускамоўнага радыё “Сталіца” з FM-дыяпазону, канчатковага выцясьненьня беларускай мовы з “нацыянальнага” тэлебачаньня etc etc, непазьбежна нараджаюцца аналёгіі з палітыкай, якую праводзілі імпэрскія ўлады ў XIX стагодзьдзі пасьля інкарпарацыі Беларусі. Прыходзіць на памяць ліквідацыя Полацкай акадэміі, Віленскага ўнівэрсытэту, Горы-горацкага земляробчага інстытуту... Праўда, цяпер гэтая палітыка ажыцьцяўляецца рукамі тых (дакладней, таго), хто ёсьць прадуктам намаганьняў Мураўёва-вешальніка ды мураўёўцаў розных гатункаў і эпохаў. Я перакананы, што калі б сёньня мы мелі Беларускі нацыянальны ўнівэрсытэт, за стварэньне якога зацята змагаецца ТБМ, гэты ўнівэрсытэт напаткаў бы лёс Беларускага ліцэю. Адзіная розьніца палягала б у тым, што зачынялі б alma mater не пастановай Саўміну, а ўказам прэзыдэнта.

Віктар Аўтушка, праграміст
Каб пазначыць плюсы ды мінусы, добра, каб было з кім параўноўваць. Але іншага прэзыдэнта ў нас не было. Несумненны плюс — гэта адносная стабільнасьць. Гэтак, я думаю, будзе лічыць і большасьць беларусаў. Ці было б зь іншым прэзыдэнтам горш ці лепш — гэтага мы ня ведаем. Гэта ўжо мінус — мы, чым далей, тым больш ня ведаем, як магло б быць па-іншаму, бо Беларусь праходзіць праз свае “кропкі біфуркацыі” па інэрцыі.
Найгорш тое, што гэтая эфэмэрная стабільнасьць, як і раней, ня будзе скарыстаная дзеля будучыні Беларусі, як у ідэалягічным, так і ў эканамічным сэнсе. Напрыклад, на працягу існаваньня цяперашняй палітычнай сыстэмы не ўзьнікае паўнавартасная беларускаарыентаваная палітычная кіраўнічая эліта. Тыя, хто цяпер пры ўладзе, маюць досьвед функцыянаваньня толькі ў лукашэнкаўскай сыстэме, а “апазыцыя” ня мае і гэткага

досьведу, і таму застаецца на ўзроўні дысыдэнцтва, не выходзячы на ўзровень сапраўднае палітыкі. Зрэшты, многія ўжо з гэтым зьмірыліся і камфортна сябе пачуваюць.

Лявон Вольскі, сьпявак, лідэр гурту “NRM”
Плюсы: вонкавая стабільнасьць (народ ня любіць ператрусаў), адсутнасьць відавочнае розьніцы паміж беднымі й багатымі, супраціў глябалізацыі і заходнім жыцьцёвым стандартам... Карацей, плюсы атрымліваюцца гэткія нерэчаісныя, і парадавацца ім зможа толькі адна, няхай дастаткова вялікая катэгорыя насельніцтва.
Мінусы: канчатковы пераход у эпоху савецкага застою. Ён перажыты ўжо адзін раз, тым брыдзей вяртацца туды зноўку. Гэтая эпоха можа цягнуцца дзесяцігодзьдзямі. Просты народ прызвычаіцца да гэткага парадку рэчаў, а рознага кшталту інтэлігенцыя, тонкія натуры, будуць вымушаныя зьехаць альбо гібець у галечы і п’янстве. Раз на тры гады будуць здымацца фільмы кшталту “Настасьсі Слуцкай” — бездапаможныя, але, паводле нашых стандартаў, “багатыя”. Наагул, усё будзе “паводле мясцовых стандартаў” — горай, чымся ў цывілізаваным сьвеце, затое сваё (як калісьці ў СССР). Што тычыць музыкі, дык сытуацыя будзе наступнай: у выніку адсутнасьці легальнага бізнэсу (а тым болей шоў-бізнэсу) таленавітыя музычныя фармацыі будуць шукаць аўдыторыю ў іншых краінах. Калі гэта ня ўдасца, давядзецца займацца іншымі, немузычнымі, справамі, каб карміць сям’ю. Месца гэтых “непрызнаных талентаў” зоймуць музычныя фармацыі з Расеі.
Нас чакае Савецкі Саюз у межах Беларусі, але без камуністычнага падмурку. Альтэрнатывы камуністычнай рэлігіі ня знойдзена, ідэалёгія дзяржавы не распрацавалася за дзесяць гадоў, яна трымаецца адно на асобе прэзыдэнта й ягоных супярэчлівых заявах.
Што тычыць “беларускасьці”, дык падчас саюзу яе было несумнеўна болей, і хоць займала яна, як і ўсё ў саўку, дакладна адведзенае месца, абмежаванае савецкімі стандартамі, дык цяпер нават гэтага “вальеру ў зьвярынцы” для яе няма.
“Змаганьне з рэжымам” набудзе карыкатурныя рысы, бо немагчыма сур’ёзна рабіць адныя і тыя ж акцыі цягам

дзесяцігодзьдзяў. Моладзі, хутчэй за ўсё, вобраз патрыёта-змагара падасца кандовым і нецікавым. Таму самы вялікі мінус — гэта тое пакаленьне маладых людзей, якое выгадуецца (невядома на чым) падчас наступнага прэзыдэнцкага тэрміну.

Павал Жук, выдавец
Нацыя зноў згубіць час. 50 мільёнаў гадоў разам. Да гэтага дадасца дэпрэсія ўва ўсіх пластах грамадзтва, падобная да той, што назіралася пасьля выбараў 2001 году, але больш сур'ёзная. Эканоміка канчаткова будзе разбураная, грамадзтва, за выключэньнем некалькіх дзясяткаў асобаў, пяройдзе ў стан жабрацтва, зьнікнуць беларуская мова, грамадзкая супольнасьць, прэса і ТВ, апрача некалькіх дзяржаўных каналаў. Усе, хто некалі быў у апазыцыі, ці зьнікнуць, ці будуць сядзець. Прэзыдэнцкая ўлада стане прыжыцьцёвай і спадчыннай. Усё начальства будзе з Магілёўскай вобласьці. А туды пачнецца міграцыя ўсіх, хто захоча знайсьці хоць нейкае месца пад сонцам. Увядуць карткавую сыстэму на прадукты харчаваньня і прадукты прамысловасьці, якія будуць разьмяркоўваць па прынцыпе ляяльнасьці да ўлады. Па гэтым жа прынцыпе будзе дазволены выезд за мяжу, які хутка забароняць зусім. Турызм будзе магчымы толькі ў Паўночную Карэю ці на Кубу. Уся ўласнасьць грамадзянаў і краіны пяройдзе да адміністрацыі прэзыдэнта. Каб набыць шкарпэткі, трэба будзе ісьці ў выканкам па дазвол. Грошы як фінансавы інструмэнт зьнікнуць, недзе ў 2009 годзе пачнецца голад і выпадкі людажэрства. Плюсоў для грамадзтва і сябе ня бачу, хіба што будзе пабудавана пара новых каткоў.
Але рэальнага пераабраньня ня будзе. Я думаю, што ўсё вырашыцца раней. Не пераабраньнем, а выбарам. Выбарам, які будзе падмацаваны сілай і адказнасьцю людзей перад краінай і будучымі пакаленьнямі.

Сяргей Навумчык, журналіст радыё "Свабода"
Ніякіх плюсоў у тым, што Лукашэнка застанецца, няма. Існуе тэорыя, што пакутлівае жыцьцё стымулюе творчасьць, — але гэта спрэчная тэорыя. Шэдэўры нараджаліся і ў раскошы. Мяркую, кожны з тысячы чытачоў "ARCHE" назаве пяць сучасных празаікаў квітнеючай Францыі, ну, Мішэля Ўольбэка дык дакладна назаве, — а ці шмат французаў прыгадаюць хаця

б аднаго пісьменьніка зь Беларусі?
Мой вопыт сумаўленьня (афіцыйнага і неафіцыйнага) з Лукашэнкам прымушае скептычна ўспрымаць спадзяваньні, што ён раптам будзе вымушаны зьвярнуцца да беларускасьці (ці паўстаць у абарону Незалежнасьці). Лукашэнка — агрэсіўны антыбеларус, на ўзроўні паталёгіі. Чалавек ня будзе абараняць тое, што ненавідзіць.
Ну і, нарэшце, трэці тэрмін Лукашэнкі — гэта падмурак для ягонага чацьвёртага тэрміну, бо дэмакратыя мае гарантыі толькі ў дэмакратычным грамадзтве, таталітарызм жа цудоўна ўмацоўвае сам сябе. Прычыны ж паразы дэмакратыі, як іх ні аналізуй, сыходзяцца на адным — нізкім узроўні нацыянальнай сьвядомасьці, усё іншае — ад гэтага. Час, калі частка апанэнтаў Лукашэнкі адмовілася ад нацыянальнай ідэі на карысьць “прагматызму” і “real politics”, — страчаны час. Вельмі мала падставаў думаць, што час ня будзе губляцца і надалей.

Валянціна Палевікова, палітык
Відавочны і вельмі вялікі плюс — што Лукашэнка сыдзе. Зь яго сыходам зьявяцца пэрспэктывы, і гэта таксама плюсы:
— наладжваньне міжнародных адносінаў і прарыў ізаляцыі Беларусі, пасьлядоўнасьць і прадказальнасьць у адносінах з Расеяй;
— зьмены ўмоў для разьвіцьця эканомікі, прытоку інвэстыцыяў, рэальнай эканамічнай інтэграцыі, што будзе важкім крокам да дабрабыту;
— у грамадзтве зьнікне страх і няўпэўненасьць, асабліва ў моладзі.
Самы вялікі мінус — што Лукашэнка не зьбіраецца сыходзіць. Але гэты мінус можа стаць для ўсіх нас плюсам, таму што міт аб стабільнай, квітнеючай краіне-Беларусі доўга не пратрымаецца. Беларусы не дазволяць бясконца глуміцца над лёсам і жыцьцём сябе і сваіх дзяцей.

Тацяна Процька, старшыня Беларускага Хельсынскага камітэту
Плюсы могуць быць толькі для той часткі нашага грамадзтва, якая цяпер робіць свой бізнэс, карыстаючыся сымпатыямі прэзыдэнта да сябе. Яны змогуць і надалей атрымоўваць вялізарныя прыбыткі. Іншых плюсоў я ня бачу.

А мінусы распаўсюджваюцца на ўсё грамадзтва. Гэта — грэблівае стаўленьне да законнасьці як галоўнага інстытуту, які рэгулюе адносіны ў грамадзтве. Калі няма законнасьці, тады дзяржава перастае існаваць як мэханізм, які дапамагае людзям будаваць сваё жыцьцё. Законнасьць выпакутаваная чалавецтвам. Ігнараваньне законнасьці вельмі жорстка караецца ў гісторыі. Сёньня нашая дзяржава, нягледзячы на тое, што прэзыдэнт такі жорсткі — адных здымае, другіх у турмы садзіць, — крыміналізуецца, робіцца карумпаванай. Прычым карупцыя ідзе зьверху да нізу. Гэта пачалося ў 1996 — грэблівасьць да Канстытуцыі, незаконнае ўнясеньне дапаўненьняў — і доўжыцца цяпер. Зноў грэблівасьць да Канстытуцыі як да галоўнага закону. Не настолькі важна, ці будзе Лукашэнка трэці тэрмін прэзыдэнтам. Пяць гадоў у гісторыі — гэта малы тэрмін, але на агульнай глебе савецкага прававога нігілізму, які нам дастаўся ў спадчыну, зрабіць грамадзтва іншым, каб яно карысталася законам як галоўным рэгулятарам, пасьля гэтых пяці гадоў стане яшчэ цяжэй. Ужо цэлае пакаленьне прызвычайваецца, што свае асабістыя праблемы можна вырашаць, абапіраючыся не на сілу закону, а на закон сілы.

Андрэй Саньнікаў, былы намесьнік міністра замежных справаў Беларусі, каардынатар “Хартыі’97”
Пытаньне пра плюсы і мінусы трэцяга тэрміну Лукашэнкі прадугледжвае пошук чагосьці станоўчага ўвогуле ў праўленьні Лукашэнкі. Але ж гэтага няма. Нават зь філязофскага пункту гледжаньня, калі нехта кажа, што мы мусім прайсьці праз пэўныя пакуты ці сапраўды заваяваць незалежнасьць, — гэта не апраўдвае таго, што адбываецца ў Беларусі.
Справа нават ня ў тым, што працяг панаваньня гэтае ўлады прывядзе да ўзмацненьня ціску на ўсё грамадзтва, да сапраўдных рэпрэсіяў супраць ня толькі іншадумцаў, але ўвогуле здольных працаваць на беларускую дзяржаву людзей. Рэч у тым, што пры Лукашэнку Беларусь страціць свой шанец вярнуцца ў Эўропу — калі не назаўсёды, то на дзесяцігодзьдзі. Ён адзіны ў Эўропе кіраўнік, які ў лёсавызначальны для ўсіх краінаў кантынэнту час пайшоў супраць натуральных працэсаў вяртаньня эўрапейскіх краінаў да сваіх каранёў. У адрозьненьне ад усіх нашых суседзяў на Захадзе, якія адчулі

час і робяць усё дзеля таго, каб іхнія краіны апынуліся ў больш спрыяльных умовах для сапраўднага дзяржаўнага і грамадзкага разьвіцьця — а дзяржавы Балтыі ўжо знаходзяцца ў гэтых умовах, — Лукашэнка абраў шлях вяртаньня нават не ў Расею, а ў СССР. Гэтага ўсё роўна не адбудзецца, але ж лёс людзей, краіны і нацыі будзе скалечаны.

Сяргей Скрабец, дэпутат палаты прадстаўнікоў
Плюсы пераабраньня Лукашэнкі — будзе будаўніцтва дарог, бібліятэк, жылых дамоў.
Мінусы — па-ранейшаму будзе панаваць страх, любы чалавек будзе баяцца ў любы момант сесьці ў турму, без тлумачэньня прычынаў, прычым нават не судзьдзя будзе вырашаць на колькі і за што.
Будзе скарачацца бізнэс. Прадпрымальніцтва можа быць ліквідавана як кляса. Сытуацыя з энэрганосьбітамі будзе кантралявацца ўладай. Ад аднаго чалавека будзе залежаць, будзе зімой цяпло ці ня будзе, ці будзе пэнсія, ці будзе ўраджай, узыход і захад сонца. Але людзі будуць за гэта дзякаваць: узышло — дзякуй, зайшло — таксама дзякуй.
Будзе скарачацца насельніцтва Беларусі. Я вярнуся да эканомікі, бо для нацыі ад гэтага шмат залежыць. Ня будуць прыходзіць тэхналёгіі і заходнія інвэстыцыі. Хаця Лукашэнка можа легалізаваць свой капітал, які будзе працаваць у Беларусі. Калі яго вярнуць у Беларусь, дык эканоміка можа й разьвівацца. Але ён будзе жорстка “вырубаць” усіх канкурэнтаў. Цалкам будзе кантралявацца ўсё.
А парлямэнт будзе выглядаць вельмі проста: 110 чалавек — самых адданых, незалежна ад адукацыі, прафэсіі і сацыяльнага паходжаньня.

Аляксандар Фядута, журналіст, карэспандэнт тыднёвіка “Московские новости”
Сьлед адрозьніваць праблемы, што стаяць перад гаспадарствам, і праблемы, што стаяць перад гаспадаром. У Аляксандра Лукашэнкі толькі адзін клопат — праблема ягонае ўласнае палітычнае будучыні. І тутака ён мае ўсяго два варыянты: ён сыходзіць з улады або спрабуе ўзурпаваць яе й далей. Гэта не такі ўжо й просты выбар, бо сына Ільхама ў Аляксандра Рыгоравіча проста няма (ягоныя дзеці

маладзейшыя за аліеўскіх). Менавіта гэтае пытаньне й далей будзе вымушаць яго ісьці на нейкія канкрэтныя крокі.
Іншыя пытаньні стаяць перад дзяржавай Беларусяй. Іх некалькі. Па-першае, ці захаваецца яна на працягу найбліжэйшых дзесяці —пятнаццаці гадоў на мапе сьвету з статусам сувэрэннае дзяржавы. Гэта далёка не відавочна. У кожным разе, калі інкарпарацыі ў склад Расеі ў найбліжэйшы час, на маю думку, ня будзе, дык факт таго, што ўсё-такі можа быць створаная нейкая канфэдэрацыя, у мяне амаль не выклікае сумненьняў. Калі Лукашэнку давядзецца заплаціць гэтую цану за сваё палітычнае быцьцё, ён яе заплаціць. Але — толькі ў выглядзе канфэдэрацыі.
Другое пытаньне: якую эканамічную мадэль абярэ Беларусь для далейшага выжываньня. Цяперашняя, калі беларуская эканоміка паразытуе на целе расейскай, бы тая п'яўка, далей — і гэта ўжо відавочна — існаваць ня можа ня толькі з вонкавых (Пуцін ня дасьць), але і з унутраных прычынаў. Гайкі закручаныя да такое мяжы, што разьба практычна сарваная. Пытаньне пра далейшае функцыянаваньне мэханізму дзяржаўнага рэгуляваньня эканамічных працэсаў застаецца адкрытае. Менавіта таму мне хацелася б папярэдзіць усіх, хто цешыцца з таго, як эфэктна Лукашэнка змагаецца з расейскім уплывам у Беларусі. Не сьпяшайцеся радавацца, калегі! Чым даўжэй Лукашэнка не пускае ў Беларусь расейскага капіталу, тым менш будзе шанцаў знайсьці інвэстара ўжо новаму, дэмакратычнаму ўраду. І гэта азначае, што пераможцам акажацца не Расея, а разруха, што нашмат горш. Ператварыцца ў краіну благое аграрнае вытворчасьці — от на што нас выракае працяг цяперашняга эканамічнага курсу. І гэта сумна.

Павал Шарамет, журналіст расейскага тэлеканалу ОРТ
Я цяпер хварэю, таму такая тэма, як плюсы і мінусы Лукашэнкі, выклікае ў мяне яшчэ большыя пакуты. Мне вельмі складана пра гэта думаць. Я б выдзеліў толькі адзін вялікі плюс і адзін вялікі мінус. Мінус у тым, што яшчэ адзін тэрмін гэтага вар'яцтва прывядзе да таго, што беларусы спыняць існаваньне. Замест Беларусі будзе існаваць адна вялікая Шклоўшчына, а беларусы пераўтворацца ў "шклашчаноўцаў", якія гавораць на трасянцы, кідаюць каменем з-за вугла, гадзяць суседу ў талерку і паводзяць сябе неадэкватна. Відавочна, што "шклоўскі ідал",

які будзе стаяць на чале “шклоўшчыны”, кланує сябе на розных узроўнях. Гэта — вялікі мінус. Чым далей гэта будзе зацягвацца, тым горш для народу. Ніколі ні ў якай дыктатуры не было ніякіх плюсоў. Апрача аднаго: калі яго абяруць на трэці тэрмін — гэта будзе натуральнае разьвіцьцё падзеяў, бо пакуль ніякай рэвалюцыйнай сытуацыі няма. Паступова, я спадзяюся, хаця б у часе трэцяга тэрміну, гэтая рэвалюцыйная сытуацыя сасьпее, і зьмена ўлады адбудзецца ня з вонкавых прычынаў, напрыклад умяшальніцтва Расеі, ЗША ці яшчэ каго, а знутры, дзякуючы народнаму абурэньню рэшткаў беларусаў. Гэта плюс, бо тады будзе гістарычная справядлівасьць, тады адбудзецца гістарычны суд над гэтым вар’яцтвам і цемрашальствам. Бо, калі ён зараз сыдзе, праз год-два, у яго ёсьць шанцы дамагчыся для сябе гарантыяў бясьпекі, схавацца ў Расеі, жыць добра недзе ў вялікім палацы. А чым даўжэй ён будзе ля ўлады, тым больш калі гаварыць пра трэці тэрмін, у яго такога шанцу ўжо ня будзе. У гэтым плюс.

Васіль Шлындзікаў, старшыня Асацыяцыі спрыяньня эканамічнаму разьвіцьцю

Любы застой — гэта застой. З гісторыі добра вядома, чым заканчваецца застой і кіраваньне аднаго чалавека. Калі гаварыць пра плюсы пераабраньня Аляксандра Лукашэнкі, то я іх увогуле ня бачу. Хаця з натуры я аптыміст. Што да мінусаў — гэта страта гістарычнага часу, страта нацыі, заняпад эканомікі, жабрацтва. Калі б цяпер народ зрабіў асэнсаваны выбар, незалежна ад таго, хто прыйшоў бы, гэта ўжо быў бы прагрэс, калі, натуральна, ня будзе палітык такога ж складу і сьветагляду. Для мяне асабіста пераабраньне Лукашэнкі азначала б, што я на пэнсіі — калі б на яе можна было пражыць! — буду вырошчваць у агародзе бульбу. Калі б сытуацыя разьвівалася інакш, я спадзяюся, што мог бы быць запатрабаваны грамадзтвам як эканаміст. Пакуль шанцы 50 на 50. Лукашэнку і хочацца, і колецца — ды мамка не дае. Інакш бы ён ужо правёў рэфэрэндум.

Апытвала Вольга Караткевіч

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/28
[image]

Тарашкевіца — наркамаўка: складанае збліжэньне Круглы стол

17 ліпеня ў памяшканьні Беларускага ПЭН-цэнтру адбыўся круглы стол, прысьвечаны функцыянальнасьці беларускай мовы. Удзел у ім узялі доктар Янка Запруднік, прафэсар Генадзь Цыхун, галоўны рэдактар выдавецтва "Тэхналёгія" Зьміцер Санько, журналіст Аляксандар Старыкевіч, кандыдат філялягічных навук Юрась Бушлякоў, сябар рэдкалегіі часопісу "Спадчына" Алесь Белы, рэдактар часопісу "ARCHE" Валер Булгакаў ды інш.

Валер Булгакаў: Часта работнікі акадэмічных структураў робяць закід незалежным выдаўцам, журналістам незалежнай прэсы, якія карыстаюцца "неўнармаваным", зь іхнага гледзішча, правапісам: дзеля таго што зьнікае правапіснае адзінства, у людзей зьнікае пачуцьце парадку ў галаве, пачуцьце нормы. І ўрэшце людзі адмаўляюцца ад роднай мовы. Маўляў, акурат тут, у неўнармаванасьці, і ўзьнікае хаос, становішча, калі нацыя ў вялікай ступені адчужаецца ад нацыянальнай мовы.

Юрась Бушлякоў: Думаю, тут ёсьць падмена паняцьцяў. Праблема не ў існаваньні правапісных, граматычных ці маўленчых варыянтаў, а ў становішчы мовы ў грамадзтве, у статусе мовы. Працэс маргіналізацыі нашай мовы

працягваецца. Кожны бачыць і можа прывесьці тут розныя факты. Мова, незапатрабаваная дзяржаваю, чыста факультатыўная з гледзішча гэтай дзяржавы, курчыцца, нікне. Праблема перадусім у ігнараваньні мовы, а ня ў моўнай варыянтавасьці.

Генадзь Цыхун: Сама наяўнасьць варыянтаў не такая ўжо вялікая бяда. Ёсьць краіны, дзе літаратурных моваў — не варыянтаў! — некалькі і яны нармальна існуюць. Кожная з моваў займае пры гэтым сваю нішу: адна — больш элітарная, другая — гутарковая... Забарона нейкага варыянту мовы ці дзяржаўнае ўмяшаньне ў гэтую справу не прынясе карысьці. Узьнікшы, варыянты, ці два тыпы літаратурнай мовы, могуць суіснаваць даволі доўга. Гвалтоўнае вырашэньне гэтага пытаньня не дае эфэкту — наадварот, узьнікае яшчэ і трэці варыянт. Адзіны гвалтоўны вопыт ёсьць у Альбаніі, дзе Энвэр Ходжа зрабіў аб'яднаньне двух варыянтаў. Але цяпер вядуцца гаворкі пра аднаўленьне іх...

Так што існаваньне двух літаратурных варыянтаў само па сабе не нясе ніякай пагрозы мове. Іншая справа, што існаваньне варыянтнасьці нельга лічыць станоўчай зьявай. Норма ўсё ж такі — адзін варыянт. Варыянтнасьць выклікае ўскладненую моўную сытуацыю. Як паказваюць дасьледаваньні, пры ўскладненьні моўнай сытуацыі карыстальнікі мовы вельмі часта кідаюцца да так званага "простага рашэньня": пры наяўнасьці нейкіх варыянтаў выбіраюць нэўтральны. Калі спраектаваць гэта на нашую рэальнасьць, нэўтральнай мовай становіцца расейская. У нашай вельмі складанай моўнай сытуацыі варыянтнасьць у правапісе можа спрыяць выбару на карысьць расейскай. Але цяжка аб'ектыўна ацаніць нашую моўную сытуацыю: наколькі яна складаная?

В.Б.: А наколькі можна разьлічваць у нашых умовах на дзяржаву як на матор беларусізацыі? Ці сапраўды моўны разнабой перашкаджае пашырэньню беларускай мовы?

Аляксандар Старыкевіч: Моўны разнабой не перашкаджае беларусізацыі. З тым самым посьпехам можна сьцьвярджаць, што бел-чырвона-белы сьцяг разбурае беларускую дзяржаву. Я ў школцы, як і ўсе, вучыў беларускую мову-"наркамаўку". А нармальна засвоіў мову толькі тады, як пазнаёміўся з "тарашкевіцай", бо гэта сапраўдная нармальная мова, а не скалечаны варыянт. На маю думку, тут праблемы ніякай няма:

хай існуе “наркамаўка”, хай існуе “тарашкевіца”, хай існуе лацінка… Абы ў грамадзтве яны былі запатрабаваныя. Як гэта зрабіць, і ці можа дзяржава адыграць тут пэўную ролю? Думаю, што так, але не пры гэтай уладзе.

Я сустракаўся зь людзьмі, якіх цяжка аднесьці да сьвядомай часткі грамадзтва. Але пры выпадковых размовах высьвятляліся цікавыя рэчы: у самых розных мясьцінах вельмі прыязна паставіліся да беларусізацыі пачатку 90-х, якую падтрымала дзяржава. І людзі былі зьбянтэжаныя, калі цягнік пры Лукашэнку даў адваротны ход. Аднак традыцыі пратэсту ў нашым грамадзтве апошнім часам вельмі слабыя… Думаю, пры нармальнай уладзе можна было б хутка аднавіць набыткі, якія ўжо былі ў гэтай справе.

Ю.Б.: Калі мы гаворым пра розныя варыянты, ці моўныя стандарты, трэба быць вельмі асьцярожнымі. Прыемна, што ў апошнім “ARCHE” пры апытаньні наконт дарэформавага моўнага стандарту частка рэспандэнтаў адказала: ёсьць адна беларуская літаратурная мова, і трэба найперш дбаць пра культуру гэтай мовы. Штодня вакол нас гучыць нізкакультурная, з агромністай колькасьцю сыстэмных парушэньняў, беларуская мова. І найперш такому размываньню сыстэмы літаратурнай мовы мы мусім процістаяць. Пры гэтым, пэўне ж, ня варта спэкуляваць паняткамі “тарашкевіца” й “наркамаўка”, каб абываталь ня думаў пра розныя беларускія мовы, паміж якімі прорва. Прорва калі й ёсьць, то паміж дагледжанай і недагледжанай беларускай моваю.

Зьміцер Санько: Карэктней будзе гаварыць не пра моўныя варыянты, а пра варыянты правапісу. Калі мы гаворым пра варыянтнасьць і ўжываем азначэньні “наркамаўка” і “тарашкевіца”, то людзі нярэдка занадта шырока трактуюць іх — ня толькі ў правапісным сэнсе. Прыхільнік “тарашкевіцы”, маўляў, часьцей ужывае забытыя словы, унікае русізмаў, карыстаецца больш уласьцівымі для нашай мовы марфалягічнымі сродкамі і г.д. Але ж гэта пытаньні культуры мовы, густу, перавагаў. Калі падыходзіць да праблемы строга, дык казаць пра варыянты беларускай мовы ніяк не выпадае. Яскравае сьведчаньне гэтага — розьніца ў маўленьні прыхільнікаў таго ці іншага правапісу, якая, аднак, не закранае велізарнага пласту лексыкі, а датычыць толькі абмежаванага корпусу пазычаньняў з заходнеэўрапейскіх моваў.

Г.Ц.: Мы гаворым пра два варыянты правапісу. Правапіс не ахоплівае канчаткаў і іншых граматычных правілаў — гэтая праблематыка была далучаная пазьней, у рэформе 1933 г. У правапісе павінна быць адназначнае рашэньне: пішы “а” ці “о”. Што датычыць граматыкі, дык яна ніколі не кадыфікуе, што трэба пісаць толькі так і ніяк іначай: яна дапускае пэўныя варыянты і варыяцыі. Сёньня адбываецца пэўная ідэалягізацыя: на правапіс пачынаюць наслойвацца розныя марфалягічныя, сынтаксычныя, лексычныя ды іншыя зьявы. Гэта якраз і параджае варыянты літаратурнай мовы. Самі ж правапісы не ўтвараюць варыянтаў мовы. У іншых мовах таксама ёсьць па некалькі правапісных традыцый, якія не перашкаджаюць мове існаваць як адзінаму арганізму. Таму давайце гаварыць пра “наркамаўку” і “тарашкевіцу” толькі на ўзроўні адрозьненьняў правапісу, а ня лексыкі, марфалёгіі. Іначай мы сапраўды пачынаем гаварыць пра два варыянты літаратурнай мовы, а то і пра дзьве адрозныя літаратурныя мовы.

З.С.: Аднак існаваньне варыянтнасьці ніяк не паніжае рэальнага статусу нашай мовы. Я ня ведаю такіх людзей, якія б адмаўляліся ад мовы з тае прычыны, што ёсьць варыянты правапісу. Той, хто настойліва сьцьвярджае гэта, проста імкнецца, на мой погляд, затушаваць сапраўдныя прычыны вядомага становішча.

Алесь Белы: Так ці інакш, “наркамаўка” і “тарашкевіца” — больш чым дзьве сыстэмы правапісу, бо шмат чаго іншага тут наслойваецца. Мне асабіста ня вельмі падабаецца “наркамаўка”, але я аддаю перавагу ейнаму палепшанаму варыянту, бо яна эмацыйна больш спакойная — дзякуючы наяўнасьці большай колькасьці тэкстаў, большай колькасьці слоўнікаў і г.д. Гэты масіў больш нэўтральны. А корпус тэкстаў на “тарашкевіцы” больш нэрвовы, эмацыйны, вельмі палітызаваны... Падбор тэмаў, на якія ствараюцца тэксты на “тарашкевіцы”, магчыма, адштурхоўвае пэўную частку грамадзтва. Але адрозьненьні паміж “тарашкевіцай” і “наркамаўкай” — зусім не галоўная прычына таго, што сёньня так звузілася поле выкарыстаньня беларускай мовы. Нельга казаць адназначна пра маргіналізацыю беларускай мовы. Яна працягваецца, але ёсьць і зрухі ў процілеглым кірунку. Па радыё цяпер значна болей, чым раней, чуваць

песьні па-беларуску (у сувязі зь вядомымі палітычнымі падзеямі). Гэты трэнд у процілеглы бок таксама існуе, і яго нельга не заўважаць.
Калі мы спрабуем знайсьці, як пашырыць сфэру ўжываньня беларускай мовы, дык ня самае важнае для спрэчкі — выбар таго ці іншага правапіснага варыянту. Тут было сказана пра неабходнасьць дзяржаўнай падтрымкі беларускай мовы. Магчыма, гэта і так. Але мова афрыкаанс у Паўднёвай Афрыцы ці французская ў Квэбэку не карысталіся ніякай падтрымкай уладаў Брытанскай імпэрыі... Давайце зыходзіць з таго, што ў наступныя 10—15 гадоў дзяржава ніяк ня будзе абараняць беларускай мовы і імкнуцца пашырыць поле ейнага выкарыстаньня. Цяперашні дзяржаўны апарат інстынктыўна баіцца, што гэта дазволіць яму лёгка страціць ініцыятыву. Гэта ня дужа прынцыповая саступка, але ўлада баіцца, што за ёй могуць пайсьці іншыя саступкі.
Гістарычна беларуская мова зазнала сваю пару росквіту як канцылярская. У XV—XVII стагодзьдзях старабеларуская мова (як сьведчаць шматлікія дакумэнты тых часоў) была вельмі добра прыстасаваная для натарыяльнага ўжытку. Але ў нашым цяперашнім ужытку зусім няма натарыяльна пацьверджаных дакумэнтаў па-беларуску! Можа, сярод усяго корпусу прыватных натарыюсаў нашае краіны знайшліся б пара чалавек, якія добраахвотна згадзіліся б на просьбу двух бакоў афармляць даверанасьці й іншыя дакумэнты па-беларуску? Калі б быў такі прэцэдэнт, якому можна надаць грамадзкі рэзананс, дык справай гонару беларускамоўнай грамады было б зьвяртацца да такога натарыюса. А ў эканамічна актыўных грамадзянаў патрэба зьвярнуцца да натарыюса ўзьнікае сама меней 2—3 разы ў год.
В.Б.: Ёсьць бліжэйшы для нас прыклад, чым Паўднёвая Афрыка ці Квэбэк. Гэта Польшча пасьля падзелаў. Тры дзяржавы, якія падзялілі паміж сабой Польшчу, асымілёўвалі ейнае насельніцтва, але грамадзтва знайшло адатруту, якая дазволіла захаваць нацыянальную самабытнасьць. А ці склалася ўжо цяпер у Беларусі грамадзянская супольнасьць, якая ўзяла б на сябе задачы стварэньня недзяржаўных дзіцячых садкоў, школак і г.д.? Ці ў нас толькі дзяржава ўплывае на станаўленьне беларускай нацыі? У такім разе застаецца толькі адно вельмі сумнеўнае выйсьце: інтэлектуальна асымільваць

палітычную эліту, прышчапляць ёй вартасьці свайго сьветапогляду.

Ян Запруднік: Магчыма, варта паглядзець на валійскую грамаду: як яны выжываюць у сябе ў Англіі? Пазнаёміцца з досьведам ірляндцаў: як яны зьберагаюць родную мову, зь якімі мэтодыкамі яны падыходзяць да дзяцей, зь якімі — да іхных бацькоў? Думаю, тут было б шмат карыснага.
Г.Ц.: У нас гэтыя мэтодыкі не заўсёды спрацоўваюць. Трэба шукаць розныя падыходы. Я ведаю, як пачыналася нацыянальнае адраджэньне ў Чэхіі. Там усё пачыналася зь піўных. Нацыянальная эліта зьбіралася піць піва там, дзе гаварылі па-чэску. Можна ж было пайсьці ў любое іншае месца... Я так і казаў некаторым нашым нацыянальным дзеячам: “Каб вы завялі дзьве беларускія карчмы, дык было б карысьці больш, чым ад усіх вашых выступленьняў”.
У нас ёсьць вельмі вялікая аналёгія з той чэскай сытуацыяй. Так, Ёзаф Добраўскі, адзін з пачынальнікаў чэскага адраджэньня, да 10 год не карыстаўся чэскай мовай, а гаварыў па-нямецку. Але ён заўжды казаў “наша мова”, маючы на ўвазе чэскую. Так і вынікі нашага апошняга перапісу паказваюць, што вялікая частка насельніцтва прызнае сваёй мовай беларускую, але ёй не карыстаецца.
В.Б.: У мяне ёсьць пытаньні да Янкі Запрудніка. Як Вам падаецца, ці перажыла “наркамаўка” за апошнія 10 гадоў эвалюцыю? І яшчэ. Эміграцыя, хаця і прызнавала толькі “тарашкевіцу”, але перажыла пэўныя ўнутраныя моўныя разломы: быў Янка Станкевіч, які ніколі ня браў пад увагу моўны узус, былі іншыя “дэструктары”...
Я.З.: На эміграцыі правапісная трасянка была ад самага пачатку. “Тарашкевіца” была мадэрнізаваная: Тарашкевіч не пісаў зь мяккім знакам асобных прыназоўнікаў.
У эміграцыйным ужытку пасьлядоўнасьці тут не было. Айцец Леў Гарошка не ўжываў мяккіх знакаў у прыназоўніках, Антон Адамовіч заўжды пісаў, напрыклад, “у цар***сьць***ве”. Разнабой быў, але ніколі не было ніякіх спробаў асэнсаваць і ўніфікаваць гэтую правапісную практыку. Думаю, менавіта цяпер у “тарашкевіцы” і варта было б навесьці ўніфікацыю, бо разнабой дужа шкодзіць прэстыжу гэтага варыянту.
Што да “наркамаўкі”, мне цяжка пра яе меркаваць, бо я

спэцыяльна гэтым не займаўся. Думаю, яна будзе існаваць, але нам ня трэба дужа пераймацца, якая яна будзе: нам трэба навесьці парадак у сваёй сфэры, у “тарашкевіцы”.
Г.Ц.: Калі ж мы гаворым пра два варыянты, дык трэба аднолькава паважна ставіцца да іх. Я некалі вельмі рэзка адказаў Дубаўцу, калі ў “Нашай Ніве” публікаваліся лісты пра “каляніяльны правапіс”. Гэта неэтычна і ў маральным пляне нядобра. Большасьць людзей, якія валодаюць беларускай мовай, карыстаюцца гэтым правапісам. Нельга казаць, што яны дурні, — гэта ніяк не падвышае статусу беларускай мовы! Мы ставім людзей у вельмі цяжкое становішча: нехта валодае толькі адной правапіснай сыстэмай, а мы гаворым, што ён карыстаецца дрэннай сыстэмай. Дзе ён можа засвоіць іншую? І ствараецца ўскладненая моўная сытуацыя, пра якую я ўжо казаў.
Я.З.: Я хацеў бы падтрымаць гэтую думку. У грамадзтве і так багата вострых канфліктаў. І трэба ставіцца з абсалютнай пашанай да другога правапіснага боку, не антаганізаваць. Сёньня стаіць пытаньне: быць ці ня быць? І сёньня лепей мець чалавека, які піша на “наркамаўцы”, чым русіфікаванага. Таму ня трэба пускаць стрэлаў у той бок, а спакойна глядзець на гэты стан, які гістарычна абумоўлены. Такі падыход, такі пагляд дапаможа беларушчыне існаваць і рухацца наперад.
А.Б.: Незалежнымі СМІ сапраўды створаны такі стэрэатып: ёсьць моўны варыянт вышэйшага гатунку, а ёсьць такі, які можна хіба што трываць. Хаця мне здаецца, што ў абодвух варыянтаў ёсьць шмат недасканаласьцяў. Тое, што ўлады сваім часам падтрымалі адзін варыянт, не азначае, што ён ім бліжэйшы. Проста іх задавальняе сама гэтая сытуацыя разладу ў непадкантрольным ім адраджэнскім асяродку. Цяпер ня той час, калі можна марнаваць высілкі на высьвятленьне таго, які варыянт лепшы. У такіх варунках найлепш было б абвесьціць маўклівы ці нават фармалізаваны нэўтралітэт у гэтай спрэчцы паміж прыхільнікамі “наркамаўкі” й “тарашкевіцы”.
В.Б.: Але ідэолягі абодвух кірункаў не кантактуюць паміж сабой. Людзі існуюць у сваіх “судзінах”, замкнёных асяродках. Спробы першай паловы 90-х запачаткаваць дыялёг — сустрэчы, канфэрэнцыі — зьведзеныя на нішто. Як у такіх варунках можна захоўваць нэўтралітэт? Я параўноўваю нашую сытуацыю з Украінай. Там таксама ёсьць русіфікаваны Ўсход, часткова

русіфікаваны Цэнтар і больш-менш украінамоўны Захад. Там была створаная дзяржаўная камісія ў справе рэфармаваньня мовы, у якой засядалі вядомыя акадэмікі. Была адноўленая графэма “г”, якая не ўжывалася за савецкім часам. У нас жа няма нават зацікаўленасьці ў дыялёгу. Пазыцыі абсалютызуюцца абодвума бакамі: людзі жывуць з пачуцьцём поўнай праўды, ісьціны ў апошняй інстанцыі.

Г.Ц.: Хачу зазначыць, што цяпер адбываецца дыфузія, ці канвэргенцыя, абодвух варыянтаў: акадэмічнага і неафіцыйнага. Гэта адна мова, у абодвух варыянтах няма рэчаў, якія не маглі б стасавацца да другога варыянту. Так, у новым акадэмічным слоўніку (аднатомным) былі ўведзеныя як мінімум 120 новых слоў, якія ў крапівоўскіх слоўніках не ўжываліся: лецішча, спадар... І гэта толькі лексыка. Але ж актывізаваліся і марфалягічныя варыянты. Дыфузія магчымая, бо ў нас няма дзьвюх літаратурных моў. Мы маем пакуль толькі разнабой у правапісе і варыянтнасьць. Але ж ніколі ніводная граматыка не кадыфікуе, што пісаць трэба толькі так і ніяк іначай.
Аднак палітызацыя праблемы прыводзіць да таго, што з абодвух бакоў пачынаюць пераходзіць з уласна моўнага ўзроўню на іншыя.
В.Б.: А ці існуе сёньня сьвядомая палітыка русіфікацыі з боку дзяржавы?
А.Б.: Дзяржава на працягу апошніх 9 гадоў прыкладала шмат намаганьняў, каб звузіць сфэру ўжываньня беларускай мовы, але я ня стаў бы перабольшваць ролю дзяржавы. Гэта ня быў валюнтарысцкі акт з боку Лукашэнкі і ягоных памочнікаў. Дзяржава была заангажаваная ў гэтую справу толькі ў той ступені, у якой яна лічыла, што гэтыя памкненьні знойдуць падтрымку ў большасьці грамадзтва.
Так, у нас сёньня ёсьць вялікі пласт людзей, якія ня ведаюць базавых беларускіх слоў, але ня варта казаць пра русіфікацыю як тэндэнцыю, якая ажыцьцяўляецца сёньня. Мы дэ-факта сутыкаемся з тым, што вялікая частка нашых суайчыньнікаў псыхалягічна ніяк не адрозьніваецца ад грамадзянаў Расеі. Тая інфармацыйная і вобразная прастора, у якой яны жывуць, мала адрозьніваецца ад прасторы, у якой жыве насельніцтва Расейскай Фэдэрацыі. Таму сытуацыя трагічная, але дваістая:

мы дасягнулі дна, але гэта значыць, што нам ужо няма чаго губляць, няма чаго баяцца.
На працягу ўсяго XX стагодзьдзя вымываўся пласт пасіўных і несьвядомых носьбітаў беларускай мовы — жыхароў вёскі.
У гэтым сэнсе працэс русіфікацыі ішоў увесь час. Але самым трагічным у мінулым стагодзьдзі было тое, што беларуская мова не знаходзіла сабе новых сфэраў ужытку. Сфэра ўжываньня цягам апошняга паўстагодзьдзя была звужаная да “забаўляльнай фальклярыстыкі”, якая не была паўнавартаснай беларускай культурай. У нашыя дні зьнікае колькасьць насельніцтва, якое несьвядома карыстаецца элемэнтамі беларускай мовы (недзе на вёсцы). Але адначасова няўхільна расьце колькасьць тых, хто ў гарадзкім асяродку і розных прафэсійных асяродках карыстаецца беларускай мовай калі й ня ўвесь час, дык прынамсі нейкую частку яго. Таму немагчыма сказаць адназначна, ідзе русіфікацыя ці не, — усё залежыць ад асяродку.
Я.З.: Пытаньне русіфікацыі складанае: можна гаварыць пра моўную русіфікацыю, можна — пра палітычную. Сёньня ў Беларусі расьце маладое пакаленьне палітычнай дзяржавы Беларусі. Нехта зь іх будзе дзьвюхмоўным, нехта — аднамоўным. Але гэта пакаленьне палітычна сьведамых беларусаў, нават калі яны і расейскамоўныя. І гэта добра, бо для нас асноўнае — каб дзяржава выжыла. Калі выжыве беларуская дзяржава, дык беларускамоўнае адраджэньне вернецца — у той ці іншай форме. І расейскамоўны беларус будзе іншым праз два пакаленьні.

Занатаваў
Зьміцер Дзядзенка

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі

Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/23
[image]

Вацлаў Гавал

Пяць заўваг пра будучыню NATO

ВАЦЛАЎ ГАВАЛ (нар.у 1936) — культурны й палітычны дзяяч сусьветнага маштабу, былы кіраўнік Чэскай рэспублікі. Паслухаць гэты выступ у леташнім лістападзе бяз посьпеху прарываўся прэзыдэнт Лукашэнка.

Выступ прэзідэнта Чэхіі на адкрыцці канферэнцыі "Трансфармацыя NATO" ў Празе.

Шаноўныя прысутныя! Спадарства!
Перш за ўсё дазвольце прывітаць вас у Празе, выказаць вам удзячнасць за ваш прыезд і падзякаваць Аргкамітэту і Берлінскаму Аспенскаму інстытуту за добрую арганізацыю гэтай канферэнцыі.
З вашага дазволу, я б хацеў распачаць нашыя дэбаты пяццю заўвагамі, якія так ці інакш звязаныя з правядзеннем у Празе сёлетняй сустрэчы NATO на найвышэйшым узроўні.
Першая заўвага: сёння, праз 13 год пасля падзення жалезнай заслоны і ў перыяд жудасных тэрарыстычных атак на мірнае насельніцтва, кожны павінен зразумець, што галоўны супраціўнік і вораг каштоўнасцяў, якія абараняе Альянс, — не нейкая асобная дзяржава, але расцярушанае па свеце зло, таму з ім і цяжка змагацца. Наагул, дзеля выканання сваёй

першапачатковай місіі неабходна хутчэйшая і больш выразная трансфармацыя самога Альянсу. Гэта азначае ператварэнне яго ў арганізацыю, здольную эфектыўна процістаяць абсалютна новым формам пагрозаў. Сёння Альянс ужо не можа быць толькі вялікай, але ў той жа час і трохі грувасткай сістэмай, сістэмай з вялікай колькасцю камандзіраў без войска і з вялікай колькасцю камітэтаў без неабходных паўнамоцтваў, калі дзяржавы — сябры NATO гатовыя ў выпадку неабходнасці запоўніць яе асобнымі часткамі сваіх армій. Дзеля павышэння эфектыўнасці сваёй дзейнасці Альянс павінен зрабіцца арганізацыяй, забяспечанай багатай і прыдатнай для хуткае апрацоўкі інфармацыяй, арганізацыяй, здольнай вокамгненна прымаць рашэнні і адразу ж уводзіць, дзе гэта толькі спатрэбіцца, свае добра падрыхтаваныя і вышкаленыя адзінкі хуткага рэагавання ці спецыялізаваныя сілы розных арміяў, здольныя процістаяць такім сучасным пагрозам, як тэрарызм, ядзерная, хімічная ці бактэрыялагічная зброя. Можа, камусьці гэта прыйдзецца недаспадобы, але прынамсі частка гэтых адзінак павінна была б мець не толькі ваенны, але ў значнай ступені і паліцэйскі характар.

Што з'яўляецца бар'ерам ці што стрымлівае такую трансфармацыю? На маю думку, гэта не што іншае, як інерцыя, бюракратызм і выпрацаваныя за доўгія гады звычкі, якія вымушаюць сваіх носьбітаў перажываць жах ад усяго новага. Гэтую інерцыю неабходна пераадолець, і чым раней, тым лепей.

Я мяркую, што дакументы, якія рыхтуюцца на пражскім саміце NATO, звязаны з раней прынятымі стратэгічнымі намерамі і з'яўляюцца значным крокам наперад. Гэтыя дакументы не будуць вельмі цікавымі для абывацеля, і мала якія газеты надрукуюць іх цалкам. Але важней было б тое, каб гэтыя дакументы былі рэалізаваныя на практыцы.

Другая заўвага: на пражскім саміце значна пашырацца межы Альянсу. Гэта будзе самае значнае за апошні час пашырэнне, пашырэнне сапраўды знакавае. Зразумела, што гэта прывядзе да значных ускладненняў. Але, з майго пункту погляду, прынцыповае і доўгатэрміновае значэнне гэтага пашырэння будзе больш важкім, чым гэтыя ўскладненні. Толькі з яго дапамогай Альянс зможа давесці, што час падзелу Еўропы мінуў. Калі апошняе пашырэнне Альянсу за кошт Польшчы,

Чэхіі і Вугоршчыны некаторыя маглі яшчэ разглядаць як нейкі эксперымент, асцярожны намёк на змены, як простую саступку гэтым наступствам ці нават толькі як альтруістычны акт, дык сённяшняе пашырэнне ніхто не можа гэтак трактаваць. Наадварот, сёння ўжо ўсім зразумела, што Альянс не з'яўляецца нейкім клубам ветэранаў халоднай вайны, якія баяцца загадкавага жыцця ў посткамуністычных краінах, але ён сапраўды хоча стаць арганізацыяй, якая ахоплівае ўсю еўраамерыканскую культурную прастору, нягледзячы на тое, ці выказваў хтосьці нейкія прэтэнзіі на асобныя яе часткі. За апошнія стагоддзі многія вялікія дзяржавы падзялялі сферы свайго ўплыву на малыя еўрапейскія краіны, не пытаючыся іх асабістага меркавання. Рабілася гэта і публічна, як, напрыклад, пакт Молатава — Рыбэнтропа, і ўпотай — накшталт ялцінскіх дамоўленасцяў. Аднак сучаснае пашырэнне NATO азначае, што эра гвалтоўнага падзелу свету на сферы ўплыву канчаткова і беспаваротна завяршылася.

З дня заканчэння другой сусветнай вайны мінула ўжо 57 гадоў, аднак так і не адбылося якой-небудзь сусветнай канферэнцыі, якая б упарадкавала ўсе ўзніклыя перадзелы тэрыторый. Хто ведае, можа, ужо сёння — пасля такога ўсеагульнага і ясна выказанага жадання паважаць волю ўсіх еўрапейскіх краін — надышоў час правядзення гэтакай канферэнцыі ці нечага падобнага? Не ведаю, можа, правядзенне такой канферэнцыі з розных прычынаў ужо немагчыма ці нават непатрэбна. Але я згадаў пра гэтую даўно забытую праблему толькі дзеля таго, каб яшчэ раз падкрэсліць тое значэнне, якое я надаю сённяшняму пашырэнню NATO.

Калі мы гаворым пра пашырэнне NATO, мы не павінны пазбягаць пытання, калі і дзе гэтае пашырэнне павінна скончыцца і ці можа арганізацыя такога тыпу пашырацца бясконца.

Я перакананы, што пашырэнне NATO мае свае лагічныя межы і калі іх перайсці, то згубіцца агульны сэнс усёй арганізацыі. NATO для мяне выступае яшчэ і як рэгіянальная арганізацыя: яна ахоплівае вельмі спецыфічную прастору, якую называюць еўраатлантычнаю, ці еўраамерыканскаю, ці проста адным словам "Захад". Дзяржавы гэтага рэгіёну маюць блізкую гісторыю, традыцыі, сістэму каштоўнасцяў, культуру,

палітычную сістэму, уяўленні пра месца чалавека ў сусвеце. У той жа час гэта і выразна акрэслены геаграфічны рэгіён. Так, напрыклад, нікому не прыйдзе да галавы прапанаваць сяброўства ў NATO Новай Зеландыі, якая, безумоўна, цывілізацыйна бліжэйшая да Вялікабрытаніі, чым, дапусцім, Албанія. Між тым, сяброўства ў NATO Албаніі рана ці позна будзе прапанавана. Расія ж, наадварот, займае вялікую частку Еўропы, але з'яўляецца абсалютна самабытнай еўразійскай дзяржавай, таму яе сяброўства ў Альянсе таксама не мела б аніякага сэнсу. Адзінае, да чаго яно магло б прывесці, гэта да ўзаемнага аслаблення гэтых двух палітычных утварэнняў і да пагаршэння іх партнёрскіх стасункаў.

Я ўжо шмат разоў казаў і зноў яшчэ раз паўтару, што галоўнаю ўмовай эфектыўнага супрацоўніцтва дзвюх дзяржаваў ці рэгіянальных арганізацыяў з'яўляецца яснае разуменне таго, дзе кожная з іх пачынаецца і заканчваецца, дзе ляжаць іх межы, асабліва супольныя. Там, дзе гэтыя межы дакладна не акрэсленыя, звычайна адбываюцца канфлікты ці нават войны. Такім чынам, дзе пачынаецца і заканчваецца тая культурная прастора, якую Альянс ахоплівае, ці павінен быў бы ахопліваць, ці было б лагічна, каб ахопліваў?

На захадзе, безумоўна, гэта мяжа паміж Злучанымі Штатамі і Мексікай.

Наконт усходняй мяжы ў мяне няма такой упэўненасці. Шмат залежыць ад самавызначэння асобна ўзятых народаў, а не толькі ад стратэгічных кірункаў арганізацыі. Асабіста мне сёння падаецца, што акрамя дзяржаваў, якім заўтра будзе прапанавана ўступіць у Альянс, рана ці позна сяброўства ў NATO будзе прапанавана — і пра гэта ўжо цяпер неабходна ясна заявіць — такім балканскім краінам, як Харватыя, Албанія, Македонія, Сербія, Чарнагорыя ды Боснія і Герцагавіна.

А мяжа паміж захадам і ўсходам? Я лічу, што Альянс павінен дэкляраваць сваю пастаянную і нязменную адкрытасць усім дагэтуль нейтральным еўрапейскім дэмакратыям ад Фінляндыі і Швейцарыі аж да Ірландыі. Многія з гэтых краін настойваюць на гістарычных традыцыях свайго нейтралітэту, і мы, вядома, усё гэта паважаем. Але ўсё ж такі, з майго пункту погляду, усе гэтыя краіны рана ці позна пачнуць задавацца пытаннем пра сэнс і змест нейтралітэту ў сённяшнім грамадстве, што ён

абазначае, што дазваляе і, наадварот, што робіць немагчымым. Безумоўна, існаванне двух вялікадзяржаўных блокаў для многіх краін з шматлікіх прычынаў мае вялікае значэнне для захавання нейтралітэту, нягледзячы на магчымае асабістае стаўленне да аднаго з азначаных блокаў. Але калі такія блокі ўжо не існуюць і калі супольным ворагам усіх людзей з'яўляецца арганізаваная злачыннасць, тэрор ці шырокае выкарыстанне зброі масавага знішчэння, навошта тады гэты нейтралітэт? Ці можна захаваць нейтралітэт пры масавай пагібелі цывільнага насельніцтва ад тэрарыстычных актаў?
Трэцяя заўвага: NATO з'яўляецца арыгінальным аб'яднаннем дзвюх блізкіх і ў той жа час геаграфічна і ў многім ментальна даволі аддаленых частак свету: Паўночнай Амерыкі і Еўропы. Многае сведчыць пра тое, што сённяшні час, час вялікіх зменаў і трансфармацый, становіцца і часам выпрабавання на трываласць узаемаадносінаў Амерыкі і Еўропы і што будучы лёс NATO залежыць галоўным чынам ад таго, хто гэтае выпрабаванне вытрывае.
Асабіста я лічу, што ў будучыні абедзве часткі гэтага саюзу змогуць дзяліць функцыі сваёй дзейнасці паміж сабой больш эфектыўна, чым дагэтуль, і таксама будуць больш неабходны адна адной. Таму іх палітычнае аддаленне сёння азначала б велізарную гістарычную памылку і нават катастрофу.
Што неабходна рабіць у гэтай сітуацыі?
Я думаю, што галоўным мусіць быць імкненне лепей разумець і адчуваць адзін аднаго.
Еўропа не павінна забываць, што дзве самыя страшэнныя ў сусветнай гісторыі вайны распачаліся на яе тэрыторыі праз канфлікт паміж еўрапейскімі краінамі і што ў абодвух выпадках менавіта Злучаныя Штаты — не будучы нават вінаватымі ва ўзнікненні гэтых канфліктаў — у пераломны момант дапамаглі перамагчы сілам свабоды і справядлівасці. І хто ведае, ці здолела б Заходняя Еўропа выстаяць у халоднай вайне і не саступіць сталінскай савецкай, ці камуністычнай экспансіі без велізарнага патэнцыялу Злучаных Штатаў, нават і ў рамках NATO. І потым зноў менавіта Злучаныя Штаты сталі ініцыятарам, хоць запозненым і недасканалым, вырашэння некаторых еўрапейскіх канфліктаў, што ўзніклі пасля падзення жалезнай заслоны. Ці здолела б Еўропа вырашыць гэтыя праблемы самастойна? Я ў гэтым не ўпэўнены. Да ўсяго, што

нам давялося перажыць і што адбываецца цяпер, у той ці іншай ступені мелі і маюць дачыненне і ЗША. Таму еўрапейцы павінны былі б лепей усведамляць крыніцы і характар амерыканскай адказнасці і з разуменнем ставіцца, калі гэта было б неабходна, да грамадзянскай глухаты, нязграбнасці ці фанабэрыі, якія могуць суправаджаць гэтую адказнасць. Я мяркую, што кожны еўрапеец, якога раздражняе амерыканскі спосаб заваёвы сусветнай эканомікі сваімі глабальнымі карпарацыямі, павінен усвядоміць, што ўся культура прыбытку і эканамічнай экспансіі спачатку ўзнікла ў Еўропе, а потым была запазычана ЗША. Таму злосць на ўласнае адлюстраванне ў люстэрку не з'яўляецца разумнай. Урэшце, гаворка не пра недапушчальную этнізацыю праблемы. Гэтыя ж вялікія карпарацыі невыпадкова называюцца "транснацыянальнымі".

З другога боку, і Амерыка мусіць прызнаць, што сваёй веліччу і сваёй сілай яна абавязана ў значнай ступені сваім еўрапейскім цывілізацыйным караням, таму Еўропа ёй яшчэ спатрэбіцца. Не так ужо і цяжка ўявіць, што праз 10—20 гадоў на іншых кантынентах нашай планеты з'явяцца сама меней такія ж развітыя краіны, як і ЗША. Цесна звязаныя з паўмільярднай Еўропай у цывілізацыйным, культурным, палітычным планах і ў пытаннях узаемнай бяспекі, гэтыя краіны змогуць у будучым стаць процівагай Злучаным Штатам. Таму складаная дамова з футрам, поўным блохаў, якім часам здаецца Еўропа амерыканцам, усё ж такі мае сэнс і яе неабходна рэгулярна падаўжаць. Дзе яшчэ зможа знайсці Амерыка такога духоўна блізкага саюзніка ці партнёра, як не на еўрапейскай зямлі?
Чацвёртая заўвага: паўгоду таму на сустрэчы прадстаўнікоў NATO і Расіі ў Італіі ўступілі ў дзеянне новыя, больш трывалыя інстытуцыянальныя дамоўленасці паміж гэтымі двума значнымі ўтварэннямі. Я з напружаннем чакаю паведамлення пра тое, як гэтае новае партнёрства сябе праявіць, да якіх вынікаў яно прывядзе, як дапаможа ў сумеснай барацьбе з тэрарызмам і іншымі небяспечнымі з'явамі, што пагражаюць гэтым абодвум утварэнням.
Тым не менш, я быў бы рады зноў успомніць пра тое, што гаварыў у Рыме: гэты трывалы саюз NATO і Расіі ні ў якім разе не павінен выклікаць уражання, што багатае паўночнае паўшар'е якімсьці чынам жыве за кошт бяднейшага поўдня ці

наагул усіх кантынентаў. Мы ўступаем у эру шматпалярнага свету, палітычны лад і сістэма нацыянальнай бяспекі якога мусілі б вырастаць з прынцыпу роўнасці розных цывілізацыйных і культурных прастораў, розных рэлігій, розных рэгіянальных арганізацый і кантынентаў. Апрача будаўніцтва добрых узаемаадносін з Расіяй, з майго пункту гледжання, неабходна ўжо сёння — чым раней, тым лепей — вызначыць узаемаадносіны NATO і іншых значных дзяржаўных ці рэгіянальных утварэнняў.

Асабіста я заўсёды падкрэсліваў, што NATO азначае супрацоўніцтва дзеля абароны пэўных каштоўнасцяў. Пад гэтым я звычайна разумею дэмакратыю, прававую дзяржаву, рынкавую эканоміку, правы чалавека, свабоду слова і г.д. Насамрэч так яно і ёсць. Але ўсё ж такі я б рэкамендаваў выбіраць больш дакладныя паняткі і гаварыць хутчэй не пра каштоўнасці, а пра пэўнае, у нашым выпадку заходнееўрапейскае, разуменне агульначалавечых каштоўнасцяў. Калі мы адназначна абвяшчаем, што прадстаўляем і абараняем пэўныя каштоўнасці, гэта можа выклікаць уражанне, нават калі гэтага мы і не хацелі, што іншыя прадстаўляюць і абараняюць нейкія псеўдакаштоўнасці. Я не думаю, што ў чалавецтва ёсць вялікі пазітыўны досвед што да прэтэнзій адных на тое, быццам толькі яны ёсць захавальнікамі праўды і сапраўдных багоў. Гэта ў сваю чаргу можа азначаць, што яны з'яўляюцца нечым большым, чым астатнія, якія паўстаюць у вобразе варвараў, паганцаў ці дзікуноў. Думаю, што наадварот, у імя барацьбы з дзікунствам за праўду было зроблена шмат дзікіх і страшэнных спраў. Гэтае паразуменне з іншымі людзьмі, культурамі і традыцыямі й імкненне не ўзвышацца над імі, а, наадварот, будаваць раўнапраўныя стасункі не азначае нейкага адступлення ад уласных уяўленняў ці стандартаў, не азначае неабходнасці ўтойваць свае перакананні ў інтарэсах узаемапаразумення. Якраз наадварот, аўтэнтычныя сяброўскія адносіны не могуць грунтавацца на хлусні, а могуць вырастаць толькі з жыватворнай атмасферы ўзаемнай адкрытасці.

Два невялікія прыклады. Цяжка ўявіць, як хтосьці мог бы разам з расійцамі супрацьстаяць сусветнаму тэрарызму, калі б даў ім зразумець, як ставіцца да іх вайны супраць чачэнскага народу. Цяжка ўявіць і сумесную барацьбу з Кітайскай Народнай

Рэспублікай за правы народаў на самабытнасць, калі б было выказана меркаванне наконт яе палітыкі ў Тыбеце.
Спадарства! Шаноўныя прысутныя! Дазвольце мне зрабіць сваю пятую і апошнюю заўвагу.
Сёння шмат гаворыцца пра тое, ці можна чыніць супраціў супольнай пагрозе ў самым яе пачатку, прэвентыўна, г. зн. да таго моманту, калі яна ператворыцца ў сапраўдную навалу, нават калі гэта робіцца за кошт парушэння дзяржаўнага суверэнітэту, ці наагул так нельга рабіць. З гледзішча NATO, гэтая дыскусія азначае па сутнасці дыскусію пра тое, ці магчыма ўмяшанне па-за рамкамі пятага артыкулу Вашынгтонскай дэкларацыі.
Гэта вельмі складанае пытанне, і неабходна ставіць яго кожны раз, зноў і зноў шукаць на яго адказ, бо не існуе агульнага адказу на ўсе магчымыя выпадкі, але нават калі хтосьці яго і знайшоў, то ён апынецца ў вельмі складанай і няўстойлівай сітуацыі.
Асабіста я звычайна схіляюся да таго, што злу неабходна супрацьстаяць у самым яго зародку, да таго моманту, калі яно разрасцецца, і я таксама лічу, што чалавечае жыццё, свабода і годнасць больш значныя, чым дзяржаўны суверэнітэт. Якраз гэтая мая схільнасць і дае мне права падаваць гэтае пытанне як сапраўды вельмі важнае і складанае.
За маё жыццё ў нашай краіне адбылося дзве падзеі, абедзве з вельмі сур'ёзнымі і глыбокімі наступствамі; адна з іх — Мюнхенская змова, калі дзве галоўныя еўрапейскія дэмакратыі адступілі нібыта ў інтарэсах міру пад націскам Гітлера і дазволілі яму парваць тагачасную Чэхаславакію на кавалкі. Аднак яны, безумоўна, так і не здолелі захаваць хоць які мір. Наадварот, якраз іх паводзіны падчас падпісання Мюнхенскай дамовы Гітлер расцаніў як сігнал для магчымасці распачаць крывавую еўрапейскую, а потым і сусветную вайну. Я мяркую, што не толькі я, але і большасць маіх суграмадзян разглядаюць Мюнхен як аргумент на карысць таго, што зло неабходна выкараняць на самым яго пачатку.
Другой падзеяй з'яўляецца акупацыя краіны войскамі дзяржаваў — членаў Варшаўскай дамовы ў 1968 годзе. Тады ўвесь народ паўтараў слова "суверэнітэт" і праклінаў афіцыйнае савецкае цверджанне, нібыта ішлося пра "братнюю дапамогу", якая ажыццяўлялася ў імя каштоўнасці значна

вышэйшай, чым дзяржаўны суверэнітэт, г. зн. у імя сацыялізму. Сцвярджалася, што ў нас узнікла пагроза сацыялізму і тым самым пагроза навісла над самой надзеяй чалавецтва на лепшае жыццё. Амаль кожны з нас разумеў тады, што насамрэч гэта была праява вялікадзяржаўнага шавінізму і эканамічнай экспансіі, хаця мільёны людзей у Савецкім Саюзе сапраўды верылі, што здушэнне дзяржаўнага суверэнітэту Чэхаславакіі адбывалася ў імя вышэйшай каштоўнасці, у імя чалавека.
Гэтая другая падзея і атрыманы праз яе досвед вымушаюць мяне быць вельмі асцярожным. Сёння мне здаецца, што кожны раз, калі мы ў імя абароны чалавечага жыцця хочам умяшацца ў справы нейкай дзяржавы, мы павінны задацца пытаннем: ці не з'яўляецца гэтае ўмяшальніцтва версіяй "братняй дапамогі"? Тры гады таму я бачыў, як вярталіся сотні тысяч звычайных вяскоўцаў у свае дамы ў Косаве. Я не ведаю ніводнага прыкладу ў сучаснай гісторыі, калі праз год пасля выгнання на свае месцы вярнуўся амаль мільён чалавек. Тыя вяскоўцы з слязьмі на вачах дзякавалі мне, як прадстаўніку новай краіны — сябра NATO, за дапамогу ў барацьбе з рэжымам Мілошавіча. Я зноў добра ўсвядоміў, як добра, што дэбаты ў самім Альянсе пра неабходнасць умяшання ва ўнутраныя справы Югаславіі прыйшлі да правільнага рашэння.
Але так не можа быць заўсёды і, тым больш, рашэнні не павінны прымацца аўтаматычна. Таму заўжды неабходна ўсё добра ўзважваць. Ці сапраўды ідзе гаворка пра дапамогу людзям у барацьбе са злачынным рэжымам і абарону чалавецтва ад яго знішчэння, ці, можа, гаворка ідзе пра, зразумела, больш вытанчаную, чым савецкая ў 1968 годзе, версію "братняй дапамогі".
Адказнасці за свае рашэнні мы ніколі не здолеем пазбавіцца, заўсёды будзем яе несці — прынялі мы добрае ці дрэннае рашэнне — перад сваімі суграмадзянамі і гісторыяй. Што мы павінны рабіць, хоць і не заўсёды робім, дык гэта праводзіць усебаковае абмеркаванне ўсіх магчымых альтэрнатываў нашых дзеянняў і іх магчымых наступстваў да прыняцця канчатковага рашэння. І пры правядзенні гэтых дыскусій самым уважлівым чынам прыслухоўвацца да поглядаў, нам бліжэйшых.
Шаноўныя сябры, дзякую вам за ўвагу і зычу вам поспехаў у дыскусіях!

Прага, 20 лістапада 2002

З чэшскай мовы пераклала Наталля Прыступа
паводле www.nato.int

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/23
[image]

Ян Максімюк

Чэскі нататнік

ЯН МАКСІМЮК (нар. у 1958 у вёсцы Ляхі на Беласточчыне) — палітычны аналітык, перакладчык. У 1983 годзе закончыў Варшаўскі ўнівэрсытэт у спэцыяльнасьці "структурныя дасьледаваньні фізыкі цьвердага цела". Апошняя публікацыя — пераклад з чэскай "Дзявочага дзеньніка" Этана Бонды (Правінцыя, № 3-4).

1

Мне запомніліся некаторыя абразкі і ўражаньні з Прагі ў пачатку студзеня 1998. Выспачкі патоўчанага шкла з бутэлек ад шампанскага на Пляцы Вацлава, пасьля навагодняе ночы 1997/98. Сырое надвор'е з мокрым сьнегападам і даўкім смогам над Старым Местам. Наагул няўцямныя надпісы на крамных шыльдах. Дзівотная чэская гаворка на вуліцы і ў крамах — я ўпершыню пачуў жывую мову, у якой зьвярталі ўвагу ня толькі на націск, але і на даўжыню галосных. Падумалася мне тады пра Гамэра і антычную грэцкую паэзію, у якой — калі верыць маім настаўніцам польскай мовы зь ліцэю — істотным было не рымаваньне, а строга вытрыманая колькасьць кароткіх і доўгіх галосных у радку. У Празе доўгі час мне думалася, што нешта такое мусіць захоўвацца і ў чэскім вершаскладаньні, калі ўжо мова ў чэхаў такая сьпеўная. Тым больш што націск у чэскай мове стаіць на пачатковым складзе, а значыць, магчымасьць рымаваньня ў іх не настолькі аб'ектыўна відавочная, як у беларусаў або палякаў. Аднак у

сваіх пасьлейшых пошуках я не знайшоў ніводнага чэскага сылябатанічнага вершыку, у якім аўтар зьвяртаў бы нейкую асаблівую ўвагу на колькасьць кароткіх і доўгіх галосных у радку. Але й бяз гэтага чэская паэзія неяк выкручваецца. Вось адвольны прыклад, зь вершу Віцезслава Нэзвала (1900—1958), паэта куды важнейшага для чэскай літаратуры, чым Ярослаў Сайфарт (1901—1986), ляўрэат Нобэлеўскай прэміі 1984:

Sbohem a kdybychom se nikdy nesetkali
bylo to překrásné a bylo toho dost
Sbohem a kdybychom si spolu schůzku dali
možná že nepřijdem že přijde jiný host
(Vitězslav Nezval*, Sbohem a šáteček*, 1934)
(Чэскія кароткія галосныя: a, e, i, o, u, y; доўгія: á, é, í, ó, ú, ů, ý)

2

У першы прыезд у Прагу мне не ўдалося аформіць працаўладкаваньня на радыё “Свабодная Эўропа” / радыё “Свабода”. Той чалавек, які меўся мяне прымаць на пасаду аналітыка па Польшчы, Беларусі і Ўкраіне, захварэў і не прыляцеў з Вашынгтону. Перапрасіў і паабяцаў сустрэцца празь месяц. Я тыдзень правалэндаўся ў Празе бяз дай справы (да таго — у праваслаўныя Каляды, якія колькі жыву стараўся праводзіць зь сям’ёю). Вярнуўся дахаты ў Беласток у даволі подлым настроі. Пасада “канвэернага” перакладчыка постсавецкіх мас-мэдыяў у амэрыканскай урадавай службе FBIS (Foreign Broadcast Information Service) у Варшаве, якую я займаў больш за чатыры гады, мне настолькі абрыдла, што я ўжо перад паездкай у Прагу адчуваў сябе на працы ў RFE/RL і ня мог зьмірыцца з думкай, што пэрспэктыва пераезду ў Чэхію можа не ажыцьцявіцца.

Другая паездка ў Прагу, у лютым 1998-га, пачалася ад злавеснага папярэджаньня. На цягнік зь Беластоку, якім я на дасьвецьці ехаў на самалёт з Варшавы ў Прагу, дзесьці ў палове дарогі зваліўся слуп электраперадачы, і хвосткі ўдар разарванага дроту раструшчыў акно майго купэ, абсыпаючы мяне і яшчэ некага, прыкархулага, як і я, клубам электрычных іскраў і шклянога друзу. Мяне нават не драпанула, але мне запомніўся мой прымхлівы перапуд — гэта быў другі выразны знак лёсу (першым была хвароба майго патэнцыяльнага

працадаўцы месяц раней), што мне трэба заставацца ў Беластоку і нікуды ня рыпацца. Цягнік прастаяў сярод засьнежанай роўнядзі над Бугам некалькі гадзінаў, і я спазьніўся на свой самалёт (наступны папераджальны знак, безумоўна). Я распусьціў ладную кучу грошай, вызвоньваючы з варшаўскага лётнішча ў Прагу, каб перапісаць свой квіток на рэйс увечары. Дабраўся да гатэлю ў чэскай сталіцы недзе каля поўначы, зусім без надзеі, што з гэтае "эскапады" будзе нейкі толк.

Але на другі дзень усё пайшло як ня трэба лепш. Папярэднім разам, калі амэрыканцы прымалі мяне на працу, я правёў паўдня ў віле былога першага сакратара ПАРП Эдварда Герака каля Варшавы (дзе разьмяшчалася варшаўскае бюро FBIS), здаючы экзамен зь перакладу з расейскай, украінскай і беларускай моваў на ангельскую. Нейкага экзамэну я спадзяваўся і ў Празе, аднак нічога падобнага не адбылося. Дырэктар "RFE/RL Communications Division" вядомы саветоляг Пол Гобл запрапанаваў мне пайсьці разам зь ім на ланч у рэстаранчык пры Пляцы Вацлава, дзе мы каля дзьвюх гадзін прагаманілі за півам пра Беларусь і Ўкраіну ў агульнасьці ды Лукашэнку і Кучму ў прыватнасьці. Пад канец тае гамонкі ён сказаў мне, што быў бы рады вітаць мяне на пасадзе аналітыка ў ягоным аддзяленьні. І толькі таго.

Іншая справа, што Гобл раней працаваў у FBIS — ён мне нават сказаў, што плянаваў "экспансію" фірмы ў посткамуністычныя краіны, уключна з стварэньнем бюро ў Варшаве, — а таму, натуральна, яму былі добра вядомыя лінгвістычныя кваліфікацыі перакладчыкаў у гэтай арганізацыі. Да таго, Гобл быў адным зь нешматлікіх амэрыканскіх саветолягаў, які прыдзяляў належную ўвагу гэтак званаму *nationality question* у Савецкім Саюзе. Ён раней працаваў на розных урадавых пасадах, займаючыся балцкімі праблемамі. (Паколькі Злучаныя Штаты не прызнавалі савецкіх "урадаў" у прыбалтыйскіх рэспубліках, "балцкім пытаньнем" у ЗША можна было займацца афіцыйна, за ўрадавыя грошы.) Такім чынам, яшчэ да распаду Савецкага Саюзу ён добра ўсьведамляў, што, каб зразумець (пост)савецкую сытуацыю, недастаткова глядзець у рот толькі Крамлю і чытаць толькі маскоўскія газэты, але трэба сачыць за *окраінамі*. А таму, калі потым яму ў RFE/RL спатрэбіўся спэцыяліст па Польшчы, Беларусі і Ўкраіне, ён

перш за ўсё пачаў шукаць чалавека, які б ведаў ня толькі мовы гэтых краінаў, але, пажадана, таксама іх гісторыю і культуру. Як мне цяпер падаецца, беларус з Польшчы (да таго, зь веданьнем украінскай і расейскай моваў і чатырохгадовым досьведам маніторынгу постсавецкай прэсы) быў яму амаль ідэальнай знаходкай. Нехта мне потым сказаў у радыё, што на гэтую пасаду, якую Гобл запрапанаваў мне ў праскай гасподзе, напісалі заяўкі больш за 160 чалавек, уключна з такімі, што мелі прафэсарскія тытулы.

У 1998-м яшчэ не было ясна, ці RFE/RL не зачыняць пад канец 1999 або ў 2000, паколькі дзейны амэрыканскі закон прадбачваў урадавую датацыю для Радыё толькі да канца мінулага стагодзьдзя. Таму сэнс існаваньня “RFE/RL Communications Division”, куды мяне прынялі на працу, быў яшчэ і ў тым, каб Радыё, праз свае англамоўныя публікацыі ў Інтэрнэце і ўдзел сваіх аналітыкаў у міжнародных канфэрэнцыях, “загучала” і ў заходнім кірунку, даказваючы ўсім зацікаўленым, уключна з амэрыканскімі кангрэсмэнамі, што яго місія ня скончылася з канцом “халоднай вайны”. Мяркуючы з таго, што Радыё ўсё яшчэ існуе, мой аналітычны аддзел выканаў сваё заданьне няблага (у кожным разе, мне хочацца думаць, што ў далейшым існаваньні Радыё ёсьць і дробка мае заслугі).
Што тычылася польскай службы RFE/RL, дык яна была незаўважна закрытая ўжо ў 1993 ці 1994 годзе, не выклікаючы ні ў кога пярэчаньня што да апраўданасьці гэтага кроку. Паколькі ж доступ да свабоднай інфармацыі ў Беларусі і Ўкраіне заставаўся па-ранейшаму цяжкі, ніхто пакуль не зьбіраўся зачыняць беларускай і ўкраінскай службаў. Улічваючы тое, што таксама цяжкі быў і застаецца доступ да непрадузятай інфармацыі пра Беларусь і Ўкраіну на Захадзе, я, як аўтар кароткіх паведамленьняў пра гэтыя краіны ў RFE/RL Newsline *(http://www.rferl.org/newsline/)* і даўжэйшых кавалкаў у RFE/RL Poland, Belarus, and Ukraine Report *(http://www.rferl.org/pbureport/)*, і да сёньня маю працы пад завязку.
Карацей, дзеля таго каб уважліва прыглядацца да чэхаў ды іхных справаў, у мяне няма шмат часу. Дэмаграфічныя суадносіны выразна ня ў іхную карысьць: з аднаго боку я маю амаль 100 мільёнаў палякаў, украінцаў і беларусаў, пра якіх

мне штодня трэба ўведаць усё істотнае, што зь імі адбылося, а з другога — усяго толькі 10 мільёнаў някідкага народу, у якога ўсё йдзе “спакойненька й памаленьку”. Таму прыведзеныя далей зацемачкі наконт майго чэскага досьведу даволі абмежаваныя ў шырыні і ня надта каб глыбокія. Але мне хочацца спадзявацца, што сьведчаньні нават самага нягеглага сьведкі ўсё ж больш дарэчы, чым канстатацыі нават самага выдатнага багеміста, калі такому не пашчасьціла пажыць сярод чэхаў даўжэйшы час. Таму я й без асаблівай няёмкасьці прапаную гэтыя нататкі чытачом “ARCHE”.

3

У Празе я не адчуў аніякай “сярэднеэўрапейскай атмасфэры”. Гэта ў першую чаргу спозьнены адказ Ігару Бабкову, які калісьці ў тэлефанічнай размове запытаўся зь Менску, ці тут у Празе ня пахне Сярэдняй Эўропай. Потым я неяк забыўся патэлефанаваць яму і адказаць. Магчыма, я ня ўсюды прынюхваўся, але там, дзе сунуў нос, я нічога асаблівага ня вынюхаў.

У Ігара Бабкова ў пэрыяд “Фрагмэнтаў” была ідэфікс, зьвязаная з культуралягічным топасам “Сярэдняй Эўропы”, якую ён, відавочна, пераняў ад Мілана Кундэры. Маўляў, з аднаго боку — Захад, з другога — Расея, але ёсьць яшчэ і нешта асобнае пасярэдзіне. Гэтае паймо “Сярэдняй Эўропы” было даволі ёмістае і ахінала — прынамсі ў бабкоўскіх “Фрагмэнтах” — як Менск і Львоў з аднаго боку, так і Скоп’е з другога (ці, можа, трэцяга).

Мілан Кундэра канчаткова выбраў Захад — і тапалягічна, і культуралягічна (кінуўшы чэскую мову дзеля французскай). Ягоныя суродзічы ў Чэхіі таксама выбіраюць Захад, нават калі яны аддаюць перавагу не французскай, а ангельскай ці нямецкай мовам. Звычайныя чэхі ня надта каб цікавіліся сваімі сярэднеэўрапейскімі таварышамі па нядолі з былога сацлягеру і тым, як ім жывецца, — іх болей займае свой уласны садочак (*zahrádka*). У гэтым уцэнтраваньні на саміх сябе чэхі мне нагадваюць амэрыканцаў. Гадоў 12 таму я прынагодна запытаўся ў аднаго кіроўцы вялізнага грузавіка ў Пэнсыльваніі, ці чуў ён пра такую краіну, што знаходзіцца паміж Польшчай і Расеяй. А як жа, адказаў ён, гэта Югаславія. У Празе я бачыў чэскія кніжкі з мапамі “Сярэдняй Эўропы”, дзе Беларусь

падпісана як “Украіна” і *vice versa*.
Дарэчы, яшчэ пра мапу. Калі тры гады таму я выбіраўся зь сям’ёй на мора ў Харватыю, мне папала ў рукі невялічкая мапа (здаецца, аўстрыйская), што называлася “Сярэдняя Эўропа”. На мапе зьмяшчаліся Чэхія, Славаччына, Аўстрыя, Вугоршчына, Славенія, кавалкі Харватыі ды Босьніі і Герцагавіны, а таксама Галіцыя (польская і ўкраінская). Словам — былая Аўстра-Вугоршчына. Гэта, відаць, і ёсьць тая Сярэдняя Эўропа, якую меў на ўвазе Кундэра. Але ці не прапала яна назаўжды ўжо ў 1918-м, разам з той неверагоднай манархіяй? Застаючыся адно як заваблівы міт на бачынах кніжак Яраслава Гашака, Бруна Шульца, Робэрта Музіля або Гойміта фон Додэрэра?
У кожным разе, мне здаецца, што, жывучы на зломе 1970/80-х у Варшаве, я там больш адчуваў “сярэднеэўрапейскую атмасфэру”, чым цяпер у Празе. Тады я мог у любы дзень знайсьці ў рэпэртуары варшаўскіх кінатэатраў чэхаславацкі або югаслаўскі фільм, а ў варшаўскіх кнігарнях — кучу перакладаў з вугорскіх або баўгарскіх аўтараў. Знайсьці што-небудзь “сярэднеэўрапейскае” ў культурным рэпэртуары Прагі сёньня (за выняткам чэскага, вядома ж) — заданьне амаль невыканальнае.
На Пляцы Вацлава ёсьць некалькі кіёскаў зь міжнароднай прэсай. Паспрабуйце тут купіць нейкую польскую або мадзярскую газэту. Ды што я кажу — мадзярскую! Паспрабуйце купіць аўстрыйскую ці хоць бы славацкую!!! *Nix! Neni!* Вось вам і Сярэдняя Эўропа, *psiakrew*! Затое тут заўсёды можна набыць бяз клопату тры нідэрляндзкія штодзённыя газэты, адну турэцкую, дзьве арабскія... *К чему это?*
Праз 100 гадоў тут будзе чуваць толькі кітайская мова, аднойчы сказаў мне мой калега-аналітык Раман Кучынскі, які служыў у амэрыканскай арміі ў Віетнаме. Гэта — як рэпліка на маю заўвагу, што ў цэнтры Прагі амаль не чуваць славянскіх моваў і не відаць славянскіх антрапалягічных тыпаў.
Закругляючы тэму Сярэдняй Эўропы, я хачу сказаць, што найбольш сярэднеэўрапейскай імпрэзай, у якой мне давялося ўдзельнічаць у Празе, быў канцэрт у адным з музычных клюбаў, на які мяне з жонкай намовіў Сяргей Шупа, аматар лінгвістычных і этнамузычных пернасьцяў. Сьпявала дзеўка, у чыім генафондзе, паводле Шупы, прысутнічала сама менш палова Сярэдняй Эўропы, а падыгрывала ёй чэская капэла.

Дзеўка, якая перанеслася ў Прагу ці то зь Любляны, ці то з Заграбу, сьпявала басановы і самбы. Па-партугальску (Шупа казаў, што гэта было па-бразыльску).

4

У Польшчы я так і не дапяў як сьлед, што сабою ўяўляе Багуміл Грабал. Прачытаў адну ці дзьве ягоныя рэчы ў польскім перакладзе — не кранула. Паглядзеў фільм Іржы Мэнцэла паводле Грабалавых “Цягнікоў пад пільным наглядам” — гэта было нашмат лепшае за пераклады, але колькі там было заслугі пісьменьніка, а колькі — рэжысэра і актораў, вырашыць цяжка. А вось першая Грабалава рэч, якая мне трапілася ў Празе, калі я ўжо сяк-так стаў чытаць па-чэску, зрабіла на мяне ашаламляльнае ўражаньне. Была гэта навэла пад дзівотнай назвай “Taneční hodiny pro starší a pokročilé”, якую я потым зьбеларусіў для “Правінцыі” пад не зусім каб адэкватным арыгіналу, але, як мяркую, ня менш дзівотным загалоўкам “Танцавальныя гадзіны для старэйшых і спрактыкаваных”. Безумоўна, пры першым сутыкненьні з гэтым Грабалавым опусам чалавеку адразу прыходзіць на думку маналёг Молі Блюм у заключным эпізодзе “Ўліса” Джэймза Джойза. І тут, і там мы маем дачыненьне з маналёгам аднае асобы — у Грабала як “гаварун” выступае ягоны дзядзька Пэпін. І тут, і там мы таксама маем дачыненьне зь нястрымнай плыньню мовы, якая выліваецца “бяз ладу і складу” на шматлікія старонкі. У Джойза няма ніякіх знакаў прыпынку, але ён распадзяляе свой тэкст на некалькі абзацаў; Грабал ставіць коскі, але ўвесь ягоны тэкст ёсьць па сутнасьці адным гіганцкім сказам. Абодва пісьменьнікі пастараліся імітаваць гутарковы стыль ня надта каб адукаванага, але “моцнага ў слове” чалавека. І абодва пісьменьнікі чэрпалі ўзоры такога размоўнага стылю ад рэальных асобаў: Грабал — ад успомненага дзядзькі Пэпіна, Джойз — ад свае жонкі Норы. Ёсьць адна істотная розьніца паміж “Танцавальнымі гадзінамі для старэйшых і спрактыкаваных” ды маналёгам Молі Блюм. Джойз прыдумаў маналёг свае “Пэнэлёпы” ад пачатку да канца, у той час як Грабал абапёр сваю навэлу на ранейшыя запісы аўтэнтычных маналёгаў дзядзькі Пэпіна. Ужо пасьля публікацыі перакладу “Taneční hodiny pro starší a pokročilé” ў “Правінцыі” я натрапіў у кнігарні на сьвежавыдадзены зборнік

тэкстаў Грабала з 1940-х і 1950-х гадоў пад агульным загалоўкам “Schizofrenické evangelium”. У гэтай кніжцы была апублікаваная першапачатковая, “сырая” вэрсія навэлы “Taneční hodiny pro starší a pokročilé”, пад назовам “Utrpení starého Werthera”, якая значна больш верна імітавала і стыль, і зьмест гутарак дзядзькі Пэпіна. Вэрсія гэтая для звычайнага чытача нічым не цікавая, але для літаратурнага крытыка, якога цікавяць суадносіны паміж “жывым голасам” і яго ўвасабленьнем у мастацкім творы, — нешта абсалютна неацэннае, я б сказаў, абавязковае чытаньне. Мяне асабіста параўнаньне гэтых двух тэкстаў “з аднае крыніцы” падмацавала ў пераканаьні, што літаратура ёсьць перш за ўсё пошукам нітачкі сэнсу ў шматгалосым і бэссэнсоўным гармідары сьвету.

Дзядзька Пэпін, “Божы вар’ят” з “Танцавальных гадзін для старэйшых і спрактыкаваных”, — архетып наратара ў Грабала. Сам пісьменьнік ужываў у адносінах да такога “апавядальніка з народу” адмыслова прыдуманую назву *pábitel*, якая ў маёй галаве амаль аўтаматычна пераклалася як *байдун*. Ролю такіх “байдуноў” выконваюць афіцыянт Дзіця ў бадай ці не найвыдатнейшай рэчы Грабала, рамане “Obsluhoval jsem anglického krále”; макулятуршчык Ганця ў аповесьці “Příliš hlučná samota”; маці пісьменьніка ў навэле “Postřižiny”; жонка пісьменьніка ў “сямейнай трылёгіі” “Svatby v domě”, “Vita nuova” і “Proluky”; сам пісьменьнік у выдатным зборніку “нымбурскіх абразкоў” “Městečko, kde se zastavil čas”.

Важна адзначыць, што Грабал пісаў сваю прозу гутарковым стылем чэскае мовы, які характэрны для Прагі і яе навакольляў. Гэтая “праская” мова, якую чэхі свабодна ўжываюць ня толькі ў нефармальных сямейна-сяброўскіх абставінах, але таксама ў крамах і на вуліцы, выразна адрозьніваецца, як лексычна, так і марфалягічна, ад літаратурнага стандарту, якога навучаюць у школах і ўжываюць у сродках масавай інфармацыі. Грабал, як мала хто з чэскіх пісьменьнікаў, дасягнуў вялізнага аўтэнтызму ў моўнай характарыстыцы сваіх герояў. (З сучасных пісьменьнікаў падобную тактыку скарыстоўвае Яхім Топал, раманы якога “Anděl” і “Sestra” напісаныя на праскай гутарцы і ўключаюць шчодрую дамешку вялікагарадзкіх слэнгаў.)

Сам Грабал з гумарам сьцьвярджаў, што ён набраўся сваіх

пісьменьніцкіх ухватак у праскіх гасподах за півам. *“Мяне ў гасподзе ўсё страшна інсьпіруе, —* я выпісваю грабалаўскую цытату з кнігі сяброўскіх успамінаў пра пісьменьніка. *— Я сачу за мовай, на якой людзі тут гавораць. Зь дзяцінства жыцьцё мяне хіліла да чацьвёртага стану, да дзядзькі Пэпіна, да звычайных бедных хлапцоў, афіцыянтак, да народных разумнікаў. Толькі пазьней я пазнаёміўся з інтэлектуаламі, Боўднікам, Бондым, Марыскам, кампазытарамі, мастакамі, адвакатамі. Мне ніколі не прыйшло ў галаву пайсьці пасядзець у Клюбе пісьменьніка на Народнай алеі і паслухаць тую балбатню. Туды я хадзіў толькі калі мусіў. У звычайнай гасподзе я пазнаю, як узбагачваецца мова. Маёй асноўнай мовай ёсьць мова звычайных людзей. Мова гэтых людзей заўсёды папярэднічае мове пісьменьніка”.*

Грабал аддаваў шанаваньне чэскаму піву ў праскіх гасподах “U Sojků”, “U Háků”, “U Dvou koček” і, перш за ўсё, “U Zlatého tygra”. Кажуць, нібыта і сёньня Грабалавы сябры зьбіраюцца “U Zlatého tygra” аўторкамі, сядаюць за тым самым сталом, дзе калісьці сядзелі з Грабалам, п’юць плзэньскае піва (“Pilsner Urquell-Plzeňský prazdroj”) і “ўзбагачаюць чэскую мову”. Наагул, аднак, там цяжка знайсьці вольнае месца. Зусім звычайны абразок, калі перад уваходам у гасподу стаяць некалькі чалавек (наагул замежных турыстаў) і чакаюць, ажно нехта звольніць месца. У такіх абставінах наўрад ці можна пасмакаваць “грабалаўскай атмасфэры” “U Zlatého tygra”. Калісьці з Шупам нам удалося ўшчаміцца ў сярэдзіну і выпіць па піву пры адным гаманлівым стале. Але гармідар там быў несусьветны, так што пра літаратуру пагаварыць нам не ўдалося.

Падобнае расчараваньне мне прыйшлося перажыць у іншым “грабалаўскім” месцы — мястэчку Нымбурк, куды мы з жонкай заглянулі позьняй восеньню 2000-га. У Нымбурку Грабал правёў сваё дзяцінства і маладосьць, там ягоны айчым быў кіраўніком і потым дырэктарам мясцовага бровару, які камуністы нацыяналізавалі ў 1949-м. Пра нымбурскія гады сям’і Грабал распавядае ў незвычайна прыгожай, настальгічнай навэлы “Postřižiny” і ў кніжцы апавяданьняў “Městečko, kde se zastavil čas”. Паводле “Падстрыжынаў” Мэнцэл паставіў выдатны фільм, які я паглядзеў ужо разоў 15 у Празе, ня лічачы

некалькіх аглядаў у Польшчы.
Аднак сёньняшні Нымбурк моцна расчараваў — у гэтым мястэчку, на жаль, час не спыніўся. Адно, што звонку нагадвала грабалаўскія часы, быў стары мост над Лабай, збудаваны яшчэ перад першай сусьветнай вайной. І адна вулачка, брукаванка, абапал якой стаялі старэнькія дамкі, усё роўна што з Грабалавых расповедаў. Мы з жонкай нейк аўтаматычна павярнулі ў тую вулачку і пасьля двух дзясяткаў крокаў натрапілі на дамок з шыльдачкай “Музэй Багуміла Грабала”. У сярэдзіне аказалася, што там яшчэ знаходзіцца і невялічкі музэй прыроды — у адной залі, на подсьціле зь лісьця, качаўся і вуркатаў маленькі вожык. У залі, прысьвечанай Грабалу, можна было пабачыць адну зь пішучых машынак пісьменьніка і старонкі машынапісу зь ягонымі праўкамі, а таксама шмат фатаграфій і дакумэнтаў з нымбурскага пэрыяду. Запомнілася назва дакумэнту яшчэ з часоў Аўстра-Вугоршчыны, які сьцьвярджаў шлюб ці то Грабалавых маці і айчыма, ці то ягоных дзядоў — “Kopulační list”. Чэская мова і сёньня не перастае мяне зьдзіўляць сваімі лексычнымі вынаходзтвамі.

5

Дзесьці ў пачатку 1990-х па гасподах разам з Грабалам цягалася адна перакладчыца і літаратуразнаўца, якая на падставе таго, што пачула ад пісьменьніка, склала кніжку пад надзьмутай назвай “V rajské zahradě trpkých plodů”. Агульна кажучы, кніжка даволі бесталковая, якая фактычна не адкрывае нічога новага ні пра жыцьцё, ні пра творчасьць Грабала. Пісьменьнік “байдаваў” за півам, выдаючы жаданае за сапраўднае і *vice versa*, а тая кабета запісвала. Ну й чорт зь ёю. Аднак адна рэч мяне разьятрыла амаль да шаленства, калі я скончыў тую кніжку. У ёй ні разу ня згадваецца, які ж гатунак (гатункі) піва піў, як бы там ні было, найвыдатнейшы чэскі пісьменьнік другой паловы XX стагодзьдзя!
Так і бачыш гэтую сцэну: Грабал п’е і байдуе, тая інтэлектуальная лярва, магчыма, таксама пацягвае з кухля, каб занадта не выпадаць з карціны, але ж мордачка ёй крывіцца ад таго паскудзтва, званага півам. Такога паскудзтва, пра якое і ня варта згадваць у інтэлектуальнай кнізе… Каб дзе папала пад руку, дык задушыў бы на месцы!

Да скарбніцы чэскай народнай мудрасьці і заадно нацыянальнай культуры належыць захапленьне Грабала над чэскім півам у гасподзе “Форманка” ў Празе, якое пісьменьнік некалі выказаў “верхняму” (*vrchní* або *vrchní číšník* — старшы афіцыянт, у адрозьненьне ад звычайнага *číšníka*): “Пане верхні, што за красу вы мне прынесьлі ў кухлі! Гэтае піва зь неверагоднай пенай! Гэта ня пена, гэта бітая сьмятана, гэта не сьмятана, гэта схалоджаны пудынг! Пане верхні, гэтая ваша “Форманка” не карчма, гэта не гаспода, а Бэтлеемская капліца, у якой кожны госьць стаецца тым, кім ён бываў або хацеў бы быць; пане верхні, гэтая ваша “Форманка” не карчма, гэтая ваша гаспода — гучная самота, у якой чалавеку сьняцца найлепшыя сны. Пане верхні, Маці Божая, што за красу вы мне прынесьлі ў кухлі!”
(Бэтлеемская капліца — стаіць і цяпер у Празе; шэсьць стагодзьдзяў таму казаў у ёй свае казані вялікі рэлігійны рэфарматар і сьветач чэскай гісторыі Ян Гус. “Гучная самота” — выраз, які Грабал ужываў на акрэсьленьне ўласнай сытуацыі ў камуністычнай Чэхаславаччыне; адзін зь ягоных найбольш вядомых твораў называецца “Příliš hlučná samota”.)
Дык вось, для тае бабы гатунак піва ня меў ніякага значэньня! Я ня быў у “Форманцы”, а таму ня ведаю, які гатунак піва выклікаў Грабалаў хваласьпеў у той якраз гасподзе. Але “U Zlatého tygra” пісьменьнік піў пільзнэр.
У чэскіх гасподах традыцыйна даюць толькі адзін гатунак (зрэдку два) піва. Гэта, відаць, ня столькі зьвязанае з традыцыяй, колькі зь фінансавай выгадай: бровар адпускае гасподзе разьліўное піва па ніжэйшай цане, калі ведае, што прадавацца там будзе толькі яно.
У праскіх гасподах найчасьцей натрапіце на “Budvar-Budweiser” (бровар у Будзяёвіцах), “Pilsner Urquell-Plzeňský prazdroj” (Плзэнь), “Gambrinus” (Плзэнь), “Staropramen” (Прага), “Radegast” (Носавіцы на паўночнай Мараве), “Velkopopovický Kozel” (Вялікія Попавіцы, на поўдзень ад Прагі), “Krušovice” (Ракаўнік, на захад ад Прагі). Усе яны — вялізныя бровары, якія ў змозе вытрымаць высокі тэхналягічны ўзровень прадукцыі і жорсткую канкурэнцыю на рынку.

Традыцыйна піва аднаго гатунку падаецца ў “дзьвюх вэрсіях” — “desítka” (аб’ём алькаголю прыблізна 4 працэнты) і

“dvanáctka” (алькаголю каля 5 працэнтаў). “Дзясятка” і “дванаццатка” абазначаюць вагавы працэнт цукру ў ячменным соладзе, які варыцца ў катлах (гэты паўпрадукт называецца па-чэску *sladina*). Наагул таксама кожная значная марка піва мае сваю трэцюю вэрсію — “цёмную” (pivo tmavé, černé).
У Чэхіі ёсьць таксама куча малых мясцовых броваряў, піва зь якіх у Празе не пабачыце альбо пабачыце толькі зрэдку. Піва з аднаго такога мясцовага бровару, “Lobkowicz”, я сабе асабліва ўпадабаў. У Празе яго можна дастаць толькі ў некалькіх рэстаранчыках дзесьці на ўскраінах гораду. Аднойчы я і Шупа, якому гэтае піва таксама падышло да смаку, зьезьдзілі ажно ў Высокі Хлумэц, на поўдзень ад Прагі, дзе стаіць бровар княскай сям’і Лобкавіцаў, каб папіць нашага ўлюбёнага напою ў мясцовай гасподзе і закусіць яго мясцовай каўбасой, якая мне крыху нагадала тую, што робяць у нас на Беласточчыне. Гэта была субота, і бровар быў зачынены, так што нам не ўдалося паглядзець, як вараць піва сапраўдныя майстры.
Неяк потым, выведзены з раўнавагі немагчымасьцю дастаць лобкавіцкае піва ў сталіцы, я пазваніў у іхны бровар і запытаўся, ці яны ўвогуле прадаюць яго ў бутэльках. Аказалася, што так, толькі што вялізныя бровары (глядзі вышэй) не дапускаюць іх у крамы ў Празе, а таму іхнае піва прадаецца ў нейкіх дробных крамках, усё роўна што падпольным чынам. У бровары далі мне нумар тэлефону свайго дылера ў Празе, ад якога я дазнаўся, што піва “Lobkowicz” можна набыць у краме на вуліцы Белагорскай, 124! А я ж гэтай вуліцай пяць гадоў ежджу трамваем нумар 22 на працу! Крама мае падвойную назву: NÁPOJE MINERÁLKY і OVOCE ZELENINA. Даволі цяжка здагадацца, што тут можа быць піва. А яно ёсьць, і то якое! Увогуле, кожнаму беларусу, які апынецца ў Празе, варта было б пад’ехаць з цэнтру на трамваі 22 у бок Белай Гары (Bílá Hora), ня толькі з увагі на піва “Лобкавіц” у краме на Белагорскай, 124. Паміж прыпынкамі *“Brusnice”* і *“Pohořelec”*, па левы бок, стаіць помнік Францішку Скарыну.
Каб купіць піва “Лобкавіц” (*“Princ”, “Knížе”, “Vévoda”, “Baron”*), трэба сысьці на прыпынку *“U Kaštanů”* і вярнуцца крыху назад.

6

Цягам 90-х чэскія пісьменьнікі-дысыдэнты двух папярэдніх дзесяцігодзьдзяў сышлі ў цень, уступіўшы месца “пад сонцам”

ня столькі маладзейшаму пакаленьню калегаў па пяру, колькі перакладам з заходняй (перш за ўсё амэрыканскай) выдавецкай індустрыі, зь яе шматлікімі канькамі (дэтэктывы, жаночыя раманы, fantasy, размаітыя “срылеры” etc.). Сытуацыя, безумоўна, добра вядомая пісьменьнікам і зь іншых посттаталітарных краінаў Цэнтральнай Эўропы.
Ужо ў сярэдзіне 90-х я чуў гучныя галашэньні ў Польшчы, што “сапраўдная літаратура” канае безь дзяржаўнай падтрымкі, прыдушаная псэўдалітаратурным хлудам. Прычым гэткія скаргі паходзілі нярэдка ад пісьменьнікаў, якія ў недалёкім сацыялістычным мінулым лічылі, што якраз дзяржаўная падтрымка забівае “сапраўдную літаратуру”, даючы грошы пераважна палітычна карэктным графаманам.
Крыху падобнае нараканьне я пачуў на літаратурнай сустрэчы з выдатным чэскім празаікам Іванам Клімам, якую наладзіла амэрыканская “International School of Prague”, куды я запісаў сваіх сыноў пасьля пераезду з Польшчы. Кліма тады сказаў, паўжартам-паўсур’ёзна, што ў пасьлякамуністычны пэрыяд чэскі пісьменьнік (былы дысыдэнт) страціў свой грамадзкі ранг маральнага аўтарытэту і наагул перастаў цікавіць людзей. Калісьці, тлумачыў Кліма, пісьменьніка перапынялі людзі на вуліцы і, азіраючыся па бакох, паціху дзяліліся ўражаньнямі ад прачытанага (апублікаванага, вядома ж, нейкім самвыдатам). А цяпер, іранізаваў пісьменьнік, твае кнігі завальваюць паліцы ўва ўсіх кнігарнях краіны, але на вуліцы на цябе не забрэша нават сабака, ня кажучы ўжо пра (не)прыхільнага чытача. Патрапляючы пісьменьніку ў тон, я запытаўся, ці не хацеў бы ён, так бы мовіць, дзеля дабрабыту “сапраўднай літаратуры”, каб вярнуліся таталітарныя часы з цэнзурай і рэпрэсіямі іншадумства. На што Кліма паўабураным голасам адказаў, што свабоду нельга абменьваць на нічый камфорт, нават калі йдзецца пра камфорт маральных аўтарытэтаў грамадзтва.
Калі мне захацелася “разабрацца” ў чэскай літаратуры, я стаў купляць чэскія кніжкі, пачынаючы якраз з былых дысыдэнтаў і/або эмігрантаў — Івана Клімы, Мілана Кундэры, Паўла Когаўта, Ёзафа Шкворацкага, Эгана Гостаўскага, Івана Блатнага. Аднак акрамя “Жарту” Кундэры ніводная іншая кніжка “пазарэжымнага” чэскага пісьменьніка не зрабіла на мне значнейшага ўражаньня. Хваленая-перахваленая “Nesnesitelná lehkost bytí” Кундэры падалася “невыносна

лёгкай” і “банальнай” у параўнаньні з “Жартам”. Магчыма, таму, што “Жарт” сваёй галоўнай сюжэтнай лініяй — разьлікам з пэрыядам сталіншчыны — непасрэдна перагукаўся з гісторыяй маёй сям’і (як і галоўны герой у кніжцы Кундэры, адзін мой дзядзька (мамін брат) адбыў вайсковую службу ў “будбаце” як пакараньне за сваё палітычна некарэктнае, “кулацкае” паходжаньне; бабка, як “кулачка”, сядзела паўгоду ў турме ў Беластоку, а дзеда саветы ў 1940-м увогуле турнулі за Ўрал, адкуль ён на Беласточчыну так і не вярнуўся). Магчыма, яшчэ і таму, што дзеля поўнага разуменьня дысыдэнцкае/эмігранцкае літаратуры трэба добрае адчуваньне палітычнага кантэксту, у якім пісалася і чыталася тая літаратура. А гэтае адчуваньне зь цягам часу незваротна страчваецца. (Мне помніцца напружанасьць, зь якой чыталася “Мала apokalipsa” Тадэвуша Канвіцкага недзе ў 1981-м, у варшаўскія студэнцкія часы; калі ж нядаўна гэтая рэч зьявілася ў беларускім перакладзе, мне нават не парупіла яе пагартаць.) Кожны час, відаць, патрабуе свае літаратуры. А “звышчасавыя” творы — прыкладам, “Сто год адзіноты” Маркеса або “Гоман і ятра” Фолкнэра — зьяўляюцца даволі рэдка.

Што да сучаснай чэскай літаратуры, дык тут, збольшага, пануе сытуацыя агульнай дэзарыентацыі, як і ў іншых постсацыялістычных грамадзтвах. Даўнія карыфэі дажываюць свой век, маладыя яшчэ ня ўзьлезьлі на свае п’едэсталы. Малады плюралізм літаратурнага жыцьця (куча незалежных выдавецтваў і літаратурных пэрыёдыкаў, часта даволі эфэмэрных) ускладняе ацэнку чэскай літаратурнай сцэны для такога чытача-аўтсайдэра, як я, у якога не стае часу, каб пагартаць традыцыйна рэспэктабэльныя “Literární Noviny”, ня кажучы ўжо пра “Revolver Revue” ці нешта іншае. Аднак два прозьвішчы выразна выдзяляюцца з агульнае плыні: Міхал Вівэг (нар. 1962) і згаданы ўжо Яхім Топал (нар. 1962).

Вівэг — адзін зь нешматлікіх чэскіх пісьменьнікаў (разам з Клімам, відаць), які жыве выключна за кошт ганарараў за свае кніжкі. Раней ён быў звычайным настаўнікам чэскай мовы ў Празе, але пасьля публікацыі раману “Цудоўныя гады сабаку пад хвост” у 1992 годзе стаўся літаратурнай знакамітасьцю, атрымаў працу рэдактара ў вядучым чэскім выдавецтве, а потым увогуле кінуў усялякія пабочныя заняткі і стаў публікаваць кніжкі, у сярэднім адну на год. “Цудоўныя гады

сабаку пад хвост” — іранічна-настальгічная гісторыя (напэўна, аўтабіяграфічная) сям’і правінцыйных чэскіх інтэлігентаў, якая стараецца ператрываць пэрыяд “нармалізацыі”, што настаў пасьля інтэрвэнцыі войскаў Варшаўскай дамовы ў 1968 годзе, стараючыся ня ўвязвацца ў грамадзкае жыцьцё і абараніць сваю прыватнасьць у часы татальнай “зраўняйлаўкі”. Кніга была пасьпяхова экранізаваная (з выдатнай роляй Лібушы Шафранкавай, адной з найлепшых чэскіх акторак) і дачакалася свайго працягу пад загалоўкам “Цудоўныя гады з Клаўсам” у 2002 годзе. Увогуле, кніжкі Вівэга выйшлі ў 10-мільённай Чэхіі ў калясальнай колькасьці 750 000 асобнікаў і былі перакладзеныя амаль на 20 моваў сьвету. Што й казаць, Вівэг — паказальны прыклад фінансавага і чытацкага посьпеху “сапраўднай літаратуры” ў посткамуністычным грамадзтве. Запомнілася таксама вельмі цікавая рэклямная кампанія ягонай кніжкі, што выйшла ў 2001-м, “Román pro ženy”. Раней, на працягу паўгоду, у вагонах праскага мэтро рэгулярна зьяўляліся “аплачаныя абвесткі” ў форме мілосных лістоў аднаго хлопца, які шукаў свае нядаўняе каханкі, што пакінула яго пасьля інтэнсіўнага, але кароткага раману. Апошняя абвестка зьнімала гэтую містыфікацыю, адсылаючы ўсіх зацікаўленых лёсам памянёнай пары да новай кніжкі Вівэга, у якой лісты-абвесткі былі інтэгральнай часткай наратыву.

Вівэг, аднак, не задавальняецца “чыстым апавядальніцтвам” — яму яшчэ рупіць пахваліцца, што ён добра знаёмы зь ёмістым арсэналам постмадэрновых вычварэньняў, зь якога, акрамя правілаў канструкцыі літаратурных гісторый, ён таксама скарыстоўвае правілы іх “дэканструкцыі”. Інакш кажучы, ён прапануе чытачом “гульню ў літаратуру”, не дазваляючы ім забыцца, што яны маюць дачыненьне зь фікцыяй, чыстай выдумкай, містыфікацыяй, падробкай пад рэчаіснасьць. Часам гэткі прыём спрацоўвае няблага, як, прыкладам, у рамане “Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі”, пераклад якога друкуецца ў гэтым нумары, — самаіранічным камэнтары да працэсу канструяваньня літаратурнай гісторыі і навучаньня гэтак званаму creative writing. Аднак, акрамя гэтага постмадэрновага балясту, кніжка мае сакавітую фабулу, а таму яна цалкам цікавая і для “непостмадэрновых” чытачоў (дарэчы, яна таксама была экранізаваная, хоць і зь меншым посьпехам, чым

“Цудоўныя гады сабаку пад хвост”). Але апошні раман Вівэга, “*Případ nevěrné Kláry”* (2003), паказвае, у якую пастку можа зацягнуць празмернае захапленьне “гульнёй у літаратуру”. “*Případ nevěrné Kláry”* ўяўляе сабою імітацыю “сапраўднай літаратуры” пад дэтэктыў. Сама дэтэктыўная фабула даволі займальная для чытаньня — я прачытаў 250 старонак за два “прылягі”, калі быў прастудзіўся і два дні праваляўся ў ложку. Аднак жа акрамя гэтай дэтэктыўнай гісторыі мне нічога больш не запомнілася. Папяровыя пэрсанажы (якіх аўтар “дэканструяваў” пад канец аповеду) не выклікаюць, кажучы паталстоўску, ніякага “супераживаньня”, а таму да гэтай “сапраўднай літаратуры” прападае ў чытача ўсякая цікаўнасьць адразу пасьля прачытаньня, як у выпадку зусім звычайнага дэтэктыву. На трэці дзень я ўжо назусім забыўся, як зваўся галоўны герой кніжкі Вівэга, ня кажучы пра другарадных пэрсанажаў (адну Клару выратоўвае ад татальнага забыцьця загаловак кніжкі).

Забыцьцё, па-мойму, не пагражае кніжцы Яхіма Топала “*Anděl”* (1995) — “наркатычнай фантасмагорыі” пра ўжо зьніклы сьвет праскага кварталу Сьміхаў, які існаваў недзе на зыходзе 80-х. Кніжку нельга распавесьці нават прыблізна — ня толькі з увагі на абрывістасьць наратыву, распадзеленага на кароткія абразкі-відзяжы, што ўзьнікаюць у мозгу наркамана (галоўнага героя), але і з увагі на своеасаблівую мову, на якой яна напісана. Пасьля Грабала Топал уяўляецца найбольш радыкальным чэскім пісьменьнікам у справе пасьлядоўнага і мастацка абгрунтаванага выкарыстаньня “нелітаратурнай” гутарковай мовы. У Топала — гэта гарадзкія арго наркаманаў, прастытутак, зладзеяў, шулераў, цыганоў і чорт ведае каго яшчэ. Пра такую кніжку, як “*Anděl*”, трэ было б распавядаць або на мове, на якой яна напісана (то бок на “топалаўска-чэскай”), або канструяваць адмысловы пераклад, на што спатрэбілася б шмат часу і моўнай вынаходлівасьці. Пра гэтую кніжку мне часта думаецца; я напэўна вазьмуся яе перачытваць.

І ў мяне яшчэ стаіць на паліцы Топалава *“Sestra”* (1994) — гарадзкі раман на 450 старонках, зь якіх я прачытаў недзе 10 у кнігарні, калі знайшоў гэтую кніжку, і ўжо гады два чакаю адпаведнага моманту (мабыць, нейкай працяглай прастуды з ускладненьнямі), каб пачаць яе чытаць па-сапраўднаму. Чаго толькі вартая сама цэнтральная мэтафара Топалавай

творчасьці: любоў — сястра жыцьця?

На Вівэгу і Топалу практычна вычэрпваецца маё знаёмства з сучаснай чэскай літаратурай. Я быў зрабіў яшчэ адно намаганьне ў гэтым кірунку, але ня надта каб пасьпяховае. Недзе ў пачатку гэтага году я падслухаў просьбу аднае кабеты ў праскай кнігарні, каб ёй прадалі сьвежавыдадзеную кніжку, пра якую ўсе цяпер гавораць, што яна вельмі добрая. Я падгледзеў, што за кніжку ўзяла тая кабета, і ў іншай кнігарні купіў асобнік сабе. Хто ж ня хоча мець таго, пра што ўсе гавораць, быццам яно вельмі добрае? Кніжку напісала ўсяго 23-гадовая студэнтка культуралёгіі і мангалістыкі Карлавага ўнівэрсытэту пасьля двухгадовага побыту ў Манголіі. Паколькі ў кніжцы было аж густа ад мангольскіх словаў, я ня змог учытацца ў яе як сьлед — з таго, што да мяне дайшло пасьля хаатычнага гартаньня туды-сюды, вынікла, што кніжка ўяўляе сабою нешта накшталт споведзі мангольскай прастытуткі ад першай асобы адзіночнага ліку! О бляха-муха! Кніжка цяпер стаіць на маёй паліцы сярод іншых непрачытаных чэскіх кніжак і чакае няведама якога часу. Калі каму цікава, аўтарка называецца *Petra Hůlová*. Я, напэўна, куплю ейную наступную кніжку. Спадзяюся, гэта будзе не пра Манголію.
Мой улюбёны Яхім Топал таксама пабываў у Манголіі. У інтэрвію, якое апублікаваў “Revue Labyrint” за 2001 год, Топал сказаў нешта, што змусіла мяне глянуць глыбей у чэска-мангольскія кантакты і літаратурныя перагукі. Аказваецца, у камуністычны час Чэхаславаччына прыняла і навучыла недзе пад 15 000 мангольскіх студэнтаў (гэткая чэская спэцыялізацыя ў рамках дапамогі братнім сацыялістычным каганатам). Зразумела, усе гэтыя мангольскія магістры вярнуліся на радзіму ня пасьвіць вярблюды, а заняць добрыя, грашавітыя пасады ўва Ўлан-Батары. Дык вось, Топал сказаў “Revue Labyrint”, што ў начных рэстаранах і клюбах Улан-Батару ён пачуваўся амаль як дома ў Празе, таму што бальшыня тамтэйшых наведнікаў зусім нязмушана размаўляла зь ім па-чэску.
Ну й каб ужо закончыць гэты цяг мангольскіх асацыяцый. Праскі часопіс “Revue Labirynt” (гадавік, з падназовам “Časopis pro kulturu”) займеў пэўны ўплыў і на беларускую культуру. Ён належыць да ўлюбёных чытаньняў (ці, лепш сказаць,

гартаньняў) галоўнага рэдактара “Правінцыі” (у прыватнасьці, майго брата Аляксандра). Калі справа выданьня першага нумару “Правінцыі” падыходзіла да фіналу і нам не ўдалося запэўніць да супрацоўніцтва Лёніка Тарасэвіча пры мастацкім афармленьні часопісу, мы апынуліся ў скрутнай сытуацыі. Было цьвёрда пастаноўлена, што сваім вонкавым выглядам “Правінцыя” мае рэзка адцурацца ад 80 гадоў савецкай традыцыі афармленьня беларускіх часопісаў (ад якой, на жаль, так і не адвязаліся цяперашнія, нават з грунту несавецкія, беларускія пэрыёдыкі). А таму што адпаведнага мастака ў нас не аказалася, я закупіў стос розных чэскіх часопісаў і паслаў іх брату (ён жа і тэхнічны рэдактар “Правінцыі”) дзеля натхненьня. “Revue Labyrint” прыпаў яму надзвычайна да густу, і ён “у агульных рысах” перанёс у “Правінцыю” ня толькі макетаваньне і фармат чэскага гадавіка ды вёрстку тэксту ў дзьве калёнкі на бачыне, але таксама, як здаецца, яго таямнічую падвойную нумарацыю. Пачынаючы з 1999-га, я рэгулярна купляю “Revue Labyrint” і перадаю яго брату ў Беласток. “Правінцыі” засталося яшчэ ўвесьці каляровыя рэпрадукцыі ў сярэдзіну і больш апэратыўна рэагаваць перакладамі на выдавецкія навінкі ў сьвеце, як слушна заўважыла наша перакладчыца Хрысьціна Граматовіч, якой у Празе я паказваў “Revue Labyrint” і тлумачыў яго ролю ў эстэтычнай самаадукацыі беластоцкіх рэдактараў...

6.1 (Ladislav Fuks)

Значыць, каб было зусім ясна: мне нашмат больш падабаюцца чэскія “падрэжымныя” пісьменьнікі, кшталту Грабала, чым “антырэжымныя” Кундэра з Клімам. Хоць з Грабалам сытуацыя не зусім ясная. З аднаго боку, ён публікаваўся ў дзяржаўных выдавецтвах пасьля 1968-га і не падпісаў “Хартыі’77”, але з другога — шмат ягоных твораў выйшла за камуністычным рэжымам толькі ў самвыдатах (напрыклад, “*Něžný barbar”, “Příliš hlučná samota”, “Obsluhoval jsem anglického krále”*). Чытачы, якія спачатку былі адхіснуліся ад пісьменьніка і нават публічна выкідалі ягоныя кніжкі ў сьмецьце, зь цягам часу прабачылі Грабалу ягоную палітычную бесхрыбетнасьць і зноў палюбілі ягоную творчасьць.

А вось з Ладзіславам Фуксам (1923—1994), які ў маёй прыватнай гіерархіі чэскай літаратуры стаіць цяпер за

Грабалам, зусім іншая песьня. Ён быў, што называецца, апорай рэжыму ў літаратурным асяродзьдзі ня толькі з увагі на вернападданчыя артыкулы ў рэжымных газэтах, але таксама як творца. У 1970-я, у разгар “нармалізацыі”, Фукс апублікаваў два раманы пад яўна палітычны заказ: адзін пра ўхваленьне палітычнага рэжыму пасьля пераняцьця ўлады камуністамі ў Чэхаславаччыне ў 1948-м, другі пра дзяцінства камуністычнага героя Юліюса Фучыка (аўтара кананічнага тэксту чэскіх камуністаў, “Рэпартажу з-пад шыбеніцы”). Ды чорт зь імі, гэтымі раманамі. Ніхто іх з таго часу не перавыдаваў і, як спадзяюся, ня будзе перавыдаваць. Значэньне Фукса ў літаратуры вызначаецца кніжкамі, якія ён напісаў да і пасьля гэтых двух раманаў.

Фукс, у адрозьненьне ад плябея Грабала, паходзіў з сацыяльнай эліты: ён нарадзіўся ў сям’і высокапастаўленага афіцэра праскай паліцыі. Вывучаў філязофію, псыхалёгію, пэдагогіку і гісторыю мастацтва ў Карлавым унівэрсытэце. Доўгі час працаваў як гісторык мастацтва ў Нацыянальнай галерэі. Дэбютаваў пазнавата, апавяданьнямі ў часопісах, пад канец 1950-х. Славу здабыў сваім першым раманам, *“Pan Theodor Mundstock”* (1963), пра дробнага жыдоўскага канцылярыста, які ўзяўся перамагаць свой страх перад вывазам у канцэнтрацыйны лягер абсурдна пэдантычнай сыстэмай падрыхтоўкі да гэтага вывазу. Іронія лёсу не дазволіла яму ажыцьцявіць сваю сыстэму да канца — атрымаўшы позву аб вывазе, Мундшток выпадкова трапіў пад колы вайсковага нямецкага грузавіка. “Pan Theodor Mundstock” меў вялізарны міжнародны розгалас і быў адразу перакладзены на дзясятак моваў, перш за ўсё дзякуючы жыдоўскім асяродзьдзям, якія парупіліся разрэклямаваць гэты выдатны твор пра Халакост, напісаны, што выразна падкрэсьлівалася, нежыдоўскім аўтарам. (Кажуць, нібыта Раман Паланскі меркаваў паставіць фільм паводле гэтага раману Фукса, але потым чамусьці перадумаў. Амаль праз 40 гадоў, гэты польскі рэжысэр жыдоўскага паходжаньня і сусьветнага маштабу зьняў “Піяніста”, падобную да Фуксавай аповесьць пра выжываньне жыда ў часы нацысцкай акупацыі.)

“Pan Theodor Mundstock”, якога я ўрэшце знайшоў у праскага букініста пасьля двухгадовых пошукаў, не зрабіў на мяне асаблівага ўражаньня. Праўду кажучы, я нават не дачытаў кніжкі да канца. Нешта такое сабе... даволі пасярэдняе... У

1964-м Фукс апублікаваў зборнік апавяданьняў “*Mí černovlasí bratři”* пра сваіх школьных жыдоўскіх сяброў з часоў нацысцкага Пратэктарату Чэхіі і Маравы. А ў 1966-м выйшаў выразна аўтабіяграфічны раман — першы opus magnum Фукса — пад назовам *“Variace pro temnou strunu”*. Фактычна, пасьля гэтай кніжкі Фукс мог бы нічога больш не пісаць, а і так займеў бы пачэснае месца ў чэскай літаратуры.
“Variace pro temnou strunu” (у польскім перакладзе, які я прачытаў недзе ў сярэдзіне 1970-х, кніжка называлася “Wariacje na najniższej strunie”) — гэта вытанчаны аповед пра дасьпяваньне звышуражлівага хлопца Міхала ў сям’і высокага паліцыйнага ўрадніка ў Празе 1930-х гадоў. Кніжка, якая мяшае яву і сон, рэчаіснасьць і мрою, пакідае несьціральнае ўражаньне нейкай недасказанасьці, невымоўнай таямніцы. Якой — гэтае веданьне прыйшло да мяне толькі ў Празе, калі я прачытаў артыкул пра Ладзіслава Фукса ў штотыднёвым дадатку да газэты “Mladá fronta Dnes”.

Аказваецца, Фукс быў гомасэксуалістам і з гэтай прычыны цярпеў неафіцыйны астракізм у пісьменьніцкім асяродзьдзі, які значна ўзмацніўся пасьля Фуксавай падтрымкі рэжыму ў пэрыяд “нармалізацыі”. У 1960-я ці 1970-я гомасэксуалізм у краінах сацлягеру заставаўся цалкам у паласе сацыяльнага асуджэньня як “вычварэнства”. Таму й ня трэба занадта зьдзіўляцца, што ў 1964 годзе, пасьля сусьветнага посьпеху свайго першага раману “Pan Theodor Mundstock”, Фукс спрабаваў “нармалізаваць” сваё прыватнае жыцьцё жаніцьбай з італьянскай арыстакраткай, гідам ягонага падарожжа па Італіі і наведваньня італьянскіх унівэрсытэтаў у 1964-м, нейкай Джуліянай Ліміці. Шлюб у базыліцы ў Міляне быў вельмі пышнай міжнароднай імпрэзай, віншаваньні надышлі як ад папы, так і першага сакратара Італьянскай кампартыі. Што сталася потым, ніхто дакладна ня ведае. Паводле спомненага артыкулу ў дадатку да “Mladá fronta Dnes”, Фукс даў драла ў самы апошні момант, ад ложа, у якім чакала ўцехаў сужонства ягоная выбраньніца. Уцёкі Фукса ад жонкі з Італіі ў Чэхаславакію спарадзілі агромністы дыпляматычны скандал і зрабілі Фукса, што зусім зразумела, аб’ектам шматлікіх анэкдотаў у Празе. Вянчаньне ў Італіі было для Фукса настолькі траўматычным перажываньнем, што ён пазьней

зьнішчыў усе захаваныя здымкі Джуліяны і ні словам не абмовіўся аб ёй у аб'ёмістай (амаль 500 старонак) кнізе сваіх успамінаў, якую сьпісаў у 1993-м ягоны літаратурны сакратар і асыстэнт Іржы Тушл. (Тушл згадаў гомасэксуалізм Фукса і ягоную жаніцьбу ў Італіі ў неаўтарызаваных камэнтарах-"інтэрмэццах" да ўспамінаў, якія выйшлі ўжо па сьмерці пісьменьніка.)

Потым жыцьцё Фукса афіцыйна вызначалі адно выданьні ягоных чарговых раманаў. "Spalovač mrtvol" (1967) стаўся абавязковым чытаньнем у чэскай сярэдняй школе (у 1968-м славацкі рэжысэр Юрай Герц паставіў неблагі фільм паводле гэтай змрочна-панурай кнігі Фукса). У 1971-м выйшаў "Příběh kriminálního rady" (дэтэктыў, які абыгрывае псыхалягічна-фабулярную схему, закладзеную ў "Variace pro temnou strunu"), а ў 1972-м — "Myši Natalie Mooshabrové" (своеасаблівая "кніга жахаў"). У 1983 годзе выйшаў апошні твор Фукса і заадно ягоны другі opus magnum — панарамічны раман "Vévodkyně a kuchařka" ("Княгіня і кухарка"), пра Аўстра-Вугорскую манархію на схіле XIX стагодзьдзя, сузіраную вачыма арыстакраткі з даволі складаным прозьвішчам Sophia la Talliére d'Hayguéres.

Потым Фукс пражыў 10 гадоў у самоце і забыцьці, так і ня ўцяміўшы да канца, паводле сьведчаньняў сваіх сучасьнікаў, значнасьці гістарычнага пералому, які адбыўся ў ягонай краіне ў 1989/90. Але гэта ня так ужо істотна. Ладзіслаў Фукс, паводле майго перакананьня, пакінуў такі сьлед у чэскай літаратуры, якога ня змогуць ігнараваць ніякія рэжымы. У 1994-м выйшла перавыданьне "Myši Natalie Mooshabrové", а сёлета — "Spalovač mrtvol". Я ня трачу надзеі, што неўзабаве перавыдадуць "Variace pro temnou strunu", якую мне рупіць прачытаць па-чэску з часу, як я апынуўся ў Празе. А пакуль — я чытаю па кавалачку і насалоджваюся таўшчэзным томам "Vévodkyně a kuchařka", які жонка знайшла ў букініста летась...

7

Хацелася б закончыць гэтыя занатоўкі нечым лёгкім, лягчэйшым нават за чэскае піва. А што можа быць лягчэйшым за піва, калі не віно? Піва наагул прытупляе чалавека; яно добрае, каб зьняць стрэс пасьля працоўнага дня і вярнуцца дахаты ў мірным настроі. (Мая жонка яшчэ дадае,

абапіраючыся на пяцігадовыя назіраньні за чэскімі асобенямі мужчынскага полу, што піва вытварае “піўны зьвіс” у чалавека, гэта значыць выдатны трыбух, які мае тэндэнцыю зьвісаць уніз, згодна зь сілай зямнога прыцягненьня.) А віно “падкручвае” актыўнасьць чалавека і прасьвятляе ягоныя мазгі, прынамсі першыя два келіхі, недзе пад паўбутэлькі... Далей бывае парознаму. Ды ўсё ж мне — чалавеку з “усходнеэўрапейскай праваслаўнай цывілізацыі самагонкі” — было цікава і дзікавата назіраць у Празе амаль поўную адсутнасьць агрэсіі ў тутэйшых выпівохаў. Ці не таму чэхі менш агрэсіўныя, што яны ўпадабалі піва і віно больш за віскі?

Чэскае віно досыць паганае ў параўнаньні з прадукцыяй іншых “вінаградных” краінаў. Аднак у большасьці праскіх рэстаранаў, калі вы замовіце бутэльку віна, афіцыянт прынясе яе вам і адкаркуе ў вашай прысутнасьці, а потым наліе ў келіх дзеля дэгустацыі. Калі скаштуеце і вам не пасмакуе, дык можаце выбраць іншы гатунак. Толькі што чэскіх гатункаў віна ў чэскіх рэстаранах прыблізна два — “Frankovka” і “Svatovavřinecké” з чырвоных ды “Veltlinské Zelené” і “Müller-Thurgau” зь белых. Выбар невялікі, а таму вышэй упамянутая дэгустацыя — ня больш чым пусты рытуал. Усе гэта добра разумеюць, але ўсе выконваюць яго. “Wofür, zum Teufel?” — пытаюцца ня толькі немцы.

Рыхтуючыся да напісаньня гэтага тэксту, я яшчэ раз перакаштаваў пад дваццаць гатункаў чэскага віна, каб знайсьці нейкае, якое можна было б без сумневаў рэкамэндаваць чытачом “ARCHE”. Ды ўсё марна. Найлепш у Празе піць аўстралійскае, чылійскае або паўднёваафрыканскае. Праўда, смак чэскага віна залежыць ад гэтак званых акалічнасьцяў.

У апошні канцатыдзень верасьня мінулага году я з жонкай ды Кастусь і Тамара Бандарукі (нашы землякі зь Беласточчыны) выбраліся ў Бзэнэц на Мараве, на мясцовае “сьвята віна”. Бзэнэц — невялікае мястэчка, крыху меншае за Гайнаўку ці Бельск. Яно ляжыць у паласе мараўскага вінаградарства і, калі верыць маёй кніжцы пра чэскае вінаробства, ёсьць цэнтрам гэтак званага бзэнэцкага вінаробнага рэгіёну. Ды ўсё гэта малаважна. Істотна, што якраз у Бзэнцы мае свой вінаграднік Ярамір, муж Алены Ціхановіч зь Беларускай службы радыё “Свабода”. У гэтым вінаградніку я ўпершыню пасмакаваў сапраўднага вінаграду (Frankovka), зь якога робіцца віно, і

моцна зьдзівіўся, наколькі ён саладзейшы ад фінальнага прадукту, гэта значыць чырвонай сухой “франкоўкі”.
У Бзэнцы ў гэтае сьвята, акрамя маладога віна, можна папіць і “бурчаку” — віннай брагі, паўпрадукту на шляху да шляхетнага віннага напою. Што мы з Кастусём і зрабілі, уволю і ўсмак. А потым назіралі за парадам мясцовага люду на галоўнай вуліцы мястэчка, у гонар бога выпівохаў, Бахуса. Нам, прывыклым адно да першамайскіх шэсьцяў пад ідыёцкія партыйна-дзяржаўныя лёзунгі, было нязвыкла глядзець на людзей, якія публічным шэсьцем услаўлялі хмяльны напой, а не палітычных лідэраў ці праграмы. Я так пранікся сымпатыяй да бзэнэцкіх людзей, што купляў разьліўное віно на кожным латку, які яны ў той дзень паставілі ў сваім мястэчку. Віно ў Бзэнцы смакуе надзвычайна. Жонка мне потым сказала, што паедзем у Бзэнэц і ў наступным годзе, але налета руліць аўто буду я, а дэгуставаць мясцовае віно — яна...
Вось яшчэ што: людзі на Мараве ня толькі аддаюць перавагу віну перад півам, але й літаратурнай мове перад праскім плабейскім дыялектам. Інакш кажучы, яны зусім натуральна гавораць на амаль беззаганнай Oxford Czech, як героі кніжак Ладзіслава Фукса.

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/09/28**
[image]

Ёзаф Кроўтвар

Праскія кавярні

Да першай сусьветнай вайны Прага была разьдзеленая на два лягеры: адзін размаўляў па-нямецку, а другі, нашмат большы, — па-чэску. Аднак мяжа не была дакладнай і шматкроць выгіналася, цягнучыся па ўсім месьце. Тут былі ўзаемныя адступы, шчыліны, але былі й нахлёсты, і цяжка разьмежавальныя пераплёты, і зьмяшаныя асяродкі. Менавіта ў існаваньне кавярняў сьцьвярджае спэцыфічныя традыцыі дзьвюхмоўнага места і разбурае шмат якія догмы. Пршыкапы заўсёды ўважаліся за нямецкі прамэнад, праспект Фэрдынанда (сёньняшні Нацыянальны) — за выключна чэскі. Можна было б меркаваць, што кавярні на Пршыкапе наведвалі праскія немцы й нямецкамоўныя габрэі, а кавярні на супрацьлеглым баку — чэхі. І ўсё ж было ня гэтак: нямецкамоўныя кавярні хадзілі й чэхі, а ў чэскае асяродзьдзе завітвалі нямецкія госьці. Кавярні ня толькі дзялілі грамадзтва, але і ядналі яго ў вышэйшае цэлае. Нездарма Макс Брод назваў даваенную Прагу “местам палемічным”. А дзе яшчэ вучыцца палеміцы, як не ў кавярні? Кавярня заўсёды была адкрытай больш ці менш лібэральнай інстытуцыяй. Побач на праспекце гадоў маглі сядзець дзьве зусім розныя суполкі заўсёднікаў, і

ЁЗАФ КРОЎТВАР (нар. у 1942) — гісторык мастацтва, эсэіст, крытык, паэт і мастак, вядучы супрацоўнік Мастацкага прамысловага музэю ў Празе, аўтар шматлікіх кніг ды артыкулаў з гісторыі і тэорыі мастацтва. Па-беларуску друкаваліся ягоныя эсэ “Клопат з экзыстэнцыяй: мінімальная літаратура (літаратурна-філязофскі сыпгак зМО, 28 сьнежня

гэта ніякім чынам не парушала этыкі кавярні. **1994).**
Да надзвычайнага росквіту кавярняў спрычыніўся перадусім мадэрн, залатыя часы клюбнага жыцьця. Мадэрн выдумаў ня толькі вакзалы й музэі, шырокія дамскія капелюшы, прамэнады й кіёчкі для шпацыраў, ён стварыў таксама й элегантныя ўстановы з чорнай і белай кавай ды газэтамі. Шмат якія кавярні даўно ўжо зьніклі, зьмянілі назовы, былі перабудаваныя, але некаторыя дасюль трымаюцца ці цудоўным чынам адраджаюцца. З ростам гарадоў і разьвіцьцём вулічнага асьвятленьня пачынае разьвівацца і новы, тыпова гарадзкі фэномэн начнога жыцьця. Вокны кавярняў зіхацяць дапазна і прыцягваюць наведнікаў, як запаленыя маякі. Для некаторых кавярня ёсьць другім, а можа, і адзіным, домам.
Да першых мадэрновых кавярняў належала “Café Corso” на Пршыкапе, твор архітэктара Фрыдрыха Омана. Гэтая сёньня ўжо зьніклая кавярня, адзін зь першых мадэрновых будынкаў, адчынілася ў 1897—1898 гадох. У той час Оман якраз дарабляў інтэр’еры “Вар’етэ” ў Карліне, і здаецца, што лёгкая муза кіравала ягонай рукой і на Пршыкапе. На цалкам стандартны дом быў прылеплены фасад з багатай ляпной аздобай — нібыта створаны ўмелым кандытарам. Вонкавыя паверхні фасаду размаляваў Віктар Оліва, які, зрэшты, быў недалёкі ад багемных колаў. У аздобе інтэр’еру браў удзел і Арнашт Гофбаўэр, мастак і стваральнік першых па-мастацку вартасных чэскіх плякатаў. Кавярня зьмяшчалася на другім паверсе і мела балькон пад сьцяжной палатнянай стрэшкай.
“Праскі адрасны даведнік” 1896 году падзяляе кавярні на вялікія, малыя і астатнія. Дык толькі вялікіх налічана ажно трыццаць! Што тычыцца колькасьці гасьцей, найболей папулярнымі былі Пршыкапы: апроч “Continental’ю” ды “Central’ю” тут знаходзяцца “Адрыя”, “Блакітная зорка”, “Венская кавярня” і “Французская кавярня”. Далей ідуць кавярні на праспэкце Фэрдынанда, Вацлаўскім пляцы, на вуліцах Водзічкавай, Індржыскай, Жытнай і на Старамескім пляцы. Сярод “астатніх” увагі вартая кавярня пані Разаліі Шпіркавай з паэтычным назовам “Два камінары”, што знаходзілася на Кожнай вулачцы. Вельмі часта ўласьнікамі першых малых бістро ў даведніку запісаныя жанчыны-гаспадыні. Праз два гады, то бок у 1898 годзе, у даведніку зьяўляецца ўжо новая кавярня “Corso”, для якой пададзены й нумар тэлефону (2132).

Патэлефанаваць можна было яшчэ ў кавярню “Славія” каля Нацыянальнага тэатру і ў кавярню “Ў залатога анёла” на Цэлетнай. Малыя кавярні тэлефонаў ня маюць, а ў “астатніх” яго і шукаць ня варта.

Калі згасалі ліхтары кавярняў, грамадзкае жыцьцё працягвалася ў кабарэ ды начных забаўляльных установах. Да найбольш наведвальных месцаў належаў “Montmartre” на Ржэцезавай вуліцы ў Старым Месьце. Нават ня верыцца, што сюды завітвалі Бас, Брунэр, Гелнэр, Гашак, Майрынк, Брод, Вэрфэль, Пік, Лаўрын, Кіш, Урзыдыль і, напэўна, Кафка. То бок чэхі і немцы, праскія габрэі, літаратары і мастакі, танцоркі ды дамы паўсьвету, т.зв. “demimondky”. У “Montmartre’ы” танчылі першыя танга, папулярныя былі “танцы апачы” парыскай багемы. Калі не абмяжоўвацца толькі байкамі ды гісторыяй, дык трэба зазначыць, што “Montmartre” нядаўна, пасьля грунтоўнай рэканструкцыі, адчыніўся зноў. Былое кабарэ выкарыстоўваецца перш за ўсё як кавярня, хаця тут чуюцца і шансоны — кабарэтныя песенькі, дапоўненыя забаўляльнай праграмай.
“Café Metropol” на рагу Водзічкавай вуліцы ды Вацлаўскага пляцу было ўлюбёным месцам спатканьняў чальцоў мастакоўскага згуртаваньня “Mánes”. Там зь імі сустракаўся і Гануш Елінак, перакладчык і вялікі франкафіл. Ужо тады мэтрдатэлем там быў пан Суханак, які пазьней працаваў ува “Ўніёнцы” ды ў кавярні “Arco” на Гібэрнскай вуліцы. Кавярня як месца сустрэч мастакоў і літаратараў зьяўляецца таксама і на тагачасным плякаце мастака Олдржыха Гамалача ў мастацкім штотыднёвіку “Lumír”. Ля століка сядзіць прывабная маладая кабета ў капелюшы й слухае мужчыну, відаць, маладога паэта. Гэта значыць, што кабета ў мадэрновай кавярні была вітаная, пасавала да яе, дапаўняла ейную атмасфэру. Пасьля таго як на верхнім канцы Вацлаўскага пляцу быў збудаваны Нацыянальны музэй, гэтая частка места пачала хутка набываць адмысловае значэньне. Вацлаўскі пляц стаўся новым грамадзкім цэнтрам, дзе, натуральна, не бракавала найлепшых гатэляў, кавярняў ды рэстарацыяў. У мадэрновым духу вырас і новы гатэль “Эрцгерцаг Штэфан” (цяперашняя “Эўропа”), на першым паверсе якога зьявілася элегантная кавярня. Будоўлю зьдзейсьнілі ў 1903—1905 гадох два

Оманавы вучні, Алаіс Дрыяк і Бэдржых Бэндэльмаер.
У аздабленьні інтэр'еру браў удзел і Ян Летцэль, які пазьней зьехаў з Прагі працаваць у далёкую Японію. Між іншага, Летцэль — аўтар будынку Прамысловага музэю ў Гірасіме, жалезабэтонная канструкцыя якога адзіная выстаяла ў атамнай катастрофе. Памяшканьне кавярні ў сёньняшнім гатэлі "Эўропа" робіць грандыёзнае ўражаньне сваім арыстакратычным вэстыбюлем зь верхняй галерэяй, адкуль можна назіраць агульную сумятню на доле. Такім чынам, грамадзкае жыцьцё ёсьць падзеяй, відовішчам, тэатрам і моднай імпрэзай. "Эўропа" ўяўляе сабой кавярню тыпу "café-concert", дзе аркестрык найграе знаёмыя і прыемныя мэлёдыі. Ужо перад першай сусьветнай вайной чэскае мастацтва знайшло свой натуральны цэнтар прыцягненьня на Нацыянальным праспэкце, дакладней — на рагу з Пэрштынам. Там, дзе сёньня стаіць "Альбатрос", брыдкая сучасная каробка, калісьці стаяў легендарны "Union", больш вядомы сярод месьцічаў як "Уніёнка". Яна не была элегантнай кавярняй, ейныя памяшканьні знаходзіліся ў старым барочным доме, але элегантнасьці ад яе ніхто й не патрабаваў. "Уніёнка" прапаноўвала нешта зусім іншае — сяброўскую, натхняльную творчую атмасфэру, панадлівую для мастакоў, літаратараў ды іншых блізкіх душаў. Праз "Уніёнку" прайшлі як найменей тры генэрацыі, найстарэйшая зь якіх мела карані яшчэ ў XIX стагодзьдзі, а наймаладзейшая ўжо цалкам аддавалася сучасным радыкальным кірункам.
Кавярня ўяўляла сабою малы лябірынт, бо складалася з шэрагу невялічкіх памяшканьняў, салёнаў ды салёнікаў. Адзін пакойчык належаў шаноўным унівэрсытэцкім прафэсарам, другі — выключна мастакам, у наступным стаяў більярд, далейшыя часткі й куты займалі шахматысты, эспэрантысты, журналісты, а таксама чэскія габрэі. Менавіта ў гэтай кавярні нарадзіўся рух чэскага кубізму, адважна зразуметы як новы, сучасны жыцьцёвы стыль, які ахоплівае ўсе сфэры чалавечага жыцьця. Нідзе на сьвеце, акрамя Прагі, ня ўзьніклі кубістычныя дамы, нідзе больш кубізм ня быў прыняты так шырока. У былой кавярні на першым паверсе марылі пра будучыню, віталі новыя ідэі ды кірункі. Для гэтай кавярні за невялікія грошы, назьбіраныя наведнікамі, былі набытыя Дэрэнавы "Купальніцы", сёньняшняя гордасьць Нацыянальнай галерэі.

Ужо ў 1923 годзе над “Уніёнкай” зьбіраліся чорныя хмары, меркавалася, што кавярня будзе канчаткова зачыненая. Карэл Чапэк тады напісаў у “Лідовэ навіны” артыкул “Помнік у небясьпецы”. Ён рашуча абараняў кавярню і падкрэсьліваў ейны ўнёсак ува ўзьнікненьне сучаснага чэскага мастацтва. Чапэк пісаў, што “Ўніёнка”, як genius loci, павінна застацца ахоўваным запаведнікам. Мусіў бы ахоўвацца законам і ейны сакрэтны рэцэпт чорнай кавы! Кавярня вытрымала першы націск і праіснавала яшчэ ўсю першую рэспубліку. Яна зачынілася толькі 18 сакавіка 1941 году, за часамі пратэктарату. Апошні гурт верных гасьцей сышоўся з самага ранку на гістарычным месцы найслыньнейшай чэскай мастакоўскай кавярні і цэлы дзень чакаў муніцыпальнага службоўца. Гэта было сумнае разьвітаньне, але ні ў якім разе не абсалютны канец і не хаўтуры.
На кароткі час кавярня адчыніцца яшчэ пасьля вайны, але потым настане 1948 год, а зь ім і камуністычны пераварот. У памяшканьнях кавярні будзе арганізавана заводзкая кухня — установа грамадзкага харчаваньня. У 1949 годзе разбураны стары дом, у руінах якога загіне й “Уніёнка”. Не засталося нічога, толькі ўспаміны сьведкаў ды некалькі фатаздымкаў. Старая вычварная каменная тумба з галавой мурына, умураваная калісьці ў рог будынку, — добрае свойскае боства — скончыла свой шлях у музэі.
З кавярняй “Union” на Пэрштыне сваім культурным значэньнем магла спаборнічаць хіба што толькі кавярня “Arco” на рагу Гібэрнскай і Длаждзянай вуліц, акурат насупраць Масарыкавага вакзалу. У “Arco” хадзілі перадусім нямецкія літаратары, суполку якіх Карл Краўс трапна назваў “арканаўты”. Тут весела “вэрфэлявалася, бродавалася, кафкавалася ды кішавалася”, і менавіта ў “Arco” Мілена Есэнска спаткала свайго першага мужа Эрнэста Поляка, клюбную істоту par excellence. Інтэр’ер кавярні, прапанаваны Янам Коцерам, нагадваў чытальню. Тут госьці гарталі новыя нумары замежных часопісаў і даведваліся пра культурныя падзеі ў сьвеце. Выбар быў багаты, бадай найлепшы ў Празе, таму хадзілі сюды ня толькі немцы, але і чэхі.

Падчас аднаго такога гартаньня часопісаў у “Arco”, як пра тое піша В. В. Штэх, у 1907 годзе нарадзілася ідэя “Арцелі”. Новая

суполка, чэскі аналяг “Wiener Werkstätte” (“Венскіх варштатаў”), імкнулася ўзьняць узровень грамадзкага густу прапановай якасных мастацкіх і рамесьніцкіх прадметаў па прымальных цэнах. З кавярняй “Arco” зьвязанае і апавяданьне Ёганэса Урзыдзіла “Ноч жуды”. Пісьменьнік распавядае драматычную гісторыю пра сустрэчу двух мужчынаў, якія позьняй ноччу хаваюцца ў доме ад вайсковае варты. Адзін зь іх — забойца, якога шукаюць, а другі — проста запозьнены госьць. Нарэшце, менавіта з кавярні “Arco” Франц Вэрфэль і Макс Брод выправіліся да прафэсара Масарыка, каб паспрабаваць прадухіліць ваенную катастрофу. Як ведаем, марна...

Сёньня аб’ект знаходзіцца ў мізэрным стане. Ад вялікага круглага стала, пры якім зьмешваліся ў палеміцы нямецкая, габрэйская і чэская стыхіі, не засталося ані сьледу.

Акурат насупраць “Уніёнкі” на другім паверсе знаходзілася знакамітая кавярня “Louvre”. Магло б здацца, што дзьве так блізка разьмешчаныя кавярні толькі б дарэмна канкуравалі, але гэтак не было. У “Louvre”, як можна меркаваць паводле назову, хадзілі іншыя людзі. Макс Брод згадваў візыты з асяродзьдзя нямецкіх філёзафаў — кажуць, гэта была нейкая дэлегацыя зь нямецкага ўнівэрсытэту. У 1911 годзе ў “Louvre” быў створаны “Sursum”, сябрына апошніх літаратурных дэкадэнтаў. Хто сёньня ведае паэта Шыманка альбо Марышу Шарэцку? Але да літаратараў далучылася і некалькі цікавых мастакоў, якія нарэшце надалі сябрыне адмысловы выгляд. Ёзаф Вахал стварыў пасьведчаньні й пячаткі, нават вёў уліковую кнігу, якую сам ілюстраваў.

Калі ў адзін зь вечароў 1926 году гурток натхнёных лінгвістаў мусіў пакінуць філязофскі факультэт, яны перайшлі ў кавярню “Louvre”. Напэўна, сам дух Брэнтанавай філязофіі прывабіў іх сюды. Праскі лінгвістычны гурток на чале зь Вілемам Матэзіюсам, Раманам Якабсонам і Янам Мукаржоўскім сёньня вядомы ў сьвеце гэтаксама, як Венскі гурток ці Суполка венскіх псыхааналітыкаў. Пасьля лістападу 1989 году кавярня з рэшткамі ляпніны была адноўленая, але атрымала імя “Gany’s” (сёньня зноў “Louvre”). У амэрыканскім гучаньні ейнага назову наведнік зь цяжкасьцю распазнаваў бы імя міталягічнага Ганімэда, служкі грэцкіх багоў. Лінгвісты б зьдзівіліся, як шмат можа мова, але, хто ведае, можа, і натхніліся б дасягненьнямі

пасьлярэвалюцыйнай паэтыкі.
Ужо каля 1930 году Прага — прызнанае эўрапейскае места з сучаснай архітэктурай, самабытнай культурай ды публічным жыцьцём. Кавярні спаборнічаюць за прыязнасьць публікі й выпярэджваюць адна адну ў раскошы. Лё Карбюзье быў, кажуць, так уражаны выглядам места, што Прага здалася яму ў параўнаньні з Парыжам занадта сьвецкай. Кавярні, поўныя люстраў, ён, мусіць, лічыў празьмернай эксцэнтрыкай густу. Трыццатыя гады даваршаюць утопію “места-кавярні” як аднаго бясконцага праходнага пасажу. Карэл Гонзік пра гэта піша: “У трыццатых гадах амаль увесь Вацлаўскі пляц быў да другога паверху (і вышэй) аблямаваны кавярнямі, іх памяшканьні вялі назад у двары, да будынкаў, да прылеглых галоўных праспэктаў, так што, разбурыўшы сьцены, якія іх разьдзялялі, можна было б шпацыраваць амаль па ўсім праскім цэнтры як па адной кавярні”.
У 1932—1933 гадох адбылася маштабная рэканструкцыя кавярні “Славія”, падчас якой былі прасечаныя вялікія шырокія вокны. Сёньня нам гэтыя “панарамныя вокны”, як іх тады называлі, здаюцца галоўнай адметнасьцю, а ў свой час яны хутчэй шакавалі. І паважаны часопіс “Styl” папярэджваў аб недарэчным афармленьні партэру: “Баімся, каб у суседзтве з тэатрам, зь якога адкрываецца від на Градчаны, не дайшло да таго, што і тут, дзеля густу дэкадэнцкай публікі, гаспадар зробіць прыблізную копію бэрлінскага “Café” і спляжыць такі далікатны рог, які прэтэндуе на тры зорачкі ў даведніку “Baedeker”, таксама як Пляц Сіньёрыі ў Флярэнцыі ды Сан-Марына ў Нэапалі”. Тым ня менш гэта сталася, прапанова новага гаспадара Вацлава Фішэра была рэалізаваная. Будаўнічая рэвалюцыя неміласэрна зьнішчыла апошнія рэшткі XIX стагодзьдзя і пачала новую эру сучаснай, элегантнай і моднай кавярні “Славія”.
Аўтарства ўнікальнай перабудовы Ганна Жантаўска прыпісвае праф. Олдржыху Стэфану, знакамітаму гісторыку чэскага барока. Побач з імем О.Стэфана зьяўляецца яшчэ адно — імя нейкага архітэктара Кестэра, можа Кёстлера, спэцыяліста ў афармленьні кавярняў, рэстарацыяў і бараў. Зь імені можна было б меркаваць, што гаворка ідзе пра габрэя-эмігранта зь Нямеччыны, якіх ужо тады ў Празе была цэла гурба.
І натуральна, што гэтыя людзі мелі тэрміновую патрэбу ў

грашах і працавалі часта без дазволу на працу, а таму і без мажлівасьці прызнаваць сваё аўтарства. Радыкальнае пераафармленьне інтэр'еру прынесла абсалютна новыя элемэнты, якія пераглядалі ранейшую традыцыю кавярні. Парыскія, а таксама бэрлінскія ўплывы на новы выгляд кавярні былі відавочнымі. Сымбалем пераўтварэньня сталіся ня толькі шырокія вокны, а і колавы матыў на столі, у месцы, дзе сыходзіліся абодва крылы кавярні. Кола пазначае нешта накшталт купалу, тыповы матыў, напэўна, перанесены з слыннай мастацкай кавярні "La Coupole" на Манпарнасе. Вялікія бэрлінскія кавярні былі падчас вайны цалкам зьнішчаныя, таму сёньня цяжка прасачыць верагодныя ўплывы на кавярню "Славія". Хіба толькі аздобныя мэталёвыя краткі, мармуровая абкладка ды дэкаратыўныя вазы з камбінаванай залатой і чорнай мазаікай адзначаюць зусім іншы, адрозны ад французскага, уплыў. У 20-х гадох Бэрлін жыў вірлівым грамадзкім жыцьцём і прыцягваў, апроч астатніх, Франца Кафку і іншых праскіх нямецкіх і габрэйскіх літаратараў.
У XIX стагодзьдзі праскія кавярні падпалі пад уплыў Вены, але ўжо тады зьяўляецца ў Празе і першая французская кавярня.
У XX стагодзьдзі французскія ўплывы наагул пераважаюць, Парыж становіцца прызнанай меркай шляхетнасьці і грамадзкім ідалам.
Сымбалем праскіх кавярняў сталася вядомая карціна Віктара Олівы, зьмешчаная ў кавярні "Славія" і названая "Чалавек, які п'е абсэнт". На жаль, сёньня арыгінал замяніла копія, але і так карціна дае па-ранейшаму пэўнае ўяўленьне пра тое, што азначала "клюбнае існаваньне" і што маецца на ўвазе пад выразам "клюбны літаратар". Без кавярні мастакі, журналісты, інтэлектуалы і наагул аматары пабываць на публіцы наўрад ці абыходзіліся. Невыпадкова дэталь карціны Олівы зьявілася і на вокладцы збору эсэ і фэльетонаў Пэтэра Бэхера "Zwischen München, Prag und Wien".

З чэскай пераклала Вераніка Бяльковіч
паводле: Josef Kroutvor, Pražské kavárny // W.Koschmal, M.Hekula, J.Rogall (eds.): Češi a Němci. Dějiny — kultura — politika. — Praha: Litomyšl, 2001.

[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/23
[image]

ЧЭСКІ АЛЬБОМ
2003
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Наталля Прыступа

Палітычная арэна Чэхіі: працэсуальная нестабільнасць

НАТАЛЛЯ ПРЫСТУПА — асьпірантка катадры гісторыі паўднёвых і заходніх славян БДУ, займаецца дасьледаваньнем найноўшай гісторыі Чэхаславаччыны і, у прыватнасьці, дзейнасьці Чэхаславацкай нацыянальна-сацыялістычнай партыі ў 30—40 гадах XX стагодзьдзя. У "ARCHE" друкуецца ўпершыню.

Пасля другой сусветнай вайны ніводная палітычная партыя Чэхаславакіі не была гатовая кіраваць краінай самастойна. Гэта прывяло да ўзнікнення Нацыянальнага фронту чэхаў і славакаў, у рамках якога дазвалялася дзейнасць толькі шасці партый: камуністычнай (асобна Чэхіі і асобна Славакіі), сацыял-дэмакратычнай, нацыянальна-сацыялістычнай, народнай (лідаўцы) і дэмакратычнай. Няздольнасць камуністаў (КПЧ) сканцэнтраваць уладу ў сваіх руках прымушала іх ісці на палітычныя кампрамісы. Аднак яны не пакідалі ідэі аб неабходнасці барацьбы за манаполію ўлады. Так, старшыня КПЧ Клімэнт Готвальд, выступаючы на пасяджэнні ЦК КПЧ пасля майскіх выбараў 1946 году, заклікаў камуністаў "клапаціцца пра тое, каб пасля наступных выбараў мы (камуністы. — **Аўт.**) змаглі выпраць у адной вадзе і начыста". А

палітыкі некамуністычнага лагеру вымушаныя былі супрацоўнічаць з камуністамі дзеля таго, каб стрымаць бальшавізацыю Чэхаславакіі і ўсталяванне ў краіне дыктатуры адной партыі. Такім чынам, пад уплывам розных акалічнасцяў палітычныя партыі як пасля 1945 году, так і сёння вымушаныя адмаўляцца ад некаторых праграмных установак дзеля таго, каб, як казаў першы пасляваенны прэзідэнт Чэхаславакіі Эдвард Бэнэш, “наша краіна і наш народ пабудавалі найлепшы і самы ўстойлівы ў свеце дом”.
Палітычную сітуацыю ў сённяшняй Чэхіі таксама можна характарызаваць як працэсуальна няўстойлівую, што выяўляецца, перш за ўсё, у стварэнні розных партыйных кааліцыяў і немагчымасці сфармаваць аднапартыйны ўрад. Адлюстраваннем таму служаць парламенцкія выбары 2002 году.
Выбары ў парламент Чэхіі 14—15 чэрвеня 2002 году прайшлі ва ўмовах спаду палітычнай актыўнасці грамадзян і іх расчараванасці ў палітыках. Неадназначнае стаўленне чэхаў да сваёй дзяржавы вядомы чэшскі публіцыст Багуміл Долежал называе “шызафрэнічным”. Рэч у тым, што большасць чэхаў бачаць у сучаснай Чэшскай Рэспубліцы не нейкую вечную каштоўнасць, якой паводле логікі для кожнага народу павінна быць Бацькаўшчына, а “рэшткі цудоўнай чэхаславацкай мары ці прамежкавую станцыю на шляху да жаданай Еўропы”. Як сведчаць звесткі, атрыманыя падчас апытання насельніцтва напярэдадні выбараў (табл. 1, 2, 3), народ, што здзейсніў Аксамітную рэвалюцыю, у значнай сваёй масе ўжо не перакананы, што да рэвалюцыі было адназначна горш. Навошта ж тады была рэвалюцыя?

Як бачым, грамадзяне неаднолькава ставіліся і ставяцца да працэсаў, якія адбываюцца ў краіне. Перш за ўсё, дадатнае стаўленне чэхаў да палітычнае сітуацыі ў краіне да сярэдзіны 1990-х гадоў тлумачылася поспехамі ўраду Вацлава Клаўса: у Чэхіі былі самыя нізкія ўзроўні інфляцыі і беспрацоўя сярод посткамуністычных дзяржаў. Тады нават загаварылі пра чэшскія “рэформы з чалавечым тварам” і што Чэхія значна бліжэй за іншых падышла да заходнееўрапейскіх сацыяльных

стандартаў. З другой паловы 1996 году ў краіне пачалі нарастаць крызісныя з'явы ў эканоміцы, што, перш за ўсё, выявілася ў падзенні ўзроўню жыцця, росце беспрацоўя і інфляцыі. Да эканамічных цяжкасцяў дадалася разбуральная паводка. І толькі недзе з сярэдзіны 1999 году, г.зн. з моманту першых пазітыўных зменаў у эканоміцы краіны, можна адзначыць рост задаволенасці людзей палітычным развіццём. Аднак гэтыя паказчыкі так і не перавысілі дакрызісных. Яўна адрозніваюцца погляды прыхільнікаў правай (Грамадзянскай дэмакратычнай партыі, ГДП) і крайне левай (Камуністычнай партыі Чэхіі і Маравіі, КПЧМ) партый. Тлумачыцца гэта, па-першае, розным электаратам, па-другое, рознымі прыярытэтамі. Калі ў аснове праграмы ГДП ляжаць прымітыўна растлумачаныя палажэнні неалібералізму 1980-х гадоў (за ўзор для пераймання В.Клаўс лічыць М.Тэтчэр), то КПЧМ па-ранейшаму застаецца традыцыйнай і нерэфармаванай камуністычнай партыяй, якая дэкларуе прыняцце парламенцкай сістэмы, але выступае і за вяртанне некаторых аспектаў далістападаўскага (да лістапада 1989 году) рэжыму. Камуністы змагаюцца перадусім за сацыяльную справядлівасць ва ўсіх сферах чалавечага жыцця, і таму асабліва негатыўную ацэнку атрымалі рэформы, што праводзіў урад В.Клаўса, а менавіта прыватызацыя.

Увогуле, на апошнія выбары камуністы ішлі пад дэвізам "З людзьмі і для людзей" (у 1998 годзе — пад дэвізам "Іншыя для людзей, а мы — з людзьмі".) Сярод іх патрабаванняў можна вылучыць такія, як клопат пра будучыню чэшскай вёскі і сельскай гаспадаркі, права на годную працу і жыццё, на адукацыю, дазвол моладзі свабоды выбару і перспектывы і г.д. На вынікі галасавання, як адзначаюць аналітыкі, галоўным чынам, паўплывала палітыка, якую праводзіла ЧСДП. Сацыялагічнае апытанне, зладжанае напярэдадні выбараў, пацвердзіла пераход галасоў ад ЧСДП да КПЧМ. Тлумачыцца гэта блізкасцю ідэалогій, перадвыбарных праграмаў і электарату. КПЧМ вядзе барацьбу з ЧСДП за галасы выбарцаў пераважна сярод сацыяльна слабых, леваарыентаваных слаёў насельніцтва. Калі прыняць пад увагу характар, гісторыю і

праграму, то ў камуністаў практычна няма шанцаў сярод гэтак званага сярэдняга класу. І тут мы падыходзім да непасрэдных прычынаў поспеху камуністаў. Рэч у тым, што на выбарах 1998 году ЧСДП выступала як апазіцыйная партыя, якая, найперш дзякуючы свайму старшыні Мілашу Зэману, здолела ўзмацніць сваю праграму надзвычай радыкальнымі патрабаваннямі. Гэта садзейнічала таму, што партыя здолела прыцягнуць на свой бок незадаволеныя леваарыентаваныя слаі насельніцтва і тым самым стварыць перашкоды для росту ўплыву камуністаў. Праз чатыры гады сацыял-дэмакраты, ужо як партыя ўлады і як партыя, якая супрацоўнічала з правымі партыямі, страцілі гэтую частку выбарцаў. Гэта, у сваю чаргу, прымусіла ЧСДП весці барацьбу за сярэдні клас з партыямі Кааліцыі і ў значнай ступені з ГДП, а з КПЧМ — за радыкальна настроеныя слаі, незадоволеныя сучаснай сітуацыяй. Апошняя катэгорыя выбарцаў у асноўным і аддала свае галасы КПЧМ. Асабліва моцныя пазіцыі камуністаў былі ў раёнах з высокім узроўнем беспрацоўя (Усцецкі край, Зноемшчына), дзе не ўдалася рэструктурызацыя, а значыць, становішча малаабароненых катэгорый насельніцтва (нізкакваліфікаваных рабочых, людзей перадпенсійнага веку, аграрыяў і г.д.) пагоршылася. Гэтыя слаі грамадства не цікавяцца гісторыяй камуністычнай партыі. Яны бачаць у ёй перш за ўсё левую апазіцыйную партыю, здольную правесці сацыяльна-эканамічныя і грамадска-палітычныя рэформы. На сустрэчы са сваімі выбарцамі ў Астраве старшыня КПЧМ М.Грэбэнічак заявіў: “Як можа ЧСДП называць сябе левай партыяй, калі падчас знаходжання яе пры ўладзе колькасць беспрацоўных павялічылася больш чым на 200 тыс. чалавек? Яна праявіла сябе ў гэтым нават горш за ГДП”.

Нароўні з камуністамі поспеху дасягнулі і сацыял-дэмакраты, якія, страціўшы толькі 2,1% галасоў, перамаглі на выбарах. ЧСДП ад астатніх партый аддзяляюць 5,7% галасоў — найлепшы для кіраўнічай партыі паказчык ад 1992 году (у 1996 годзе гэтая розніца паміж ГДП і ЧСДП складала 3,2%, у 1998 годзе паміж ЧСДП і ГДП — 4,6%). Існуе шмат прычын чарговай перамогі сацыял-дэмакратаў. Поспеху ЧСДП садзейнічала і спрыяльная эканамічная сітуацыя без значных сацыяльных катаклізмаў, і палітычная стабільнасць, сімвалам якой частка выбарцаў лічыла ЧСДП. Напярэдадні выбараў партыя

дыстанцыявалася ад пагадненняў з правай апазіцыяй і паўстала перад сваімі выбарцамі як партыя, свабодная ад якіхсьці папярэдніх дамоўленасцяў з ГДП. Рэч у тым, што гэтая ўгода была ўкладзеная паміж ГДП і ЧСДП на тых умовах, што ГДП як вядучая апазіцыйная партыя згаджалася на стварэнне сацыял-дэмакратамі ўраду меншасці ў абмен на ключавыя пасады ў парламенце. Дарма што ўгода з апазіцыяй уратавала краіну ад сур'ёзных палітычных катаклізмаў, у краіне расла незадаволенасць яе падпісаннем: усё часцей і часцей гэтыя дзве партыі вырашалі ўсе найважнейшыя праблемы ў кулуарах. "Ачышчэнню" партыі садзейнічала і змена яе кіраўніцтва, што, у сваю чаргу, значна паўплывала на вынікі галасавання. Цікава, што, з пункту гледжання выбарцаў, новы старшыня партыі Ўладзімір Шпідла ў параўнанні з Мілашам Зэманам увасабляе палітычны цэнтрызм, да таго ж, яго погляды меней ліберальныя і болей адпавядаюць леваму крылу еўрапейскай сацыял-дэмакратыі. Тым не менш, поспех партыі не можа быць звязаны толькі з асобай яе старшыні. У партыі прадстаўлены шырокі спектр розных палітычных дзеячоў: агульна папулярныя Станіслаў Грос і Пэтра Бузкава, "спецыялісты-тэхнакраты" тыпу Яраслава Тврдзіка ці Іржы Руснака, "эколаг" Мілаш Кужварт ці "інтэлектуалы" кшталту Паўла Достала, а яшчэ "прафсаюзныя дзеячы", такія, як Здэнек Шкромах (табл. 5). Кожны выбарца можа атаясамліваць сябе з якой-небудзь асобай ЧСДП, прадстаўленай гэтымі тыпамі палітыкаў. Прычым, як адзначалі аналітыкі, У.Шпідла ацэньваецца як "працавіты службовец, прафесіянал", аднолькава папулярны як сярод сярэдніх слаёў насельніцтва, так і сярод памяркоўных правых. У сваю чаргу, Я.Тврдзік ацэньваецца як "чалавек цвёрдай рукі", здольны весці складаныя перамовы, што так неабходна сілавым структурам. А П.Бузкава — "прывабная жанчына", здольная ісці на кампрамісы і ніколі не дзейнічаць напралом. У сваю чаргу, уся перадвыбарная кампанія ГДП, наадварот, круцілася вакол асобы В.Клаўса, і склалася такое ўражанне, што ў партыі больш нікога няма. З другога боку, такая стракатасць партыйнага складу ЧСДП можа негатыўна паўплываць на далейшы лёс самой партыі (з пункту погляду яе адзінства).

Ні для кога не сакрэт, што галоўнымі супернікамі ЧСДП у барацьбе за галасы выбарцаў былі Кааліцыя і ГДП. Увогуле Кааліцыю і, у прыватнасці, хрысціянскіх дэмакратаў (ХДС) ды Народную партыю (ЧНП) можна ахарактарызаваць як партыі цэнтру. Хадэкі заўсёды рабілі стаўку на тое, што іх партыя з'яўляецца альтэрнатывай грамадзянскім дэмакратам і сацыял-дэмакратам. І дарма што выбары для ўсіх партый Кааліцыі ў цэлым скончыліся паразай (1998 г. — 1137 тыс. галасоў, 2002 г. — 681 тыс.), ХДС–ЧНП здолела захаваць свае пазіцыі. Дасведчаныя "лідаўцы" (ЧНП) разумелі, што Кааліцыя асуджаная на няўдачу, але яны добра разумелі і тое, што поўнае знішчэнне Кааліцыі непасрэдна перад выбарамі не прынясе карысці. Таму яны пазбавіліся ад ГДА і дамовіліся аб стварэнні ўласных парламенцкіх фракцыяў пасля выбараў. Пасля лістапада 1989 году ХДС–ЧНП ні разу не ўдавалася самастойна пераадолець 10-працэнтную мяжу. Таму вынікі выбараў 2002 году менавіта для ХДУ–ЧНП можна расцэньваць як своеасаблівы поспех. Кааліцыя ішла на выбары пад лозунгам "Давядзем усё да ладу" і патрабавала зніжэння падаткаў, павышэння ўзроўню жыцця, выступала за прававую дзяржаву і барацьбу з карупцыяй, за здаровую сям'ю як аснову здаровага грамадства, за еўрапейскую будучыню і за прамыя выбары прэзідэнта краіны. Параза Кааліцыі была пройгрышам выключна блоку Унія свабоды (УС)/Дэмакратычная унія (ДУ), які апынуўся на мяжы знікнення. Яго стаўка на супрацоўніцтва з "лідаўцамі" і нежаданне супрацоўнічаць з ГДП уцягнула яго ў дзейнасць левага ўраду, што можа прывесці да страты свайго ідэйна-палітычнага профілю і знікнення з палітычнай сцэны. Яшчэ адной няўдачніцай выбараў была ГДП (24,5%). Былы старшыня партыі В.Клаўс здолеў не толькі пераканаць значную частку грамадства ў правільнасці прапаноўваных ГДП рэцэптаў эканамічнага адраджэння і развіцця, але і стварыць партыйны механізм, які забяспечвае партыі стабільную падтрымку 25—30% палітычна актыўных грамадзянаў. Тым больш што яны практычна не маюць канкурэнцыі ў правай частцы палітычнага спектру (гэта таксама заслуга ГДП). Аднак 25% галасоў у 2002 годзе — гэта крытычны паказчык. Пяць гадоў таму такія вынікі галасавання для ГДП можна было б разглядаць як поспех. На мяжы 1997—1998 гадоў чэшская эканоміка перажыла сур'ёзны

крызіс, віноўніцай якога многія лічылі ГДП, ад якой тады адкалолася Унія свабоды. Таму тады грамадзянскія дэмакраты думалі хутчэй не аб перамозе на выбарах, а аб захаванні пазіцый самай моцнай правай партыі і аб тым, каб перамога ЧСДП не была занадта яўнай. На гэтыя ж выбары яны ішлі ўжо з іншай пазіцыяй ("Насустрач новаму лёсу"). Партыя выступала за хутчэйшае ўступленне ў ЕС, за зніжэнне падаткаў, за прафесіяналізацыю войска, супраць проціпастаўлення чалавека і прыроды ды разумення абароны нацыянальных інтарэсаў як праявы нацыяналізму і г.д. Таму вынікі (1167 тыс. галасоў у параўнанні з 1656 тыс. галасоў у 1998 г.) можна расцэньваць як паразу, прычыны якой — благое завяршэнне перадвыбарнай кампаніі, празмерная арыентацыя на асобу В. Клаўса, паварот чэшскага грамадства ўлева, непрыязнасць да ГДП значнай часткі СМІ. Негатыўную ролю адыграў і той факт, што ГДП не здолела своечасова дыстанцыявацца ад угоды з сацыял-дэмакратамі. Узнікла падазрэнне, што ГДП выступае за далейшае супрацоўніцтва з ЧСДП, і ў правым палітычным спектры ГДП засталася без партнёраў. Больш за тое, ГДП сцвярджала, што лепш адкрытае супрацоўніцтва з ЧСДП, чым з партыямі Кааліцыі. Падчас перадвыбарнай кампаніі правыя партыі супернічалі ў асноўным паміж сабой і не сталі сапраўднымі супернікамі ЧСДП.

Слабасць правых партый паўплывала на нізкі ўзровень яўкі выбарцаў (1996 г. — 76,4%, 1998 г. — 74%, 2002 г. — 58%). Аднак, зыходзячы з вынікаў галасавання, нельга адназначна гаварыць аб павароце чэшскага грамадства ўлева. Правыя партыі сапраўды страцілі ў параўнанні з папярэднімі выбарамі 945 тыс. галасоў. Але, з другога боку, страцілі галасы і левыя партыі — 264 тыс., бо калі камуністы набылі 224 тыс. галасоў, то ЧСДП адначасова страціла 488 тыс. Гэта значыць, што левыя партыі ў цэлым здолелі ўтрымаць сваіх выбарцаў у сферы свайго ўплыву, а правыя партыі іх страцілі.
Партыйна-палітычная сістэма Чэхіі адрозніваецца адноснай стабільнасцю сваіх суб'ектаў у спалучэнні з працэсуальнай нестабільнасцю. Так, у Палату Дэпутатаў з 1992 году не трапіла ніводная новая парламенцкая партыя (за выключэннем УС, якая адкалолася ад ГДП). Партыйна-палітычны рэжым, тым не менш, застаецца працэсуальна (г.зн. у галіне ўзаемадзеяння)

нестабільным: пастаянна змяняюцца кааліцыйныя перавагі асобных партый. Змены такога характару прыводзяць да таго, што выбарцы, нават зыходзячы з вынікаў галасавання, не маюць аніякай упэўненасці ў тым, які будзе склад і ідэйна-палітычны профіль будучага ўраду. У гэтым таксама можна ўбачыць прычыну нежадання выбарцаў ісці на выбары. Як адзначаў былы дарадца В.Гаўла Іржы Пэге, “палітыка ў Чэхіі стала бессэнсоўным рытуалам, наборам палітычных камбінацый… Ніхто з ветэранаў чэшскай палітыкі за апошнія 10 гадоў не змог выпрацаваць новыя ідэі і канцэпцыі. Палітыка апусцілася да ўзроўню бесперапыннай барацьбы за ўладу і асабістых нападак. Рэспубліка пакутуе ад абсалютнай неэфектыўнасці палітычнай эліты”.
Пацверджаннем гэтым словам могуць служыць сёлетнія выбары прэзідэнта рэспублікі. Асаблівасцю выбараў прэзідэнта ў Чэхіі з’яўляецца іх непрамы характар, г.зн. яго выбірае парламент. Кандыдатуры на пасаду прэзідэнта падаюцца не пазней як за 48 гадзін да дня галасавання: гэта пісьмовае паведамленне, падпісанае 10 дэпутатамі ці сенатарамі. Колькасць кандыдатураў у першым туры не абмежаваная. Выбраным у першым туры лічыцца кандыдат, які набраў больш за палову галасоў у кожнай з палат парламенту. У сувязі з гэтым галасы падлічваюцца ў кожнай палаце асобна. Для таго каб стаць прэзідэнтам, неабходна набраць не меней за 101 голас у Палаце дэпутатаў і 41 голас у Сенаце. Калі кандыдат не набраў неабходных 142 галасоў, праводзіцца другі тур. У яго выходзіць кандыдат, які набраў найбольшую колькасць галасоў у Палаце Дэпутатаў, і кандыдат, які набраў найбольшую колькасць галасоў у Сенаце. Тут можа ўзнікнуць некалькі варыянтаў. Першы — у дзвюх палатах найбольшую колькасць галасоў атрымаў адзін кандыдат, але ён не набраў неабходнай паловы галасоў членаў парламенту. У такім выпадку ў наступны тур выходзіць адзін кандыдат. Другі варыянт — у кожнай палаце найбольшую колькасць галасоў набралі розныя кандыдаты, таму ў наступны тур выходзяць два кандыдаты. Трэці варыянт — калі хаця б у адной з палат парламенту найбольшую колькасць галасоў набралі адразу некалькі чалавек, тады ў другі тур выходзіць болей за два кандыдаты. Перамогу ў другім туры атрымае той кандыдат, за якога прагаласуе больш за палову прысутных дэпутатаў і сенатараў. Галасы ў кожнай

палаце таксама падлічваюцца асобна. Калі прэзідэнт не выбраны і ў другім туры, праз 14 дзён праводзіцца трэці тур, у якім бяруць удзел усе кандыдаты другога туру. Для выбрання прэзідэнта ў трэцім туры неабходна набраць больш за палову галасоў прысутных сенатараў і дэпутатаў, прычым іх галасы ўжо падлічваюцца разам.

На пасаду прэзідэнта Чэшскай Рэспублікі ў 2003 годзе прэтэндавалі спачатку 4 чалавекі — старшыня Сената Пэтр Пітгарт (ХДС–ЧНП), экс-прэм'ер і экс-спікер Палаты Дэпутатаў Вацлаў Клаўс (ГДП), былы міністр юстыцыі Яраслаў Бураш (ЧСДП) і адвакат, у мінулым галоўны вайсковы пракурор Міраслаў Кржыжанэцкі (КПЧМ). Усім адразу было зразумела, што ўсе парламенцкія партыі будуць прасоўваць сваіх кандыдатаў, а гэта, у сваю чаргу, можа прывесці да правалу першага туру выбараў. Вядомы чэшскі журналіст і каментатар газеты "Права" Аляксандр Мітрафанаў напярэдадні галасавання адзначаў, што вынік будзе залежаць ад таго, якую пазіцыю зоймуць сацыял-дэмакраты: у шэрагах гэтай партыі сёння адсутнічае адзінства. Магчыма, што тыя, хто не хоча бачыць Я.Бураша на пасадзе прэзідэнта, будуць галасаваць за іншых кандыдатаў. Насамрэч так і адбылося. Так, за Я.Бураша прагаласавалі толькі 39 дэпутатаў і 7 сенатараў з ліку ўсіх сацыял-дэмакратаў, прадстаўленых у парламенце (81 чалавек). У сувязі з гэтым многія палітыкі выказваліся за правядзенне прамых выбараў прэзідэнта, але для гэтага неабходна змяніць канстытуцыю Чэхіі. А гэта немагчыма без палітычнай дамовы паміж урадавай кааліцыяй і апазіцыяй. Закон аб прамых выбарах прэзідэнта Чэхіі быў падрыхтаваны перад пачаткам летніх парламенцкіх выбараў партыямі, якія ўваходзілі ў Кааліцыю, але парламент гэтага законапраекту не падтрымаў. Сацыялагічныя апытанні пацвярджаюць, што, калі б праводзілася ўсенароднае галасаванне, перамогу, хутчэй за ўсё, атрымаў бы В.Клаўс (32,5%).
Што тычыцца вынікаў самога галасавання, дык у першым туры колькасць галасоў размеркавалася наступным чынам: В.Клаўс — у Сенаце 31 і ў ніжняй палаце 92; П.Пітгарт — адпаведна 35 і 20; Я.Бураш — 7 і 39; М.Кржыжанэцкі — 2 і 44. У другі тур паводле вынікаў галасавання выйшлі В.Клаўс і П.Пітгарт.
У другім туры В.Клаўс набраў 77 галасоў з 200 у ніжняй палаце

і 32 з 81 у верхняй. П.Пітгарт — 46 і 43 адпаведна. Не ўдалося выбраць прэзідэнта Чэхіі і ў трэцім туры. В.Клаўс атрымаў 80 з 200 галасоў у ніжняй і 33 з 81 у верхняй палатах парламенту, усяго — 113 галасоў з 281. П.Пітгарт — 44 з 200 галасоў у ніжняй і 40 з 81 у верхняй палатах парламенту, усяго — 84 з 281. Былі прызначаныя паўторныя выбары. У гэтай сувязі чакаўся ўдзел былога старшыні ЧСДП і былога прэм'ер-міністра Мілаша Зэмана. Яго кандыдатуру маглі падтрымаць камуністы, частка сацыял-дэмакратаў, але атрымаць галасы грамадзянскіх дэмакратаў, лідаўцаў, уніяністаў, а таксама часткі сацыял-дэмакратаў яму выявілася вялікай цяжкасцю (другі тур адбыўся 24 студзеня і не прынёс аніякіх зменаў). Па сканчэнні першага туру другога этапу выбараў лідэр камуністаў М.Грэбэнічак адзначыў, што "неабходна весці перамовы. Усе палітычныя партыі павінны ўсвядоміць, што без дыялогу можна апынуцца ў патавай сітуацыі".

Так і адбылося. Парламентары не здолелі выбраць прэзідэнта краіны ні ў першым, ні ў другім туры, а 1 лютага скончыліся прэзідэнцкія паўнамоцтвы Вацлава Гаўла. Як адзначалася ў прэсе розных краін свету, нягледзячы на ўсе хібы, Вацлаў Гавал заставаўся самай яркай асобай на палітычнай сцэне Чэхіі. Хаця канстытуцыя краіны замацоўвае за яе кіраўніком не так і шмат паўнамоцтваў, Вацлаў Гавал не ператварыўся ў намінальную "прадстаўнічую" фігуру. Яго маральны аўтарытэт быў бясспрэчным. Меркаванне чэшскага лідэра заўсёды ўлічвалася пры вырашэнні важкіх пытанняў як унутры краіны, так і па-за яе межамі. Як адзначаюць аналітыкі, грамадзяне даравалі свайму прэзідэнту і раптоўную жаніцьбу пасля смерці сваёй першай жонкі і непапулярнае сярод насельніцтва прабачэнне, якое ён прынёс судэцкім немцам, што былі выгнаныя з Чэхаславаччыны пасля другой сусветнай вайны ў рамках так званай нацыянальнай рэвалюцыі і ачышчэння краіны ад носьбітаў нацысцкай ідэалогіі. Даравалі і сумнеўныя амністыі ў адносінах да крымінальных злачынцаў.
Пасля дзвюх няўдалых спробаў выбраць чэшскага прэзідэнта ў шырокіх слаях насельніцтва пачала расці колькасць прыхільнікаў змены канстытуцыі краіны і правядзення прамых выбараў: у лютым такіх людзей стала 88%, у той час як у верасні 1998 году гэты паказчык складаў 77%.

Пры ўмове правядзення прамых выбараў адным з магчымых кандыдатаў на пасаду прэзідэнта прапаноўваўся нават сусветна вядомы спявак Карэл Гот. Прыхільнікі гэтае кандыдатуры бачылі ў ім працяг закладзенай Гаўлам традыцыі — выбіраць прэзідэнта з прадстаўнікоў мастацтва. Так, яны адзначалі, што куды больш запамінальным было б навагодняе выступленне прэзідэнта па нацыяльным тэлебачанні, калі б ён яго праспяваў. Сам Гот лічыў гэтую ініцыятыву заўчаснай.
Свайго кандыдата — вядомага чэшскага хакеіста Дамініка Гашака — прапанавалі і хакеісты з клубу “Прасцеёў”. Аднак галоўнай перашкодай ягонаму прэзідэнцтву з’яўляўся век: Гашаку 38, а стаць прэзідэнтам Чэхіі можна, толькі маючы 40 гадоў. Аналітыкі не адмаўляюць магчымасці поспеху як Карэла Гота, так і іншых прадстаўнікоў чэшскага шоў-бізнэсу. Так, вядомы чэшскі палітолаг Здэнек Зборжыл лічыць, што пры ўмовах добрай арганізацыі перадвыбарнай праграмы Карэл Гот мог бы атрымаць каля 10% галасоў.
Так ці інакш, 28 лютага 2003 году прэзідэнтам краіны ў трэцім туры быў абраны Вацлаў Клаўс, які набраў 142 галасы, што ўсяго на адзін голас больш за неабходную для перамогі колькасць галасоў. За ягонага суперніка, навукоўца і былога дысідэнта Яна Сокала, мужа вядомае беларусісткі Францішкі Сокалавай і зяця філосафа Яна Патачкі, прагаласавалі 124 парламентары. Безумоўна, вялікую ролю ў перамозе Клаўса адыгралі камуністы, якія вырашылі галасаваць за яго, каб нарэшце выбраць прэзідэнта і не дапусціць “авалодання Градам стаўленікамі землеўласнікаў, шляхты і клерыкалаў” (М.Грэбэнічак).
Стаўленне замежнай прэсы да абрання В.Клаўса на пасаду прэзідэнта Чэхіі было супярэчлівым. Так, “Le Monde” (Парыж) пісала, што абраннем Клаўса прэзідэнтам краіны ГДП адным махам забіла двух зайцоў: на чале дзяржавы апынуўся іх былы старшыня і ўвадначас аслабіліся пазіцыі кіраўнічай кааліцыі і асабіста прэм’ера У.Шпідлы. Бельгійская газета “La Libre Belgique” увогуле заявіла, што такія вынікі галасавання сведчаць аб заняпадзе ўсёй палітычнай сістэмы, якая трымалася на асобе В.Гаўла, а таксама аб тым, што Клаўс знайшоў прыхільнікаў як сярод “старой гвардыі” сацыял-дэмакратыі, так і сярод сталінскай камуністычнай партыі.
“El Pais” (Мадрыд), згаджаючыся з “Financial Times” (Лондан) у

тым, што кіраўнічая кааліцыя пацярпела сур'ёзную паразу, дадавала, што "Клаўс з'яўляецца ўвасабленнем усяго, чым В.Гавал грэбаваў". Як адзначаюць іспанскія аналітыкі, Пражскі Град пакінуў вялікі дзяржаўны дзеяч-паэт, месца якога заняў бязлітасны і выбуховы меркантыліст. Над Влтавай скончыліся часы лірыкі.

7 сакавіка 2003 году Вацлаў Клаўс прыняў прысягу і засеў на Пражскім Градзе ажно да 2008 году. Калі кіраўнічая кааліцыя, у якой большасць у Палаце Дэпутатаў складае толькі адзін голас, разваліцца, то сацыял-дэмакратам не застанецца нічога іншага, як прапанаваць новы варыянт "гістарычнага кампрамісу". Альтэрнатывай яму можа быць толькі роспуск парламенту і яго датэрміновыя выбары.

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/30
[image]

Сяргей Сматрычэнка

Незнаёмае пісьменства

СЯРГЕЙ СМАТРЫЧЭНКА (нар. у 1977 у Віцебску) — багеміст, перакладчык, выкладчык ВДУ. Ягоная апошняя публікацыя ў “ARCHE” — артыкул Летаргія беларускай лінгвістыкі (№ 4-2001).

Здабыткамі чэшскай і славацкай літаратур цікавяцца на Беларусі здаўна. У даваенныя гады на беларускай мове асобнымі выданнямі выйшлі “Прыгоды ўдалага ваякі Швейка ў сусветную вайну” (ч. 1—4, 1931—32): “Цвёрдая шкура” і “Швейк на фронце” (1931), “Швейк за дзеншчыка ў фельдкурата” (2-е выд., 1932) Гашака, “Прыгоды ўдалага ваякі Швейка” (ч. 4, 1932) Гашака і Ванака, “Прыгоды ўдалага ваякі Швейка” (ч. 5—6, 1931—32) Ванака. Пасля Айчыннай вайны ўзаемасувязі беларускай і чэшскай літаратур узмацніліся. На беларускую мову перакладзены кніга Фучыка “Рэпартаж з пятлёй на шыі” (пад назвай “Слова перад пакараннем смерцю”, 1953), раманы П. Бояра і В. Бояравай “Закаханыя” (1960), І. Кубічка “Люцынка” (1965), А. Ірасека “Скалакі” (1974), Б. Ногейла “Паводка” (1977) і Казака “Гняздо бусла” (1979), зборнік “Чэшскія і славацкія апавяданні” (1958), кнігі І. Марака “Маладыя змагары” (1958), Ржыгі “Паездка Гонзіка ў вёску” (1961), Чапека “Казкі і вясёлыя гісторыі” (1966), прыгодніцкая аповесць В. Стыблавай “Мой брацік” (1977), чэшскія народныя казкі “Кубачак, вары” (1977),

анталогія сучаснай чэшскай паэзіі “Высокае неба” (1980), кніга апавяданняў Гашака “Госць у хату” (1984), аповесць І. Герцыкавай “Цень сну” (1985), зборнік вершаў і паэм Незвала “Васількі і гарады” (1986).

Паводле “Энцыклапедыі літаратуры і мастацтва Беларусі”

Паспалітаму беларускаму чытачу цяжка зарыентавацца, наколькі згаданыя ў цытаце імёны і творы прэзэнтацыйныя, а яны, між тым, мусілі нам прадстаўляць усё багацьце і разнастайнасьць чэскай літаратуры — інакш як у перакладах нам не даступнай, — ды яшчэ на ўсім працягу ейнага разьвіцьця ажно да канца 80-х. Калі Гашак ды Чапэк, падобна непадзельнай двойцы Колас—Купала, даўно прапісаліся ў шэрагах сусьветных клясыкаў, а Фучык заняў сваё месца на камуністычным Парнасе, дык астатнія імёны з падобнай вядомасьці цешыцца наўрад ці могуць. Адукаванейшыя беларусы скажуць, што пра Іраска ды Нэзвала, здаецца, недзе чулі, што ж да рэшты — гэта аўтары цалкам выпадковыя, пра якіх даўна забыліся й самі чэхі, як чытачы, так і адмыслоўцы ў літаратуры.

Каб не спыняцца на далёкім ужо канцы 80-х, трэба сказаць, што сякія-такія пераклады выходзілі й пасьля: дзіцячыя кніжкі Станіслава Рудальфа “Маё цудоўнае вужаня” ды Эдуарда Баса “Клапзубава каманда”; у “Школьнай бібліятэцы” (адцэнзураваны і з купюрамі) выйшаў новы (гэтым разам, праўда, зроблены з арыгіналу) Мажэйкаў пераклад “Прыгод удалага салдата Швэйка”; асобнаю кніжкай выходзілі вершы Івана Скалы ў перакладзе Х. Жычкі; сякія-такія вершы чэскіх паэтаў трапілі ў зборнік С. Панізьніка “Сустрэча роднасных сусьветаў”; у 1997 годзе “Полымя” старонак 50 прысьвяціла караценькаму агляду сучаснай чэскай літаратуры; нарэшце, сталыя чытачы “Крыніцы”, “ARCHE”, “Правінцыі”, “Нашай Нівы”, “Літаратурна-філязофскага сшытку ЗНО” прыгадаюць, што на старонках гэтых выданьняў друкаваліся асобныя творы Вацлава Гаўла, Мілана Кундэры (шаноўныя спадары-хто-лічыць-сябе-інтэлігентам, дазволю сабе маленечкую заўвагу, каб вы шторазу ня пляскаліся ў гразь: Кундэра вымаўляецца з націскам на першы склад!), Багуміла Грабала, тых самых Гашка ды Чапка, Эвы Кантуркавай, Вацлава Чэрнага, Івана Блатнага, Эгана Бонды. Мо каго забыўся — прашу ласкава прабачыць. У кожным разе, імкненьне да пэўнай сыстэмнасьці й

прэзэнтацыйнасьці ў гэтых новых перакладах ужо прасочваецца, хоць яшчэ й ня гэтак выразна, як хацелася б. Ня буду, аднак, галаслоўны.

У 1999 годзе сярод чэскіх літаратуразнаўцаў і крытыкаў было зладжанае апытаньне, паводле вынікаў якога названа 50 чэскіх кніг XX стагодзьдзя, што зрабілі значны ўнёсак у разьвіцьцё ўсяе сусьветнае літаратуры (нешта падобнае, але бяз гэнай сусьветнай значнасьці, ладзіла ў нас “Наша Ніва”). З усіх вышэйпамянёных (перакладзеных на бел. мову) аўтараў у сьпісе прысутнічаюць Гашак, Грабал, Кундэра, Карэл Чапэк ды Алаіс Ірасэк. Але давайце зьвернемся беспасярэдне да рэйтынгу. У першай дзясятцы тут разьмясьціліся Гашкаў “Швэйк”, “Занадта гулкая самота” Грабала, “Маркета Лазарава” Ладзіслава Ванчуры, “Баязьліўцы” Ёзафа Шкворацкага, Кундэраў “Жарт”, “Чэскі соньнік” Людвіка Вацуліка, “Звычайнае жыцьцё” Карла Чапка, зноў Грабал — “Я абслугоўваў ангельскага караля”, “Голет у лагчыне” Івана Олбрахта і кніга другога з братоў Чапкаў — Ёзафа — “Кульгавы вандроўнік” (не зьдзіўлюся, калі нават нашыя знаўцы літаратуры ня чулі асобных імёнаў з гэтай першай дзясяткі). Паводле колькасьці наяўных у рэйтынгу твораў адназначныя лідэры — творца-гуманіст Карэл Чапэк (сем кніг) і выкшталцоны стыліст Ладзіслаў Ванчура (шэсьць). Натуральна, дадзены рэйтынг — зусім не апошняя інстанцыя, да таго ж ён ахоплівае толькі прозу, тым часам як у паэзіі, скажам, чэхі маюць і свайго “нобэля” Яраслава Сайфэрта, аднак у астатнім сьпіс досыць аб’ектыўны і бесстароньні, яму немагчыма закінуць, прыкладам, антыкамуністычны падыход, жаданьне выкрасьліць сацыялістычны пэрыяд з сваёй літаратурнай гісторыі (тыя самыя Чапэк ды Ванчура, як і добрая траціна іншых фігурантаў, былі верныя сацыялісты, Іван Олбрахт цягам доўгіх гадоў рэдагаваў *“Rudé právo”*, рупар чэскіх камуністаў, а Марыя Маерава, таксама прысутная ў рэйтынгу, была актыўнай дзяячкай той самай Камуністычнай партыі Чэхаславаччыны). Каб ня быць аднабаковым і надаць гэтаму кароткаму агляду чэска-беларускіх літаратурных сувязяў узаемны характар, варта хоць адным вокам акінуць тое, што ж зрабілі чэхі дзеля папулярызацыі нашай літаратуры ў сваёй краіне. Адразу трэба зазначыць, што іхныя пераклады з нашай літаратуры маюць

значна больш сыстэмны і ахопны характар. Паводле статыстыкі, у 70—80-я гады мінулага стагодзьдзя па-чэску штогод выходзіла каля 100 кніг савецкіх аўтараў, зь іх каля 80% прыпадала на расейцаў, а з той 20-працэнтнай рэшты беларусам даставаліся 1-2%, то бок адна-дзьве кнігі за год. Гэта нямала, прычым тут улічваюцца толькі кнігі — без газэтна-часопісных публікацыяў. Беспасярэдне зь беларускай мовы, мінаючы расейскую, перакладалася мо палова, прычым пераважна дзякуючы шчыраваньню сьветлай памяці Вацлава Жыдліцкага. У выніку пры канцы 80-х па-чэску гучалі Быкаў і Адамовіч, Пташнікаў і Брыль, Карпюк і Караткевіч, Мележ і Танк… Гэта ня кажучы ўжо пра Коласа з Купалам. Прычым у кожнага зь іх выйшла не па адной кніжцы, а па дзьве-тры і больш.

На жаль, у 90-я, калі ў нас, пакуль вельмі памалу, пераклады з чэскай пачалі набываць рэальную прэзэнтацыйнасьць, у Чэхіі на беларускую літаратуру забыліся. Дазваньня. Зрэшты, зразумець гэта можна: савецкая літаратура (як і ўсё іншае) даўно абрыдла, а столькі цікавых, знакавых, урэшце, модных твораў (як сваіх, так і заходніх), доўга недаступных масаваму чытачу, раптам зрабіліся дазволенымі і даступнымі. Цяпер, здаецца, пэрыяд непрыманьня ўсяго расейскага (што для чэхаў сынанімічна савецкаму) ужо мінуўся і цікавасьць да сучаснай беларускай літаратуры паціху абуджаецца, аднак па сьмерці Вацлава Жыдліцкага не зьявілася пакуль роўнай яму ў сваёй адданасьці нашаму пісьменству постаці. Дый узяцца ёй пакуль што няма адкуль — беларусістыка на сёньняшні дзень не вывучаецца ні ў адным чэскім універсытэце. Сярод славянаў падобнай незацікаўленасьцю з боку чэхаў “цешымся” хіба мы ды лужыцкія сэрбы, зрэшты, у дачыненьні да апошніх я магу памыляцца. Нават культура і мова нашых паўднёвых суседзяў, нягледзячы на агульную нелюбоў да іх шараговых грамадзян Чэхіі, у якой украінцы ўтвараюць вельмі шматлікую армію нелегальных рабочых, а разам з цыганамі й мясцовымі нэафашыстамі ў значнай ступені абвастраюць крымінагенную сытуацыю, вывучаецца вельмі шырока; украіністыка карыстаецца немалой папулярнасьцю, зусім ня шмат саступаючы, напрыклад, русістыцы. Што казаць, па сьмерці ўсё таго ж Вацлава Жыдліцкага ў Чэхіі не засталося ніводнага

судовага перакладчыка зь беларускай мовы, г.зн., што цяпер там пры неабходнасьці немагчыма было б зрабіць натарыяльна завераны пераклад афіцыйнага дакумэнта, складзенага па-беларуску (натуральна, калі б такі адшукаўся).
Але вернемся да прыгожага пісьменства. Давайце яшчэ на хвілінку зірнём на наш рэйтынг “Топ-50”. Уважлівы чытач, мусіць, заўважыў, што чэхі крыху пасьпяшаліся, склаўшы яго яшчэ ў 1999-м, безмаль за два гады да канца стагодзьдзя. І гэткім чынам урэзаныя 90-я прэзэнтаваныя ў ім толькі адным творам — раманам “Сястра” Яхіма Топала. У такой сытуацыі заканамерна паўстае пытаньне: няўжо зрыненьне ідэалягічнага пута і вальнейшы доступ да ўзораў сучаснага сусьветнага мастацтва і мысьленьня ўвагналі чэскае пісьменства апошніх 10—15 год у ступар? Ні ў якім разе! На маё ўражаньне, чэская літаратура за сваю гісторыю ніколі яшчэ не буяла так, як цяпер. Іншая рэч, што напоўніцу значнасьць пэўнага твору і яго месца ў канкрэтнай літаратуры можна ацаніць хіба з часавай адлегласьці — большай ці меншай. Нават “Швэйк” быў ацэнены й прыняты не адразу — гэта вядомы факт. Вось жа, тым значнейшым і знакавейшым творам уяўляецца тая ж “Сястра”, калі яна ўсяго праз колькі гадоў па сваёй публікацыі трапіла ў сьпіс самых-самых.
Сьпіс, натуральна, умоўнасьць, важнейшае ўражаньне, адчуваньне, і мне было б страшэнна прыемна, калі б мае ўражаньні дапамаглі скласьці ўяву нашаму чытачу пра тое, што цяпер робіцца ў чэскім пісьменстве, чым жыве тамтэйшая літаратура па Аксамітнай рэвалюцыі, як гучаць тыя новыя імёны і назвы, якія ўжо выцясьняюць імёны і творы “цяпер-ужо-француза” Кундэры або нябожчыка Грабала?

Вось жа, Аксамітная рэвалюцыя прынесла з сабой ня толькі вызваленьне і разьняволеньне, але й непрацяглы “тайм-аўт”, калі на самым пачатку 90-х літаратурны працэс нібыта закансэрваваўся, зьнерухомеў. Роспач ад страты дагэтулешніх ідэалаў і пераацэнка вартасьцяў, аднак, не зацягнуліся, да таго ж тыя няплённыя год-два было чым запоўніць: як грыбы пачалі ўзьнікаць новыя выдавецтвы (за першую палову 90-х іх зьявілася блізу 3000), якія ўзяліся выдаваць усё забароненае ці невядомае датуль (не забывайма, што рэвалюцыйны лістапад 1989-га году, апроч іншага, зьліў разам тры прыкладна

раўназначныя плыні — афіцыйна выдаваную літаратуру, эмігранцкую ды самвыдаў). Досыць хутка, аднак, спажыўцы насыціліся й перасыціліся, а бальшыня выдавецтваў збанкрутавала. Сярод тых, што перажылі і занялі трывалае месца на кніжным рынку, — “Atlantis”, “Host”, “Hynek”, “Petrov”, “Torst”, “Votobia”, “Ivo Železný”, “Větrné Mlýny”… Неацэнную ролю на самым пачатку 90-х гадоў адыграў у справе адкрыцьця новых імёнаў часопіс *“Iniciály”*. У тым часе ён стаўся сапраўднай трыбунай для маладых аўтараў. На жаль, праз ідэйную неакрэсьленасьць і фінансавыя праблемы часопіс праіснаваў нядоўга, але ягонае месца вельмі апэратыўна здолелі заняць іншыя новазаснаваныя ці адноўленыя выданьні: “Host”, “Tvar”, “Psí víno”, “Weles”, “Aluze”, “Lumír”… Цікавай тэндэнцыяй і выразнай праявай рынкавай эканомікі ў літаратуры ёсьць дэцэнтралізацыя выдавецкае справы (як і самога літаратурнага працэсу): большая частка літаратурных часопісаў цяпер выходзіць ня ў Празе, а на ўсходзе — у Маравіі, галоўным чынам у Брне зь ягонымі магутнымі выдавецкімі дамамі “Host” і “Petrov”. Вакол асобных часопісаў і выдавецтваў пачалі гуртавацца суполкі аўтараў, і ўрэшце, нават нягледзячы на пэўныя складанасьці напачатку, цяперака Чэхія перажывае сапраўдны пісьменьніцкі бум. Што казаць, нават калі палічыць толькі аўтарскія дэбюты за апошняе дзесяцігодзьдзе, выйдзе, што ў чэскай літаратуры што тры дні на літаратурным небасхіле загараецца новае імя. Вядома, ня кожнае зь іх робіцца яснаю зоркай, аднак нямала нават дэбютных кніжак імгненна атрымлівае ўсенароднае прызнаньне, а заадно і прэстыжныя літаратурныя прэміі. Сьвежы прыклад: у 2002 годзе ў штогадовай анкеце газэты *“Lidové noviny”* найлепшымі кнігамі году былі названыя раман “Памяці маёй бабулі” (*Paměť mojí babičce*) 22-гадовай студэнткі мангалістыкі Пэтры Гулавай і зборнік апавяданьняў “Жэлары” 83-гадовай Кветы Лягатавай. Абедзьве аўтаркі гэтак адрознага веку — дэбютанткі, аднак гэта ня сталася перашкодай, каб апярэдзіць нават прызнаных мэтраў.

Калі асацыяваць 90-я гады з адною творчаю постацьцю, ёю бясспрэчна будзе Міхал Вівэг, які да сёньня ўжо цягам дзесяцігодзьдзя ўтрымлівае адназначнае першынство што да накладаў сваіх кніг і любові чытачоў, а асабліва чытачак. Такое

становішча тлумачыцца, між іншым, беспамылковым разьлікам. Па-першае, Вівэг вельмі плённы аўтар: з 1990 да 2003 году ён выдаў агулам 12 кніг, не даючы тым самым нагоды забыцца на сябе. Па-другое, ягоныя творы займаюць тактычнае становішча між высокім мастацтвам і кічам; як выказаўся Ян Максімюк, гэта своеасаблівы постмадэрнізм для народу. Побач зь літаратурнай гульнёй, інтэртэкстуальнымі ды мэтатэкставымі пасажамі ягоныя творы заўсёды маюць прыцягальны сюжэт, часта заснаваны на аўтабіяграфічных перажываньнях, яны насычаныя густоўным гумарам і не перанасычаныя сымбалямі. Гэта чытво як лёгкае, гэтак і дабраякаснае. Чытач, верыцца, падзеліць маё меркаваньне, пазнаёміўшыся па-беларуску з раманам “Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі” (*Výchova dívek v Čechách*, 1994), які, разам з кнігай “Цудоўныя гады сабаку пад хвост” (*Báječná léta pod psa*, 1992), ёсьць найпапулярнейшай кнігай гэтага аўтара (не ў малой ступені дзякуючы таму, што паводле згаданых двух раманаў амаль адразу былі зьнятыя аднайменныя фільмы).
Ужо згаданы вышэй Яхім Топал (Jáchym Topol, нар. 1962) — асоба, узгадаваная андэрграўндам. Цяперашні паэт і празаік, былы журналіст і рок-сьпявак паходзіць зь вядомага пісьменьніцкага роду: ягоны дзед Карэл Шульц — аўтар славутага раману “Камень і боль”; бацька Ёзаф Топал — дысыдэнт, знакаміты драматург, перакладчык п’есаў Шэксьпіра, юначы сябар Вацлава Гаўла; брат Філіп — празаік і паэт, сьпявак і музыка, лідэр культавага андэрграўнднага гурту “Байцовыя сабакі” (*Psí vojáci*), для якога нямала тэкстаў напісаў і сам Яхім. Сваю дарогу ў літаратуру ён пачаў, узараўшы паэтычную ніву і выдаўшы зборнікі вершаў “Кахаю цябе да шаленства” (*Miluju tě k zbláznění*, 1991) і “У аўторак будзе вайна” (*V úterý bude válka*, 1992). Дасягнуўшы ў паэзіі вяршыні ў выглядзе прэстыжнай літаратурнай прэміі, Яхім Топал ня кінуў яе пісаць, але перастаў публікаваць і ў 1994 годзе выдаў свой першы слаўны раман “Сястра” (*Sestra*), які адразу ж зрабіўся найгучнейшым літаратурным скандалам. Другі раман (а ўжо вось-вось мусіць выйсьці і трэці) — “Андзел” (*Anděl*, 1996; даслоўны пераклад — Анёл) — атрымаў сваю назву паводле раёну Прагі, раёну наркотыкаў і злачынных прытонаў (мастацкі фільм *“Anděl Exit”* (2000) рэжысэра Ўладзімера Міхалка, гэткі чэскі *“Trainspotting”*, быў адзначаны як найлепшы фільм году ў

некалькіх намінацыях). Кнігі Топала стылёва цалкам супрацьлеглыя Вівэгавым: гэта вельмі складаныя мэтафары пра пагібель людзей ад “дабротаў” сучаснай цывілізацыі, гэта крывавыя алегорыі, што выклікаюць у чытача ўвадначас і захапленьне, і агіду, гэта мазаікавыя каляжы зь цяжкаўлоўным сюжэтам, напісаныя гутарковай і слэнгавай мовай.

Тэма наркотыкаў, жыцьця багемы ці папросту грамадзкага дна для чэскай літаратуры ня новая — яшчэ ў 1984 годзе другі прадстаўнік чэскага андэрграўнду Ян Пэлц (Jan Pelc, нар. 1957) выдаў на эміграцыі брутальны, даўна ўжо культавы раман “…а будзе горш” (…*a bude hůř*; амаль як у песьні нашага “NRMy”; зрэшты, рок-музыка і андэрграўнд заўжды былі вельмі блізкія, таму такія міжнародныя перагукі нядзіўныя) пра амаральны супраціў яшчэ больш амаральным і нават злачынным завядзёнкам сацыялістычнага нармалізацыйнага рэжыму. Пэлц застаецца плённым аўтарам і цяпер: на хвалі камэрцыйнага посьпеху свайго першага раману, які на радзіме быў выдадзены ў 1990 годзе і ўжо вытрымаў некалькі перавыданьняў, ён напісаў яшчэ колькі празаічных кніг, сярод якіх найвялікшы рэзананс атрымала аповесьць “Баскет Флёра” (*Basket Flora*, 1995), надзвычай дасьціпная чарнушная пародыя на клясычны дэтэктыў, экалягічны раман, баявік і г.д.
Цікава, што старэйшае пакаленьне чэскіх аўтараў, чые кнігі ў камуністычнай Чэхіі былі пад забаронай, па Аксамітнай рэвалюцыі ўжо, бадай, не стварылі гэткіх слынных твораў, як да таго, пішучы ў стол або выдаючы на эміграцыі ці ў самвыдаве (з ходу магу назваць хіба вельмі моцны раман “Як робіцца хлопец” Вацуліка, аднак характэрна, што ён не ўвайшоў у наш “Топ-50” і Вацулік там прэзэнтаваны сваімі ранейшымі кнігамі “Чэскі соньнік” ды “Сякера”). Новыя часы амаль не прынесьлі “старой гвардыі” новых тэмаў, і тыя часьцяком заглыбляліся ў мэмуары ці ўвогуле адышлі ад літаратурнай творчасьці. Яскравым выняткам на гэтым тле — Іржы Кратахвіл (Jiří Kratochvil, нар. 1940), які, пачаўшы пісаць у 1964 годзе, сапраўднай пісьменьніцкай славы дасягнуў якраз толькі ў 90-я. У 1970 годзе яго абвесьцілі пэрсонай нон грата, аднак, не падзяляючы й многіх поглядаў тагачасных дысыдэнтаў, ён стаўся гэткай белай варонай. Калі не лічыць самвыдатаўскай кнігі апавяданьняў з 1978 году, ягоны

афіцыйны кніжны дэбют адбыўся ажно ў 1990-м. На сёньняшні дзень Іржы Кратахвіл — аўтар васьмі раманаў, двух зборнікаў апавяданьняў, колькіх эсэістычных кніг, тузіна п'есаў… Апроч таго, ён — уладальнік цэлай калекцыі прэстыжных літаратурных прэміяў: Тома Стопарда за "Мядзьведжы раман" (*Medvědí román*, 1990), Чэскіх кнігагандляроў і "Літаратурных навінаў" за "Пасярод начэй сьпеў" (*Uprostřed nocí zpěv*, 1992), Эгана Гостаўскага за "Авіён" (*Avion*, 1995), Карла Чапка за "Несьмяротную гісторыю" (*Nesmrtelný příběh*, 1997), Яраслава Сайфэрта за "Начное танга, або Раман аднаго лета з канца стагодзьдзя" (*Noční tango aneb Román jednoho léta z konce století*, 1999). Чэрпаючы натхненьне з тэмаў і ўласных перажываньняў найперш часоў таталітарызму, аўтар "не выпісваецца", ягоны апошні раман "Ляжаць, шэльма!" (*Lehni, bestie!*, 2002) зноў вельмі ўражвае, і, хоць ён пакуль не атрымаў прэстыжных прэміяў, гэта хутчэй пытаньне некалькіх месяцаў. Іржы Кратахвіл, між іншым, аўтар "Маніфэсту постмадэрнізму", аднак ягоны пісьменьніцкі мэтад цяжка зьмясьціць у рамках толькі постмадэрнізму. Кнігі пісьменьніка — складана структураваныя гісторыі, дзея якіх, вычварна пераплятаючыся, адбываецца то ў Брне ў вельмі канкрэтным месцы, то ў нейкім фантастычным, выдуманым сьвеце. Кратахвіл вольна маніпулюе ня толькі з часам ды прасторай, але і зь дзейнымі асобамі, умела гуляе з цытатамі і алюзіямі. Ён — неператўзыдзены стыліст і тонкі дасьціпнік, правакатар і псыхоляг.

Наступны, пра каго неабходна згадаць, — Пэтар Шабах (Petr Šabach, нар. 1951), пасьпяховы прадаўжальнік вельмі "чэскай" літаратурнай традыцыі, разьвітай Гашкам і Грабалам. Ягоныя творы — парадаксальна-гумарыстычнае (часам з трагікамічным адценьнем) асэнсаваньне найноўшай гісторыі, зноў жа галоўным чынам таталітарнай, часьцяком натхнёныя так званымі карчомнымі гісторыямі і анэкдотамі. Амаль усе ягоныя кнігі за кароткі час вытрымалі па некалькі перавыданьняў, а некаторыя — нават больш за дзясятак. Найбольш пасьпяховыя зь іх — "Гаўно гарыць" (*Hovno hoří*, 1994; на матывы гэтай кнігі быў зьняты шалёна папулярны фільм "Норкі" (*Pelíšky*), 1999), "Бабулі" (*Babičky*, 1998), "П'яныя бананы" (*Opilé banány*, 2001). Парадаксальна: згаданыя вышэй аўтары, якія набылі

літаратурную вядомасьць, а часта і ўступілі ў літаратуру на мяжы 80—90-х гадоў, належаць ужо да сучасных клясыкаў. На пяты ім наступае новае пакаленьне аўтараў кшталту Марціна Камарка, Рамана Лудвы, Пэтра Ульрыха, Вацлава Кагуды, Яна Балабана ці Мілаша Урбана, творы якіх заслугоўваюць безумоўнай чытацкай увагі. Выразную ролю ў многіх гэтых аўтараў адыгрывае фантасмагорыя, міт і фікцыя. Асабліва Мілаш Урбан (Miloš Urban, нар. 1967) зьдзівіў і выклікаў спрэчкі сваёй першай кнігай "Апошняя кропка ў справе "Рукапісаў" (*Poslední tečka za Rukopisy*, 1998), якая выдадзена пад псэўданімам Ёзаф Урбан і закладаецца на вядомых спрэчках што да падробкі Ганкам і Ліндам у XIX стагодзьдзі "Кралевадворскага й Зеленаградзкага рукапісаў". Падобны містыфікацыйны характар маюць і ягоныя наступныя раманы: новагатычны "Сямікасьцёльле" (*Sedmikostelí*, 1999), экалягічны "Вадзянік" (*Hastrman,* 2001) або навінка "Цень катэдральнага сабору" (*Stín katedrály*, 2003).
Шматабяцальным празаікам выявіўся й Раман Лудва (Roman Ludva, нар. 1966), які па экспэрымэнтальнай дэбютнай кнізе "Сьмерць і фатэль" (*Smrt a křeslo*, 1996) у сваёй творчасьці хутчэй схіляецца да рэалістычнай плыні ў літаратуры, асабліва ж у апошнім сваім рамане "Сьцяна сэрца" (*Stěna srdce*, 2001). Да важных імёнаў прозы 90-х належыць Вацлаў Кагуда (Václav Kahuda, нар. 1965), які сваімі творамі, поўнымі фікцыі, узьвірыў розгалас як сярод чытачоў, гэтак і крытыкаў. Нярэдка яго называюць наступнікам Гашка і Грабала ды малодшым калегам Шабаха. Ягоны самавіта-размашысты стыль уласьцівы ўсім ягоным творам, зь якіх пакуль найвядомейшы — "Гушчар" (*Houština*, 1999).

Дагэтуль я не згадаў ніводнага імя сучаснай чэскай пісьменьніцы: іх дастаткова, аднак аб'ектыўна выходзіць так, што жаноцкасьць у полавай прыналежнасьці вызначае й жаночую тэматыку — гэта галоўным чынам праблемы, зьнітаваныя з становішчам і магчымасьцямі самарэалізацыі жанчыны ў сучасным грамадзтве, сям'і, партнэрстве… Таму й асноўную чытацкую аўдыторыю тут складаюць пераважна кабеты, хаця часта няма гаворкі пра лёгкае чытво, чыста жаночы раман. Якраз абстрагавацца ад жаночых праблемаў і ня страціць глыбіні мысьленьня найбольш удалося, відаць,

Даніэле Годравай (Daniela Hodrová, нар. 1946), аднак паказальна, што многія пісьменьнікі-мужчыны — той самы Вівэг — ейных кніг не разумеюць. На ейную празаічную творчасьць найбольш паўплывала эстэтыка французскага Новага раману, з чэскіх аўтараў ёй духоўна блізкі Іржы Кратахвіл. Мэтафізычныя містыфікацыйныя раманы Годравай ствараюць новую міталёгію Прагі (“Перуноў дзень” (*Perunův den*, 1994), трылёгія “Пякельны горад” (*Trýznivé město*, 1991—1992)). Яны цяжкія для чытаньня, прасякнутыя літаратуразнаўчымі рэфлексіямі над сэнсам пісьма, а адсюль і жыцьця інтэлігенцыі. Найбольшага камэрцыйнага посьпеху дасягнулі кнігі Галіны Паўлоўскай (Halina Pawlowská, нар. 1955): “Безнадзейныя жанчыны робяць безнадзейныя рэчы” (*Zoufalé ženy dělají zoufalé věci*, 1993), “Чаму я не засілілася” (*Proč jsem se neoběsila*, 1994), “Бэгемоты ня плачуць” (*Hroši nepláčou*, 1996), “Як быць шчасьлівым. Дванаццаць амаральных парадаў” (*Jak být šťastný. Dvanáct nemorálních rad*, 1996), “Як дасьць Гасподзь здароўя, будуць і грахі” (*Dá-li pánbůh zdraví, i hříchy budou*, 1998) і інш. У высокай папулярнасьці тэкстаў Паўлоўскай, безумоўна, немалую ролю адыгрывае ейны апавядальніцкі тэмпэрамэнт, досьціп, пераважна гумарыстычны падыход, а таксама пэўны геданізм і эстраднасьць. Асаблівае месца ў дагэтулешняй творчасьці гэтай сцэнарысткі, рэдактаркі і тэлевядучай займае аповесьць “Дзякуй за кожны новы ранак” (*Díky za každé nové ráno*, 1994; да таго ж году належыць і аднайменная кінавэрсія кнігі), дзе апроч асабістых траўмаў ад пошуку й стратаў партнэраў апавядальніца ў трагікамічным ключы паказвае свой шлях да навукі і творчай самарэалізацыі, ускладнены “нармалізацыйнымі” завядзёнкамі што да недастаткова ляяльных або кадрава “праблематычных”. Той факт, што ейныя родныя жывуць як у Нямеччыне, гэтак ува Ўкраіне, дае Паўлоўскай магчымасьць параўноўваць “заходні” і “ўсходні” лад жыцьця ды руйнаваць міжнацыянальныя забабоны. Адно з апошніх адкрыцьцяў жаночай літаратурнай сцэны Чэхіі — Ірэна Абэрманава (Irena Obermannová, нар. 1962), аўтарка з выключным пачуцьцем гумару і не абцяжараная мяшчанскімі табу, якая, не выходзячы за рамкі традыцыйных жаночых тэмаў, у сваіх кнігах (“Дзёньнік шалёнай жонкі” (*Deník šílené manželky*, 2001), “Дзіўнавалоскі” (*Divnovlásky*, 2001) ператварае іх у “брутальныя гратэскі”.

Чэская літаратура 90-х (у адрозьненьне ад беларускай) — літаратура раманная. Заўважце тэндэнцыю: нават пачаткоўцы зазвычай пішуць спачатку раманы і толькі потым спрабуюць нешта стварыць у больш кароткай форме.
І яшчэ адно маленькае назіраньне: чэхі з задавальненьнем экранізуюць свае творы, што шаноўны чытач, мабыць, ужо заўважыў. З аднаго боку, гэта прыносіць немалыя прыбыткі як аўтарам ды выдаўцам, так і кінэматаграфістам, а з другога — гэта страшэнна падвышае прэстыж чэскай літаратуры і, натуральна, самой кінэматаграфіі. Нездарма ж фільмы чэскай прадукцыі амаль штогод фігуруюць сярод намінантаў на "Оскара".

У адрозьненьне ад прозы, сытуацыя ў сучаснай чэскай паэзіі цяжка апісальная. Колькасьць тут значна перавышае якасьць. Штогод выдаецца 300—500 паэтычных зборнікаў, часта прыватнымі намаганьнямі саміх аўтараў. І ўсё ж, нягледзячы на пэўны хаос, хвалю паэтаў, што ўступіла ў мінулыя 10—15 гадоў у літаратуру, можна падзяліць на колькі групаў.
Найперш — кароткая згадка пра наймаладзейшых аўтараў андэрграўнду, чый дэбют адбыўся яшчэ да 1989 году, калі іхныя публікацыйныя магчымасьці былі зьнітаваныя з самвыдатаўскімі часопісамі *"Vokno"* і *"Revolver Revue"*. Апошні з названых пэрыёдыкаў слугуе "пэрыфэрыйнай" літаратуры да сёньня і рэгулярна выдае крытычныя дадаткі. Да найвядомейшых асобаў гэтай групы належаць ужо згадваны вышэй Яхім Топал, ягоны сябра І.Г.Крхоўскі і Віт Крэмлічка. Літаратурнай падзеяй зрабілася выданьне выбраных твораў "Ночы, па якіх не прыходзіць ранак" (*Noci po nichž nepřichází ráno*, 1991) і "Хіба зь лебедзем" (Leda s labutí, 1996) нэадэкадэнта І.Г.Крхоўскага (J.H.Krchovský, нар. 1960). Апошнім зборнікам "Старыя песьні" (*Staré písně*, 2002) чарговы раз пацьвердзіў свой выразны паэтычны талент Віт Крэмлічка (Vít Kremlička, нар. 1962).
1989 год значыў для літаратуры й вяртаньне хрысьціянскай і духоўнай плыні. З новай генэрацыі паэтаў сюды належаць Пэтар Боркавэц (Petr Borkovec, нар. 1970), Мілаш Долежал (Miloš Doležal, нар. 1970), Павэл Колмачка (Pavel Kolmačka,

нар. 1962), Пэтар Павэл (Petr Pavel, нар. 1969), Марцін Ёзаф Штэр (Martin Josef Stöhr, нар. 1970). Творчасьць гэтых аўтараў насьледуе спадчыне Багуслава Рэйнка і поўніцца традыцыйным успрыманьнем і традыцыйнымі сымбалямі.
Блізка да гэтай плыні знаходзіцца паэзія Эвалда Мурара (Ewald Murrer, нар. 1964) і Богдана Трояка (Bogdan Trojak, нар. 1975), які дагэтуль выдаў тры зборнікі і зьвярнуў на сябе ўвагу ўжо сваім дзівосна празрыстым дэбютам “Кунічым пэндзлем” (*Kuním štětcem*, 1996).
Крыху ўбаку ад галоўнага цёку, аднак па-ранейшаму актыўнай застаецца праская сюррэалістычная група, што яднаецца вакол часопісу *“Analogon”*. Найбольш адметным аўтарам, што чэрпае з крыніцаў сюррэалізму, ёсьць Ярамір Ф.Тыплт (Jaromír F.Typlt, нар. 1973). Імкненьне шакаваць і ў той самы час прага праграмнасьці прасочваецца як у першым зборніку *“Concerto grosso”* (1990), так і ў выбраным “Страчанае пекла” (*Ztracené peklo*, 1994).
Падобна як празаікі, паэты сярэдняга і старэйшага пакаленьня, актыўныя асабліва ў таталітарныя часы, не дадалі сваёй апошняй творчасьцю, хоць якаснай і арыгінальнай, сабе славы, аднак умацавалі свае пазыцыі мэтраў паэтычнага слова. У іх шэрагу варта назваць пачынальніка андэрграўнду Івана Марціна Іраўса (Ivan Martin Jirous, нар. 1944), віртуознага парадыста і перакладчыка Івана Вэрніша (Ivan Wernisch, нар. 1942), нэалацініста Эўгена Брыкцыюса (Eugen Brikcius, нар. 1942), Паўла Шрута (Pavel Šrut, нар. 1940), Пэтра Кабэша (Petr Kabeš, нар. 1941).

Я імкнуўся абмежаваць свой пералік, аднак існуе цэлая плеяда аўтараў, тут не згаданых. Гэты артыкул — беглы агляд, таму прымеце вышэй прыведзеныя радкі як сьведчаньне таго, што чэская літаратура мае што прапанаваць, у тым ліку беларускаму чытачу. 90-я гады належаць да аднаго зь яе найбольш плённых пэрыядаў і выявілі шэраг неаспрэчных талентаў. Адбылося аднаўленьне нармальнай камунікацыі і разнастайнасьці. І, нягледзячы на ўсе чутныя ў Чэхіі нараканьні, новая чэская літаратура знайшла і знаходзіць свайго чытача.

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/30
[image]

Эканоміка Чэхіі

Сучасная грашовая сыстэма Чэхіі належыць да самых стабільных у рэгіёне. Грашовая адзінка — чэская крона (Kč, CZK), курс якой з 2000 году хістаецца ў межах прыкладна 30—31 CZK за 1 EUR. Асноўнай адзінкай зьяўляецца мэталічная манэта вартасьцю ў адну крону. Астатнія манэты маюць вартасьць 0,5 (50 галержаў) кроны, 2, 5, 10, 20 і 50 CZK.
У траўні 2003 году былі выведзены з ужытку самыя танныя манэты (10 і 20 галержаў). Купюра самай нізкай намінальнай вартасьці — дваццацікронавая (20 CZK), далей ідуць банкноты вартасьцю 50, 100, 200, 500, 1000, 2000 і 5000 крон. Пераход да эўра (уступ у Эўрапейскі грашовы зьвяз) чакаецца пасьля ўступу ў Эўрапейскі зьвяз у 2007—2010 годзе.
Разьмеркаваньне сродкаў у дзяржаве вызначаецца законам аб дзяржаўным бюджэце, які прымаецца штогод. Рыхтуе яго ўрад, а зацьвярджае ніжняя палата парлямэнту. Акрамя грошай у дзяржаўнай скарбніцы дзяржава мае і пазабюджэтныя фонды:
– Фонд дзяржаўнай маёмасьці распараджаецца сродкамі, атрыманымі ў выніку прыватызацыі;
– Зямельны фонд разьмяркоўвае аграрныя датацыі й кіруе дзяржаўнымі даходамі зь сельскай гаспадаркі;
– Фонд транспартнай інфраструктуры фінансуе будоўлю й

рамонт нацыянальнай сеткі дарог (камунальная інфраструктура знаходзіцца на ўтрыманьні краёў і гарадоў);
– Дзяржаўнае кансалідацыйнае агенцтва займаецца трансфармацыйнымі даўгамі й абавязаньнямі, перанятымі дзяржавай ад прыватнага сэктару.
Управа сацыяльнага страхаваньня й так званы Пэнсійны фонд, у адрозьненьне ад іх, фінансуюцца зь дзяржаўнага бюджэту. Мэдыцынскае страхаваньне ідзе па-за дзяржаўнымі фіскальнымі плынямі й забясьпечваецца страхавымі мэдыцынскімі кампаніямі. Мэдыцынскае, сацыяльнае ды пэнсійнае страхаваньне ў Чэхіі абавязковае.

Структура народнай гаспадаркі
У Чэхіі дзейнічаюць суб'екты дзяржаўнай, прыватнай і каапэратыўнай уласнасьці. Паводле арганізацыі прадпрыемствы падзяляюцца на наступныя тыпы:
Дзяржаўныя прадпрыемствы кіруюцца непасрэдна дзяржавай; гэта, напрыклад, пошта. Але часта дзяржава мае значную долю і ў прадпрыемствах іншага тыпу, напрыклад, яна можа мець вялікія пакеты акцыяў.
Акцыянэрныя таварыствы маюць звычайную форму кіраваньня, але яны абавязаныя адзін раз у год склікаць агульны сход і знаёміць грамадзкасьць з вынікамі сваёй гаспадарчай дзейнасьці. Камэрцыйныя таварыствы не абавязаныя даваць справаздачу пра сваю працу. Каапэратыўная форма ўласнасьці страчвае сваё значэньне, яна сустракаецца ў асноўным у галіне сельскай гаспадаркі й кіраваньні жыльлёвым фондам. У эканоміцы дзейнічаюць таксама самастойныя прамыслоўцы і земляробы.
Доля прыватнага сэктару ў стварэньні валавога нацыянальнага прадукту (ВНП) з 1990 году падвысілася за 10 год з 12,5% да больш як 75%. З пачатку 90-х таксама значна зьмянілася галіновая структура эканомікі. Галоўную ролю, вядома, па-ранейшаму адыгрывае прамысловасьць, але цяжкія галіны (горназдабыўная, мэталюргія ды інш.) саступілі месца пераапрацоўчай прамысловасьці, дзе большая даданая вартасьць. Напрыклад, самым буйным чэскім экспартэрам (прыкладна 7% агульнага экспарту) ужо зь сярэдзіны 90-х зьяўляецца вытворца легкавых аўтамабіляў "Шкода Аўта". Будоўля страціла другое месца сярод стваральнікаў ВНП,

саступіўшы транспарту, тэлекамунікацыям і фінансава-банкаўскай сыстэме, якія разьвіваюцца хуткімі тэмпамі, а таксама турызму і так званай новай эканоміцы. Значэньне сельскай гаспадаркі ў нацыянальных маштабах увесь час зьніжаецца, але земляробы ўяўляюць сабой дастаткова ўплывовую частку рынку працы, асабліва ў Маравіі. Земляробы, дарэчы, найбольш пэсымістычна настроеныя ў пытаньні ўступу краіны ў Эўразьвяз.

Узровень жыцьця

У сярэднім 15442 кроны (без вылічэньняў), г.зн. каля 500 даляраў, зарабіў у трэцім квартале 2002 году кожны працоўны. Рэальная зарплата, дзякуючы рэкордна нізкай інфляцыі (0,7%), у параўнаньні з такім жа пэрыядам 2001 году падвысілася на 6,7%. Гэта найбольшае падвышэньне заробкаў за апошнія 3 гады. Аналітыкі папярэджваюць, што рост заробкаў у Чэскай Рэспубліцы не адпавядае дынаміцы прадукцыйнасьці працы, а гэта мусіць скончыцца або звальненьнямі, або стратай канкурэнтаздольнасьці на замежных рынках.

У апошнія 13 год у грамадзтве павялічваецца розьніца ў аплаце розных прафэсій. Мэнэджэры вялікіх фінансавых і страхавых фірмаў зарабляюць у невытворчай сфэры найбольш (каля 1100 CZK за гадзіну). Высокія заробкі маюць таксама маклеры, мэнэджэры авіякампаній. Наадварот, горш за ўсё аплачвалася праца краўчых (38,73 кроны за гадзіну). Ня больш за 50 кронаў за гадзіну зарабляюць таксама чаляднікі й некваліфікаваныя рабочыя, вартаўнікі, прыбіральніцы, а таксама, напрыклад, работнікі пральняў ды хімчыстак, швачкі й шаўцы. Таксама менш за сярэдняе зарабляюць выкладчыкі некаторых ВНУ, бібліятэкары, кіроўцы, супрацоўнікі інфармацыйных службаў, тэлефаністы, прадавачкі, працаўнікі органаў бясьпекі, земляробы, касіры ў банках, страхавых фірмах і на поштах.

У дзяржаўнай сфэры найлепш аплачваецца праца судзьдзяў, дырэктараў і прэзыдэнтаў буйных арганізацый ды прадпрыемстваў, а таксама высокапастаўленых чыноўнікаў. Узровень беспрацоўя (кастрычнік 2002 — 9,3%) хістаецца, не перавышаючы 10%. Спэцыялісты, аднак, баяцца, што ў будучым ён будзе павялічвацца.

Дзяржаўнае гаспадараньне

Асноўнымі фактарамі, якія рэгулююць нацыянальную эканоміку, зьяўляюцца фіскальная (дзяржаўна-бюджэтная) і валютная (грашовая) палітыка. Але магчымасьць уплываць на эканоміку бюджэтнымі ўмяшальніцтвамі ў Чэхіі значна абмежавана. Больш за 80% выдаткаў дзяржаўнага бюджэту абавязковыя, а значыць, строга вызначаныя законам (пэнсіі, сацыяльная дапамога і г.д.), і дзяржава мусіць забясьпечыць іх, нягледзячы на стан даходнай часткі бюджэту. Акрамя звычайных даходаў з свайго гаспадараньня (падаткі, мыты, прыбыткі дзяржаўных прадпрыемстваў), урад у мінулыя гады часта выкарыстоўваў дзеля сваіх фінансавых патрэбаў таксама сродкі, атрыманыя ў выніку прыватызацыі, — але заўсёды не на доўгачасовыя, структурныя мэты (напрыклад, разгортваньне транспартнай інфраструктуры), а дзеля непасрэднага спажываньня. Такая практыка выклікала вострую крытыку ня толькі чэскіх незалежных эканамістаў, але час ад часу і міжнародных арганізацый на чале зь Міжнародным валютным фондам і Сусьветным банкам. Больш за тое, у апошнія гады бюджэтная шчодрасьць выявілася ў павялічэньні дэфіцыту дзяржаўнага бюджэту (няплянавага, а зрэдку і плянавага), і адначасова з гэтым — у хуткім росьце дзяржаўнага доўгу ў выніку прызнаньня дзяржавай так званых трансфармацыйных даўгоў. Гаворка ідзе пра забавязаньні, якія пераймае дзяржава ў збанкрутавалых фірмаў або прыватных прадпрыемстваў. Значную крытыку дзейнасьці ўрадавых эканамістаў выклікае яшчэ і раздрабненьне плыні дзяржаўных фінансаў на мноства фондаў, якія дзейнічаюць незалежна ад дзяржаўнага бюджэту, прытым што іх дзейнасьць не абавязкова ўзгадняецца з парлямэнтам.
Пад націскам міжнародных арганізацый і перад абліччам пагрозы пагаршэньня сытуацыі ў фіскальнай сфэры Міністэрства фінансаў цяпер рыхтуе кардынальную рэформу дзяржаўнага гаспадараньня, у пытаньні якой усё яшчэ не дасягнуты палітычны кансэнсус. Першым крокам мусіць стаць прыняцьце сярэднетэрміновых бюджэтных плянаў, якія, як і дзяржаўны бюджэт, зацьвярджаліся б парлямэнтам.

Падаткі
Асноўную частку даходаў дзяржавы складаюць падаткі. Дзяржаўная скарбніца часткова дзеліцца гэтымі грашыма з

больш дробнымі тэрытарыяльнымі ўтварэньнямі — самакіраваньнямі ды асобнымі гарадамі. Адміністрацыйная рэформа (улучна з падатковай) яшчэ ня скончаная, і яе дапрацоўка працягваецца. Значную незадаволенасьць левых выклікае тое, што ў чэскай падатковай сыстэме адсутнічае падатак на маёмасьць (ёсьць толькі падатак на нерухомасьць). Акрамя таго, левыя беспасьпяхова намагаюцца правесьці закон аб увядзеньні рэгістрацыйных касаў, якія б вялі ўлік ускосных падаткаў пры канчатковым спажываньні.
Самы значны падатак з пункту гледжаньня прыбытку дзяржаўнага бюджэту — безумоўна, падатак на даданую вартасьць (ПДВ), які прыносіць у дзяржаўны бюджэт кожны год больш за пятую частку агульнага прыбытку. Гэта асноўны ўскосны падатак, якім абкладаецца канчатковае спажываньне тавараў і паслуг. Падаткаплатнікам зьяўляецца па сутнасьці кожны канчатковы спажывец, аднак вызначэньне платнікаў — рэч больш складаная. Прадпрымальнік можа патрабаваць ад дзяржавы вяртаньня падатку ў выпадку, калі тавар (паслуга) будзе выкарыстаны далей дзеля разьвіцьця, напрыклад, вытворчасьці. Базавая стаўка падатку 22%, ільготная (напрыклад, на прадукты харчаваньня) — 5%. Турысты пры вывазе тавараў з краіны могуць не пазьней як праз адзін дзень пасьля набыцьця патрабаваць вяртаньня гэтага падатку, калі кошт тавараў перавысіў 1000 Kč. Патрабаваць вяртаньня падатку могуць і замежныя прадпрымальнікі пры набыцьці тавараў і транспартных паслуг на тэрыторыі Чэхіі.
Да ўскосных таксама належыць акцызны падатак, якім абкладаюцца тытунёвыя вырабы, алькаголь, паліўныя сумесі. Падатак дае 10—15% прыбытку бюджэту. Ён вызначаецца не адсоткам з кошту дадзенага вырабу, як іншыя падаткі, а сталай надбаўкай да адзінкі вымярэньня — напрыклад, 234 CZK да літра чыстага алькаголю (этанолу) або 10,84 CZK да літра неэтыляванага бэнзыну.
Грамадзяне абкладаюцца, галоўным чынам, простым падаткам на даход фізычных асоб. Гэта тычыцца як супрацоўнікаў розных установаў, так і прадпрымальнікаў, што маюць свой бізнэс. Падатак плаціцца і з прыбытку ад арэнды, даходаў, якія прыносіць пасада чалавека, або даходаў з капіталу. Асновай падатку зьяўляюцца атрыманыя з усяго сьвету прыбыткі канкрэтнай асобы, якая знаходзіцца больш за 183 дні ў год або

стала пражывае на тэрыторыі Чэхіі. Існуюць некалькі падатковых групаў, стаўкі для якіх часта зьмяняюцца — самая нізкая, аднак, застаецца аднолькавай даволі доўгі час на ўзроўні 15% пры гадавым даходзе да 3600 эўра. Гэты падатак напаўняе дзяржаўную скарбніцу на 12%. Яго галоўнай перавагай для дзяржаўнага кіраваньня зьяўляецца добрая прагназаванасьць даходу ды адносна лёгкая спаганяльнасьць ад падаткаплатнікаў, перадусім ад працоўных.
Фірмы плацяць аналягічны падатак, і гэта падатак з даходаў юрыдычных асоб. Базавая стаўка — 31% з падатковай асновы (даходы мінус выдаткі), паніжаная — 11% (для інвэстыцыйных, далявых і інш. фондаў). Абодва падаткі з прыбытку ахоўваюцца шэрагам міжнародных пагадненьняў для папярэджаньня двайнога падаткаабкладаньня.
Выкарыстаньне дарожнай інфраструктуры пры прадпрымальніцкай дзейнасьці ў Чэхіі абкладаецца дарожным падаткам. Ім абкладаюцца ўсе больш чым двухколавыя транспартныя сродкі, якія выкарыстоўваюцца для прадпрымальніцкай дзейнасьці, — вынятак складаюць пасажырскі маршрутны транспарт унутры краіны і ратавальныя машыны.
Прадпрымальнікі і фізычныя асобы абкладаюцца таксама падаткам на нерухомасьць, якому падлягаюць як участкі зямлі, так і будынкі. Праўда, шырокае кола аб’ектаў вызваленае ад гэтага падатку. Базавая стаўка 1 CZK/м^2 карэктуецца каэфіцыентам паводле разьмяшчэньня — найвышэйшы, вядома, у сталіцы. Прыбытак ад гэтага падатку, аднак, мінімальны, а ў нацыянальных мерках мізэрны, улік складаны. Таму многія эканамісты прапануюць наагул адмовіцца ад гэтага падатку.
У чэскай падатковай сыстэме існуюць таксама падаткі на спадчыну, падарункі, перавод нерухомасьці (продаж). І тут ёсьць цэлы шэраг выняткаў і льготаў. Галоўным чынам гэта тычыцца сваякоў. Стаўкі вагаюцца ад 0,5% да 40%.
Самакіраваньні таксама маюць свае прыбыткі: акрамя падаткаў, якімі яны дзеляцца зь дзяржавай, гэта мясцовыя зборы. Яны могуць спаганяць іх большай часткай паводле ўласных пастановаў. Напэўна, самая вядомая сярод іх — гадавая плата за ўтрыманьне сабакі. Яна часам дасягае нават 1000 CZK, і за кожнага наступнага сабаку ўлады могуць узьняць

плату нават напалову. Больш прыбытку, аднак, мясцовыя адміністрацыі атрымліваюць зь іншых збораў: напрыклад з квіткоў на спартовыя і культурныя імпрэзы, з платы за жыльлёвую плошчу, за знаходжаньне ў рэкрэацыйнай зоне, за гульнявыя аўтаматы і г.д. Спэцыяльную плату мясцовыя ўлады зьбіраюць за вываз і ўтылізацыю камунальных адкідаў.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/28
[image]

ЧЭСКІ ЛІБОМ
2003
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Іван Адзіла Штампах

Новая рэлігійная сытуацыя: індывідуалізацыя веры*

ІВАН АДЗІЛА ШТАМПАХ — сьвятар старакаталіцкага касьцёла, доктар тэалёгіі і грамадзкі дзяяч, аўтар кніг “Малы агляд рэлігіяў” (*Malý přehled náboženství*), 1992; “Сэкты” (*Sekty*), 1992; “Жыцьцё, дух і ўсё” (*Život, duch a všechno*), 1994 і іншых. Тэкст друкуецца з ласкавай згоды аўтара.

** Асновай для артыкулу паслужыла лекцыя, прачытаная ў жніўні 1999 году на сэмінары, прысьвечаным палітычным свабодам, які быў арганізаваны пэдагагічным факультэтам Унівэрсытэту імя Палацкага ў Аламоўцы. Назва артыкулу ў арыгінале — “Рэлігійны спэктар Чэскай Рэспублікі”.*

1. Крыніцы інфармацыі

Інфармацыя аб рэлігійнай сытуацыі на тэрыторыі Чэхіі ня з шэрагу лёгкадаступных. Відавочна, пра зарэгістраваныя рэлігійныя суполкі, якія самі даюць інфармацыю і дзейнасьць якіх навідавоку, вядома больш.

Яшчэ адною крыніцай ёсьць *перапіс насельніцтва*, які праводзіцца раз на 10 год. Перапіс утрымлівае толькі адно пытаньне, цікавае ў дачыненьні да рэлігійнай сытуацыі, — пра канфэсійную прыналежнасьць. Рэлігійныя суполкі маюць свае ўласныя правілы вызначэньня, хто ёсьць іх вернікамі. Адказы ў перапісе неабавязкова супадаюць з дадзенымі суполак, яны,

хутчэй, паказваюць, зь якой канфэсіяй атаесамляюць сябе і сваіх дзяцей асобныя грамадзяне. І ўсё ж нават пры адным пытаньні на рэлігійную тэму перапісныя лісты даюць багата інфармацыі. Узьнікаюць камбінацыі зьвестак. Так, напрыклад, узьнікае тыповы вобраз асобаў, якія адносяць сябе да пэўнага веравызнаньня ў залежнасьці ад адукацыі, веку, месца жыхарства, даходу, прафэсіі.

2. Месца рэлігіі ў Чэскай Рэспубліцы

Закон дае хрысьціянскім цэрквам і іншым рэлігійным суполкам магчымасьць *зарэгістравацца,* а праз гэта набыць яшчэ больш магчымасьцяў. Трэба, аднак, катэгарычна адкінуць вельмі пашыраную памылку, быццам зарэгістраваныя суполкі зьяўляюцца цэрквамі, а незарэгістраваныя — сэктамі. Па-сэктанцку (г. зн. аўтарытарна, неталерантна) можа сябе паводзіць як хрысьціянская царква, так і нехрысьціянскія суполкі, аднак гэта ня мае нічога супольнага зь дзяржаўнай рэгістрацыяй.

Рэгістрацыя надае рэлігійнай суполцы статус юрыдычнай асобы і дае тым самым магчымасьць уступаць ад уласнага імя ў праўныя дачыненьні — набываць маёмасьць, прадаваць, купляць, здаваць у арэнду. З рэгістрацыі вынікае і права на дзяржаўную грашовую дапамогу, што рэгулюецца рознымі праўнымі нормамі. Акрамя таго, дзяржава пакрывае выдаткі на заробкі царкоўным служкам, асабліва духавенству. Цікавая праўная анамалія: разам з тым, паводле юрыдычных дакумэнтаў Канстытуцыйнага суду, сьвятары не валодаюць усімі тымі правамі, якімі валодаюць службоўцы, а рэлігійныя суполкі не нясуць усіх абавязкаў працадаўцаў. Акрамя таго, дзяржава разам з грамадзкімі і рознымі прыватнымі юрыдычнымі асобамі выдаткоўвае цэрквам і астатнім рэлігійным суполкам сродкі на царкоўныя будынкі (касьцёлы, плябані, кляштары і г.д.). Дзяржава фінансуе пачатковыя і сярэднія царкоўныя школы ў такіх жа аб'ёмах, як і дзяржаўныя, а таксама робіць грашовы ўнёсак на разьвіцьцё царкоўных сацыяльных інстытутаў і актыўнай царкоўнай дзейнасьці. Рэгістрацыя дае і іншыя магчымасьці. Па-першае, трэба згадаць права выкладаць закон Божы ў школе. Кіраўніцтва школаў павінна бясплатна даць памяшканьне, у тым ліку ацяпленьне, асьвятленьне і г.д., упаўнаважаным прадстаўнікам рэлігійных

суполак, а таксама арганізаваць навучаньне пры наяўнасьці жаданьня з боку дзяцей альбо іх бацькоў. Сьвятары маюць права аказваць духоўную дапамогу ў шпіталях і падобных установах. Гэтае права можа быць абмежаванае толькі з мэдыка-санітарных прычынаў. Акрамя таго, дзьве найвялікшыя цэрквы, Рыма-каталіцкі касьцёл і Эвангельская царква чэскіх братоў, выкарыстоўваюць магчымасьць аказаньня духоўнай дапамогі ў войску. Духоўнікі зарэгістраваных цэркваў маюць таксама права аказаць духоўную падтрымку абвінавачваным і асуджаным у адпаведных установах.
Цікавымі самі па сабе ёсьць і ўмовы рэгістрацыі. Зарэгістраванымі лічацца рэлігійныя арганізацыі, якія мелі дазвол дзейнічаць за камуністычным часам, пры гэтым без увагі пакідаецца, напрыклад, колькасьць сяброў (да ліку гэткіх арганізацыяў належаць і такія, якія налічваюць, паводле перапісу, толькі некалькі соцень сяброў). Новыя рэлігійныя суполкі могуць зарэгістравацца пры ўмове наяўнасьці каля 10 000 вернікаў. Трэба адзначыць, што хрысьціянскім цэрквам, сябрам Сусьветнай рады цэркваў, для рэгістрацыі досыць усяго 500 подпісаў. Таму ўжо некалькі год гавораць пра ўціск рэлігійных меншасьцяў.
Аддзел па рэлігійных пытаньнях пры Міністэрстве культуры падрыхтаваў новы праект закону, што будзе рэгуляваць умовы рэгістрацыі рэлігійных суполак. Умовы будуць супольнымі для ўсіх і шматкроць лягчэйшымі. Для рэгістрацыі будуць патрэбныя ўсяго 300 подпісаў. Аўтаматычна акрэдытаванымі будуць усе 21 царква і астатнія рэлігійныя суполкі, што існуюць на дадзены момант. Для астатніх умовы будуць цяжэйшыя, чым былі дагэтуль. Яны павінны будуць падаць 20 000 подпісаў (0,2% грамадзянаў) і быць зарэгістраванымі ня менш за 10 год. Законапраект прадугледжвае і вось якое цікавае абмежаваньне: забарону на выкарыстаньне псыхатэрапэўтычных мэтадаў у працы зь вернікамі. Узьнікае пытаньне, а ці ня будуць забароненыя тэрапэўтычныя цэнтры, напрыклад, каталіцкай арганізацыі “Карытас”, эвангельскія “Дыяконіі” ды інш. Цікава, што тэрапія як лячэньне лічыцца ўжо небясьпечнай дзейнасьцю.

3. Гістарычныя карані сёньняшняга рэлігійнага жыцьця
Хрысьціянства на тэрыторыі сучаснай Чэхіі зьявілася хутчэй за

ўсё спачатку ў выглядзе самабытнага кельцкага хрысьціянства (г.зв. ірляндзка-шатляндзкая місія), а пазьней — лацінскага, заходняга хрысьціянства з тэрыторыі Сьвятой Рымскай імпэрыі (сучаснай Нямеччыны). У IX стагодзьдзі мела месца спроба пахіснуць уплывовую пазыцыю лацінскага хрысьціянства празь бізантыйскую місію, якая ахапіла галоўным чынам Маравію. У XI стагодзьдзі значна пераважала хрысьціянства рымскага тыпу. Спробы ўзяць за аснову ўсходнія карані былі адзінкавымі. Разам з хрысьціянамі на тэрыторыі сучаснай Чэхіі жылі жыдыюдэі. Сувязь паміж гэтымі дзьвюма народнасьцямі была нязначнай. Юрыдычнае раўнапраўе жыды атрымалі толькі ў апошнія два стагодзьдзі.

XV і XVI стагодзьдзі пазначаны імкненьнем рэфармаваць царкву. Прадстаўнічыя фігуры рэфармацыі гэтага часу — канстанцкія пакутнікі Ян Гус і Еранім Праскі. Па гусіцкіх войнах апрача рыма-каталіцкай меншыні зьявіліся яшчэ дзьве рэлігійныя групы: чашнікі (стара- і новатраквісты) і Братэрскае адзінства. Абедзьве ўзьніклі пад уплывам нямецкай і швайцарскай рэфармацыяў, толькі частка чашнікаў знаходзілася пад пераважным уплывам лютэранства, а браты — кальвінізму. Гэтыя групы здолелі надалей супрацоўнічаць, а за аснову разам прызнавалі гусіцкія карані. Лучнасьць гэтых групаў выявілася ўва ўзьнікненьні Чэскай канфэсіі (1575), якая была ня толькі рэлігійным, але й палітычным аб'яднаньнем рэфарматарскіх цэркваў. Пасьля задушэньня паўстаньня ў 1620 годзе адбываецца рэкаталіцызацыя краіны. Рэфарматарскія цэрквы апынаюцца ў выгнаньні ці сыходзяць у падпольле, зь якога выходзяць пасьля ўвядзеньня рэлігійнае талерантнасьці імпэратарам Ёзафам II у 1781 годзе. Расчараваньні ў выніку гусіцкіх войнаў у першай палове XVII стагодзьдзя, асьветніцтва часоў кіраваньня Ёзафа II, а таксама індустрыялізацыя ў XIX стагодзьдзі прывялі да аслабленьня сувязяў некаторых грамадзкіх групаў з хрысьціянствам і рэлігіяй наагул. Рэлігійная сцэна на момант узьнікненьня Чэхаславацкай Рэспублікі была вельмі стракатай, але ў той жа час даволі слабой. З 1918 году паступова ўмацоўваюцца рэлігійныя свабоды. У гэты ж час, як зазначаюць некаторыя дасьледнікі, адбываецца пэўны заняпад рэлігійнага жыцьця. Рэлігійнай катастрофай для чэскага грамадзтва стаўся камуністычны рэжым 1948—1989 гадоў. Здаецца, аднак, што

зярнё атэістычнай прапаганды, якая вялася ў школах і іншых установах, трапіла на падрыхтаваную глебу, і нельга ўсё прыпісваць аднаму толькі ўціску. Рэжым паспрабаваў ня толькі ўзяць пад кантроль унутранае жыцьцё царквы, але і абмежаваць яе звонку. Многа шкоды нанесьлі пасьпяховыя спробы кантраляваць царкву знутры з дапамогай дэмаралізаваных сьвятароў.

4. Адгалінаваньні хрысьціянства

Прыкладна з IX—X стагодзьдзяў на тэрыторыі сучаснай Чэхіі галоўную ролю адыгрывала хрысьціянства. Гістарычныя падзеі ў сьвеце вялі да падзелу хрысьціянства на розныя кірункі, бальшыня зь якіх так ці інакш прадстаўленыя на чэскай зямлі. Каб разгледзець асобныя зарэгістраваныя цэрквы, трэба спачатку прывесьці агульную інфармацыю пра асобныя адгалінаваньні, іх узьнікненьне, адметнасьці і прадстаўніцтва ў сьвеце. Зьвернем увагу толькі на тыя хрысьціянскія кірункі, якія існуюць ў наш час.

а) Старажытныя ўсходнія цэрквы

У V стагодзьдзі ўва ўсходнім Міжземнамор'і (потым гэта адгукнулася і ў іншых частках тагачаснага хрысьціянскага сьвету) адбыўся канфлікт. Дыскусія вялася аб тым, якім чынам патлумачыць адну з найважнейшых догмаў хрысьціянства, што Ісус Хрыстос ёсьць адначасова і чалавек, і Бог. Узьніклі дзьве канцэпцыі. Прыхільнікі першай не пярэчылі таму, каб людзкое падабенства Хрыста распусьцілася ў ягонай боскасьці (*монафізытызм*). Прыхільнікі адваротнай канцэпцыі (*нестарыянства*) катэгарычна аддзялялі адну сутнасьць Хрыста ад другой. Пасярэдні пункт погляду стаўся падмуркам фармаваньня галоўнай плыні заходняга і ўсходняга хрысьціянства. Усе тры адгалінаваньні лічылі якраз сябе прававерным, а іншых абвінавачвалі ў ерасі. Спадкаемцы нестарыянскай традыцыі ў наш час уяўляюць сабой малую суполку асырыйскай артадаксальнай царквы, распаўсюджанай пераважна ў Іране. Другі кірунак прадстаўлены вялікімі цэрквамі зь мільёнамі вернікаў у Этыёпіі, Арменіі й меншымі цэрквамі, такімі, як копцкая ў Эгіпце, якабіцкая пераважна ў Сырыі, малабарская ў Індыі і інш. Ніводная з гэтых цэркваў у Чэхіі арганізавана не прадстаўленая.

б) Праваслаўе

У сярэдзіне XI стагодзьдзя дасягнула свайго апагею спрэчка паміж усходнім і заходнім хрысьціянствам. Доўга існавала адрозьненьне ў вядзеньні імшы і абрадавай практыцы: ужо ў IX стагодзьдзі царква ў Бізантыйскай імпэрыі адчула патрэбу бараніцца ад Рыму ў справе абраньня канстантынопальскага патрыярха. Канфлікт быў вырашаны, і асобныя патрыярхаты (Рым, Царград, Александрыя, Антыёхія, Ерусалім) жылі ў адноснай згодзе. Сутнасьцю спрэчкі ў 1054 годзе была зьмена, якую ў "Вызнаньне веры" ўнесла лацінская царква. Першапачатковае, супольнае для ўсіх "Вызнаньне веры" казала пра Дух Сьвяты, які *"ад Айца паходзіць"*. Заходняя царква пасьля ўнутраных спрэчак пачала афіцыйна ўжываць фармулёўку *"ад Айца і Сына паходзіць"*. Гэтая спрэчка пра ўнясеньне дадатку ў першапачатковы тэкст стала называцца спрэчкай аб *Філіёквэ*. З гэтага часу заходняе хрысьціянства існавала самастойна і азначалася звычайна як *каталіцкая царква*; усходняе хрысьціянства найчасьцей называюць *артадаксальным,* ці *праваслаўным*. Праваслаўе існуе сёньня як вольная супольнасьць незалежных (аўтакефальных) цэркваў. Акрамя згаданых старых патрыярхатаў існуюць вялікія цэрквы ўва Ўсходняй Эўропе (Расея, Украіна) і на Балканах (Грэцыя, Македонія, Сэрбія, Баўгарыя, Румынія, Альбанія). У шматлікіх іншых краінах, у тым ліку і ў Чэскай Рэспубліцы, ёсьць невялікія праваслаўныя цэрквы, вернікамі якіх зьяўляюцца ці то карэнныя жыхары, ці то перасяленцы з праваслаўных рэгіёнаў. Агульны лік праваслаўных цяжка вызначыць з дакладнасьцю, але можна сказаць, што колькасьць вернікаў складае прыкладна 200 мільёнаў.

в) Рыма-каталіцтва

Па расколе ў XI стагодзьдзі заходняя царква распаўсюджвалася з Заходняй Эўропы на іншыя часткі сьвету. Утваралася магутная арганізацыя, што цэнтралізавалася вакол рымскага папства. У гэтым сэнсе можна ўжо казаць пра рыма-каталіцтва. Пазьней каталіцкая царква далучыла да сябе некаторыя старажытныя заходнія й праваслаўныя цэрквы. У такім сэнсе кажуць ужо ня толькі пра рымскіх, але і пра, напрыклад, копцкіх, армянскіх, халдэйскіх і інш. каталікоў. Магутны

місійны размах, што пачаўся ў XVI стагодзьдзі, далучыў да царквы новыя вялікія абшары, асабліва ў Лацінскай Амэрыцы. Каталіцкая царква мае вялікі ўплыў у некаторых краінах Паўднёвай і Заходняй Эўропы (Партугалія, Гішпанія, Італія, Ірляндыя, Францыя, Бэльгія, Аўстрыя, частка Нямеччыны). З краінаў Сярэдняй Эўропы наймацнейшыя пазыцыі каталіцызм мае ў Польшчы і Славаччыне, слабейшыя — у Чэхіі й Вугоршчыне. Паводле прыкладных падлікаў, каталікоў — каля мільярда. Зусім іншыя зьвесткі падаюцца згодна з самаідэнтыфікацыяй, хростам і жыцьцёвай рэлігійнай практыкай. Па Другім Ватыканскім саборы (1962—1965) цэрквы некаторых краінаў атрымалі абмежаваную свабоду. Іх галоўнымі органамі сталі біскупскія канфэрэнцыі.

г) Рэфарматарскія цэрквы

У заходнім хрысьціянстве рэфарматарскія плыні ўзьніклі яшчэ ў XII—XIII стагодзьдзі — рухі вальдэнсаў і альбігойцаў. У XV стагодзьдзі пра сябе заявіла *чэская рэфармацыя* ў выглядзе гусіцкага руху і Братэрскага адзінства. Знакавай датай пачатку *сусьветнай рэфармацыі* лічыцца 1517 год, калі Марцін Лютэр выступіў з сваімі тэзамі абнаўленьня і выпраўленьня царквы. У той жа час спробы рэфармаваць царкву чыніліся ў Швайцарыі й Шатляндыі. Спроба аб'яднаць усе імкненьні рэфарматарскага характару ў адзіны рух ня мела посьпеху. Так узьніклі дзьве галоўныя плыні пратэстанцкага хрысьціянства: лютэранская царква (сёньня асабліва моцная ў Нямеччыне, Скандынавіі, Латвіі, Эстоніі, Славаччыне, ЗША, зь лікам вернікаў каля 75 мільёнаў) і рэфармаваныя цэрквы (кальвінісцкая, наймацнейшае прадстаўніцтва — у Шатляндыі, Швайцарыі, Нідэрляндах, частцы Нямеччыны, Вугоршчыне). Неўзабаве стала незалежнай ад Рыму і царква ў Англіі, якая пайшла ўсьлед за сусьветнай рэфармацыяй і ўтварыла самастойнае адгалінаваньне на мяжы каталіцкага і пратэстанцкага тыпаў. Англіканства пашырылася на ўсёй тэрыторыі Брытанскай садружнасьці. Рэфарматарскія цэрквы галінаваліся далей, і ўзьнікалі новыя кірункі ўнутры пратэстантызму (рухі піетысцкі, эвангелічны, трынітарскі). Фармаваліся асобныя аб'яднаньні, як, напрыклад, мэтадысты, баптысты, адвэнтысты й іншыя, кожнае зь якіх мае свае адметнасьці. Можна агулам казаць, што паміж пратэстанцкімі цэрквамі на сёньняшні дзень пануе згода,

узаемнае прызнаньне і супрацоўніцтва. Пратэстантаў усіх адгалінаваньняў налічваецца каля 400 мільёнаў. Дакладнейшую лічбу даць вельмі цяжка.

д) Старакаталіцкія цэрквы
Усе цэрквы каталіцкага тыпу, што прытрымліваюцца традыцыі, пэўнага вядзеньня літургіі, арганізацыі працы біскупаў, не прынялі мадэлі цэнтралізаванай рымскай царквы. Такой суполкай з значнай унутранай аўтаноміяй былі чэскія чашнікі ў сярэдзіне XV стагодзьдзя. Часам царкоўныя суполкі ў пэўных краінах узмацнялі незалежніцкія рухі (галіканства, фэбраніянства). У 1723 годзе стала незалежнай Утрэхцкая царква. У XIX стагодзьдзі набыла самастойнасьць частка польскіх каталікоў. Сучасны выгляд старакаталіцкая царква набыла па Першым Ватыканскім саборы (1870) як выраз нязгоды з далейшым узмацненьнем рымскай цэнтралізацыі. Ядром сёньняшняга старакаталіцкага руху ёсьць Утрэхцкая унія (прыкладна 100 тысяч вернікаў), рэпрэзэнтаваная Міжнароднай біскупскай канфэрэнцыяй. Асобныя цэрквы, якія ўваходзяць ува Утрэхцкую унію, не залежаць ані ад Утрэхту, ані адна ад адной. Утрэхцкая унія мае добрыя дачыненьні зь іншымі цэрквамі, што не ўваходзяць у яе склад, але належаць да старакаталіцкай традыцыі (напрыклад, польскія марыявіты), зь некаторымі нацыянальнымі цэрквамі і з сусьветным англіканскім супольніцтвам.

е) Нацыянальныя цэрквы
Нацыянальныя каталіцкія цэрквы ўзьнікалі як выраз тугі па незалежнасьці, асабліва ў XX стагодзьдзі. Дзьве значныя колькасьцю царквы захавалі каталіцкі характар: філіпінская незалежная царква з 38 біскупамі і люсітанская царква ў Партугаліі (сёньня зьвязаная з англіканскім супольніцтвам). Падобная царква ўзьнікла таксама і ў былой Чэхаславаччыне. Цяпер яна стаіць на мяжы каталіцызму ды пратэстантызму і шукае сваё месца ў грамадзтве.

5. Агляд зарэгістраваных цэркваў і рэлігійных суполак
Асноўныя зьвесткі аб прыведзеных ніжэй зарэгістраваных цэрквах і іншых рэлігійных суполках узятыя з крыху састарэлых зьвестак перапісу насельніцтва 1991 году. Там, дзе сучаснае

дасьледаваньне сьведчыць пра драматычныя працэсы, на тое зьвернем увагу асобна. Варта зазначыць, што падчас перапісу 16,2 % грамадзянаў Чэскай Рэспублікі не далі ніякай інфармацыі. Таму вельмі няпроста інтэрпрэтаваць такі інфармацыйны прагал. Адказ “без вызнаньня” далі ў перапісе 39,9% чэскіх грамадзянаў.

— *Рыма-каталіцкая царква* раўнамерна прадстаўленая на ўсёй тэрыторыі Чэскай Рэспублікі і мае дзьве царкоўныя правінцыі: чэскую (праская арцыдыяцэзія і дыяцэзіі літамнержыцкая, плзэньская, будзяёвіцкая ды градацкая) і мараўскую (аламоўцкая архідыяцэзія і дыяцэзіі астраўска-апаўская ды брненская). Улада ў дыяцэзіях належыць біскупам. Парафіяў маецца каля трох тысячаў. Прамежкавым зьвяном зьяўляюцца вікарыяты (Чэхія) альбо дэканаты (Маравія). Да гэтай царквы аднесьлі сябе 4 021 385 чалавек рознага веку, то бок 39 % чэскіх грамадзянаў. Рыма-каталіцкая царква мае элемэнты дзяржаўнага ўтварэньня: адзін з найвышэйшых прадстаўнікоў царквы мае сан кардынала — дзяржаўнага сакратара, а кіраўніцтва царквы (а не дзяржава Ватыкан!) падтрымлівае дыпляматычныя дачыненьні з краінамі. Для гэтай царквы характэрная наяўнасьць манаскіх суполак, і прыкладна траціна духоўнікаў — манахі. Найвялікшыя мужчынскія манаскія ордэны — бэрнардынцы, францішканцы, езуіты, прэманстраты, дамініканцы. Сярод жаночых манаскіх ордэнаў можна згадаць урсулінак, сёстраў Сьв.Вінцэнта, крыжовых сёстраў, барамэек, сёстраў Сьв.Кірылы. Рыма-каталіцкай царкве падпарадкоўваюцца тры тэалягічныя факультэты ў Празе, Аламоўцы і Чэскіх Будзяёвіцах. Паводле некаторых падлікаў, колькасьць рыма-каталікоў з 1991 году скарацілася напалову.

— Да *грэка-каталіцкай царквы* належаць грамадзяне пераважна славацкага ці русінскага паходжаньня, якія прытрымліваюцца бізантыйска-славянскага абраду. Арганізацыйна гэтая царква далучаная да рыма-каталіцкай праз Чэскую біскупскую канфэрэнцыю. Арганізацыйнай формай грэка-каталіцкай царквы ёсьць гэтак званы экзархат на чале зь біскупам. Царква мае некалькі аддаленых адна ад адной, раскіданых парафіяў, лепш прадстаўленых у перасяленчых рэгіёнах. З грэка-каталіцкай царквой атаесамлялі сябе 3 199 чалавек.

— *Старакаталіцкая царква* ўзьнікла на чэскай тэрыторыі па Першым Ватыканскім саборы пераважна ў асяродзьдзі

нямецкамоўных грамадзянаў. Па іх высяленьні засталося 5 чэскіх прыходаў. Гэтая царква была лёгкай здабычай камуністычнага рэжыму. У апошняе дзесяцігодзьдзе яна адрадзілася і цяпер пашырае свой уплыў. Сёньня старакаталіцкая царква мае 11 прыходаў (у тым ліку праскі англіканскі). Найвышэйшым органам ёсьць сынод, які абірае біскупа і сынадальную раду. Лік вернікаў складае 2 725 чалавек.

— *Праваслаўная царква на тэрыторыі Чэскай Рэспублікі* існуе ў выглядзе розных груповак. Адну частку складаюць нашчадкі чэхаў, якія ў пэрыяд нацыянальнага адраджэньня і барацьбы па ўзьнікненьні Чэхаславакіі шукалі новую рэлігійную арыентацыю, а таксама тыя, хто сам навярнуўся ў праваслаўе. Самастойнай найвялікшай групоўкай зьяўляюцца валынскія чэхі, рэпатрыяваныя пераважна па другой сусьветнай вайне, якія жывуць на тэрыторыях, пакінутых немцамі. Наступнай групоўкай ёсьць славакі і русіны, а менавіта ўкраінцы паходжаньнем з Славаччыны й Закарпацьця. Астатнія вернікі — перасяленцы розных праваслаўных у сваёй бальшыні народаў (расейцы, украінцы, сэрбы, баўгары, грэкі ды інш.). Прыкладна 60 прыходаў адносяцца да дзьвюх епархіяў на чале зь біскупам. Праскі біскуп мае сан мітрапаліта, а ягоны намесьнік — вікарыя праскай епархіі. Да царквы далучылі сябе 19 354 вернікі.

— *Чэхаславацкая гусіцкая царква* ўзьнікла па ўтварэньні Чэхаславаччыны зь ліку каталікоў, якія імкнуліся спалучыць хрысьціянства з нацыянальнай традыцыяй. З прыходам радыкальнага мадэрнізму, які адмаўляў асновы хрысьціянскай традыцыі, з генэрацыі заснавальнікаў гэтай царквы вылучылася суполка арыентаваных на нацыянальную традыцыю тэолягаў і іншых духоўнікаў, якія адштурхоўваліся ад сваёй першапачатковай рыма-каталіцкай адукацыі. Чэхаславацкая гусіцкая царква раней імкнулася і працягвае цяпер аб'ядноўваць розныя чэскія духоўныя традыцыі. Пік папулярнасьці гэтай царквы прыпадае на пэрыяд пасьля другой сусьветнай вайны, калі колькасьць сяброў наблізілася да мільёна. З таго часу колькасьць вернікаў увесь час скарачалася. На момант перапісу прыхільнікамі гэтай царквы сябе вызналі 178 036 чалавек. Мяркуецца, што скарачэньне ліку сяброў будзе ісьці такім жа тэмпам. Асноўнай адзінкай царквы ёсьць

рэлігійная суполка, якая абірае раду старэйшых на чале з прызначаным сьвятаром ці сьвятаркай. Прамежкавым зьвяном зьяўляюцца дыяцэзіі (праская, плзэньская, градацкая, брненская, астраўская), на чале якіх стаяць біскупы. Царкву афіцыйна рэпрэзэнтуе патрыярх, які супрацоўнічае зь іншымі выбарнымі органамі. У Празе месьціцца Гусіцкі тэалягічны факультэт Карлавага ўнівэрсытэту.

— *Чэскабратэрская эвангельская царква* ўзьнікла ў 1918 годзе праз аб'яднаньне лютэранскай меншыні з рэфармаванай бальшынёй (кальвіністамі). Абедзьве суполкі мелі каранямі чэскую рэфармацыю. Асноўнай адзінкай царквы ёсьць збор, прадстаўляны і кіраваны радай старэйшых на чале з куратарам і выбіраным сьвятаром. Зборы аб'ядноўваюцца ў рэгіянальныя сэньяраты. Найвышэйшы орган царквы — сынод, кіруе якім сынадальная рада, сынадальны куратар і сынадальны сэньёр. Прыкладна 600 збораў раскіданы па тэрыторыі Чэхіі й Маравіі з найбольшым прадстаўніцтвам у Празе і на Чэскамараўскім узвышшы. У Празе месьціцца Эвангелічны тэалягічны факультэт, што мае дачыненьні з гэтай царквой. З колькасьцю сваіх сяброў, што складае 203 996 чалавек, чэскабратэрская эвангельская царква была і застаецца другой паводле колькасьці вернікаў царквой у Чэскай Рэспубліцы. Здаецца, што колькасьць сяброў калі і скарачаецца, то значна павольней, чым у іншых цэрквах.
— *Сылеская эвангельская царква аўгсбурскага вызнаньня* ўяўляе сабой лютэранскую плынь рэфармацыі. Распаўсюджаная толькі ў ваколіцах Цешына ў асяродку польска- і чэскамоўных грамадзянаў. Падчас перапісу прыхільнікамі гэтай царквы назвалі сябе 33 130 чалавек. Царкву рэпрэзэнтуе выбіраны біскуп. Між тым, у сувязі з складанасьцямі, што ўзьніклі з падзеньнем камуністычнага рэжыму, у межах сылескай эвангельскай царквы ўтварыліся дзьве самастойныя арганізацыі. Стан царквы на сёньняшні дзень няясны. Лютэранскае хрысьціянства ў Чэхіі прадстаўленае таксама і іншымі малымі царкоўнымі суполкамі.
— *Братэрская царква* належыць да суполкі эвангельскіх цэркваў. Сябром гэтых цэркваў чалавек становіцца не на падставе жаданьня бацькоў, а пазьней, калі сам адчуе патрэбу ў веры, пажадае далучыцца да царквы і будзе прыняты зборам.

Зборы Братэрскай царквы маюць значную незалежнасьць. Кіраўніцтва царквой мае толькі частку паўнамоцтваў. Зборам кіруе рада старэйшынаў і казаньнік. У некалькіх дзясятках збораў налічвалася 2 759 сяброў. Здаецца, што колькасьць вернікаў стабільная і цяпер. Разам зь іншымі кангрэгацыйнымі цэрквамі належыць да шырэйшага рэфармаванага (кальвінісцкага) супольніцтва.

— *Братэрскае адзінства баптыстаў* пасьлядоўна захоўвае эвангелічныя традыцыі. Хрост учыняецца выключна на падставе веры і пры асабістым звароце як знак далучэньня да збору. Хросту, праведзенага да таго, царква не прызнае. Братэрскае адзінства баптыстаў зьявілася на тэрыторыі Чэхіі на пачатку XX стагодзьдзя. Некалькі дзясяткаў збораў мелі 2 544 сяброў. Пакуль усё сьведчыць пра тое, што колькасьць сяброў не зьмяншаецца.

— *Братэрскае адзінства* — непасрэдны спадкаемца першапачатковага Братэрскага адзінства, заснаванага ў 1457 годзе. Сусьветная *Unitas fratrum* была заснаваная ў саксонскім Гернгуце выгнанцамі-сябрамі двух збораў Адзінства. Ужо адтуль праз актыўную місійную дзейнасьць царква набывала ўсё большую папулярнасьць у цэлым сьвеце. Напрыканцы XIX стагодзьдзя царква вярнулася на тэрыторыю продкаў і было заснавана 5 збораў, якія ўтвараюць адну з правінцыяў сусьветнага адзінства, на чале з выбіраным біскупам. У апошняе дзесяцігодзьдзе ў Адзінстве меў перавагу трынітарскі кірунак і значна ўзрасла колькасьць сяброў.

— *Эвангельская мэтадычная царква* ўзьнікла як клюб унутры англіканскай царквы пад уплывам сяброў Братэрскага адзінства на яе заснавальнікаў — братоў Уэсьлі. Пазьней царква вымушана была стаць самастойнай. На тэрыторыі Чэхіі яна зьявілася на пачатку XX стагодзьдзя. Эвангельская мэтадычная царква вядомая сваёй сацыяльнай актыўнасьцю. На чале — выбарныя органы, а царкву рэпрэзэнтуе супэрінтэндант. Да эвангельскай мэтадычнай царквы далучалі сябе 2 855 сяброў, і, здаецца, значных адхіленьняў ад гэтага ліку пакуль што няма.

— *Апостальская царква* сярод зарэгістраваных цэркваў рэпрэзэнтуе трынітарскі кірунак. Гэтая царква эвангелічнага тыпу ставіцца да хросту гэтаксама, як і баптысты. Акцэнтуе містычныя тайніцы, як праройцтвы, аздараўленьне хворых.

Колькасьць сяброў у параўнаньні з 1991 годам (тады 1 485) павялічылася, арганізоўваюцца новыя зборы. Зборы раскіданыя па ўсёй тэрыторыі Чэхіі й асабліва прадстаўленыя ў вялікіх гарадох. Найбольшая колькасьць збораў — у ваколіцах Цешына.

— *Новаапостальская царква* ўзьнікла ў Англіі на падставе пераканаьня, што пасьля апосталаў царква знаходзілася ў сьне, тады як у новы час Ісус Хрыстос абудзіў яе, ізноў паклікаўшы апосталаў. На чале дзейнага ў Чэхіі новаапостальскага руху стаіць галоўны апостал, які супрацоўнічае з прызначанымі апосталамі, біскупамі, старэйшынамі і г.д. Для вядзеньня імшы не патрабуецца тэалягічнай адукацыі. З двух збораў і 427 сяброў, як было ў 1991 годзе, царква разраслася і заняла сваё месца ў грамадзтве.

— *Хрысьціянскія зборы* хочуць быць вольным хрысьціянскім рухам. Паводле сьветапогляду яны блізкія да баптыстаў і ўзьніклі як рух у Англіі. Зборы не залежаць ані ад цэнтру, ані адзін ад аднаго. Не імкнуцца ствараць арганізацыю, пакуль да гэтага іх не прымусяць юрыдычныя ці практычныя прычыны. Адметнасьцю збораў ёсьць тое, што яны ня маюць духавенства. На пэўны час збор прызначае свайго прадстаўніка, які адказвае за сувязі з грамадзтвам. Прапаведаваць, учыняць хрост, старшыняваць на ўслаўленьні Госпада можа любы мужчына-сябар збору. Місіянэры царквы вельмі актыўныя. Колькасьць сяброў павялічваецца. Зьвесткі перапісу сьведчаць пра 3 017 прыхільнікаў царквы.

— *Царква адвэнтыстаў сёмага дня* асноўную ўвагу надае адвэнту, чым ёсьць хуткае другое прыйсьце Ісуса Хрыста, паводле інтэрпрэтацыяў біблійных тэкстаў заснавальнікамі царквы. За дзень адпачынку і Божай службы ўважаюць суботу — сёмы дзень тыдня. Здаровы лад жыцьця лічаць неад'емнай часткай жыцьця паводле веры. Гэтая царква ёсьць сусьветнай цэнтралізаванай адзінай арганізацыяй. Чэскае і мараўска-сылескае аб'яднаньні разам з славацкім утвараюць унію, якая падначальваецца цэнтру. Асноўнай адзінкай зьяўляюцца зборы. У 1991 годзе царква мела 7 674 ахрышчаныя, то бок актыўныя вернікі. Царква пашырае свой уплыў і вылучаецца выдавецкай, місійнай і дабрачыннай дзейнасьцю (часопісы і кнігі

выдавецтва *“Advent”*, арганізацыя *“Adra”*).
— Пра *Царкву Ісуса Хрыста сьвятых апошніх дзён*, больш вядомую пад назваю *“Царква мармонаў”*, у 1991 годзе не было пэўных зьвестак, паколькі ў той час яна толькі працавала над аднаўленьнем сваёй місійнай дзейнасьці ў Чэхіі. Падмуркам сьветапогляду мармонаў ёсьць хрысьціянскія асновы, у той жа час да Бібліі дадаюцца і іншыя крыніцы, якія ўважаюцца за Божае адкрыцьцё (напрыклад, Кніга мармонаў). Гэтую царкву не адносяць да ліку хрысьціянскіх цэркваў. Царква Ісуса Хрыста сьвятых апошніх дзён вядомая сваёй актыўнай місійнай дзейнасьцю і жорстка рэглямэнтаваным ладам жыцьця сваіх сяброў.
— *Рэлігійная суполка сьведкаў Еговы,* паводле вынікаў перапісу, на 1991 год мела 14 575 сяброў. Хрост прызнаецца сапраўдным толькі ў сталым веку. Сьведкі Еговы лічацца хрысьціянамі, але ня часткай сусьветнага хрысьціянства. Суполка вядомая сваёй актыўнай місійнай дзейнасьцю на вуліцах, у розных грамадзкіх месцах, а часам і абходам ад дзьвярэй да дзьвярэй. Сябры зьбіраюцца ў вялікіх залях. Дзейнасьць каардынуюць старэйшыя браты і надгляднікі. Чэскае адгалінаваньне гэтай жорстка цэнтралізаванай адзінай царквы мае цэнтар у праскім Бэтэлі. Здаецца, што пасьля даволі значных хістаньняў у першай палове 90-х колькасьць сяброў павялічваецца.
— *Рэлігійная суполка чэскіх унітарыяў* належыць да руху ўнітарыяў — унівэрсалістаў, якія спалучаюць элемэнты розных рэлігіяў і падкрэсьліваюць сваё пераканаьне ў існаваньні адзінай божай асобы. Унітарыі ня маюць атрыбутаў хрысьціянскай царквы (хрост, Божая вячэра) і ніколі за такую не ўважаліся. Зьместам сустрэчаў (якія адбываюцца ў некаторых вялікіх гарадох) зьяўляюцца лекцыі, гутаркі і мастацкія выступы. З гэтай суполкай атаесамляюць сябе 365 чалавек. На сёньняшні дзень першапачаткова адзіная рэлігійная суполка чэскіх унітарыяў расколатая, таму вельмі цяжка падлічыць прыкладную колькасьць сяброў.
Каб мець праўдзівую сучасную інфармацыю пра разьвіцьцё чэскіх лютэранскіх цэркваў, новыя рэгістрацыя (нядаўна гэтага дамагалася Царква зьяднаньня) і аб дакладнай колькасьці сяброў, трэба пачакаць далейшых вартых даверу зьвестак.

6. Тэндэнцыі разьвіцьця чэскай рэлігійнай сцэны

Сытуацыя ў Чэхіі нетыповая для краінаў, што належаць да заходняй цывілізацыі. Чэская Рэспубліка з пэўнага пункту погляду — адна з найменш рэлігійных краінаў. У 70—80-я гады XX стагодзьдзя колькасьць вернікаў складала 30%, потым паступова павялічвалася, хісталася, і здаецца, што ўжо ў другой палове 90-х гадоў стабілізавалася. Зь якой-небудзь рэлігійнай суполкай атаясамілі сябе ў 1991 годзе 43,9% чэскіх грамадзянаў. Іншыя пазьнейшыя крыніцы сьведчаць, што такое патрабаваньне хрысьціянскіх цэркваў, як наведваньне хаця б раз на тыдзень багаслужбы, выконваюць каля 5 % вернікаў, і іх колькасьць зьмяншаецца.
Спасылаючыся на дасьледаваньне Пэтра Сака, да пададзеных вышэй зьвестак можна дадаць інфармацыю, якая дазваляе меркаваць наконт далейшага рэлігійнага разьвіцьця. Выяўляецца, што традыцыйныя рэлігійныя кірункі (каталіцкі, эвангелічны) маюць найбольшую колькасьць сяброў сярод людзей сталага веку і найменшую сярод людзей сярэдняга веку. Сярод моладзі назіраецца ўмераны рост прыхільнасьці да гэтых кірункаў. Новыя, нетрадыцыйныя для Чэхіі цэрквы, наадварот, выклікаюць найбольшую цікавасьць у наймаладзейшага пакаленьня, а з гадамі гэтая цікавасьць зьмяншаецца. Напрыклад, будызм уяўляе сабой рэлігію маладых людзей.
Нядаўна апублікаванае групай сацыёлягаў дасьледаваньне сьведчыць пра некаторыя цікавыя тэндэнцыі. Здаецца, што адбываецца індывідуалізацыя рэлігіі празь нежаданьне зьвязваць асабістае жыцьцё зь якімсьці строга абмежаваным кірункам. Далей сьцьвярджаецца, што працягваецца агульны спад цікавасьці да традыцыйных, асабліва хрысьціянскіх рэлігійных плыняў, але і ўнутры самога хрысьціянства найвялікшыя цэрквы (рыма-каталіцкая, эвангельская і гусіцкая) страчваюць папулярнасьць, у той час як малыя цэрквы яе набываюць. Агульнай тэндэнцыяй ёсьць страта цікавасьці да традыцыйных рэлігійных плыняў, арыентаваных на адзінага Бога, і рост папулярнасьці альтэрнатыўных сьпірытычных кірункаў, пазначаных у згаданым дасьледаваньні як мэдытацыйныя.

Можна падсумаваць, што спад рэлігійнага жыцьця ў 80-я гады спыніўся. Па стагнацыі меў месца пэўны рост. Размова ня йдзе

пра вяртаньне да традыцыйных для чэскай прасторы рэлігійных плыняў або пра пошук альтэрнатываў. Новымі альтэрнатывамі найхутчэй будуць некаторыя новыя рэлігійныя кірункі. Сукупнасьць тых, хто не адказвае на пытаньне пра рэлігійную прыналежнасьць, і тых, хто вызначаецца як асоба без вызнаньня, колькасна пераўзыходзіць тых, хто ў дасьледаваньнях пазначаны як атэіст. Можна меркаваць, што частка зь іх мае сваё прыватнае духоўнае жыцьцё, не зьвязанае ні зь якім кірункам. На той фэномэн, пра які сьведчаць сацыёлягі й рэлігіязнаўцы, трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу, бо размова ідзе пра новую рэлігійную сытуацыю.
Новая рэлігійная сытуацыя заслугоўвае асобнага разгляду. Рэлігійны спэктар, які фармуецца цяпер, стракаты; каб моладзь вярталася да рэлігіі бацькоў ці дзядоў — такое здараецца нячаста. У хрысьціянстве найбольшую цікавасьць грамадзтва выклікаюць плыні, якія за аснову прымаюць містычны досьвед, напрыклад зьяўленьні — найчасьцей Панны Марыі, анёлаў і розных сьвятых. Крыху дзіўна, што зноўку вялікую папулярнасьць сярод адукаваных эўрапейцаў і амэрыканцаў маюць розныя іншыя цуды (абразы і фігуры, што плачуць і крывавяць), прарочыя прадказаньні, аздараўленьне хворых і выгнаньне дэманаў. Да таго ж, вялікае зацікаўленьне выклікае вельмі папулярны рух, які называюць трынітарскім, пяцідзясятніцкім, сьвятадухаўскім або харызматычным. У сваёй радыкальнай вэрсіі гэты рэлігійны рух зьнітаваны з ідэяй узбагачэньня (хто верыць у Бога, мусіць быць заможным). Акрамя гэтага, на пачатку 90-х гадоў вялікі бум перажылі плыні, арыентаваныя на непасрэднае перажываньне, такія, як ёга, транспэрсанальная псыхалёгія і рух *“New Age”*. Пералом адбыўся на мяжы 1993—1994 гадоў. З таго часу на працягу некаторага пэрыяду цікавасьць да такога кшталту суполак падала. Верагодна, ня спраўдзіліся чаканьні тых, хто далучыўся да гэтых рухаў і чакаў простага ды хуткага шляху да атрыманьня містычнага досьведу. Дакладней, досьвед мог быць, але ён вельмі хутка расьцярушваўся і не пакідаў сьледу. Яшчэ ёсьць пытаньне, наколькі такі мэтад пошуку містычнага перажываньня замянілі больш даступныя псыхатропныя сродкі. Мяркуючы з вынікаў дасьледаваньняў і з сыстэматычнага прагляду непэрыядычнай духоўнай літаратуры, на новай сьпірытычнай хвалі больш-менш захоўваюць пазыцыі, асабліва

сярод моладзі, традыцыйныя нехрысьціянскія плыні, як, напрыклад, будызм, які не прывабіў вялікай колькасьці людзей, але на сёньня застаецца досыць папулярным. У Чэхіі, як і ў Заходняй Эўропе, Амэрыцы й Аўстраліі, расьце лік будысцкіх цэнтраў і ўвесь час выдаецца новая будысцкая літаратура.

7. Праблема рэлігійнага сэктанцтва і супрацьсэктанцкай дзейнасьці

Перадусім трэба высьветліць значэньне слова “сэкта”. Цяпер ужо мала хто згадвае першапачатковае значэньне — адшчапенцаў, адлучаных ад рэлігійнай суполкі. Гэтае слова звычайна ўжываецца для рэлігійна-палемічных і журналісцкіх мэтаў. Гэтаксама ўжываецца і выраз “дэструктыўны культ”. Часта пры дапамозе гэтых выразаў даецца азначэньне новай для дадзенай прасторы рэлігійнай суполкі. Навешваньне такой біркі спрашчае далейшы шлях да рэпрэсіяў. Часта адвольна выказваецца меркаваньне, што любая новая рэлігія — небясьпечная. Між тым, новая рэлігія можа ажывіць рэлігійную сцэну і стаць здаровым выклікам для старых і вычарпаных рэлігіяў. Яшчэ часьцей падставай для атрыманьня кляйма сэкты можа стаць нязначная колькасьць вернікаў у грамадзе. У мэтах гуманізму і дэмакратыі, на *абароне рэлігійных меншасьцяў* павінна стаяць школа. Спробы паклёпу на мяншыні і абмежаваньня іх правоў — гэта праява нецярпімасьці. Звычайным мэтадам барацьбы з новай і невялікай рэлігійнай суполкай акурат і ёсьць паклёпы і абразы. Любая такая інфармацыя павінна дэталёва правярацца. Неабходна даць магчымасьць гэтым невялікім суполкам абараняць сябе ад паклёпу. Непацьверджаныя абвінавачаньні не павінны быць падставай для абмежаваньня свабоды веравызнаньня. Калі справа даходзіць да суду, рэлігійная суполка, згодна з законам, не нясе перад ім адказнасьці, пакуль ня будзе выяўленая яе віна. Часта такія або іншыя парушэньні этычных прынцыпаў і закону маюць месца і з боку традыцыйных рэлігійных арганізацыяў. Рэлігійныя мяншыні абвінавачваюцца і ў сэксуальных скандалах, і ў сувязі з сакрэтнымі службамі, і ў непразрыстасьці фінансавай дзейнасьці. Праўда, часта “Хапайце злодзея!” крычыць сам злодзей.

Вельмі важна пасьлядоўна абараняць рэлігійную разнастайнасьць і плюралізм поглядаў. Сацыяльна-

паталягічныя зьявы маюць месца, зразумела, і ў рэлігійных суполках. Але нельга адназначна сьцьвярджаць, што гэта тычыцца ў большай ступені толькі новых або малых суполак. Калі такое адбываецца, увагу варта зьвяртаць на *фундамэнталізм*, які можа быць вызначаны як наіўны давер да інфармацыі, якую агучваюць, і заклікаў да дзеяньня, зь якімі выступаюць рэлігійныя аўтарытэты. Тыповым для яго зьяўляецца чорна-белае мысьленьне і схільнасьць даваць простыя адказы на складаныя пытаньні. З фундамэнталізмам можна змагацца інфармацыяй і крытычным мысьленьнем. Бясспрэчна, аднак, што нікому нельга забараніць бачыць сьвет у фундамэнталісцкім сьвятле. Часам, але не заўсёды, фундамэнталізм перарастае ў рэлігійны *фанатызм*, адметнай рысай якога ёсьць агіда і нават нянавісьць да іншадумцаў. Падставай для гэтага часта бывае страх і адчуваньне небясьпекі. Зь небясьпечнымі наступствамі, да якіх вядзе фанатызм, трэба змагацца, але пры гэтым варта дэманстраваць фанатыкам разуменьне і павагу да іх поглядаў. Трэба паспрабаваць парушыць іх (часам выключна псыхалягічную) ізаляцыю ад навакольнага сацыяльнага асяродзьдзя. Трагічнай праявай сацыяльнай паталёгіі ёсьць *рэлігійны экстрэмізм*, накіраваны супраць людзей іншай веры, людзей, абыякавых да рэлігіі, і праціўнікаў рэлігіі. У гэтым выпадку перадусім патрэбная сацыяльная абарона, але адначасова — і спроба перанесьці спрэчку на інтэлектуальны ўзровень і наладзіць сур'ёзнае абмеркаваньне спрэчных пытаньняў.

8. Экумэнічны і міжрэлігійны дыялёг

У XX стагодзьдзі хрысьціянскія цэрквы паступова наладжвалі паміж сабой сувязі, што вялі да пераадоленьня ўзаемнага недаверу і адчужэньня, да супрацоўніцтва ў практычнай сфэры і, нарэшце, да поўнага прызнаньня сябе і іншых паўнавартаснымі часткамі (адгалінаваньнямі) адзінай Хрыстовай царквы. Пэўная напружанасьць паміж цэрквамі і царкоўнымі суполкамі, на жаль, усё ж існуе. *Экумэнізму* на яго сучасным этапе разьвіцьця ўсё больш сталі ўнікаць праваслаўныя цэрквы, што на пачатку былі ягонымі пратаганістамі. Нягледзячы на значную эвалюцыю пасьля Другога Ватыканскага сабору, рыма-каталіцкая царква таксама не сьпяшаецца сёньня далучацца да экумэнічнага руху,

паколькі для яе няпроста прызнаць роўнасьць усіх сяброў гэтага руху.
Новая зьява канца ХХ стагодзьдзя — *міжрэлігійны дыялёг*. Дарма што яго часам называюць “шырэйшым экумэнізмам”, мэта яго — не аб’яднаньне ці ўзаемнае прызнаньне, а пераадоленьне забабонаў і недаверу, духоўны абмен, супрацоўніцтва на карысьць людзям. У гэтым асаблівы посьпех маюць будысцкія, хрысьціянскія і індуісцкія манахі, якія прапаноўваюць свой досьвед іншым. Нямецкі каталіцкі тэоляг Ганс Кюнг стварыў вялікі праект “Сусьветны этас”, дзе гаворка ідзе пра ўзаемны ўплыў розных рэлігіяў на гуманізацыю палітыкі і гаспадаркі. Ягоны чэскі паплечнік, былы сэнатар, філёзаф Карэл Флос заснаваў разам з Кюнгам фонд з такім жа назовам. Гэты фонд ладзіць летнія сустрэчы для ўсіх зацікаўленых і дапамагае выдаваць літаратуру, прысьвечаную міжрэлігійнай супольнай працы.
Шкодзіць міжрэлігійным дачыненьням тое, што ў такім міжканфэсійным дыялёгу ніводная з рэлігіяў не прадстаўленая як цэлае нейкай арганізацыяй, а толькі невялікімі суполкамі ці асобнымі людзьмі. Некаторыя хрысьціянскія цэрквы больш схільныя да падтрыманьня добрых міжрэлігійных дачыненьняў (напрыклад каталікі, англіканцы, лютэране), іншыя ў гэтым бачаць небясьпеку (праваслаўныя, бальшыня эвангелічных і трынітарскіх цэркваў). Акрамя таго, збліжэньне царквы з пэўнай нехрысьціянскай рэлігіяй можа азначаць аддаленьне яе ад астатніх хрысьціянаў. З гэтага і вынікае непрыемная дылема наконт удзелу ў гэтым руху.

9. Высновы
Чэская рэлігійная сцэна вельмі стракатая, і ёсьць магчымасьць пашырэньня грамадзкага ды рэлігійнага плюралізму. Традыцыйныя вызнаньні трацяць прыхільнікаў, тады як новыя, часта неарганізаваныя рэлігійныя адгалінаваньні і сьпірытуалісцкія практыкі становяцца больш папулярнымі, а таксама нарастае абыякавасьць у дачыненьні да рэлігіі, нават у большай ступені, чым да поўнай нерэлігійнасьці. Удумлівым людзям цяпер нярэдка характэрная неакрэсьленасьць рэлігійных поглядаў, стан пошуку. Гэта спрыяе ня толькі росту рэлігійнай цярпімасьці, але і вядзе да супрацоўніцтва паміж рэлігійна і нерэлігійна арыентаванымі людзьмі.

З чэскай мовы з скаротамі пераклала Вікторыя Радзіеўская паводле: Náboženství v době společenských změn. Brno, 1999.

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/09/23**
[image]

Міхал Вівэг

Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі

МІХАЛ ВІВЭГ (Michal Viewegh, 1962) — найпасьпяховейшы чэскі пісьменьнік апошняга дзесяцігодзьдзя. Аўтар аповесьцяў, літаратурных народьляў, раманаў бэстсэлераў і інш. Беларуская мова сталася дзевятнаццатай мовай, на якую перакладзены творы празаіка.

I

1. *Тое самае дзівоснае, што нас найбольш захапляе на пачатку кожнага аповеду, — гэта дасканалая пустэча, што расьсьцілаецца перад намі. Падзеі адбыліся і ляжаць вакол нас у суцэльнай, бясформавай масе, без пачатку й канца. Можна пачаць дзе заўгодна…*
Вера Лінгартава

Калі я ў гэтую сераду вярнуўся з дачкой з школы, паштовая скрынка была літаральна забітая: апрача звычайных “Лідавых навінаў” яна зьмяшчала вялікую брунатную капэрту з карэктурамі майго раману, нейкую белую капэрту, адрасаваную таксама мне, і, нарэшце, у той час так абгаворваны ўсімі сіні цэляфанавы пакецік з рэкламным узорам прадукцыі фірмы *“Procter & Gamble”*. Замыкаючы скрынку, я заўважыў, што папяровы ярлык з маім імем нейкі Радаб “Выхаваньне дзяўчат у Чэхіі” дрыжыць з нас, вадрапаў свае кіўкі.
У белай капэрце быў кароткі ліст ад мясцовага мільянэра Крала з прапановай *вельмі добра аплатнай працы, якая не забярэ шмат часу*.

Інакш кажучы, пачатак гэтай гісторыі ляжаў не ў бясформавай масе дасканалай пустэчы, а ў нашай скрынцы, у белай капэрце, у аўторак 16 чэрвеня 1992 году.
— Прыйшло нешта? — пацікавілася жонка.
— Мне прыйшлі карэктура раману і прапанова *вельмі добра аплатнай працы*, — адказаў я. — Табе прыйшлі пракладкі. Шчыра вітаю чэскіх фэміністак.
Пазьней я перачытаў ліст уважлівей. Я лягічна меркаваў, што гаворка пойдзе пра рэпэтытарства для Агаты, але мяне крыху зьдзівіла Кралава навонкі ня выяўленая, але ўлоўная стопрацэнтная ўпэўненасьць, што я прыму ягоную прапанову, — праявай гэтага быў, безумоўна, і той факт, што ён прызначыў толькі адзін тэрмін для нашай сустрэчы. Міжволі прыгадалася вядомая цытата зь Фіцджэральда: “Ён пагардліва меркаваў, што ў мяне ў нядзелю няма лепшага занятку”.
— Прымеш прапанову? — спыталася жонка.
У ейнай інтанацыі пакуль не прысутнічала ніякай ацэнкі.
Я паціснуў плячыма.
— Ты хацеў пісаць *постмадэрновы раман*… — заўважыла яна іранічна.
Але я быў рады, што яна гэта сказала, бо гэтаксама яна магла сказаць, што нам дарагая кожная крона.
І адно, і другое было праўдай.
— Пабачым, — сказаў я.
Яна пайшла ў душ. Я ўзяў карэктуру і пачаў праглядаць пачатковыя старонкі. Пры гэтым я гучна ўключыў радыё, дзякуючы чаму па выхадзе з ваннай жонка засьпела мяне на целарухах, якія я па-дылетанцку называю *падрыгваньнем у стылі соўл*. Яна назірала за мной вельмі *паблажліва*, ейную галаву абкручваў ручнік.
— Ну добра, добра, — здаўся я, — я рады.
— Дабранач, — паведаміла яна бесстаронна.

А стомленасьць ад прыдуманых вобразаў сьвету, падазронасьць да кожнай прыдумкі, нават — безумоўна, несправядліва — да самага спрадвечнага й вартага павагі ў літаратурным мастацтве, нарасла так радыкальна, што надышоў асаблівы час пакоры перад літаратурай факту, перад мастацтвам і праўдай дзёньнікаў.
Сяргей Махонін

2. Кажу наўпрост, што далейшае апісаньне Кралавай вілы (падобна як і само Кралава прозьвішча) зусім не адпавядае рэчаіснасьці, бо ягоная згода на публікацыю гэтай гісторыі была адназначна абумоўлена патрабаваньнем, каб я прыняў такія *захады*, якія б зьнемагчымілі верагодную ідэнтыфікацыю. Зь іншага боку, мне, вядома ж, хацелася б захаваць *genius loci* таго раёну, і таму я згадаю прынамсі той факт, што рух з галоўнай збраслаўскай вуліцы сюды ўжо не сягае і што кожны трэці чалавек, які прахаджаецца паўз усе гэтыя пескавіковыя цокалі ды аздобныя каваныя платы, за якімі праз густыя туі можна часам пабачыць раскошны траўнік ці блакітны борт хатняга басэйну, вядзе на рулеткавым павадку заводнага сабаку.

Менавіта ў той момант, калі я сабе адзначыў, што нумар, напісаны ў лісьце, адпавядае нумару на слупе ўваходнае брамы, азваўся непрыемны пранізьлівы гук, які звычайна суправаджае аўтаматычнае рассоўваньне варотаў. Гэта, відавочна, быў заезд для аўтамабіляў (весьнічкі для пешых месьціліся правей), але, калі я азірнуўся і не заўважыў нідзе ніякай машыны, я дапяў, што мяне, пэўна, нехта ўжо выглядае празь цёмныя вокны вілы, а гэтая брама, гэтая віла і ўвогуле ўвесь гэты *сьвет* адчыняюцца менавіта і толькі для мяне. Таму я зь *сяброўскай* усьмешкай у бок вокнаў вілы ўступіў на двор і мая левая рука з шырока разьведзенымі пальцамі ўзьляцела ўгару ў завучаным удзячным жэсьце. (Я ўжо чую лёгкае шушуканьне ў чытацкіх шэрагах, аднак я ўрачыста прысягаю, што не зьбіраюся на гэтым міжвольным жэсьце збудаваць увесь раман, нават калі б гэта забясьпечыла мне *несьмяротнасьць*[1].) Але ў наступную сэкунду — да сёньня не магу сабе растлумачыць, як гэта магло здарыцца — мяне ледзь не пераехаў чорны кабрыялет *“Volkswagen Golf”*; я інстынктыўна адскочыў убок, толькі калі пачуў характэрны гук драблёнага шынамі жвіру. Машына аб’ехала мяне кароткай хуткай дугой — заехаўшы пры гэтым правымі коламі на траўнік — і на ймгненьне воддаль спынілася. Дарма што было вельмі цёпла, дах ня быў спушчаны, а праз танаванае шкло ў сярэдзіну было кепска відаць; і ўсё ж на момант я ўбачыў у люстэрку задняга бачаньня Бэацін бледны, засяроджаны, нават суровы твар:

цьвёрда сьцятыя вусны, вочы, схаваныя за сонечнымі акулярамі. Пераканаўшыся, што я жывы, яна націснула на газ і зьнікла за рогам асабняку.
За коламі напраўду трохі курэла.
І тут — я нават не пасьпеў як мае быць асэнсаваць свае адчуваньні — нехта незнаёмы ззаду паваліў мяне на зямлю і скруціў рукі за сьпіну. Я войкнуў ад спалоху і болю.
— Вось гэтага з намі больш не рабі!
Калена ўладальніка голасу балюча ўядалася мне ў маю.
— Мы не прыдуркі!
— Аў!
— Ці ты так ня думаеш?
— Аў, баліць!!
Голас засьмяяўся, да яго далучыўся й другі. Гэта былі маладыя мужчынскія галасы.
— Дык што, братан, каго шукаем?
Ціск калена не памяншаўся. Яшчэ ніколі ў жыцьці я ня бачыў травы з такой блізіні. Я паспрабаваў прыўзьняць галаву, каб адказаць, але мне яе імгненна прыціснулі назад. З намаганьнем я колькі разоў набраў паветра й прамармытаў у зямлю сваё імя.
— Ня чуў пра такога, — сказаў голас з насьмешкай.
Мой першапачатковы спалох зьмяніўся разьюшанасьцю.
— А палове на шостую, — выкрыкваў я ў шаленстве, — у мяне сустрэча з спадаром Кралам. *Дамоўленая* сустрэча!
Я ніколі ня думаў, што некалькі словаў могуць каштаваць такіх высілкаў.
— Праўда? — зь недаверам адказаў голас. Ціск на ныркі зьнік, і мне вызвалілі рукі. — Чаму ж вы тады *нармальна* не пазванілі?
Тым ня менш яны дапамаглі мне ўзьняцца. У абодвух былі гальштукі і абодва былі большыя за мяне. Я расьцьвелена абтрасаўся.
— Ну, тады пардон, — сказаў другі з усьмешкай.
У ягоным голасе не было ані найменшай намінкі на пакаяньне.
Ён разглядаў мяне зь цікавасьцю:
— Дык вы той самы *наступны*?
Я не зразумеў:
— Як гэта — наступны?
Яны абмяняліся кароткімі позіркамі.

[1] Намінка на раман Мілана Кундэры “Несьмяротнасьць”. — Тут і далей зацемы перакладніка.

Правёўшы мяне да мармуровых сходаў, што вялі на прасторную летнюю тэрасу, крыху недарэчна абстаўленую (два белыя пластыкавыя столікі, чатыры фіялетавыя пластыкавыя крэселкі і адзін аранжава-зялёны сонечны парасон), яны кіўнулі, каб я там пакуль пачакаў.
— Ну, удачы, — сказаў бляндын.
— І наступным разам — званіце, — дадаў другі.
Я сярдзіта маўчаў. Яны пайшлі пазабаўленыя.
Узышоўшы па сходах на тэрасу — пры гэтым мая хада была пазначаная нейкай сутаргавай годнасьцю, — я завагаўся, да якога з столікаў мне прысесьці, бо адзін увесь быў заліты нейкім пладовым кактэйлем, а на другім грувасьцілася дзіўная мяшанка з брудных кубкаў, ілюстраваных часопісаў, крэмаў для скуры, шпілек і ружовых гантэляў для аэробікі. А па-над усім гэтым натурмортам сувэрэнна панаваў магутны, а галоўнае, уключаны фэн маркі *“Braun”* — ён ціха й самотна гуў, бесьперапынна разьдзьмухваючы старонкі моднага часопісу *“Tina”*. Падаўжальнік праз адчыненыя дзьверы цягнуўся кудысь у цяністыя нетры вітальні.
— Здароўкі! — выгукнуў адтуль Крал, але ў той цемры я яго ня бачыў.
— Добры дзень, — тым ня менш адказаў я.
— Сядайце. Я зараз!
Было чуваць, як ён падымаецца кудысьці на другі паверх. Адразу ж бразнулі дзьверы й азваліся прыглушаныя галасы — ягоны й дзявочы. Я ўзяў фэн і зьдзьмуў з стала крошкі ад чыпсаў. Ангельскі сад унізе пада мной выглядаў крыху занядбана: кусты былі пераросłыя, траўнік доўга ня кошаны, клюмбы з ружамі няполатыя, белы жвір на пад’ездавай дарозе парос дзьмухаўцамі і іншым пустазельлем. Некаторыя садовыя работы — прыкладам, паднаўленьне каменнага парапэту ці падстрыганьне жывой агароджы ўздоўж дарогі — былі выкананыя на дзіва па-дылетанцку.
— Здароўкі, — сказаў Крал задыхана. — Я рады, што вы прыйшлі.
Гэта быў мажны мужчына, але выглядаў ён стомлена (гэтага ўражаньня я ніколі ўжо не пазбудуся). Агата сарамяжліва пасьміхалася ў яго за сьпінай:
— Добры дзень!
Яна зрабіла нейкі сьмешны, парадыйны рэвэранс і пацягнулася

па горстку чыпсаў, абярнуўшы пры гэтым шклянку з кока-колай.
— Здароўкі, — адказаў я паводле мясцовае завядзёнкі.
Зь нейкай невядомай мне прычыны яна пырснула ад сьмеху. Некалькі драбкоў з чыпсаў прыляпіліся мне на рукаў сьветлага пінжака.
— Агата, — зьлёгку папікнуў яе Крал.
— Пардон, — сказала яна.
Адфутболіўшы драўляныя чаравікі, яна жвава адно за адным правяла на тэрасе сэрыю гімнастычных практыкаваньняў, званых *кола* і *шпагат*. Тады зноў абулася.
— Ня хочаце колы? — сказала яна зычліва. — Або чыпсы?
— Хадземце ў мой кабінэт, — прапанаваў Крал.
Я ведаў, што вілу ён купіў у 1990 годзе, але тое, што ён тут жыве зусім нядоўга, можна было адгадаць ужо паводле таго, як ён вымаўляў *мой кабінэт*.

Ад мяне ня ўнікла, што кабінэт быў замкнёны — і, пэўна, толькі дзякуючы гэтаму ў ім быў парадак: рэчы на пісьмовым стале з моранага дубу ўпарадкаваныя, тэчкі-рэгістратары зраўнаныя на паліцах, бурштынавы дыван адпыласошаны, і нават на дырэктарскім фатэлі з дрэва й натуральнае скуры не было ніякае лужыны ад разьлітага кактэйлю. Над сталом дамінаваў узьнёслы выгін імпазантнай залатой настольнай лямпы. Мушу прызнаць, што кабінэт (нягледзячы на пэўную невынаходлівасьць) уразіў мяне сваёй раскошнай элегантнасьцю.
— У вас тут нішто сабе, — сказаў я шчыра.
Яго гэта заўважна ўсьцешыла. Ён наліў у дзьве шклянкі шатляндзкага віскі і ўжо крыху паказушна адчыніў дзьверцы ўмантаванай лядоўні, зь якой выцягнуў поўную шклянку лядовых кубікаў. Прысеў насупраць мяне.
— Я чытаў вашую кніжку… “Погляды на забойства”?
— Так.
— Мне спадабалася.
Ты мне кабінэт, я табе кнігу.
— Дзякуй.
— Мая дачка таксама крыху піша.
— Праўда?

— Ёй гэта магло б дапамагчы лепш разабрацца ў сабе, — прамовіў ён задуменна, гледзячы ў стол.
Калі ён узьняў вочы на мяне, з выразу ягонага твару я зразумеў, што гэта было пытаньне.
— Вядома, — сказаў я. — Безумоўна.
Ён кіўнуў у знак згоды. Мне падалося, што ён аджыў.
— Шчыра кажучы, ёй гэта трэба, — сказаў ён. — Маю на ўвазе, разабрацца ў сабе. У яе цяпер *крытычны* пэрыяд.
— Я б сказаў, што яна ў поўным парадку, — я засьмяяўся. — Куляецца вельмі спрытна…
Ён уражана паглядзеў на мяне.
Нешта тут было ня тое.
Ён, вядома ж, меў на ўвазе Бэату.

Натуральна, гэта мяне трохі зьбянтэжыла, і Крал, як прафэсійны гандляр, адразу ж скарыстаўся маёй нерашучасьцю.
— Ну дык, — сказаў ён энэргічна, — што вы скажаце пра гэткі сабе курс творчага пісьма?
— Вы…
— Давайце гаварыць канкрэтна: вы прыходзілі б сюды чатыры разы на тыдзень, з панядзелка да чацьвярга, скажам, шторазу гадзінкі на дзьве. На выходныя мы зьяжджаем, так што пятніцы, суботы й нядзелі ў вас, вядома, будуць вольныя. Як *прафэсійны настаўнік чэскай мовы* я ня мог не заўважыць умоўнага ладу побач з простым будучым часам.
— Але гэта страшэнна шмат часу — восем гадзінаў на тыдзень, — сказаў я няўпэўнена. — Якраз цяпер у мяне на стале карэктура раману, і я ня ведаю, ці…
— Дзьве гадзіны на дзень? А ці ведаеце вы, колькі гадзінаў на дзень працую я? Дванаццаць. Нават пятнаццаць.
Ён устаў і сеў за пісьмовы стол.
— Няма гаворкі пра нейкае занудлівае *рэпэтытарства*… Праграма залежыць толькі ад вас. Збольшага вы можаце рабіць што захочаце. Ніхто нават ня кажа, што гэтым пісьмом вы павінны заўсёды займацца абавязкова ў нас дома…
Ён глядзеў на мяне так доўга, што я ўрэшце кіўнуў.
У паветры вісела *зьмена*.
Адчуваньне зьмены, якой бы яна потым ні выявілася, спрадвеку выклікала ўва мне ірацыянальнае пачуцьцё *радаснага чаканьня*.

— На гэтым пераходзім да вашага ганарару, — сказаў Крал.
У сваім перасоўным фатэлі ён адштурхнуўся ад стала, пацягнуўся па досыць далёка адлеглы ноўтбук і, пакуль паварочваўся назад да стала, разгарнуў яго, уключыў і краем паклаў на стальніцу; пальцы ягонай правай рукі зьнерухомелі на мініятурнай клявіятуры. Мне прыйшло да галавы, што ягоныя рухі не пазбаўленыя пэўнай *харэаграфічнасьці*.
— Колькі вы хочаце?
Міжволі я зьлёгку пачырванеў. Паводле *“Пастановы ўраду Чэскай Рэспублікі пра заработную плату працаўнікоў бюджэтных і некаторых іншых арганізацыяў”* ад 22.04.1992 мне ў той час належаў месячны заробак у памеры 3860 крон без уліку падаткаў, а ў сьпісе пяцідзесяці выбраных прафэсіяў, апублікаваных у друку, заробкі настаўнікаў прыпадалі на 49-е месца.
— Ці ёсьць у вас нейкае ўяўленьне на гэты конт? — прыязна паўтарыў Крал.
— Не.
— Маё ўяўленьне наступнае: восем тысяч за месяц на рукі плюс нешта накшталт *выніковых прэміяў*.
Ня варта было гэтак з мной абыходзіцца, жаласьліва казаў я сабе. Гэта несумленна.
— Ці мы дамовіліся? — спытаў Крал.
Я зацеміў, што пасьля ўсіх гэтых апавядальных сказаў нарэшце прагучала агульнае пытаньне.
Спахапіўшыся, я папрасіў тры дні на роздум.
На гэта ён не разьлічваў.
— Добра, — засмучана пагадзіўся ён.

3. Але і я пачуваўся зусім ня добра. У думках я вяртаўся як да нашай размовы, так і да згаданага ліста, і чым далей, тым выразьней усьведамляў, наколькі трывалым і сувэрэнным было і, відавочна, застаецца дагэтуль Кралава пераканаьне ў тым, што *малады чэскі настаўнік і пісьменьнік* за восем тысяч кронаў на месяц адразу ж кіне ўсё, каб чатыры вечары штотыдня выседжваць над няўмелымі літаратурнымі спробамі ягонай большай дачушкі. У пэўным сэнсе было вельмі крыўдна. Я вырашыў, што наступны дзень прысьвячу *мабілізацыі свайго прафэсійнага гонару*.

Аднак гэта было зусім ня лёгкім заданьнем: калі ў вашай школе дырэктарам чалавек, чыё найвышэйшае інтэлектуальнае дасягненьне — дваццаціпяцігадовае даўніны дыплёмная праца *“Трэніровачны касьцюм вучняў і вучаніц”*, ваш прафэсійны гонар засунуты ў вас досыць глыбока.
— Добрай раніцы, — прамовіў я, уваходзячы ў кабінэт.
— Добрай раніцы й вам, — прамовіў калега і сябра Ярамір Наданы, мужчына сталага веку.
Мне здалося, што ён у гуморы, што зусім не было безумоўным. (Я імкнуўся зразумець ягоныя зьменлівыя настроі, і звычайна мне гэта ўдавалася тым лепш, чым *плястычней* я мог уявіць, як прыкладна могуць выглядаць дні і тыдні ў тым маленькім дамку, дзе адзінай жывой істотай, апрача яго, быў ягоны чорны кот. “Мой апошні кот”, — часам казаў Ярамір.)
— А-а, добрай раніцы, — прамовіла каляжанка Ірэнка.
— Добрае раніцы, — прамовіла каляжанка Ліба.
— Добрай ранічкі! — прамовіла каляжанка Ленка.
Каляжанка Хваталава-Сукава не прамовіла нічога. Замест прывітаньня яна кінула на мяне погляд, якім кіроўца на аўтамагістралі зіркае на пераеханага вожыка. Пасьля гэтага ейны твар зноў набыў ранейшую заклапочанасьць, і яна працягнула пратрус шафаў у кабінэце. Нарэшце яна выпрасталася.
— Леначка! Лібушка! Ірэнка! — выгукнула яна ў своеасаблівай махаўскай варыяцыі[2]. — Ці няма ў вас выпадкам пустога слоічка з-пад кавы?
— Не.
— Мы ўжо табе, Мілушка, усе слоічкі з-пад кавы пааддавалі, — патлумачыла Ірэнка.
Выраз абсалютнай роспачы ў Мілушчыных вачох дазваляў меркаваць, што дырэктар сабраўся на рыбалку яшчэ да абеду, а мо й проста цяпер. Яраміру стала яе шкада; ён перасыпаў сваю распушчальную каву ў поліэтыленавы мяшэчак з-пад перакускі, а пусты слоік моўчкі падаў ёй.
— Што з маленькім, — зазначыла Хваталава-Сукава, прытлумляючы задаволенасьць, і з слоікам ды сапёрнай рыдлёўкай з рыштунку амэрыканскай арміі засьпяшала на школьную дзялянку.
Ейны крок і целарухі, як заўжды, адбівалі тэмп кампазыцыі, нячутна гранай недзе пад скляпеньнем ейнага чэрапу.

Мы выйшлі з кабінэту на калідор і абступілі акно. Мілушка лунала сярод роснай травы.
— “Ода да радасьці”, — выказала здогад Ленка, тым часам як спадарыня настаўніца пад намі ўжо шчыравала на градзе. Ейны твар беспамылкова сьведчыў пра знаходку кожнага новага дажджавога чарвяка. Беспэрспэктыўныя грады Мілушка з выразам нямога дакору імгненна пакідала. Трэба сказаць, што рухалася яна вельмі шпарка.
— “Палёт чмяля”, — сказала Ліба.
Зьнізу, ад гардэробу, ужо нёсься знаёмы ранішні гоман. На бяду, сярод першых прыходзячых вучняў была і Агата. Заўважыўшы мяне, яна ўся зазьзяла.
— Добры дзень! — выклікнула яна падкрэсьлена акцэнтавана.
— Прывітаньне, — стрымана адказаў я, імкнучыся не адстаць ад калегаў, але ў дзьвярох кабінэту Агата літаральна заступіла мне дарогу.
З-пад чорнай футболкі ў яе тырчэла нейкая накрухмаленая карункавая камбінашка. Яна міла ўсьміхалася, а ейны погляд ні на хвіліну не пакідаў майго твару.
— Ну што? — прамовіла яна дабрадушна. Амаль *па-мацярынску*.
— Нічога. У цябе вылез падол.
У яе быў выгляд, нібы яна ніколі ня чула нічога забаўнейшага.
— Гэта так носіцца, — нарэшце сказала яна аўтарытэтна. Затым разгайдала заплечнік з падручнікамі ды сшыткамі і кінула яго па калідоры ў бок сваёй клясы.
— Брава, — сказаў я ўжо крыху знуджана. — Табе нешта трэба?
— Мне? — здумленьне ў нявінных вачах. — Не…
— Ну, тады ня тоўпіся ў дзьвярох вагону, — сказаў я, хаця й імкнуўся заўжды пазьбягаць падобных *жартоўных выслоўяў*. Калі мы зь імі ня можам даць сабе рады — заганяем іх у клясу.
— Тата вам перадае прывітаньне, — сказала Агата пакрыўджана.
Сьпінай я адчуваў погляды каляжанак.
— Дзякую.
І хутка зачыніў дзьверы.
— Ты заняўся прадпрымальніцтвам? — пацікавілася Ірэнка.

[2] Маецца на ўвазе паэма Карла Гінка Махі “Май” (1836), у якой колькі разоў сустракаюцца радкі з зваротам аўтара да сябе і галоўных герояў, напрыклад: “Гінку, Вілеме, Ярміла”.

Зацемка, натхнёная дажджавымі чарвякамі:
Калі каляжанцы Хваталавай-Сукавай трапляліся асабліва вялікія экзэмпляры, часам здаралася, што яна, высукваючы іх зь зямлі, у запале іх разрывала. Гэты факт мне падаецца вельмі павучальным, бо рэальная гісторыя, непасрэдным удзельнікам якой я праз шчасьлівы выпадак зрабіўся (зноў жа, відаць, толькі пісьменьнік здольны зразумець шчасьце аўтара, якому ў часе абсалютнай няверы ў выдуманыя сьветы лёс падкідае *аўтэнтычную падзею*), у пэўным сэнсе і ёсць *тоўсты чарвяк*, ня йнакш. Калі я хачу выцягнуць яе *ўсю*, трэба дзейнічаць максымальна асьцярожна.

Дарэчы, сапёрная рыдлёўка, якой Хваталава-Сукава заўжды здабывае прынаду, ня проста звычайная сапёрная рыдлёўка. Гэтаксама як джып маркі *“Jeep”*, які зь вясны ў працоўныя дні стаіць перад школай, ня проста звычайны джып. Калі ж я зараз скажу, што джып і рыдлёўка паходзяць з узбраеньня амэрыканскай марской пяхоты, я рызыкую, што гэтае маё сьцьверджаньне будзе ўспрынята толькі як дзікая ідэя апавядальніка, які ўжо не кантралюе сябе, — таму лепш я без скарачэньняў прывяду тут артыкул, які пад загалоўкам “ДОБРАЯ ІДЭЯ” быў апублікаваны ў “Збраслаўскіх навінах” (4/1992, стар.3):
Мінулы месяц увянчаў прадпрымальніцкі дух дырэктара сярэдняй школы імя Ўладзіслава Ванчуры ў Збраславе новым посьпехам. Ён першым з дырэктараў сярэдніх школ у Празе-5 адрэагаваў на прапанову амэрыканскага пасольства пра магчымасьць выгаднага выкупу рыштунку і абсталяваньня, якое па сваім сыходзе зь Нямеччыны пакінуў там кантынгент амэрыканскай арміі. Наша школа надзвычай танна (тавар быў вызвалены ад увознага мыта і ўсіх плацяжоў, у тым ліку ад падатку на даданую вартасьць і падатку з дарункаў) атрымала сярод усяго астатняга восем рассоўных лесьвіцаў, якія можна выкарыстоўваць як швэдзкую сьценку, трыножныя ляфэты, што добра прыдадуцца ў якасьці стоек для пераносных дошак, камплект працоўнага абутку і адзеньня і, нарэшце, былы ў карыстаньні джып. Гэта яшчэ адзін важкі довад за тое, што чым чакаць з працягнутай рукой, то лепш дзейнічаць… Віншуем!

Роўна а восьмай пачуўся другі званок. Мілушка дагэтуль адсутнічала.
— Ану цыц! — прыкрыкнула на званок Ленка.
— Ужо? — уздыхнула Ліба.
— Няма цікавейшага падарожжа, чым падарожжа ў краіну ведаў, — прамовіў калега Ярамір.
Аднак грукатаньне заведзенага джыпа пад акном кабінэту адразу ж усім паказала, што падарожжа на Орлік[3] можа быць усё ж цікавейшым. Мы асьцярожна вызірнулі ў акно: дырэктар Наскачыл у сваёй улюбёнай абыдзеннай форме сяржанта Л. Райта (нашыўку зь імем дырэктар зь невядомых прычынаў адпароць адмаўляўся) якраз даваў апошнія распараджэньні

двум хлопцам у кодабе — вучню Гаўлічку, чыім заданьнем, што ўжо, праўда, крыху зацягнулася, было пасьвяціць спадара дырэктара (відавочна, у часе кароткіх перапынкаў паміж асобнымі закідамі вуды) у праблематыку абслугоўваньня пэрсанальнага кампутара, і вучню Ла́зьняўскаму, які цяпер трымаў вуды і сіні дарожны мяшок (недзе ў ягоных нетрах у Яраміравым шкляным слоіку беспахібна выгіналіся Мілушчыны дажджавыя чарвякі).
— Чаму Лазьняўскі? — спытаў я.
— Бо ніхто, — паінфармавала мяне Ліба, — ня здатны лепш ачысьціць сачок, запэцканы вуграмі…
— Ах вось як.
— Натуральна, за выключэньнем Мілушкі.

3

Вадасховішча на Вэлтаве.

Калі верыць копіі раскладу, што ў мяне захавалася, у тым навучальным годзе ў пятніцы ў мяне была першым заняткам стылістыка ў 8“В”, дзе я адначасова быў *клясным*. (Хаця б караценька што да маёй клясы: некаторыя вучні былі, мякка кажучы, трохі *праблемныя*, і падыходу да іх я шукаў надта доўга, — аднак нават у тыя гады, калі мы ўжо досыць няблага ладзілі, усю клясу час ад часу ахоплівала нейкая калектыўная непрытомнасьць, падчас якой яны раскідвалі й раструшчвалі па падлозе каляровыя крэйды або пасярэдніцтвам перасьпелага памаранча стваралі на сьвежапафарбаваных сьценах новы самабытны ўзор, а затым на мае абураныя запытаньні — яшчэ ўсе спатнелыя і задыханыя — толькі схілялі вочы, а калі я, шалеючы, падымаў ім галовы за падбародкі, у іхных вачох была адно дзіцячая нявіннасьць.) Але вернемся да стылістыкі — вядома, што зь мяне *гейзэрам біў запал, я перапаўняўся ідэямі, а незвычайнае багацьце і стракатасьць рыхтаваных мною практыкаваньняў безупынна яўляла ўражаным вучням матчыну мову як дзівосны і дзейсны інструмэнт самапазнаньня*… Інакш кажучы: немінучай данінай за выбар аповеду ад першай асобы ёсьць немагчымасьць *праўдзіва* апісаць часам досыць удалыя заняткі.

— У наступных сказах дзеясловы замяніце прыдатнымі выклічнікамі, — чытала Марцэла заданьне наступнага практыкаваньня. — Узор: Жаба *скочыла* ў ваду. — Жаба *шабулдых* у ваду.

— Гэта проста да непрыстойнасьці лёгка, — сказаў я. — Думаю, справа мусіць пайсьці як з маслам. Радку, пачынай.

— Алень *скочыў* цераз плот, — прачытаў Радак Зэлэны і задумаўся. — Алень *шабулдых* цераз плот.

Вучнёўскі пэрл. Пачуўшы яго, нават зусім непыхлівы інтэлектуал адно спачувальна ўсьміхнецца (*праскі* інтэлектуал найхутчэй ветліва прыкінецца, што нічога ня чуў, — як калі б, прыкладам, нейкі неадукаваны гарапашнік у ягонай прысутнасьці нехаця перакруціў імя Хорхе Люіса Борхеса). Я ў гэтым ані крыху не сумняюся. Яшчэ адзін вучнёўскі пэрл — і ад

мяне ўжо рэпутацыі *павярхоўнага гумарыста* сапраўды будзе не адчапіць.

Мая будучая вучаніца за гэтую раніцу ўскосна нагадала мне пра сябе яшчэ двойчы.
Спачатку, калі я на перапынку, у рамках т. зв. пэдагагічнага дзяжурства, бязмэтна туляўся па калідоры, я знайшоў на адной з насьценгазэтаў Бэацін стары малюнак — з часоў, калі яна хадзіла ў восьмую клясу. Гэта быў удалы малюнак вугалем, адзіным матывам якога была *левая рука*, без сумневу ейная ўласная. Мне падумалася, што партрэт гэтай дзяўчыны адкрываецца перада мной неяк па частках, як у вядомай тэлегульні. Пакуль што я пабачыў толькі адбітак ейнага твару ў люстэрку задняга віду і шасьцігадовае даўнасьці выяву ейнай левай рукі — і я злавіў сябе на думцы, што ўва мне нарастае нейкая ідыёцкая цікаўнасьць.

А ў палове на другую перад школай мяне чакаў Крал.

4.

Ён сядзеў у
сваёй бірузовай
“аўдзі”. Кіроўцу
я ведаў: гэта
быў адзін зь
ягоных
ахоўнікаў.
Агата сядзела
ззаду і заўзята
адбівала кепікі
аднакляснікаў,
якія ў вялікім
мностве
скупіліся вакол.

Ён з усьмешкай выйшаў мне насустрач:
— Здароўкі. Едзеце дадому? Мы вас падкінем…
Я кіўнуў у бок школьнай сталоўкі:
— Яшчэ толькі на абед.

— Мы таксама едзем на абед.
Я маўчаў.
— Што ў вас на абед? — спытаў Крал.
— Кнэдлікі з таматным соўсам, — паінфармаваў яго нейкі школьнік з тусоўкі.
— Блюааа, — сказала Агата з машыны. — Блююааа.
Ейная імітацыя была да агіды дакладнай.
— Агата, — з замілаванай усьмешкай папікнуў яе Крал, а потым зноў зьвярнуўся да мяне. — Ведаеце што? Я вас запрашаю.
— Але я люблю кнэдлікі з таматным соўсам, — сказаў я весела. Упершыню ў жыцьці я зразумеў, як пачуваецца сакратарка, якую запрашае на абед шэф.
— Ды плюньце вы на гэтыя кнэдлікі.
Ён па-сяброўску ўсьміхаўся.
— Упершыню ў жыцьці я зразумеў, як пачуваецца сакратарка, якую запрашае на абед шэф…
Кіроўца крыху прыўзьняўся на сваім сядзеньні:
— Як?
Куткі ягоных вуснаў паторгваліся ў прадчуваньні фрывольнага жарту. Ягонае ператварэньне ў майго сябра адбылося неяк занадта хутка.
— Пагана, — сказаў я.
— А-а. Зразумела, — сказаў ён расчаравана.
— Але ж гэта зусім іншая рэч! — не пагадзіўся Крал, аднак магу пайсьці ў заклад, што насамрэч яму гэтае параўнаньне пахлебіла.
— *Праўда*?
Ён уважліва паглядзеў мне ў вочы:
— Вядома.
Я разьвёў рукамі:
— Ну добра.
Я сеў ззаду да Агаты.
— Кнэдлікі! Блююааа! — зноў выгукнула яна.
— Блююааа! — выгукнуў Крал.
— Блююаа! — выгукнуў кіроўца.
І мы паехалі.
Мы паехалі досыць павольна, нібы мне хацелі даць даволі часу, каб я ацаніў ціхі магутны рухавік, дасканалыя рысоры, мяккую аксамітную абіўку салёну й прыемны халадок кандыцыянэра.

Аднак Кралу, відавочна, мая зачараванасьць падалася недастаткова пераканаўчай, бо ён палічыў неабходным прадэманстраваць мне яшчэ й *мабільны тэлефон*: з удаванай уцьвеленасьцю ён некуды *настойліва* званіў, але, паколькі на другім канцы ніхто не адказваў, ён вымушаны быў задаволіцца званком жонцы, якой паведаміў, што вязе госьця.
— Накрый на адну асобу больш, — зычліва загадаў ён, але добра чутная — няўцямная, а затым і крыху раздражнёная — рэакцыя спадарыні Кралавай досыць красамоўна выявіла сумнеўны сэнс ягонага тэлефанаваньня тады, калі нас ад гасьцёўні ў іхным доме аддзяляла пара сотняў мэтраў.

Мы абедалі з Кралам адны. Агата з кіроўцам некуды зьніклі. Бэаты не было ані сьледу, але Крал, відавочна, не адчуваў ніякае неабходнасьці ейную адсутнасьць неяк камэнтаваць, таму я й не пытаўся. Два апэрытывы мяне нямала разьняволілі, але, нягледзячы на гэта, я заставаўся, так бы мовіць, напагатове. Пасьля супу Крал на хвілінку адышоўся, а я тым часам з акна гасьцёўні агледзеў рэшту саду. Мой погляд і цяпер натыкаўся на дзіўныя рэчы: тут былі па-дылетанцку абкарнаныя хмызы, глыбока аселыя, зарослыя грады і цалкам адкрытыя карані кустоў агрэсту й парэчак. А вяршыняй усяго была разьбітая скрыня з кампостам, на якой грувасьцілася невытлумачальная мяшанка з галінаў, грунту, кардонных каробак, камянёў і дроту.
— Ваш садоўнік проста забойца, — сказаў я Кралу, калі той вярнуўся.
— Такія жарты, — сказаў ён зь нечаканаю непрыязнасьцю, — мне недаспадобы.
Я не зразумеў:
— Не разумею…
— Ня ведаю, хто вам што сказаў, — прамовіў ён холадна. — У кожным разе кіньце гэта.
— Я толькі хацеў сказаць, што гэты сад…
Ён спыніў мяне поглядам. Нядобрым поглядам. Божа, што ж я сказаў? — пытаўся я ў сябе.
Напружаньне было невыносным.
— Добра, — сказаў я.
Я асьцярожна выбіраў словы:

— Калі я вас нечым пакрыўдзіў, перапрашаю.
Ён *велікадушна* кіўнуў. Кім ён сябе, к д'яблу, уявіў? Я не ўтрымаўся ад пэўнай сварлівасьці:
— Што ж, пакіну сад як ёсьць і абмяжуюся выключна назіраньнямі *пэдагагічнымі*, — сказаў я, нападаючы. — Па-першае, *я таксама* штодня чакаю сваю дачку перад школай, дарма што большасьць ейных аднаклясьніц даўно ўжо ходзіць дамоў самастойна, такім чынам я ці не найлепш разумею такую праяву *бацькоўскага клопату*, але чакаць яе ў шыкоўным лімузыне — гэта адназначная дурасьць. Ёй і без таго — дзякуючы вам — нялёгка, а гэтым сваім палацам на колах вы ёй толькі ўсё ўскладняеце. А па-другое, *высакародны бацька* — наскрозь сымпатычны пэрсанаж, але сваёй *абсалютна бяскрайняй талерантнасьцю* і сваім *некрытычным абагаўленьнем* вы сееце ў Агаце насеньне тых самых праблемаў, якія сёньня — скажам так — маеце, падобна, з Бэатай.
Я ўжо крыху задыхаўся.
Ён задумліва пазіраў на мяне. Ці прагоніць? — пытаўся я сам у сябе.
— Магчыма, я сапраўды залішне *мяккі*, — прамовіў ён надзіва спакойна. Затым паглядзеў у акно. Ён без сумневу быў нечым заклапочаны. — Але яна ня можа хадзіць сама. Зразумейце адно: калі ў вас ёсьць трохі грошай, то й зайздросьцяць вам толькі крыху. Але калі вы *сапраўды* багаты, у вас ёсьць, на жаль, і *сапраўдныя* ворагі.
— У гэта можна паверыць, — сказаў я мірна.
— Паслухайце, — сказаў ён нечакана ціха. — Вазьмеце гэтую працу.

А я на гэта:
— Ну, добра.

II

1. Сам факт, што Бэата *крыху піша*, мяне зусім не зьдзівіў: урэшце, кожны з нас *пакутуе ад таго, што зьнікне непачутым і незаўважаным у абыякавым сусьвеце, што даводзіць нястрымны рост масавай графаманіі сярод палітыкаў, таксістаў, парадзіх, палюбоўніц, забойцаў, злодзеяў, прастытутак, прэфэктаў, лекараў і пацыентаў* (Мілан Кундэра). Да таго ж я ведаў, што

яна год адвучылася на філязофскім факультэце (аднак пасьля пасьпяховай здачы іспытаў за веснавы сэмэстар *на ўласнае жаданьне* сышла ў акадэмічны адпачынак) — у асяродку, дзе — што я меў магчымасьць зьведаць і сам — чалавек пісаньнем *легітымізуецца*; не пісаць *зусім* — значыць выклікаць падазрэньне, што ўва ўнівэрсытэт вы трапілі з чыёйсьці пратэкцыі. Такім чынам, дасюль было ўсё ў парадку. Але я не разумеў, чаму Крал гэтак дбае, каб Бэата пісала, і я ня мог добра сабе растлумачыць ягонай упартай зацікаўленасьці ў курсе *creative writing*. Няўжо ён бы гэтаксама ўлягаў і перад настаўнікам ігры на скрыпцы? — пытаў я ў сябе.
— Дык чаго ён ад цябе, уласна, хоча? — дапытвалася жонка, калі ў нядзелю ўвечары я ў першы раз зьбіраўся на працу. Дачка, нягледзячы на мае пратэсты, пакавала мне з сабой тры тварожнікі.
— Я б і сам хацеў гэта ведаць, — адказаў я няўважліва, бо якраз разважаў, што б мне з сабой узяць: чырвоны маркер? фатаздымак Гемінгуэя? — Каб навучыў яе пісаць… Адным словам, *цуду*.
— Цуду. Дык ты зьбіраешся яе *зачараваць*?
Насуперак насьмешліваму выразу твару яна выглядала трохі скептычна.
— Я *не зьбіраюся* яе зачараваць, — адказаў я на вока напышліва. — Я, як ты ведаеш, маладых дзяўчат зачароўваю неяк *міжволі*.
— Ха-ха-ха, — сказала дачка нязгодна, бо нават зусім нявінныя заўвагі на гэтую тэму ёй былі вельмі недаспадобы. На пачатку таго лета ёй не было й дзевяці.
Жонка маўчала. Звабная Кралава прапанова на пятнічны вечар і ўсю суботу зрабіла зь мяне *надзвычай здольнага й вартага павагі мужчыну*, але сёньня ўжо была нядзеля. Няцяжка было здагадацца, якой *страты* ад хуткага *зыску* яна баялася прычакаць.
— Колькі разоў табе туды трэба схадзіць? — спытала дачка.
— Шмат разоў.
Я зьвярнуўся да жонкі:
— Шмат разоў, бо *беднасьць — як паршывая псіна, што валяецца ў нас на парозе*…
— Мы праўда бедныя? — дапытвалася дачка з шчырай цікаўнасьцю.

— А ты бачыла калі-небудзь багатага настаўніка? — сказала жонка.
Я пацалаваў яе:
— Але *пабачыш*.

Як толькі я апынуўся перад брамай Кралавай вілы, рассоўныя вароты зноў з грукатам адчыніліся перада мной. Я ня зрушыў зь месца.
Абодва здаравілы махалі мне з саду, трымаючы пульт дыстанцыйнага кіраваньня:
— Здароўкі, настаўнік!
— Прывітаньне, хлопцы.
— Ну заходзь!
— Ні ў якім разе! — абвесьціў я рашуча.
— Ня бойся, заходзь! — сьмяяліся яны.
Я не зварухнуўся ані на сантымэтар. Яны вясёла мацюгаліся. Той, што ў чацьвер вёў Кралаву “аўдзі”, прыйшоў урэшце мне адчыніць. Я заўважыў, што ў яго пачырванелыя і прыпухлыя вочы.
— Зноў мы з гэтай брамай маху далі, — патлумачыў ён, працягваючы мне руку. — Я Пэтар. А называюць Пэтрык.
Я кіўнуў галавой у той бок, дзе мінулым разам яны мяне павалілі:
— Думаю, што я ўжо прадставіўся.
У яго вырваўся кароткі сьмяшок.
— Сёньня мяне не адлупцуеце? — пацікавіўся я.
Падышоў і другі.
— Пытаецца, ці мы яго сёньня не адлупцуем… — ажыўлена пераказаў яму Пэтрык.
— Сёньня не, — засьмяяўся другі. Зваць яго, маўляў, Ірка, але ўсе завуць Іржыкам. З вачыма ў яго было яшчэ горш, чым у Пэтрыка.
— Каго гэта вы аплаквалі? — спытаў я. — Няўжо Шварцэнэгер памёр?
Высьветлілася, што абодва хлопцы спаборнічалі, хто даўжэй вытрымае, зачыніўшыся ў машыне, запырсканай папярэдне сьлезацечным газам. Іржык перамог.
На тэрасе зьявіўся Крал:
— Праходзьце далей! — крыкнуў ён і зноў зьнік.

— Ну давай, — пусьцілі яны мяне.
— А як жа асабісты дагляд?
— Давай-давай, — падштурхоўвалі яны мяне. — Ён сьпяшаецца на тэніс.
— Вашая легкадумнасьць уражвае: а што калі ў мяне ўва ўказцы тратыл?
Яны зайшліся ад рогату. Іржык крыху абсмаркаў сабе пінжак. Ну, хоць ад гэтых ідыётаў я збавіўся, падумаў я сам сабе.

Я крыху наіўна чакаў, што першы мой дзень на новай працы будзе мець калі не зусім *пратакольны*, дык прынамсі пэўны *афіцыйны* характар, — але ўрэшце гэтае меркаванае *ўступленьне на пасаду* (калі пра яго ў гэтым выпадку ўвогуле можна казаць) адбылося досыць пасьпешліва і малаўрачыста; Крал хапатліва пераапранаўся на тэніс і ўсе інструкцыі даваў мне па дарозе між спальняй і ваннай.
— Бэата ў сябе. Я ёй сказаў, што вы пачняце а шостай. Цяпер ужо за палову, жонка ў кухні зробіць вам кавы.
Ён сьцягнуў зь сябе і кінуў на падлогу майткі і голы забег у ванную, пакінуўшы дзьверы насьцеж. Сам сабе я адзначыў, што традыцыйная антыпатыя да самаўпэўненых голых мужчын з часоў тэрміновай вайсковай службы ўва мне яшчэ больш узрасла.
— Перадайце ёй, што я настойваю, каб напачатку вы займаліся дома. Гэта калі б ёй захацелася куды-небудзь паехаць…
— Добра.
— Празь дзьве гадзіны я ўжо даўно буду дома. Калі ж не пасьпею, пачакайце.
Ягоныя словы гучалі непрыемна. Усю сваю прыхільнасьць ён нібы вычарпаў пры нашых папярэдніх дзьвюх сустрэчах.
— Добра.
Ён апрануў бела-зялёную тэніску з каўнерыкам. Нарэшце зірнуў на мяне:
— Як я вам казаў, у яе *творчы крызыс*. Вам будзе нялёгка. Але вы не павінны адступацца.
Ён нацягнуў белыя шкарпэткі *“Adidas”* — на кожнай былі тры зялёныя палоскі.
— Я ўжо даўно мусіў быць на корце.
Мяне не пакідала адчуваньне, што яму гэтая нястача часу прыдалася. Усе ягоныя кароткія ўрыўкавыя загады толькі

прыхоўвалі нейкую невядомую мне няўпэўненасьць. Зрэшты, і гэта я бачыў у войску.
— *ODS*[4] *Open Cup*, — сказаў *я жартаўліва*.
— Ён будзе ажно ў сьнежні. На крытых кортах, — патлумачыў ён мне й самазадаволена ўсьміхнуўся. — Сёньня я гуляю з Пэтрам Чэрмакам[5].

[4] ODS (Občanská demokratická strana) — Грамадзянская дэмакратычная партыя (ГДП)

[5] Палітык, колішні сябра чэскага парлямэнту ад ГДП.

Актыўнасьць вершаванага радка, безумоўна, нельга тлумачыць тым, што паэзія нібыта стварае словам рэчаіснасьць новую, самабытную і штучную, як часам зь неразуменьнем сьцьвярджаюць. Сапраўдная рэчаіснасьць — толькі адна.
Ян Мукаржоўскі, Нарысы пра паэтыку

Некалькі доўгіх хвілін я праседзеў у кухні сам-насам. Потым зьявілася спадарыня Кралава:
— З малаком або без? — строга спытала яна; відавочна, таксама атрымала інструкцыі. Я пачуваўся як майстар па рамонце тэлевізараў.
— Без малака, дзякуй.
— Не разумею, як можна піць чорную, — сказала яна з дакорам. Сабе зварыла *белую*.
Я вінавата паціснуў плячыма й прапанаваў ёй тварожнік; факт, што я прынёс з сабой тры тварожнікі, яе нечакана разьвесяліў. Яна пачала распытваць пра дачку: ці яна іх мне спакавала сама? Безь нічыёй дапамогі? І што пры гэтым казала? А чыя гэта, уласна, была ідэя? Сапраўды яе?
Да такіх пытаньняў я звыклы ад абедзьвюх сваіх бабуляў, таму мне ўдаецца на іх адказваць без усіх гэтых звычайных *генэрацыйных грымасаў* (спадзяюся, гэта гучыць не занадта самаўпэўнена). Майму збліжэньню з спадарыняй Кралавай гэта, вядома, паспрыяла.
— Анёлак, — урэшце сказала яна з шчырым замілаваньнем. Уздыхнула.
Не магло быць сумневаў, што яна ўжо думае пра нешта іншае. Паказала пальцам у столь:
— Я вам нешта скажу: ёй хутка дваццаць. Лепш бы яна знайшла сабе працу, — сказала яна сур'ёзна. — А па-другое, ёй пайшло б на карысьць замужжа.
Далейшыя яе развагі пра тое, што трэба рабіць

дваццацігадовым, перапыніў прыход трынаццацігадовай Агаты. З рота ў яе тырчаў ледзянец.
— О-о, — усьцешана прыцмокнула яна. — Вы тут ужо?
— Так. Я тут ужо.
— Павітайся як сьлед, — сказала спадарыня Кралава. — І разуйся.
Агата адфутболіла красоўкі ў кут, а ледзянец прыляпіла на часопіс “Бляск”, што ляжаў перада мной на стале. Затым басанож прайшла да лядоўні, паўтараючы ступакамі ўзор на кафлянай падлозе. Зь лядоўні выцягнула плястыкавую бутэльку кока-колы і велізарны памідор, які ўвесь запхала ў рот, — як я і чакаў, з куткоў роту ў яе пырснуў сок з жоўтымі зернейкамі.
— Агата, — сказала спадарыня Кралава.
Агата захіхікала, папярхнулася і пачала душыцца — пачырванела, жахліва выракчыла вочы і з красамоўнымі жэстамі зьехала да маіх ног; я паслухаўся і даланёй колькі разоў ударыў ёй па кастлявай грудзіне. Яна набрала паветра.
— Дзякуй.
Ейныя вочы былі поўныя сьлёз.
— У мяне на гэта нэрваў не хапае, — сказала спадарыня Кралава. Сыходзячы з кухні, яна кінула на мяне сумны позірк.
— Ну што ёй зноў ня так? — з дакорам прамовіла Агата.
Я нават не імкнуўся схаваць усьмешку, хоць і ведаў, што маю *настаўніцкую* ўсьмешку яна ўспрыме як згоду, калі не як заахвочаньне.
Пацьвердзілася гэта адразу ж.
— Як ты ладзіш з Бэатай? — спытаў я. Яна якраз рабіла нейкае практыкаваньне на расьцяжку.
— Якая вата? — сказала яна без зацікаўленьня, прыкінуўшыся, нібы недачула.
Я пакорліва паўтарыў сваё запытаньне.
Яна паглядзела на мяне з пагардлівым зьдзіўленьнем:
— Як я зь ёй магу ладзіць, калі яна з мной ужо тыдзень не размаўляе?
— Яна з табой *не размаўляе*?
— Не размаўляе ні з кім… — баранілася яна.
Памажы божа, падумаў я.
— Чаму не размаўляе?
Яна, пэўна, хацела нешта сказаць, але ўрэшце толькі

ўхмыльнулася:
— Таму што ідыётка.

2. Калі я ў пару хвілінаў на сёмую падымаўся па мармуровых сходах у Бэаціну мансарду, я злавіў сябе на тым, што зьлёгку хвалююся. (Гэта было трохі дзіўна: на пачатку настаўніцкай кар'еры мяне — відаць, як і ўсіх — дрыготка колькі разоў прабірала, але цяпер я ўваходзіў у самыя розныя клясы дваццаць шэсьць разоў на тыдзень і пра ўсякую нэрвовасьць даўно забыў.) Сходы пераходзілі ў заліты сонцам бэльэтаж з маленькім зімовым садам, дзе нехта з дапамогай трох плеценых фатэляў, століка і раскошнай настольнай лямпы з махрыстай ядвабнай абцяжкай ружовага колеру стварыў вельмі ўтульны закуток. Яшчэ б толькі каўнік і дзьве філіжанкі — і *ціхая размова пра літаратуру* можа пачацца, казаў я сабе. На дзьвярох у Бэацін будуар была вялікая прастакутная налепка з надпісам "PRIVATE" і з тузін старых пераздымкаў з выявамі розных музычных гуртоў, прычым шматлікія драпіны на многіх зь іх сьведчылі пра марныя спробы іх зьдзерці. Калі я, пагрукаўшы нават тройчы, так і не дачакаўся ніякага чутнага запрашэньня, з словамі *"Ці можна?"* я ўвайшоў.
У пакоі панаваў задушны й змрочны прыцемак, бо парчовыя завесы на вокнах прапускалі толькі мінімум сьвятла. Таму мінуў пэўны час, пакуль я зарыентаваўся: усё памяшканьне падзяляў доўгі кніжны стэляж, вышынёй мэтра паўтара, што пачынаўся ад супрацьлеглай сьцяны і заканчваўся якраз насупраць уваходных дзьвярэй. На ягоным тарцы, як на носе карабля, вісела расфарбаваная драўляная фігура сырэны з крыху экспрэсіўна выпрастанымі рукамі, якія служылі вешаком для адзеньня. У меншай частцы пакою быў просьценькі працоўны закуток зь пісьмовым сталом, заваленым кнігамі і паперамі. У астатніх дзьвюх трацінах прасторы дамінаваў кутні сядзельны *гарнітур*, што ўключаў у сябе дзьве вялізныя аморфныя кучы нейкіх сасіскападобных падушак, два нізкія, нават з выгляду хісткія скураныя табурэты і адзін аўтэнтычны стаматалягічны фатэль. Традыцыйны часопісны столік нязвыкла замяняла палавіна нафтабаку фірмы *"Texaco"*, што стаяла пасярод квадратнага дыванка з усходнімі ўзорамі. У кутах на сьценах віселі вялікія чорныя рэпрадуктары, а паміж

зацямнёнымі вокнамі была прымацаваная полістыролавая дошка з мноствам рукой напісаных зацемак і выразак з часопісу “Акно”. Аднак пасьцель на разасланым ложку, у якім тварам да сьцяны ляжала Бэата, была сумна пасрэдная.
— Здароўкі. Вось і я. Інакш кажучы, у твой студэнцкі пакойчык — між іншым, вельмі своеасаблівы — увайшло *чыстае, нялжывае мастацтва*.
Ніякай рэакцыі. Я зноў прабег вачыма па ўсім інтэр’еры:
— Ну добра: хай будзе *мяшчанскае* мастацтва.
Нічога.
— Нічога ня зробіш, — сказаў я, — калі табе не ўдалося мяне пераехаць…
Сьветлыя валасы на падушцы не зварухнуліся ані на мілімэтар. Ці не глухая? — падумаў я. Дзеля бога, пра гэта мне б мо сказалі. Хвілю я разважаў, дзе б мне лепей прысесьці, і ўрэшце асьцярожна апусьціўся на кучу згаданых сасіскападобных падушак, каб у наступнае імгненьне з жахам адцеміць, што яны напоўненыя вадой: падатлівая матэрыя імгненна прысвоіла сабе мой цэнтар цяжару і, колькі разоў плаўна пераліўшыся, навязала мне паставу Гоеўскай “Аголенай Маі”.
— Гэта не фатэль. Гэта балота…
Першая спроба вызваліцца скончылася ў позе “Забіты Марат”. Цішыню перарывала толькі маё ўласнае сапеньне. З другога разу мне ўдалося вызваліцца. Я сеў на цьвёрды край стаматалягічнага фатэля:
— Ну добра: жарты ў бок.
Момант я разважаў.
— Што ж, давай шчыра. Бацька казаў мне, што ты *крыху пішаш*, і пытаўся, ці ня быў бы я супраць пару разоў на тыдзень гэта з табой абмяркоўваць. Я тлумачыў яму, што ў мяне сапраўды няма лішняга часу і што я, да таго ж, да падобных курсаў стаўлюся досыць скептычна. І калі я ягоную прапанову ўрэшце прыняў, дык толькі таму, што ён прапанаваў мне — прынамсі, як на мой розум — вялікія грошы.
Мне падалося, што яна нібыта *кіўнула*.
— Аднак у той самы час я ня мог пазбыцца ўражаньня, што яму зь нейкай прычыны вельмі важна, што ты пішаш. Хоць ён і сьцьвярджаў, што нешта накшталт літаратурна-стылістычнага курсу — гэта тваё *патаемнае жаданьне*, але я, шчыра кажучы, хвіліны тры ўжо пытаю ў сябе, ці напраўду ён разьбіраецца ў

прыхаваных жаданьнях сваёй большай дачкі…
Яна маўчала. Ейная галава бяз руху спачывала на падушцы. У маёй *мазаіцы* (апрача гэтага вадаспаду сьветлых валасоў) не дадалося ніводнай новай дэталі.
— Мне сысьці? — спытаў я.
Ніякага адказу.
— Я супраць таго, каб кагосьці да нечага прымушаць…
Нічога.
— Сыходжу. Сыходжу бяз гэтых грошай. Буду сабе й надалей у нядзелю на абед есьці тушаніну. Зрэшты, я абагаўляю тушаніну.
І кнэдлікі, прыгадаў я.
— Сыходзячы сыходзь, — сказаў я ўжо хутчэй для сябе.
Тым ня менш, адсутнасьць усякай рэакцыі зь ейнага боку нямала мяне нэрвавала. Прыгадаўся Крал і ягонае *“не павінны адступацца”*. Я схіліўся да ейных валасоў (маецца на ўвазе так званы *наступальны пэдагагічны ўхіл*):
— Паслухай, Бэата, — сказаў я ўжо настойлівей, — я дзевяць гадоў жанаты, і калі я нечага *сапраўды не выношу*, дык менавіта такіх вось *тэатральных паказных сцэнаў*. А што калі б мы проста адгарнулі ўсе гэтыя завесы, пусьцілі сюды дзеля зьмены трохі сьвятла і паветра ды паспрабавалі *спакойна*, нязмушана пагаварыць? Або, — натхніўся я імгненнай ідэяй, — мо нам зусім пакінуць гэтую ўражальную камбінацыю стаматалягічнага кабінэту й нафтаскладу і перасунуцца на момант у тыя аптымістычныя плеценыя крэслы там на пляцоўцы?
Нехта ўвайшоў. Я раздражнёна прымружыў вочы, паглядзеўшы ў прастакутнік сьвятла.
— Не замінаю? — ветліва запытала Агата. — Чаму вы тут седзіце ў поцемках?
— Замінаеш! — упершыню ў гэтым доме я падвысіў голас. — Даруй, але табе давядзецца пакінуць нас адных!
Яна абражана трасянула чубчыкам і бразнула за сабою дзьвярыма.
— Я прапусьціў твой адказ, — сказаў я Бэаце як мага прыязьней.
Як пугаю па вадзе.
— Бэата, *прашу цябе*, — цярплівасьць, зь якой я гаварыў, каштавала мне ўжо немалых высілкаў. — Няўжо мы ня можам

хаця б *паспрабаваць*? Няўжо мы ня можам дагадзіць твайму бацьку? Паглядзім — можа, з гэтага нешта выйдзе…
І яшчэ я казаў:
— Дзеля бога, няма ж гаворкі ні пра якае *рэпэтытарства* — дык навошта адно аднаму ўсё ўскладняць?
А таксама:
— Адзінае, што нам трэба, — гэта крыху тваёй добрай волі.
І яшчэ:
— Я табе абяцаю, што нам *зусім* не спатрэбіцца сшытак…
Я яе нават — пад уплывам фільмаў, дзея якіх адбываецца ў асяродзьдзі псыхіятрычных клінік, — паспрабаваў справакаваць:
— У цябе валасы трохі льсьняцца — ты заўважыла?
Яна ляжала *як мёртвая*.
Я пакорна вярнуўся назад у стаматалягічны фатэль.
— Дзеля бога, — я гучна ўздыхнуў. — Бачу, гэтыя грошы дадуцца нялёгка.
Яна ўзьнялася на локцях і павярнула да мяне *каменны твар*:
— Можаш не сумнявацца! — прасіпела зь непрыхаванай апатыяй.
Ну дык не сумняюся.

Бяз дай прычыны пачала хварэць і нядужаць; яна марнела, мадзела, худнела й бляднела, маркоцілася і ўздыхала.
Карэл Чапэк, Пра сулейманскую прынцэсу

Мушу прызнацца, што Бэацін раптоўны выбух на доўгія хвіліны мяне ашаламіў: ня будучы здольным да нейкай зьвязнай асэнсаванай прамовы, я моўчкі блукаў вачыма па змроку пакою.
Толькі пачуцьцё *абражанасьці*, у якое я з пэўнай доляй непазьбежнай крывадушнасьці сам сябе ўвёў (*Што гэтае дзяўчо ўвогуле пра сябе думае?*), мне паступова ўмагчыміла больш-менш скансалідавацца — у рэшце рэшт я ніякі ня *дзэн-будыст*, каб паўтары гадзіны вытрымаць у цемры сам-насам з уласнымі, да таго ж зусім не аптымістычнымі, думкамі.
З гэтага складзецца файны *сюжэт*, стомлена суцяшаў сябе я.
— Паслухай, — сказаў я, — можа, хоць радыё ўключым?
Збольшага я ўжо зьмірыўся з тым, што кожная мая рэпліка

безадказна губляецца ў сутоньні.
— Або магнітафон? Цішыня хоць і лек, але зь іншага боку неабавязкова ж адразу *перадазоўвацца*… Мо я пайду зраблю клубнічны кактэйль, у якім я ў чацьвер сядзеў у вас на тэрасе? Быў выдатны — я дома лізнуў у сябе ў пасе.
Гэтым разам у яе міжволі вырваўся чутны сьмяшок. Тым упарцейшым было потым ейнае маўчаньне.
Сьцерва, я цябе ўсё адно дастану, казаў я сабе, аднак у мяне зьнікала натхненьне.
— Ці мо мне прапыласосіць? — прапанаваў я безь пятнаццаці сем.
А сёмай я сказаў:
— Я толькі так спытаўся — *каб гаворка ня грузла*.
Недзе а палове на восьмую яна адкінула капу. Я чакаў, што будзе далей, але яна засталася ляжаць — відаць, не стрывала гэтае сьпёкі. Поўная абыякавасьць, зь якой яна вытыркала да мяне зад у карункавых майтках, была абразьлівай. Мне здавалася, што я літаральна фізычна адчуваю зрухі, што адбываліся ў гэты момант у маім *сацыяльным адчуваньні*.
— Файна, — сказаў я. — Я толькі ў душ і адразу ж да цябе.
Гэта прагучала зусім ня так, як я хацеў.
Лепш бы я зусім нічога не казаў.

А сёмай пяцьдзясят чатыры я не разьвітаўшыся ўзьняўся і спусьціўся наніз. Адразу ж прыехаў і Крал — ён быў увесь чырвоны, а зь ягонага дыханьня было слаба чуваць піва. Жонка забірала ў яго прапацелыя адзёжкі.
— Ну, што чуваць? — выклікнуў ён бадзёра, але мяне ўжо немагчыма было ўвесьці ў зман.
— Зусім ніяк.
Раптам ён набыў спалоханы выгляд:
— Як гэта зусім?
— Проста *зусім*.
— Былі дома? — спытаў Крал падазрона. Пытаньне адрасавалася жонцы. Тая кіўнула.
— Я скончыў, — сказаў я.
— *Скончыў*? — перапытаў Крал насьмешліва. — Вы яшчэ нават не пачалі…
У мяне не было змогі распачынаць *дыскусію*.
— На гэта ў мяне няма цярплівасьці.

— Навошта адразу адступацца?
— Навошта? Бо за дзьве гадзіны я зь яе выцягнуў адзін сказ.
Мае словы на мужа і жонку Кралаў мелі нечаканае ўзьдзеяньне.
— Што? — сказаў Крал. — Яна загаварыла?
— Што яна сказала? — спытала спадарыня Кралава, гэтаксама, як перад тым выпытвала пра *маю* дачку. Аднак цяпер ейная цікавасьць яшчэ пабольшала.
— Што мне зь ёй давядзецца цяжка — вольна перафразаваўшы. Муж з жонкай пераглянуліся.
— Уголас? — пацікавіўся Крал.
— Што?
— Ці яна гэта сказала *ўголас*?
— Так. Уголас. І цалкам самастойна.
Ён не зразумеў.
— Хадземце з мной, — радасна выгукнуў ён і пацягнуў мяне ў свой цудоўны кабінэт, дзе мне гатоўкаю заплаціў дзесяць тысячаў крон у якасьці *задатку за ліпень*.
— Вось пабачыце: справа пойдзе! — запэўніў ён.

Ня так даўна ў “Лідавых навінах” я натрапіў на інтэрвію з акторам Нацыянальнага тэатру Барысом Рэзнэрам — вядомы пытаньне, што ён лічыць сваім дагэтулешнім найлепшым дасягненьнем, ён адказаў: “Найвялікшым дасягненьнем, жыцьця я лічу тое, што ў мяне здаровая, разумная, васямнаццацігадовая дачка”.
А хіба не?

III

1. Яшчэ ў той самы вечар я спрабаваў над сытуацыяй рэфлексаваць, але нешта не магу прыгадаць, каб я дадумаўся да чагосьці істотнага.
Зранку ў кабінэце *дзьверы не зачыняліся*.
Першым прыбег калега Стршыбрны, васямнаццацігадовы гімназіст.
Ён заікліва паведаміў нам, што ўцякае ад сваіх вучняў-дзевяціклясьнікаў, і з выразам загнанай лані папрасіў у нас да званка прытулку. За дзьвярыма кабінэту было чуваць, як галёканьне разьюшанага натоўпу паступова пачало аддаляцца.

6 Мілан Юнгман (1922) — вядомы чэскі крытык і літаратуразнаўца; Рудольфова Слобада (1938—1995) — адзін з найвядомейшых славацкіх пісьменнікаў.

— Стршыбрны, ты нас дастаў! — пачулася сярод тупату ног. Вось бачыце, казалі ягоныя вочы. Нягледзячы на свой малады век, ён рабіў уражаньне вычарпанага чалавека.
— Іх няможна так блізка падпускаць да сябе, — па-сяброўску заклікалі яго астатнія.
Ён сумна паківаў галавой:
— Мне гэта ўсе кажуць — але як гэта *зрабіць*?
Адказу, аднак, ён не дачакаўся, бо прыйшла разгняваная спадарыня Тракаржава, каб *удакладніць у спадарыні Хваталавай-Сукавай некаторыя моманты заўтрашняга пазакляснага канцэрту*.
Хваталавай-Сукавай у кабінэце не было.
— Дзе ж нашая артыстка?
— У дырэктара.
— Чым яны там увесь час займаюцца — сэксам, ці што? — засьмяялася яна.
Сьвятлана Тракаржава была зь ліку тых нямногіх настаўніц, якія *сапраўды* ўсьвядомілі, наколькі вялізны і ўвадначас небясьпечны доўг застаўся нам ад камуністычнай сыстэмы адукацыі (зь яе крывадушным пурытанствам, называным *сацыялістычнай маральлю*) у галіне сэксуальнага выхаваньня, і ягоную ліквідацыю ці прынамсі істотнае зьмяншэньне ўспрыняла як сваё жыцьцёвае пакліканьне. Трэба сказаць, што для гэтай няпростай задачы яна была добра падрыхтаваная, бо ў адрозьненьне ад зацятых кансэрватараў кшталту Яраміра Наданага (чыю непрагрэсіўную пазыцыю найлепш характарызуе слаўны вырак, што *нават першынство Чэскай Рэспублікі ў колькасьці непаўналетніх, хворых на вэнэрычныя хваробы, не прымусіць яго разьбіраць зь дзецьмі эратычны дапаможнік "Прагныя вусны"*) не адчувала ніякай фальшывай боязі, а *абсалютная адкрытасьць*, зь якой падчас навучаньня прадмету "сямейнае выхаваньне" яна падступалася да тэмаў, нядаўна яшчэ табуяваных, наадварот, прыносіла ёй немалую ўцеху.
Той панядзелкавай раніцай яна трымала пад рукой штук дзьвесьце сьвежанакапіяваных выяваў *разрэзу вагіны* (дакладна ня памятаю — гэта мог быць і разрэз *маціцы*), паводле якіх ейныя вучні апісвалі асобныя часткі. Такі мэтад кантролю ведаў зыходзіць з даўно апрабаванага прынцыпу *контурных мапаў*, і адзінае адрозьненьне палягае, відаць, толькі ў тым,

што, прыкладам, заміж “Шцяўніцкія горы” трэба напісаць “палавыя вусны”.
— Толькі ўявеце сабе, што ў *сёмай* клясе дзевяць хлопцаў зь дзесяці не маглі знайсьці клітару! — распавядала яна агаломшана.
— Ды *няўжо*? — адчайна паўтараў калега Стршыбрны.
На шчасьце, галоўным прадметам Сьвятланінай ранішняй цікавасьці быў толькі згаданы ўжо пазаклясны канцэрт.
— Чаму мы мусім хадзіць на пазаклясныя канцэрты *чатыры разы* на месяц? — абуралася яна. — Раз на год было б больш чым даволі.
— Таму што музыка, — прамовіў ласкава Ярамір, — гэта сродак зносінаў.

Аднак мне, на жаль, ня выпала шчасьця даслухаць сваіх калег да канца, бо неўзабаве пасьля Сьвятланінага прыходу загадчыца школьнай гаспадаркі паклікала мяне да дырэктара. Магу ўявіць вашыя магчымыя пярэчаньні, але ж я ніколі не сьцьвярджаў, што *кожны* дыялёг, які вы чытаеце, — гэта натарыяльна завераны магнітафонны запіс. *Аўтар стылізуе свае аповеды так, каб чытач адчуў, што іхны герой — сам пісьменьнік, што гэта дакладна апісаныя ягоныя канфлікты, і ў той самы час ён нас зьняпэўнівае “выдумляньнем”, фікцыяй, яўным перабольшаньнем, каб гэтае атаесамленьне немагчыма было засьведчыць бяз рызыкі памыліцца* (Мілан Юнгман пра Рудальфа Слобаду[6]).

Гэтым разам дырэктар на рыбалку відавочна не зьбіраўся, бо быў апрануты ў *парадную* форму малодшага сяржанта Дж.К.Адамса.
(Я падумаў, што пасьля вышэйсказанага, магчыма, варта было б падкрэсьліць, што імя насамрэч *нявыдуманае*.)
— Несяце мне заяву аб звальненьні? — спытаў ён адразу ж, як толькі я ўвайшоў у гэтую краму бытавой тэхнікі, якую некаторыя мае калегі па старой завядзёнцы яшчэ называюць *дырэктарскім кабінэтам* (прычынаў гэтага я лепш дашуквацца ня буду). І зусім ня мела значэньня, што ён сам паклікаў мяне і што, такім чынам, сам лепш мусіў ведаць, чаму я прыйшоў, — кожнаму настаўніку, што да яго заходзіў, ён задаваў гэтае

пытаньне абсалютна аўтаматычна, каб даць зразумець, што *ягонай* школе імя Ўладзіслава Ванчуры магчымы сыход пэўнага настаўніка ні сьвярбіць ні баліць, бо перад ейнымі дзьвярыма стаяць *дзясяткі іншых і* — само сабой зразумела — *лепшых*.
— Сядайце.
Я застаўся стаяць, бо хацеў адбыць гэты візыт як найхутчэй. Нашая варожасьць ужо даўно набыла адкрыты характар, таму й малодшаму сяржанту Дж.К.Адамсу гэта не падалося дзіўным.
— Гэты ваш артыкул пра Ванчуру… — сказаў ён задуменна, спрабуючы знайсьці яго на стале, але значная колькасьць конкурсных купонаў, рэклямных часопісаў і запрашэньняў узяць удзел у гульні *“Заплаці 100 — выйграй 1 000 000!”* ягоныя пошукі вельмі ўскладнялі.
— Мне здаецца, ён пад гэтай каробкай з блешнямі, — дапамог я яму. *Сапраўды* ён быў там.
— Ён мне не падабаецца, — сказаў ён наўпрост.
— Рады чуць, — сказаў я. — Гэта можа азначаць, што ён сапраўды добры.
— Ён ня добры!
— Чаму?
— Залішне пра Ванчуру.
Было ўсеагульна вядома, што імя гэтага *левага інтэлектуала* ў тытуле школы было бяльмом на дырэктарскім воку.
— Разумею.
— Вы перапішаце яго.
— Мяркую, што гэта было пытаньне. Адказ — не.
Ён зірнуў на каробкі з тэлевізарамі, відэамагнітафонамі й мікрахвалёвымі печкамі, што былі нагрувашчаныя ўздоўж сьцяны, быццам гэтыя аб’екты камэрцыі былі доказам ягонай літаратурна-гістарычнай кваліфікацыі:
— Я яго *сам* напішу!
— Але ведайце: музэй нацыянальнага пісьменства падасьць на вас у суд, — папярэдзіў я яго.
Ён паціснуў плячыма.
— Ані прэміі, ані даплаты вы *не дачакаецеся*.
— А калі прынясу чарвякоў?
Як я і чакаў, ён мяне выгнаў.
З “дырэктарскага кабінэту”.

Грошай мне — дзякуючы Кралу — ставала, але, як звычайна,

гэта было пытаньнем прынцыпу. Таму пасьля абеду я склаў крыху эмацыйна афарбаваную скаргу (…*разьмеркаваньне асабістых прэміяў і даплатаў у руках дырэктара Наскачыла ўсё часьцей робіцца прыладай, з дапамогай якой ён вырашае спрэчкі з апанэнтамі*…), якую я заказным лістом адаслаў доктару пэдагогікі Іржы Найману, дырэктару Адукацыйнай управы Прагі-5, вул. На Валянцінцы, 5. Зь ягонага адказу даслоўна цытую ўрывак: *“Пры абмеркаваньні з спадаром дырэктарам Наскачылам Вашай скаргі мне было паведамлена наступнае. Пры разьмеркаваньні прэміяў і дадатковых асабістых даплатаў спадар дырэктар усталяваў крытэры, якімі ён кіраваўся. Зь імі быў азнаёмлены пэдкалектыў. У поўнай кампэтэнцыі спадара дырэктара вырашаць і ацэньваць пэдагагічных работнікаў. Адукацыйная ўправа наўрад ці сваім рашэньнем можа разьмяркоўваць дадатковыя фінансавыя сродкі, ня ведаючы працы асобных настаўнікаў. А згодна з словамі спадара дырэктара, вы відавочна не выконвалі згаданых усталяваных крытэраў”.*
З прывітаньнем.

Удалая ўрачыстасьць (“Збраслаўскія навіны”, 7/1992, стар.2)

Пяцідзясятую гадавіну трагічнай сьмерці вялікага чэскага пісьменьніка Ўладзіслава Ванчуры, замучанага сьмерцю пяцьдзясят год таму нямецкім гестапа, адзначылі на памятнай урачыстасьці і вучні Сярэдняй школы імя Ўладзіслава Ванчуры. Дырэктар школы спадар Наскачыл у сваёй прамове падкрэсьліў вырашальнае значэньне амэрыканцаў пры вызваленьні нашай радзімы савецкай арміяй, а пра культурную праграму, як заўсёды, паклапаціўся школьны хор пад кіраўніцтвам настаўніцы сьпеваў спадарыні Хваталавай-Сукавай. Найбольшы водгалас мела ўжо традыцыйна ўлюбёная полька збраслаўскага кампазытара Яраміра Вэйвады “Шкада каханьня”, якую члены хору прасьпявалі ў сусьветна вядомай ангельскай вэрсіі “Roll on the Barrels”. Аднак сапраўдным пікам удалай урачыстасьці было заключнае выступленьне членаў мясцовай філіі “Military Car Club”, у якім з амэрыканскім вайсковым аўтамабілем маркі “Jeep” узяў удзел і дырэктар спадар Наскачыл.
Я лічу, што нашая асьвета актыўна абуджаецца.
Пэтар Піцька

2. Дадому я ішоў разам зь Ярамірам.
— Ці не вучыў ты калі Бэату Кралаву? — спытаўся ў ягоным.
— Гадоў гэтак шэсьць-восем таму?
— Вучыў, — сказаў ён, доўга ня думаючы.
— І якія ў яе былі посьпехі? Як у Агаты?
— Зусім не, — сказаў Ярамір. — Гэта была *дзясятаўніца*.

7 Ярамір Сломэк — чэскі крытык, галоўны рэдактар “Літаратурных навінаў”.

Каля Бэльвэдэру мы разышліся. Я працягваў свой шлях да *верхняй* школы, каб забраць дачку. Яна, дарэчы, магла хадзіць і ў *дольнюю* школу, дзе выкладаў я, але мы з жонкай хацелі прынамсі на гэтыя першыя чатыры гады абараніць яе ад нялёгкай долі *настаўніцкага дзіцяці*. (Сёньня — пісана ў студзені 1994 году — яна ходзіць ужо ў чацьвертую клясу, і зь верасьня мела б працягваць *у дольнай*, але, дарма што я там ужо не настаўнічаю, ёй, гаротніцы, *праз татаву пісаніну* давядзецца езьдзіць ажно ў Хухлі.)
Яна ўбачыла мяне яшчэ здалёк і пабегла насустрач. (Так, і мне ясна, што *дзевяцігадовае дзяўчо, якое бяжыць — матляючы коскамі, з ранцам за сьпінай — насустрач любаму татку* — з гледзішча літаратурнага рамяства вобраз у значнай ступені праблематычны, але, на жаль, я мушу на ім настойваць, бо часам мне падаецца, што ён нейкім дзіўным чынам ускосна зьвязаны з нашым сюжэтам.)
— Прывітаньне, — сказала яна, *пацалаваўшы мяне*.
Яна дагэтуль мяне не саромеецца.
Я зьняў зь ейных кволых плечыкаў цяжар падручнікаў:
— Прывітаньне.
Ейныя карыя вочы іранічна бліснулі:
— Ну, ці займае цябе, *як у мяне прайшоў дзень*?
Было зразумела, на што яна намякае: як *спэцыяліст*, я, безумоўна, ведаў, што абавязковае бацькоўскае пытаньне “Што было ў школе?” — адназначная пэдагагічная і псыхалягічная памылка, бо яно недапушчальна звужае багатую стракатасьць жыцьця да кола праблемаў школьнага навучаньня, але зь іншага боку, я дагэтуль ніколі не абцяжарваў сябе тым, каб пэдагагічна й псыхалягічна слушнае, але манатоннае ад нястомных паўтораў пытаньне *“Як у цябе прайшоў дзень?”* пашырыць да некалькіх, адрозных прынамсі з выгляду,

варыянтаў.
— Мне *сапраўды* гэта цікава, — сказаў я зь вінаватай усьмешкай. — Што Ржыга — усё яшчэ кахае цябе? Ці мо здраджвае табе з чарапашкай Ніндзяй?
Яна закаціла свае карыя вочы, але ўзяла мяне за руку. Я падладзіў свой крок пад ейны.
— Як абед? — спытаў я. — Калі я зноў буду пісаць нейкую пэтыцыю?
— Адбіўная, — сказала яна каротка. — Нармальна.
Я раздумваў, ці ня варта было б надаць нашай размове трохі больш паэтычны характар. Праз хвілю я сказаў:
— Ты ніколі ня думала, што вакацыі маюць свой *пах*?
Яна падазрона павярнула да мяне твар. Пэўна, нешта ў маім абліччы мне здрадзіла, бо яна сказала:
— Можаш не старацца, усё адно я ведаю, што *насамрэч* цябе цікавяць толькі адзнакі.
Яна адразу ж скарысталася сваёй імгненнай перавагай (у гэтым яна падобная да сваёй маці):
— Я купіла сабе “Бравічка” — нічога?
Я завагаўся.
— Нічога, — сказаў я ня надта шчыра. — Гэта твае кішэнныя грошы.
— Там ёсьць і песьні *па-ангельску*, — у ейных словах выразна праглядала імкненьне падкрэсьліць *пазнавальныя* вартасьці вышэйпамянёнага часопісу.
Мне прыгадаўся цэнтральны разварот *“Каханьне, сэкс і пяшчота”*, які мінулым разам дадушы мяне абурыў.
— Апроч усяго іншага, — сказаў я нападна.
Яна пачырванела *як півоня*.
Шаты, што застануцца назаўжды, — з надзеяй падумаў я, вырашыўшы яе больш ня мучыць.
— Джэксан упаў з другога месца ажно на дзявятае, — *хутка* паведаміла яна.
Я жахнуўся:
— І ты мне гэта проста вось так гаворыш?! На гэтым маё жыцьцё губляе ўвесь сэнс! А тваё?
— А вось гэтым ты мяне *страшэнна* выводзіш, — сказала яна. Наважанасьць, зь якой яна перайшла ад абароны да нападу, мне зноў нагадала ейную маці. — Што ты ўвесь час зь мяне толькі сьмяешся…

Я фанацею ад Майкла Джэксана і хацела б перапісвацца з нэграм, які да яго падобны (але не абавязкова). Мне 12 гадоў.
Міхаэла Ліпаева, вул.Сарторы, 29, 169 00 Прага-6. “БРАВА”

Перш чым я пайшоў да Бэаты, я перагартаў свае старыя выпіскі ды занатоўкі і пару зь іх узяў з сабой.
Ані Крала, ані Кралавай не было дома. Каву мне вельмі *неахвотна* зрабіла Агата.
— Што новага? — спытаў я.
— Разьдзелі голага! — дзёрзка адсекла яна.
— А акрамя гэтага, — сказаў я, — Майкл Джэксан упаў з другога месца на дзявятае!
— А чаго было чакаць? — адказала Агата і бразнула за сабой дзьвярыма.
Ну, з адной разабраўся, падумаў я. Цяпер на чарзе другая.

3.

І гэтым разам
яна на мой
грукат не
адрэагавала.

Ані пакой, ані Бэаціна поза супраць учорашняга дня не зазналі ніякіх зьменаў, толькі змрок у пакоі, беручы пад увагу хмарнасьць неба, трохі згусьціўся. Я прайшоў да пісьмовага стала і бяз словаў запаліў маленькую лямпу з галягенавай лямпачкай. Шрубавае пасоўнае крэсла, засунутае пад стол, я падкаціў да нафтабака, кінуўшы на яго тэчку з занатоўкамі. Яны ладна грымнулі, і Бэаціна галава на падушцы прыкметна тарганулася. Яшчэ жывая, падумаў я. У мяне не было ніводнай прычыны, каб гэтую *разбэшчаную прымадонну* неяк шкадаваць.
Лекцыю я пачаў з *“Правілаў для аўтараў-пачаткоўцаў”* А.П.Чэхава:
“Зрабіцца пісьменьнікам вельмі проста. Няма калекі, які б не знайшоў роўнага сабе, і няма бязглузьдзіцы, якая б не знайшла прыдатнага чытача, — цытаваў я. — *А таму не ўпадай у роспач… Пакладзі перад сабою паперу, вазьмі ў руку асадку і, раздражніўшы ўхопленую думку, хутка пішы. Пішы пра што*

хочаш: пра сушаныя сьлівы, пра надвор'е, пра стрэлку гадзіньніка, пра леташні сьнег… Калі ты напісаў, вазьмі рукапіс у рукі і, адчуваючы ў жылах сьвятарнае трымценьне, ідзі ў рэдакцыю. Потым ляжы дома на канапе, плюй у столь і цешся з сноў…"
Я памаўчаў.
— То ж бо, я мяркую, што ты ўжо нешта напісала? — сказаў я зьедліва.
Яна па-ранейшаму ляжала бяз руху.
— Дасі мне пачытаць?
Нічога.
— Шкада, — сказаў я. — Пруст кажа, што чалавек мусіў бы ведаць пісьменьніка толькі паводле ягоных кніг, але ні ў якім разе не асабіста. *Ніхто не знайшоў бы стварэньня менш падобнага да ягоных кніг, ганарлівейшага, манернейшага, пыхлівейшага й праблематычнейшага суразмоўцу*, піша ён літаральна. Баюся, што гэта датычыць нас *абаіх*…
Раптам над бакам зьявіўся ейны бледны, скамечаны твар.
— Пацалуй сабе сраку, — прамовіла яна павольна з узорнай дыкцыяй.
За астатнія сто пятнаццаць хвілінаў яна ня вымавіла ані слова.

Што да мяне, я як нічога ніякага (калі гэта можна так назваць) *за ейнай сьпінай* працягваў лекцыю згодна з сваім плянам. Азнаёміўшы яе з сваім блізу шасьцігадовай даўнасьці, аднак усё яшчэ *надзвычай наватарскім* аналізам *"Дамы з сабачкам"*, я скарыстаў яго як *ідэальны трамплін для эфэктнага і ўвадначас эрудыяванага раскрыцьця абсалютна ўсіх ключавых таямніцаў апавядальнага жанру*. Дарма што мой голас да самага канца не пакінула знакамітая сутаргавая годнасьць аратараў, якія мусяць скончыць сваю прамову, нават ведаючы, што іх ніхто ня слухае, я ня страціў пераканаьня, што на мяне, як ні дзіўна, *зважаюць* — я, вядома, маю на ўвазе разнавіднасьць ірацыянальнага пераканаьня, падобнага да таго, як калі жанчына на трэцім месяцы цяжарнасьці прамаўляе да відавочна глухога эмбрыёна, намаўляючы пры гэтым сабе і мужу, што іхны Давідка або Ітушка *безумоўна ўсё чуе*.
Калі сёньня, перапісваючы вышэйпрыведзеныя радкі, я зноў прыгадаў свой тадышні самотны маналёг, мне да галавы прыйшоў яшчэ адзін прыклад: гэта ж, зрэшты, тое самае, што і

пісаньне — бо, пішучы, я таксама пасылаю сказы некуды ў цемру… (Не палічэце гэта за скаргу; у рэшце рэшт, гэта значна лепш, чым пры пісьме мець перад вачыма, барані божа, твар гэткага Яраміра Сломка[7].)

Дакладна а восьмай я склаў свае занатоўкі і спусьціўся ўніз. Крал выйшаў з свайго кабінэту. У яго былі мяшкі пад вачыма.
— Усё было выдатна, — апярэдзіў я ягонае запытаньне. — Яна мне сказала, каб я пацалаваў сабе сраку.
Ён усьцешана засьмяяўся.
— Уголас, — дадаў я. — Колькі атрымаю?
Гэтым разам да яго дайшло.
— Я б хацеў з вамі перамовіцца, — папрасіў я яго.
Ён кіўнуў у бок кабінэту.
Спадарыня Кралава праводзіла нас заклапочаным позіркам.

Змрочную непрагляднасьць паўмэтровага стосу папераў на дубовым пісьмовым стале не магла ўтаймаваць нават цудоўная залатая лямпа. Крал падышоў да бару, і знаёмы пах скураных фатэляў зьмяшаўся з пахам шатляндзкага *“Glen Deveron”* дванаццацігадовай вытрымкі. Але я й ня думаў даць сябе зьняпэўніць.
— Давайце ўсё падсумуем, — сказаў я рашуча. — Учора і сёньня я прабавіў тут цалкам чатыры гадзіны.
Ён вычэкваў.
— На працягу гэтых чатырох гадзінаў вашая дачка адкрыла рот роўна двойчы. Цалкам яна сказала *шэсьць* словаў.
Для эфэкту я памаўчаў.
— Гэта нармальна, — сказаў Крал нібы нецярпліва. — На ўсё свой час.
Я нахіліўся да яго:
— Нармальна? За чатыры гадзіны сказаць шэсьць словаў — нармальна? Яна татальна мяне ігнаруе, ні пра які курс ня можа быць і гаворкі — і гэта нармальна? Як гэта?
— На ўсё свой час, — паўтарыў ён супакойліва. На ягоным загарэлым твары было мноства маленькіх зморшчынак.
— Зразумейце, — налягаў я. — Яна скажа *“Можаш не сумнявацца”* — а вы мне ўмэнт даяце дзесяць штук. Божа мой, што мне думаць пра гэта?

Ён адвёў вочы.
— Тады дайце мне хоць нейкае прымальнае тлумачэньне, на якое б я мог абаперці сваю схільнасьць да самападманаў, — папрасіў я яго. — Бо… Чорт, няўжо гэта праўда?
Ён засьмяяўся.
Я — не.
— Вы ўсё залішне драматызуеце, — сказаў ён. — У гэтай дзеўкі звычайны сплін. Разышлася з хлопцам — нібыта вы такога ня ведаеце… Яе толькі трэба крыху *падладзіць*.
Для мяне гэта была навінка.
— Падладзіць? Значыць, не *пісаць*?
— Можа, і пісаць, — сказаў Крал. — Там будзе відаць, што ёй дапаможа найлепш. Урэшце, вы ж спэцыяліст.
— Я? Я што, псыхоляг?
Спачатку мне хацелася сказаць *псыхіятар*.
— Вы вывучалі *пэдагогіку*, вы *пісьменьнік*, у вас *таксама* дачка… — пералічваў ён упэўнена. Усьміхнуўся. — Вы пра гэта ня ведаеце, але вы — пераможца майго таемнага конкурсу!
— Я?
— Мне што, трэ было запрасіць нейкую *настаўніцу*? Каб тая зжэрла яе жыўцом?
Слова *настаўніца* ён вымавіў зь непрыхаваным жахам.
Хто каго? — казаў я сабе.
— Настаўнік — гэта *прафэсія*, — ужыў ён вядомы жарт. — Настаўніца — гэта *дыягназ*.
Я ветліва засьмяяўся.
Цяпер да мяне нахіліўся ён:
— Я толькі хачу, каб яна сябе так ня нішчыла. Каб рабіла нешта *разумнае* — мне ўсё адно што. Каб хадзіла купацца ці там запрашала сяброваk на дні нараджэньня… Каб ня зналася з усякімі *сучынымі сынамі*.
— Сучынымі сынамі?
Ён толькі махнуў рукой:
— З адным некалі сустракалася.
Ён пра нешта думаў.
— Цяпер разумееце, чаго я ад вас хачу?
— Падобна, нейкай пэдагагічна-псыхалягічнай *абслугі*, — сказаў я. — У выкананьні *інжынэра людзкіх душаў*[8].
На шчасьце, ён мяне амаль ня слухаў.
— Проста каб яна не была няшчаснай.

(Пры ўсім сваім жаданьні я ня здолею пераканаўча й несэнтымэнтальна апісаць тую брылу бацькоўскай любові, якая заваліла гэтую ягоную фразу.)
Мы моўчкі пілі.
— Жыцьцёвае шчасьце… — урэшце сказаў я бязрадна. — Хіба гэтаму можна навучыць?
— А ці вы самі, — спытаўся ён хітра, — няшчасны?
Я задумаўся.
— Больш-менш не, — дапусьціў я.
— Вось бачыце, — сказаў ён трыюмфальна. — Карацей, пакажэце ёй, як у вас гэта выходзіць…

IV

1. — А калі гэтую царэўну-несьмяяну разьвесяліш, — спытала за сьняданкам жонка, — ці хоць аддадуць яе табе за жонку?
Яна *нязмушана* намазвала масла на грэнку. Я зірнуў на дачку: тая ўважліва слухала.
— Жонка ў мяне ўжо ёсьць, — сказаў я. — Буду патрабаваць *усё* каралеўства[9].

[8] Намёк на раман Ёзафа Шкворацкага “Гісторыя інжынэра людзкіх душаў”.

[9] Гульня словаў: *Крал* па-чэску значыць “кароль”.

Вэстыбюль станцыі мэтро “Сьміхаўскі вакзал”, што быў традыцыйным месцам збору на *пазаклясныя канцэрты*, радасна гуў. Тым часам як дзяўчаты на нязвычных абцасах няпэўна й бязмэтна курсавалі па плятформе (матляючы пры гэтым сваімі сумкамі, якія ім яўна заміналі), практычна ўсе дагэтуль прышлыя хлопцы бы пчаліны рой таўкліся вакол спадарычні настаўніцы Тракаржавай, што стаяла тварам да насьценнага аўтамата з прэзэрватывамі і з выразам піянера сэксуальнай асьветы *без фальшывае боязі* гучна выбірала найбольш надзейныя віды або прынагодна дапамагала выбіць назад захраслую пяцікронку. За выняткам каляжанкі Хваталавай-Сукавай, якая з жэстыкуляцыяй дырыжора вагнэраўскай “Пагібелі багоў” у нечым пераконвала пераляканага наглядчыка станцыі, усе чальцы пэдагагічнага суправаджэньня стаялі малой разгубленай грамадкай і, ухіляючыся ад поглядаў мінакоў, стараліся не зважаць на бразгат настойліва спустошванага аўтамата. Імкнучыся як мага хутчэй апынуцца адтуль як надалей, я ім толькі лёгка кіўнуў і ціха скамандаваў сваім вучням:
— Хадзем, — сказаў *я прыглушана*.
На грамадзкасьці я шторазу з пэўнымі цяжкасьцямі адшукваў свой *настаўніцкі* голас, бо — нават маючы колькігадовую практыку — я так і ня здолеў пазбыцца сораму перад фразамі кшталту *“Восьмая “В” — заходзім”*.
Дзьве ці тры дзяўчыны з маёй клясы каманду хоць і пачулі, але, калі ўпэўніліся, што ніякага шыхтаваньня пакуль не патрабуецца, каўзануліся па мне невідушчым позіркам і

працягнулі шпацыр. Я мусіў сказаць гучней:
— Ганка, Каміла! Сюды!
Сталая сямейная пара, што якраз праходзіла міма, імгненна спынілася, каб на ўласныя вочы пабачыць адзінкавы экзэмпляр *чэскага настаўніка,* прычым нават *у дзеяньні.* Іхная непадробная радасьць была вельмі падобнай да радасьці наведнікаў заапарку, якім пашчасьціла засьпець *павіяна чубатага* падчас кармленьня.
Ганка з Камілай прыдыбалі, як качкі, каб утварыць першую, безнадзейна самотную пару.
— Ладзя! — паклікаў я.
Ладзя неахвотна стаў за абедзьвюма дзяўчатамі. Забарона насіць на пазаклясныя канцэрты джынсы і ўвогуле ўсякія джынсавыя аксэсуары, штогод абвяшчаная настаўніцай Хваталавай-Сукавай, прынцыпова паўплывала на ягоны цяперашні строй: патрабаваныя цёмныя нагавіцы, дужа падобна, бацькавы, відавочна былі яму завялікія, і ён спрабаваў замаскаваць гэта тым, што максымальна зацягнуў скураную паляўнічую папругу. Праз нагрудную кішэню ягонай белай дэдэронавай кашулі прасьвечваў пачак прэзэрватываў маркі *“Wild Tiger”.*
— Восьмая “В” — заходзім!!! — зароў я ашалела.

У фае канцэртнай залі Гарадзкой бібліятэкі, запоўненым юнымі сябрамі клясычнай музыкі зь пяці праскіх школаў, перад пачаткам праграмы, складзенай з твораў Моцарта, стылёва луналі гукі *“Малой начной сэрэнады”.* Я адвёў сваю клясу ў адносна ціхі закуток каля мужчынскай прыбіральні, дзе правёў з вучнямі кароткую прафіляктычную гутарку, *адважна дакараючы* іх нягоднымі паводзінамі на Сьміхаўскім вакзале.
— Хто мае якія пытаньні? — сказаў я нарэшце, сьвядома імітуючы фразэалёгію й дыкцыю грознага падпалкоўніка Брабца.
— А ці можна слухаць плэер? — прагундосіла Яна, дэманстратыўна заціснуўшы нос вялікім і ўказальным пальцамі.
— Не. Яшчэ пытаньні?
— А калі мне Моцарт не падабаецца? — запратэставала яна.
— Мне таксама!
— І мне!

І хоць я добра ведаў, што бунт можна задушыць хіба ў самым зародку, я дазволіў сабе хвілінную нерашучасьць. Я павярнуўся тварам да залі, якая тымчасам пачынала запаўняцца: Хваталава-Сукава стаяла з прыплюшчанымі вачыма, зьлёгку абапёршыся на парапэт адной зь лёжаў. Было відавочна, што чарговага ўваскрашэньня музычнага генія яна чакае з надзвычайнай узрушанасьцю. На імгненьне я забыўся на сваіх вучняў і аддаўся вельмі прыватным уявам, што здарылася б, калі б у гэты момант нейкі элегантны мужчына ў белым парыку эпохі ракако падышоў да маёй каляжанкі і прашаптаў ёй, да прыкладу, слова *Бэртрамка*[10]. Беспахібна пад уплывам менавіта такіх уяўленьняў мной пачала авалодваць хвароба, для настаўніка найпадступнейшая, — *пэдагагічны нігілізм*.
— Так, — сказаў я, — якія *яшчэ* пражане не разумеюць Маэстра?
Гэта было залішне цяжка.
— Каму яшчэ гэта не цікава? — сказаў я іх мовай.
Лес рук.
— Добра, тады слухайце тое, што вам цікава.
Яны ня верылі ўласным вушам.
— Дык можна? — спытаў няўпэўнена Ўласьцік Лізанак. — Плэер?
Адзіны папулісцкі ківок зрабіў зь мяне героя дня. Зь пераможным крыкам яны пабеглі ў залю. З рукамі ў кішэнях я павольна ішоў сьледам за імі, аднак пры поглядзе на двух білецёраў у салідных гарнітурах *часоў першай рэспублікі* я жахнуўся ўласнай адвагі:
— Але толькі калі пагасяць сьвятло! — гукнуў я баязьліва, перайшоўшы на трушок.
Сьвятло пагасілі толькі часткова.
— Ня маючы нават васямнаццаці год… — прамовіла вядучая праграмы і *ўражана* паглядзела на Ўласьціміла Лізанка, які — з чорнымі навушнікамі на галаве — якраз прыцягнуў руку свайго суседа справа, каб зь ейнаю дапамогай лепш зымітаваць ігру на электрагітары, — ня маючы нават васямнаццаці год, юны Моцарт стварыў больш за *дзьве сотні* музычных твораў. Аднак большы розгалас, чым Моцартава надзвычайная працавітасьць, меў пранізьлівы піск ейнага мікрафона.
— Тццц! — засіпела ўвадначас колькі настаўніц. Яны стаялі ў абодвух праходах, і аб’ектам іхнай цікавасьці была найперш

глядзельная заля.
— Дзьвесьце музычных твораў. У васямнаццаць гадоў. Толькі ўявеце сабе, — паўтарала вядучая.
Вось і яно: *слушныя прыклады, бліскучыя ўзоры*.
Ізноў мы прымушаем іх *кленчыць ля падножжаў гнятучых помнікаў* (Зыгфрыд Ленц).
— Ціха!
Гэтым разам заўвага адрасавалася не маім гадаванцам, аднак яна вывела зь нірваны Хваталаву-Сукаву, якая расплюшчыла вочы і ўпершыню зафіксавала ня толькі той скандальны факт, што прыблізна траціна вучняў 8-й “В” клясы сядзіць у слухаўках, але перадусім тую невытлумачальную рэч, што іхны клясны кіраўнік, найхутчэй, як падаецца, пад уплывам нейкага наркотыку, скарыўся.
— Зараз жа зьняць! — прасіпела яна, зьвярнуўшы да подыюму поўны пакаяньня погляд.
Вядучая ледзь заўважна кіўнула.
— Моцарт ствараў музыку ясную, гульлівую, часта нават усьмешлівую, — сказала яна ясным, амаль гульлівым голасам.

[10] Віла ў Празе, дзе ў ейных гаспадароў Францішка

Ксавэра і Ёзафіны Душкаў нейкі час гасьцяваў Моцарт.

Загучаў прыклад.
— Зэлэны! — выгукнула Хваталава-Сукава, стараючыся не заглушыць музыкі. — Апошняе папярэджаньне.
Зэлэны зьняў з галавы навушнікі і, тэатральна выняўшы з плэеру абедзьве пальчыкавыя батарэйкі, засунуў іх сабе ў ноздры. Так ён мне крыху нагадаў пэрсанажаў "Зоркавых войнаў", але ў сваім манумэнтальным настроі я быў ахвотны ўважаць ягоны ўчынак за цалкам законны знак пратэсту супраць вясельля Фігара. Тым ня менш пантаміма маёй каляжанкі дазваляла меркаваць, што мы, відаць, разыходзімся ў ацэнцы ягонага ўчынку.
— Гэта музыка мэлядычна выразная, сьпеўная, музыка, поўная неапісальнае радасьці, спакою і душэўнае раўнавагі, — працягвала тым часам вядучая.
— Звара!
Гэтым разам уцьвелены голас належаў Ірэнцы. Звара на момант супакоіўся, але наступная ж музычная ілюстрацыя займела на яго надзіва натхняльнае ўзьдзеяньне: ён незаўважна абняў за плечы абедзьвюх сваіх суседак, якімі перад пачаткам канцэрту Ірэнка паспрабавала яго ізаляваць ад іншых праблемных вучняў, а затым зь нечаканым напорам апусьціў свае рукі на патрэбныя пару сантымэтраў ніжэй.
Дзяўчынкі з жахам ускрыкнулі.
— О блядзі́, о бляда! — выгукнуў Звара з сапраўды *неапісальнаю радасьцю*.
— Звара! — завішчала Ірэнка і, характэрна схіліўшыся, кінулася да парушальніка. І хоць я Звару разумеў досыць добра, бо й сам да дзявочых грудзей упершыню дакрануўся ў праскім плянэтары ў вельмі падобных варунках, я, тым ня менш, калі Ірэнка прабіралася міма, дараваў ёй погляд, поўны *шчырай таварыскай спагады*.
— Зэлэны ў мяне ўкраў касэту! — уголас паскардзілася Каміла.
— Ня ўкраў! — бараніўся Зэлэны. — Схаваў!
— Ціха! — запатрабавалі колькі настаўніц хорам.
Я згадаў Бэату, і гэтае патрабаваньне падалося мне

парадаксальным.
Вядучая прадэманстравала чарговы дыяпазытыў, але паглядзець на выяву мужа і жонкі Душкаў мне перашкодзіў надзьмуты прэзэрватыў.
І гэтак далей.
Мяне апанавалі сумневы.
Складнікам праграмнай сыстэмы *“Windows”*, у якой я пішу гэтую кнігу, апроч іншага ёсьць і функцыя *аўтаматычнага ўпарадкаваньня* (*Аўтаматычнае ўпарадкаваньне ацэняць усе пэданты і ўвогуле тыя, хто ня любіць хаосу.* Міхаэл Грушка, Windows 3.1) — ці не раблю я тое самае, калі ўвесь гэты хаос у ейнай галаве парадкую ў наглядныя разьдзелы?
Часам сумневы зьяўляюцца і ў астатніх: калі я пэўны час таму распавядаў Бэаціну гісторыю брненскаму выдаўцу і свайму сябру Марціну Плугачку, той не выглядаў цалкам перакананым:
— Нічога ня скажаш, гэтая *story* як гром, — разважаў ён. — Аднак, ці гэта ўвогуле можна — *пісаць* пра самагубства?
Я разумеў, што ён мае на ўвазе.
— Павінна быць можна!
Я захоплена выклаў яму пра мэтад *замоўчваньня*.

2. Кожны пэдагог, які па сканчэньні пазакляснага канцэрту вяртаўся ў наш кабінэт, звычайна нагадваў зьбітага вязьня, якога пасьля допыту прыводзілі назад у камэру; ягоныя рухі былі гэтаксама млявыя і пра яго адразу ж рупліва клапаціліся. Не інакш было гэтым разам і з намі: Ірэнка адразу ж абрынулася на крэсла, якое ёй своечасова падсунуў Ярамір, а Ліба ахвотна ўсхапілася паставіць ваду на каву.
— Яна́чак? — спачувальна прамовіла Ленка, наліваючы нам па чарцы бэхераўкі.
— Моцарт, — сказаў я. — А таксама Сукава і Тракаржава.
— Трасца, — дасьведчана выклікнуў Ярамір. — *Скампанаваная праграма*. Семдзесят пяць хвілінаў безь перапынку. І сьвятло ў залі.
— Выпі тады яшчэ, — паспачувала Ленка.
— І праблемы зь мікрафонам, — сказаў я. — Апроч усяго іншага.
— І з прэзэрватывамі, — прамовіла Ірэнка.
Дадала тлумачэньне.

— Вы сваё перажылі, — прызнала Лібушка.
— Але зь іншага боку, — паволі сказаў Ярамір, і ў яго зайскрыліся вочы, — вы дакладна не віселі сорак хвілінаў уніз галавой на гімнастычных колцах, як калега Стршыбрны. Пасьля гэтай навіны аджыла нават Ірэнка.
— Што?!
— Дзевяціклясьнікі, — дапусьціў я.
— Прывязалі яго за шнуркі і падцягнулі пад столь, — удакладніла інфармацыю Лібушка.
— І разгайдалі, — дадала Ленка.
Я зь недаверам паглядзеў на Яраміра, але той кіўнуў:
— Зранку задаў ім кантрольную, — сказаў ён. — Па кажанох.

Камічна. *Вучні й настаўнікі*[11].
“Табе гэта трэба?” — казала часам Бэата, калі я, так бы мовіць, *шуткаваў*.
Аднойчы яна зачытала мне з Анаіс Нан: “Мне было за ягоны аптымізм, за ягонае імкненьне ўсё ўладзіць”. Ці мне гэта трэба? Урэшце, чаму ў мяне кожны раз твор намер шторазу абяртаецца ў гратэск? Відаць, адгэтуль аглядкі на чытача — гэта я называю *сындромам* ведаеце: гэты вечны абавязак клапаціцца пра гаспадыню забаву. *Напраўду на вас з таго акна ня дзьме, спадарыня Цуржынава? Ці ўсе маюць што піць? Ці ўсім ёсьць з чаго сьмяяцца?*
Рабіць настрой. Не гаварыць пра хваробы. У мяне гэта адклалася зь дзяцінства: *Будзьце зь дзядулем ласкавыя — у яго ж гэтая пухліна. Старайцеся яго трохі разьвесяліць — можаце яму, прыкладам, распавесьці, як у вас упаў самакат у памыйнік… Чакаеце гасьцей, а жонка пырнула вас нажніцамі ў шыю? Скажэце, што парэзаліся пры галеньні…* Мне відавочна не стае адвагі, каб сказаць праўду, і таму я салодка маню. Я ганебна баязьлівы, бо ў мяне няма сьмеласьці пазбавіць некалькі тысячаў стомленых рабачаёў апошняй кроплі гумору. Вось я й блазную і дадаю надзеі, як сьмятанкі ў занадта горкую каву: *Кажаце, самагубства? Але ў астатнім гэта быў суцэльны прыкол.*
Аднак я забягаю наперад.

[11] **“Вучні й настаўнікі” — гумарыстычная кніжка Ярослава Жыка (1906—1960).**

Я скарыстаўся бесклапотнай весялосьцю, якая запанавала ў кабінэце пасьля весткі пра пакуты Стршыбрнага, і як бы між іншым паведаміў сваім калегам пра сваю *падпрацоўку*; больш адкладаць было нельга. Жадаючы, каб маю навіну як найлягчэй *праглынулі*, я прэзэнтаваў сваю новую працу як больш-менш стандартнае рэпэтытарства, але нават так жаданага выніку ня выйшла.
— Крала? — прамовіла Ірэнка, шчыра жахнуўшыся. — Гэтага *мафіёзі*? Гэтага *курвяля*?
— Ах, кволасьць, — лагодна сказаў Ярамір, — тваё імя — жанчына.
— А хіба не? — баранілася Ірэнка.
— Мафіёзі, — сказаў я. — А як пазнаць мафіёзі?
— Лёгка. Калі нехта мае — толькі тут, у Збраславе — дзьве вінарні, два гатэлі й бардэль у Забягліцах, тады лёгка. Ясна, адкуль тут могуць быць грошы.
Ейная абазнанасьць у збраслаўскіх справах традыцыйна зьдзіўляла.
(У гэтым месцы хачу нагадаць пра сваю дамоўленасьць з Кралам і падкрэсьліваю, што прыведзены сьпіс нерухомасьці наўмысна перакручаны.)
— Тут ёсьць бардэль? — шчыра падзівілася Лібушка. — Дзе?
— У Забягліцах, — прамовіла Ленка.
Ірэнка не ўсьміхнулася.
— Ірэнка, — сказаў Ярамір. — Ты можаш адрозьніць брудныя грошы. Гэтага ня можа нават спадар прэм'ер…
— Я — магу, — прамовіла Ірэнка пераканана. — У мяне на іх нюх.
Пасьля гэтых словаў яна выправілася на абед.
— Я толькі хацела… — ужо ў дзьвярох клапатліва павярнулася яна да мяне. — Толькі каб ты з гэтым гэбістам не *пагарэў*…

Я ня меў часу глыбей абдумаць ейнае паведамленьне, бо Ленка зь Ярамірам адразу ж зацягнулі мяне ўва ўспаміны пра *ўзорную вучаніцу* Бэату Кралаву: зь ейнай меншай сястрой яе, маўляў, параўнаць нельга. Ярамір нават адкапаў фатаздымак з навучальнага году 1983/84 — ёй тады было гадоў адзінаццаць: яна сядзела ў першым шэрагу, у белай блюзцы з карункамі, склаўшы — відаць, на наказ фатографа — рукі на каленях сіняй джынсавай спадніцы (гэта была тая вядомая агрэсіўная

джынсавая сінеча, што ўтвараецца на каляровых фатаздымках празь невысокую якасьць стужкі). На загарэлых нагах у яе былі белыя шкарпэткі й заношаныя дзіцячыя сандалікі. Я адчуў нейкае мімалётна няпэўнае, усьцешлівае замілаваньне.
— Лялечка, — сказаў Ярамір.
— Сапраўды ў гэтых Забягліцах ёсьць бардэль? — спытаў я, бо жыў блізка адтуль.
— А ліха яго ведае, — сказаў ён. — Але ж пэўна гэта не гастраном.
Я пашыбаваў за Ірэнкай у школьную сталоўку. На асфальтавай дарожцы перад школай дзевяціклясьнікі бегалі шасьцідзесяцімэтроўку, і я адразу адзначыў сабе прысутнасьць Доўбка. Настаўніца Андзелава стаяла ля фінішу з сэкундамерам у выцягнутай руцэ.
— Прывітаньне, Гелена.
— Прывітаньне, — змучана адказала яна. На абодвух перадплеччах у яе красавала зь дзясятак наручных гадзіньнікаў, і калі яна ўзьняла руку, зрабілася падобнай да сумнага вулічнага рэгулявальніка. Доўбэк нарэшце прыспрынтаваў і зь сіпеньнем паваліўся на ўгрэтыя прыступкі да астатніх хлапцоў. Я падышоў да іх: яны былі спатнелыя й запыленыя, і ў многіх зь іх — насуперак дыплёмным працам пра вучнёўскія трэніровачныя ўборы — з чырвоных спартовых трусоў вызіралі зморшчаныя пэнісы. Яны зірнулі на мяне зь недаверам.
— Я прыйшоў зь мірам, — сказаў я, — да свайго чырванаскурага брата Доўбка.
Я зірнуў на ягоны пах:
— І да ягонай чырванаскурай машонкі.
У іхным сьмеху я прачытаў для сябе надзейнае абяцаньне, што, магчыма, мне не давядзецца бавіць заняткі падвешаным пад стольлю спартовае залі.
— Пра што базар? — спытаў Доўбэк, заправіўшыся.
— Пра *разьвітальную прамову*, — нагадаў я яму. — У нас няшмат часу.
— А-а, ну так, — прыгадаў ён. — Я напішу…
— *Напішаш*? Ты казаў, што ўжо напісаў.
— Ну, практычна так, — супакоіў ён мяне. — Парадак — я яе *дапішу*.
— Дык калі ласка, — сказаў я, — калі ласка, *дапішы* яе.

Ірэна ўжо сыходзіла, таму я хоцькі-няхоцькі мусіў падсесьці да Стыва. Падобна, дзень у мяне сапраўды не заладзіўся.
Стыў у нас выкладаў ангельскую мову, бо ў 1991/1992 навучальным годзе амэрыканскіх лектараў за выкладаньне ангельскай мовы ў турму яшчэ не саджалі[12]. Мне ён быў цалкам сымпатычны (*Люблю амэрыканцаў, бо яны здаровыя і аптымістычныя.* Франц Кафка), але зь іншага боку, у мяне ў ягонай прысутнасьці заўжды толькі паглыблялася пачуцьцё маёй моўнай непаўнавартасьці, ня кажучы ўжо пра тое, што ягоныя бліскучыя белыя зубы выклікалі ўва мне бог вед чаму неадчэпную неабходнасьць праяжджаць языком па амальгамавых плёмбах. Вось жа, з памянёных прычынаў я яго хутчэй пазьбягаў, але гэтым разам уцякаць не было куды.
— Прывітаньне, Стыў, — сказаў я яму сваёй *зброкаўскай* ангельскай мовай. — Як маешся?
Ён адказаў, што маецца файна. Потым нешта казаў пра канцэрт, пра спозьнены самалёт і крэмы для загару. Я сказаў, што моцныя крэмы для загару сёньня *unfortunately* не патрэбныя, бо ў небе дзірка. Ён дапытліва зірнуў на мяне і сказаў, што ў тым сэнсе, што ад дзевак можна чакаць чаго заўгодна — маўляў, ці разумею, што ён мае на ўвазе. Я адказаў, што, аднак, у кожнае хмары ёсьць срэбраны (што было адной з трох ангельскіх прыказак, якія я памятаў). Ён крыху няўпэўнена пагадзіўся. Я за раз праглынуў два кнэдлікі і зазначыў, што сёньня *unfortunately* вельмі горача. Ён зьдзівіўся, што я так сьпяшаюся. А я адказаў, што я *unfortunately very busy*.
Ніколі ў жыцьці я не зьядаў абеду так хутка.

Можаце не сумнявацца, што гэты амэрыканец тут не як аздоба. Інакш кажучы: “Ня ў солі соль мастацтва” (Ян Забрана).

Яшчэ зацем. Летась у Гамбургу я выпытваў у Карла Трынкевіца[13] між іншым пра тое, як ён глядзіць на ўжываньне цытатаў у сучаснай прозе. Пазьней ён мне даслаў сваё эсэ *“Пра постмадэрнісцкі раман”*, дзе адзначыў вось гэтую цытату з Раляна Барта: *“Ніколі не бывае ніякай арыгінальнасьці. Мы жывём у пэўнай разнавіднасьці вялікага абмену, у вялікім*

12 У 1993 годзе ў Нэхіі за крадзеж трапіў амэрыканскі лектар Дэвід Стотлер, які ў выніку адбыў пакараньне ў турме.

міжтэкстоўі. Ідэі цыркулююць, мова таксама. Адзінае, што мы пры гэтым можам учыняць і да чаго звыкнуць, — гэта іх камбінаваць. І ўсё ж адна ідэя не вытворная: яна тут як пэўная разнавіднасьць вялікага рынку ў вялікай эканоміцы. Думкі цыркулююць і толькі ў пэўным імгненьні спыняюцца, параўноўваюцца — і адбываецца, прыкладна як у фільме, мантаж, выходзіць твор".
Ну, вось бачыце.

3. Дома я паклаў на месца свае занатоўкі пра літаратурную творчасьць і паспрабаваў дзеля разнастайнасьці знайсьці нейкія мудраслоўі пра жыцьцёвае шчасьце. *Шчасьце — гэта мастацтва быць задаволеным* (Бэргман).
І іншыя.
Да Кралаў я літаральна поўз, бо пякло сапраўды страшэнна.
Агата з мной па-ранейшаму не размаўляла.
Ейных бацькоў дома не было.

У мансардным пакоі адбылася адзіная заўважная зьмена: тут запахла віном. Я сфакусаваў погляд у змрок: бутэлька стаяла на начным століку. Бэата была прыкрытая толькі скамечанай прасьціной; я пакуль ня быў стопрацэнтна ўпэўнены, але мне здавалася, што яна голая. Пярына ляжала на падлозе ля ложку. Гэтыя акалічнасьці мяне крыху нэрвавалі, і я разважыў лепш не запальваць сьвятла, адно падкаціўшы ў крэсьле да кніжнае шафы, нібыта карэньчыкі пераважна добра вядомых мне кніг, да якіх я цяпер датыкаўся кончыкамі сваіх пальцаў, гэтае маё напружаньне бясьпечна маглі *зазямліць*. Я доўга раздумваў, як увогуле пачаць, пакуль праз брак лепшых ідэяў ня вымушаны быў скарыстацца ўчорашнім Кралавым запытаньнем: ці я няшчасны? Больш-менш не. Тады проста пакажу ёй, як гэта ў мяне выходзіць.
Я імкнуся *ўва ўсім бачыць добрыя знакі* (Доктараў).
Імкнуся *любіць жыцьцё больш, чым ягоны сэнс* (Дастаеўскі).
Імкнуся *аддзяляць ад ужо пражытых гадоў устаноўленых* [13] *звычак і жарсьцяў, якія магу ўважаць для сябе за* [13] *паказальныя, і дбаю пра іх перадусім дзеля таго, каб* [13] *якое я выбраў, прыносіла мне радасьць* (Пруст).
Імкнуся не губляць пачуцьця гумару, таму што *тое* [13] *можа нас замірыць з гратэскам жыцьця* (С.Е.Лец).

[13] **Кароткі тэрмінавіц Трынівіц (1931) — польскі крытык, тэарэтык літаратуры,**

датуль, пакуль чалавек можа рагатаць, ён у бясьпецы (Кінік).
Імкнуся выконваць пэўныя правілы, бо *правілы — ваята ідыса, што мы маем* (Голдынг).
Імкнуся *прымаць кожнае вытлумачэньне сьвету, якое ўядзе да дабрыні* (Шымэчка), і не імкнуся чытаць і разумець усё, бо *недастатковая адукаванасьць можа быць і крыніцаю моцы й спакою* (Італа Звэва), пагатоў *усяму, што чалавеку трэба ведаць, ён навучыўся ў дзіцячым садку* (Фулгам).
Імкнуся *любіць сябе* і імкнуся як найхутчэй забыцца, за якую партыю галасавалі б некаторыя мае сябры.
Імкнуся не купляць лятарэйных білетаў і не гуляць у “Кола фартуны”.
Імкнуся піць так, каб разьняволіцца, але ня зьнішчыць сябе.
Імкнуся пазьбягаць баляў і гандлёвых цэнтраў.
Імкнуся ня надта азірацца ў мужчынскай саўне.
У пачакальні да стаматоляга аддаю перавагу расповедам тупых анэкдотаў перад показкамі пра рэзэкцыю.
У жыцьці я раблю гэтаксама.
Нарэшце я ёй — як увайшоў у стос — раскрыў і той найрафінаванейшы хітрык, як урваць крыху таго шчасьцейка: *Самаахвяраваньне, самаабмежаваньне. Калі ня можаш уратаваць сябе, імкніся ўратаваць іншых*.
Паказушны манэўр найпранырлівейшых эгаістаў.

[14] Цытата з чэскай народнай казкі пра сьціхлівую прынцэсу.

Мне хапіла няпоўных сарака хвілінаў, каб з дапамогай двух дзясяткаў цытатаў разьвязаць чыста ўсё: распад народных каштоўнасьцяў, нарастаньне адчужанасьці, кульк і ніжэйшаньня, крызыс сям’і, страту Бога і страту самасьвядомасьці, — і ўсё мне засталося дзесяць хвілінаў на падсумаваньне і паўтарэньне. Гэта была *ўзорная* лекцыя.
Я быў сабой задаволены.
— Амэн, — прамовіла Бэата.
Яна была ўжо ладна ўпітая, і я яе адно *нудзіў тым, што паўтараў ёй разумныя рэчы* (Сол Бэлаў).

Працягваць ня мела сэнсу. Шторазу, калі яна цягнулася па бутэльку, прасьціна зь яе падала. Урэшце яна нават не абцяжарвала сябе тым, каб зноў прыкрывацца, што, аднак, зусім не было какецтвам, а (падобна як у выпадку зь яе

льсьністымі ўскудлачанымі валасамі) асэнсаванай, дэманстратыўнай абыякавасьцю. Усе позы, якія яна ў ложку займала, былі толькі а толькі *мэтавыя* — каб вызваліць пераляжалыя рукі, каб абаперціся сьпінаю на сьцяну, каб дастаць віно, — і тым, што пры гэтым яна адкрывала перада мной *усё*, яна толькі паказвала, як ёй глыбока пляваць на маю непажаданую прысутнасьць.
Раз яна нават гучна пусьціла газы, ані не ўзнагародзіўшы мяне вінаватай усьмешкай.
Мой нос поўніўся зьнявагай.
Я не стрываў:
— Пах жанчыны, — сказаў я зь непрыхаванай пагардай.
Гэта яе літаральна разьюшыла:
— Дык валі адсюль! Чуеш? Валі! Ніхто не прасіў, каб ты тут тырчэў!
Нягледзячы на яе дзікі напор, адной часткай сваіх думак я заставаўся надзіва спакойны. Колькі словаў адразу, божа мой!
— казаў я сабе амаль радасна. У Крала ніякіх грошай ня хопіць.
— Думаеш, мне цікава слухаць тваю настаўніцкую балбатню?
— крычала Бэата. — Яна мне яго ня верне!
Каго гэта? *Сучынага сына*?
У прыпадку плачу яна абрынулася на ложак.
Божачкі мае, мы плачам!
Яшчэ імгненьне яна ўсхліпвала, а потым заснула. На ейных засьмяглых вуснах засохлі чырвоныя кропелькі віна.
Сытуацыя была, мякка кажучы, нязвыклая.
Хоць з мной, як і з кожным, цягам майго досыць небагатага эратычнага жыцьця пару разоў здаралася, што дзяўчына, прыўзьняўшыся на ложку на локцях, цэліла ў мяне смочкамі сваіх грудзей, але ніводная зь іх пры гэтым не пазірала *зь нянавісьцю*. Пазіралі *замілавана*, *какетліва*, *звычайна* або (у двух жалюгодных выпадках) *пазабаўлена*, але *зь нянавісьцю* — аніколі. Гэтае дагэтуль непазнанае перапляценьне аголенасьці й нянавісьці заняло мае думкі на доўгія хвіліны.
Яна слаба застагнала.
Я падняў вочы і зь зьдзіўленьнем заўважыў, што яна лашчыць сябе ў паўсьне.
На адшморгнутай посьцілцы заблішчэла маціцовая вадкасьць.
Мая цікавасьць да філязофскіх аспэктаў перапляценьня прыгажосьці зь нянавісьцю ў значнай ступені падупала.

У яе было суха ў роце. Яна сутаргава хапянула паветра і прахапілася. Гэтым разам маю прысутнасьць яна сабе адзначыла зь зьмяшанымі адчуваньнямі, на ейным абліччы адбівалася як расчараваньне, так і радасьць — падобна, мусіць, выглядае чалавек, якога дома ахопіць неадольны апэтыт на марозіва з долькамі садавіны ды з узьбітай сьмятанкай і які ў маразільні зь зьдзіўленьнем натрапіць на паўрасталае эскімо.
— Хадзі сюды, — сказала яна.
Прыдушаны голас. Вы ж уяўляеце.
Яна мне ўжо вызваляла месца каля сябе.
— Не-не, — адказаў я.
Мне страшэнна бракавала якой-небудзь прыдатнай цытаты.
— Ідзі! — зноў прамовіла яна.
— Не-не, прынцэса, — сказаў я. — Я вам пантофліка не завяжу[14].

Крал прыехаў толькі пераапрануцца. Кіроўца нават не выключаў матору.
— Мне трэба з вамі пагаварыць.
— *Зноў*?
Гэта гучала незадаволена. Не магу сам даць сабе рады? Чаму я ўвесь час мушу яго турбаваць?
— Я страшэнна сьпяшаюся, — адмахнуўся ён ад мяне.
— Гэта зойме тры хвіліны.
— Не магу.
— Дзьве хвіліны!
— Заўтра, — сказаў ён у дзьвярах, — заўтра можаце з мной гаварыць хоць гадзіну.

Я разьвітаўся з спадарыняй Кралавай і пашыбаваў дадому.
У двары я натыкнуўся на Пэтрыка з Іржыкам. *Рабром мезенца* правай рукі яны без асаблівых цяжкасьцяў разьбівалі цагліны.
— Ён быў гэбістам? — спытаў я ў іх, каб нешта сказаць.
Гэтае пытаньне іх надзвычай пацешыла.
— Не, — сьмяяўся Іржык. — Дысыдэнтам.
Шчыра кажучы, у той момант мяне гэта ня надта займала. Хутчэй мне трэ было зь некім падзяліцца. Я ім завуалявана абмаляваў свае папярэднія цяжкасьці з Бэатай.
— Дык у чым праблема? — спытаў Пэтрык. — Хоча маўчаць —

хай маўчыць, хоча патрахацца — ну й трахні яе.
— І гэта мне кажаш ты… — запярэчыў я, — той, хто мусіць яе ахоўваць?
Ён па-сяброўску пляснуў мне па клінох. У мяне з вачэй пырснулі сьлёзы, але яны чакалі на жарт.
— Я ведаю, — сказаў я. — Не ад *гэтае* зброі. Гэта не ўваходзіць у вашыя абавязкі…
Цяжар гумарыста.

4. Я вярнуўся дадому. Здаецца, я прывітаў сабаку й пацалаваў на ноч дачку (яна клалася спаць якраз у той час, калі я вяртаўся ад Кралаў, так што гэта досыць верагодна). Затым мы з жонкай найхутчэй заварылі сабе гарбаты і селі праглядаць каталёгі розных турыстычных фірмаў — дзякуючы Кралавым грашам гэтымі днямі мы вырашалі, куды паедзем у адпачынак. Гэтым заканчваюцца мае здагадкі — далей я цалкам дакладна памятаю, што хацеў правесьці як мага *спакайнейшы вечар у коле сям'і*, што мне мо і ўдалося б, калі б мая разьвярэджаная памяць безупынна не бамбардавала мяне вельмі *плястычнымі* малюнкамі самалашчаньня дзявочага цела.
Як прабіла поўнач, нехта хутка пазваніў у дзьверы.
Жонка ўжо спала. З-за фіранкі я агледзеў вуліцу: Кралава налякаваная “аўдзі” стаяла пад самымі нашымі вокнамі. Ля дамафона чакаў Пэтрык, рукой я яму паказаў, каб ён падняўся наверх.
Як толькі ён увайшоў, я прыпёр яго тварам да сьцяны і бяз словаў сымбалічна абшукаў (імгненьне я вагаўся, ці сапраўды забраць у яго пісталет, але я баяўся з гэтай штукай як-колечы маніпуляваць).
— Апранайся, — сьмяяўся ён прыдушана. — Паедзеш з намі.
— Куды?
Ён адно па-змоўніцку пазіраў.
— Калі толькі ў цябе няма ордэру на мой арышт, нікуды не паеду, — сказаў я.
Аднак я ўжо апранаўся. Я зусім не ўяўляў, навошта мне некуды ехаць, але я ведаў абсалютна дакладна, што ехаць хачу.
Маё нядаўна яшчэ аселае настаўніцкае жыцьцё ператваралася ў незвычайныя прыгоды.
— Буду ёй чытаць казку на ноч?
Пэтрык адно пасьміхаўся:

— Джынсы не падыдуць, — сказаў ён. — Апранай што прыстойнейшае.
Дзьверы я замыкаў як мага цішэй.
Ноч была цёплая. Крал прагульваўся ля машыны.
— Я абяцаў вам размову, — сказаў ён.
Я зірнуў на гадзіньнік.
— Ну, гэта не было так тэрмінова…
Ён іранічна ўзьняў бровы:
— Дык вы ўжо ня хочаце даведацца пра гэтую *страшэнную таямніцу*?

Лімузын амаль бязгучна сьлізгаў па цёмных вуліцах. Фары выхоплівалі дрэвы ў навакольных садох. За паваротам зьявіўся чорны масіў вэлтаўскай лагчыны. Я прасунуў руку ў акно і паклаў яе на дах: ён быў прыемна халодны.
— Купальская ноч, — сказаў я. — У вас усё добра зрэжысіравана.
— Сёньня? — шчыра зьдзівіўся Крал, падобна, ён гэтага сапраўды ня ведаў.
Пэтрык прыбраў хуткасьць: мы зьяжджалі на пляц. Я паклаў галаву на мяккі падгалоўнік. Крал выцягнуў з нагруднай кішэні пінжака пазалочаную біклажку: глынуў і падаў мне. Я адпіў — гэта было ягонае ўлюбёнае шатляндзкае віскі — і вярнуў пляшку яму.
— Дзяўчаты скачуць цераз вогнішчы, — прамовіў я. — Расчыняюцца поўныя скарбаў пячоры, а глыбока ў цёмных лясох расьцьвітае залатая папараць-кветка.
— Лухта, — сказаў Пэтрык з сумневам.
Я чакаў, што ён паверне налева ў Прагу, але ён павярнуў назад да Збраслава.
Мы ехалі ў Забягліцы.
— Я б яшчэ глынуў, — сказаў я.
Яны засьмяяліся.

Гатэль *“Вэлтава”* з шашы выглядаў крыху закінута, але, на маё зьдзіўленьне, стаянка перад уваходам была амаль поўная — пераважалі машыны зь нямецкімі нумарамі. Над дзьвярыма на дзьве палавіны, дакладна ў тым месцы, дзе на доме маіх добрых, працавітых бацькоў вісіць іржавая конская падкова, тут

быў падвешаны бачны здалёк чырвоны ліхтар.
Крал пазваніў і назваўся ў дамафон.
Знутры нехта адразу ж адчыніў.
Я быў у пастцы.
Прысутны пэрсанал *па-сяброўску* вітаў Крала. Пэтрык ад нас адышоўся, каб паздароўкацца зь нейкім бамбізам у ліўрэі.
— Не дурыце, — сказаў я Кралу спалохана, — я *гуманістычна арыентаваны* пісьменьнік. Мой абавязак — *кляймiць* дамы распусты, а не *наведваць*.
Ён мяне зусім ня слухаў, бо на хаду за нешта ўшчуваў сталага мужчыну, які абслугоўваў гардэроб, таму я рад-нярад мусіў ісьці сьледам за ім. Пры гэтым я марна спрабаваў прыгадаць, ці не належаць майткі, якія былі на мне, да той жахлівай *ружовай сэрыі*, якую мая жонка стварыла пасьля апошняга мыцьця.
У салёне, у адрозьненьне ад асьветленага холу, панаваў інтымны паўзмрок: я прыкмеціў маленькі, але *жывы* аркестар, сталы з ружовымі лямпамі, занятыя ледзь напалову, і адзіную пару на асьветленай шкляной танцавальнай пляцоўцы. *Дзяўчаты* былі надзіва юныя й выглядалі па-над усімі чаканьнямі добра.
Крал зноў узяў мяне пад сваю апеку. Мы селі ля бару — з высокіх услонаў было добра відаць *усё, што дзеялася вакол*.
— Чаго спадарства жадае? — ветліва спытаўся бармэн.
Крал моўчкі прапанаваў мне першым зрабіць замову.
— Гарачы бутэрброд з сырам, — сказаў я, — і двайная картопля-фры.
Бармэн зірнуў на Крала.
— А вы гумарыст, — сказаў Крал.
Ён замовіў шампанскае.
— У мяне зранку першы занятак, — папярэдзіў я яго. — У сёмай “Б”. Я тут не магу застацца надоўга.
— Бяз панікі.
Ён зірнуў на адну зь дзяўчат.
— Тут *шась-шась* — і гатова… — пажартаваў ён.
Я зухавата засьмяяўся, але маё *зухаватае* сэрцайка ад такой *адкрытасьці* панеслася, як спалоханы птах.
— А дзе пакоі? — пацікавіўся я. У мяне чамусь было адчуваньне, што ў *дадзеным кантэксьце* маё пытаньне прагучыць калі не *франтавата*, дык прынамсі *рашуча*, але, зірнуўшы на Крала, я зразумеў, што пытаньне папросту *дурное*.

— Дзе ж ім быць? — ён махнуў рукой у бок шырокай лесьвіцы, па якой якраз спускалася адна з параў. — Наверсе.
Толькі цяпер да мяне дайшла жахлівасьць усёй сытуацыі. І яшчэ я заўважыў, што жанчына на танцавальнай пляцоўцы гадоў на трыццаць старэйшая за свайго пагляднага юнага партнэра.
Крал з усьмешкай узьняў келіх, і мне давялося зь ім выпіць за *посьпех курсу*.
Ён пільна глядзеў на мяне.
— Нешта ня так? — спытаў ён праз імгненьне.
— Што тут можа быць ня так? Зусім не, — сказаў я. — Проста адзін збраслаўскі настаўнік сядзіць апоўначы ў бары ў адным збраслаўскім публічным доме. Усё нармальна.
Тракаржава б за мяне парадавалася, падумаў я.
— Вы залішне азіраецеся на сваю прафэсію.
Я нязгодна паціснуў плячыма.
— Хіба настаўнікі не займаюцца сэксам? — сказаў Крал.
Мяне правакавала тое, што ён ані крыху не адчувае ніякай адказнасьці за тое, што зацягнуў мяне сюды.
— Гэта няправільнае пытаньне, — сказаў я. — Яно не закранае ядра праблемы.
— Як жа тады гучыць правільнае? — спытаў ён зь лёгкай крыўдай.
Спрачацца зь ім не было сэнсу.
— Правільнае? Ну, напрыклад, *якую палітычную пазыцыю займае міністар адукацыі*? — сказаў я. — Можа, не зусім правільнае, але безумоўна дакладнейшае.
Напружаньне спала. Аднак тая *натуральная, цярплівая непасрэднасьць*, зь якой русавалоска за столікам насупраць дастала для нямецкага суразмоўцы свае грудзі з дэкальтэ, мяне зноў жахнула.
Нейкі час мы моўчкі пілі.
З твару маладога танцора на пляцоўцы не сыходзіла ўсьмешка.
— Гаворка ня толькі пра *настаўніцтва*, — сказаў я праз імгненьне. — Я тут проста *зусім* чужы. Я ветлівы, добра выхаваны хлопчык. Я нічога не падымаю зь зямлі, таму што гэта *кака*. Не засоўваю нажа ў рот. Калі жонка, памыўшы посуд, ня выпусьціць з мыйні ваду, мы паўгадзіны спрачаемся, хто ў гэтую халодную тлустую гразь засуне руку.
Дзеўчыніны грудзі вярнуліся назад пад сукенку. Немец спаў,

паклаўшы галаву на стол. Кельнэр зноў высыпаў у русавалоскі папяльнічку.
— Публічны дом таксама *кака*, — сказаў я. Мая артыкуляцыя ўжо не была бездакорнай (калі я напіваюся, у мяне бываюць праблемы зь міжвольным устаўляньнем пратэтычнага *г*).
— Я, відаць, той нясьмелы марак, які заўжды адстаіць у чарзе, а потым ня йдзе, — разважаў я ўголас.
— Усё ў парадку, — сказаў Крал. — Ніхто цябе ні да чога не прымушае.
Зразумеўшы, што перайшоў на ты, ён мне сказаў, каб я называў яго *Дэніс*.
— Добра, Дэнісе.
Шампанскае было файнае. Тая рознавекавая пара зноў кружляла па пляцоўцы.
— Дэнісе, — сказаў я асьцярожна, — гэта яна так смуткуе па тым сучыным сыне?
— Ды не, — закруціў ён галавой. — Гэта ўжо перагорнутая старонка.
Я чакаў, але ён больш нічога не дадаў.
— Дык што там за таямніца? — спытаў я наўпрост. Хоць я і вымавіў *тгаямніца*, але ён мяне зразумеў.
— Ды няма ніякай таямніцы. Ты будзеш расчараваны.
Ягонае вымаўленьне было значна лепшым.
— Ня бгуду.
— Што ты хочаш пачуць? *Звычайнае* няшчаснае каханьне. Як заўсёды, калі дзяўчына закахаецца ў нейкага бандзюгу.
У звычайнага *засранца*.
Мой погляд мусіў выяўляць *салідарнасьць бацькі, які ведае, што значыць мець дачку*, але ў адным з мноства люстэркаў бару я ўпэўніўся, што ён выяўляе адно ап'янеласьць.
— У засранца, які рабіў выгляд, што кахае яе, а насамрэч цікавіўся толькі грашыма.
Відавочна, да яго вярталася нейкая даўняя разьюшанасьць, бо ён падвысіў голас.
— І мы далі яму шанец — зарабіць! Каб ён змог заплаціць за ўсе *шкоды*.
Гэта гучала надзіва бязьлітасна.
Раптам у мяне зьявілася адчуваньне, што свае словы ён адрасуе некаму ў залі.
Я павярнуўся ўбок і прасачыў за ягоным позіркам: ён быў

зьвернуты на пляцоўку.
Крал гэта заўважыў.
— Так, — сказаў ён кісла. — Вунь той прыгожы *gigolo*. А мне сьцьвярджаў, што ён *садоўнік*.

V

1. *Бясконцая вабнасьць аповеду.*
Уолтэр Кер

Відаць, нікога ня зьдзівіць, што мае ўспаміны пра рэшту ночы вельмі разрозьненыя і няпоўныя. Дакладна ведаю толькі тое, што *прага асемяняльніка* (хаця *зьвера*, магчыма, гучала б дакладней) пасьля некалькіх келіхаў шампанскага і чаркі каньяку дзіўным чынам можа абудзіцца нават у вельмі прыстойным хлопчыку, які прынцыпова не суе ножыка ў рот і нічога не падымае зь зямлі, і што маімі ўсё часьцейшымі і ўсё менш прыхаванымі поглядамі ў бок стала русавалоскі з выймальнымі грудзьмі апанавала да жалю прымітыўнае юрлівае *жаданьне*. Пасьля ад'езду немца я, на радасьць Крала, да яе нават падсеў, так што магу пахваліцца, што ўсе цыгарэты, якія яны выкурыла недзе пасьля другой гадзіны ночы, я прыпальваў ёй сам. Зрэшты, гэта было найменшае, што я гатовы быў зрабіць для яе, бо *ў імя каханьня* — варта ёй было толькі захацець — я быў цьвёрда наважаны падняць зь зямлі або сунуць у рот папросту што-колечы. А яна мяне папрасіла, каб я *што-небудзь добрае* распавёў пра школу, што было зусім нялёгкім заданьнем, зь якім, зрэшты, я ўправіўся, думаю, някепска. І я ўжо вось-вось чакаў, што за мае расповеды і галянтнае прыпальваньне яна ўзнагародзіць мяне гэтым цудоўным круглявым падарункам з свайго дэкальтэ, але, на шчасьце, да нас своечасова падсеў зусім п'яны Крал і зь вядомым патасам жлукталёў пачаў мяне ўпрошваць, каб я, маўляў, *вылечыў ягоную дачушку*.
Пэтрык, відавочна, застаўся цьвярозы настолькі, каб нас абодвух разьвезьці па дамох — аднак пра гэта я мяркую з словаў сваёй жонкі, якая ўжо пад шостую раніцы ўбачыла мяне з акна спальні, калі я зь цяжкасьцямі вылазіў з машыны Крала; на ейнае запытаньне, дзе я прабавіў ноч, я, маўляў, адказаў, што ў *бгардгэлі*.

(Сёньня ў макеце раману Любаміра Марцінка “Мыс добрай безнадзейнасьці” я вычытаў сказ, які мяне, магчыма, непрыемна выкрывае: “Гумар, што дыскрэдытуе іх саміх, каб яны ўпэўніліся ў адваротным”.)

Калі малады гімназічны выкладчык у чэхаўскім апавяданьні “Чалавек у футарале” аднойчы прыехаў у школу на ровары, ягоны старэйшы калега Белікаў быў надзвычай абураны: *“Калі настаўнік едзе на вэлясыпэдзе, дык што ж застаецца вучням? Ім застаецца хіба што хадзіць на галовах!”*
Насамрэч я не хачу прыкідвацца, што згаданае апавяданьне ўсплыло ў маіх мазгох менавіта ў тую крытычную раніцу, калі я на ровары сваёй дачкі пакутліва каціў тыя няпоўныя два кілямэтры ад мікрараёну да школы (бо магчымыя насьмешкі былі адназначна прымальнейшыя, чым рызыка, якую для майго небясьпечна разварушанага страўніка ўяўляў задушлівы аўтобус, поўны дзяцей, бацькоў і калегаў); то ж бо калі я ўвогуле сваёй галавой, якая трашчала й расколвалася на часткі, быў здольны пра нешта думаць, гэта было ніяк не даўно прачытанае апавяданьне. Я цешыўся слабой надзеяй, што язда ранішнім сьвежым паветрам хоць трохі мяне ўзбадзёрыць, але спачувальны погляд вахцёра Францішка Недзяльнічка, якому я перад школай перадаў ровар, дазваляў чакаць, што мае спадзевы былі збольшага не абгрунтаваныя (дарэчы, хоць мы з Францішкам крыху й разыходзімся ў ацэнцы апошніх дырэктараў школы, ён мне вельмі сымпатычны і я сапраўды шчыра дзіўлюся амаль рэнэсансавай стракатасьці ягоных абавязкаў і зацікаўленьняў, шкала якіх звычайна пачынаецца панядзелкавым ранкам у школьнай кацельні, на тыдні затым працягваецца ўдзелам у аматарскім тэатры і ў дзіцячым тэатры лялек, прафэсійным гуляньнем у кеглі і працай у мясцовай газэце, а ў нядзелі сягае чытаньня ўласнаручна пісаных жалобных прамоваў пры абрадах разьвейваньня праху ў тутэйшым цьвінтарным гаі).
На шчасьце, у кабінэце быў пакуль адно Ярамір, які, у адрозьненьне ад Белікава, да сваіх маладых калегаў ставіўся зазвычай з паразуменьнем.
— Я піў, — прызнаўся я шчыра, хоць гэта было, відаць, лішне.
— Што рабіць?
Спачатку я хацеў сказаць толькі пра *водгукі ап’яненьня*, але я

знаходзіўся ў той сытуацыі, калі ваніты могуць выклікаць нават некаторыя групы зычных, таму я разважыў задаволіцца вышэйпрыведзенай найпрасцейшай вэрсіяй (для непітушчых чытачоў і для тых узорных асобаў, якія заўсёды ведаюць, калі ўжо досыць, я прывяду яшчэ некаторыя *сымптомы* гэтага стану, без асноўнага веданьня якіх гэты разьдзел немагчыма рэальна *супераджыць*: гэта пачырванелыя, апухлыя, бліскучыя вочы, чаргаваньне прыступаў гарачыні й холаду, падломваньне каленяў і агульная млявасьць, сьмярдзючая ліпкая плеўка на языку, моташнасьць і, нарэшце, пачуцьцё віны й непераадольная цяга даваць сабе абяцаньні).

Ярамір падсунуў мне крэсла. Яно мне было неабходна.

— Зьбегаю па Нэтэйкала, — сказаў ён ахвотна. — У яго знойдзецца *“Алькаазэльцэр”*.

Праз імгненьне Нэтэйкал прыйшоў сам, ніяк не хаваючы сваёй задаволенасьці тым фактам, што — як ён выказаўся — *здаровае ядро школы* зь сёньняшняй раніцы папоўнілася яшчэ адным чальцом.

— Уладзя, — сказаў я ўмольна. — Выратуй мяне.

Да ўсяго іншага ў мяне дадалося ўражаньне, што па дарозе ў школу мяне за язык укусіў шэршань.

— Ніколі больш піць ня буду, — з намогай вымавіў я.

— Не блюзьнер, — сказаў Уладзімір.

Ён зьлёгку закінуў маю галаву назад і нешта закапаў у вочы. Пякло невыносна.

— Так будзе лепш, — сказаў Ярамір.

— Творца, мастак мусіць піць, — адзначыў Уладзімір, — бо бачыць глыбей за астатніх.

— Цяпер я нічога ня бачу!

— Творца бачыць *замнога*!

Зь нейкай прычыны Ўладзімір залічваў сябе да творцаў.

— Бо ў іх уваччу *дваіцца*, — сказаў Ярамір.

Да восьмай яшчэ заставалася дваццаць хвілінаў.

— Першае правіла — хадзіць, — павучаў Уладзімір, разьмешваючы белы парашок у шклянцы вады. — Хадзіць.

Хадзі паміж партамі. Па-другое — адчыненыя вокны. Па-трэцяе — наколькі магчыма, не размаўляць: як *перакіслародзішся* — капцы.

На кароткі момант ягоныя вочы зацягнула павалока нейкага нядобрага ўспаміну.

— Выпі гэта, — загадаў ён мне.
— А ён вытрымае? — клапатліва спытаў Ярамір.
— Вытрымае, — аўтарытэтна адказаў Уладзімір. — Ня нюхай.
Я заплюшчыў вочы і перакуліў у сябе зьмест шклянкі.
У мяне заставалася пяць сэкундаў. У найлепшым выпадку, можа, шэсьць, але ніяк ня больш.
Я ўскочыў з крэсла, за два скокі апынуўся ля адчыненага акна і званіtаваў.
У кабінэце запанавала раптоўная цішыня. Я выцер вусны.
Уладзімір адкашляўся.

— Парадак, — сказаў ён. — Ты ў бясьпецы.
Ягоны аптымізм падаваўся мне штучным.
— Пайду прыбяру за сабой, — сказаў я з пакорай.
— Ты што, звар'яцеў? Нічога ня ведаеш — чуць ня чуў і бачыць ня бачыў.

Празь дзесяць хвілінаў — наш кабінэт быў ужо ў поўным складзе — пад акном заверашчаў незаменны голас Радка Зэлэнага:
— Спадару настаўнік! Спадару настаўнік!
Ярамір вызірнуў вонкі зь дзівоснай хуткасьцю:
— Зараз жа перастань енчыць і марш у клясу! — крыкнуў ён нязвыкла голасна.
Я быў яму глыбока ўдзячны.
— Але спадар настаўнік…
— Ты што, ня чуў? — загрымеў Ярамір пагрозьліва.
Зэлэны спалохана змоўк.
Ярамір адышоў ад акна і гнеўна сеў.
Я падзякаваў яму вачыма.
— Нехта там наблiваў пад акном! — пакрыўджана заенчыў на дварэ Зэлэны.

Нягледзячы на няўдачу з *"Альказэльцэрам"*, усе мае наступныя заняткі былі пазначаныя ажно пэдантычным памкненьнем пільнавацца ўсіх Уладзіміравых наказаў.
— Як на дварэ *цудоўна*, — казаў *я*, заходзячы ў чарговую клясу.
— Давайце адчынім вокны!
Яны разгублена пазіралі на пахмурнае неба.
— Аркушы паперы. Напісаць прозьвішча, — загадваў я як мага

карацей, праходзячы паміж партамі.
Іх здумленьне яшчэ павялічвалася: *Што? Пісьмовая праца ў самым канцы году? Калі ўжо выстаўленыя адзнакі?*
— Гэта на наступны год, — строга асаджваў я іх.
Яны не маглі зразумець гэтага раптоўнага адліву сяброўскай прыязнасьці.
— Міністэрская праверка, — зымправізаваў я ў васьміклясьнікаў.
Усе мае строгія рэплікі былі скіраваныя высока да столі.

Падчас чацьвёртага ўроку зьявіліся зрокавыя галюцынацыі. Калі я ў кабінэце музычнага выхаваньня, праходзячы сярод партаў, мімаходзь узьняў вочы на заднюю сьценку, замест абрыдлага лёзунгу “МУЗЫКА — ГЭТА СРОДАК ЗНОСІНАЎ” цяпер я зь зьдзіўленьнем прачытаў досыць адрознае паведамленьне:
ГЭТА — СРОДАК ЗНОСІНАЎ МУЖЫКА
Літара Ж выглядала крыху па-аматарску.
Што ён мне ў вочы накапаў? — падумаў я.
— Табе гэта не падалося, — сказаў мне Ярамір на перапынку.
— Гэта Кралава пажартавала.

2. На абед я не пайшоў. Даклыпаўшы да верхняй школы, я дачакаўся дачкі. Падчас нашай *вясёлай* размовы дарогай дадому яна колькі разоў справядліва абвінаваціла мяне ў няўважлівасьці: я думаў толькі пра тое, як дома адразу ж залягу.
Я ўжо быў зашмаргнуў фіранкі ў спальні і *плаўна* распранаўся, калі зь ейнага пакою загарлаў Майкл Джэксан. Ува мне ўсё паўстала, але зь іншага боку, нават у гэтай сытуацыі я не хацеў быць *бацькам, які вечна забараняе*; таму я выйшаў у калідор і лёгка пацягнуў за выключальнік засьцерагальніка: запанавалая цішыня належала, безумоўна, да катэгорыі тых, якія мы называем *цудоўнымі*. Я хутка вярнуўся назад.
— Зноў сьвятло адключылі, — прыйшла паведаміць раззлаваная дачка.
— Паршыўцы.
Яна надумалася пайсьці пагуляць.
— Схадзі, — сказаў я. — На дварэ цудоўна.
(Гэтае пэдагагічнае *ноў-хаў* я перадаю зусім бескарысьліва,

аднак зьвяртаю вашую ўвагу, што магчымае злоўжываньне гэтым простым хітрыкам найчасьцей заканчваецца выкрыцьцём, да таго ж у вас у лядоўні можа сапсавацца мяса.)

Аднак яна адразу ж вярнулася, ледзь ня плачучы.
— Што здарылася?
— А ты ня будзеш злавацца?
— *Спадзяюся*, што ня буду.
— Ты *будзеш* злавацца.
— Я ня буду злавацца.
— *Праўда* ня будзеш?
— *Ня буду!* — зароў я.
Нарэшце яна наважылася. Жаласна ўсхліпнула.
— У мяне ўкралі ровар…
Я заплюшчыў вочы. Бацькоўскі сорам.
— Ня ўкралі, — запэўніў я яе.
Я пайшоў прапаласкаць рот, каб яе пацалаваць.

Калі жонка вярнулася з працы, я яшчэ спаў.
Яна адшмаргнула фіранкі і стала *дэманстратыўна* праветрываць пакой. Іранічна ўсьміхаючыся, яна ўвадначас пільна сачыла, наколькі я сам пачуваюся вінаватым, бо ведала, што, з увагі на маю слабую здольнасьць маніць, гэта надзіва дзейсны спосаб, як згадаць сур'ёзнасьць і абсяг маіх магчымых грахоў. Апроч іншага гэта значыла, што яна толькі яшчэ *вырашае*, угневацца ёй ці не.
Я ўсхапіўся, каб пераказаць ёй падзеі мінулай ночы: вядома, я скарыстаў іранічнае й самаіранічнае перабольшаньне, а таксама некалькі іншых звычайных *наратыўных прыёмаў*, але ў прынцыпе маё апісаньне было цалкам праўдзівае (я не ўтаіў нават сваёй гальлівай пажады цыцкастай русавалоскі), толькі ж яна ўсё адно паглядала зь непахісным недаверам. Мяне гэта расьцьвеліла: я шчыра хацеў *зарабіць* прабачэньне тым, што, як гумарыст, *кваліфікавана* яе пазабаўлю, а яна рабіла выгляд, нібы я ўсе гэтыя забаўныя дэталі прыводзіў толькі дзеля таго, каб адвесьці ейную ўвагу, а сваёй легендзе дадаць праўдападобнасьці.
Ну й чорт з табой, казаў я сабе абражана.

Прабачэньне *Агаты* я выслужыў значна лягчэй — за кубачак бананавага марозіва, купленага ў цукерні “Збраславанцы”, куды я дарогай да Кралаў зайшоў па *асьвяжальныя* жуйкі *“Orbit”*.
— Не хачу, — тым ня менш, натурыста сказала яна спачатку. Яна сядзела на ўскрайку басэйну, спусьціўшы ногі ў блакітную ваду.
Калі я прысеў побач, яна адсунулася.
— Агата, — сказаў я *шчыра*, — мне шкада, што я заўчора на цябе крыху накрычаў. Даруй мне.
— Ніхто вас і не прасіў.
Гэта мусіла прагучаць груба, але падбародак ейны трымцеў.
— У мяне здалі нэрвы, — сказаў я і крывадушна дадаў:
— Дзякуючы тваёй сястрычцы.
— Ненавіджу, калі на мяне крычаць…
— Хто на цябе крычыць — акрамя мяне?
— Усе!
— Але я папрасіў прабачэньня.
— Вы — так.
Яна раставала, як тое марозіва.
— Я б хацеў нешта табе прапанаваць: ці не магла б ты — прынамсі тут, дома — казаць мне “ты”?
Яна велікадушна згадзілася.
— Мір? — спытаў я.
— Ну так, — сказала яна.
Пераломны момант. Я зразумеў, што цяпер мне варта было б — каб засьведчыць нашае адноўленае сяброўства — гарэзьліва скінуць яе ў басэйн, але пра нейкія *гульбішчы марскіх коцікаў*, якія, безумоўна, з гэтага выніклі б, я ў сваім стане ня мог ані памысьліць.
Я глядзеў, як яна ліжа марозіва.
Яе гэта зьбянтэжыла:
— На што вы гледзіце?
— Глядзіш, — паправіў я. — *На твой сродак зносінаў*.
Яна засьмяялася:
— Праўда, добра?
— Добра, — заслужана пахваліў я яе. — Як настаўніку чэскай мовы мне гэта сапраўды спадабалася: вельмі дасьціпная анаграма.
Упэўніўшыся, што я не жартую, яна ўсьцешана пачырванела.

— Але тут ёсьць адна праблемка: што пра гэта скажуць настаўнікі *астатніх* прадметаў?
— Што-што, — сказала Агата. — Лямант падымуць.
У сутнасьці, яна не памылялася.

Учора пад уплывам досыць даўняга артыкулу Першэмысла Рута *“Эгаізм як мастацкі кірунак”* я зноў разважаў над тым прыкрым фактам, што я самавольна зрабіўся пратаганістам гэтае кнігі. Я нават паспрабаваў апавядаць ад трэцяй асобы:
Квіда вярнуўся з пазакляснага канцэрту на мяжы вычарпанасьці.
— Дзякуй за каву, спадарыня Кралава, — сказаў Квіда добрапрыстойна.
Пра Бэаціна самагубства Квіда даведаўся ўночы, вярнуўшыся з Данії, — набраў я дзеля экспэрымэнту.
Затым я гэтую сваю пісаніну ўважліва прачытаў.
Мне адразу зрабілася ясна, што так гэта ня пойдзе.
Што гэта за ідыёт, гэты Квіда?
Што ён увогуле пра сябе думае?

3. Фіранкі па-ранейшаму былі зацягнутыя. Гэтым разам Бэата сядзела ў стаматалягічным фатэлі. На ёй была выцягнутая, пакамечаная футболка, і, калі я ўвайшоў, я заўважыў, што яна апатычна заплюшчыла вочы.
Я падцягнуў крэсла бліжэй да яе і пачаў думаць, як лепш суцешыць дзявочае сэрца, разьбітае адкрыцьцём, што каханы *садоўнік* насамрэч усяго толькі мэркантыльны *казёл*, але мне да галавы прыходзілі спрэс аблудныя банальнасьці або народныя мудрасьці кшталту “Ня ўсё тое сонца, што глядзіць у аконца”. Тады я проста захацеў ёй *паказаць сваю дабрыню, начарпаную з кніг* (Шандар Броды), але як на ліха я ня мог згадаць ніводнай прыдатнай цытаты.
Пасьля паўгадзіннага маўчаньня яна, на маё зьдзіўленьне, пачала сама.
— Учора… — рэзка сказала яна, — …ён там быў?
На ймгненьне я завагаўся, аднак зараз жа вырашыў, што ў гэты дзень яшчэ раз паспрабую *праўду*:
— Быў.
— Размаўляў з татам?

— Наколькі я ведаю — не размаўляў.
— Нават не павітаўся?
— Ну чаму ж.
— Тата адказаў яму?
— Я ня чуў, каб адказаў.
Строгія, адрывістыя, нібыта *цьвёрдыя* пытаньні. Яна з мной перамаўлялася, як з працаўніком інфармацыйнага бюро ў абсалютна нецікавым райцэнтры. Ёй нават з посьпехам удавалася зусім на мяне не глядзець.
— Як ён выглядаў?
Я завагаўся:
— Большасьць людзей адказала б, што *вельмі добра*.
— У што ён быў апрануты?
— Сьветлы гарнітур. Чорная ядвабная кашуля.
На апошняе пытаньне яна імгненьне наважвалася:
— Ён быў… адзін?
— Не.
Яна грызла сабе ніжнюю губу, як гераіні кніг выдаўца Жэлезнага.
Павярнула галаву да сьцяны.
— Бэата, — сказаў я ціха, — мы абое ведаем, што назад дарогі няма.
Ня ўсё тое сонца, што глядзіць у аконца.
Яна павярнулася да мяне:
— У цябе ніхто не пытаецца!
— Ну добра, я маўчу. Калі ты ня супраць, я падрамаў бы хвілінку — уночы, бачыш, ня дужа адаспаўся. Калі раптам захочаш даведацца, ці былі ў ягонай партнэркі на нагах варыкозныя жылы, калі ласка, штурхані мяне зьлёгку ў бок.
— Зрабі ласку, перастань мяне *прыхавана павучаць*. Перастань мяне ўжо, к чорту, *выхоўваць*!
Хуткасьць, зь якой яна ўмомант увайшла ў раж, уражвала:
— Слухай, што я табе скажу: я не выношу настаўнікаў, а асабліва не выношу *маладых, поўных энтузіязму настаўнікаў*! Яна казала мне гэта проста ў твар.
— Паслухай сюды як сьлед: чхаць я хацела на гэтыя твае вычытаныя мудрасьці, на тое, як ты файна ладзіш зь дзецьмі і на гэтыя твае цудоўныя нетрадыцыйныя *мэтады*! Мне насраць на гэтую тваю цудоўную *працу з голасам*! Ясна табе?

Яна пацэліла ў дзясятку.
Да сёмай я не сказаў ані слова. А потым заснуў.
Калі я прачнуўся, Бэаты ў пакоі не было. Я спалохана зьбег уніз. На тэрасе стаяў Пэтрык.
— Глянь, — паказаў ён рукой у сад, поўны вечаровых ценяў. Бэата ляжала пад туямі, на жываце, шырока раскінуўшы рукі ды ногі.
Я пастукаў па галаве.
— Што скажаш пра гэта?
Я яшчэ раз зірнуў на аблічча, уваткнутае ў пацямнелы траўнік.
— Ёсьць два варыянты, — сказаў я. — Або яна татальна зьнясілела, або цікуе крата.

…баця вылецеў у комін.
Арнашт Лустыг

Understatement. Замоўчваньне.

На шчасьце, яна адразу ж вярнулася ў пакой.
Я ўжо застаўся ўнізе чакаць з Пэтрыкам Крала. Пасьля паўгадзіннай размовы пра Івана Лэндла, аўтаматычную вінтоўку М6 і фільм *“Сьмяротная пастка”* я ахвотна прыняў прапанову згуляць у кухні ў картачную гульню “Вочка цягне”. Пэтрык пераважна выйграваў. Спадарыня Кралава да піва згатавала нам пару дранікаў.
— Не падобна, каб ты быў надта *напагатове*, — заўважыў я.
— Гэта табе толькі здаецца, — запэўніў ён. — А Ірка стаіць каля брамы.
Крал прыйшоў а дзявятай.
— Як посьпехі? — адразу пацікавіўся ён.
Узяў дранік. Жонка сурвэткай выцерла яму з падбародку тлушч, каб ён ня сьцёк на кашулю або на гальштук.
— Паслухай, Дэнісе, я б пра нешта хацеў цябе папрасіць, — сказаў я *разважліва*, нават не адарваўшы вачэй ад картаў. — Ці ня мог бы ты перастаць у мяне пытацца *“Як посьпехі?”* Калі посьпехі будуць, я табе абавязкова паведамлю. Пакуль што посьпехаў няма.
— Нешта здарылася? — спытаў ён заклапочана.
— Яна мяне не выносіць, — каротка адказаў я і зымітаваў

Бэаціну інтанацыю:
— *Не выносіць настаўнікаў…*
Ён засьмяяўся задаволеным сьмехам бацькі, чыё дзіця адпаліла нейкую наскрозь *сымпатычную* штучку:
— Гэта нармальна — я іх таксама не любіў. Ніколі.
— І я таксама, — азваўся Пэтрык.
— Магчыма, заўтра табе давядзецца на гадзінку пераадолець сваю агіду да настаўнікаў, — сказаў я. — Будзе бацькоўскі сход.
Ён нічога не сказаў, але ў кутках яго вуснаў чыталася пагарда.
Я паціснуў плячыма і працягваў гуляць.
Ён не ўтрымаўся:
— Агата нешта ўчыніла?
— Нявінны жарт. *Акт вандалізму*. Заўжды ўсё залежыць ад інтэрпрэтацыі.
Я сьцісла пасьвяціў яго ў сутнасьць праблемы.
— Зайдзі да дырэктара, — параіў я яму. — Пакуль Хваталава гэтага не разьдзьмула.
— Ці зь ім можна дамовіцца? — усумніўся ён.
— Нельга, — сказаў я. — Купі яму сачок.

4. Зранку на сваім стале я зь зьдзіўленьнем знайшоў недзе сто дваццаць пісьмовых працаў. Уяўленьне, што дзеля гіпахандрычнай знаходкі двух-трох дробненькіх зьліткаў чыстай інтэлігентнасьці я столькі гадзінаў мусіў бы корпацца ў гэтай грудзе пустой пароды, было бязьмежна агідным, але за дзьвярыма кабінэту ўжо стаялі першыя падхалімы з назойлівымі пытаньнямі *“Як мы напісалі?”*.
— Усё значна горш, чым вы думаеце, — сказаў я ім з каменным тварам. — Праўду кажучы, для большасьці з вас гэта будзе нечакана дрэнны старт у новы навучальны год.
На іх вуснах паторгваліся няпэўныя ўсьмешкі.
— І ня думайце, — сказаў я, — гэта *ня жарты*.
Яны папляліся як не свае.
Вестка пра *жахлівыя* вынікі ўчорашніх праверак дзякуючы гэтай ранішняй *артылерыйскай прыстрэлцы перад пэдагагічнай атакай* імгненна разьнеслася, таму, калі я затым у асобных клясах неправерaныя кантрольныя *велікадушна* шкуматаў да памераў карнавальных канфэці, я сустракаў толькі а толькі шчырую ўдзячнасьць.

Чэскі настаўнік — гэта ня мёртвы міт.
Пэтар Піцька

Замена на літаратуры ў 7“Г”, на шчасьце, пацьвердзіла прынамсі той адзіны пэдагагічны посьпех, якога я дасягнуў напярэдадні: калі я, паўгадзіны адчытаўшы ўголас гумарыстычныя апавяданьні Івана Краўза, асіпла папрасіў падмяніць мяне, Агаціна рука імгненна ўзьляцела ўгору. І хаця ёй не ўдавалася авалодаць дыханьнем (ня кажучы ўжо пра нейкую *працу з голасам*), але чытала яна зь небывалай заўзятасьцю і нават сама рабіла заўвагі некаторым менш захопленым аднаклясьнікам.
— Ты што, з дуба ляснула? — зрываліся яны на яе.
— Ні ў якім разе, — далікатна адказвала ім Агата, дасылаючы мне мілыя змоўніцкія ўсьмешкі.
Пакуль у мяне не пачала дранцьвець ніжняя сківіца, я ім *спантанна* падтакваў.

Пасьля таго занятку я пайшоў на абед.
Калі я вяртаўся назад у кабінэт, па ўсёй лесьвіцы праз аднолькавыя інтэрвалы стаялі дзяўчаты з шостых клясаў, якія з руплівасьцю мастакоў-рэстаўратараў мокрымі анучкамі выціралі кожны выгін аздобных слупкоў чыгунных парэнчаў.
— Прывітаньне, дзяўчаты. Божа, чым гэта вы тут займаецеся?
— Выціраем пыл, — прашаптала Андрэа. — У нас тут у Маты працоўнае выхаваньне.
— Нам за гэта адзнакі паставяць, — дадала шэптам Іржына.
— Адзнакі? — зьдзівіўся я.
— Дурасьць, праўда? — ціха сказала Андрэа.
— Ну, зрэшты, так, — пагадзіўся я. — А чаму шэптам?
— Нам нельга гаварыць, — ціха адказала Іржына.
— Што там такое? — гукнула з трэцяга паверху Мата.

Па абедзе на бацькоўскі сход прыехаў дырэктар у шыкоўным шэра-сінім гарнітуры, які — карыстаючыся слоўнікам вучняў нашай школы — быў *ня лажа якая*. (Калі б увогуле можна было казаць пра нейкую лажу, дык, відаць, хіба што пра тое — але гэта сапраўды лухта, ня вартая ўвагі, — што нагавіцы былі з

чырвонымі лямпасамі, а на правым рукаве пінжака застаўся чытэльны надпіс *US NAVY FORCES*.) Пінжак быў як на яго шыты, што, між іншым, было ўскосным доказам таго, што і ў афіцэра амэрыканскай арміі можа быць трыбух, і гэты факт так падбадзёрыў дырэктарскую самаўпэўненасьць, што на традыцыйна крытычныя пытаньні падчас агульнага паседжаньня бацькоўскай рады (*Чаму дагэтуль не было прапанавана ніякай канцэпцыі? Чаму з школы сыходзяць настаўнікі, асабліва маладыя? Чаму школа мусіць выпісваць часопіс "Рыбалоўства"?*) ён адказваў з насьмешлівай абыякавасьцю і трыюмфальнымі спасылкамі на *прававую суб'ектыўнасьць і падвышаную кампэтэнцыю дырэктараў*.
У астатнім бацькоўскі сход праходзіў паводле стандартнай схемы: бацькі, якіх прыбіральніца найперш прымушала разуцца, выстойвалі ў шкарпэтках на халодным лінолеўме доўгія чэргі, каб праз гадзіну чаканьня патрэбнага настаўніка даведацца, што самая ключавая праблема іхнай дзяціны — недастатковае веданьне сульфатаў ды аксыдаў.

Мы не жадаем нічога ламаць. Рэформаў ужо было столькі, што ад іх усе пасінелі.
Пэтар Піцька

Я прадзіраўся па перапоўненых калідорах, апускаючы вочы долу, і ледзь не прапусьціў спадарыню Доўбкаву, зь якой хацеў параіцца, як урэшце прымусіць ейнага сына *дапісаць* абяцаную разьвітальную прамову. Я спрабаваў ёй патлумачыць, наколькі непрыемным было для мяне адно толькі ўяўленьне таго, што і сёлета гэтае *ўдзячнае слова настаўнікам* мне б давялося пісаць самому. Яна паабяцала, што *зробіць усё, што зможа*. Калі мы разьвітваліся, яна з хітрай усьмешкай пажадала мне *ўдачы ў маёй падпрацоўцы*.
Хуткасьць распаўсюджваньня чутак у збраслаўскай лякальнай інфармацыйнай сетцы ніколі не перастане мяне ашаламляць.
— Дзякуй, — сказаў я, — на шчасьце, спадар Крал плаціць мне і за няўдачы.
Толькі за няўдачы, дадаў я сам сабе.

Мы дамовіліся, што пасьля сходу ён пачакае мяне перад

школай. Аднак, на маё зьдзіўленьне, ён чакаў проста ў кабінэце — сядзеў у маім уласным крэсьле, перакінуўшы нагу за нагу, папіваў каву з майго кубку і нязмушана гаманіў з маімі калегамі.
— Здароўкі, — сказаў я асьцярожна. — Падобна, вы ўжо ўсе пазнаёміліся.
— Так, нас ужо прадставілі, — адказала Ленка й зрабіла рэвэранс.
— Ты ведаеш, а спадар настаўнік мяне вучыў, — сказаў Крал зь перавагай, нібы гэты факт даваў яму нейкае дакладна ня вызначанае права.
— Дэніс быў маім найгоршым вучнем, — прамовіў Ярамір з усьмешкай. — Трэба сказаць, што дзеля гэтага першынства ён рабіў сапраўды ўсё.
Крал пацешана ўсьміхнуўся. Толькі цяпер я заўважыў, што ён у ботах.
— Як ты прайшоў праз прыбіральніц? — пацікавіўся я.
Ён сунуў руку ў кішэню, выцягнуў прыгаршч манэт і весела імі пабразгатаў:
— Як праз турнікет.
Я падумаў, што ён бывае досыць дасьціпны (асабліва калі я пішу яму рэплікі).
Роздум на тэму *разуваньня ў Чэхіі* неўзабаве перапыніла настаўніца Тракаржава, якая ўварвалася ў кабінэт уся чырвоная ад гневу:
— Абмежаваныя тупіцы! Чмуты местачковыя! — гукала яна на адрас бацькоў.
З увагі на Кралаву прысутнасьць наша *згоднае падтакваньне* было, аднак, крыху больш іранічным, чым заўсёды, таму ў наступнае імгненьне яна пакрыўджана бразнула за сабою дзьвярыма.
— Выкладае сэксуальнае выхаваньне, — увёў я Крала ў сутнасьць рэчы. — Мяркую, што бацькі забаранілі ёй разьбіраць зь дзецьмі *вібрашарыкі*.

— Ну як дырэктар? — спытаў я ў Крала ў машыне.
— Парадак.
— Што ён пажадаў? Набор нашывак? Ці адразу рыбацкую шаланду?
— Сорак клетак.

— Сорак клетак?
Ён лёгка кіўнуў.
— Але ж у пэдкалектыве нас трыццаць шэсьць, — падлічыў я.
— Відаць, чатыры на запас.
— Ды не, — засьмяяўся Крал. — Будзе гадаваць нутрыі.

Кіраўніцтва Сярэдняй школы імя У. Вянчуры зноў пераканала нас у тым, што яно не належыць да тых, хто толькі плачацца на нястачу фінансавых сродкаў. Спадар дырэктар Наскачыл высунуў новую добрую ідэю, а менавіта — купіць невялікую колькасьць нутрыяў. Махнатыя зьвяркі з каштоўным футрам добра пракормяцца з таго, што застаецца ў школьнай сталоўцы, а карміць іх і клапаціцца пра іх будуць самі вучні на занятках прыродазнаўства і працоўнага выхаваньня. Прыбытак ад іх далейшага продажу, паводле словаў спадара дырэктара, будзе пушчаны на абсталяваньне гэтак патрэбнай кампутарнай клясы. Як бачым, варта захацець — і ўсё ўдасца, нават у галіне гэтак крытыкаванай народнай асьветы. Віншуем!
“Збраслаўскія навіны”, 8/1992, стар.2

5. — Не люблю чакаць, — сказала Бэата незадаволена. — Не люблю чакаць нават тых, каго люблю… ня кажучы ўжо пра ўсіх астатніх.
Яна паўляжала ў водным фатэлі. Бутэлька віна стаяла на падлозе ля нафтабака.
— Я ніяк ня думаў, што ты магла ссумавацца па маёй прысутнасьці…
— Хто гаворыць пра сумаваньне? — рэзка адказала яна. — Я проста кажу, што дзіка не люблю чакаць.
Я ўжо ведаў гэты ейны настрой: патрэба бэсьціць была ў ёй мацнейшай за намер не размаўляць.
— Быў бацькоўскі сход, — сказаў я замірэнча. — Мы прыехалі адразу, як ён скончыўся.
— *Бацькоўскі сход?* — прамовіла яна насьмешліва. — Іх яшчэ праводзяць?
— Праводзяць, — сказаў я спакойна. Я паглядзеў на зашморгнутыя фіранкі. — Зрэшты, існуюць і іншыя рэчы. Напрыклад, *сонца*. Або *лета*.
— І *сена*. І *клубніцы*[15], — яна ўхмыльнулася. — Гэта засунь сабе ў сраку.

— Слухай, табе не надакучыла ўвесь час іграць *сапсаваную цынічку*? — спытаў я. — Ці ня хочаш крыху адпачыць ад гэтай ролі?
Яна хацела нешта сказаць, як раптам заўважыла мой гальштук. З удаваным захапленьнем яна нахілілася да мяне:
— Што гэта ў цябе вісіць на шыі?
Пакуль яна яго вывучала, *гідліва* трымаючы двума пальцамі, я разважаў пра тое, што выклікала ў яе такі небывалы *камунікацыйны* настрой.
— Што гэта? — паўтарыла яна недаверліва.
— Здагадайся, — адказаў я цярпліва. — Гэта можа быць: а) звычайны аксэсуар эўрапейскага мужчынскага адзеньня, называны гальштук; б) проста вылезла мая тоўстая кішка…
Яна рагатнула.
Я па-сяброўску ёй усьміхнуўся.
— А в)? — спытала яна.
— В)? — мой позірк упаў на разгорнуты часопіс “Акно”. — Амулет, што ахоўвае ад *кібэрпанкаў*.
Яна адразу ж нашчацінілася:
— Зрабі ласку, не кажы пра кібэрнэтычны панк, таму што ты пра яго зусім нічога ня ведаеш, — асадзіла яна мяне.
— Ты памыляешся: калі я летась з хард-дыску памылкова сьцёр файл з працай за тры месяцы, у мяне на галаве ўзьнік самы натуральны *панкаўскі іракез*.
Яна хацела глынуць, ды абпырскалася віном.
Яе гэта зноў раззлавала:
— Ведаеш, хто ты? Няшчасны дасьціпнік-*пісака*?
Павярхоўны гумарыст.
— Ці ты думаеш, што гэтыя твае *байкі* маюць нешта супольнае з *сапраўдным мастацтвам*? Ці ты калі бачыў, скажам, які-небудзь *пэрформанс*? Твой цягнік даўно зьехаў! Ты адстаў гадоў на пяцьдзясят.
— Адстаў ад каго? Ад чаго?
Яна з агідай адвярнулася.

[15] Намёк на папулярную кінакамэдыю рэжысэра Здэнька Трошкі “Сонца, сена, клубніцы” (1983).

Уздыхнуўшы, я ўзяў згаданы часопіс, каб гэты цягнік з *сапраўднымі творцамі* паспрабаваць трохі нагнаць. Пэрформанс, прачытаў я, ёсьць мастацтвам, што прэзэнтуе само сябе. Аднак мэтай ня ёсьць самавыяўленьне, акрамя таго, важна — прынамсі ў эўрапейскай традыцыі — захаваць адчуваньні творцы для наступных пакаленьняў. Таму ён імкнецца абудзіць публіку зь летаргіі спажывецкага жыцьця. Вось жа ня дзіўна, што ён мусіць выбіраць шокавыя мэтады, як, напрыклад, запальваньне агню на ўласным целе. Скот Маклоўд, акрамя самападпальваньня, езьдзіць на стужкавым

канвэеры й падае зь яго на кучу вугалю. Творца, пэрформэр, карацей кажучы, шукае новыя кантэксты — імі могуць быць кавалак полістыролавай дошкі або, прыкладам, тэлевізар, які на целе Маршала Ўэбэра ў ягоным пэрформансе зьяўляецца другой галавой. Насуперак гэтаму Джулія Рэйган і Эстэр Армі Фішэр падчас паказу, як гнаныя зьвяры, спрабуюць уцячы з прасторы, абмежаванай паліцэйскімі забаронамі, прычым адна адну зьневажаюць. У іншым пэрформансе Эстэр паказвае шлюху, якая мілуецца з запаленым агнём, спакусы якога імкнецца пазьбегчы (аднак таз з агнём, у якім яна ў фінальнай ачышчальнай сцэне спальвае свае падвязкі, застаўшыся голай, прывязаны да ейнай левай нагі). Гітарыст табарскага індастры-гурту “З”, у сваю чаргу, на подыюме, поўным пустых агнегасьнікаў, танчыць з уключанай пілой-баўгаркай, якой урэшце датыкаецца да рэпрадуктараў; фантаны іскраў ляцяць у публіку, якой няма куды ўцячы. Натуральна, таксама можна абліцца фарбай і класьціся на зямлю, што, дарэчы, абвастрае ўвагу публікі, або абматаць сцэну калючым дротам, скінуць зь цела прасьціну, застаўшыся без адзеньня, і біць галавой у ліст сталі. Тут, вядома, сэнс не ў відовішчнасьці, — гледача шакуе тая сапраўднасьць, што вяртае да першакрыніцаў і асноваў нашага жыцьця.

— Я дапускаю, — прызнаў я нарэшце, — што ў паэтыцы, якую я выбраў, я доўгія гады прынцыпова памыляўся.

Яна пазірала на мяне зь недаверам.

— Ня ведаю, хто быў прычынай гэтай страшэннай памылкі… — працягваў я, — але ў кожным выпадку я яму вельмі ўдзячны.

Яна ўздыхнула.

— Бо я дакладна не хацеў бы дачакацца раздачы аўтографаў, калі я буду змушаны на кучы вугалю спаліць сваю асадку або распрануцца дагала і смажыць чытачам абваляныя ў сухарах дыскеты.

— Як хочаш, — злосна прасіпела яна, — тады *вайна*!

Я ня верыў сваім вушам.

— Жартуеш?! — сказаў я спакойна. — Калі да сёньня быў *мір*, дык тады сапраўды лепш вайна!

VI

1. Выходных, на якія мы зьбіраліся да маіх бацькоў у Сазаву, я

чакаў няўсьцерп, бо адпачынак мне быў патрэбны больш, чым калі раней.
Што да надвор'я, абодва дні цалкам спраўдзілі мае спадзяваньні: ужо ад самае раніцы кахлю на тэрасе ды роўнядзь ракі саграваля залатое *сонца*, сусед задаволена варочаў *сена*, а дачка штохвілі насіла мне духмяныя чырвоныя *клубніцы*. Наколькі было магчыма, я стараўся болей чытаць, купацца, займацца сям'ёй і дужа ня думаць пра Бэату Кралаву.

Панядзелак быў перадапошнім днём навучальнага году, і ўсеагульная анархія, якая запанавала ў школе яшчэ перад першым званком, пацьвярджала самыя пэсымістычныя чаканьні. На перапынках не было чуваць уласнага голасу, і нават падчас асобных заняткаў узровень дэцыбэлаў зьніжаўся вельмі павольна. У паветры лёталі ня толькі звычныя крэйды, губкі ды зьменны абутак, але й новыя падручнікі і ўсё больш папулярныя цацачныя бомбачкі. З акна адной з шостых клясаў на трэцім паверсе выпаў на вуліцу Ўладзімір Гаўранак, які, аднак, абышоўся толькі спалохам, а зьбіцьцё камянямі некалькіх вучняў традыцыйна варожай школы для разумова адсталых дзяцей удалося прадухіліць толькі дзякуючы своечасоваму ўмяшаньню мясцовай паліцыі (я разумею, што гэткая згушчанасьць падзеяў можа падацца малаверагоднай, пагатоў што Гаўранкава падзеньне з акна кіраўніцтва школы пазьней абвергла, а выразкі з "Збраслаўскіх навінаў", што пацьвярджалі б напад на вучняў суседняй спэцшколы, я ніяк не магу адшукаць).
Дырэктар, як толькі скончыў традыцыйнае ранішняе чапляньне кручкоў, падрабязна прааналізаваў узьніклую сытуацыю, якая ўжо шмат у чым нагадвала надзвычайнае становішча, падсумаваўшы свае высновы ўлюбёным унівэрсальным выслоўем *"no problem"*. А тымчасам астатнія настаўніцкія аўтарытэты, што цягам усяго году вырашалі навучальныя праблемы, пагражаючы дрэннымі адзнакамі, у насталай сытуацыі перажывалі нэрвовыя зрывы, каўталі таблеткі і пакідалі свае кабінэты толькі ў самых неабходных выпадках; у выніку тым, хто гэтую панядзелкавую раніцу правёў ці не найспакайней, парадаксальна быў мой калега Стршыбрны, якога хлопцы зь дзявятай клясы неўзабаве пасьля восьмай раніцы ўвязьнілі ў досыць цеснай прасторы *гімнастычнага*

плінту.

Сутнасьць настаўніцкай прафэсіі палягае ня ў ведах, а ў асобе, у найасабісьцейшым, найінтымнейшым — у тым, што цесна зьвязвае чалавека з чалавекам, хай сабе і бяз словаў і ўсякага веданьня; у мастацтве зносінаў схаваная таямніца выхаваўчага і навучальнага посьпеху.
Ярамір Ён

Кралы адляталі ў адпачынак раніцой у аўторак, таму клясная кіраўніца на дырэктарскае распараджэньне выдала Агаце пасьведчаньне днём раней.
Пасьля абеду яна мне яго на матчын наказ паказала: тры двойкі, зь іх адна з чэскай мовы.
— Ты ня ведаеш роднай мовы? — спытаў я.
— Усё гэты правапіс, — уздыхнула яна.
— Як вернешся, трохі яго разьбяром, — сказаў я, гледзячы на спадарыню Кралаву, якая мыла посуд.
— Гэта вельмі міла з вашага боку, — сказала спадарыня Кралава.
Агата толькі пасьміхалася.
— Вядома, калі хочаш, — дадаў я.
— Толькі не кажы, што ты ня хочаш, — выгукнула спадарыня Кралава.
Не дачакаўшыся ад дачкі адказу, яна адно асуджальна махнула мокрай рукой, пасьля чаго кухню пакінула.
Агата па-ранейшаму пасьміхалася.
Я таксама ўсьміхнуўся й паціснуў плячыма:
— Ну добра. Тады на правапіс начхаем.
Была шостая.
— Што ж, — падняўся я. — Жадаю табе ў тым моры не патануць.
І па-сяброўску пакудлаціў ёй валасы.
Яна схапіла мяне за руку.
Я зьдзіўлена паглядзеў на яе, але яна адвяла вочы.
Яна ўсё не пускала маёй рукі.
Я з асьцярогай пазіраў на кухонныя дзьверы і пасьпешліва спрабаваў прыдумаць, што б такога сказаць. Але ў галаву лезьлі спрэс тупізмы:

Чым займаецца Майкл Джэксан?
Ці ёсьць у цябе які хатні зьвярок?
Ці будзеш ты ў моры зьбіраць ракавінкі?
Мы ставім ім двойкі з чэскай мовы, і пры гэтым ня ўмеем зь імі размаўляць, казаў я сам сабе.
— Дашлеш мне паштоўку? — урэшце спытаў я *бесклапотна*.
Яна ўзьняла на мяне вочы:
— А як жа твая жонка? — сказала яна з шчырай боязьзю.

Бэата, на жаль, пра абвешчаную вайну не забылася (акалічнасьць, што гэта наша апошняя сустрэча перад іхным ад'ездам у адпачынак, ня выклікала ў яе, у адрозьненьне ад ейнай меншай сястры, ніякага *разьвітальнага* сантымэнту). Ейнай асноўнай ваеннай стратэгіяй была *пасьлядоўнасьць*. Яна ўпарта маўчала, сапраўды ні на што не рэагавала, у яе ня вырвалася ніводнай усьмешкі, а ейныя *невідушчыя* вочы праходзілі скрозь мяне падобна да поглядаў кельнэраў Прагі-1. Аднак ейнай найдзяйсьнейшай зброяй сталася дыстанцыйнае кіраваньне *hi-fi* магнітолы *"Panasonic"*: схаваўшы пульт сваім целам, яна нерухома ляжала на жываце і чакала, пакуль пакой запоўніць важкая, задушлівая цішыня, каб затым яе незаўважным націскам на адпаведную кнопку за долю сэкунды рвануць у паветра. Гэтыя імгненныя пераходы ад амаль магільнай цішы да аглушальнай *інфэрнальнай электронікі* музычнага гурту *"Vanessa"* рабілі на мой арганізм надзіва супярэчлівы ўплыў. Я хоць, з аднаго боку, і адчуваў, згодна зь сьцьверджаньнем часопісу "Акно", што маё *гучальнае* цела *замест звычайнага спажываньня музыкі можа зрабіцца яе неаддзельнай часткай і што я, такім чынам, электронна зьвязаны з усімі жыхарамі глябальнай вёскі пад назовам Зямля*, але зь іншага боку, у мяне на верхняй губе выскачыла ліхаманка, ня кажучы ўжо пра тое, што замарака, якая мяне пры слуханьні ахапіла, была досыць падобнай да зьведаных шмат год таму адчуваньняў, калі мне ў піянэрскім лягеры ў сярэдняе вуха залезла шчыкаўка.
У чвэрць на восьмую я здаўся.
— Ну, бывай здарова, — загарлаў я, каб перакрычаць раўценьне *мэталёвай псыхадэліі*.
Відаць, яна ўсё ж хацела нешта сказаць, бо гукі музыкі сьціхлі, але я ўжо спускаўся па сходах наніз.

— Ну што, патанчыў? — прывітаў мяне Іржык.
— Зьдзекуешся? — сказаў *я жартоўна*. — Такі рытм стрывае хіба эпілептык.
Калі Іржык удосыць насьмяяўся, ён перадаў мне знаёмую белую капэрту: апрача пяці тысячакронавых купюраў у ёй быў кароткі Кралаў ліст, у якім ён перапрашаў, што не пасьпеў разьвітацца, і ўвадначас паведамляў мне як пра дату меркаванага прылёту назад, так і пра сваё *пэўнае перакананьне*, што ў мяне ўсё ўдаецца *сапраўды выдатна*.
Не брашу.

2. На шчасьце, прынамсі разьвітаньне настаўнікаў і вучняў, што пакідалі сёлета муры школы, прайшло *як мае быць* — у параднай залі збраслаўскага замку.
Неўзабаве пасьля дзявятае раніцы хлопцы й дзяўчаты, *што стаялі на самым парозе жыцьця*, няўпэўнена тапталіся на нацёртым паркеце, пазьбягаючы строгіх позіркаў нацыянальных будзіцеляў з каменю й бронзы. Дарма што ў шэрагу выпадкаў іхнае адзеньне было ня надта ўдалым кампрамісам паміж бацькоўскай уявай пра ўрачыстае ўбраньне і моднай рубрыкай часопісу “Брава”, у іх былі прынамсі вымытыя галовы, што ў спалучэньні зь небывалай паслухмянасьцю, зь якой яны ўрэшце пашыхтаваліся ў патрабаваную калёну па трое, выклікала на тварах іхных былых настаўнікаў расчуленыя ўсьмешкі. Усьміхалася настаўніца Андзелава, бо навушнікі былі ў на рэдкасьць мізэрнай колькасьці ейных вучняў, усьміхалася, на зьдзіўленьне, Ірэнка, бо вучань Звара ажно дагэтуль нікому з прысутных не сказаў уголас “уёбак”, усьміхаўся нават калега Стршыбрны, хаця ягоная ўсьмешка хутчэй, чым расчуленасьць, выказвала таемную радасьць, што яго ад хлопцаў зь дзявятай клясы аддзяляе ня толькі дружына збраслаўскіх скаўтаў зь сьцягам, але й два шэрагі крэслаў з заслужанымі ўдзельнікамі трэцяга супраціву. Нарэшце, усьміхаўся мэр Шопэк, які, перш чым агучыць сваю прамову, адзначыў *нялёгкую й адказную* працу прысутных пэдагогаў на працягу году адным гвазьдзіком, а потым заклікаў прысутную *моладзь* — найхутчэй пад уплывам манумэнтальнай патрыятычнай скульптурнай кампазыцыі, што высілася за ягонаю сьпінай, — да мужнасьці й вялікіх учынкаў (моладзь, асабліва хлапцы, на ягоныя словы згодна ківалі, бо некаторыя плянавалі мужныя вялікія ўчынкі

ўжо на надыходзячы летні вечар). Далей, на маё зьдзіўленьне, ён канстатаваў, што мы жывём у той час, калі адукацыя і творчыя здольнасьці людзей як ніколі дагэтуль вызначаюць лёс нашай цывілізацыі, і што інвэстыцыі ў адукацыю ў гэтым сэнсе — гэта той капітал, які, хоць і павольна, дае стакротны прыбытак, таму якія-колечы хістаньні з інвэстыцыямі ў адукацыю могуць мець безь перабольшаньня наступствы лёсавызначальныя. Я глядзеў на яго з шчырай удзячнасьцю і ўжо быў нават пачаў цішком прасіць у яго прабачэньня (баючыся адначасова за ягонае сяброўства ў ГДП), калі ён ня менш пераканаўча прамовіў, што, аднак, *дзяржава ня можа інвэставаць у адукацыю, пакуль сама на гэта не заробіць*.
— *Вось дыялектыка*! — сказаў я Яраміру на вуха.
— Трэба эканоміць, — сказаў Ярамір. — Чаго б гэта ні каштавала.
— Ціха, — цыцнула на нас намесьніца Прахазкава.
Доўбэк сыстэматычна адводзіў ад мяне вочы.
Прамова мэра Шопка *была ўзнагароджана воплескамі*.

Так, я ведаю, зноў *вясёлая сцэнка*. Ці сапраўды мне трэба за кожную перапрашаць?
Мы вельмі доўга спрабуем прасунуць мастацкія законы зьверху ўніз, а вынікі ў рэшце рэшт засмучаюць. Нам магло б прынесьці карысьць — і ў чыста мастацкім сэнсе — калі б мы далі задні ход і замахнуліся на вульгарную папулярнасьць.
Уолтэр Кер, Як напісаць п'есу

Сьціплае суквецьце песень, як выказалася мая каляжанка Хваталава-Сукава, што ад пачатку й да канца мэравай прамовы ціха стаяла пад Мыслбэкавай алегорыяй "Музыка"[16], дзявочы хор распачаў жвавай кампазыцыяй *"It's a Long Way to Tipperrary"*. Сьледам ішлі *"Deep in the Heart of Texas"*, *"One Man Went to Mow"* і надзіва свавольная *"What Shall We Do With a Drunken Sailor"*. Не бракавала, вядома, і "Вальсу на разьвітаньне", зразумела, у арыгінальнай вэрсіі *Auld Lang Syne"*. Заключная песьня "Ах, сынку, сынку" (якая, як душна нагадала кіраўнічка хору, была ўлюбёнай песьняй Гарыга Масарыка) сваёй мэлянхалічнасьцю стварыла кантрапункт да імклівага наступу Пэтра Доўбка

[16] **На Ёзаф Вацлаў Мыслбэк (1886 — 1922) — чэскі палітык, міністар культуры і іншым аўтар**

— Слухай, Доўбэк, казалі мне, было б файна, калі**ласка**, **пом**ніка кшталту таго, падзякаваў. Каму гэта? — пытаюся я. **Ну, тому** настаўнікам, каму ж! За што гэта, пытаюся я, хібаш **Вацлаўскім** плацяць? Але гэта ня лезла ў мяне з галавы. Яно **Вацлаўскім** казаў я сабе, але нашто перагінаць. Ну, скажам, **нямецкую** навучылі чытаць, пісаць ці, там, калі былі Пунічныя **Першае** зь іншага боку, колькі разоў мяне пакідалі пасьля школы прыбіраць клясу, я тут пяць разоў схапіў вошай, ня кажучы ўжо пра тое, што нейкі прыдурак у мяне двойчы ўкраў новыя боты. Мы з настаўнікамі ў разьліку, казаў я сабе, тым больш што за пару дзён мы ўсё адно адсюль звалім, дык якая нафіг падзяка. Дагэтуль нечуваная *неафіцыйнасьць* разьвітальнай прамовы выклікала ў старажытнай залі спалоханую зьбянтэжанасьць, але, на шчасьце, і напятую ўвагу.

— Аднак у мяне гэта ўсё ніяк ня лезла з галавы, — прамаўляў Доўбэк. — Я глядзеў на настаўнікаў, якія ўжо ледзь языкамі варочалі і выглядалі пашарпанымі, як тыя падручнікі, што мы якраз паздавалі. Ну і што, казаў я сабе, гэта ж уваходзіць у іхныя абавязкі. Урэшце я ўпаў так нізка, што пачаў пра іх думаць як пра настаўнікаў, але ж нічога ладнага я ўсё адно не надумаў, толькі мне ад усяго гэтага зрабілася неяк дзіўна — хапіла, каб я ў канцы заняткаў паглядзеў на той фікус, які я ў другой клясе прынёс з дому ў пакеце з-пад ёгурту, а сёньня ён вымахаў пад самую столь, і ў мяне ў жываце ўсё пасьціскалася. Або проста паставіў я нагу на папярочыну Катчынага крэсла, як я заўсёды гэта рабіў, — і раптам да мяне дайшло, што, уласна, ня надта я яе там ужо пастаўлю, і мне засталося толькі праглынуць сухую сьліну. Ну, бляха, яшчэ заплач, казаў я сабе, і, чорт ведае чаму, згадаў пра сваю маму, у якой пазалетась была сустрэча іхнага выпуску: у пятніцу яна наўмысна купіла новую спадніцу і ляк на пазногці, у суботу схадзіла ў цырульню і ўвесь вечар глядзела старыя фоткі, а ў нядзелю раніцай абвясьціла, што нікуды не паедзе, бо некаторыя рэчы, кшталту, вярнуць немагчыма — а я глядзеў на налякаваныя пазногці дзевак у нашай клясе, і мне ў галаву лезла купа пытаньняў і ніводнага адказу.

Прыкладна ў гэты момант у залі пачуліся першыя дзявочыя ўсхліпы.

— А тады да мяне зноў прыйшлі й спыталіся: слухай, Дуб, ці ты ўжо падрыхтаваў тую прамову? — а ў мяне ніякай прамовы,

натуральна, не было, а была толькі злосьць, таму што, зрэшты, гэта было яшчэ адно хатняе заданьне, якое далі толькі мне, а астатнім не. І ўвогуле я ня ведаў, пра што мне ў гэтай прамове пісаць, бо калі б я напісаў, што нам настаўнікі далі на дарогу па жыцьці крылы, як казалі выпускнікі летась, Зэлэны з Зварам пачалі б махаць рукамі, нібыта яны ўжо лятуць. Мне было ясна адно — трэба напісаць так, каб ніхто не махаў рукамі. Усхліпваньне набрала моцы. Некалькі хлопцаў мужна адкашляліся.

— Урэшце мне дапамог выпадак, — пераўзыходзіў сябе Доўбэк. — Гэта было заўчора, я ішоў з сталоўкі, і з акна настаўніцкай мяне аклікнула нашая клясная — ня Доўбэк, а нармальна, Пятро. Я паволі падыходзіў да таго акна і думаў, ці не заўважыла яна выпадкам, што я толькі што кінуў у траву лупіну з банана, — і тады мне як у галаву стукнула.

Доўбэк вытрымаў драматычную паўзу.

Вэраніка Пэкаржава выбухнула надрыўным плачам.

— Мне стукнула, што яны, уласна, увесь час нас некуды *клікалі*. Некуды на другі бок дарогі, як нашая клясная мяне. Некуды да сябе, да жыцьця дарослых. Хоць яны й расказвалі нам пра Пунічныя войны, але пры гэтым яны нас да сябе клікалі, ня словамі, а проста ўжо тым, што перад намі стаялі й часам на нас так змучана паглядалі, кшталту каб мы ўжо нарэшце перасталі гуляць у крыжыкі-нулікі ці лупіцца мадэлькай і каб выплылі да іх, на той другі бераг. І за гэтае кліканьне нам ім, відаць, падзякаваць было б варта.

Хваляваньне, якое многіх прысутных, у тым ліку настаўнікаў, ахапіла падчас Доўбкавай прамовы, было заразьлівае. Большасьць дзяўчат папяровымі насоўкамі выцірала размазаныя вочы.

Хлопцы мужна жвалі.

Прадстаўнікі мэрыі перашэптваліся.

І гэтак далей.

Калі кола віншавальнікаў вакол Доўбка нарэшце разьвеялася, я ня вытрымаў, каб не *далучыцца*:

— *Клясная* прамова, — сказаў *я з трапятаньнем*. — Так *праўдзіва* і ўвадначас *шчыра* нам яшчэ ніхто не казаў. Мы гэтага гадамі чакалі.

— Соры, — сказаў Доўбэк неахвотна. — Я хацеў напісаць, але, праўда, не пасьпеў…

3. Прыблізна ўжо за трыццаць гадзінаў мы з жонкай і дачкой ад'ежджалі на раскошным аўтакары турыстычнай фірмы *"Last Minute Travel"* да празрыстага Адрыятычнага мора, каб адмыць у ім брудныя Кралавы грошы.
Ехалі мы ўночы. Нягледзячы на стомленасьць ад апошніх напружаных дзён мне, у адрозьненьне ад усіх астатніх, так і не ўдалося заснуць (не дапамагла нават надзіманая турыстычная падушка "Люлі-люлі", якой мяне на дарогу засобіла бабуля-турыстка), і таму я адно стомлена й безуважна пазіраў на чырвоныя заднія ліхтары машын, якія ехалі перад намі, а ўрэшце і на ўсё магутнейшы скалісты масіў Альпаў, што грамадзіўся па-над асьветленай магістральлю. Пра Маху я, наколькі памятаю, ня згадваў[17]. Я думаў пра ўсіх тых дзяўчат, якімі я быў раптоўна аточаны, і час ад часу папраўляў коўдру сваёй дачцэ, якая спала.

Сям'я чэскага настаўніка на моле ў Порэчы.
— Прывітаньне, мора, — усклікнула жонка. — Ня ведаю, ці ты пра мяне памятаеш, мы ня бачыліся дзевяць гадоў.
— Прывітаньне, мора, — закрычала дачка. — Мы яшчэ ніколі ня бачыліся, мяне зваць Міша.
Падобна, што мору на гэта было начхаць.

Адзін чалавек сказаў сусьвету:
Госпадзе, я існую.
Толькі ж, адказаў сусьвет, гэты факт
не абудзіў ува мне
пачуцьця адказнасьці.
(Ня памятаю ўжо, хто гэты верш напісаў, але падобны досьвед я маю з акруговай адукацыйнай управай Прагі-5.)

[17] Клясык чэскай літаратуры Карал Гінэк Маха (1810—1836) шмат падарожнічаў па Аўстра-Вугоршчыне ды Італіі.

Хвалі і соль у *радасных вачох*. Соль у ручніках. Аголеныя дзяўчаты (якія ані крыху не паглядалі нянавідна). Падманлівыя пахі крэмаў для загару. Аголеныя жанчыны. Надзіманыя матрацы. Мяжа сьвятла й ценю на ўскрайку пініевага гаю. Кнігі, кава й каньяк "Цэзар" па абедзе на тэрасе *бунгала*. Яшчаркі й цыкады. Цёплыя ночы. *Лянгусты* й белае віно

“Тэран” у вінарні, асьветленай рознакаляровымі ліхтарнямі.
Паласатыя цяльняшкі пад пінжакамі кельнэраў.
І гэтак далей.

Карацей, у якасьці ўзнагароды за нецікавыя адцінкі рэальнасьці.
Уолтэр Кер

На сёмы дзень, падчас *факультатыўнай марской праходкі ў старасьвецкую Пулу*, у адной з шматлікіх тамтэйшых ювэлірных крамаў, усяго за пару соцень кілямэтраў ад той пякарні, перад якой артылерыйскай гранатай на шматкі разарвала восем чалавек, я купіў жонцы й дачцэ два сапраўды раскошныя ланцужкі.
Калі праз пару гадзінаў мы прыплылі назад у Порэч, на адной з чырвоных лавак насупраць молу сядзеў Пэтрык.
У руцэ ён трымаў ключы ад машыны і весела імі бразгаў.
Канец, зразумеў я.
Тым ня менш не магу сказаць, што я ня рады быў яго бачыць.
Бэацін чорны “гольф” стаяў на супрацьлеглым баку ходніку.
Жонка прасачыла траекторыю майго погляду. За апошнія сем дзён яна выдатна напрактыкавалася ў гэтым на пляжы.
— Ты яго ведаеш?
Тым часам ён падышоў да нас і жонцы прадставіўся сам.
Доўгая дарога не пакінула на ягоным летнім убраньні практычна ніякага сьледу, але больш мяне ўразіла, на якія зьмены пры неабходнасьці здатны ягоны слоўнік. Ён пераказаў маёй жонцы *шчырае шкадаваньне* Крала, што той на апошнія чатыры дні адпачынку *гэтак неміласэрна* вымушаны пазбавіць яе мужа, але падкрэсьліў, што гаворка вядзецца пра сапраўды *вельмі неадкладную справу*. Пасьля чаго ён выказаў спадзяваньне, што мая жонка, *відаць, не пакрыўдуе*, калі ён дазволіць сабе, *ад імя шэфа*, перадаць ёй *невялікую фінансавую кампэнсацыю*.
Нарэшце я даведаўся, чаго я як муж варты: дзьвесьце пяцьдзясят марак за дзень.
Мне гэта падалося няблага.

Ён мне даў паўгадзіны на зборы.
Праз хвілю жонка прыйшла да мяне.
— Управіцеся тут безь мяне? — спытаў я.

Яна ўсьміхнулася.
Было відаць, што нешта ёй не дае спакою.
— Ці табе з намі тут падабалася? — спытала яна.
Я зірнуў на яе ад расчыненай валізы.
У руцэ яна ўсё яшчэ трымала тыя дзьве банкноты.
— У нас цяпер усё так добра, — сказала яна. — Але я не хачу гэтага *любым* коштам.
— У гэтым я з табой згодны, — адказаў я.
Я пацалаваў яе.
Залаты ланцужок літаральна зьзяў на яе загарэлай шыі.
— Я толькі хацела, каб ты гэта ведаў.
Яны мне махалі, як мараку далёкага плаваньня.

Націскам кнопкі Пэтрык апусьціў дах. Вецер раскудлаціў мне валасы.
— Дык у чым рэч? — спытаў я.
Мне даводзілася трохі крычаць.
— Нешта здарылася?
— Што магло здарыцца? — не зразумеў ён. — Проста прыехалі раней.
— А-а, вось як, — прамовіў я.
— Прынцэса сумуе, — засьмяяўся ён.
У Альпах быў дождж.

4. І дождж суправаджаў нас да самага дому.
Я ўсю ноч распавядаў анэкдоты, каб Пэтрык за стырном не заснуў. Ён ехаў вельмі хутка, таму, нават з двума перапынкамі на перакуску, у Збраславе мы былі ўжо а пятай раніцы. Мікраграён быў бязьлюдны, мокры й панурый. Мае загарэлыя ногі ў белых шортах сярод калюжын выглядалі саманадзейна і недарэчна. Падэшвы сандаляў-*какосьнікаў* умэнт напоўніліся бруднай вадой. У вітальні я паныла паставіў валізу на падлогу і наўпрост пайшоў спаць.
Калі папоўдні я ўстаў, мой настрой ня надта зьмяніўся. Пачуцьцё пакінутасьці не прагнала і ўключанае радыё. Я схадзіў у душ, а затым да суседкі па газэты й карэспандэнцыю — ніводная з трох атрыманых капэртаў не падавала ніякага сьведчаньня таго, што я пісьменьнік. Гэта мне канчаткова сапсавала настрой.

Мне нікуды не хацелася йсьці.
Мне не хацелася сядзець у цемры.
Мне не хацелася слухаць музычнага гурту *“Vanessa”*. А пятай я апрануўся і пайшоў да яе.

Кралаў дома не было. Увесь дом выглядаў як мёртвы. Іржык сядзеў у кухні з галавой на стальніцы і гучна хроп.
У астатнім паўсюль было ціха.
Я падняўся наверх.

Карціна, што адкрылася перад маімі вачыма, калі я адчыніў дзьверы ў Бэацін пакой, належыць да *незабыўных*.
Завесы былі адшмаргнутыя.
Пакой быў прыбраны.
У стаматалягічным фатэлі сядзеў плюшавы мядзьведзь.
На пісьмовым стале зьявіўся школьны глёбус.
Нафтабак пакрываў белы абрус, на якім была ваза, поўная стакротак.
На сьцяне насупраць дзьвярэй вісела гітара і плякат Янка Ледэцкага[18].
Бэата спала на *засланым* ложку, а вымытыя валасы чырвонымі стужкамі былі сабраныя ў хвосьцікі, што камічна тырчалі ў бакі.

[18] Папулярны чэскі сьпявак.

Гэткім сама чырвоным быў і колер ейнай губной памады.
Я схіліўся да гэтых чырвоных вуснаў.
У наступнае імгненьне ўнізе бразнулі кухонныя дзьверы, а ў ваннай завібравала пральная машына. На сходах затупалі хапатлівыя крокі, і мне на шыю скочыла Агата.
Бэата расплюшчыла вочы.
— Здароўкі, — сказала яна. — А мы па табе ўжо ссумаваліся.

Працяг у ARCHE-5'03.

З чэскай мовы пераклаў Сяргей Сматрычэнка паводле:
Michal Viewegh. Výchova dívek v Čechách. Praha: Petrov, 1997

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/21
[image]

Мілаш Урбан

МІЛАШ УРБАН (нар. у 1967) — адзін з найвыбітнейшых чэскіх празаікаў і перакладчыкаў новай пары. У 1992 годзе скончыў Карлаў універсытэт, адмысловец у амэрыканскай і нарвэскай літаратурах, у цяперашнім часе рэдактар выдавецтва "Argo". Апавяданьні "Пустка" і "Беларуска" друкуюцца з ласкавай згоды аўтара.

Беларуска
Аповед пра каханне

Яна была не са сталіцы. Прыехала з падобнай дзіры з падобнаю назвай — я знайшоў тое месца на мапе — Пінск, гузік, аточаны сінімі кропкамі і мноствам рысак, марны SOS у непрадазных беларускіх балотах. Пінск або Мінск — усё адно я туды ніколі не траплю, ні ў якую ўжо дзіру, больш нікуды. Найпрыгажэйшыя кветкі растуць на гноі, гэта ведаў Шэкспір ды класікі да яго. Я гэтую пінскую ружу сарваў на Цэнтральным вакзале. Сцягнуў яе ў двух таксістаў і аднаго сутэнёра. Маладзёны біліся за яе, як сабакі за сучку. Не ведаю, наколькі цэлая была яна, але ў баксёра юшка цурчала з носу, а ў другога, з калом, — з брыва. Дзяўчына раўла і страляла вачыма ў маскаля, што воддаль курыў тонкую цыгару. Я сунуўся да аўтамата выклікаць паліцыю. Затым вярнуўся і спытаў колькі. Сутэнёр зірнуў на мае няпоўныя метр-шэсцьдзесят і прыкінуў вагу — дзевяноста, тады вачыма змераў тых бугаёў — разам тры-семдзесят і мо за дзвесце кіляў. Пачаў па-расейску рагатаць. Кол нагамі перыў баксёра ў жывот, калі са скверу

перад вакзалам азвалася сірэна.
Дзяўчына дала драла наверх да стаянкі, бітуны кінуліся ў вестыбюль. Я загарадзіў маскалю сваім жыватом дарогу і, перш чым ён паспеў яго адсунуць, ткнуў яму пад нос дзве пяцітысячныя купюры: “На гадзіну”, — сунуў іх яму ў кішэню скуранога пінжака і адступіў. У мужыка не было выбару, гешэфт як ягадка, а ў пятах паліцаі. Ён пстрыкнуў пазногцем па гадзінніку, прыгразіў мне кулаком і знік.
Ля мяне загамавала белая “феліцыя”, выскачылі чорныя камбінезоны і, убачыўшы азызлага, бездакорна выстраенага курдупеля ў найлепшым веку, што паказваў у бок электроннага табло, пабеглі далей. Я паспяшаў за той красуняй, яна не магла быць далёка. Так і было. Сядзела сабе ў кавярні ў холе старога вакзалу ды піла каву, на якую не мела грошай. У зялёнай блузцы яна трымцела, як чэк на скразняку, вочы ейныя бегалі ад выйсця да кельнера і назад. Я заплаціў, паказаў ёй ключ ад машыны і кіўнуў, каб ішла за мной. Яна закруціла галавой: “Убили б меня”.
Я нахіліўся да яе: “Я тебя не убью, я тебя люблю”.
Яна разявіла рот, устала, абвіла рукамі маю шыю і пайшла са мной. Дзіва. Як джэнтльмен, я прытрымаў ёй дзверцы машыны. Калі яна сядала, з-пад спадніцы ў яе вызірнулі жоўтыя майткі.

Баявік баевіком, але калі гаворка заходзіць пра харство, трэба здалікатніць стыль. Мне не застаецца нічога іншага, як расказваць. Вось жа, абкладаю сабе вусны сусальным золатам і пачынаю аповед пра беларуску.
Я чакаў яе дванаццаць гадоў, абыходзіў горад, аб’язджаў рэспубліку. Як антыквар, я шмат падарожнічаю, там-сям нешта купляю, часам і прадаю, але толькі ў Празе, у сваёй крамцы на Кршыжаўніцкай, і толькі тады, калі на прадаваную рэч удосыць нацешуся. Я знаны ювелір.
За крамай у мяне бакоўка, дзе я начую пасля здзелак, што зацягваюцца да ночы. Там ёсць прыбіральня і душ, на электраплітцы можна згатаваць яечню, рызота, спагеці. Ёсць там і тэлевізар — дзеля заспакаення мозгу пасля гадзінкі бухгалтэрыі. Тут я й пасяліў сваю беларуску. У яе не было нічога, акрамя той адзёжкі і майткоў, пары панчохаў ды зношаных туфляў. У кішэньцы пад паяском спадніцы яна перахоўвала каробачку з адмысловымі гумкамі.

У каморцы было халодна, у разлеглай краме цёпла, таму я пасадзіў яе там, у бідэрмаерскае крэселка, за ампіравы столік, накарміў яе спагеці, адмераў дзвесце грамаў плзэньскага, а потым, у першы ж дзень, я ёй даў працу.

Яна казала, што зваць яе Ірынай, але ўжо ў кавярні я вырашыў называць яе Коля[1], маю напалоханую, кволенькую дзяўчыначку. У яе было выцягнутае цельца і шыя, прыгожы моцны карак і правільнай формы галоўка з кароткімі русымі валасамі, вялікія зялёныя вочы, малы нос і рот са стручкападобнымі вуснамі, за якімі бялелі здаровыя зубы беднай правінцыялкі, і грудзі дробныя, пругкія і круглыя — а як інакш, а попка як арэшак — бяры ды лузгай; канцавіны млява доўгія, лыткі моцныя, а шчыкалаткі крэпкія, ступакі хутчэй вялікія і завостраныя; ах, гэта былі ногі, якія нічым, ну нічым не нагадвалі мае рапушыныя лапы.

Вітрына была невыразная, яе трэба было ажывіць. Я адамкнуў шафу з шатамі. Драўлянай паненцы ў акне, на якую я звычайна вешаю строі, час быў у склеп, на ейнае месца прыйшла Колюшка. Я не глядзеў, калі яна пераапраналася. Я выбраў вечаровы туалет у стылі ракако з нашытымі пярлінамі. Калі я павярнуўся і расплюшчыў вочы — ажно захрыпеў: яна там стаяла ў чорна-белай блузе з пярлінамі на грудзях і на аздобленай стужкамі даўжэзнай спадніцы ў фальбоны, з батыставымі ружамі на кароткіх карункавых рукаўчынах, дэкальтэ і гарсэтам, злёгку пацярушаным серабрыстымі фіялкамі. На галаве ў яе сядзеў высокі, вугальна-чорны парык “Коля” (1896, дыядэмай і двума белымі стравусінымі пёрамі, на ножках — чорныя замшавыя чаравічкі са срэбнай шнуроўкай, здобленыя фіялкамі з пап’е-машэ. Горла ёй аздабляла чорная стужка і кантовая аметыставая брошка, а з мочак вушэй звісалі аметыставыя, адшліфаваныя да выцягнутых крыштальнай завушніцы насычана-фіялетавага колеру.

[1] Імя нагадвае **“Коля” (1896, прэмія Бекар)** **Здзіняка** **Свяржакіна** і **расійскага** **кліпінаўца, які** **збегам** **акалічнасцяў** **трапіў у Чэхію.**

Як толькі я пасадзіў Колю ў вітрыне, галоўка ў яе апусцілася на грудзі і нябога заснула ад стомы. Я прыхапіў ёй парык чатырма шпількамі — яна й не прачнулася, — развярнуў яе левым бокам да шкла і, як ляльцы, склаў рукі на жываце, затым левую нагу сагнуў ёй так, каб са складкі тканіны выступала аголенае калена, а правую падцягнуў да бязмоцнага цела. Скончыўшы

гэтыя маніпуляцыі, я выйшаў з крамы, зачыніў дзверы і зрабіў дзесяць крокаў па ходніку ў бок касцёлу. Затым павярнуўся і прагулкавым тэмпам пакрочыў назад, каля антыкварыяту мімаходзь зірнуў направа і ажно здранцвеў ад зачаравання: у вітрыне сядзела жывая жанчына ў багатым адзенні, абвешаная старажытнымі ўпрыгажэннямі. Грудзі ў кантовым выразе падымаліся і апускаліся ў спакойным рытме, запэцканыя крэмавыя карункі пад спадніцай кантраставалі з ражком жоўтых майткоў, — так, амаль дасканала. Я вярнуўся ў краму, пагасіў святло і сеў за прылавак. І ціха глядзеў: паміж сценаў, завешаных пачарнелымі партрэтамі дзіўных баронаў, масянжовымі газоўкамі, рыцарскімі шышакамі і панцырамі, касцянымі веерамі, насценнымі гадзіннікамі, венецыянскімі люстрамі, турэцкімі шаблямі, фехтавальнымі шпагамі і вялізным двухвострым мячом, ззяла ядвабным святлом акно вітрыны, а ў ім спала дзяўчына — гэтак разняволеная і аддадзеная, нібыта была папраўдзе Божая.

Я не здзівіўся з хлопцаў, якія найперш прайшлі міма ў адным кірунку, затым у другім, і нарэшце я заўважыў іх трэцім разам, як яны з супрацьлеглага ходніку павыкочвалі бельмы і як ім у гэты сонечны дзень раптам нікуды не хочацца. Мяне падзівіла, што мая паненка прыцягвае і жанчын, якія рэдка калі пазіралі абурана, хутчэй збянтэжана, акрамя хіба той, што знячэўку ўварвалася да мяне ў краму; гэта была брыдкая дзябёлая амерыканка з мужчынскім партфелем у руцэ. Я ўжо чакаў ад яе натацый, але яна спытала, колькі каштуюць тыя аметыставыя завушніцы. Я прыкінуў: яны мне дасталіся за дваццаць тысяч, скажу бабе пяцьдзесят — і прадам за трыццаць пяць.

“Семдзесят”, — вырвалася з мяне. Яна адчыніла партфель і, не міргнуўшы вокам, выпісала мне чэк. Праз тэлефон я яго спраўдзіў — быў у парадку. Калі я ў сваёй беларускі выцягваў завушніцу з правае мочкі, баба назірала за мной, часта дыхаючы. Яна працягнула сваю лапу і ўзяла дзяўчыну за падбародак, але я своечасова сказаў: “I’m sorry, madame, but she’s mine, you see”. Аднак толькі я ўзяўся за правую завушніцу і вось-вось ужо выцягваў яе з вушка, мужланка схапіла яе і выдрала абедзвюма рукамі. “Ай!” — ахнула Коля на дасканалай чэшскай мове, і з мочкі скацілася рубінавая кропелька. З выразам пранырлівага спекулянта тая садыстка вылецела ў веснавы надвячорак, і настаў спакой.

За завушніцы, якія яна дапамагла мне прадаць проста сваім сном, я падараваў Колі аметыставую брошку і запрасіў яе на вячэру ў “Апошні суд”. Яна абпілася трамінам і кідала на мяне погляды вільготнай падзякі. Я паабяцаў, што дастану ёй дазвол на працу і новы пашпарт. Яна нахілілася да мяне праз клятчасты абрус і мокрымі вуснамі пацалавала маю руку.
“Сказку, — прамовіла яна. — Пажалста, расказывай”.
Гэтая просьба мяне збянтэжыла. “Не знаю, — залапатаў я. — Ну, нешта табе пасказываю, хочаш?” Вочы ў яе засвяціліся, як у дзіцяці. Я давёў яе назад да крамы і, пакуль яна за дзвярыма прыбіральні мачылася, уключыў у бакоўцы відэамагнітафон і сунуў у яго касету з маім улюбёным фільмам. Потым я пасадзіў Колю на крэсла, накінуў на яе плед і наказаў, каб у гандлёвы пакой не выходзіла, нікому не адчыняла, нават калі б хто ўпрошваў, і пагасіла святло ў прыбіральні, як пойдзе спаць; што на ноч яе зачыню і прыйду пасля восьмае раніцы. Але яна ўжо мяне не чула — глынала вачыма “Прыгажуню і пачвару”, гэтую вечную чорна-залатую гісторыю.
“Тебе панравилась?” — спытаў я зранку, калі яна ўпала ў мае абдоймы; сэрца ў яе калацілася ажно ў горле, але галоўка ашалела ківала, а роцік палка шаптаў: “Два раза сматрела”.
У нас падобныя зацікаўленні, цешыўся я і прыхінаў яе да сябе, ажно ў яе косці трашчалі. “Нясу табе сняданак, галубушка. Ты мая Цалёвачка” — вылупіла на мяне верныя сабачыя вочы.
Яна сядзела ў вітрыне цэлы тыдзень і на чвэрць падвысіла мой прыбытак. Аднак, як і ўсё, і гэта з часам далося мне ў знакі, і я пачаў ламаць галаву, як Колю скарыстаць яшчэ лепш. У яе была цудоўная шыя, пад беллю якой, калі яна паварочвала галаву, задзірыста гралі цягліцы і смела вібравала жыццё. Схапіць горла пальцамі, што могуць сціснуць, як катавы клешчы…
Я абарваў свае думкі і заляпіў сабе аплявуху, як след — ажно прыцмокнула, і, калі вы не ведаеце, як гэта, паспрабуйце самі і не шкадуйце — нічога лепшага дзеля сябе вы б учыніць не змаглі. З мяне адразу ж зрабіўся той стары чалавекалюб, да таго ж у мяне прасвятлела ў галаве. Мне прыйшла ідэя ўзяць Колю на шпацыр.
У “Котве” я накупляў дарагіх апранах, лёгенькіх, летніх, бо вясна была ў апагеі і ад ракі, як і штогод, паціху ўздымаўся пах

насення. Коля апранулася ў абноўкі. Італьянскія жаночыя чаравічкі на тоўстай падэшве спалучалі ў сабе прыземленасць з добрым густам. З карычневых нагавіцаў, заніжаны пояс якіх абдымаў дзявочыя клубы, тырчаў верх бялюткіх спартовых штонікаў з трыма сінімі палоскамі. Жывот быў голы, а белая майка, вельмі кароткая, прылягала да цела, як скурка да банана. Упрыгожанні я прыбраў, акрамя аранжавага сапфіру ў форме каларадскага жука, з пэўным гвалтам уціснутага ў дзявочы пупок, і шнура з перламі, які я павесіў на ейную шыю ажно на Вацлаўскім пляцы. Нешматлікасць аздобаў падкрэсліла як Коліну крохкую вабнасць, так і антыкварную аброжку пад падбародкам — масянжовае колца, што належала колісь шляхетнай сучцы на імя Рэя, легендарнаму высокаму сэтэру князя Шварцэнбэрга.

Мы ішлі, я сперади, яна за мной, манерная, на павадку. Надзіва, я не сустрэў абурэння, якога чакаў; палякі, украінцы, італьянцы або галандцы, што купіліся пад статуяй патрона, не далі сябе ачмурыць і толькі за намі азіраліся — жанчыны здумлёна, мужчыны з зайздрасцю. Коля ўдавала, нібыта нічога ніякага, паводзіла сябе бы турыстка, што знуджана разглядае вітрыны, поўныя золата і крышталя. Мы зажывалі раскошы, я — мерна пацягваючы за павадок даўжынёй роўна адзін метр, а Коля — клыпаючы за мной караценькімі крокамі і сочачы, каб ззаду не наступіць на мае лакаваныя туфлі. Гэтая асцярожнасць мяне ўчаравала, яна ж бо рабіла тое не са страху, а ад шчырага жадання не быць у дакуку. Калі нас спыніў паліцыянт і спытаўся ў яе, ці не хоча яна скончыць гэтае блазнаванне, Коля, не прамовіўшы ані слова, каб не адкрыць сваёй чортавай, прыкрай, праблематычнай асобы, цмокнула мяне ў лысіну, па якой ужо сцякалі ручайкі свярблівага поту. Жэст быў такі пяшчотны, што паліцыянт адкаснуўся і знік, тым часам як я, агаломшаны гэтаю прыгажосцю самавалодання, папляскаў дзяўчыне па адтапыранай попцы. Я яе так выгульваў яшчэ з паўгадзіны, а потым завёў у відэапракат, каб яна сабе ў якасці ўзнагароды што-небудзь выбрала. Узяўшы “102 далматынцы”, фільм для сямейнага прагляду, яна даверліва пашыбавала за мной у маю бакоўку. Я ўключыў ёй відэамагнітафон, а затым зварыў пару яек, накроіў іх на колцы і ў сярэдзіну жоўтых мішэняў паклаў па грудку чырвонай ікры. Тая вячэра

выглядала як крывяныя вочы, але Коля не зважала ні на што, акрамя стракатых сабачак на экране, і ела, нібыта сляпая. Так скончыўся ўдалы дзень. Зрэшты, я мушу пра нешта згадаць: дарогай назад, на Карлавай, мы спаткалі тую амерыканскую бабізну — адна аметыставая завушніца красавала ў яе правым вуху, другая падзелася бог ведае дзе. Ейная вушніца была гэтак тлустая, што не давала ўпрыгожанню натуральна гайдацца, зрэшты, гэта выглядала не горш, чым калі цялушцы вешаюць у вуха пластыкавы трохкутнічак з нумарам заводу.
На Вацлаваку мяне бачыў знаёмы мастацтвазнаўца, і сказ пра тое, як я шпацырую з расейкаю на павадку, хутка абляцеў Прагу. Усе мае сябры — эксперты ў прыгожым, і не дзіўна, што яны запраглі пабачыць німфу на ўласныя вочы. Тады я разаслаў дванаццаць запрашэнняў на вечарынку, якую надумаў зладзіць у сваім антыкварыяце, і на кожным уласнаручна дапісаў: *гэта будзе нешта абсалютнае*.
Вядома, гэта таксама была рэч высокадалікатная, і я пачаў сумнявацца, як да яе паставіцца Коля. Я вырашыў выпрабаваць яе. Праз пару дзён пасля ўрачыстай прагулянкі я пасадзіў яе ў бідэрмаерскі фатэльчык і ўпаіў шампанскім. “Московское игристое!” — віскнула яна і за дваццаць хвілінаў выпіла амаль усё, я толькі аблізаў шырокую шклянку з калекцыі Кінскіх, паставіў яе на срэбны антверпенскі паднос ля другой шклянкі і пустой бутэлькі ды паслаў з гэтым Колю ў бакоўку. Да завесы яна дайшла пэўна, мо крыху прыгнуўшыся, як Пізанская вежа, аднак таца на ейнай руцэ стаяла надзіва раўналежна да гладзі Влтавы. Але тут яна азірнулася на мяне, закруціла попкай і паслала мне паветраны пацалунак — і вось старажытнае гатунковае шкло абрынаецца на падлогу і аскепкі так перамешваюцца, што іх не змагла б перабраць ані мая папялушка.

“Преступление и наказание, ты знаеш?” — падступіў я да яе з узнятым пальцам.
Яна сарамліва кіўнула і прамармытала: “Читала в школе”. Перахілілася цераз прылавак і падняла спаднічку, чакаючы гарэзлівага плескача, але ж дзяўчо памылілася. Я загадаў, каб яна не варушылася, і адышоў у каморку, дзе ў мяне за фальшывым Маржакам[2] схаваны сейф. Я выцягнуў з яго сярэднявечны штылет з тронкам, абкладзеным яспісамі ды

агатамі, трохкантовы кінжал, што некалі належаў самому Яну Очку з Влашыму, біскупу і прыяцелю імператара Карла.
Я спусціў дзеўцы майткі і распісаўся ёй тонкім лязом па далікатнай скуры клубоў, пакінуўшы на іх сваю **мініятуру**, злева *М*, справа *У*, ініцыялы шанаванага сярод мастакоў Макс Унтэрвасэр. Было трохі крыві, чатыры кроплі, тры справа, і я іх гулліва, за адным разам, злізаў сваім **шматлікім** языком. Коля ані не піскнула, і я набыў пэўнасці, што суботняя імпрэза для маіх калег не можа скончыцца няўдачай.

2. Юліуш Марыяк (1832—1899), імяніны мастака.

Вечарынка пачалася, калі прабіла дзевятая. Перад крамай гарэлі паходні, у вітрыне стаяў грамафон, на якім пад велізарнай запыленай трубой круцілася чорная кружэлка Марыі Калас, што спявала тужлівую арыю злоўленай птушачкі. Кожны госць уваходзіў да мяне з адпаведным настроем. Зборка, вядома, была мужчынская, аднак я запрасіў і дзвюх дам, адну знаёмую галерыстку і адну мілую журналістку, якую рэгулярна сустракаў на вернісажах. Калі грамада ўладкавалася на мяккіх выразаных крэслах з пурпуровай абіўкай, прывезеных літаральна за дзень да таго з занядбанага замку ў Кастамлатах, я раздаў гасцям дванаццаць майсэнскіх талерачак з розным змесцівам. Тут была палавінка авакада з крэветкавым маянэзам, крабавая салата са зразковым сельдэрэем, кумпяковыя зразы з хрэнавай смятанкай, запечаны памідор з печарковым паштэтам… Усе ласункі былі розныя, і ўсе іх я згатаваў сам. Затым я заклікаў гасцей мяняцца далікатэсамі між сабой — бо я ж добра ведаю, што ніхто не есць усё, — і цешыўся, назіраючы, як усе касавурацца на запечанае да пазалоты галубянё, што перапала абаяльнай журналістцы, але, нягледзячы на гэта, кожны ўпарта трымаецца свайго, і як ніхто не хоча віновай дамы ў выглядзе не самай свежай рачной ракавінкі ў матавых пералівах, напоўненай сочывам з брусніцаў і чорнымі парэзанымі алівамі, якая зусім выпадкова дасталася майму канкурэнту, пыхліваму антыквару з Карлавай вуліцы. Шампанскае, аднак, не мінула нікога, гэтым разам не нейкія савецкія бурбалкі, а французскае шампанскае “Pére Poulliton’98”, брутальна сухое.
Паеўшы і папіўшы, госці пачалі ёрзаць, і нехта спытаў, дзе я схаваў сваю рускую прыгажуню. “Беларускую”, — паправіў я і дадаў, што Коля мусіць падрыхтавацца. Раздаўшы гасцям шакаладныя цукеркі з лікёрам, я ўключыў кававарку і паставіў

на грамафон Пятую сімфонію Бетховена; Нью-Йоркскім філарманічным аркестрам у шалёным тэмпе дырыжаваў Артура Тасканіні. Затым я зацягнуў перад прылаўкам ружова-фіялетавую аксамітную завесу, пагасіў жырандолю і адступіў убок.
Счакаўшы фіналу першай фразы сімфоніі, я разгарнуў завесу і падняў іголку з кружэлкі.

У гасцей заняло дух, службовец з магістрату ўпусціў фаянсавую філіжанку з кавай, пачуўся бразгат і лаянка над абпаранаю нагою. Ахутаная шыза-блакітным цыгарэтным дымам, у святле дзвюх жоўтых мадэрных лямпаў, у магільнай цішы на прылаўку ляжала Коля. Абапёршыся на локці, яна прыўздымала тулава і галаву, аднак ейныя ногі, нядбала пакладзеныя на механічную касу, уздымаліся яшчэ вышэй. На ёй не было ніякага адзення, нават шматка бялізны, і ўсё ж яна не была зусім голай. Рукой я запрасіў гасцей узняцца і падысці бліжэй. Яны абступілі нас наўкол, усё яшчэ знямелыя ад прыгажосці і, відаць, таксама, але хіба толькі крышачку — ці варта і згадваць, — ад узрушэння.
Восем аднолькавых вялікіх завушніцаў, восем святлючка-зялёных смарагдаў, асаджаных у жоўтае золата, віселі ў Колі не з вушак, а проста з шыі, роўненькім колам на ўзроўні гарляка, куды іх яшчэ па поўдні ўваткнулі мае па-дзіцячы тлустыя, мяккія пальцы знаўцы сапраўднага мастацтва; пачырванелая скура горла, апрацаваная спіртовай настойкай і гаючаю маззю з рамонкаў і наготкаў лекавых, даўно набыла адпачатны малочны колер.
“Каралі з завушніцаў”, — затрымцеў нечы галасок, а набраклая рука пацягнулася да Колінага азалочанага, асмарагдаванага горла, ажно мне давялося двойчы выцяць па ёй Анчэрлавай[3] дырыжорскай палачкай, і толькі потым свавольніца вярнулася назад, у прыцемак вакол прылаўку, у цёплую інтымнасць кішэні вельветавых нагавіцаў.
Гэтаксама як шыю, я праткнуў Колі і бледныя смочкі, але ўжо не васьмю завушніцамі, а дзвюма сукоснымі брошкамі з белага золата, абкладзенымі дробнымі шызымі дыяментамі.
“Брыльянтавы станік”, — гукнула галерыстка, і я выразна пачуў, як яна суха каўтнула, пранятая неадольнаю прагай тае балеснае прыгажосці.

“А зараз, спадары і спадарыні, паглядзіце сюды, — сказаў я тонам балаганнага штукара, — такога эратыкону вы яшчэ не бачылі”, — і пяшчотным, ласкальным рухам праслізнуў Колі паміж каленяў і развёў ёй ногі.

У цёмнай лагчынцы ейнага ўлоння заблішчэў каштоўны камень. Галерыстка ссінела. Службовец застагнаў. Журналістка заскрыгатала зубамі.

Палавыя пінскія вусны, гэтаксама як паружавелыя шчокі, пранізваў у Колі бранзалет з чырвонага золата.

“Шаноўная публіка, як бы вы патлумачылі гэты цуд — выскаляўся я і песціў свой зрок выглядам гэтых ружовых, утаропленых вачэй. — Пірсінг — учорашні дзень, цацкі для сузіраеце найвышэйшае дасягненне бодыарту. Цяпер што з вас бачыў калі шыкоўней убраную вульвачку?”

Ніхто не кіўнуў на знак згоды, ніхто не захітаў галавой, усе толькі тарашчыліся на ўпрыгожанне, якім бранзалет быў аздоблены, — на тыгровае вока, бэжавы камень, адшліфаваны ў форме вочнага яблыка і пазначаны шляхетнай аранжава-карычневай плямкай, якая дзіўна нагадвала вясёлкавую абалонку. Камень быў прасвідраваны наскрозь і трымаўся на метале вольна, як пацерка, а каб не з’ехаў убок, золата бранзалету было паабапал прыплюшчанае. Як жа мне ўдалося прашпігаваць ім сваю перапёлачку? Таямніца шэф-кухара.

У той момант, калі госці гэта ўсвядомілі, я міргнуў Колі, а Коля міргнула мне. Між ног забіла крыніца, і тыгровае вока закруцілася, бы млынок на рэчцы. Антыквар з Карлавай вуліцы, з пысаю між дзявочых каленяў, дастаў у самыя ноздры, але душ не мінуў нікога з нас, ані жанчынаў, ані мяне; толькі цяпер зрабілася ясна, хто сярод нас, знаўцаў мастацтва, Саўл, а хто Павел, бо палітыя крамнікі ўцякалі з антыкварыяту, як гандляры, выгнаныя з Храму, а сапраўдныя аматары хараства і надалей, як зачараваныя, лупілі вочы на тыгровае вока, што круцілася ў пырсках неадольнага струмяня.

Аднак жа… Ні адсюль ні адтуль, мо падпільноўвала знадворку за вітрынай ды нехта пры ўцёках пакінуў дзверы адчыненыя, мо спусцілася да нас з каласнікоў, як у оперы, аднак раптам яна апынулася сярод нас, гэтая боская постаць, deus ex machina, зусім не бос расейскай мафіі, а тая амерыканская баба, якая з партфелем пад пахай прыскакала вычысціць

3 Карэл Аленар (1908 — 1973) — знакаміты польскі дырыжор і кампазітар. На Францыску — цыцінгер у Празе.

Аўгіевы стайні. Службовец дастаў партфельнага грымака, галерыстка — поўху, антыквар з Карлавай вуліцы — выспятка ў пахвіну. Мяне яна пакінула на канец, і апошняе, што я пабачыў, была Коля, як яна ў жаху коціцца з прылаўку, бразгаючы ўсёй той раскошай, якую я ўправіў у ейнае цела. Потым бліснуў катаў меч, які дзве не на жарт абураныя жаночыя лапы сарвалі са сцяны, і запаліў у маёй нявартай галаве апошняе святло, за якім настала вечная цемра.

Галаву мне На Францішку[4] скляпалі, але вочы ўжо не. Не ведаю, дзе падзелася Коля, мо яна ў Даласе, мо зноў у Пінску, мо бясконца вандруе ў купэ экспрэсу Прага—Вена, як той забыты парасон, мо яе сапраўды нехта замардаваў і, захутаную ў стары персідскі дыван, закінуў у кантэйнер перад домам. Але я не маніў, калі тады на вакзале прызнаўся ёй у каханні: я кахаў яе так, як кожны эстэт абагаўляе прыгожыя рэчы, і дарма што ані хараства, ані брыдоты мне ўжо ніколі не ўбачыць, я ні пра што не шкадую і жадаю Колі, калі яна толькі жывая, каб яна за мае ўпрыгажэнні купіла сабе мужа, які б зразумеў, што яна была створана паводле вобразу Божага, і ў адпаведнасці з гэтым з ёй абышоўся.

Пустка

Я пачапіў сабаку шворку, і мы, як і кожны вечар у выходныя, пайшлі на пустку. Была нядзеля, Сёмуха; для мяне гэта не мела ажно такога значэння, але жонка ў святы хадзіла на імшу, перад ядой чытала мне Евангелле ад Лукі, а ў гаворцы мы абміналі непрыемныя тэмы. Я ў касцёл не хадзіў, але шанаваў святы дзеля яе і навучыўся знаходзіць у днях, якія б раней палічыў за звычайныя, небудзённае хараство.

За апошнім домам, былой кузняй, якую новыя гаспадары перабудавалі так, што не пазнаць, я, як заўжды, адчапіў сабаку павадок ад ашыйніка ды пусціў яго бегчы. І Кукі, даўгашэрсны такса, пялегаваны гаспадыняй і прыязна прыманы мной, пабег пратаптанаю сцежкаю ўгору. Ён быў у нас ужо тры гады, з таго дня, як жонка прынесла з прытулку калматага шчанюка, а разам з ім і гэтае неверагоднае імя, на якое, аднак, звераня

кемліва адгукалася. Мне здаецца, што ў нас ён распесціўся. Сцяжынка бегла насустрач пакатай вяршыні пагорка. Палова лугу над шашой, на правы бок ад сцежкі, стаяла скошаная і жоўтая: у пятніцу пачалі сенаваць. Другая палова, тая, што ўлева, бліжэй да лесу, па-ранейшаму зелянела дзікай травою, з рознакаляровымі плямкамі лугавых красак. Вечар быў цёплы, нібы на зыходзе чэрвеня, хоць да канца траўня яшчэ заставалася больш за тыдзень. З лесу, што чарнеў на тле бірузовага неба, азываўся птушыны спеў. Над лугам таўклі ступкі мушкі, зіхацелі ў промнях пацяжэлага сонца і лезлі мне ў твар, але не кусаліся. Вецер быў лёгкі, павеўны. Высока над небакраем распроствалася й паволі барвовела ружовая аблачына.

Я быў амаль на вяршыні, калі мяне напужаў сабака. Не мой, чужы. Ён бег мне насустрач па сцежцы ціха і борзда, таму я заўважыў яго не адразу. Спыніўшыся, я пацягнуўся ў кішэню па свісток, але жывёліна прабегла міма, нават не забурчаўшы, толькі сцебанула хвастом мне па назе. Гэў была вельмі цёмны, безмаль чорны аўчар з уніклівым позіркам. Ягонага гаспадара ў полі зроку нідзе не было. Кукі таксама знік з вачэй. Я свіснуў яму — без адказу. Засвістаў зноў, і сабачка да паловы высунуўся з асакі, дзе на сваіх каржакаватых лапках быў амаль нябачны. Разявіўшы зяпу, ён па-сабачаму ўсміхнуўся і цяўкнуў. Я агледзеўся. Па аўчару не стала і следу.

Пашкрабаўшы Кукі за вушыма, я ўпэўніўся, што ашыйнік з медальёнам на месцы, і кінуў сабачку камень, выдлубаны са сцежкі мыском чаравіка. Я, мабыць, перастараўся, бо кругляк пераляцеў цераз вяршыню пагорка і знік у мяне з вачэй. Кукі адважна рынуўся за ім.

На спіне ў мяне засвярбела ад поту. Я расшпіліў спачатку адзін, а тады другі і трэці гузік кашулі, высмаркаўся ў папяровую насоўку і выцягнуў з кішэні чыстую. У мяне шчыпала ў носе, пякло ў вачах і ў горле, нібыта я выпіў “Fairy”. Навокал цвіло шчаўе, чабор і халера ведае што яшчэ, непадалёк я заўважыў два зыркія макі. Сёлета ўсё паспяшала, між іншым і мой алергічны катар. Я выцягнуў з кішэні піпку, набітую яшчэ дома, запаліў і прагна зацягнуўся. Маю галаву ахінула аблачынка тытунёва-ванільнага водару, расцвелены стрававод адразу ж суцішыўся, а мушкі паразляталіся. Люлька так напалілася, што я ледзь трымаў яе ў далоні. Бы святы

агонь, я ўзнёс яе на вяршыню і разгледзеўся па пустцы.

Я тут быў не адзін. Крыху ўправа, над адхонам, парослым хваёвым падлескам, пад якім, пакідаючы горад, вілася старая шаша, гулялі дзеці. Уласна кажучы, гэта былі ўжо амаль не дзеці, і ўсё ж, бадай, пакуль яшчэ так. Дзве дзяўчынкі. Ім было гадоў па адзінаццаць, ці мо па дзесяць, цяжка сказаць. Яны знайшлі сабе забаўку ў маім сабаку; адна гладзіла яго па галаве, другая спрабавала перакуліць на спіну. Мяне гэта здзівіла — звычайна Кукі такі таварыскі не бывае. Я зноў свіснуў яму.
Ён вырваўся ад дзяўчат і падбег у мой бок, але адразу ж вярнуўся. Падскочыўшы ўгору, лізнуў адной з іх далонь, потым перакуліўся на спіну і задрыгаў у паветры ўсімі чатырма лапамі. Дзяўчаты смяяліся, як звар'яцелыя, крычалі, што мне давядзецца забраць яго жывасілам, інакш, маўляў, пакінуць сабачку сабе. Я рушыў да іх.
Адна была светлая, другая — цёмнавалосая. Тая бялявая была драбнейшая і, магчыма, крыху маладзейшая, я прыкмеціў, што яна не зводзіць вачэй з сяброўкі і ўсё ад яе пераймае. Я перавёў позірк на сабаку, каб яны не падумалі, што я іх разглядаю, але, наблізіўшыся да іх, я заўважыў, што абедзве дзяўчынкі стаяць замяшаныя, як не свае. На маё "Прывітанне", вымаўленае як мага ветлівей, яны не адказалі. Не разумеючы, што іх бянтэжыць, я ўзняў руку і зашпіліў усе гузікі, акрамя апошняга. Кукі нібыта здзівіўся, убачыўшы мяне, але як ніколі нічога працягваў задаволена качацца ля дзявочых ног. Раптам цёмнавалосая ўзняла яго з зямлі і прыгарнула да сябе, схаваўшы твар у ягоную поўсць. Ёй давялося паднатужыцца, каб утрымаць Кукі на руках. Такса з асалодай засунула галаву дзяўчынцы пад паху.
"Пусці яго, — сказаў я. — Сабак так не цягаюць. Ён аб'еўся, яму трэба пратрэсціся".
Не паспеў я дагаварыць, як дзяўчынка развяла рукі, нібы даведаўшыся, што сабака паршывы. Кукі бразнуўся на скошаную траву і заскуголіў. Цягнучы нос амаль па зямлі, ён падпоўз да мяне і лізнуў мне чаравік.
"Гэта быў ваш сабака? Той аўчар?" — спытаў я, аднак адказу не дачакаўся. Я заўважыў, што ў тае, якая трымала Кукі на руках, да грудзей, маленькіх і вострых, нібыта каменьчыкі,

прычапілася колькі яго рыжаватых паўсцінак. Дзяўчаты пераглянуліся. Я адвёў позірк, рашуча павярнуўся і пакіраваў да лесу. Такса пацюпаў за мной.
Пыхкаючы люлькай, я рабіў тым большыя крокі, чым менш мне ўдавалася выгнаць з галавы грудкі тых дзвюх дзяўчат. Тая цёмнавалосая, крыху больш даспелая, была ў белай майцы на тонкіх шлейках і ружовых аблеглых шортах у бліскаўкі, што ўпіваліся ў пах. Бландзінка была апранута амаль гэтаксама, на ёй была чорная майка і вузкія кароткія штонікі — светлыя, у вялікія кветкі й запэцканыя. Рукі ў абедзвюх былі тонкія, клубы яшчэ зліваліся з таліяй, але ногі ўжо набывалі аб'ём.

Я азірнуўся ажно каля лесу і адчуў палёгку: адсюль дзяўчат ужо было не відаць і кром мяне тут нікога не было. Я спыніўся ля першага дуба і абапёрся аб яго. Глянцаванае дрэва люлькі зноў запякло ў далоні. Мне трэба было аддыхацца. У нас з жонкай няма дзяцей. Мы гэта доўга адкладалі, а потым раптам зрабілася позна. У мяне даўно магла быць дачка такога ж веку, як гэтыя дзве, падумалася мне, і, хто ведае, мо яна была б падобнай да іх.
"Хадзем", — сказаў я Кукі і нахіліўся, каб папляскаць яго па спіне, але сабака прашмыгнуў у мяне пад рукой і пабег вон.
"Сюды — да нагі!" — закрычаў я, але такса ляцеў туды, адкуль мы толькі што прыйшлі. Я палез у кішэню па свісток, але не паспелі мае пальцы намацаць яго паміж запальнічкай, тамперам для люлькі й пакуначкам папяровых насовак, як Кукі ўжо выбег з лесу. Ён паводзіўся як нявыхаваны шчанюк.
Я паволі прайшоў праз высокую — да калена — траву на скошаную дзялянку. Сонца ўжо хілілася да гарызонту, аднак святло на пагорку нібы яшчэ пазырчэла, набыло больш насычаны тон, у якім ад белага дня не засталося і знаку — у ім быў вечар, паветра, бы густы, цёмна-залаты мёд. З хмараў мушак адна абрала маё правае вока, заляцела ў яго і патанула. Яе смерць не магла быць банальнейшай, але ў мяне за павекам пякло, нібы туды трапіў аскепак.
З насоўкай на воку я зноў падышоў да дзяўчат, якія так і стаялі адны на пагорку, усё гэтак жа без нагляду, але зноў у кампаніі з маім сабакам. Калі б я быў які вычварэнец, Кукі быў бы маім алібі, чаму я ім зноў дакучаю. Аднак гэтым разам яны на яго не зважалі. Не звярталі ўвагі і на мяне, нават калі я спытаў, ці

няма ў іх кішэннага люстэрка, бо мне нешта трапіла ў вока. Проста не рэагавалі. Тое пытанне ўсё адно было лішняе, бо й аднавокі б заўважыў, што ў іх, акрамя іхнай адзежы й пантофляў, нічога няма.
Цяпер яны выраблялі нейкія штукі. Чарнявая неяк асабліва, у невядомым рытме гайдала рукамі, узнімала вочы ўгору і высокім галаском падахвочвала другую, каб тая ўсё паўтарала за ёй; вочы трэба шырока расплюшчыць і закаціць як мага далей, каб зрэнкі, як яна выказалася, не надзілі мух, аваднёў і птушак. Яны кантралявалі адна адну, ці змогуць закаціць раёк так, каб былі відаць адно нязрушныя бельмы. Пры гэтым у іх ад напружання трэсліся вейкі, а вусны ўцягнуліся ў рот у старэчай грымасе — раптам перада мной стаялі дзве маленькія, маладзенькія бабкі. Дыхалі яны ненатуральна: павольны працяглы ўдых, доўгая затрымка паветра ў лёгкіх і рэзкі, з кашлем, выдых. Бландзінка, робячы тое, што ёй загадала цёмнавалосая, у дадатак высалоплівала язык. Знячэўку яна збялела й павалілася на мурог. Можа, страціла прытомнасць ад раптоўнага абяскроўлення мозгу, не ведаю. Я зрабіў крок да яе, але праніклівы позірк ейнай сяброўкі, вочы якой зноўку былі на сваім месцы, мяне спыніў.

“Забярыце свайго кудлу”, — буркнула тая і паказытала бландзінку за нагу. Кукі, што абнюхваў твар ляжачай дзяўчынцы, добра адчуў перамену настрою і здзіўлена павярнуўся да мяне. Самлелая ачуняла ў слязах, ёй было блага. Сабака радасна цяўкнуў, падскочыў да чарнявай і перакуліўся на спіну. За гэта ён атрымаў такога выспятка, што аж пакаціўся. Моўчкі я ўзяў яго на рукі і панёс. І пусціў, толькі калі мы зайшлі ў лес.
Дрэвы тут пасадзілі ўсяго гадоў сто таму, і хоць паблізу да сёння стаіць абжытая леснічоўка, з гаю стаўся цяпер хутчэй лесапарк, дзе ў выходныя лётаюць веласіпедысты. Даўней тут было гэтак жа гола, як і на пустцы, раўніна паступова ўздымалася і круглілася ўзгоркам над горадам ды лукавінаю рэчкі. Сам гарадок некалі абкружалі невысокія ўмацаванні, ад якіх засталіся толькі тры вартавыя вежы. Голы верх ніколі не вянчала шыбеніца, заўсёды там быў разлеглы выган для быдла з хутароў ды з млыну, што стаяў на беразе рэчкі. Недзе тут, кажуць, адвеку была жывадзёрня, якую збурылі пасля вайны.

Сам я падчас сваіх прагулянак ніякіх руінаў не бачыў.
Я прывёў Кукі да нашай звычайнай мэты, у сярэдзіну лесу, дзе крыжаваліся шэрыя, пасыпаныя друзам сцежкі. На скрыжаванні тырчаў вялікі камень, называны Чортаў Ікол, ці, як казала моладзь з гораду, Чортаў Хер. Вышынёю безмаль тры метры, наверсе звужаны і спічасты, ён і праўда нагадваў зуб ці ікол нейкай пачвары. У часы, пакуль камень яшчэ не згубіўся сярод падросłых дубоў, ён мусіў дамінаваць над мясцовасцю, нібы змрочны маяк.
Часцяком тут гулялі дзеці; абапёршы ровары аб камлыгу, яны караскаліся ўгору, дзе праз недахоп месца за раз маглі ўтрымацца сама большае трое; яны затым баранілі сваю крэпасць, а астатнія яе адваёўвалі. Вечарамі тут сыходзіліся падлеткі, па двое або кампаніямі, і хоць на дзвюх найбліжэйшых хваінах віселі шыльды з забаронай паліць ды раскладаць агонь у лесе, прычым пад пагрозай вялікага штрафу, вакол Чортавага Ікла заўсёды валяліся недапалкі. Сёння мы тут былі адны, але цэлы тыдзень было пагодна, светлыя вечары рабіліся даўжэйшыя — да Купалля заставаўся ўсяго месяц, — і бычкоў за тыдзень тут назбіралася ўдосталь. Кукі мужна трываў пах люлькі, але ненавідзеў смурод цыгарэт, асабліва пагаслых. Звычайна ён трымаўся далей ад Чортавага каменя, аббягаў яго наўкол і тэатральна чмыхаў, аж пакуль я не выкрочваў дадому. Аднак цяпер ён мяне падзівіў. Падбег да скалы, правёў па ёй носам і падняў заднюю лапу.
Я абапёрся аб халодны граніт. Утрамбаваўшы гарачы тытунь, я паказытаў яго агнём і ўгледзеўся ў колца дыму, што ўзнялося над каменем і паплыло ў бок пусткі.

Як з імі варта было трымацца? — разважаў я. — Сказаць, каб каціліся дамоў, бо ноч ужо блізка і дзецям няма чаго рабіць на дварэ? Альбо параіць ім гэта як дзяўчатам, што могуць натрапіць на непрыемнасці?.. Не, лепш не трэба. Гэта толькі выклікала б збянтэжанасць. Карацей, настаўнік з мяне б не выйшаў, не ўмею я размаўляць з гэтымі недаспелымі чалавекамі. А тыя дзве да таго ж былі брыдкія, варожыя — чужынкі, што хоць і гавораць адной са мной моваю, але словы для іх нібы маюць зусім іншы змест.
Я ўваскрасіў у памяці тыя часы, калі сам быў у іхных гадох. Гэта было не так цяжка. Хлапчуком я многа чытаў, у мяне была

пара сяброў, ды тыя ані блізка не маглі пераважыць прыцягальнасць прыгодаў, якія мне давалі кнігі. Дзяўчат я не заўважаў, быццам тады, нейкіх трыццаць гадоў таму, наўкол мяне не было ніводнай, пры гэтым я ведаю, што з пятага да дзевятага класу нас было трыццаць чатыры, і стасунак дзяўчат і хлопцаў быў фіфты-фіфты. Не памятаю, што я думаў пра адзінаццацігадовых аднакласніц, калі ўвогуле нешта думаў, але тую іх звычайную школьную блізкасць я, мабыць, праспаў і прачнуўся ажно тады, калі яны ўжо былі больш дарослыя, чымся я.

Ну, у тых дзвюх малпаў на пустцы на гэта час яшчэ ёсць, падумаў я задаволена і выплюнуў едкі тытунёвы сок, што незнарок трапіў мне на язык. Толькі, цікава, колькі? І што яны там, к д'яблу, выраблюць? Можа, гэты свой працэс даспявання хочуць неяк прыспешыць? Нязграбныя рукі і ногі, грудзі, як вузельчыкі, срачка, што толькі намінкаю надзімае пляскатасць дзіцячага тулава… Ім гэта ўжо ладна прыелася, ды застаецца толькі чакаць. А потым, аднаго дня, вылезе на падбародку ірдзяны знак непакоры, і ўсё будзе інакш.

Я выбіў люльку пад ногі і гукнуў Кукі. Гукнуў другім разам, а потым і трэцім — ён не азываўся. У лесе пахаладнела і пацямнела, паветра набракла вільгаццю. За руку мяне ўкусіў камар, а над вухам загулі яшчэ два. Я адмахнуўся ад іх, пляснуў сабе па шыі, і на далоні засталася крывавая пляма.

Я абышоў скалу, потым яшчэ раз, пасля пашырыў кола за дрэвы. Не перастаючы гукаць і свістаць, я вырашыў пару хвілінаў счакаць. Калі яны прамінулі, а Кукі не паказаўся, я шырокімі крокамі пакіраваў у бок пусткі. Мне не хацелася, але ў мяне было адчуванне, што шукаць трэба там. Ці мо сам вярнуўся дадому? Але так ён ніколі яшчэ не рабіў.

Кветкі ў высокай траве пазакрываліся. За вяршыняй узгорку, на ўскудлачаным цьмяным гарызонце, што ў насталым змроку здаваўся бліжэйшым, вынырнулі дзве валасатыя галоўкі. На маё здумленне, дзяўчаты ўсё яшчэ там былі, а з імі — заспадзяваўся я — і гэты нявыхаваны цюцька.

Але ж сабакі там не было — толькі дзве гэтыя ведзьмы. Стаялі адна насупраць другой на адлегласці ў пяць-шэсць крокаў і дзіўна варушылі рукамі, як у запаволеным фільме. Суладнасць рухаў вымагала практыкі: тым часам як правае прыдалонне ў іх

варочалася да цела, левае абярталася ў адваротным кірунку і штохвілі перапынялася, пры гэтым далонь быццам адпіхвала нябачнага ворага. Падобна, што гэтым яны займаліся ўжо доўга, бо ў апошніх промнях святла на іхных плячох зіхацеў пот. Тым не менш, яны былі вельмі бледныя, з пасінелымі вуснамі, нібы ім мала было кісларoду. Не дзіва, што дыхалі яны, як сухотніцы.

Я падышоў да іх і спытаў пра сабаку. Ледзьве я выславіў пытанне, абедзве павярнуліся да мяне, але сваёй настырлівай пантамімы не кінулі. Выглядала гэта жудасна, быццам яны былі ў трансе. Да таго ж яны зусім не маглі мяне бачыць, бо, закаціўшы вочы, патрапілі вылупіць на мяне адно шкляныя сіняватыя бельмы. Я гукнуў сабаку імем, прарэзліва і сярдзіта, ажно ў мяне падарваўся голас. Крыху разяўленыя раты дзяўчат скрывіліся ў нацягнутую ўсмешку.

Яны перамаглі. Я пакінуў іх там і азірнуўся толькі метраў праз пяцьдзесят. Яны стаялі ў тых самых паставах, павярнуўшы да мяне твары са сляпымі вачыма, і варушылі рукамі, нібы мне на развітанне махалі два ажыўляныя ветрам гародныя пудзілы.

Я не пераставаў гукаць Кукі. Свісток я згубіў недзе ў лесе.

Я абышоў пагорак яшчэ раз, далёка абмінаючы гэтых смаркачак, і толькі калі выйшаў месяц, развярнуў стаптаныя ногі дамоў.

У гэты момант я спатыкнуўся. Недалёка ад былой кузні, там, дзе сцежка, што дзеліць пустку на скошаную й зарослую часткі, ператваралася ў заасфальтаваны ходнік, нешта стаілася ў траве. Я зачапіўся за гэта мыском чаравіка, як раней за каменьчык, і аўтаматычна нахіліўся, каб загадаць Кукі “Апорт!”. Але ж сабака быў немаведама дзе, а гэта быў не каменьчык. Гэта была частка нейкай жывёліны, кароткая і мускулістая, у святле паўмесяца фіялетава-шызая, з праблiскам жылак, зацягнутая дзе-нідзе плеўкай; нага, вырваная з суставу і збаўленая поўсці, яна неадчэпна нагадвала трусінае сцягно, толькі пасаліць — і на патэльню. Мяса не смярдзела, было свежае. Тым не менш мяне пацягнула на ваніты, калені затрымцелі. Мне патрабавалася апора, але побач нічога прыдатнага не было. Зверху да мяне даляцеў нейкі гук. Я прыслухаўся. Там хіхікалі дзеці.

З таго часу я на пустцы не быў; сабака да нас не вярнуўся, а іншага мы сабе не прыдбалі. Жонка спыталася толькі раз, у той

самы вечар, на Сёмуху, дзе Кукі і што з ім здарылася, і я ёй сказаў, каб яна, дзеля бога, зараклася ў мяне пра гэта пытацца.

Пераклалі з чэшскай Сяргей і Юлія Сматрычэнкі
паводле аўтарскага арыгіналу

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/30
[image]

ІРЖЫ КРАТАХВІЛ (нар. у 1940) — празаік, драматург, эсэіст.

Іржы Кратахвіл

Наведнікі

Пераклад зроблены з ласкавае згоды аўтара і выдавецтва “Petrov” паводле тэксту, зьмешчанага на сайце выдавецтва: www.ipetrov.cz

Ужо пару гадоў мінула, як з мной гэта здарылася. Я недзе быў затрымаўся да досьвітку, і нехта прапанаваў адвезьці мяне дадому, бо ўсё адно, маўляў, едзе да Іванчыцаў, а адтуль ужо рукою дастаць да мяне, да Мараўскага Крумлава. Мы выблыталіся з брненскіх вуліц і на сьвітанку выехалі на шашу, якая тою гадзінай была пустая. Чалавек, што ўзяўся мяне падкінуць (рэквізытар з тэатру “Гусь на шворцы”? — ужо ня памятаю), распавядаў дарогаю нешта пра новыя сыстэмы бясьпекі, і за іх падрабязным апісаньнем нам выдатна бег час. Не пасьпелі мы й вокам міргнуць, як апынуліся перад Іванчыцамі. Кіроўца прыгамаваў і сказаў, што тут мусіць быць дарога напрасткі, зьезд уніз да мястэчка, але, маўляў, нешта тут ня тое, бо тая дарога ніколі не пачыналася ў ляску. І спытаўся ў мяне, ці ўсё ж нам не рызыкнуць. Я кіўнуў — а што мне было рабіць?

Мы павярнулі ў лясок. Ужо амаль разьвіднела, але кіроўца ехаў павольна, гледзячы на ўсе вочы. Я папрасіў яго спыніць на хвілінку. Вылезшы, я зрабіў пару крокаў да найбліжэйшага дрэва, але потым зірнуў на кавалак неба між вершалінаў і так спалохаўся, што адразу ж забыўся, чаго я там хацеў. Мой спадарожнік, які тым часам таксама вылез з машыны, зьбіраўся запаліць цыгарэту, але, узьняўшы вочы на неба, імгненна засунуў цыгарэту назад у пачак, а сябе назад у машыну. Выруліў задам назад на шашу і моўчкі завёз мяне, як абяцаў, у Мараўскі Крумлаў, не сказаўшы ні слова на разьвітаньне, а я, у сваю чаргу, забыў яму падзякаваць.
У Брно на Копэчнай вуліцы, пад тэрасамі Пэтрава, жыве мастак Ян Зузьяк, які ў той час якраз перабываў у працяглым творчым крызысе і зусім не пісаў. Зрэдзьчас я завітваў да яго пагаманіць.
Уяві сабе, неяк сказаў ён мне, мо зь месяц таму я вярнуўся начным цягніком з Прагі і быў такі здарожаны, што адразу ж пайшоў спаць, хаця ўжо быў амаль дзень. І мне прысьнілася — ты ж ведаеш, што я занатоўваю сны, — мне прысьнілася, што ты некуды зь некім едзеш, вы спыняецеся, ты ідзеш да дрэва, а ён хоча запаліць цыгарэту, але не запальвае.
Аднак я ня даўся, каб ён мне тлуміў галаву: ясная рэч, ты пра гэта ведаеш ад рэквізытара, ці хто ён там быў, той, што мяне тады вёз. Цікава было б даведацца, што ён табе ўвогуле пра тую паездку нагаварыў.
Але Зузьяк зьдзіўлена зірнуў на мяне. Ён не разумеў, пра што я кажу. Урэшце ён зьмяніў тэму і спытаў, ці памятаю я яшчэ Доўбраўку, яна, маўляў, зноў пачала пісаць. Прычым адразу ж фрэскі на столі! Ходзіць да сяброў і, калі будзеш вароны страляць, прыцягне лесачкі і ўладкуецца ў цябе пад стольлю. Але не лякайся, красьлюнкі крыху дзікаватыя. І адчыніў дзьверы ў пакой, дзе ён спаў. Калі я там паглядзеў на столь, кроў ува мне застыгла.

Не дуры, зьдзівіўся Зузьяк, цябе што, так захапілі гэтыя вычварэньні Доўбраўкі?
Гэта цяжка растлумачыць, давай пра гэта ня будзем.
Але паспрабую гэта высьветліць прынамсі вам.
Вядома, што ў той фазе сну, у якой нам нешта сьніцца (яна называецца ангельскім скаротам REM), нашыя вочы імкліва

рухаюцца. Я думаю, што пры такой імпэтнай дзейнасьці вочы могуць націснуць на вейкі — і тыя трошкі расплюшчацца. Калі вакол цемра, а пераважна так і бывае, на сон гэта ніяк не ўплывае. Але ж Зузьяк пайшоў спаць ужо ранкам, пры дзённым сьвятле, і мог, такім чынам, шчылінкаю між веек пабачыць у сьне кавалак столі. Гэтым высьвятляецца тое, што мы бачылі на ўцінку неба: жахлівыя фрэскі Доўбраўкі! Мы відавочна заблукалі ў Зузьякаў сон. Вось жа, цяпер я па часе вельмі рады, што мы трымаліся там прыстойна: кіроўца не запаліў, а я не зрабіў таго, што хацеў зрабіць. Каб жа ж так сябе паводзілі і наведнікі маіх сноў…

Пераклаў з чэскай Сяргей Сматрычэнка

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/09/28**
[image]

[image]

A R C H E

П а ч а т а к

№ 4 (27) – 2003

[image]

[image]

[image]

ЯЗЫКА ЛІТОМ
Ярыка [image] 2003
аналітыка • эсэістыка • крытыка • рэцэнзіі

Яхім Топал

У горад

У ночы бяссоньня
недзе ў цемры лунаюць абліччы
тут і там раптам вылузьне твар
кагосьці каго ты ведаў
і зьнікае калі пачынаюць хадзіць трамваі.
Гэта ведае кожны вар’ят.
Сёньня ўночы таксама зноў у тым самым доме
поўным чэхаў у нашай у іх уласнай рэальнай дзяржаве.
Гэта напэўна лепш за бамбардаваньне
вядома ж.
Спаць ня трэ’ паміраць кажаш ты кажа нехта
ў табе. Але ўсё так няпэўна.
Пакрысе па мурох паўзе цень і хвіліны
ўжо там месяц. Гэта нібы мінулыя жыцьці.
Калі б ты выйшаў у горад
ты адчуў бы яго да апошняй цагліны.
Гэта можна спасьцігнуць.
Тут і там на вятры
сьмецьцевы кантэйнэр скавыча бы нешта жывое.

ЯХІМ ТОПАЛ (Jáchym Topol, нар. у 1962) — паэт, пісьменьнік, перакладчык, найбуйнейшая постаць літаратурнага андэрграўнду. Выбарка тэкстаў і пераклад выкананыя з ласкавага дазволу аўтара і гурту “Psi vojáci”. Пераклад зроблены паводле: www.psivojaci.cz/html/sestra.html

Агнявая вада

Сястра мая — Агнявая вада
я кажу ёй: каханая
яна кажа мне: мілы
мы кажам адно аднаму: я кахаю цябе.
І п’ем Агнявую ваду.
Каля сестрыной галавы
сёньня месяц пазбавіць мяне небясьпекі.
Я плыцьму ў вадзе
моцы агня покуль зранку ня ўстану
і не падамся
паўзь цемру навобмацак калідорам з паддашку
Сястра мая Агнявая вада
у яе раскудлачаныя валасы раніцой яна скажа: ідзі на працу
я думаю: бяру колькі хачу даю колькі магу
і мы кажам адно аднаму: я кахаю цябе.
Месяц пячэ і мы ўдвох нас нясе Агнявою вадою
скура на скуры і ўсё
ёсьць істотным. Сястра. Гэтай ноччу
Ты зы мною ў сьне
і пасьля. Шум подыху, дотык пазногцяў
ў рытме мозгу й крыві. Сястра.
Будзь побач. Бліжэй. Ты Агнявая вада.

Дзе-кольвек

Якім-кольвек наступным рухам сваім
Бог скасуе тэатры й актораў.
Альбо ён іх пакіне ў іх грыме
курчыцца поўзаць мінаць
пакіне іх гаварыць. Дома. Між іншых.
У пакоі між сьценаў. Там будзе паветра.
Там будзе каханьне бы расьліна на падваконьні.

У дарозе

Два птушаняты сядзелі на дрэве
нібы ў пракавецьці.
І кроў выглядала таксама
хіба што была гусьцейшай. У сетцы па-над галовамі
пад лямпачкай скручваліся валізы
уверсе каля павуціньня.
Я трымаў гэта ў галаве.
У чакальні быў гандаль: газэты улёткі кветкі
посуд шмоткі і шлёндра і я паміж падарожных
пазнаў д'ябла мужчыну што хоча забіць і мужчыну
што йдзе сам ня знае куды і было немагчыма схавацца
паміж кошаў для сьмецьця і гальля бузіны.
Пасьля я патроху пачаў любіць павука я ўжо ведаў:
у ягоным жыцьці ёсьць сэнс.
Тады за шпінатавай піцаю ў ба́ры я вывернуў
найпякнейшай жанчыне сьвету свае душу і вантробы
і жылка ў мазгох гэты злучок із сусьветам
ледзь ня лопнула.
Яна ўсьміхалася ведала бо пра жыцьцё
і што ўласна кажучы робіць.
На сьценах віселі здымкі сьпевакоў актораў баксёраў
некаторых мы ведалі.
Мы ўсьміхаліся зьлёгку сьвятло блікавала ў іх пысах
а знадворку хадзілі астатнія.
Калі б я абярнуў далоні было б у іх поўна сьвятла
але гэта было непатрэбна.
Я лапаў яе клубы і быў вельмі харошым.
Мы краналі адно аднаго. Я казаў аб сабе брыдоту
пасьля лыбіўся вонкі. Туды дзе стаялі мы.
Было ўсё за шклом. І гэта было таямніча.

"Зараз хадзеце зь мірам" –

мовіў гэты ў сутане згары натоўпу
каляднага люду.
Я цяпер магу бачыць цябе кожнае ночы
Словы "Свабода альбо сьмерць"

выдумаў я. Гэта сёстры.
Калі да мяне па сходах сышоў Дух Сьвяты
у мяне акурат была сутарга
ўнізе вантробаў.
Мяне рэальна прабіла
браце
жыцьцё.
Гэй — я кажу гэта
і жыцьцё маё альфабэт. Я адно
прадукую слоўную масу
ужо толькі тое што скажуць мне клеткі.
Адпрасаваны мозг.
Мая мафія.
Я казаў: Свабода альбо Сьмерць.
Я хацеў і шукаў іх. Цяпер я ведаю: гэта сёстры.
Я сплю зь імі. У адным доме. У маленькай такой
каморцы.
1994
Пераклала з чэскай Марыя Мартысевіч

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/30
[image]

Ружэна Свобада

Дыянка

*Апавяданьне чэскае пісьменьніцы **Ружэны Свобады** ў 1924 годзе было перакладзена на беларускую мову **Янам Станкевічам** на замову **Вацлава Ластоўскага** для ковенскага часапісу "Крывіч", але так і не было апублікавана. Доўгі час яно ляжала ў стосах рэдакцыйных папераў гэтага выданьня. Цяпер захоўваецца ў Беларускім дзяржаўным архіве-музэі літаратуры і мастацтва (фонд №3, вопіс 1, справа 56, арк.11—20). Друкуецца сучасным правапісам.*

1

Яна была лёгенькая і высмуклая, невысокія, загарэлыя босыя ножкі і далікатныя плечучкі, цёмна-шараватыя вочы, як сьвежавылупленыя каштанкі, а валаскі палавыя, на канцы кучаравыя ды бліскучыя, бы з блядога прадзенага золата. Сядала на ганку вясковае хаты або бегала ля яе па запыленай вуліцы, скакала па сенажацях паміж красак ля жарол а цуркоў, любіла месячнае сьвятло, расу і туман, ачараваная бяз дай прычыны нейкай нутраной радасьцяй, а сьмяялася так, быць гэта рабіла патайно, бы дзесь блізка нехта спаў, быццам ёй было гэта забаронена, але як бы нягледзячы на гэта, а дык жа

дзеля гэтага ёй хацелася сьміяцца. Яна бывала адзеўшыся ў сарочку без рукаваў і кароткую спаднічку, адзетая была гэтак лёгка, што было відаць усё яе чатырагодняе харство, харство маленькае, падгорняе Дыянкі.
Прыйшла калісь у сад да лесьніковае хаты; сядзелі там госьці, чорныя лесьнікі з чорным князем.
Гаспадыня папрасіла яе, каб запяяла; яна сказала, што Дыянка ўмее шмат харошых песьняў.
Дыянцы хацелася пяяць, але яна стыдалася чужых людзей.
А ў гэтую часіну зьявілася ўсё яе крохкае, зьменнае ўмецтва, якога яшчэ ніхто ніколі ня ўгледзіў а якога ўжо ніхто ня ўгледзіць.
Скакала сваю неадвагу так, бы Айсэдора Дункан, грэцкая скакуха ў школе грацыі ў Грунвальдзе, сказала малой, прынаднай, геніяльнай, з тысячы выбранай дзяўчынцы, сваёй вучаніцы:
“Папросяць цябе, каб пяяла, але не пяі! Узьдзержвайся доўга, з усьмешкаю, высьцерагайся іх ціханька, будзь простай і прыроднай, як харошыя статуі, што я тэ паказвала ў музэі”.
Маленькая вясковая дзяўчынка, страйнейшая, чымся вучаніца з школы Айсэдоры Дункан, чараўнейшая, чымся ўсе статуі ў музэі, як выбраная з ста тысячаў, далікатна кранулася, аперлася абедзьвюма далонямі аб сьцяну, ля якой стаяла, апёртая плячыма, пераставіла дабрародныя, у клубох хораша збудаваныя, тонкія ножкі, нахінула чула далікатнае целца, пракаханае ўсё прыродаю, заварушыла чароўныя плечыкі.
“Пяі!” — сказалі ёй.
Дзяўчынка ціха заварушылася, мяняючы свае паставы, адну чараўнейшую за другую, адну чулейшую за другую, ніколі не паўтаральныя і нікім ня споўнельныя.
Яе далікатны, радасны тварык зьмяняў новыя борзда ўзыходзячыя і борзда гаснучыя ўсьмешкі, яе ножкі й ручкі складаліся ў краскавыя позы, тым часам як дробным плечучкам без падмогі рукі яна старалася ўхапіць сарочку, каторая звальвалася.
Скакала далікатна свае ўцекі: сашчапіла ручкі над галавой і згарнула ў іх пучок бліскуча залатажоўтых, лёгка вянучых красак, дакраналася імі да тварыку, да плечучкоў, не спушчаючы вачэй і ўсьмешак зь людзей, якія жадалі ейнага пяяньня.

Усё чыста, што рабіла, было быццам доўга ўзгадавана, цэлымі пакаленьнямі выпрацавана, як бы была вялікай і ласкавым жыццём узгадаванай артысткаю, жыццём ачараванай, харaству адданай скакухаю, перакананай, што на яе глядзяць сотні натхнёных вачэй.
Айсэдора Дункан, вучыцелка грацыі, сама толькі ў сьне сьніла аб гэткім скоку жыцьця.

2

Як нарадзілася малая Дыянка, дзядуля яе, панскі аб'ежджчык, цешыўся. Была, праўда, дзіцем яго незамужняе дачкі і асабістага лесьніка князевага, чорнага дзёрзкага дзецюка, які свайго дзіцяці ніколі ня ўгледзіў. Але дзейкалі аб лесьніку, што ён сын грапаў, а добры, дурны дзядуля гардзіўся малой Дыянкаю і забараніў усім вясковым дзяцём казаць ёй аб тым, "бо нашае дзіцё панскае", хваліўся радасны.
Добры, наіўны дзядуля, аднак, скора памёр, ягоная дачка пайшла скора за ім, а малая Дыянка дасталася дзядзьку, сусім асірацелая, нікому не жаданая.
Але яна сусім ня мучылася ў чатыры гады ад свайго сіроцтва. Сьвет адбіваўся ў яе радасным арганізьме адзіным, неўсьвядомленым а ўсёй радасьцяй ейнага сэрца зацемляваным хараством.
Нічагусенькі не рабіла бязь дзіўнага, бы хаванага сьмеху і заўсёды неяк салодкіх дагадак-паглядаў.
Купалася нецярпліва, скідаючы сарочку, каб апусьціцца ў вузкія цуркі сенажатныя, у чыстую горнюю ваду, што цякла паміж берагоў, парослых карэньнем незабудак і йстужкамі шырокіх траў. Яе белае, высмуклае незагарэлае целца засьвяціла, як чарэшня ў цьвеце. Нейкае жывейшае жыцьцё, райская, даўно страчаная радасьць запалалі ў яе тварыку, заэлектрызавалі пазорнае* целца. Яна была падобная да срэбнае вясёлае рыбкі, да нечага лепшага, бо радасьнейшага а дзеля гэтага ўдзячнейшага, як людзі.
Саступіла нецярпліва ў брадок, з усьмешкай захоплюючыся. Вада ёй даходзіла да костачак.
"Апушчуся ўся ў ваду!" — крычэла ў роскашы.
Як дзіця, узгадаванае ў прыродзе, басое і блізу што голае, якое нічога не баіцца, не зьлякнёная, але ўсьцешаная прыемным і сьвежым холадам, апусьцілася ў ваду, а вада пабяліла ейнае

цела ў колер белае рожы, у блеск бялюсенькае пэрлы. І ўзноў кожны яе рух быў выбраны, як знойдзены, радасны і далікатна пазорны, выказуючы штось патайнейшага, чымся змагла б зразумець, штось глыбака схаванага і закрытага чуцьцём дасканальнае мастачкі і даравальніцы сьпелага хараства.
Скакала сваю радасьць, бы Айсэдора Дункан у Грунвальдзе, месьце ангельскіх віл, пастаўленым у бары, сказала найпрынаднейшай, з тысячы выбранай дзяўчынцы, сваёй вучаніцы:
“Ідзі на цьвітучую сенажаць, разьдзенься ў любым сонейку, цешся зь яго зьзяйнае, любае цяпліні летняе, цешся з быстрае вады, якая будзе цячы па тваіх каленках і зьменіць тваё цела ў краскавую беліню, цешся зь сьветлячкоў, із травак, ізь цьвітучых незабудак, ізь сьцюдзёнае быстрыні, народжанае на высокіх горах, у цяні стагодніх букоў!”
Малая Дыянка купалася, а яе купаньне было падобнае да скоку, весяленьня, адзінае гульбы малога чалавека, надоранага дарам ясных паэтаў: цешыцца ўцехаю красак, купаных у расе, уцехаю птушак, што ў лёце ўпіваюцца рухам чыстых сфэр.
Як выкупалася, узлажыла нецярпліва сарочку й спаднічку, раскінула шырока абедзьве тоненькія ручкі, разьбеглася лёгкім птушыным лётам, як бы ня ведала, што рабіць із сваім шчасьцем, як бы хацела па ўсім сьвеце разьнесьці, па цьвітучай луцэ рассыпаці. Не апушчаючы рук, разьвярненых як у абоймах божага сьвету, папяваючы сабе адзіны, што як на арфе гучэў, пчаліны тон, перабягала луку з канца ў канец, як бы ёй Айсэдора Дункан сказала:
“Думай, што любіш сонейка, красуючую рожавую дзяцеліну, залатыя красачкі і што ім гэта хочаш сказаць!”
Якое любае, разьвяселенае дзіцё была гэта малая Дыянка, дзяўчынка асірацелая!
Колькі ў ёй было магчымасьці, колькі радасьці й захапленьня магла разьнесьці па сьвеце, калі б яе прыродную стройнасьць магла захаваць вучыцелка хараства!
У той час як другія вясковыя дзеці білі паўгадзіны асколкам у стары чэрап і аглушаліся сваім крыкам, падобным да крыку качкі, у гэтай безгалосай вёсцы, у той час як другія дзеці сядзелі тупа на прызбах і верашчэлі носам аднатонна, брыдка, бясконца й без прычыны “Нянька! Нянька! Нянька! Нянька!”, маленькая Дыянка скакала сваё прынаднае дзяцінства.

Кідала з мастка па вадзе малы шкляны мяч, бегала па беразе й скакала ў ваду, каб яго ля другога мосту задзяржаць.
Любіла заўсёдны жывы рух, як Божая птушачка, гаспадар паднябесься.

3

Прыйшоў у вёску маляр, зразумеў яе маладое, жывое, плывучае харство, хацеў яго змаляваць. Паставіў яе, але яна расьмяялася і скакала зьменныя паставы. Пасадзіў яе. Яна мыла ляльку на ўлоньні; пакуль прыгатаваўся, падняла яе над галавой, пакуль агледзеўся, а яна ўжо ляжыць галавою ў траве. Благая гэта была мадэль. “Ведаеш, чым будзеш, як вырасьцеш?” — спытаўся маляр у малой прынаднай Дыянкі. Дыянка надумалася толькі што адзець у рожавае лісьцё сваю брыдкую танную ляльку з кудзеляй на галаве і з вытрашчанымі шклянымі вачыма.
Нарысавала ў пяску пальцам прыбор, паклала ў яго сярэдзіну ляльку і накрыла яе пахнючымі, далікатнымі лісточкамі рожавымі.
Ня слухала маляра й не адказвала яму.
“Будзеш харошай скакухай! — сказаў ён ёй. — Купіш сабе калёсы, белыя коні, белую вопратку, капялюш з рожамі…”
Было гэта ў садку ейнага дзядзькі, валаснога райчага, у тры гадзіны па паўдні; у чатыры гадзіны прыйшоў поштай ліст дзядзьку. Стараста яго сам дзядзьку прынёс.
Маляр спытаўся ў дзеванькі ўзноў: “Чым будзеш, як вырасьцеш?”
“Харошай скакухаю!” — адказала Дыянка.
“А што купіш?”
“Куплю сабе калёсы, белыя коні, белую вопратку, куплю харошую ляльку, якая будзе заплюшчваць вочы, плакаць і гаманіць, белыя чаравічкі, кошычак з чакалядаю!”
Дзядзька чытаў у лісьце: “Шукаю сіроткі, дзіця без аніякае радні, над ім бы ўзяла апеку. Узгадавала я ўжо пяць дзяўчат за добрых пільных слуг. Навучу яе памалу рабіць усялякую хатнюю работу, шыць, прасаваць, гаспадынічыць і даглядаць жывёлы. Павязу яе ўсюды. У чатырнаццаць год знайду ёй добрую службу. Калі маеце малую дзяўчынку, шчырую сірату, у вас у вёсцы, адкуль я родам, дам ёй першынство перад іншымі, якія мне прапануюць”.

“Ну, дык што ж, — сказаў дзядзька, дачытаўшы ліст, — я яе аддаў бы. Жонка яе ня любіць, а сваіх дзяцей маю таксама даволі”.
Доля дзяўчынкі была азначана.
Айсэдора Дункан!

4

Ніхто ўжо ніколі ня ўгледзіць яе цякучага, плывучага хараства, ніхто ўжо ніколі, а асабліва дабрадзейка яе, узгадавальніца паслугачак, хвабрыка наймітак, ня ўгледзіць яе грацыі: памалу, але пеўна яе будуць зь яе вытаўкаць, вырываць, як краскі з град у гародзе.
А з часам, як навучыцца гэтая прыродная прынада служыць цяжкой працай людзём і адпусьцяць яе. Дыянчына расчараваная моладасьць заартачыцца, стане яна благой слугой, няпеўнай гандляркай, а ў канцы малой какоткай, блага плачанай дзеўкай усім.
У нас лорды Гамільтоны не адшукваюць грэцкіх скакух у корчмах. Князі Патоцкія не падымаюць з дарог харошых дзяўчат. Ніхто не падасьць рукі сьветлым чарам, дару нябеснаму. Цяжка, цяжка будзе ўміраць стройнасьці Дыянчынай.
Мусіць, цяпер у вольныя часіны, як яе ня вучаць замятаць падлогі і не прынукаюць да гаспадаркі, ходзіць Дыянка па запыленай вуліцы новае вёскі і хавае пышна сваю брыдкую, мурзатую ляльку, адзетая ў пашытую картановую адзежынку, што, як тога, ліпне да яе белага целца.
Мусіць, пушчае нейдзе па вадзе свой мяч, ідучы навыперадкі з быстрынёй горнай, мусіць, бяжыць лёгенькім пасьпешным крокам з ручкамі раскінутымі, падобнымі да крыл белае птушкі, і пяе ціха сваю пчаліную песьню, бо нічога ня ведае аб трагедыі свайго хараства, якое ня будзе ніколі нікім адкрыта.

Публікацыя Ўладзімера Ляхоўскага

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003

[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/09/21**
[image]

Антон Луцкевіч

Успаміны аб прэзыдэнту Масарыку

[1] Маецца на ўвазе Віленская езуіцкая акадэмія (пазьней універсытэт), адчыненая 30 кастрычніка 1579 году на базе езуіцкага калегіюму, заснаванага ў 1570 г.

Памёр Т.Г.Масарык. У яго асобе сышоў у магілу, пасьля доўгага і працавітага жыцьця, ня толькі былы прэзыдэнт Чэхаславацкай Рэспублікі, ня толькі ўваскрашальнік гэтае дзяржавы і ідэйны правадыр свайго народу, а таксама і шчыры, пераканаць ды *пасьлядоўны вызнаўца ідэі дэмакратызму*, супраць якое цяпер у роўнай меры і з аднолькавай зацятасьцю змагаюцца бальшавізм, фашызм і гітлерызм. Згас выдатны вучоны, чыё імя было шырока вядомае ў Эўропе задоўга перад уваскрасеньнем Чэхаславаччыны.

Я падкрэсьліў дэмакратызм Масарыка з адмысловым намерам, бо дэмакратызм — гэта той грунт, на якім людзі розных нацыянальнасьцяў могуць найлепш паразумецца. На тым грунце завязана была і нітка ўзаемнай сымпатыі паміж Масарыкам і беларусамі — народам, можа, найбольш дэмакратычным у Эўропе. А з тае прычыны, што ў завязваньні гэтае ніткі выпала адыграць пэўную ролю мне, лічу сваім абавязкам падзяліцца жменяй успамінаў і інфармацыі над

сьвежаю магілаю вялікага дэмакрата.
Трэба адзначыць, што чэхі і беларусы зналіся нязгорш у далёкай мінуўшчыне. Ужо напрыканцы XIV ст. беларуская моладзь ведала дарогу да Праскага ўнівэрсытэту. З часоў каралевы Ядвігі ў сталіцы чэхаў была створаная спэцыяльная бурса для студэнтаў зь Вялікага Княства Літоўскага — беларусаў і літвінаў.
Па атрыманьні ў Падуі дактарату ў Прагу імкнецца Францішак Скарына, палачанін, знакаміты беларускі гуманіст, перакладчык і выдавец Бібліі на беларускай мове, заснавальнік першай беларускай друкарні ў Вільні.
Пасьля заснаваньня ў Вільні акадэміі[1] ўсё менш беларусаў — адэптаў навукі кіруецца па яе на Захад. Адносіны паміж беларусамі і чэхамі, колісь гэтак ажыўленыя, абрываюцца на доўгія гады.
І толькі на самым пачатку нацыянальнага адраджэньня беларусаў парваную нітку навязвае піянер гэтага адраджэньня сьвятое памяці Іван Луцкевіч, які, пачынаючы з 1904 г., неаднаразова адведвае Прагу. Знаёміцца там з шматгадовым рэдактарам часопісу “Slovanský Prehled” Адольфам Чэрным і зь іншымі дзеячамі, якіх інфармуе пра беларусаў і іх нацыянальнае абуджэньне. Пазьней карэспандэнцыю з Чэрным меў я, і ад выпадку да выпадку пасылаў невялікія артыкулы ды інфармацыйныя матэрыялы для яго часопісу.
Пасьля 1905 году ў Чэхіі вучыцца шэраг студэнтаў зь Беларусі. Там у 1908 г. адбываецца зьезд прагрэсіўнай моладзі славянскіх народаў, на якім беларусаў прадстаўляюць Іван Луцкевіч (пад псэўданімам), Абухоўскі, Крагельскі ды іншыя. У пэрыяд перад сусьветнай вайной чэскі друк усё часьцей зьмяшчае артыкулы і нататкі пра беларускі рух.

Сусьветная вайна на працяглы час абрывае ўсякія кантакты паміж беларусамі і чэхамі. Аднаўляць іх выпала мне — ужо пасьля таго, як паўстала незалежная Чэхаславацкая Рэспубліка. У апошнія дні красавіка 1919 г., едучы на чале дэлегацыі Беларускай Рэспублікі на мірную канфэрэнцыю ў Парыж, вырашыў наведаць Прагу і скласьці візыт прэзыдэнту Масарыку.
Па прыезьдзе ў Прагу і ўстанаўленьні кантакту з Градам паехаў у вызначаны час у рэзыдэнцыю прэзыдэнта. Там я мусіў нейкія

5—10 мінут пачакаць: выявілася, што прэзыдэнт Масарык быў на сваім штодзённым шпацыры і трохі спазьніўся. Пры гэтым даведаўся, што прэзыдэнт звычайна шпацыруе па вуліцах гораду сам, адзін і нікому не дазваляе суправаджаць яго, часьцей, можа, езьдзіць конна. Што праўда, падчас пешых прагулянак заўсёды наводдаль ішоў за ім паліцэйскі агент, але пры гэтым мусіў прыкладаць намаганьні, каб Масарык яго не заўважыў. Мне тлумачылі, што клопат быў не пра ахову асобы прэзыдэнта ад якога-небудзь замаху, а пра тое, што яму, чалавеку пажыламу, магла спатрэбіцца дапамога ў разе якога здарэньня, заўсёды магчымага на ажыўленых вуліцах сталічнага гораду. Папулярнасьць Масарыка была такая вялікая, што баяцца замаху на яго асобу не было ніякіх падставаў.

Пасьля некалькіх хвілін чаканьня ў вялікай рэпрэзэнтацыйнай залі я ўбачыў, як празь яе, вяртаючыся з шпацыру, прайшоў Масарык з парасонам у руцэ, зь якога сьцякала вада, бо пачаўся дождж. Мяне адразу ж завялі ў кабінэт прэзыдэнта.

Масарык прыняў мяне зь незвычайнаю сардэчнасьцю і нейкаю прастатою. Я павітаў яго спачатку па-беларуску, потым, бачачы, што ён зь цяжкасьцю ловіць сэнс маіх словаў, перайшоў на расейскую мову, якою Масарык, як было вядома, валодаў дасканала. Я меў намер коратка паінфармаваць прэзыдэнта аб беларускім руху адраджэньня і потым перайсьці да палітычных пытаньняў.

Масарык перапыніў мяне:

— З рухам беларускім я знаёмы. Паінфармуйце, што ў вас рабілася пасьля выбуху рэвалюцыі ў Расеі.

Гэтая рэпліка не зьдзівіла мяне ані мала. Я ведаў, што Масарык перад вайною заўсёды цікавіўся справамі славянскіх народаў, пра беларусаў, акрамя таго, павінен быў ведаць ад Адольфа Чэрнага, зь якім меў блізкія адносіны. Падчас далейшай размовы я даведаўся, што Чэрны — па даручэньні Масарыка — знаходзіўся ў той час у Парыжы.

Інфармуючы майго суразмоўцу пра найноўшыя падзеі ў Беларусі — абвяшчэньне незалежнай Беларускай Рэспублікі і стварэньне ўласнага ўраду, — я перайшоў да спраў, зьвязаных з маім падарожжам у Парыж. Масарык з шчырым спачуваньнем паставіўся да нашых спраў. Між іншым з смуткам адзначыў, што Польшча, якая лёгка магла б пасьля Расеі заняць месца

правадыра славянства, пра гэтую ролю абсалютна не клапацілася.

З уласьціваю чэхам прыктычнасьцю Масарык сам закрануў пытаньне пра дыпляматычную дапамогу з боку чэскае місіі. “У Парыжы, — казаў, — цяпер знаходзіцца Бэнэш, і зь ім трэба абавязкова скантактавацца. Праўда, там знаходзіцца і наш прэм’ер Крамарж, але гэта масквафіл старое даты, апошні з магіканаў. Зь ім пра вашы справы размаўляць ня варта”.
— Вы ўсё зразумелі, пра што мы размаўлялі? — раптоўна зьвярнуўся да прысутнага свайго сакратара. — Так? Дык усё гэта запішыце і пашлём гэта з маім лістом да Бэнэша. А Бэнэш, — тут зноў зьвярнуўся да мяне, — будзе ахвотна вам служыць сваёю парадаю і падтрымкаю на міжнародным абшары. За гэта я ручаюся.
Аўдыенцыя працягвалася амаль дзьве гадзіны. Пры разьвітаньні Масарык яшчэ раз запэўніў мяне ў сваіх беларускіх сымпатыях і абяцаў, што, як толькі беларускі ўрад умацуецца, Чэхаславаччына адразу ж установіць зь ім дыпляматычныя адносіны. А тым часам у Празе павінен знаходзіцца паўафіцыйны беларускі прадстаўнік[2].
Пасьля прыезду ў Парыж я пераканаўся, што Масарык дакладна выканаў свае абяцаньні. Падчас майго першага візыту ў Бэнэша ён адразу ж заявіў, што ўжо мае інструкцыю Масарыка ў нашай справе і гатовы аказаць нам усялякую дыпляматычную дапамогу. З Крамаржам палітычнага кантакту я не ўстанавіў, пазнаёміўся зь ім на глебе чыста таварыскай.
Дзякуючы прыхільнаму стаўленьню Масарыка да беларусаў праз колькі гадоў пасьля майго візыту ў яго — ужо пасьля заняпаду нашае незалежніцкае акцыі ў шырокім абсягу — чэхаславацкі ўрад даў палітычны прытулак былым сябрам беларускага ўраду[3], а таксама прызначыў каля 150 стыпэндыяў для выпускнікоў беларускіх гімназіяў у Польшчы, бо для іх дзьверы польскіх вышэйшых школаў былі зачыненыя з тае прычыны, што гімназіі ў той час ня мелі публічнага права. У сталіцы Чэхаславаччыны дасёньня знаходзяцца беларускія дзеячы, якія ані ў Саветах, ані ў Польшчы не маглі

[2] Прадстаўніком БНР у Празе быў Мікалай Вяршынін. Ён лічыўся ўпаўнаважаным

БНР у справах ваеннапалонных беларусаў у Чэхаславаччыне.

[3] Прэзыдыюм Рады і Ўрад БНР пераехалі ў Прагу з Коўна ў 1923 г.

Гістарычная даведка

Пасьля 19 лютага 1919 году Старшыня Рады Міністраў БНР Антон Луцкевіч апынуўся ў даволі складанай сытуацыі.

У Парыжы ўжо распачала працу мірная канфэрэнцыя, а беларуская дэлегацыя — перш за ўсё дзеля фінансавых цяжкасьцяў — не магла выехаць у сталіцу Францыі. А ехаць на канфэрэнцыю было звышнеабходна, бо толькі праз Парыж пралягаў шлях да прызнаньня Беларускае Народнае Рэспублікі дэ-юрэ.

Паколькі вестак ад пасланых на Ўкраіну беларускіх дэлегатаў не было, абяцаная дапамога ад украінцаў не прыйшла і ехаць у Парыж не выпадала, А.Луцкевіч вырашыў вярнуцца з Горадні, дзе знаходзіўся Ўрад БНР, у Вільню, тым больш што падвіленскія сяляне, якія прывезьлі на сваіх падводах рээмігрантаў, адшукалі яго і паведамілі, што брат Іван чуецца блага.

Зьвесткі пра гэта мы знойдзем і ў дзёньніку А.Луцкевіча, і ў ягоных уласнаручных паказаньнях, дадзеных 30 кастрычніка

1939 году ў папярэднім зьняволеньні.
Праз пару тыдняў у Вільню з Горадні прыехалі кур'еры Міністэрства замежных спраў Аўгіньня Алексючанка і Ўладзіслаў Курбскі ды паведамілі, што ў Горадню тэлефанаваў з Коўна Аляксандар Цьвікевіч і наказаў, каб А.Луцкевіч зараз жа вяртаўся. У Коўна Цьвікевіч трапіў з Украіны праз Бэрлін. З Украіны ў Бэрлін прыехалі і два іншыя сябры Ўраду БНР — Аркадзь Смоліч ды Васіль Захарка. Пасьля гэтае весткі А.Луцкевіч мусіў разьвітацца (як высьветлілася потым, назаўсёды) з сваім братам ды ехаць у Горадню, а адтуль — дачакаўшыся Цьвікевіча — у сталіцу Нямеччыны.
Пра фінансавыя цяжкасьці, якія стварылі беларускаму Ўраду ўрады савецкі й нямецкі, апавядаецца, зноў жа, у Луцкевічавым дзёньніку. Вымушаны два месяцы (з канца сакавіка да канца траўня) сядзець у Бэрліне, Луцкевіч пераканаўся, што ніякае "палітыкі" зь нямецкім сацыялістычным урадам зрабіць немагчыма. Не "дастукаўся" ён да гэтага ўраду і празь вядомых нямецкіх дзеячоў — нават праз Карла Каўцкага. Затое нямала друкаваўся, разам з Вальтарам Егерам рыхтаваў да выданьня кніжку "Weissruthenien. Land, Bewohner, Geschichte, Volkswirtschaft, Kultur, Dichtung".
У сваіх уласнаручных паказаньнях А. Луцкевіч паведамляе, што з Бэрліна езьдзіў у Прагу — да Томаша Гарыга Масарыка — і што Прэзыдэнт Чэхаславаччыны "вельмі спагадліва паставіўся да беларусаў". Лідэр чэхаславацкае дзяржавы, пісаў Луцкевіч, даў даручэньне міністру замежных справаў Эдварду Бэнэшу наколькі магчыма дапамагаць у Парыжы дэлегацыі БНР. Тады ж адбылося фактычнае прызнаньне Прэзыдэнтам Чэхаславацкай Рэспублікі Беларускае Народнае Рэспублікі. Было дамоўлена, што прадстаўнік чэхаславацкага ўраду прыедзе ў сталіцу Беларусі пры павароце туды Беларускага Ўраду. Пра гэта А. Луцкевіч пісаў Старшыні Рады БНР Язэпу Лёсіку (гл.: *Архівы БНР* (т.I, кн.1, с.462—466); газ. "Беларусь" за 2 лістап. 1919 г.). Ня выключана, што чэхаславацкі прадстаўнік зьявіўся б у Менску, калі б Урад БНР кантраляваў тэрыторыю й сытуацыю хоць бы ў частцы краіны.
Такім чынам, зьвесткі, якія ўтрымліваюцца ўва ўспамінах А.Луцкевіча, пацьвярджаюцца й іншымі крыніцамі. Калі захаваліся ў парадку дакумэнты Праскага Граду, можна было б высьветліць, якога чысла адбылася гутарка А.Луцкевіча і

Т.Г.Масарыка.
На жаль, у сваіх успамінах А. Луцкевіч не паказаў, як была дасягнутая дамова з чэхаславацкімі ўладамі пра навучаньне беларусаў у вышэйшых школах Чэхіі.
Успаміны А.Луцкевіча былі надрукаваныя ў тыднёвіку “Przegląd Wileński” (1937, №7) пасьля таго, як прыйшла вестка аб сьмерці Т.Г.Масарыка. Іх публікацыя ў “ARCHE” сталася магчымаю дзякуючы дапамозе сп. Сяргея Дубаўца.

Пераклад з польскае і даведка Анатоля Сідарэвіча

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/28
[image]

Бржэціслаў Данчак, Віт Глоўшак

Дзьве дзесяцімільённыя краіны ў цені Тэмэліну

БРЖЭЦІСЛАЎ ДАНЧАК — навуковы сакратар Міжнароднага паліталягічнага інстытуту Ўнівэрсытэту Масарыка ў Брне, выкладчык аддзяленьня сацыяльных навук УМ. Вялікі сябар Беларусі.

ВІТ ГЛОЎШАК — асыстэнт па справах праектаў Міжнароднага паліталягічнага інстытуту Ўнівэрсытэту Масарыка ў Брне, выкладчык аддзяленьня сацыяльных

Стасункі паміж Чэхіяй і Аўстрыяй апошніх двух гадоў не выглядаюць ідэальнымі. Атмасфэру напружаньня ствараюць непасрэдна адчуць падарожнікі, што спрабавалі перасячы чэска-аўстрыйскую мяжу падчас яе блякады аўстрыякамі, незадаволенымі запускам у суседняй краіне атамнай электрастанцыі. Сам назоў мясцовасьці, дзе збудаваная гэтая АЭС, — Тэмэлін — стаўся ўжо сымбалем. Тэмэлін увайшоў у гісторыю міжнародных стасункаў такім чынам, што для большасьці сама згадка пра яго азначае ўсплёск эмоцыяў. Дыпляматыя таксама непазьбежна ўцягнулася ў арбіту дыскусіі, што не заўсёды трымаецца “дыпляматычнага пратаколу”. Сутнасьць праблемы застаецца на задзіным плыне, а вынікі спрэчак не прыносяць пазытыўных зрухаў. Наблізкаюць тэрмінаў парлямэнцкіх выбараў таксама не спрыяе сунішэнню

непаразуменьняў. **навук УМ.**
Пры аналізе палітыкі Чэхіі і Аўстрыі ў апошнім дзесяцігодзьдзі мінулага стагодзьдзя Тэмэлін выступае як найвідавочнейшы аспэкт узаемных дачыненьняў. Нават вельмі добрыя і плённыя стасункі ў гаспадарчай, культурнай сфэрах, асабістыя кантакты між людзьмі ня ў стане зьмяніць гэтага факту. Як падаецца, прычына гэтага — розьніца ідэалягічнага кшталту: Аўстрыя стаіць на пазыцыі бязьядзернасьці ў самым шырокім сэнсе гэтага слова; Чэхія ж разглядае атамную энэргію як адзін з галоўных энэргетычных рэсурсаў. Дадзены артыкул спрабуе паказаць, адкуль бяруцца матывацыі палітычных паводзінаў абодвух бакоў канфлікту.

Кароткая гісторыя Тэмэліну
Стратэгія пабудовы некалькіх атамных электрастанцыяў на тэрыторыі былой Чэхаславакіі паўставала з доўгатэрміновай канцэпцыі камуністычнай партыі. Працы на будоўлі Тэмэліну (каля 25 км на поўнач ад Чэскіх Будзяёвіцаў) распачаліся ў 1983 годзе. Першапачаткова быў намер пабудоваць чатыры рэактары магутнасьцю 1000 МВт кожны, пазьней гэтая лічба была скарочаная да двух рэактараў.
1989 год паклаў канец мэгаляманскім плянам камуністычнага кіраўніцтва; але, на жаль, ад пачатку працаў у Тэмэліне прайшоў нейкі час і згарнуць будоўлю было ня так проста. Час ад падзеньня камунізму да 1993 году быў пэрыядам, калі вяліся дыскусіі: працягваць работы альбо замарозіць праект. Калі ацэньваць тагачасную сытуацыю і разглядаць шанцы абодвух варыянтаў, сілы прыхільнікаў і праціўнікаў Тэмэліну, дык шанцы былі пяцьдзясят на пяцьдзясят. Тагачасны прэм'ер чэскага ўраду Пэтар Пітгарт ня быў, аднак, у стане прыняць прынцыповага рашэньня аб заканчэньні ці працягу працаў. Яго нерашучы падыход хутчэй ускладняў, чым вырашаў сытуацыю, а яго пазьнейшы ўдзел у дэманстрацыях экалягічнага руху супраць Тэмэлінскай электрастанцыі будзіць падазрэньне, што ён не да канца разумеў уласную ролю ў працэсе кіраўніцтва краінай.
Такім чынам, справа электрастанцыі перайшла ў рукі рэспубліканскага ўраду, які паўстаў па выбарах 1992 году і быў ачолены прэм'ерам Вацлавам Клаўсам. Пасьля месяцаў адкладаньня праблемы 10 сакавіка 1993 году адбылося

паседжаньне ўраду, на якім было прынятае рашэньне працягваць будоўлю двух рэактараў. Праект быў рэалізаваны наступным чынам: былі скарыстаныя савецкія рэактары тыпу WER-1000/320, дакамплектаваныя заходнімі тэхналёгіямі амэрыканскай фірмы “Вэстынгаўз”.
Акцыянэрнае таварыства “ČEZ” (“Чэскія энэргетычныя заводы”) ажыццявіла дастаўкі паліва і зладзіла першыя выпрабаваньні электрастанцыі 5 ліпеня 2000 году пасьля атрыманьня дазволу з боку Дзяржаўнага камітэту па ядзернай бясьпецы (ДКЯБ). З таго часу было шмат перапынкаў, зьвязаных з рознымі тэхнічнымі складанасьцямі, якія пакрысе выпраўляліся да самага моманту запуску Тэмэліну на 100% магутнасьці. Аднак камэрцыйная эксплюатацыя электрастанцыі так і не пачалася.

Праблема экалёгіі
ў аўстрыйскай палітыцы

У Эўропе Аўстрыя ёсьць краінай, якая здавён праводзіць пасьлядоўную і, на думку многіх, нестандартную палітыку аховы навакольнага асяродзьдзя. Першапачатковым імпульсам у гэтай галіне быў экалягічны рух 70-х гадоў, які імкліва разьвіваўся і прывёў да таго, што ўжо ў той час ідэі гэтага руху былі ўключаныя ў праграмы ўсіх вагомых аўстрыйскіх партый. Шырокі электарат, відавочна, ухваляў гэткую пазыцыю. Ад самага пачатку ў Аўстрыі пытаньне атамнай энэргіі й яе выкарыстаньня мела вялікае, сымбалічнае значэньне. Спачатку гэта тычылася толькі сытуацыі ў самой Аўстрыі, пазьней, пасьля 1989 году, пашырылася і на суседнія дзяржавы. Аўстрыйскі падыход можна ілюстраваць прыкладам лёсу адзінай аўстрыйскай атамнай электрастанцыі. Ужо за канцлерам Ёзэфам Клаўсам (1964—1970) урад пачаў будоўлю атамнай электрастанцыі ў Цвэнтэндорфе. Кошт будоўлі дасягнуў сумы ў некалькі мільярдаў шылінгаў, аднак грамадзкі плебісцыт 5 лістапада 1978 году невялікай бальшынёй пастанавіў, што электрастанцыя ня будзе пушчаная, дарма што будоўля ўжо была завершаная. На гэтым рэфэрэндуме Сацыял-дэмакратычная партыя Аўстрыі (СДПА) была хутчэй за станцыю, Аўстрыйская народная партыя (АНП) — хутчэй супраць, але пазыцыі абедзьвюх партый у гэтым пытаньні былі досыць невыразныя. Тым часам зьявіліся агульныя дыскусіі на тэму аховы навакольнага асяродзьдзя і пачаў фармавацца

арганізаваны рух зялёных, які памалу страціў лякальны характар і выйшаў на агульнаяўстрыйскую палітычную арэну. Істотным момантам было прыняцьце патрабаваньняў зялёных у пытаньні ядзернай энэргіі рэштай аўстрыйскіх палітычных партый і аўстрыйскай грамадзкай думкай. Вельмі рашуча выступіла супраць атамнай электрастанцыі ў Цвэнтэндорфе, апрача іншых аб'яднаньняў руху зялёных, таксама Аўстрыйская партыя свабоды (АПС). Стаўленьне гэтай партыі да Тэмэліну, якое часта разумеецца чэскім бокам як праява папулізму, ёсьць у пэўным сэнсе толькі працягам тэндэнцыі суцэльнага адмаўленьня ядзернай энэргіі, што ўмацавалася шчэ пры канцы 70-х гадоў.

Праблема Тэмэліну: храналёгія падзеяў, афіцыйная пазыцыя Аўстрыі

Афіцыйная аўстрыйская палітыка мусіць, вядома ж, улічваць настроі грамадзтва. Аўстрыйская дыпляматыя пасьля падзеньня жалезнай заслоны сканцэнтравала свае высілкі перадусім на атамных электрастанцыях у суседніх краінах. Справа Тэмэліну страшэнна цікавая для СМІ. Аб'ектыўна гэта самая сур'ёзная праблема ў адносінах Аўстрыі з сваімі суседзямі. Да таго ж, існуюць і агульныя складанасьці ў чэска-аўстрыйскіх адносінах, пра што ніжэй.

Аўстрыйскае антыатамнае лобі зрабіла з Тэмэліну сымбаль, нэгатыўны зарад якога настолькі моцны, што здольны выклікаць вялікую хвалю грамадзянскіх пратэстаў.

Балючых месцаў, аднак, болей. І славацкая атамная электрастанцыя ў Яслаўскіх Богуніцах, і асабліва славенская ядравая электрастанцыя ў Кршску выклікаюць нэгатыўную рэакцыю аўстрыйскага грамадзтва і палітыкаў. Кршская электрастанцыя, фінансаваная ня толькі Славеніяй, але й Харватыяй, — адзіная атамная электрастанцыя на тэрыторыі былой Югаславіі. Будаўніцтва гэтай станцыі распачалося ў 1974 годзе, а яе камэрцыйная эксплюатацыя — у 1983 годзе. Праектавы час яе эксплюатацыі — да 2003 году. Як і ў выпадку з Тэмэлінам, славенцы ўжылі для падстрахоўкі тэхналёгію амэрыканскай фірмы "Вэстынгаўз", што не замінае аўстрыйскай дыпляматыі лічыць станцыю ненадзейнай.

Асаблівы ціск з мэтай дабіцца закрыцьця электрастанцыі Аўстрыя аказвала ў 1991 годзе. Любляна пагадзілася тады, каб камісія незалежных экспэртаў правяла экспэртызу рызыкі дзейнасьці электрастанцыі. Камісія ацаніла праект пазытыўна. Вена старалася й далей блякаваць функцыянаваньне электрастанцыі[1], але замест Кршскай вельмі хутка паўстала праблема Тэмэліну.

Тэмэлін выявіўся важнейшым ня толькі таму, што вялося пра электрастанцыю з вышэйшым узроўнем энэргетычнага патэнцыялу паблізу дзяржаўнай мяжы, але й таму, што вялося пра электрастанцыю ў стане будаваньня, у мэтазгоднасьці якога існавалі сумневы і з чэскага боку. Чэскія сумневы вынікалі з таго, што будоўля паглынула велізарныя фінансавыя сродкі, плюс не было пэўнасьці ў надзейнасьці спалучэньня савецкай і амэрыканскай ядзерных тэхналёгій. Пратэсты супраць запуску Тэмэлінскай электрастанцыі ўзрасталі ў меру набліжэньня тэрміну запуску. Масавыя дэманстрацыі, блякада чэскай мяжы й агульная вельмі эмацыйная атмасфэра антытэмэлінскай кампаніі перашкаджалі аўстрыйскаму ўраду знайсьці разважлівы кампраміс з чэскім бокам. Аўстрыя спрабавала вырашыць пытаньне Тэмэліну на ўзроўні Эўразьвязу, але намер арганізаваць канфэрэнцыю Эўрапарляманту па тэме закрыцьця Тэмэліну ня зьдзейсьніўся між іншага таму, што такі падыход адхіліла Эўракамісія. Незалежна ад гэтага, Аўстрыя не сустрэла ў Эўропе падтрымкі, толькі Нямеччына выказалася з крытыкай чэскае атамнае энэргіі. У такой сытуацыі Тэмэлін усё хутчэй стаўся ўнутрыаўстрыйскай праблемай, якая падзяляе ўладную кааліцыю на два станы.

Асноўныя межы для кампраміснага рашэньня гэтай сытуацыі акрэсьленыя ў Мэльцкім пратаколе (Мэльк — клімэнтны Аўстрыі), падпісаным 13 сьнежня 2000 году чэскім прэм’ерам Мілашам Зэманам і аўстрыйскім канцлерам Вольфгангам Шусэлем. Гарантам Пратаколу выступіў камісар паветраныя Эўразьвязу Гюнтэр Фэргоген. Мэльцкі пратакол каміцэўрідае шэраг тэхнічных момантаў, якія маюць пераканаць аўстрыйскую грамадзкасьць у бясьпечнасьці электрастанцыі. Гаворка ў тым ліку аб сыстэме раньняга інфармаваньня аўстрыйскага боку пра збоі і непаладкі ў працы электрастанцыі й правядзеньне новай экспэртызы электрастанцыі пры

[1] **Напрыклад, Аўстрыя ў 1999 годзе ўскладніла дастаўку ядзернага паліва закрытым паветраным каліцэўрідам самалётаў з гэтым паліваам.**

дапамозе Эўракамісіі. Чэскі бок абавязаўся не пачынаць камэрцыйнай эксплюатацыі Тэмэліну, пакуль ня будзе канчаткова вывучанае пытаньне бясьпекі станцыі для навакольнага асяродзьдзя.
Відавочна, пад уплывам досьведу блякады дарог і памежных пераходаў у Пратакол унесьлі таксама арт.VII, у якім гаворыцца пра свабоду руху асобаў і транспарту. Канцавы арт.VIII прысьвечаны пытаньню пашырэньня Эўразьвязу. Абодва бакі выказваюць у ім перакананьне, што працэс пашырэньня мае прынцыповае значэньне для эўраінтэграцыі. (Умовай закрыцьця разьдзелу “Энэргетыка” Аўстрыя абвяшчае вырашэньне Чэхіяй справы Тэмэліну).
Тым часам АПС настойвала на правядзеньні рэфэрэндуму ў пытаньні Тэмэліну. Гэтыя дзеяньні прывялі да глыбокага крызысу ўнутры ўладнай кааліцыі. Яшчэ перад абвяшчэньнем рэфэрэндуму Гайдэр[2] прыгразіў выхадам з уладнай кааліцыі й абвяшчэньнем датэрміновых выбараў.
Подпісавы рэфэрэндум, які носіць толькі кансультатыўны характар, адбыўся 14—21 студзеня 2002 году[3]. Выбарцы сваімі подпісамі ўхвалілі прапанову, у адпаведнасьці зь якой аўстрыйскі ўрад павінен заблякаваць уступ Чэхіі ў Эўразьвяз у выпадку, калі Чэская Рэспубліка не закрые АЭС ў Тэмэліне. Рэфэрэндум рашуча байкатавалі ўсе парлямэнцкія партыі за выняткам АПС. Неасьцярожныя выказваньні чэскага прэм’ера Зэмана, у якіх ён параўноўваў АПС з НСДАП, называючы Гайдэра “постфашыстам”, выклікалі шэраг рэзкіх заяваў з абодвух бакоў. Афіцыйная аўстрыйская дыпляматыя асудзіла гэтыя выказваньні, палічыўшы іх недапушчальным умяшальніцтвам ува ўнутраныя справы Аўстрыі. АПС, застаўшыся ў ізаляцыі, рэагавала вяртаньнем да тэмы дэкрэтаў прэзыдэнта Бэнэша, называючы адмову Чэхіі скасаваць іх разам з увядзеньнем у лад Тэмэліну падставамі для магчымага накладаньня вэта на чэскае імкненьне ўступіць у Эўразьвяз. Рэзкія выказваньні Зэмана абурылі аўстрыйскае грамадзтва і, можна дапусьціць, забясьпечылі больш высокую яўку на подпісавы рэфэрэндум, у параўнаньні з той, якая чакалася. Зэман паўтарыў сваю ацэнку Гайдэра таксама і ў інтэрвію аўстрыйскаму тыднёвіку “Профіль” ад 21 студзеня 2002 году і ўскосна назваў тых, хто ўзяў удзел у рэфэрэндуме, “ідыётамі”, а аўстрыйскі народ — “нацысцкімі калябарантамі”.

У рэфэрэндуме ўзялі ўдзел 915 220 аўстрыйцаў, што складае 15,53 % ад агульнай колькасьці тых, хто мае права голасу. У Верхняй Аўстрыі, якая суседзіць з Паўднёвай Чэхіяй, дзе месьціцца Тэмэлін, свае подпісы далі аж 23,52 % тых, хто мае права голасу. Беручы пад увагу факт, што ў аўстрыйскіх рэфэрэндумах такога кшталту яўка звычайна нізкая, а таксама пратэст супраць рэфэрэндуму рэшты партый і большасьці СМІ, прыходзім да высновы, што акцыя АПС мела посьпех.
Праблема Тэмэліну — не адзіны гарачы пункт у чэска-аўстрыйскіх стасунках. Само хуткае далучэньне Чэхіі да санкцыяў Эўразьвязу пасьля ўтварэньня кааліцыйнага ўраду АНП—АПС кантраставала зь вельмі рацыянальным вугорскім падыходам.
Таксама й прапанова аўстрыйскай міністаркі замежных справаў Бэніты Фэрэра-Вальднэр (АНП) узмацніць супрацоўніцтва ў межах Цэнтральнай Эўропы[4], успрынятая цэнтральнаэўрапейскімі краінамі стрымана, наклалася на супярэчнасьці альпійскай рэспублікі з сваімі суседзямі.

[2]Дзеля таго каб паўстала кааліцыя АНП—АПС, Гайдэр 28 студзеня 2000 году склаў зь сябе функцыі кіраўніка партыі. 1 траўня 2000 году яго замяніла малавыразная Зузана Райс-Пасэр. Фактычны ўплыў Гайдэра на палітыку

АПС, тым ня менш, застаўся вельмі вялікім, а яго выказваньні маюць ключавое значэньне для далейшай працы партыі ў падставовых кірунках палітыкі.

[3]Калі подпісавы рэфэрэндум кансультатыўна падтрымае больш чым 100 000 выбарцаў, парлямэнт абавязаны вынесьці гэтае пытаньне на абмеркаваньне, вынік якога, аднак, можа быць адрозным ад выніку рэфэрэндуму. Супастаўны эфэкт мог бы мець таксама звычайны законапраект, з чаго вынікае,

што мэтай была не расчыстка прасторы для рашучых дзеяньняў супраць Чэхіі, а хутчэй дэманстрацыя АПС сваёй здольнасьці да “працы” з грамадзкай думкай.

[4]Ад студзеня 2001 году Бэніта Фэрэра-Вальднэр зандавала неафіцыйную рэакцыю сярэднеэўрапейскіх партнэраў на намер стратэгічнага супрацоўніцтва Аўстрыі, Чэхіі, Вугоршчыны, Славаччыны і Славеніі ў розных сфэрах. Без заўваг гэтую прапазыцыю прыняла толькі Вугоршчына. Чэская дыпляматыя

палічыла немагчымым адсутнасьць Польшчы ў гэтым шэрагу. Вельмі вострую рэакцыю гэтая прапанова выклікала (ужо пасьля дапаўненьня аб Польшчы) з боку італьянскай дыпляматыі. Прэзыдэнт парлямэнцкага сходу Сярэднеэўрапейскай ініцыятывы Фэлічэ Бэзостыё назваў ініцыятыву стратэгічнага партнэрства без Італіі “варожым жэстам” на адрас Рыму. На пачатку чэрвеня 2001 году адбылася сустрэча ў Вене, на якой абмяркоўвалася пытаньне аб цесным супрацоўніцтве

між Аўстрыяй, Чэхіяй, Вугоршчынай, Славаччынай і Польшчай без інстытуцыйнай базы, з вынасам двухбаковых праблемаў (у тым ліку праблемы Тэмэліну) па-за рамкі супрацоўніцтва.

Пазыцыі аўстрыйскіх палітычных партый па пытаньні Тэмэліну

Пазыцыю АПС па Тэмэліне можна ахарактарызаваць словам “няўступнасьць”. Вынікі подпісавага рэфэрэндуму партыя ацаніла як перамогу розуму і лічыць гэта адназначнай легітымізацыяй свайго ціску на аўстрыйскі ўрад у справе вэта на ўваход Чэхіі ў Эўразьвяз, у выпадку калі Тэмэлін ня будзе зачынены. У дадатак партыя цесна зьвязала гэтую праблему з пытаньнем высяленьня судэцкіх немцаў і дэкрэтамі прэзыдэнта Бэнэша. Экалягічная матывацыя ў гэтым выпадку толькі часткова абгрунтаваная. АПС яшчэ з пачатку 90-х гадоў выступае супраць далейшага пашырэньня Эўразьвязу. У гэтым кантэксьце Тэмэлін — добрая зброя ў барацьбе супраць пашырэньня, поруч зь іншымі аргумэнтамі (небясьпека наплыву таннай працоўнай сілы, транзыту праз Аўстрыю і г.д.). АНП вызначыць сваю пазыцыю адносна Тэмэліну, пэўна, найбольш складана. З аднаго боку, гэта адназначна праэўрапейская партыя, якая адкрыта падтрымлівае працэс пашырэньня Эўразьвязу, з другога ж, яна мусіць балянсаваць паміж патрэбамі кампрамісу з сваім партнэрам па кааліцыі й кампрамісу з чэскім суседам. Пазыцыя АНП зрабіла магчымым дасягненьне кампрамісу і ўкладаньне дамоваў у Мэльку і Брусэлі. АНП катэгарычна адмаўляе тактыку вэтаваньня ўступу

Чэхіі ў Эўразьвяз у выпадку, калі Тэмэлін ня будзе зачынены. Але ў той жа час бачыць аптымальным рашэньнем т.зв. нулявы варыянт (г.зн. закрыцьцё Тэмэліну). Да гэтай мэты мае весьці шлях доўгатэрміновых перамоваў з чэскім бокам і спроба ўзьняць праблематыку атамнай энэргіі на форуме Эўразьвязу. Пазыцыя СДПА прасьцейшая, хаця б таму, што яна ёсьць апазыцыйным фармаваньнем. СДПА, як і АНП, упэўненая, што нельга зьвязваць пытаньне Тэмэліну з пытаньнем прыняцьця Чэхіі ў Эўразьвяз. У той жа час партыя крытыкуе пагадненьне, дасягнутае Зэманам і Шусэлем у Брусэлі, паколькі, на яе думку, яно нічога не вырашае. СДПА крытыкуе ўрад за тое, што не былі створаныя адпаведныя магчымасьці для далейшых перамоваў.
Аўстрыйскія зялёныя паўсталі як маналітная партыя галоўным чынам дзякуючы барацьбе супраць атамнай энэргіі. Лідэр зялёных Аляксандар ван дэр Бэлен назваў рэфэрэндум “разьдзіманьнем антыславенскіх і антычэскіх настрояў” і абвесьціў “абсалютна дадатнае” стаўленьне партыі да пашырэньня Эўразьвязу. Паводле прадстаўніцы зялёных у справах навакольнага асяродзьдзя Эвы Глявішніг, рэфэрэндум паказаў неаднароднасьць антыядзернага руху, паколькі ня ўсе з тых, хто падпісаўся, выказаліся за вэта, і ня ўсе, хто супраць Тэмэліну, падпісалі лісты. Паводле зялёных, неабходна чакаць парлямэнцкіх выбараў у Чэхіі, бо толькі пасьля іх варта пачынаць новыя размовы з новым чэскім урадам аб закрыцьці Тэмэліну і працягваць спробы правядзеньня антыядзернай палітыкі на ўзроўні Эўразьвязу. Пры гэтым яны зыходзяць з агульнай канцэпцыі энэргетычнай палітыкі сваёй партыі, якая аддае перавагу разьвіцьцю аднаўляльных энэргетычных рэсурсаў. У пытаньні аб дэкрэтах прэзыдэнта Бэнэша зялёныя прапануюць вырашыць канфлікт падпісаньнем чэска-аўстрыйскае дэклярацыі, якая была б сутнасна блізкай да чэска-нямецкай дэклярацыі ад 21 студзеня 1997 году.

Высновы

Падсумоўваючы вынікі ўсіх спрэчак вакол Тэмэліну, можна сьцьвярджаць, што рэакцыя палітыкаў і публічныя выказваньні абодвух бакоў перасьледуюць перш за ўсё ўнутрыпалітычныя

мэты.
Як ужо было сказана вышэй, аўстрыйская палітычная арэна больш чуйная, чымся чэская, да пытаньняў, зьвязаных з атамнай энэргіяй. На пачатку 90-х Партыя зялёных мела пэўную падтрымку ў былой фэдэратыўнай Чэхаславаччыне і яе галоўныя праграмныя мэты былі зьвязаныя таксама з пытаньнем Тэмэліну. Але ўплыў партыі даўно застаўся ў мінулым. Цяпер тэматыку абароны навакольнага асяродзьдзя ўздымаюць галоўным чынам такія арганізацыі, як “Дзеці Зямлі”, рух “Вясёлка” ды “Грынпіс”. Найбольш інтэнсіўна гэтыя арганізацыі пачалі разьвівацца толькі ў сярэдзіне 90-х. Сымбалем змаганьня з атамнай энэргіяй сталіся штогадовыя летнікі каля Тэмэлінскай электрастанцыі, блякады ўезду на яе тэрыторыю і да т.п. Падчас апошняй стадыі падрыхтоўкі да пуску Тэмэліну (дазвол ДКЯБ на ўвоз ядзернага паліва) рух “Вясёлка” зладзіў — разам з амаль сямю дзясяткамі іншых арганізацый і згуртаваньняў — акцыю ў падтрымку ідэі рэфэрэндуму аб лёсе Тэмэліну. Кампанія была пачатая 19 красавіка 2000 году і насіла назву “Рэфэрэндум-2000”. Паводле неафіцыйных зьвестак, пэтыцыю падпісалі каля 100 тыс. чалавек.
Тэма Тэмэліну выяўляецца вельмі прывабнай для палітыкаў, улічваючы яе розгалас у СМІ, што мабілізуе і прыцягвае розных асобаў палітычнага жыцьця. Таксама й тэма рэфэрэндуму дыскутуецца тым актыўней, чым бліжэйшы тэрмін уваходжаньня Чэхіі ў Эўразьвяз. Увогуле палітычная арэна падзеленая на прыхільнікаў аднаразовага, ясна акрэсьленага рэфэрэндуму аб уваходзе Чэхіі ў Эўразьвяз — гэта ідэя Грамадзянскай дэмакратычнай партыі (ГДП) — і на прыхільнікаў правядзеньня агульнага рэфэрэндуму, на які былі б вынесеныя найважнейшыя дзяржаўныя пытаньні — іх прадстаўляюць Чэская сацыял-дэмакратычная партыя (ЧСДП), Камуністычная партыя Чэхіі і Маравіі (КПЧМ), Хрысьціянска-дэмакратычны саюз — Чэхаславацкая народная партыя (ХДС—ЧНП) і Унія свабоды (УС).
Агульнаграмадзкія дэбаты наконт рэфэрэндуму цягнуцца ўжо два гады, а падчас чарговага ўзьняцьця гэтай тэмы эколягамі да яе далучыліся некаторыя аўтарытэтныя палітыкі, якія дзейнічаюць у рамках т.зв. постмадэрнісцкага дыскурсу новых тэмаў у палітыцы. Дэпутаты Пэтра Бузкава (ЧСДП), Уладзімір

Млынарж (УС), Лібар Амброзэк (ХДС—ЧНП) і іншыя прадставілі 10 ліпеня 2000 году праект закону аб рэфэрэндуме ў пытаньні Тэмэліну. Праект быў адхілены з тае прычыны, што дазвол на ўвоз атамнага паліва на электрастанцыю ўжо быў дадзены; выносячы законапраект, дэпутаты мусілі ведаць пра адносна нізкую імавернасьць праходжаньня праекту ў парлямэнце і хутчэй разьлічвалі ўмацаваць асабістую папулярнасьць, чым дасягнуць практычнага выніку сваіх дзеяньняў.

Агульнае перакананьне бясьпечнасьці Тэмэліну вынікае ня толькі з таго, што палітыкі пераконваюць у гэтым выбарнікаў, але хутчэй зь лёгікі інстынкту самазахаваньня чэскага грамадзтва. Падаецца абсурдным, каб пры такой колькасьці фінансавых сродкаў і часу, якія былі аддадзеныя Тэмэліну, рэалізоўваўся бессэнсоўны праект. Сярод чэскіх парлямэнцкіх партыяў бракуе выразнага праціўніка Тэмэліну, калі ня ўлічваць малаўплывовых фракцыяў у некаторых партыях, якія акцэнтуюць экалягічную тэматыку. Сучасная атмасфэра чэска-аўстрыйскіх стасункаў таксама выключае, каб некаторыя з партыяў дазволілі сабе публічна сумнявацца ў цяпер ужо “прэстыжным” пытаньні падтрымкі чэскай пазыцыі. Гэта, аднак, не азначае, што ўсе партыі згаджаліся з вастрынёй некаторых выказваньняў прэм’ера Зэмана на адрас Аўстрыі ці, дакладней, Гайдэра.

У цэлым пытаньне Тэмэліну істотна не ўплывае на праграмы чэскіх палітычных партый.

Дарма што апошнім часам чэска-аўстрыйскія дачыненьні разьвіваюцца пад знакам праблематыкі Тэмэліну і дэкрэтаў прэзыдэнта Бэнэша, не спыняецца, аднак, і эфэктыўнае супрацоўніцтва ў гаспадарчай сфэры. Аказалася, што адносіны між дзяржавамі ў гэтай галіне матываваныя ўзаемнай карысьцю, а шырокая каапэрацыя паміж прыватнымі суб’ектамі гаспадараньня сьведчыць пра далейшыя пэрспэктывы разьвіцьця. Ілюстрацыяй добрага стану могуць быць статыстычныя зьвесткі, паводле якіх у 2000 годзе Аўстрыя была трэцім па значнасьці гандлёвым партнэрам Чэхіі з доляй 5,5% у агульным абарачэньні замежнага гандлю і другой з краінаў Эўразьвязу. У 2000 годзе дадатнае сальда Чэхіі ў гандлі з Аўстрыяй склала 5,5 мільярда кронаў. Аўстрыйскія інвэстыцыі склалі ў гэтым жа годзе 20,4% ад замежных інвэстыцыяў у

Чэхіі, апынуўшыся на трэцім месцы пасьля ФРГ і Галяндыі.

Пераклала з польскай
зь невялікімі скаротамі
Марыя Мартысевіч паводле Przegląd Środkowoeuropejski (Central European Review). 2002. №1.

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/09/23**

ВІТАЛЬ СІЛІЦКІ (нар. у 1972 у Менску) — палітоляг. Дацэнт катэдры эканомікі Эўрапейскага гуманітарнага ўніверсытэту.

Віталь Сіліцкі

Адкладзеная свабода Посткамуністычны аўтарытарызм у Сербіі і Беларусі*

Мілошавіч і Лукашэнка — палітычныя апартуністы

На пачатку “антыбюракратычнай рэвалюцыі” Мілошавіча, у 1987 годзе, праз паноўную камуністычную наменклатуру пралёг глыбокі раскол. Адна яе частка трымалася старых цітаўскіх прынцыпаў федэралізму. Новая ж плынь была гатовая выкарыстаць сербскі нацыяналізм, каб прадухіліць распад дзяржавы і крах сістэмы. Ніводная з гэтых плыняў не мела свайго яўнага лідэра — гэта было важнай акалічнасцю. У тых умовах Мілошавіч актыўна ангажаваў абодва бакі, папераменна пазіцыянуючы сябе то як вернага цітаіста (менавіта ён калісьці назваў сербскі нацыяналізм “змяёю ў жываце” свайго народу), то як зацятага сербскага нацыяналіста, то як рэфарматара (у

свой час за Мілошавічам, што меў вялікі досвед гаспадарчае працы і нават быў прадстаўніком найбуйнейшага югаслаўскага банку ў Нью-Йорку, замацавалася мянушка “балканскі Гарбачоў”), то як самага цвердалобага артадокса. (Як сведчаць некаторыя з удзельнікаў тагачаснага палітычнага працэсу ў Сербіі, Мілошавіч пачаў мэтанакіравана планаваць сваё ператварэнне ў сербскага нацыяналіста яшчэ ў сярэдзіне 1980-х, калі ён, хутчэй за ўсё пад уплывам сваёй жонкі Мір’яны Маркавіч, старанна вывучаў розныя шляхі і магчымасці прарыву да вышэйшай улады.) Урэшце, Мілошавіч стварыў моцную базу падтрымкі ў дзяржаўным апараце, што дазволіла яму хутка адцясніць ад улады сваіх былых палітычных настаўнікаў, перш за ўсё тагачаснага прэзідэнта Сербіі Івана Стамбаліча, зацятага цітаўца, які актыўна прасоўваў Мілошавіча ўверх па партыйнай іерархічнай лесвіцы. Дарэчы, за некалькі дзён да падзення Мілошавіча ў 2000 годзе Стамбаліч знік без следу.

За кароткі час Мілошавіч стварыў моцную ўласную групоўку ў партыйным і дзяржаўным апараце, медыях, паліцыі і войску, актыўна прасоўваючы на высокія пасады верных сабе людзей з ніжэйшых і вышэйшых эшалонаў наменклатуры. Такім чынам палітычны адзіночка, якога некаторыя спадзяваліся скарыстаць ва ўласных мэтах, неўзабаве стаў паўнаўладным гаспадаром дзяржавы. Пасля кансалідацыі ўлады Мілошавіч прадэманстраваў тую ж гнуткасць і здольнасць да палітычных пераўвасабленняў, што дапамагла яму пратрымацца ва ўладзе, нягледзячы на катастрофу, у якую вылілася ягонае панаванне. На сваіх першых выбарах, у 1990 годзе, ён паўставаў перад грамадствам, напужаным перспектывай вайны, памяркоўным рэфарматарам. На другіх выбарах, у 1992 годзе, калі вайна ў Босніі і санкцыі міжнароднае супольнасці выклікалі гіперінфляцыю, ён ужо быў ястрабам, які адцягваў увагу ад унутраных праблемаў пошукам вонкавых ворагаў. У 1995 годзе, калі вайна ў Босніі скончылася паразай сербаў, ён паўстаў міратворцам, які падпісаннем Дэйтанскіх пагадненняў дамогся заканчэння вайны.

Як і Мілошавіч, але ў іншых палітычных варунках, Лукашэнка адрозніваўся выключным палітычным апартунізмам, **[1]** **Так здарылася,** беспрынцыповасцю. Для пакалення, што ўзрасло **што Лукашэнка ў**

прэзідэнцтва, сёння будзе гучаць дзіўна, што Лукашэнка ўвайшоў у вялікую палітыку як дэмакрат, які змагаўся супраць партыйнай наменклатуры, падтрымліваў Шушкевіча на выбарах старшыні Вярхоўнага Савету БССР, выступаў на мітынгах з Пазняком, крытыкаваў урад за непрыняцце закону аб прыватнай уласнасці, выступаў за прыватызацыю, супраць увядзення пасады прэзідэнта і нават уносіў у Вярхоўны Савет чырвона-белы сцяг (які сам пасля і скасаваў праз рэферэндум) у залу пасяджэнняў парламенту. Усё гэта было, калі ён быў дэпутатам, у 1990–1992 году. Пасля, калі стала зразумела, што падтрымка такіх, як ён, дэмакратыі ў грамадстве падае, Лукашэнка спачатку пачынае хістацца да ўрадавай большасці, а потым — да рэакцыйных камуністычных і прарасійскіх груповак накшталт Народнага фронту руху Беларусі. Лукашэнка доўга гуляў у чужую гульню, пакуль не атрымаў магчымасці гуляць у сваю. Супраць былых лідараў наменклатурнай эліты (вядомай як “партыя ўлады”) і нацыянальна-дэмакратычнай апазіцыі, якую ўзначальваў БНФ, ён не дазволіла ажыццявіцца палітычнаму сцэнару, які ў гэты ж час адбываўся ва Украіне. На працягу некаторага часу ў гэтым моманту здабыцця незалежнасці партыя ўлады і не ўяўляла сабой пачалі дамагацца ажыццяўлення дыяметральна супрацьлеглых палітычных праграмаў, адна з якіх была скіравана на будаванне новага палітычнага саюзу былых савецкіх рэспублік, а іншая — на здабыццё поўнай незалежнасці на шляху ад балтыйскіх дзяржаваў. Аднак ні БНФ, ні партыя ўлады не мелі палітычных магчымасцяў, каб ажыццявіць свае праекты цалкам і без дапамогі звонку. БНФ пераацаніў ступень гатоўнасці падтрымкі сваёй палітыкі, якая пайшла на спад *ідэй* постсавецкай дэзінтэграцыяй эканомікі. Партыя ўлады, з іншага боку, пераацаніла сваю здольнасць кантраляваць *ход* працэсы ва ўмовах адноснай адкрытасці палітычнай сістэмы. Тым часам грамадская незадаволенасць эканамічным і палітычным становішчам вылілася ў непрыманне ўсіх палітычнай эліты — як уладнай, так і альтэрнатыўнай. У такіх умовах тактыка Аляксандра Лукашэнкі, які выкарыстоўваў супрацьлеглыя бакі ў якасці “таранаў” для знішчэння апанентаў, і адкрыла яму шлях да ўлады. Нагадаем, што менавіта дэмакрат Станіслаў Шушкевіч, тагачасны кіраўнік парламенту, прапанаваў Лукашэнку на пасаду старшыні антыкарупцыйнай камісіі, а апазіцыя БНФ падтрымала яго

барацьбе за
пазіцыі
выходзіла з
колаў Кебіча
Пазняка
Шушкевіча
Мірбаванні
кандыдатаў
такіх самых
чыноўнікаў
слабыя бакі
Шаранговіча
вядомым
Лукашэнкам
дзве чаргу,
наступаў БНФ
закрыць
Пры гэтым
не ўяўляў
супраць
супраць сваіх
(Sergiej
Owsiannik,
Jelena
Strielkowa.
Władza a
Społeczeństwo
Białoruś 1991—
1998.
Warszawa:
Rzeczpospolita,
1998. S. 95).
Мае ўладаць
чакагорыя
свае назіранні:
на першае
пачатку
1994 году

прызначэнне. У той жа час партыя ўлады заахвочвала Лукашэнку скіраваць сваю атаку супраць Шушкевіча. Праз некалькі месяцаў пасля трыумфальнага выступу Лукашэнкі на сесіі Вярхоўнага Савету да ягонай прэзідэнцкай кампаніі далучыліся многія маладыя незалежныя дэпутаты, дадаючы вядомыя як “маладыя ваўкі”, галоўнай мэтай якога, ды ва-быў хуткі кар’ерны рост цераз галовы старой намеркатуры. Большасць “маладых ваўкоў” былі вычышчаны з дзяржструктураў праз некалькі месяцаў пасля перамогі на выбарах, а некаторых у будучым напаткаў трагічны лёс. Якія дзіўна, ці абсурдна нават, але ўлада і нацыяналізм — дэмакратычная апазіцыя ігнаравалі перадвыбарную кампанію Лукашэнкі аж да таго моманту, калі яе ўжо немагчыма было спыніць[1]. Фактычна і ўлада, і апазіцыя бачылі ў Лукашэнку свайго партнёра, спадзеючыся, што ён расколе, адпаведна, пратэставы і пракамуністычны электарат. Лукашэнка гэта і зрабіў, аднак так, што гэтыя электараты былі ім аб’яднаныя ў адзін, што зрабіла яго абсалютным пераможцам у выбарах. Цікава, што падчас барацьбы за ўладу і выкрышталізаваўся апартуністычны стыль, які надалей стаў характэрны для Лукашэнкі-прэзідэнта. Ужо тады ён быў здольны сумяшчаць несумяшчальнае, абяцаючы грамадству і “рынкавы сацыялізм”, і “інтэграцыю з поўнай незалежнасцю”, і “расійскі рубель з друкарным станком у Менску”. Наагул, супярэчлівы палітычны стыль і Мілошавіча, і Лукашэнкі сведчыць, што абодва лідэры імкнуліся перадусім да максімальнага пашырэння сваёй сацыяльнай базы па-за межамі ўласнага “цвёрдага электарату”. Гэта супярэчлівасць — тыповая тактыка палітычнага выжывання ў аўтарытарных умовах, дзе асноўнай крыніцай унутранай легітымнасці рэжыму з’яўляецца не ідэалогія, якой прымусова падпарадкоўваецца ўсё, а масавая свядомасць, на якую абапіраюцца лідэры. Гэтая тактыка абапіраецца на прынцып “Улада легітымная не тады, калі людзі вераць у тое, што яна кажа, а тады, калі яна кажа тое, у што вераць людзі”.

Сербскія дысідэнты ўзгадавалі аўтарытарны нацыяналізм

Наступная прычына палітычных перамог Мілошавіча і Лукашэнкі заключалася ў тым, што палітычныя і інтэлектуальныя эліты абедзвюх краінаў не здолелі супрацьстаяць іх тактыцы культурнага папулізму, якая

патрабавала выпрацаваць адатруту палітыцы падзелаў і супрацьстаяння ў грамадствах. Выкарыстанне нацыяналістычнае рыторыкі сербскімі інтэлектуаламі-дысідэнтамі фактычна ўгнаіла глебу для ўзыходу Мілошавіча. А ён скарыстаў нацыяналістычную хвалю, каб перавесці крызіс легітымнасці ўлады з рэспубліканскага ўзроўню на федэральны, апраўдаць выключэнне апазіцыйна настроеных нацыянальных меншасцяў з палітычнага працэсу і ўзаконіць разгром апазіцыі як "ворагаў сербскай справы". Расчараванне ў камуністычнай сістэме і крыўда на працяглую палітыку здушэння нацыянальных рухаў у Югаславіі 1970-х прывялі да таго, што апазіцыйна настроеныя сербскія інтэлектуалы пачалі зводзіць спароджаныя камунізмам праблемы да адной — варожасці да сербаў з боку ўсіх іхніх суседзяў, з чаго вынікала патрэба бараніць "свабоду і права сербскага этнасу на захаванне духоўнай, культурнай і гістарычнай ідэнтычнасці без уліку цяперашніх рэспубліканскіх межаў у Югаславіі"[2]. Выходзіла, што шлях да дэмакратыі ляжаў праз вырашэнне сербскага пытання (нават за кошт іншых нацыяў), а не наадварот. Такая тактыка барацьбы з камуністычнай ідэалогіяй фактычна запраграмавала змену адной дыктатуры іншай, бо ў ёй не было месца дэмакратычнаму нацыяналізму, які б базаваўся на ідэі грамадзянства і роўных правоў для ўсіх членаў супольнасці. Ідэалогія аўтарытарнага нацыяналізму, выпрацаваная сербскімі інтэлектуаламі, не толькі справакавала канфрантацыю паміж сербамі і нацыянальнымі меншасцямі, але і ў пэўнай ступені справакавала выбух нацыяналізму ў іншых югаслаўскіх нацыянальных супольнасцях, што прывяло да ўзмацнення аўтарытарных тэндэнцыяў і сацыяльнай гамагенізацыі ў кожнай з іх. Цікава, што ідэю "вялікай Сербіі" першымі "ўзнялі на штандары" не паплечнікі Мілошавіча, а тыя, хто правёў наступнае дзесяцігоддзе ў апазіцыі, напрыклад пісьменнік і прэзідэнт "малой" Югаславіі ў 1992—93 гадах Добрыца Чосіч, а таксама адзін з лідэраў сербскай апазіцыі на працягу 1990-х, таксама пісьменнік Вук Дрэнцыч. Аднак сумесь нацыянальнага калектывізму і этапізму ў выпрацаванай імі ідэалогіі расчысціла дарогу да ўлады не ім, а Мілошавічу.

[2] Ліст Добрыцы Чосіча да сербскай інтэлігенцыі, цытуецца паводле: **Dusan Janjic. Serbia between identity crisis**

and the challenge of modernization (1987—1994) // *Serbia Between Past and Future / E*d. Dusan Janjic. Belgrade: Institute for Social Sciences and Forum for Ethnic Relations, 1997.

БНФ у пагоні за немагчымым

Палітызаванасць “нацыянальна-дэмакратычнага” дыскурсу ў Беларусі прывяла да таго, што ён не змог вытрымаць рэстаўратарскай контратакі; з яго не нарадзілася новай нацыянальнай ідэалогіі, якая знайшла б шырокую грамадскую падтрымку. Гэтаму нямала паспрыяла тое, што БНФ, асноўны носьбіт нацыянальнай ідэалогіі, хутка ператварыўся з шырокага руху, якім ён быў на пачатку свайго існавання, у вузкую палітычную партыю нацыянальна-кансерватыўнай арыентацыі, захоўваючы пры гэтым прэтэнзіі на выключнасць і лідэрства ў дэмакратычным лагеры. Ідэалогія БНФ грунтавалася на ўяўленні аб этнічнай нацыі, якая была выключаная з натуральнага гістарычнага і культурнага развіцця замежным панаваннем (адсюль і бескампрамісная пазіцыя ў пытаннях беларусізацыі, вонкавай палітыкі і г. д.). Аднак такое бачанне не толькі не адпавядала светаўспрыманню той рэальна існай супольнасці, што насяляла Рэспубліку Беларусь (і справа тут не толькі ў заняпадзе нацыянальнай мовы, але і ва ўспрыманні свету, гісторыі і саміх сябе, што ў пераважнай большасці не супадала з нацыянал-дэмакратычным дыскурсам). Фактычна палітычная стратэгія, заснаваная на нацыянал-дэмакратычнай ідэалогіі, знаходзіла падтрымку ў вузкага кола інтэлігенцыі, моладзі і ў некаторых рэгіёнах на паўночным захадзе Беларусі[3]. Безумоўна, перспектывы пашырэння палітычнай базы “нацдэмаўшчыны” існавалі: БНФ

мог бы пайсці на пэўныя кампрамісы ў сваёй ідэалагічнай арыентацыі і заангажаваць тую частку электарату, якая заставалася нацыянальна пасіўнай, але праявіла схільнасць да падтрымкі “грамадзянскай” версіі нацыянальнай праграмы, г. зн., прымаючы палітычную ідэю незалежнасці, заставалася расійскамоўнай. Фактычна, менавіта гэтая частка грамадства, якую сёння модна называць “крэоламі” (на маю думку, аднак, яны не большыя крэолы, чым англамоўныя ірландцы), і стварала на працягу мінулага дзесяцігоддзя сталую “незалежніцкую” частку беларускага палітычнага спектру. Аднак бескампраміснасць БНФ і ў першую чаргу яго лідэра Зянона Пазняка прывяла да таго, што рух адштурхнуў ад сябе гэтую частку грамадства і ўрэшце пачаў ператварацца ў маргінальную палітычную сілу. Заўважым, што **[illegible]** БНФ на працягу свайго існавання заставаўся дэмакратычнай партыяй. Аднак унутраная яго структура і персанальная харызма лідэра справакавалі поўнае бяздзеянне **[illegible]**, калі Пазняк фактычна стаў пераўтварацца ў беларускага Пэна ці Шэшаля, прымаючы ўсё больш радыкальную рыторыку, што пераходзіла мяжу, за якой пачыналася ксенафобія, тэрытарыяльныя прэтэнзіі да іншых краінаў, падзел дэмакратычнага лагеру на “сваіх” і “чужых”. Гэтая нацыяналізму старанна асвятлялася дзяржаўнымі ЗМІ, на доўгі час стварылі адпаведны брэнд, у якім усё нацыянальнае атаясамлівалася з Пазняком, а прыхільнікі фашыстамі і іншымі знаёмымі грамадству ворагамі. паварот Пазняка на радыкальныя пазіцыі пакінуў грамадства без сапраўды дэмакратычнай нацыянальнай альтэрнатывы, якую, дарэчы, трэба яшчэ сфармуяваць. Такая палітычная стратэгія пакінула выбар паміж традыцыйнай нацыянальным і савецкім, прычым, улічваючы савецкую культурную спадчыну і ідэалагічную індактрынацыю, вынік такога выбару быў цалкам прадказальны.

Так, на пачатку 1990-х тактыкі 69% беларусаў бачылі ўнаёмыя з рускамоўнымі дыстарыі фальсіфікаваць беларускай гісторыі, відома ж, нетэрпіма ставіліся Абэлардскага. Гі: Таканоміч Олыпарўнам явіпае хвіпаст снежаналізмам жыццёва культурнай

***Беларуская думка*. 1993. №10.**

Слабасць нацыянал-дэмакратычнай ідэалогіі абумоўлівалася не толькі яе нераспаўсюджанасцю, але і антаганізмам паміж прыхільнікамі яе традыцыйнай версіі і так званага “беларускага расійскамоўнага нацыяналізму”. З аднаго боку, гэты феномен палітычнай культуры Беларусі, які пашырыўся на

працягу апошняга дзесяцігоддзя, пацвердзіў, калі верыць Яну Запрудніку, “павелічэнне розніцы паміж моўнай ды палітычнай русіфікацыяй. Расійская мова ў Беларусі ў шматлікіх выпадках стала такой жа мовай культурнага адраджэння краіны ды ўмацавання яе незалежнасці, як і беларуская. Можна нават правесці, хоць і грубае, параўнанне з ангельскай мовай у Ірляндыі ды нямецкай у Аўстрыі”[4]. З іншага боку, узнікненне “беларускага расійскамоўнага нацыяналізму” паглыбіла палітычны раскол у незалежніцкім лагеры, які падзяліўся на прыхільнікаў “этнічнага” ды “грамадзянскага” нацыяналізму. “Этнічны” нацыяналізм апелюе да этнічнай/нацыянальнай моўнай ды культурнай традыцыі й культывуе міт аб “адвечнасці” нацыі. “Грамадзянскі” нацыяналізм адштурхоўваецца ад ліберальнага бачання нацыі як прадукту “грамадскай дамовы”. Нацыя (таксама як і яе атрыбуты) у першым выпадку — вартасць метафізічная, у другім — інструментальная, сродак дасягнення іншых, у тым ліку палітычных мэтаў, такіх, як дэмакратызацыя, дэсавецізацыя ды вестэрнізацыя. Для прыхільнікаў “этнічнага” нацыяналізму нацыянальнае адраджэнне ёсць зарукай пабудовы дэмакратыі ў незалежнай дзяржаве, тады як для тых, хто аддае перавагу “грамадзянскаму” нацыяналізму, наадварот, дэмакратыя выступае рухавіком у справе пабудовы нацыі.

[4] **Jan Zaprudnik. Belarus: In Search of National Identity, 1990 – 2000 // Belarusian Review. Vol. 13. Issue 2.**

У Беларусі “этнічны” ды “грамадзянскі” нацыяналізм мае сваіх палітычных носьбітаў у дэмакратычным лагеры (БНФ — з аднаго боку, АГП — з другога, хаця ідэалагічныя бар’еры паміж гэтымі партыямі апошнім часам сталі менш адчувальнымі), а таксама свой базавы электарат (з аднаго боку — нацыянальная інтэлігенцыя ды моладзь, з іншага — касмапалітычнае гарадзкое насельніцтва, частка эканамічнай эліты ды дзяржапарату). Асноўнае адрозненне паміж “этнічнымі” ды “грамадзянскімі” нацыяналістамі праходзіць па стаўленні да нацыянальнай мовы. Калі ў традыцыі “этнічнага” нацыяналізму акурат нацыянальная мова ператварае насельніцтва ў нацыю, то з пункту гледжання нацыяналізму “грамадзянскага” асобна ўзятая беларуская нацыя можа быць і расійскамоўнай, і двухмоўнай.

Не збіраючыся тут абмяркоўваць плюсы ды мінусы той ці іншай рэдакцыі беларускага нацыяналізму, зазначым, аднак, што два

супярэчлівыя міжсобку падыходы спарадзілі доўгатэрміновы падзел у дэмакратычнай апазіцыі на “нацыянальны” і “ліберальны” блокі, які прывёў да падзення іх сукупнага ўплыву на беларускае грамадства. Не ў апошнюю чаргу праз гэта падзелены нацыянальна-дэмакратычны лагер не мог дагэтуль стварыць жыццяздольную альтэрнатыву лукашэнкаўскаму “савецкаму кансерватызму”. Трэба сказаць, што і саветызаваная частка беларускага грамадства ўсё болей рабілася адной з палітычных мяншыняў. Таму натуральнае для кожнага аўтакрата імкненне легітымізаваць сваю ўладу, выкарыстоўваючы вартасці і сімвалы палітычнай культуры, якія пераважаюць у грамадстве, падштурхнула Лукашэнку стала імкнуцца да фармавання “кааліцыі мяншыняў” (гэта значыць фармуляваць сваю палітычную праграму так, каб яна знаходзіла водгук у розных сацыяльных групах, часам з несумяшчальнымі інтарэсамі ды прэферэнцыямі). Такая тактыка звычайная для большыні аўтарытарных рэжымаў, якія ў выніку няздольнасці выпрацаваць сваю ўласную ідэалогію замяняюць яе “клопатам пра кожнага чалавека”. Адсюль усе Лукашэнкавы апартуністычныя зігзагі ў рыторыцы, ад пагарджання беларускай мовай да ўслаўлення беларускай незалежнасці, ад дэманізацыі NATO да “пагрозы” тэрмінова нармалізаваць стасункі з Захадам, ад “Славянскіх базараў” да параўнання самога сябе з “таварышам Сапегам”; адсюль і Лукашэнкаў “doublespeak” — тэрміны накшталт “рынкавага сацыялізму”, “праваслаўнага атэізму” ды, нарэшце, “поўная інтэграцыя пры захаванні поўнага суверэнітэту”. Дваістасць Лукашэнкавай рыторыкі сведчыць перадусім пра “раздваенне свядомасці” беларускага грамадства, ці, дакладней, пра яго падзеленасць на некалькі палітычных мяншыняў. Істотна, што “савецкая” меншыня знаходзіцца дзесьці пасярэдзіне паміж “нацыянальна-дэмакратычнай” ды “прарасійскай” мяншынямі. Акурат гэтая, прыкладна трэцяя частка грамадства, якая выступае і за інтэграцыю, і за суверэнітэт, дае пажыву для Лукашэнкавых апартуністычных выкрунтасаў — ад прызнання Расіі другой бацькаўшчынай беларускага народу да адстойвання святога права беларусаў на незалежнасць і суверэнітэт — з заўсёднай падтрымкай адной з узаеманесумяшчальных пазіцыяў, вызнаваных большынёй грамадства.

Важнай акалічнасцю, якая дазволіла і Мілошавічу, і Лукашэнку паспяхова захапіць уладу і ўтрымліваць яе ў кантэксце падзеленых грамадстваў, было, бадай, тое, што абодва лідэры мелі надзвычай багаты жыццёвы досвед па абодва бакі сацыяльнага разлому. Абодва выраслі ў патрыярхальных сацыяльных асяродках без бацькі, пачынаючы, такім чынам, з самага нізу сацыяльнай лесвіцы. Абодва навучыліся "караскацца" па іерархічнай вертыкалі пры камуністах, разлічваючы на камбінацыю ўласных сілаў і сілы выпадку. Абодва прыйшлі ў "вялікую" палітыку ў адносна маладыя гады (Мілошавіч заняў першую высокую партыйную пасаду ў 40 год). Усё гэта дазволіла будучым лідэрам лепей зразумець патрыярхальную палітычную культуру сваіх грамадстваў. Адначасова гэта навучыла іх маніпуляваць інтарэсамі і амбіцыямі ў антаганістычнай "гарадской" палітыцы, прычым як старой наменклатуры, якая цалкам згубіла сувязь з публічнай думкай, так і маладой, амбітнай, але непрафесійнай дэмакратычнай эліты, якая ў большасці выпадкаў трапіла ў палітыку дзякуючы выпадку, у абставінах непрадказальных палітычных пераменаў.

2

Modus operandi і modus vivendi персаналізаваных аўтакратый

Палітычныя рэжымы, усталяваныя Мілошавічам і Лукашэнкам, спалучалі ў сабе "папулісцкія" і "султанісцкія" рысы. Папулісцкія элементы праяўляліся ў імкненні абодвух прэзідэнтаў вызначыць сваю ўнікальную асабістую місію, у іх харызматычных якасцях, а таксама іх настойлівым звароце да даміноўных элементаў палітычных культураў сваіх грамадстваў. Папулізм (ці, папросту, імкненне быць папулярнымі) падштурхоўваў лідэраў легітымізаваць кожны свой крок воляй масаў. "Султанісцкія" элементы адбіліся ў сістэме персанальнага праўлення і манапалізацыі фармальнай і нефармальнай улады, у якой фармальная сістэма дзяржаўных інстытутаў і іерархіі, вызначальваная ўладаю, губляла сваё значэнне, а размеркаванне ўлады цалкам залежала ад выбару лідэра і ад лаяльнасці да яго, якая ў сваю чаргу падтрымлівалася палітыкай бізуна і перніка ў дачыненні да сваіх падначаленых[5].

Зазначым, што папулізм і султанізм — надзвычай супярэчныя

формы арганізацыі ўлады і адносінаў з грамадствам. Папулізм падштурхоўвае лідэра да кантакту з электаратам і правядзення палітыкі, якая цалкам адпавядала б яго настроям. Папулізм прымушае лідэра трымаць руку “на пульсе” грамадскіх настрояў, захоўваць як мінімум бачнасць нейкіх дэмакратычных працэсаў і ажыццяўляць дзеля захавання і ўзмацнення ўлады рызыкоўныя палітычныя праекты, такія, як выбары ці рэферэндумы (нагадаем, што Лукашэнка стаяў за некалькі крокаў ад імпічменту ў 1996 годзе; як будзе растлумачана далей, менавіта ўпартая настойлівасць да легітымізацыі сваіх прэтэнзій на ўладу праз выбары і прывяла ўрэшце да аслаблення рэжыму Мілошавіча, а потым і да яго падзення). У той жа час султанізм у найвышэйшай ступені форме абмяжоўвае ўсялякія кантакты лідэра з грамадствам, пачынаюць ажыццяўляцца выключна праз рэпрэсіўныя жменьку лаяльных прызначэнцаў, у руках якіх канцэнтруюцца ўсе механізмы палітычнай і эканамічнай улады. У рэшце, можа прывесці да страты палітычнай арыентацыі лідэра, які можа проста “праваронiць” той момант, пасля якога сітуацыя награецца настолькі, што абодва працэсы ў грамадстве становяцца незваротнымі або само “кола” пачынае плесці змову вакол лідэра. Аднак у гісторыі сваіх рэжымаў аўтарытарныя лідэры могуць выкарыстоўваць папулісцкія аспекты сваёй улады (народную падтрымку), напрыклад, для вырашэння нейкіх сваіх унутраных праблем, а султанісцкія — для прыдушэння агмянёў апазіцыі ў грамадстве. Як сведчыць досвед рэжымаў Лукашэнкі і асабліва Мілошавіча (што скалапсаваў першы), спалучэнне элементаў папулізму і султанізму застаецца трывалым у першую чаргу праз тое, што лідэрам удаецца захаваць шырокую грамадскую падтрымку (г. зн. калі лідэр здольны пераканаць падначаленых у тым, што ён можа захаваць уладу і без іх дапамогі).

Як ужо было вызначана, неабходнасць легітымізаваць статус былой кампартыі падштурхнула Мілошавіча да арганізацыі інстытутаў сербскай дзяржавы ў форме напаўпрэзідэнцкай рэспублікі, дзе існавалі і фармальны кантроль парламенту над урадам, і выбары паводле партыйных спісаў, і выбарнасць мясцовых органаў улады (то бок Мілошавіч яшчэ ў 1990 годзе сам выканаў “чатыры патрабаванні АБСЕ”, калі праводзіць

5 Нягледзячы на **назвы** **султанісцкіх** **рэжымаў**, гл. **J. E. Chehabi and Juan J. Linz, *Sultanistic Regimes*, Baltimore: Johns Hopkins University Press, 1998.**

аналогіі з беларускай сітуацыяй, — што не перашкодзіла яму пратрымацца ва ўладзе яшчэ дзесяць год пасля таго). Вядома, сістэма “стрымак і супрацьвагаў” была дэкаратыўнай, пакуль Мілошавіч і СПС захоўвалі поўны кантроль над уладай і кіравалі аднаасобна. Важнай акалічнасцю сербскай палітычнай гісторыі ў 1990-х, аднак, было тое, што Мілошавіч і асабліва яго партыя вельмі хутка страцілі статус большасці і знайшлі змогу гэта прызнаць. Так, СПС дасягнула адзнакі ў 50% галасоў выбарнікаў на рэспубліканскіх выбарах у 1990 годзе ў першы і апошні раз. Сам Мілошавіч апошні раз выйграў прэзідэнцкія выбары ў 1992 годзе. У 1997 годзе прэзідэнтам Югаславіі яго выбраў ужо парламент. Падзенне папулярнасці ў грамадстве (выкліканае войнамі і развалам эканомікі) прымусіла Мілошавіча змяніць тактыку і пачаць кааптаваць палітычных апанентаў ці прасоўваць паплечнікаў, што дазваляла яму дыверсіфікаваць базу падтрымкі і пашыраць яе ва ўмовах, калі палітычныя інстытуты прымушалі яго рабіць гэта. Так, у 1992 годзе, калі ход вайны ў Босніі прымушаў яго выкарыстоўваць радыкальную рыторыку, Мілошавіч, партыя якога набрала на парламенцкіх выбарах таго году толькі 28% галасоў (прытым заўважым, што і на гэтых, і на ўсіх астатніх выбарах СПС чыніла масавыя фальсіфікацыі галасоў у Косаве, дзе албанскае насельніцтва, больш за 15% усяго электарату Сербіі, заўжды байкатавала выбары), пайшоў на хаўрус з ультранацыяналістычнай Сербскай радыкальнай партыяй Ваіслава Шэшаля. У 1993 годзе дарогі Мілошавіча і Шэшаля разышліся, пасля таго як першы пачаў “здаваць” сербаў у Босніі пад ціскам ваенных паразаў і санкцый. Тады, зноў не дабраўшы большасці на датэрміновых выбарах, Мілошавіч завабіў у кааліцыю маленькую апазіцыйную партыю “Новая дэмакратыя”, што дазволіла яму стварыць новы ўрад. У піку апазіцыянеру Шэшалю ўлады раскруцілі другую ультрарадыкальную групоўку на чале з камандзірам сербскіх баевікоў у Босніі, вядомым мафіёзі Златкам Разнятавічам (на мянушку Аркан), які ў 2000 годзе быў забіты пры нявысветленых абставінах. Пасля падпісання Дэйтанскіх пагадненняў, калі ідэя “вялікай Сербіі” пацярпела крах, Мілошавіч дапамог сваёй жонцы рэстаўраваць камуністычную партыю пад назвай “Аб’яднаныя югаслаўскія левыя”, каб падкрэсліць “інтэрнацыяналізм” сваёй новай палітыкі.

Нарэшце, у 1997 годзе Мілошавіч пайшоў на хаўрус з найбуйнейшай на той час апазіцыйнай сілай — “Сербскім рухам аднаўлення” Вука Драшкавіча, што зноў палегчыла ягонае палітычнае выжыванне.

Паколькі “папулісцкі” складнік улады Мілошавіча паступова губляў сваё значэнне, той быў вымушаны павялічваць ролю “султанісцкага” складніка. Асаблівасцю яго ўнутранай тактыкі захавання кантролю за ўладным апаратам былі бесперапынная ратацыя высокапастаўленых работнікаў, якія тым самым не паспявалі “пусціць карані” ў дзяржаўным апараце, і прасоўванне асабіста адданых яму людзей, чыю залежнасць і амбіцыі Мілошавіч мог выкарыстоўваць незалежна ад таго, на якой канкрэтна пасадзе ў дзяржаве (прэзідэнта Сербіі ці Югаславіі) ён знаходзіўся. Мілошавіч стварыў вялікія магчымасці для ўзбагачэння сваіх паплечнікаў, паводле словаў назіральнікаў, “абраўшы каля дзесяці тысячаў людзей, якім было дазволена ў кароткі адрэзак часу назапасіць вялікі капітал, што стварыла новы эканамічны клас… Кіраўнічая пара (Мілошавіч і Маркавіч. — **Аўт.**) абыходзілася з дзяржаўнай прамысловасцю і дзяржаўнымі канцэсіямі як з сродкам заахвочвання паплечнікаў”[6]. Такім чынам, у Сербіі паўсталі алігархія і мафія, дабрабыт якіх наўпрост залежаў ад таго, ці знаходзіцца Мілошавіч пры ўладзе.

Іншай тэндэнцыяй было надзяленне фактычна цырыманіяльнымі, але фармальна важнымі дзяржаўнымі пасадамі верных Мілошавічу людзей, для таго каб абвяшчаць і праводзіць найбольш непапулярныя палітычныя і эканамічныя рашэнні, а потым, калі палітыка рэжыму цярпела няўдачу, ад іх дэманстратыўна пазбаўляцца. Фактычны падзел “партыйнага кола” і “цырыманіяльнікаў” прывёў да раздваення ўнутранага апарату на “фармальны” (які займаўся чарнавой працай і забяспечваць функцыянаванне дзяржавы) і “паралельны”, які займаўся выключна забеспячэннем жыццяздольнасці рэжыму і урады. Такі падзел цалкам адпавядае прынцыпам маскоўскай арганізацыі. Адзначым, аднак, што ў дачыненні да Мілошавіча можна казаць не аб цалкам усталяваным султанісцкім рэжыме, але толькі аб султанісцкіх тэндэнцыях, якія былі абмежаваныя значным “вольным полем” для дзеяння палітычнай апазіцыі і грамадзянскай супольнасці, прынамсі

[6] **Lazić Slavoljub.** ***Cohen Serpent in the Bosom: The Rise and Fall of Slobodan Milosevic.*** **Westview Press: 2000. P.112.**

фармальна прызнаваных уладай, што было падмацавана інстытуцыйнымі механізмамі, якія дазвалялі апазіцыі ўдзельнічаць у падзеле ўлады.
Рэжым Мілошавіча можна вызначыць тэрмінам “канкурэнтная аўтакратыя”. Ва ўмовах канкурэнтнай аўтакратыі Мілошавіч мусіў актыўна ўжываць тактыку подкупу апазіцыі. Па-за адзначанымі вышэй выпадкамі рэкрутавання асобных палітычных партыяў, трэба адзначыць і выпадкі ўдзелу некаторых апазіцыйных палітыкаў у “шэрым” паддзяржаўным бізнэсе, што квітнеў падчас санкцыяў. Найбольшыя абвінавачанні на конт гэтага гучалі і працягваюць гучаць на адрас былога лідэра Дэмакратычнай партыі і прэм’ер-міністра Сербіі Зорана Джынджыча, забітага пры не да канца высветленых абставінах. Яго падазравалі ва ўдзеле ў кантрабандзе (іншы вядомы аб’ект абвінавачанняў — прэзідэнт Чарнагорыі Міла Джуканавіч, але ён сышоў у апазіцыю толькі ў 1997 годзе).

Механізмы маніпуляцыі і кантролю ў Беларусі
У адрозненне ад Сербіі неабмежаванасць персанальнай прэзідэнцкай улады ў Беларусі больш фармалізаваная (гэта было ў высокай ступені наступствам спецыфікі шляху да ўлады Лукашэнкі як палітычнага аўтсайдэра, які першапачаткова не меў моцнай базы ў дзяржаўным апараце, што і справакавала яго, пасля перыяду канфрантацыі з непадкантрольнымі яму дзяржаўнымі інстытутамі, на больш “жорсткую”, чым у сербскім выпадку, інстытуцыяналізацыю асабістай улады). Канстытуцыя 1996 году, якую Лукашэнка правёў праз рэферэндум, гарантавала яму неабмежаваны кантроль над урадам, міністраў якога ён можа мяняць з сваёй волі, над суддзямі, якіх ён прызначае, мясцовымі адміністрацыямі, што ўваходзяць у структуру прэзідэнцкай вертыкалі, Нацыянальным банкам, пракуратурай, а праз фактычна падначалены яму Савет Рэспублікі (большасць якога складаюць прызначаныя ім прадстаўнікі вертыкалі) — і над Цэнтральнай выбарчай камісіяй і Канстытуцыйным судом. Паўнамоцтвы парламенту ў такой сістэме зведзеныя да мінімуму канстытуцыйнай нормай, што аддае прыярытэт прэзідэнцкім дэкрэтам над законамі. Канстытуцыя 1996 году не была прызнаная на Захадзе, які настойваў на прызнанні Вярхоўнага Савету 13-га склікання

(больш дакладна — той яго чвэрці, што не пагадзілася з абвешчанымі вынікамі рэферэндуму і не далучылася да Палаты Прадстаўнікоў) як адзінага легітымнага беларускага парламенту. Аднак дзеянні ВС 13-га склікання абмяжоўваліся міжнароднай сцэнай і ён сам ператварыўся на пэўны час выключна ў інстытут дэлегітымізацыі рэжыму Лукашэнкі на Захадзе, не маючы значнага ўплыву на палітычныя падзеі ў межах самой Беларусі.

Выключная манапалізацыя ўлады ў руках адной асобы дазволіла Лукашэнку эфектыўна кантраляваць дзяржаўны апарат, умешвацца ў эканамічныя працэсы з сваёй волі, маніпуляваць грамадскай думкай, а таксама мінімізавала кошт адсочвання і здушэння апазіцыі ўнутры і за межамі краіны. Для Лукашэнкі не існавала ні фармальнай, ні фактычнай патрэбы выкарыстання тактыкі палітычнага гандлю і інкарпарацыі для таго, каб ліквідаваць пагрозы з боку апазіцыі. У той жа час, ён валодаў значна шырэйшымі магчымасцямі, каб падтрымліваць стабільна высокі рэйтынг сваёй папулярнасці. З іншага боку, Лукашэнка прадэманстраваў такія ж, як і Мілошавіч, здольнасці да кантралявання “ўнутранага кола”. Сведкі яго першых палітычных крокаў на пасадзе прэзідэнта ўспамінаюць, што яго падручнай кнігай у той час быў зачытаны літаральна да дзірак і падкрэслены ў шматлікіх месцах “Князь” Макіявелі. Як некалі заўважыў яго былы паплечнік, а цяпер адзін з лідэраў Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі Ўладзімір Нісцюк, тактыкай Лукашэнкі было “ператварэнне сяброў у ворагаў, а ворагаў у рабоў”. Менавіта так ён на пачатку сваёй дзейнасці пазбавіўся ад “маладых ваўкоў”, замяніўшы іх найбольш адыёзнымі прадстаўнікамі старой кебічаўскай наменклатуры. Іншай яго тактыкай было прызначэнне “землякоў” з Магілёўскай вобласці на вышэйшыя дзяржаўныя пасады (як правіла — з ніжэйшых эшалонаў абласной бюракратыі, скажам, былога школьнага настаўніка — на пасаду віцэ-спікера парламента, былога раённага пракурора — на генеральнага пракурора, былога сакратара райкаму — на віцэ-прэм’ера па сельскай гаспадарцы і г.д.). Такім чынам, магілёўская наменклатура атрымала магчымасць хуткага кар’ернага ўзлёту. Відавочна, што і яе статус, і ўсе сённяшнія фінансавыя датацыі Магілёўшчыне залежаць выключна ад знаходжання Лукашэнкі пры ўладзе. Акрамя таго, Лукашэнка, як і Мілошавіч,

выкарыстоўвае тактыку няспыннай ратацыі кадраў — не засталося дзяржаўнай установы, дзе раз у год, у два гады не адбываліся б кадравыя змены. Такім чынам максімальна змяншаецца аўтаномнасць дзяржаўнай бюракратыі. Наступная тэндэнцыя, аб якой некалі ўзгадваў былы міністр унутраных справаў Юры Захаранка, гэта прызначэнне на дзяржаўныя пасады людзей з “праблемамі з законам” у мінулым, што гарантавала лаяльнасць і магчымасць маніпуляцыі імі на новых пасадах. Заўважым, што амаль усе прадстаўнікі лукашэнкаўскага апарату, прыцягнутыя да крымінальнай адказнасці ў 1997—2000 гадах, былі асуджаны за злачынствы, здзейсненыя перад сваім прызначэннем (да такіх адносяцца Чыгір, Віннікава, Лявонаў і шэраг “прыўладных бізнесоўцаў”).

Нарэшце, Лукашэнка таксама стварыў сваю “паралельную дзяржаву”, што складаецца з мноства кантрольных органаў (іх каля пятнаццаці), функцыі якіх звычайна перакрыжоўваюцца, а таксама інстытуцый, што знаходзяцца ў непасрэдным падпарадкаванні прэзідэнта (прэзідэнцкая адміністрацыя, кіраўніцтва справаў прэзідэнта, што дублююць урад, служба бяспекі прэзідэнта і рада бяспекі, што дублююць карныя органы, і г.д.) Трэба зазначыць, што такая структура ўлады ў комплексе з антырынкавай эканамічнай палітыкай Лукашэнкі і яго папулісцкім памкненнем заўжды звальваць правалы на “дрэнных баяраў” прывяла да таго, што наменклатура не магла канвертаваць свае назапашаныя пры дапамозе карупцыі багацці ва ўласнасць і незалежны ад улады палітычны ды эканамічны капітал. Тое, што ва ўмовах Мілошавіча (ці ва ўмовах Расіі і Украіны) аддавалася прыўладным бізнесоўцам (а паралеляў можна прывесці багата — гэта і вядомая справа “Гандальэкспа”, і сакрэтны продаж зброі, і рээкспарт расійскай нафты), у Беларусі манапалізавалася самой дзяржавай. У Беларусі не з’явілася феномену алігархіі. Як зазначыла тая ж Віннікава, “багатыя людзі ў Беларусі адрозніваюцца ад багатых людзей у Расіі нават выглядам. Ім дазволілі мець вялікія грошы, але не дазволілі іх траціць. Нельга паехаць у адпачынак, асабліва за мяжу. Не кожны ездзіць у камандзіроўкі. Рэспубліка невялікая, таму нельга пайсці ў начны клуб ці купіць шыкоўны дом ці вілу і застацца

незаўважаным. Застаецца толькі многа есці і піць”[7]. Ва ўмовах, калі прадухілялася фармаванне прыватных капіталаў і аўтаномных алігархій, вялікія грошы мелі мінімальны палітычны ўплыў, нават калі прадстаўнік “унутранага кола” сыходзіў у апазіцыю (што прадэманстраваў лёс колішняга кіраўніка справаў прэзідэнта Івана Ціцянкова). Болей за тое, гэта падтрымлівала нізкі ўзровень сацыяльнай няроўнасці, нізкі (паводле ацэнак заходніх аналітыкаў) узровень “маштабнай” карупцыі і прымальны для ўлады ўзровень сацыяльнай стабільнасці.

У цэлым лукашэнкаўскі рэжым можна вызначыць як “гегеманічную аўтакратыю”, у якой “вонкавыя” дэмакратычныя інструменты (такія, як выбары) выкарыстоўваюцца ў абмежаваным выглядзе для пацверджання фактычна складзенага палітычнага статус-кво. Калі Мілошавіч ператвараўся ў султана, чыю ўладу абмяжоўваў плюралізм, дык Лукашэнка на пэўны час застаўся любімцам і народным героем, што кіруе тыраніяй.

[7] **Московские новости. 2000 г. 1 лютага.**

Стабільнасць аўтарытарных рэжымаў у абедзвюх краінах падтрымлівалася сістэматычнай палітыкай вынішчэння альтэрнатыў. Палітычныя альтэрнатывы знішчаліся злоўжываннем уладай у палітычным працэсе і рэпрэсіямі супраць апазіцыйных актывістаў. Рэпрэсіі праводзіліся як сродкамі “рэгулярных” карных органаў, так і спецыяльнымі аддзеламі, што наўпрост падпарадкоўваліся лідэрам ці сябрам іх “унутраных колаў”. Манапалізацыя электронных і друкаваных СМІ дазваляла знішчыць ці значна зменшыць доступ грамадства да інфармацыйных альтэрнатыў (гэта, аднак, меней адчувалася ў Сербіі, дзе большасць часу існавалі апазіцыйныя тэле- і радыёстанцыі, якія, аднак, пакрывалі толькі буйныя гарады, не выходзячы такім чынам за межы “жорсткага” апазіцыйнага электарату). Кантроль публічнай сферы рабіў магчымым вынішчэнне сацыяльных і культурных альтэрнатыў.

Актыўная і патэнцыйна апазіцыйная частка абодвух грамадстваў кантралявалася рэжымамі праз стварэнне адпаведнай сістэмы дзяржаўнага патранажу, што рабіў лаяльнасць перадумовай прафесійнага і кар’ернага росту ды паляпшэння дабрабыту. Да таго ж сам эканамічны крах, як гэта

ні парадаксальна гучыць для тых, для каго галоўнай крыніцай надзеяў на змену палітычнага рэжыму быў эканамічны крызіс і рост народнай незадаволенасці, значны адрэзак часу працаваў на руку дыктатарам. Па-першае, падзенне ўзроўню жыцця павялічвала атамізацыю грамадства, ставячы людзей ва ўмовы, пры якіх любая сацыяльная актыўнасць і камунікацыя даражэлі настолькі, што людзі вымушаны былі замыкацца “ў чатырох сцянах” свайго прыватнага жыцця. Напрыклад, у Беларусі за дзесяць год з 1990 да 2000 году колькасць штодзённа прачытваных газетаў на 100 чалавек зменшылася з 29 да 11, колькасць дасланых лістоў — з 29 да 12, колькасць наведанняў кінатэатраў — з 11 да 1 на чалавека ў год[8]. У Сербіі за той жа перыяд часу амаль дзве траціны насельніцтва цалкам перасталі купляць газеты і “выходзіць у свет”, напрыклад, наведваць тэатры ці кавярні. У такіх умовах асноўным інфарматарам аб падзеях і стваральнікам грамадскай думкі было дзяржаўнае тэлебачанне, што прасоўвала аднабаковыя вертыкальныя каналы камунікацыі. У той жа час сацыяльнай атамізацыі спрыяла і рэакцыя грамадства на эканамічныя цяжкасці, якая зводзілася не да пратэсту, а да адаптацыі. Паводле ацэнак статыстычных агенцтваў, да 80% жыхароў абедзвюх краін займаліся фактычна натуральнай сельскай гаспадаркай. Беларусь за часамі Лукашэнкі выйшла на сёмае месца ў свеце па валавым зборы бульбы і на першае — у зборы на душу насельніцтва. У Сербіі за гэты ж час адбылася зваротная міграцыя насельніцтва з гораду ў вёску (нешта падобнае адбылося ў Беларусі падчас другой сусветнай вайны), што навідавочна да росту ў сельскагаспадарчым сектары (вядома ж, выключна экстэнсіўнага). Эканамічны крызіс тым самым адштурхоўваў грамадзян ад палітычнай і грамадскай актыўнасці.

Дадамо, што лаяльнасць да ўлады падтрымлівалася і стварэннем спецыфічнай “культуры ўлады” — ідэалагічнай апрацоўкі насельніцтва пры дапамозе манапалізаваных дзяржавай мастацкай, культурнай, музычнай, кінематаграфічнай і іншых сфераў. Напрыклад, у Сербіі выразнай праявай “культуры ўлады” быў “турба-фолк”, сумесь поп-музыкі і традыцыйных сербскіх народных матываў, праз якія аўдыторыі даносілася афіцыйная палітычная рыторыка, вызначаліся “героі” і “ворагі”. Мілошавіч трапна выкарыстоўваў для легітымізацыі сваёй улады і шматлікія

[8] ***Belarus: Choices for the Future. National Human Development Report.*** **Minsk: UNDP, 2000.**

поспехі сербскага спорту. Напрыклад, групоўкі фанатаў колішняга ўладальніка Кубку еўрапейскіх чэмпіёнаў клубу “Црвена звезда” выкарыстоўваліся ім для нападаў на апазіцыйных дэманстрантаў і збівання апанентаў. У Беларусі прыкладам прапаганды “культуры ўлады” могуць служыць і актыўнае культываванне савецкай “папсы” праз фестывалі “Славянскі базар” ды “Залаты шлягер”, і палітычнае ангажаванне беларускіх і расійскіх поп-зорак ды вядомых спартоўцаў, і паказальныя хакейныя матчы ды лёгкаатлетычныя эстафеты “на лыжах па асфальце”, на якіх прэзідэнт карцінна перамагае колішніх алімпійскіх чэмпіёнаў, і іншыя мерапрыемствы, што дапамагаюць умацаваць культ “моцнага лідэра”. Рэжым выкарыстоўваў складзеныя дзесяцігоддзямі густы і сімпатыі свайго электарату для “мабілізацыі пасіўнасці”, выведу грамадства за межы палітычнага поля. “Апазіцыйная” культура (напрыкад, “апальны” рок-н-рол у Сербіі ці беларускамоўная рок-музыка ў Беларусі) узнікалі ў андэрграўндзе не толькі як культурныя феномены, а і як палітычныя субкультуры. У гэтых умовах культура ператваралася ў частку палітыкі, а палітыка — у форму культурнага існавання.

Мабілізацыя пасіўнасці і актыўнае спрыянне сацыяльнай атамізацыі дапамагло Мілошавічу і Лукашэнку без значных палітычных стратаў перажыць працэс паступовага расчаравання грамадства ў іх, які, ва ўмовах знішчэння альтэрнатываў, прыводзіў страчаных прыхільнікаў не ў апазіцыйны электарат, а, выкарыстоўваючы папулярны ў Беларусі выраз, у “балота”. Грамадства паступова дзялілася на тры групы: прыхільнікаў, апанентаў рэжыму і тых, хто не вызначыўся. Маніпуляцыя сацыяльнай, культурнай і палітычнай сферамі дазваляла рэжымам падтрымліваць упэўненасць “балота” ў тым, што “пры ўсіх недахопах і няўдачах існыя палітычныя інстытуты ўсё ж лепшыя за любыя іншыя”[9]. У электаральнай палітыцы такое становішча лёгка дазваляла лідэрам дамагчыся поспеху, дадаўшы да “цьвёрдага” электарату старанна апрацаванае “балота”. Разбурэнне гарызантальных сувязяў у грамадстве, якія складаюць аснову грамадзянскай супольнасці, не зачапіла аднабаковых вертыкальных сувязяў паміж уладай і грамадствам, што

працу апазіцыі выключна цяжкай.

Абодва рэжымы праявілі неабыякую здольнасць да выжывання, нягледзячы на эканамічныя цяжкасці і міжнародную ізаляцыю. Ізаляцыя, як ужо было падкрэслена раней, была жорсткай у выпадку Сербіі, дзе краіна апынулася пад татальнымі санкцыямі ААН у перыяд з 1992 да 1995 году і зноў — з 1999 да 2000 году. Санкцыі знякровілі эканоміку, што за часамі камунізму была шчыльна інтэгравана ў заходнюю эканоміку. Краіна, што мела сярэдні ўзровень жыцця яшчэ ў 1980-я гады, апусцілася на адзін узровень з Албаніяй (у найцяжэйшыя часы гіперінфляцыі ў 1992—93 гадах, калі цэны ўзрасталі на некалькі працэнтаў у гадзіну, сярэдні заробак не перавышаў 10 долараў на чалавека ў месяц). У выпадку Беларусі санкцыі былі хутчэй касметычнымі і прыпадалі больш на палітычную, чым на эканамічную сферу. Краіна не мела ні вялікай замежнай пазыкі, ні шчыльных гандлёвых ці інвестыцыйных сувязяў з Захадам. Тыя, што ўзніклі за часамі незалежнасці і пачалі разбурацца, дзякуючы як антырынкавай эканамічнай палітыцы Лукашэнкі, так і згортванню раней дасягнутых гандлёвых пагадненняў з Еўрасаюзам і ЗША, былі амаль бязбольна кампенсаваныя эканамічным і вайсковым саюзам з Расіяй. Заўважым, што не спрацавала ні жорсткая, ні мяккая ізаляцыя. У сербскім выпадку санкцыі далі лёгкі адказ на пытанне, хто вінаваты ў эканамічнай катастрофе. Тое самае выкарыстоўвалася і Лукашэнкам, які нават імкнуўся кампенсаваць адносную абыякавасць да сваёй асобы паслядоўным правакаваннем новых канфліктаў з заходнімі краінамі і інстытутамі. Самым трагікамічным прыкладам была каналізацыйная вайна ў Драздах.

The Breakdown of Democratic Regimes: Crisis, Breakdown, and Reequilibration. **Baltimore: Johns Hopkins University Press, 1978. P. 16.**

Малаімавернасць элітных і кампрамісных варыянтаў трансфармацыі

Сумяшчэнне папулісцкага і султанісцкага падмуркаў аўтарытарнай улады, яе ўкарэненасць у палітычную культуру сваіх прыхільнікаў і механізмы “знішчэння альтэрнатываў” пэўным чынам абмежавалі магчымыя варыянты трансфармацыі палітычных рэжымаў і стварылі параўнальныя ў сваёй

прыродзе выклікі для дэмакратычных рухаў, што знаходзіліся ў апазіцыі. Так, эфектыўны кантроль над уладным апаратам не пакідаў магчымасці для стварэння ў яго нетрах уплывовай групоўкі прыхільнікаў мяккай лініі, здольнай нейтралізаваць уплывы “ястрабаў” унутры дзяржаўнай эліты і дамагчыся пераменаў шляхам перамоваў з памяркоўна настроенымі прадстаўнікамі апазіцыі (да такой мадэлі трансфармацыі была больш прыдатная старая аднапартыйная сістэма з яе прынцыпам калектыўнага кіраўніцтва). Такі ход падзеяў быў прадухілены існаваннем унутранага кола актыўных паплечнікаў дыктатараў, якія эфектыўна адсоўвалі ад улады больш ліберальна настроеных калег (нагадаем хаця б кадравыя ператасоўкі ў лукашэнкаўскім апараце падчас перамоваў з апазіцыяй у 1999 годзе ці перад прэзідэнцкімі выбарамі пры канцы 2000 году). Відавочна, што адсутнічала і магчымасць лібералізацыі зверху, бо самі дыктатары такога кшталту, як правіла, не маюць ілюзій наконт таго, што ім нясе нават невялікае аслабленне рэпрэсіўнага кантролю.

Ва ўмовах, калі элітныя і кампрамісныя варыянты трансфармацыі блакаваў сам рэжым, адзіным варыянтам палітычнай трансфармацыі заставалася замена рэжыму пры дапамозе і ўдзеле апошняга і галоўнага палітычнага рэсурсу — грамадства (маецца на ўвазе вулічная ці электаральная рэвалюцыя). Аднак гэткая замена мусіла ажыццяўляцца ў іншых варунках у параўнанні з ранейшымі выпадкамі пераходу ад дыктатуры да дэмакратыі ва ўсходнееўрапейскіх краінах. Па-першае, магутная пасіўная падтрымка рэжыму ўнутры грамадства была не менш важным падмуркам аўтарытарнай улады, чым яе рэпрэсіўны апарат. Сацыяльныя і культурныя фактары, што спрыялі стабільнасці рэжымаў, пакідалі мала шанцаў для выкарыстання “нацыі” ці “грамадзянскай супольнасці” як мабілізацыйнага фактару для апазіцыі. Рэч у тым, што для паспяховага выкарыстання гэтай тактыкі апазіцыя мусіла найперш усталяваць сваю ідэалагічную гегемонію ў грамадстве накшталт таго, як з бласлаўлення касцёлу гэта зрабіла “Салідарнасць” у Польшчы. Аднак ва ўмовах і Сербіі, і Беларусі фактычна не было палітычных і культурных сімвалаў, якія б аб’ядноўвалі, а не раз’ядноўвалі грамадствы, не выклікалі б рэзкага непрымання адной з яго частак. Такім чынам, большасць экстраінстытуцыйных формаў палітычнай

барацьбы (такіх, як вулічныя акцыі ці падпольная барацьба) фактычна ажыццяўляліся ў асобных сацыяльных ды культурных асяродках і часцяком зводзіліся да “навяртання навернутых” — як мінімум да таго моманту, пакуль расчараванне статус-кво і змена палітычных арыентацый не дасягалі крытычнай масы. Аднак, як ужо было растлумачана, гэты працэс ішоў доўга і даволі марудна. Фактычна, адзіным варыянтам выхаду з аўтарытарнага рэжыму заставалася фармаванне “дэмакратычнай супербольшасці” ў грамадстве, прычым гутарка ідзе не проста пра крытычную масу апанентаў рэжыму, але і пра пераважную большасць свядомых прыхільнікаў канкрэтнай, персаніфікаванай у партыях, кааліцыях і персаналіях дэмакратычнай альтэрнатывы. Што, заўважым, не адно і тое ж: і ў выпадку Мілошавіча, і ў выпадку Лукашэнкі іх адмоўныя электараты стабільна перавышалі (цягам часу — у некалькі разоў) дадатныя электараты ўсіх іх апанентаў, разам узятых.

Чаму я раблю акцэнт менавіта на “супербольшасці”? Важным наступным крокам апазіцыі пасля заваявання падтрымкі ў грамадстве з’яўляецца мабілізацыя сваёй сацыяльнай базы для палітычнага дзеяння. Мабілізацыя ці для вулічнага, ці для электаральнага дзеяння мусіць пераадолець шэраг бар’ераў, якія натуральна ўзнікаюць у аўтарытарных умовах, — такія, як страх і няўпэўненасць асобнага чалавека ў тым, што дзякуючы яму палітычнае дзеянне большасці можа дасягнуць поспеху. Ва ўмовах сацыяльнай атамізацыі і разбурэння гарызантальных каналаў камунікацыі паміж людзьмі такі стэрэатып амаль немагчыма пераадолець тым, чым можна дамагчыся перамогі ў дэмакратычных умовах, — перавагай у некалькі працэнтаў грамадскай падтрымкі. Да таго ж, калі гутарка ідзе аб электаральных дзеяннях, менавіта супербольшасць можа запярэчыць фальсіфікацыі выбараў, мабілізаваць грамадскі супраціў фальсіфікацыі (больш падрабязна пра гэта гл. ніжэй на прыкладзе Сербіі).
Перад дэмакратычнай апазіцыяй паўставала задача пераўтварэння нарастаючай масы пасіўных апанентаў рэжыму і значнай часткі балота ў сваіх актыўных прыхільнікаў. І тут апазіцыя сутыкалася з праблемай “гары і Магамета” — адзін факт яе існавання не выклікаў энтузіязму з боку грамадства.

Яна мусіла пераадолець і грамадскія стэрэатыпы, і культурныя бар'еры, што першапачаткова аддзялялі яе ад большай часткі электарату, дзеля чаго неабходна было збудаваць моцныя інстытуты камунікацыі з грамадствам, дасягнуць арганізацыйнага і ідэалагічнага адзінства ў сваіх шэрагах і, самае галоўнае, выпрацаваць дэмакратычную альтэрнатыву, якая б знайшла падтрымку ў сярэднестатыстычнага грамадзяніна. У апісаных раней палітычных і сацыяльных умовах, што прыводзілі да мінімізацыі грамадскай актыўнасці, адзіным практычным спосабам дайсці да людзей заставаўся ўдзел у палітычным працэсе, арганізаваным рэжымам, а менавіта — у выбарах. Неабходнасць удзелу ў "сістэмным" палітычным працэсе абумоўлівалася яшчэ й тым, што менавіта перамога на выбарах надае легітымнасць прэтэнзіям апазіцыі на ўладу і канчаткова разбурае "квазідэмакратычную" легітымнасць дыктатараў. Тым самым знікае лаяльнасць да лідэра і ягонага ўласнага апарату з боку грамадства, заснаваная на факце яго колішняга абрання народам і ўпэўненасці ў яго неабмежаваных магчымасцях захавання ўлады праз "рэгуляваны" выбарчы працэс, што прадухіляе ў апазіцыі памкненне здабыць уладу, а ў дзяржапарату — да сабатажу і "здачы" свайго патрона. Забягаючы наперад, падкрэслім, што ў сербскім выпадку падзеі разгортваліся ў паслядоўнасці "выбары — сілавая акцыя — здача лідэра ўнутраным колам", прычым без першай часткі, пераканаўчай перамогі на выбарах, дзве іншыя былі б немагчымыя.
Вядома, перспектыва ўдзелу ў выбарах, арганізаваных рэжымам, стварала небяспеку яго легітымізацыі як унутры краіны, так і па-за яе межамі. Гэткая небяспека была больш адчувальнай у выпадку Беларусі, дзе палітычны працэс быў апанаваны рэпрэсіўным апаратам у значна большай ступені, чым у Сербіі. Аднак праўда і тое, што ў беларускім выпадку быў мацнейшым і папулісцкі падмурак улады, што рабіла яшчэ больш актуальным пытанне ліквідацыі "квазідэмакратычнай легітымнасці" прэзідэнта і пакідала яшчэ менш надзеяў — ва ўмовах старанна падтрымліванай ізаляцыі апазіцыі ад грамадства, — што неінстытуцыйныя метады палітычнага дзеяння змогуць дасягаць сацыяльнага асяроддзя, шырэйшага за апазіцыйную палітычную субкультуру.
Абодва лідэры не мелі ніякіх ілюзіяў наконт таго, да чаго можа

давесці лібералізацыя выбарчага заканадаўства. Таму патрабаваць ад іх свабодных і справядлівых выбараў было тое самае, што прасіць іх застрэліцца. Фактычна, ва ўмовах, калі апазіцыя не мела сродкаў для масавай мабілізацыі на неінстытуцыйную палітычную дзейнасць (і болей за тое, як будзе зазначана ніжэй, вулічная мабілізацыя рабілася магчымай праз мабілізацыю электаральную), шлях да свабодных выбараў ляжаў праз перамогу ў выбарах несвабодных.

“Маральная” палітыка ці палітычная самаізаляцыя?
Важным чыннікам у ператварэнні палітычнай апазіцыі ў эфектыўную і канкурэнтную альтэрнатыву аўтарытарным рэжымам мусіла стаць узаемадзеянне апазіцыйнай палітычнай і грамадзянскай супольнасці. Дарма што гэтыя асяроддзі непазбежна разглядаліся ўладай як дзве часткі апазіцыі і што між імі існавала шчыльная ўзаемасувязь, у дзвюх супольнасцяў былі і ёсць свае спецыфічныя мэты і функцыі. Грамадзянская супольнасць, якое ўвасабляецца ў сетцы няўрадавых арганізацый, гэта перш-наперш асяроддзе, што спрыяе незалежнай самаарганізацыі грамадзян для абароны грамадскіх (а не вузкапартыйных) інтарэсаў. Вядома, ва ўмовах, калі сама ідэя самаарганізацыі ўспрымаецца палітычным рэжымам як крыніца пагрозы для свайго існавання, грамадзянская супольнасць непазбежна становіцца апазіцыйнай і пераўтвараецца ў пэўную зону аўтаноміі для незалежнай думкі і дзеяння, у адпаведнасці з вядомым прынцыпам “жыць у свабодзе ў несвабоднай краіне”, сфармуляваным былым польскім дысідэнтам Адамам Міхнікам. Палітычная супольнасць непазбежна пераўтвараецца ў зону больш вузкіх інтарэсаў, што азначаюцца інтарэсамі і ідэнтычнасцямі палітычных партыяў і рухаў, а таксама амбіцыямі іх лідэраў. Ва ўмовах, калі і палітычная, і грамадзянская супольнасць з’яўляюцца па сутнасці апазіцыйнымі, на долю другой ускладаецца адказная і цяжкая місія падрыхтоўкі сацыяльнай глебы для палітычных пераменаў, а таксама ў некаторых выпадках — інтэлектуальнай і нават арганізацыйнай дапамогі палітычнай апазіцыі, дзейнасць якой паводле азначэння рэгулюецца больш кароткімі “часавымі гарызонтамі”. Але каб выконваць сваю ролю,

грамадзянская супольнасць павінна мець пэўную ступень арганізацыйнай і ідэалагічнай незалежнасці ад палітычнай апазіцыі — інакш яна пераўтвараецца ў служку вузкіх інтарэсаў у яе шэрагах.
Грамадзянская супольнасць імкнецца дасягнуць пэўных базавых умоваў у грамадстве, змагаецца за прынцыпы, а не за канкрэтных асобаў, і тым самым імкнецца да больш шырокіх мэт ды дзейнічае інакш, чым супольнасць палітычная, для якой прынцып і канчатковая мэта час ад часу саступаюць месца прагматычнаму разліку і кароткачасовым інтарэсам. У той жа час, грамадзянская супольнасць пры аўтарытарызме часта будуецца на спецыфічна вызначаных этычных прынцыпах, што вызнаюць маральным толькі існаванне ў вузкім коле “паралельнага грамадства” (дзе, адпаведна ідэі, і захоўваецца свабода), максімальна ізаляванага ад уплыву і ідэалагічнай апрацоўкі афіцыйнага грамадства. Гэтая ідэя “этычнасці” грамадзянскай супольнасці і самакаштоўнасці “паралельнага грамадства” сваімі каранямі ўзыходзіць да часоў дысідэнцкіх рухаў у Сярэдняй Еўропе, дзе яна ўвасобілася ў прынцыпе “антыпалітыкі”. Зазначым, аднак, што “маральнасць” антыпалітыкі можа быць прызнанай толькі ў выпадку жорстка кантраляваных таталітарных дзяржаваў, дзе дзейнічае вядомы прынцып, пра які добра сказаў Уінстан Чэрчыль: “Забаронена ўсё, а ўсё дазволенае — абавязковае”, і любы ўдзел у палітычным жыцці можа ажыццяўляцца толькі ў межах афіцыйнай ідэалогіі кіроўнай партыі. Відавочна, што аўтарытарныя рэжымы, асабліва тыя, што вызначаюцца пэўнай ступенню інстытуцыйнага “дуалізму”, пад гэтую катэгорыю не падпадаюць. У той жа час “этычная” грамадзянская супольнасць можа стаць і надзвычай эфектыўным сродкам палітычнай барацьбы, але, як я ўжо зазначыў у дачыненні да польскага досведу, гэта магчыма толькі тады, калі сама аўтарытарная ўлада (як правіла, навязаная грамадству звонку) ператвараецца ў палітычную субкультуру, што не мае ідэалагічнага ўплыву на грамадства. Ва ўмовах, калі разбурэнне квазідэмакратычнай легітымнасці ўлады і стварэнне грамадскай супербольшасці ў падтрымку дэмакратычнай альтэрнатывы з’яўляюцца неабходнымі перадумовамі дэмакратычнай трансфармацыі, падштурхоўванне “этычнай” грамадзянскай супольнасцю

палітычнай апазіцыі да адыходу ў “паралельнае грамадства” фактычна дэмабілізуе апошнюю і пакідае грамадства без дэмакратычнай альтэрнатывы.
Калі вярнуцца да палітычнай апазіцыі, дык галоўнай прычынай, што перашкаджала яе эфектыўнай дзейнасці ў абедзвюх краінах, была стракатасць паходжання, палітычных, ідэалагічных і культурных арыентацыяў яе асобных плыняў і лідэраў. Часцяком сацыяльныя супярэчнасці ў расколатых грамадствах прыводзілі да расколаў у асяроддзі апазіцыі не толькі на “традыцыйнай ідэалагічнай” глебе (левыя супраць правых, лібералы супраць кансерватараў і г.д.), але і ў больш фундаментальных пытаннях, такіх, як дзяржаўнасць, нацыя і нават сама дэмакратыя. Да таго ж, новаўтвораныя апазіцыйныя рухі і партыі ва ўмовах адсутнасці сталых дэмакратычных традыцый часта больш клапаціліся пра ўласную самаідэнтыфікацыю і замацаванне на палітычнай арэне, чым пра абарону шырэйшых надпартыйных інтарэсаў, чаму спрыялі неабмежаваныя палітычныя амбіцыі іх лідэраў.
Вось жа, лёс дэмакратычнай трансфармацыі ў аўтарытарных умовах непасрэдна залежаў ад здольнасці прыхільнікаў пераменаў да змайстравання дэмакратычнай альтэрнатывы пры палітычных і сацыяльных умовах, што спрыялі яе заняпаду. Палітычная апазіцыя мусіла прайсці праз колы няўдач, расчараванняў і ўнутраных канфліктаў.
Галоўнымі чыннікамі поспеху сербскай апазіцыі было не толькі расчараванне пераканаўчай большасці сербскага грамадства ў Мілошавічу, але і плён доўгага перыяду навучання на ўласных памылках, што ўрэшце выпрацавала ў апазіцыі волю да яднання і ўгрунтавала яе ў грамадстве дзякуючы ўдзелу ў “сістэмнай палітыцы”. Фактарам поспеху было таксама эфектыўнае супрацоўніцтва паміж палітычнай апазіцыяй і грамадзянскай супольнасцю, якая “загадзя падрыхтавала” дэмакратычныя перамены.
Галоўнымі чыннікамі дагэтулешняй палітычнай бездапаможнасці беларускай апазіцыі былі яе няздольнасць вырвацца з замкнутага кола існавання ў паралельным грамадстве і пераадолець унутраныя супярэчнасці, што працягвалі раз’ядноўваць яе нават тады, калі фармальна яна гуртавалася.
Працяг будзе.

[image]
[image]
Пачатак Навіны Форум
Пошук Аўтары Цалкам Іншае
№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/30
[image]

Ігар Карашчанка

Чэхі ў Беларусі

ІГАР КАРАШЧАНКА (нар. у 1959 у Менску) — фалькалярыст. Працаваў у акадэмічным інстытуце этнаграфіі й фальклёру. Ягоная апошняя публікацыя ў "ARCHE" — артыкул "Гарышчына" (№ 3-2003).

У Беларусі чэхаў, а тым больш славакаў, жыло нашмат, таму ў масавай свядомасці яны не адбіліся так, як ва Ўкраіне, дзе яны пражывалі і жывуць куды больш шматлікай супольнасцю. Не засталося ўжо й тых беларусаў, ураджэнцаў Заходняй Беларусі, якія ў 1920—1930-я гады жылі ў Чэхаславаччыне: навучаліся там у розных навучальных установах, арганізоўвалі свае нацыянальныя студэнцкія зямляцтвы, жывучы на стыпендыі і з капання бульбы ў прадмесцях Прагі... Ды затое мо з часоў Францішка Скарыны ў нашай мове працуе і працаваў шэраг чэхізмаў, многія з якіх прыйшлі ў старабеларускую мову праз пасрэдніцтва польскай: "гарцаваць" (уступаць у паядынак перад строем войскаў), "гасла" (пароль), "табар" (абоз, табар) і г.д. Са "славакізмаў", што бытавалі ў той даўні час (XVI ст.), нашы мовазнаўцы прыводзяць, па-мойму, толькі адно слова — "бачкурка" (туфель, ад славацкага "bačkor").

Затое ў нас, далячэнькіх, як папраўдзе, ад Чэхіі і Славакіі, можна сустрэць чалавека, які родам з якіх-небудзь Чэхаўцаў, што на Гарадзеншчыне, у беларуска-літоўскім этнакультурным

памежжы, дзе, дарэчы, яшчэ ў 1980-я гады ў вясельным ці якім іншым застоллі можна было пачуць літоўскія песні.
Можна ў нас запісаць песні і выслоўі ад людзей, якія паводле мясцовай традыцыі мянуюцца “ганакі”, “ганаччо” (збіральн.), як, напрыклад, “магілёўскія” жыхары вёскі Мікалаеўка і іншых вёсак Лоеўскага раёну Гомельскай вобласці. У час вялікай айчыннай вайны ў тых месцах з’явіліся смаленскія перасяленцы, якіх фашысты адсялялі на захад з прыфрантавой паласы і якіх, як і іншых немясцовых насяленцаў, мясцовыя сяляне называюць “ганаччом”. Ці падобныя нечым нашы прыдняпроўскія “ганакі” да “ганакоў” Маравіі — вядомай этнаграфічнай групы чэхаў, — над гэтым няхай задумваюцца вучоныя мужы.
Хто ведае, можа, і выслоўе “Не трэба ендрося ендросіць, а кудосю кудосіць”, якое бытуе на Тураўскім Палессі і якое народная традыцыя разглядае як рашучую перасцярогу нядбалым гаспадыням-“расамахам”, неяк звязана і з перасцярогай ад непатрэбных варожбаў, а можа, і з’яўляецца нейкім водгуллем у асяроддзі славянскіх народаў вядомага паўстання Ондраша ў Маравіі.
Нарэшце, пра нешта магчыма чэшскае, заходнеславянскае вельмі ж красамоўна нагадвае нам назва багата аздобленых традыцыйнымі ўзорамі рукавоў у традыцыйным жаночым адзенні беларусаў з блізкіх да Расіі, а недзе і да Украіны мясцін (як, напрыклад, у гаруноў на Сумшчыне), — “чэхлікі” (запісана ў 1990-я гады).

Пачатак чэшскай і славацкай прысутнасці ў Беларусі прыпадае на Сярэднявечча. У XVI стагоддзі на беларускія землі прыбывалі так званыя “аляяры” — славацкія вандроўныя гандляры алеем і лекамі. Тады, відавочна, з’явіліся тут і рамеснікі, вайскоўцы, асобы духоўнага звання (у прыватнасці, “чэшскія” (“мараўскія”) браты).
У найноўшы ж час большасць усіх чэхаў тагачаснай Савецкай Беларусі пражывала на гістарычнай Мазыршчыне. “Кажуць, папалі сюды чэхі з Аўстрыі на паншчыну... Колісь купілі яны ў паноў зямлю і пасяліліся тут у Галоўчыцах. Чэхі працавалі на зямлі”, — так успаміналі нам пра перасяленне чэхаў на беларускія землі ў 1860-я гады сяляне Нараўлянскага раёну Гомельскай вобласці (запіс 1990-х). Канкрэтызуючы, нам

растлумачвалі: “Памешчык выдаваў чэхам-работнікам крупы, муку. На карову — 100 пудоў сена. Мужчыны працавалі на полі, касілі, аралі, працавалі на конях. Таму іх называлі “фарналі”. Замужнія жанчыны, што мелі дзяцей, не працавалі ў полі, глядзелі сям’ю” (запісана ў 1995 годзе ў пасёлку Чэхі на Нараўляншчыне). Паступова сфармавалася некалькі асяродкаў пражывання чэхаў. Сярод буйнейшых — маёнтак Галоўчыцы ў былым Мазырскім павеце Менскай губерні (належаў памешчыку Горвату; цяпер вёскі Двор і Чэхі сучаснага Нараўлянскага раёну Гомельскай вобласці); вёска Санюкі і наваколле (урочышча Ляхаўшчына і інш.) у сучасным Ельскім раёне (былым Каралінскім) той жа вобласці. Паводле звестак перапісу 1926 году, з 650 чалавек чэхаў і славакаў БССР у Мазырскай акрузе жыло 486 чалавек (з іх 288 чалавек роднай мовай лічылі чэшскую). Паводле ж звестак перапісу 1897 году, у тагачасным Рэчыцкім павеце мелася даволі значная група (121 чалавек) праваслаўных чэхаў. Адзначым наступнае. Частка чэхаў (прынамсі, многія з наваколля Санюкоў) перасяліліся на беларускае Палессе з Валыні. Так, у прыватнасці, старажылы Санюкоў у размове з намі адзначалі: “Карнійчук (чэх) неяк сказаў, што чэхі прыехалі сюды аднекуль з Валыні. Былі яны каталікамі (рыма-каталікі), ездзілі ў Жытомір у касцёл”. У той жа мясціне мы чулі такую канкрэтызацыю: “Чэхі Сухамолі недзе з-пад Дубна, Роўна ва Ўкраіне — з сельсавету Іваньня Дубенскага раёна Ровенскай вобласці”. На беларускае Палессе чэхі, як немцы Беларусі, дасяляліся з Валыні ў 1900—1910-я гады. Як былыя падданыя Аўстра-Венгрыі, яны ў час першай сусветнай вайны былі прымусова эвакуяваны ўглыб Расійскай імперыі і пэўны час жылі ў былой Арлоўскай губерні. З чэхаў у наваколлі Галоўчыц у розны час жылі Траўнічкі, Бачыны, Карабцы, Сынэк, Вафэкі (ці Вафкі), Янічэк (па-мясцоваму Янічко), Ажэнілэк, Козак, Свобада (па-мясцоваму Слабода), Сыровыя (сям’ю чарнобыльскіх адсяленцаў Канстанціна Сыровага, 1928 г. нар., і Ганны Сыровай, у дзявоцтве Вафэк, 1932 г. нар., з вёскі Двор, я сустрэў у менскай Малінаўцы, дзе жывуць многія чарнобыльцы-перасяленцы з розных раёнаў Гомельшчыны і Магілёўшчыны), Вожышэк (настаўнік чэшскай школы ў 1930-я), Гаек у Антонаве, Дэконскі (інакш Дзеконскі) у Мальцаве. У наваколлі Санюкоў жылі Працівенскія, Бачыны, Сыровыя, Сухамелі, Карнійчук, Кімпал (якога называлі

аўстрыйцам, бо ў час першай сусветнай вайны ён быў падданым Аўстра-Венгрыі, ваяваў як вайсковец гэтай дзяржавы), Новак, Артысук, Вафкі ў Чырвоным Пільшчыку, Пангліч па Кустаўніцкай дарозе ў раёне Тажылаўкі. У вёсцы Роза-Люксембург (колішняй Анзельмаўцы) сярод немцаў, беларусаў і ўкраінцаў жылі чэхі па прозвішчы Шэды.

Праз нешматлікасць чэхаў у Беларусі, а таксама іхнюю асіміляванасць (у выніку этнакультурнага збліжэння з беларусамі-каталікамі ды палякамі; “ты ж паляк, ядрыць тваю налева” — пачуў у Чэхах ад суседа-беларуса) доўгі час ніякага нацыянальна-культурнага будаўніцтва сярод чэхаў Гомельшчыны не вялося. І толькі ў галодныя ці “паслягалодныя” 1933—1934 гады, калі найбольш спрыяльны час нацыянальна-культурнага будаўніцтва сярод нацменшасцяў БССР мінуў, а заставалася толькі такая экзотыка, як чытанне кітайскіх кніг кітайскімі калгаснікамі з-пад Віцебску, выраб галёшаў асірыйцамі гораду Гомелю (якія, дарэчы, мелі сваю беларуска-асірыйскую школу), распаўсюджанне аблігацый БелАЗЕТу, арганізацыі, што займалася землеўпарадкаваннем працоўных яўрэяў, чэхі арганізавалі школку... У беларускай прэсе з’явілася паведамленне пра тое, што разам са школамі на 11 мовах у рэспубліцы адкрылася школа на чэшскай мове (“Звязда”, № 198 ад 1 верасня 1935). У пасёлку Чэхі была арганізавана пачатковая чэшская школа. Настаўнікам першага й другога класаў — усяго ў найманых у гаспадароў-вяскоўцаў хатах вучылася чалавек пятнаццаць — быў нехта Стэфан Лойзікавіч (сын Алоіза) Вожышэк. Паводле ўспамінаў вяскоўцаў, гэта быў чалавек сярэдніх гадоў, сямейны (жонку звалі Лаўра, меў двох дзяцей), кватараваў у вёсцы Востраў. Падручнікаў чэшскай мовы было мала, штук пяць на ўсіх вучняў. Як зачынілі чэшскую школу (недзе ў 1936 годзе), ён пэўны час працаваў у мясцовай беларускай школе і толькі ў пачатку 1937-га выехаў. Пасля таго як зачынілі чэшскую школу, дзеці давучваліся ў беларускай школе ў вёсцы Двор. Тры чалавекі пайшлі вучыцца ў польскую школу ў вёску Галоўчыцы і правучыліся там адзін ці два гады.
Першую рубленую хату ў Чэхах, пабудаваў сабе Траўнічак у 1929-м годзе. Датуль жылі ў панскіх мураваных дамах. У тым жа годзе ў навакольлі Двара і Галоўчыц, а таксама ў Чэхах была

праведзена калектывізацыя. У апошняй вёсцы быў арганізаваны калгас “Герой працы”. Калектывізацыя не прывяла да рэпрэсій супраць заможнай часткі чэшскага насельніцтва. Арышты адбыліся ўжо ў другой палове 1930-х “па лініі НКВД”. Тады ў Чэхах арыштавалі шэсць чалавек: двух Працівенскіх, трох Сыровых і аднаго Бачыну. Старыя людзі кажуць: “На іх навялі, што з Польшчай (са сваякамі з заходняй Украіны, а можа, і Чэхіі) маюць перапісь”.

Што да асаблівасцей матэрыяльнай культуры, звычаёвасці, дык трэба адзначыць наступнае. Даўней чэшскія жанчыны не ткалі, абыходзіліся куплёным. Сталі ткаць у вялікую айчынную вайну, навучыліся ад суседзяў-беларусаў. Апошнія — па старой звычцы і ў выніку кантактаў з вайскоўцамі-славакамі, якія з’явіліся на Палессі разам з немцамі — называлі чэхаў “драцязамі” (г. зн. “малазаможнымі”), “грэкамі”. У вайну пасярод вёскі стаяў крыж. Яго павязвалі ручнікамі, да Вялікадня, Дабравешчання, Стрэчання на яго вешалі вяночкі. Свае святы старыя людзі называлі нам красамоўна: Чэшскі Спас, Чэшская Тройца, Сва́та Троічка. Сярод цікавых абрадаў трэба адзначыць звычай “ганяць скочак” на другі дзень Вялікадня (абрадавае абліванне).

Да 1950—60-х гадоў чэшскую мову было чуваць у пасяленнях, населеных чэхамі. Да пачатку 1960-х яна ўжывалася пры адпяванні нябожчыкаў. У час сумесных маленняў збіраліся ў доме “Бабічкі” — жонкі былога панскага хмельніка Івана Траўнічка.

[image]
[image]

Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: **2003/09/28**
[image]

Вячаслаў Адамчык

Дзённік 1998

Працяг. Пачатак у № 3 за 2003 год.

Серада, 1 ліпеня 1998 году.
7.00. Сёння ноччу запісаў на полі старога часопісу з дзённікамі Твардоўскага: “Прачнуўся ў 2.30 ад невыносна моцнага галаўнога болю. Шукаю таблеткі (клафелін і берліпрыл)”. Галава цяжкая і цяпер. У дадатак левы бок ніжай рэбраў працінае востры, як іголкі ці лязо брытвы, падазроны агонь. Нырка, посік? Не разбяру, што баліць.
Хацеў паскардзіцца Ніне, але ёй ужо слова не скажы. Крыўдуе за кожную дробязь, наракаючы на сваю старасць. А яна, старасць, і праўда ўжо чуецца і ў нашых бясконцых хваробах, і [ў] недакладных рухах, калі ўсё падае з рук, і ў страце памяці, калі іншы раз ідзеш, забываючыся, куды і па што ідзеш. Сарваўшыся з электраправадоў, на чарэшню ў нашым двары злятае цэлая грумадка пісклявых драздоў. Ягад на ёй ужо няма. Тую жменю, што яны яшчэ не падзяўблі, я ўчора абабраў. Але ім напэўна помніцца, што (днямі) надоечы яны добра тут ласаваліся. Пазаўчора іх апярэдзіла сойка. Яна сядзела на дрэве, не баючыся нават Нінінага крыку.
Рэч простая — кожная істота хоча жыць. А раз жыць, то

і жывіцца.
Калісьці Жорж Сімэнон не мог гаварыць з Андрэ Жыдам пра яго кніжкі, бо ніводнай з іх, апрача дзённікаў, да канца дачытаць не мог. А ўсё, як прызнаваўся Сімэнон, праз яго стыль — занадта правільны і занадта элегантны.
Але ж і заскарузлы і зусім не элегантны, а хутчэй — абшарпаны і галеча-жабрачы стыль нашых раманаў я не магу ўспрымаць. Душа вымагае дакладнасці, інтэлігентнасці, элегантнасці, нарэшце, пісьменнай літаратурнай мовы, прасеянай хоць збольшага на першае, негустое сіта ад русізмаў (урон), дыялектызмаў (ейны і ягоны) і ўсечаных наркомаўкай ненатуральных слоў (зроблен).

Чацвер, 2 ліпеня 1998 году.
14.20. Патэлефанаваў у Мінск Ніне. І што ні дзень, то найгоршая навіна: Міраславу не далі ліцэнзію на выдавецкую дзейнасць, Наташу выганяюць з працы ў Доме літаратара. Не дзіва, што нашы кніжкі могуць скласці касцёр на Круглым пляцы. Бібліятэку ў суполцы літаратараў ліквідуюць. Там загаспадарылі тры невядомыя срулі і кіргізка Іпатава. Ці ім да нацыянальнай беларускай культуры?
Рука сапраўды ўжо шукае гранату ці спуск у гранатамёце.
І шкада, што іх у мяне няма. А наўкруга — бандытызм, хабарніцтва, распуста, махлярства і здрадлівыя лукашэнкі з малафейкінымі /.../
21.10. Як хвалюецца, як шапоча, як кіпіць раскалыханы і ўзбунтаваны ветрам наш малады сад. Як шугае, густа шуміць, раскалыхвае з парыпваннем франтон (веранды) мансарды парыўны вецер. Ён дзьме з-пад сівых, набрынялых дажджом, ацяжэлых хмараў, што засцяць неба. Мільгае лямпачка, нібы папярэджваючы, што ноччу электрыкі не будзе. Яна то прыгасае, свецячы толькі чырвонымі валаскамі, то ўспыхне ярчэй, ператварыўшыся ў сонца...

Субота, 4 ліпеня 1998 году.
9.15. Учора дзікая гульба на праспекце: бубны, гармоні і электрагітары. Гурты п'янай моладзі. З магазінаў прывезлі не толькі гарэлку, а чамусьці сантэхніку: ракавіны і ўнітазы. Наш пад'езд заблакавалі скрынямі каньяку. Я нават паскардзіўся паліцэйскаму. На кветніках пад ліпамі валяліся смяротна

п’яныя мужчыны.
Сапраўды, пір у часе чумы.

10.30. Схадзіў на паштамт і палучыў нарэшце пенсію.
У свой пад’езд, сёння застаўлены скрынямі з двума бусламі, прарваўся дзякуючы міліцыянеру. Каб не ён, то алкашы з бурачковымі тварамі і наглыя дзявулі скрыні не адсунулі б.

Нядзеля, 5 ліпеня 1998 году.
Учора — ізноў дзікая гульба. П’яная гурма ў сінім дыме ад шашлычных жароўняў пад гукі ўзмацняльнікаў ляніва, як чэрві, варушылася на праспекце насупраць банку.
Ледзь не лопалі перапонкі, калі я прайшоў міма чорных скрыняў, з якіх выляталі рытмы тамтамаў.
На пляцы Якуба Коласа не мог дачакацца тралейбуса — праспект быў заняты шнурамі задыханых, спацелых бегуноў.
На крос выйшлі і дзяды, і ўнукі. Каб так на касьбу, ворыва і жніво.
Ніна ў касцёле. А ўкленчыць яна не можа — баляць калені.

Панядзелак, 6 ліпеня 1998 году.
7.30. Захмаранае, з ледзьве прыкметнымі ясна-блакітнымі (на гарызонце) і густа-сіняватымі (у зеніце) азярынкамі, неба. Кружэнне бясконцае чорных вастракрылых стрыжоў. Іржава-карычневыя дахі беднага, недагледжанага гораду. Гэта калі не зазірнуць у брудныя засмечаныя двары з ямамі пабітага асфальту, засыпанага ружаватым нязмеценым пяском. Старыя, ссутуленыя ад холаду кабеты, што вывелі на выгульванне сабак, і зарослыя бародамі клышаногія бамжы, што цягнуцца да кантэйнераў са смеццем, дадаюць душы яшчэ больш чорнасці і смутку.

Аўторак, 7 ліпеня 1998 году.
7.20. Непрадукцыйны я чалавек — трачу час на дробязі. Ужо гадзіну як капашуся ў шуфлядах стала і тумбачкі, перабіраючы лякарствы.
Большасць (баляшыня, як казала маці) нашага жыцця ідзе на дробязі. Каб мы маглі разлічыць кожны свой крок, колькі было б карысці.

Пятніца, 10 ліпеня 1998 году.
9.00. Учора нарэшце скончыў рэдагаваць і аддаў (хлопцам) сынам для набору сваю “Развітальную аповесць”. Ёсць шмат (агульнага) адэкватнага паміж дзённікамі, апавяданнямі і аповесцю.
Гэтыя паўторы варта было б зняць, ва ўсякім выпадку прыглушыць.
З офісу, куды я ледзьве падняўся пад вялікі дождж, сыны мяне запрасілі ў “Ракаўскі бровар”. Гэта ўжо ў гонар Валодзевага ад’езду (на адпачынак) у Гішпанію.
Потым была яшчэ Міраслававa кватэра, нарэшце агляд іхняга новага офісу. Трохпакаёвая кватэра, у якой толькі пастаўлены новыя сцены і ўсланы паркет, мне спадабалася, але ж першы паверх...
Абыдзецца яна дарагавата.
Дарэчы, у ёй ужо ўстаўлены новыя вокны (пакеты), няма толькі дзвярэй.

Нядзеля, 12 ліпеня 1998 году.
У старожцы, хватаючы слухаўку — тэлефоны спараныя, — не даюць пагаварыць бамжы, якіх тут пасяліў, узяўшы за старажоў, ранейшы старшыня таварыства. Я адчыніў дзверы старожкі і ўбачыў на калодцы п’яную маладзіцу, яна нешта барматала ў чорную тэлефонную трубку.
І машыны да іх прыязджаюць пад № /.../ КХ і /.../ МХ. Значыць, тут збіраецца цэлая зграя зладзеяў, што абіраюць дачы.

Панядзелак, 13 ліпеня 1998 году.
Кручаны
— Бог назваў святло днём, цемру — ноччу. А як мне назваць сабачку? Я купіла яго без імені. Ішла на рынак па іншай патрэбе, і ў пераходзе метро стаяла жанчына, трымаючы на руцэ, сагнутай у локці, лапавухае шчанятка з выпуклымі і неразумна-наіўнымі вачамі. Я мінула гэтую худую, высокую, як жардзіна, жанчыну, з гарбаватым носам і тонкімі губамі, а ў памяці засталося шакаладнага колеру чорна-сінявокае шчаня.
Я, вядома, вярнулася.
А шчаня аднойчы згубілася і прывяло ў кватэру чорнага, як асмалак, і гэтакага жылістага, кручанага, як асмалак, Тодара.

Аўторак, 14 ліпеня 1998 году.
Гул, грукат і вуркат самалёта, што глухне за ўздыбленым гарбом лесу, затканага сіняватаю смугою, нясе мае ўспаміны на надрэчныя алешыны і вербы Варакомшчыны, да даўняга, можа, дваццацігадовага лопату верталёта, што чамусьці лятаў над далінаю Ятранкі, да тых людзей, якіх ужо няма, якія спяць пад глыбамі пяску сярод марных, чэзлых і замшэлых хвоек. І чамусьці ў галаве пайшоў такі падлік: каму было дзесяць — сёння яму трыццаць, каму было трыццаць — сёння пяцьдзесят, каму пяцьдзесят — таму сёння семдзесят, каму семдзесят — той адышоў.

А верталёт, трымаючыся за празрысты круг прапелера і падняўшы хвішчаваты хвост, усё лапоча над зялёным алешнікам і сінявата-сталёвым рваным паскам Ятранкі. І густа стаіць сіваваты, ацяжэлы ад расы авёс на гарбатых боханах далёкіх і блізкіх грудоў. Палявыя межы і дарогі горка і вязка пахнуць белым рамонкам, упрыгожаным лёгкімі, сінімі, як матылькі, валошкамі...

Серада, 15 ліпеня 1998 году.
9.00. Адстаяў, ці, праўдзівей, прагаварыў чаргу па малако з ліпкім Спрынчаном. І заварыў сабе манную кашу. Чакаю Ніну. Але наўрад пад марасісты дождж, што крадком пасыпаў і разышоўся, пабольшаў, яна прыедзе.
Надвячоркам разгортваў Брыля, але чытаць яго куртаценькія, кволыя, націнныя апавяданні не мог. У свой час, працуючы ў "Мінскай газеце", іх, напэўна, адрэдагаваў Антон Адамовіч. Бо тое, што было ім выбракавана, выпраўлена і надрукавана ў той жа газеце — цыкл дзіцячых навелак, — выдатна.

Чацвер, 16 ліпеня 1998 году.
Прыгадалася мая астатняя сустрэча, праўдзівей, гутарка па тэлефоне з Кандратам Крапівою, ці, па-нашаму ды, можа, і па-ўздзенскаму, — Крапівом. Блізілася яго 90-годдзе. Але пра гэта трохі ніжэй...
З ім, ужо даволі сталым, хворым на вочы (катаракта), я сустракаўся і гутарыў не раз. Як памятка пра гэтыя кароткія сустрэчы застаўся блакітны, пасярэбраны на карашку пяцітомнік з тым няроўным дарчым подпісам, які яму,

невідушчаму, даўся даволі цяжка. Ён доўга і навобмацак, адцягнуўшы сяроднюю шуфляду стала, шукаў стрыжань:
— Недзе ж тут.
Я прапанаваў сваю аўтаручку.
— Дзякую. Знайду. Павінен быць, — яго доўгія пальцы таропка кешкаліся на днішчы шуфляды і нарэшце знайшлі белую кантовую ручку, прымітыўна-простую, шарыкавую.
Ён ганарыста падняў свой старэчы, хударлявы, перакрэслены зморшчынамі, але яшчэ ружаваты твар і, зморшчыўшы нос і прыўзняўшы (закапыліўшы) верхнюю губу, як гэта робяць падслепаватыя людзі, пераможна паглядзеў на мяне. Вядома, праз складаныя лінзы акуляраў. Не ведаю, ці ўбачыў ён мой твар, бо доўга, на вобмацак, пэўна, ішоў адчыняць дзверы, накінуўшы на плечы ці не байкавы бальнічны халат, як гэтак жа, абапіраючыся растапыранаю рукою аб сцяну, вяртаўся ў свой кабінет з калодаю вычасанага красналюдка ці лесавіка і стэлажамі беларускіх кніжак, асобна ад расійскіх, якія стаялі злева і ў цэнтры, нібы намёк на інтэграцыю.
— Чытаю ваш раман. Толькі ўжо зрок слабы — губляю радкі. Ого, колькі вы ведаеце зёлак. Але ў адным месцы ўсё ж паўтарыліся.
Ён быў карэктны, а можа, трохі афіцыйны. Але помніцца, калі з нагоды залатое зоркі мы сфатаграфавалі яго на лаўцы ў акадэмічным садзе ў сівым старамодным капелюшы і збіраліся былі развітацца, ён нечакана запрасіў да сябе на кватэру.
Мне было няёмка і сорамна, і я знайшоў адчэпку:
— У грыбы сабраўся.
— Ідзі, пасядзі за сталом, грыбы падрастуць, — ён, падняўшы абедзвюма рукамі і перакінуўшы за борт сваю правую нагу, пачаў паволі выбірацца з машыны.
І перад гэтым таксама жартаваў, учуўшы, як на зялёнай выспе сярод нерухомага азярка гарланіць певень.
— Во, чуеце, спявае.
— А што, тут і пеўні ёсць? — здзівіўся наш шафёр.
— Усяго адзін. А курыцу на лодцы яму не падвезлі, таму і крычыць.
Астатняя ж наша гутарка аказалася не толькі не жартаўлівай, а нейкай адчужана-невясёлай, калі не сказаць горкай.

Патэлефанаваўшы Крапіве — дзякуй Богу, слых у яго, як і

памяць, быў яшчэ не скарэжаны старасцю, — я папрасіў яго, папярэдне, вядома, распытаўшы пра здароўе, напісаць зварот да моладзі: часопіс “Бярозка”, дзе я працаваў тады на пасадзе рэдактара, меўся прысвяціць яму некалькі сваіх сціплых разгорткаў (разваротаў).
Але ў слухаўцы зацягнулася падазронае маўчанне, патрэсквала разрадамі толькі правадная адлегласць, дарэчы, кароткая — наўскос праз праспект — ад Дому друку, дзе знаходзілася рэдакцыя часопісу, да магазіну “Сінтэтыка”, над якім ён жыў. Нарэшце пачуўся яго слабы і ўжо даволі глухаваты голас. Мяне кінула ў недаўменне яго кароткая, трохі нават асцярожная, але катэгарычная фраза:
— Тут ёсць нюанс.
— А ў чым справа, Кандрат Кандратавіч? Танк, напрыклад, у свае семдзесят нам напісаў.
— У семдзесят можна, а ў дзевяноста...
І раптам нечакана страшнае і крыўднае, напэўна, да болю ў скронях, раздражнёнае запытанне:
— Хіба вы жадаеце мне смерці, што вымагаеце гэты зварот ці запавет?
Я, мусіць, таксама доўга маўчаў, пераводзячы дых.
Было, вядома, і маё прабачэнне і за трывогу, і за тэлефонны званок, і за сваю, мусіць, неабдуманую прапанову і некарэктнасць.
— Даруйце яшчэ раз, — нарэшце я змогся ў сваёй мальбе і просьбе.
— Нічога, бывае, — адклікнуўся ён, як мне здалося, паспакайнелым, а ўсё ж пакрыўджаным, недаравальным тонам у голасе.
З гадамі, успамінаючы гэты выпадак, я чую нейкую невымоўна цяжкую, незразумелую і невытлумачальную віну перад Кандратам Крапівою. Але ў чым яна, дабраць і асэнсаваць не магу.
Што ён, як казаў Дастаеўскі пра Пушкіна, забраў з сабою нейкую вялікую таямніцу, то, мусіць, не. Крыўду, то, напэўна, так. Але ж пражыў нямала — 94 ці 96. То ў чым жа яна?

Пятніца, 17 ліпеня 1998 году.
Мой самаробны флюгер, мільгаючы срэбна-бляшаным прапелерам, паварочваецца на поўнач.

Гнуцца ўстрывожана-непакорныя, раскалыханыя ветрам, маладыя танканогія яблынькі-прышчэпы, і на сетку доўгімі сівымі косамі, нібы ў актыніі, навальваецца вербалоз.
Неба спрэс сівае, з дымам ірваных цемнаватых хмар, што сплываюць за цёмна-зялёны гай. Адна да аднае ў знямозе ці ў жалобе туляцца, нагадваючы нечым усходніх жанчын, затуленых чадрою, гнуткія бярэзіны. Сівыя дымкі ад нізкіх хмар перапаўзаюць высокую спіну шмат'яруснуга лесу.
За акном пад застрэшкам франтону гудзе і віхрыць вецер.

Субота, 18 ліпеня 1998 году.
7.00. Прачнуўся пад гул, шэпт і падвыванне віхурнага ветру, ад якога парывала і стагнала мансарда. Як вынік гэтых парываў — недзе зблытаныя электраправады — святла няма.
Сад трапеча, кіпіць, варушыцца, гнецца доўгімі маладымі галінамі ледзьве не да зямлі.
Сівыя воблакі рваных хмараў, пераплыўшы праз зубчаты хрыбет лесу, спадаюць у лагчыну.
Дуб, падняўшы круглую крону, нібы амёба шчупальцамі, варушыць ёю, плыве супраць ветру.
І вал за валам сіва-дымных нізкіх хмараў коціцца за прылізаны, нібы павернуты спінаю да ветру, ссутулены гай.

Успомніўся гэтак захмараны, дажджлівы і ветраны май, калі я, прыехаўшы ў Варакомшчыну, хадзіў на поле, дзе была Папушчына, сасновы лес, высечаны калгасам (старшыня — антыхрыст Каско), шукаць сунічнік, праўдзівей — яго кветкі. Каля каменняў, нассованых з поля, каля іхніх лежбішчаў, што нагадвалі прыморскія лежбішчы маржоў, нага наступіла на сухія сасновыя шышкі. Я ажно зніякавеў і падняў іх як прыкмету, як знак, што некалі тут шугалі і ўздымаліся да неба струнікія сосны.
Наўкруга на боханістых грудах ляжала лілова-карычневая ралля з кволымі жаўтлява-зялёнымі ўсходамі ячменю ці аўса. І душу высмоктваў смутак, і сэрца сціскала жальба, што ўсё мілае і знаёмае змалку — зацішная сцяна хвоек з падлескам крушыны, берасклету і цёмна-зялёных купчастых елачак з чырвоным агнём і лопатам цецерукоў — так беззваротна адышло.
Быў лес, прытулак... А цяпер я стаяў нібы расхрыстаны ці

бессаромна голы сярод голага, бязлесага і нібы чужога поля. О, як гэта цяжка: хаваць не толькі чалавека, але і родны лес, што прыветна цягнуў да цябе выгнутыя галіны з ёршыкамі зялёных ігліц і лашчыў душу мяккім цёплым шэптам.
Які бязбожны, нечысцівы і шкодны чалавек, бывае, народзіцца на зямлі.

Субота, 18 ліпеня 1998 году.
15.00. Парывісты вецер (заходні ці нават заходне-ўсходні), перагонамі дождж, як у глыбокую восень. Дзень схіліўся на вечар, а сонца яшчэ і не прабілася праз тоўшчу сіва-белаватых хмар. І Ніна мусіць расіцца ў мокрых кустах, каб назбіраць вядзерца парэчак.
Дачнікі паціхеньку ўцякаюць у горад. Балазе з'явілася электрыка, а то і мы, як кажуць, навастрылі лыжы. Паедзем заўтра.
Няўжо ж не распагодзіцца?
Праз авёс, вядома ж мокры, з пустымі кашамі, бо памахвае імі, прэцца на дачы грыбнік. Апрача баравікоў, лісіц, асавікоў і падбярозавікаў высыпалі ўжо апенкі — асеннія грыбы. І сіўцоў (ваўчакоў) поўна.
Грузавік гудзе. Мусіць, нейкая "Татра" ці "МАЗ", што з жвіровішча пад Заслаўем (бяруць) возяць пясок.

Нядзеля, 19 ліпеня 1998 году.
7.15. Пагодны, ветраны ранак. Але на ясна-блакітнае неба наплываюць кудзеркі белых хмарак. Адна за адною. А на небасхіле белая рабізна іх.
Мігціць осцямі, выпусціўшы колас, жаўтлява-зялёны ячмень пад кучарава-зялёным дубам. Па загонах бульбы засвяціліся пяцікутна сонечна-жоўтыя кветкі гарбузоў.
Ніна ў гародзе з пучком цыбулі (пер'я). Збіраемся ў Мінск, нарыхтаваўшы ў дарогу па вядзерку чырвоных і чорных парэчак (смародніку).

Серада, 22 ліпеня 1998 году.
18.50. На градусніку +30 °С. Але ён на сонечным баку і нагрэўся за дзень. Усё ж на праспект не высунуцца — ідзеш як па Афрыцы і цябе прыціскае да асфальту.
Вярнуўшыся з Масквы, заходзіў Міраслаў. Заўтра ці

паслязаўтра ён прынясе карэктуру “Развітальнай аповесці”, майго зборніка прозы.
Учора, сустрэўшы Сашу Станюту ў аптэцы, я падмовіў яго купіць маці, вядома, за мае, бутэльку до пурпара (мал. віно). Спадарыня Стэфанія, напэўна, была бясконца рада. Бо хто ж успомніць пра шаноўных людзей, калі не я.

Аўторак, 28 ліпеня 1998 году.
Цікавае апісанне кветак у польскіх даведніках. Напрыклад, у кнізе “Пажыткі пчол”. Пра кіпрэй, ці па-расійску іван-чай, у нас — кудзеля, гаворыцца простаю, нават трохі паэтычнаю моваю: цвіце ў ліпені і жніўні. Кветкі велікаватыя, кармінавыя, сабраныя [ў] стажковую гронку.
А пра цвет мядункі: найперш чырвона-ружова, а пазней — блакітна, нябеска. Расце пераважна ў лесе. Цвіце ад пачатку сакавіка да пачатку мая. 30 см вышыні.
Медуніцу ў нас называюць смактухаю, па-расійску — медуніца цёмная.
Мацяжанка. Ці не <мыцердушка>? Выдае араматычны пах. Кветкі ружова-ліловыя. Нарэшце здагадаўся — ліловы, поўны пчол наш чабор. Гаркаваты, цёпла-густы яго пах заводзіць у роце. Ён заўсёды поруч з жоўтым расходнікам. Гэтымі жоўта-ліловымі стракатымі дыванамі былі ўсланы нашы сухія ялавіны ці пералогі. Яшчэ між іх сівавата-варсістыя, але мяккія лісцем, стрымбулі жоўтай ад кветак мядова-пахучай дзіванны, а ўвосень, калі згасне дыван, на ім закалышуцца, махаючы сіва-ліловымі галоўкамі-шышкамі, сціплыя, сарамлівыя каткі.
У суботу, калі мы са сватам ехалі на дачу і з дачы на яго шарым, ужо стараватым “мерседэсе”, нас на адхонах шашы віталі сінія, праўдзівей, блакітныя лёгкія матылькі, толькі не ўзляталі, — кветкі мацаўніку (цыкорыі), што абляпілі яго ледзьве не голыя бадылі.
Па-восеньску ўжо суха шапаціць, калышацца і сыпле першае жоўтае і пажухлае, дзіравае лісце наш яшчэ не стары садок. Але ўжо з чэзлымі ад марозу і раку замшэлымі яблынямі. Дрэвы гінуць цераз адно.
Неба замурзалася валакністай рэддзю белаватых высокіх воблакаў. Кіпіць, варушыць кожнаю галінаю круглаверхі дуб. За блакітна-сіваватай капустай, за жоўтымі ад цвету патысонамі ці кабачкамі гнуцца зялёныя высокія зараснікі

тапінамбуру (земляное грушы, ці канадскай бульбы). Ён яшчэ не цвіце.

Серада, 29 ліпеня 1998 году.
7.30. Вяртаючыся ў падлеткавыя гады (ажно страх казаць — паўвека назад), перачытваў пад шапаткі вечаровы дождж спіленькую ружавата-злінялую кніжачку Змітрака Бядулі з тымі змалку вядомымі яго апавяданнямі “Пяць лыжак заціркі”, “Малыя дрывасекі”, “Летапісцы”, “Віхор”.
Наіўна-замілаваная, простая проза, якая так прыйшлася даспадобы маладой душы, сёння трохі выклікае не злы, добры смяшок.
Найлепш напісана, нягледзячы на арнаментальнасць і часам літаратурныя шкляныя званочкі, навела “Віхор”. Добра, даверліва ўспрымаеш і гэты паўтор з ледзь улоўным тонам у голасе местачковага балагола: “Ах ты-ы-ый... Баламут! І-ха-ха”. І чуеш гэты тоненькі і дробны смех, і бачыш, як дзедава дрыготкая шурпатая рука гладзіць аксамітную шыю свайго гадунца. І нават уяўляеш, як сівыя мяккія губы жарабка бяруць з дзедавай далоні чорствы хлеб.
Каб не наіўная, занадта ўжо фантастычная канцоўка — жарабок прывозіць на сабе свайго злодзея, беспрытомнага канакрада, што “бразнуўся лбом аб хвою” і чамусьці не зваліўся, ушчаперыўся пальцамі ў гарачую густую грыву, — навела была б беспадобнай, проста зіхатлівай іскрынкай нашай, не такой ужо і багатай на класічныя шэдэўры, нацыянальнай прозы.

Пятніца, 31 ліпеня 1998 году.
Дзіва, але Міцкевіч у эпілогу “Пана Тадэвуша” Наваградчыну/ Польшчу называе “краем шчаслівым, убогім і цесным”.
“Ptak małego lotu”.
Выраз Міцкевіча: “Павінна і там быць жыццё, дзе маскаль тне сякераю”.

Субота, 1 жніўня 1998 году.
Праз тыдні два будзе пяты год/якраз роўна пяць гадоў, як мой малодшы брат Янак не чуе ні плачу за сцяною ўнука, ні вадаспаднага ліўню за акном, ні пошуму старых дрэў у блізкім парку, ні рыкання кароў у цаглянай пабеленай аборы, ні лопату

блакітнага калёснага трактара на вуліцы і не прыедзе да мяне, каб убачыць у росным садку паружавелы зялёны яблык на абвіслай галіне той яблынькі-прышчэпкі, якую ён калісьці прывёз з Пружаншчыны, дзе спачывае сам недалёка ад старой бярозы з зажуранаю сасною, і якую, выкапаўшы ямку, пасадзіў мне на ўспамін.
У аўторак 17 жніўня 1993 года на лістку адрыўнога календара я запісаў няроўным, нервова-дрыготкім почыркам: “Сёння, у 5.30 раніцы, памёр мой брат — Ян Адамчык”.
Недзе ў шэсць пасля навальнічнага дажджу мне з Каштанаўкі (былы панскі двор пад Пружанамі) патэлефанавала Аня, яго жонка, сказаўшы каротка: “Памёр Іван. Вось толькі што. Уключыў святло і паклікаў мяне з мацераю: “Будзьце пры мне, не адыходзьця!” Мы запалілі свечку. Ён заплюшчыў вочы — і памёр”.

Нядзеля, 2 жніўня 1998 году.
Не мог прысесці за стол, успомніўшы Яна, яго заўчасную, у 49 гадоў, пакутную смерць.
У гэтакія парныя ліпеньска-жнівеньскія дні я наведаў яго яшчэ жывога, схуднелага, як Хрыстос, з вялікімі ўмольна-вінаватымі вачамі. Колькі было наіўнай просьбы ў гэтых дзіцячых сіняватых вачах, калі мы развітваліся.
А перад гэтым была задушлівая ноч з перуном, водгуллем грому, шчодраю навальніцаю і яго сухім, раз за разам, нямоцным кашлем за перагародкаю...
Дарога дадому/да чыгуначнай станцыі праз залатое ўжо збожжа — палавое жыта і бурштынавыя аўсы — у кабіне жоўтага малакавоза ад белай фермы поруч [з] двухпавярховым сілікатным домам з ражнамі і крыжавінамі антэн на шыферным даху і... акном у ім, завешаным белымі фіранкамі, у тыльным пакойчыку з пластмасавым прыёмнікам на падлозе пры ложку, на якім, я ўжо ведаў, ён застаўся дажываць апошнія дні.
І мне на калдобістай палявой дарозе помніліся вялікія сіняватыя вочы ў кучаравых густых вейках і акно, зашморгнутае белымі фіранкамі...
Працяг у ARCHE-5’03.
Публікацыя
Уладзімера Адамчыка

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Элы Мацьвіенкі
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/23
[image]

Павал Абрамовіч

Праўда Адамчыкаў

Артыкул пра апошнія мастацкія пошукі Адама Глёбуса я хацеў напісаць даўно, але мне чагосьці бракавала. Здавалася, матэрыял застанецца няскончаным, стаіцца ў чарнавых накідах у нетрах майго кампутара, таму што я аніяк ня мог даўмецца: што так моцна перашкаджае мне пісаць?

І толькі калі пабачыў сёлетні чэрвеньскі нумар “ARCHE”, зразумеў: я ня ведаў пра існаваньне дзёньнікавых запісаў бацькі Глёбуса, пісьменьніка Вячаслава Адамчыка, якія ён вёў цягам 1998 году.

Бацька

Чытаньне пачатку гэтага дзёньніка (ягоны працяг друкуецца ў гэтым нумары часопісу) спарадзіла ў маёй душы дэпрэсію, ці не нашмат люцейшую за тую, што я перажыў пасьля сьмерці Васіля Быкава. Вядома, каб выкладаць ніжэй свае погляды і ідэі, я мусіў бы пачакаць і дачытаць да канца дзёньнік, які дапамагае лепш усьвядоміць унутраны сьвет ня толькі ягонага аўтара, але й Адама Глёбуса; аднак, шчыра кажучы, наўрад ці знайду ў сабе сілы, каб прачытаць тыя старонкі ці нават проста

прабегчы іх вачыма.
Бо чытаньне гэтага дзёньніка небясьпечнае для псыхікі: кожны запіс быццам набрыняў атрутаю; раздражненьне, боль, крыўда, агіда, нянавісьць да ўсіх, акром сваёй сям'і. *“Якою вясельнаю зграяй нас, Адамчыкаў, акружыла каляпрэзідэнцкая і калялітаратурная дружына”*, — піша аўтар (запіс ад 19 траўня). А вось як апісвае В. Адамчык адно з паседжаньняў Саюзу пісьменьнікаў: *“Рада. Ссутулены, з дрыготкімі рукамі Зуёнак, кучаравы, нечым падобны да партрэтнага Валошына. Няголены па-гебрайску, з адутлаватым тупым тварам Дудараў. Хваравіта-злосны, з сінімі тонкімі губамі Бураўкін. Навуменка з праваленым ротам. Падобны да нейкага снежнага чалавека, шыракаплечы і грузны Гніламёдаў. На зарослым, шчаціністым вялікім твары ані іскры розуму…”* (запіс ад 21 красавіка).
Я не зьбіраюся ў нечым папікаць В. Адамчыка, крый Божа! Але мне робіцца не па сабе: літаратару да скону застаюцца лічаныя гады, ён *“жыве адчуваннем страху смерці”* (запіс ад 19 лютага), аднак ягоная рука занатоўвае вось гэта, выводзіць на белі старонак поўныя гідлівасьці і зацятай злосьці словы пра тое, што ў трамваях сьмярдзіць бамжамі, у крамах няма вяршкоў, у тэлевізары — *“парсюк Сванідзе”*, а ў Скрыгана — палюбоўніца-перакладчыца. Даверыць дзёньніку такое паскудзтва, такую мяшчанскую нудоту — як гэта стала магчыма?
Дзёньнік сьведчыць, што ў 1998 годзе В. Адамчыку ўжо цяжка даецца літаратурная дзейнасьць. Ён памірае і ў думках ужо разьвітаўся зь недапісанымі апавяданьнямі, нястворанымі аповесьцямі і п'есамі (запіс ад 30 студзеня). Аднак хапаецца за жыцьцё, бо там, за парогам, — нябыт, а тут *“то дыміць завейны дробны снег, то ў разрывах сіняватых хмараў залаціцца сонца і глыбокі блакіт зманвае вока, як светлая надзея на штосьці таемна-радаснае”* (запіс ад 6 лютага).
Але такіх запісаў у дзёньніку-1998 няшмат. Вячаслаў Адамчык пакінуў сьвет, быццам злосна бразнуўшы дзьвярыма.
Не дараваў нікому.

Сын
Калі я чытаў пачатак дзёньніка В. Адамчыка[1], мне раптам здалося, быццам перад маімі вачыма… чарговы блёк “Сучасьнікаў” Глёбуса: *“…А пры іх тая ж кароценькая Іпатава… У свой гарэм чэмярыс Някляеў…”* (запіс ад 28 траўня).

[1] **Ён дарэчы,**

Інтанацыя, ступень зараднасьці і нязмушанасьці ў друкаванай плётак — адны і тыя ж.

У 1998 годзе “Наша Ніва” надрукавала дзьве падборкі крытычных нататак сына Вячаслава Адамчыка —“Суайчыньнікі-3” і “Сучаснікі (літоўцы, расейцы, старонкі)”. Пішу “крытычныя нататкі”, бо тыя допісы Глёбуса, выразныя рысы пісьменьніцкай крытыкі, утрымліваюць цікавыя і надзвычай катэгарычныя (што характэрна для пісьменьніка) заўвагі наконт творчасьці літаратараў і мастакоў: *“Тэксты Леаніда Галубовіча цёплыя, як жывыя арганізмы. Цеплынёю яны й прывабліваюць. Толькі ёсьць небяспека, што яны хутка састарэюць, як састарэлі нататкі Янкі Ёрыніч* (“НН”, № 19, 1998). Аднак ужо ў першых гэтых нататках выявілася выразнае жаданьне Глёбуса назіраць за актуальным жыцьцём, побытам інтэлектуалаў, а не аналізаваць творчасьць: *“Пад Барсэлёнаю, у Січазе падчас карнавалу, у натоўпе я апынуўся побач з паэтам Андрэем Вазьнясенскім. Той глядзеў у вітрыну й гаварыў да старой кабеты: “Сорак баксаў. Паглядзі... Гэтая драбяза каштуе сорак баксаў!!!”* (“НН”, № 21, 1998). Паступова і няўмольна літаратурна-мастацкая крытыка зьнікала з “Сучаснікаў” — замест яе ў зацемах заставаліся кіпы бруднай чужой бялізны.

ці друкаваны з купюрамі: бо ці пропускаў на 17 старонак. Між іншага, “Наша Ніва” ранейшага, ці “ARCHE” будзе друкаваць без цэнзурных зарнавалаў і прыхарошваньня”.

Менавіта чытачы “НН” сталі сьведкамі нараджэньня новага жанру ў беларускай журналістыцы[2] а сама газэта, дзякуючы Глёбусу, набыла скандальную вядомасьць і “жоўтае” адценьне. Аднойчы штотыднёвіку нават давялося друкаваць абвяржэньне, перапрашаць за словы літаратара (“НН”, № 14, 2003). Але Глёбус, нягледзячы на маўклівы/голасны пратэст некаторых сваіх калег і гнеўнае абурэньне часткі чытачоў, з энтузіязмам энтамоляга працягваў ствараць усё новыя і новыя калекцыі, пратыкаючы словамі-шпількамі сваіх сучаснікаў і прыклейваючы ўнізе пад імі ярлыкі: “алькаголік”, “скандалістка”, “вычварэнец”, “зайздросьнік”, “бабнік”, “графаман” і інш.

Цягам 1999—2002 гадоў “Наша Ніва” рэгулярна друкавала падборкі “Сучаснікаў” (іншым разам зьмяняючы назву — “Нашы тутэйшыя”, “Мае сучаснікі”, “Цёткі”, “Мае сучаснікі-мастакі”), а таксама нататкі Глёбуса “Невялікае пра вялікіх”, “Расейская калекцыя” і “Расейская кунсткамэра”, якія тоесныя згаданаму вышэй цыклу[3]. У 1999—2000 гадох “Сучаснікаў”

арганічна дапоўнілі “Бытавуха” і “Дробы і шрот” — нататкі Славаміра Адамовіча. Сапраўды, лепшыя назвы рубрык для падобных матэрыялаў знайсьці цяжка.

[2] Насамрэч “Сучасьнікаў” трэба залічыць да квазіпубліцыстыкі, аднак “Наша Ніва” ўважае іх за літаратурны твор (гл.“НН”, №14, 2003).

[3] **Цяперака “Сучасьнікі” зьмяшчаюцца на сайце www.litara.net**

Бацька

Талент пісьменьніка і драматурга Вячаслава Адамчыка неаспрэчны. Нацыянальная крытыка ўважліва сачыла за ростам яго дараваньня. Аднак сёньня, на пачатку XXI стагодзьдзя, відаць, што літаратурная дзейнасьць В. Адамчыка, ляўрэата Дзяржаўнай прэміі і Літаратурнай прэміі імя Мележа, усё-такі не ацэненая належным чынам. Ці трэба казаць, што сумны лёс напаткаў ня толькі ягоную мастацкую спадчыну. Акадэмічным зборам твораў у нас можа “пахваліцца” толькі Купала, аднак праца спэцыялістаў — укладальнікаў гэтага кнігазбору ў дзевяці тамах, праца, да якой дасьледчыкі падступіліся толькі празь пяцьдзясят з гакам гадоў пасьля сьмерці песьняра, выклікае шматлікія нараканьні[4].

Між іншага, некаторыя крытычныя абагульненьні адносна творчасьці аўтара “Чужой бацькаўшчыны” і “Чорнага цмоку” ёсьць. І вось што цікава. Як пераконвае ў сваёй кнізе “Хараство і боль жыцьця: Нарыс творчасці Вячаслава Адамчыка” (Менск, 1985) дасьледчык Яўген Лецка, літаратар, на жаль, не дасягнуў вышыняў у мастацкім увасабленьні сучаснасьці. З гэтым пунктам гледжаньня пагаджаюцца аўтары манаграфіі “Праблемы сучаснай беларускай крытыкі” (Менск, 1996), якія тактоўна зазначаюць, што *“асэнсаванне бягучага дня тэмы ўсё ўдавалася В. Адамчыку — тут, бадай, было больш прыкмет, чым сапраўдных мастацкіх знаходак”.*

Каб зразумець, ці маюць рацыю спэцыялісты, мы мусім зьвярнуцца па дапамогу да апошніх мастацкіх тэкстаў В. Адамчыка альбо ягоных запісных кніжак. І суаднесьці ўражаньні. На жаль, апублікаваная частка дзёньніку-1998 усё толькі ўскладняе: яна ня ўтрымлівае вобразаў, якія пазьней пісьменьнік мог бы скарыстаць пры напісаньні твораў; там нямашака новых мастацкіх рашэньняў, абрысаў новых тэмаў і сюжэтаў, філязофскіх заўваг. Наагул у гэтым фрагмэнце адсутнічае той шчыры маналёг аб мастацтве, які звычайна ёсьць у дзёньніках літаратараў і які ўлічваюць дасьледнікі. Як відаць з запісаў, В. Адамчык сьцяўся ў прадчуваньні

[4] **Сідаравіч А. Поўны не акадэмічны // ARCHE.— 2000.— №6(11).**

апакаліпсысу беларускага Сусьвету і сваёй асабістай галяктыкі.
І як літаратар ён маўчыць. Адно рэдкія філялягічныя заўвагі пазначаюць межы былых інтэлектуальных зацікаўленьняў гэтай асобы.
Дзёньнік не нараджае ў душы чытача радасьці ад блізкага знаёмства з празаікам, не дапамагае спасьціжэньню тонкасьцяў ягонае душы альбо асаблівасьцяў таленту. Але з запісаў можна шмат даведацца пра тое, як ставіўся В. Адамчык да беларускіх рэаліяў, як яму не ставала паветра ў гэтай рэчаіснасьці, які безабаронны ён быў. Перад намі стары нядужы чалавек, што страціў надзею. Дзёньнік шакуе, выклікае абурэньне, пратэст, як і "Сучасьнікі" Глёбуса. Непрыязнасьць да самога В. Адамчыка здольныя спарадзіць тыя месцы дзёньніка, дзе ён апісвае сваіх сучасьнікаў, калег-літаратараў. Сэрца пісьменьніка перапаўнялі зло і нянавісьць да іх. Ён пакутаваў, заблукаўшы ў лябірынтах сваёй крыўды, і яго робіцца шкада. Ці трэба было Адаму Глёбусу выстаўляць на сьвет духоўную і чалавечую немач прыдушанага лёсам бацькі? "Так, — адказвае ён, — бо **тата змог напісаць праўду**"[5].
Ні ў адным радку свайго дзёньніка за 1998 год Вячаслаў Адамчык ня выказаў сумневу ўва ўласных ацэнках людзкіх характараў, поглядаў на жыцьцё. Але ж менавіта няўпэўненасьць змушае кожнага мастака рабіць рэгулярную рэвізію ўласных жыцьцёвых дасягненьняў і духоўных каштоўнасьцяў, дапамагае яму пазьбегчы дагматызму мысьленьня, гэтак небясьпечнага для інтэлектуалаў, і рухацца — абноўленым — далей.
В. Адамчык нават не задумваўся аб тым, што можа памыляцца. Гэта рыса ўласьцівая і ягонаму сыну Ўладзімеру.

www.litara.net/forum/399 (постынг ад 24.07.2003,12:29).

Сын

Уладзімер Адамчык, цьвёрда перакананы, што запісы бацькі павінны быць неадкладна надрукаваныя, аддаў дзёньнік-1998 у “ARCHE”, дзе яго з задавальненьнем узялі ў працу[6]. Дзёньнік чытачам абяцалі без купюр, цэнзурных правак. Панове не стрымалі дадзенага слова.

Глёбусу было, відаць, усё роўна, якія пачуцьці ў чытачкай аўдыторыі выкліча дзёньнік. Ён і ня думаў пра каментары, заўвагі да яго. Праўдзе не патрэбныя тлумачэньні. Яна адна сьцяжыць тлумачэньнем. “А тата змог напісаць праўду”. Калі ў дзёньніку-1998 адчувальныя пагарда, агідаць людзей, то ў “Сучасьніках” — кпіны, халодны сьмех зь іх нікчэмнасьцю і слабасьцяў. Аніякага мастацкага пераўвасабленьня рэчаіснасьці, як піша “НН”, у “Сучасьніках” няма, толькі знарок падкрэсьлівае праўдзівасьць гэтых гісторыяў, пакідае даты і прозьвішчы рэальных пэрсанажаў, імкнецца ў аўтарскай адстароненасьці пры аднаўленьні падмяніць Кірацей,

[6] **Дзёньнік бацькі за 1999 г. Яна адносіць у “Маладосць”, за 2000 г. — у “Дзеяслоў”, за 2001 г. — у “Полымя”. Ахоп аўдыторыі мяксымальны.**

зьбірае і падае “факты” як журналіст. Для У. Адамчыка мае значэньне толькі праўда. Гэта бацькоўскі запавет.
Нядаўна Глёбус скончыў “раман-аўтапартрэт у сямейным інтэр’еры” (аўтарскае азначэньне) аб сваёй сям’і — “Дом”. Працу над гэтым творам, поўным цеплыні, пяшчоты да родных, Глёбус вёў паралельна з напісаньнем “Сучасьнікаў”. Пагарда і зьнявага — для суайчыньнікаў, любоў — для сям’і.
Вось яна — праўда Адамчыкаў?

Ад рэдакцыі
Купюры пры публікацыі дзёньніка Вячаслава Адамчыка былі выкліканы тэхнічнымі (арыгінальны памер дзёньнікавых запісаў толькі за 1998 г. складае прыкладна 150 старонак у фармаце “ARCHE”) і юрыдычнымі меркаваньнямі. У дзёньніку зьмяшчаліся зьвесткі, публікацыя якіх у любой краіне магла выклікаць судовы перасьлед і нават ліквідацыю часопісу (шматразовая абраза “кіраўніка дзяржавы” з ужываньнем нецэнзурнай лексыкі, пэрсанальнае абвінавачаньне вышэйшых службовых асобаў у карупцыі і злоўжываньні сваім становішчам, распальваньне міжнацыянальнай варожасьці і г. д.).
Ніякіх цэнзурных правак апублікаванага тэксту не рабілася. Кожны бесстароньні чытач, азнаёміўшыся з публікацыямі Адамчыкавых дзёньнікаў у “Маладосьці” і іншых СМІ, зможа самастойна зрабіць выснову, дзе аўтарскі дух быў перададзены найпаўней.

[image]
[image]

№ 4 (27) – 2003
[image]да Зьместу
[image]да Пачатку СТАРОНКІ
Рэдакцыя: **analityka@yahoo.com** Дызайн **mk** Майстраваньне Макса Плакса
Copyright © 1998-2003 ARCHE "Пачатак" magazine
Апошняе абнаўленьне: 2003/09/28
[image]